Юры Туронак



Юры Туронак

Мадэрная гісторыя Беларусі

Юры Туронак

Мадэрная гісторыя Беларусі

Вільня
Інстытут беларусістыкі
2006

EAN 80–86961–13–3

ISBN 978–80–86961–13–2

Tytuł dofinansowany przez Program Translatorski ©POLAND administrowany przez Instytut Książki w Krakowie.

The book is supported by the Allianz Cultural Foundation, Munich and the Fund for Central & East European Book Projects, Amsterdam.

Камэнтары да гэтай кнігі былі створаны пры дапамозе Польскага Інстытуту ў Менску.

Кніга выдадзена пры інфармацыйнай падтрымцы фонду «Чалавек у нядолі».

У афармленьні першай старонкі вокладкі выкарыстаныя здымкі з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва–музэю літаратуры й мастацтва.

Надрукавана ў друкарні "Прынткарп". 220141, Рэспубліка Беларусь, г. Менск, вул. Ф. Скарыны 40. Наклад 1000 ас. Зак. 699 (06139).

Зьмест

II. Канфэсіі

III. Вайна і акупацыя

Прадмова

Я ніколі ня жыў у Беларусі, толькі зрэдку, у летні час, наведваў бацькавых сваякоў на Браслаўшчыне і матчыных на Беласточчыне. З гэтай прычыны, па сутнасьці, ніколі ня меў магчымасьці канфрантаваць ідэалізаванае хатняе нацыянальна-арыентаванае выхаваньне зь беларускімі рэаліямі — у даваенныя дзіцячыя гады на гэта было зарана, а пазьней — амаль немагчыма. У гэтых адносінах нічога не давалі літоўскія і польскія школы, няшмат скарыстаў і з бацькавай бібліятэкі, якая згарэла падчас ваенных дзеяньняў у ліпені 1944 г. Усё ж ніколі не пакідала мяне жаданьне пазнаць мінуўшчыну і сучаснасьць Беларусі — сапраўднай радзімы маіх бацькоў, якая мне была ўжо толькі ўяўнай бацькаўшчынай.

У 1952 г. скончыў Галоўную школу Плянаваньня і Статыстыкі ў Варшаве, атрымаў дыплём магістра эканамічных навук і пачаў працаваць малодшым асыстэнтам на катэдры эканамічнай геаграфіі гэтай школы. Акрамя дыдактычных заняткаў, неабходна было акрэсьліць напрамак дасьледчыцкіх зацікаўленьняў і тэму будучай доктарскай дысэртацыі. З такой мэтай і згодна з профілем школы я заняўся вывучэньнем становішча сельскай гаспадаркі ў міжваенны пэрыяд ува ўсходняй і заходняй частках падзеленай Беларусі. Кожную вольную хвіліну працаваў у варшаўскіх бібліятэках, у якіх аказалася нечакана шмат афіцыйных савецкіх і польскіх публікацый па гэтым пытаньні. На іх падставе апрацаваў падрабязны статыстычны аналіз разьвіцьця сельскагаспадарчай вытворчасьці, параўноўваючы абедзьве часткі краіны, між іншым, паказаў яе рэгрэс у БССР як вынік праведзенай гвалтоўнай калектывізацыі.

Аднак у 1950-я гады, калі прыклад СССР быў асноўным канонам разьвіцьця сатэліцкіх краін, калі і ў іх ажыцьцяўлялася палітыка калектывізацыі сельскай гаспадаркі, такія мае досьледы ні ў якой меры не адпавядалі "адзінаправільным" ідэалягічным устаноўкам. Паводле іх, ня факты абумоўлівалі такія ці іншыя высновы, але наадварот — яны, факты, павінны былі служыць адпаведнай ілюстрацыяй загадзя акрэсьленых палітычна правільных тэзаў. З такім прынцыпам я не хацеў пагадзіцца і адмовіўся ад афіцыйнай навуковай кар'еры.

Неўзабаве ўзьніклі новыя пэрспэктывы і магчымасьці. На пачатку 1956 г. я атрымаў цікавую і свабодную ад ідэалягічных штампаў працу ў Польскай Зьнешнегандлёвай Палаце, у якой да пэнсіі займаўся вывучэньнем каньюнктуры міжнароднага рынку хімічных вырабаў. Выкананьне службовых задач у многім залежала ад маёй працавітасьці і спраўнасьці, таму можна было назапасіць час і прызначыць яго на свае дасьледчыцкія патрэбы. У гэтым самым годзе ў Польшчы было заснавана Беларускае грамадзка-культурнае таварыства, пачаў выходзіць у Беластоку штотыднёвік "Ніва". Гэтая падзея ўзбудзіла маю зацікаўленасьць гісторыяй беларускага нацыянальнага руху на Беласточчыне, яго пачынальнікамі і дзеячамі. Аднак такія пытаньні ня ўкладваліся ў пляны працы катэдраў ці інстытутаў гісторыі, не адпавядалі яны і задачам БГКТ, таму давялося працаваць самастойна, безь нічыёй інсьпірацыі і фінансавай дапамогі, з марнай надзеяй на магчымасьць публікацыі дасьледчыцкіх вынікаў.

Гэтыя акалічнасьці, а таксама службовыя і хатнія заняткі не спынілі досьледаў. Пачынаючы зь першых 1960-х гадоў, я прысьвячаў нямала часу вывучэньню гісторыі беларускага школьніцтва, вынікам чаго былі тры распрацоўкі — "Нарыс разьвіцьця школьніцтва на Беласточчыне 1773—1939 гг.", "Акупацыйная школьная палітыка ў Беластоцкай акрузе 1941—1944 гг." і "Беларускае школьніцтва на Беласточчыне ў пасьляваенны пэрыяд", у якіх разглядалася стаўленьне і мерапрыемствы зьменлівых дзяржаўных уладаў па арганізацыі беларускіх школаў. Усё ж, нягледзячы на розныя цяжкасьці і мае сумневы, гэтыя працы зацікавілі выдаўцоў, аднак, надзіва, не зь беларускага, але польска-

га боку. Першы артыкул надрукавала Беластоцкае Навуковае Таварыства ў беларускамоўным "Навуковым зборніку", да якога кіраўніцтва БГКТ фактычна ня мела ніякога дачыненьня. Разгляд дзейнасьці школаў падчас нямецкай акупацыі, якая моцна палохала беларускіх дзеячоў у Беластоку, быў бязь цяжкасьцяў апублікаваны ў варшаўскім "Аглядзе гісторыі асьветы" (1976 г.), а апісаньне пасьляваенных пэрыпэтый гэтых школаў выдала асобнай брашурай Беластоцкая гарадзкая ўправа (1976 г).

Па магчымасьці спрыяў і галоўны рэдактар "Нівы" Юрка Валкавыцкі, які зьмяшчаў мае нарысы першапраходчыкаў беларускай справы на Беласточчыне, палемічныя і іншыя артыкулы. На жаль, з увагі на невялікі аб'ём штотыднёвіка, рэдакцыя магла карыстацца толькі кароткімі тэкстамі. У гэтым пляне большыя магчымасьці давалі "Беларускія календары" БГКТ, аднак іх зьмест пільна кантраляваўся чыноўнікамі міністэрства ўнутраных спраў, што ўплывала на завостраную аўтацэнзуру рэдактараў. З гэтай прычыны зьмешчаны ў гэтым выданьні нарыс "Непакорная Вера" двойчы адкідаўся і быў надрукаваны толькі ў 1990 г, калі ўжо не было цэнзуры і нішто не пагражала рэдактару. Затое ў календары на 1978 г. неспадзявана прайшоў артыкул пра беларускую школу ў Варшаве, якая працавала падчас нямецкай акупацыі, галоўным чынам дзякуючы таму, як прыдачліва ў ім распавядалася пра сувязі двух яе пэдагогаў з польскім камуністычным падпольлем.

З паловы 1970–х гадоў я заняўся вывучэньнем кнігавыдавецкай і палітычнай дзейнасьці Вацлава Іваноўскага — аднаго зь піянэраў беларускага нацыянальнага руху. На зацікаўленьне гэтым дзеячом паўплывалі перш за ўсё размовы з прафэсарам БДУ Сьцяпанам Александровічам, які бадай упершыню раскрыў мне яго ролю і значэньне ў працэсе змаганьня за дзяржаўнасьць Беларусі, за што абвінавачваўся ўладамі БССР ва ўсіх магчымых грахах і быў імі асуджаны на вечны нябыт у народнай памяці. Гэта інтрыгавала і будзіла жаданьне праверыць закіды супраць Іваноўскага. Пачаліся досьледы яго дзейнасьці ў Пецярбургу, Вільні, Варшаве і Менску — вывучаліся архіўная дакумэнтацыя, пэрыёдыкі, успаміны і рэляцыі сьведкаў, што дазволіла абгрунтаваць беспадстаўнасьць многіх хлусьлівых прыёмаў беларускіх савецкіх публіцыстаў.

Сабраная на працягу некалькіх гадоў дакумэнтацыя, праўда, дазваляла падрыхтаваць манаграфію аб жыцьці і дзейнасьці Вацлава Іваноўскага, аднак з увагі на стаўленьне да СССР яе публікацыя ў Польшчы ўяўлялася немагчымай. Таму давялося пайсьці альтэрнатыўным шляхам — апрацоўваць і публікаваць у навуковых пэрыёдыках паасобныя артыкулы, у якіх пад нэўтральнымі загалоўкамі разглядаліся асноўныя пытаньні яго дзейнасьці. Такім чынам, у 1980–х гг. у друку зьявіліся пяць грунтоўных распрацовак, якія без асаблівых цяжкасьцяў выкарыстоўваліся ў выданьнях Інстытуту Гісторыі і Інстытуту Славістыкі Польскай Акадэміі Навук, а таксама Беластоцкага Навуковага Таварыства. Першым быў артыкул "Беларускае пытаньне ў палітыцы лёнданскага лягеру", у якім разглядалася дзейнасьць Вацлава Іваноўскага ў гады другой сусьветнай вайны на фоне польска–беларускіх судачыненьняў. Спрыяў гэтай справе і тагачасны дырэктар Інстытуту Славістыкі прафэсар Васіль Белаказовіч, які ў інстытуцкіх выданьнях зьмясьціў тры артыкулы аб яго кнігавыдавецкай працы на пачатку XX ст.

Гэты альтэрнатыўны шлях аказаўся даволі ўдалым: пасьля вялікіх палітычных зьмен ва Ўсходняй Эўропе апублікаваныя раней распрацоўкі былі хутка дапоўненыя і скаліся ў даўно задуманую манаграфію "Вацлаў Іваноўскі і адраджэньне Беларусі", выдадзеную ў 1992 г. Інстытутам Гісторыі ПАН. Кніга выклікала жывое зацікаўленьне ў Польшчы і Беларусі, зьявіліся навуковыя рэцэнзіі, палемічныя агляды, асобныя яе разьдзелы перакладаліся і друкаваліся ў беларускіх часопісах "Нёман" (1992 г.), "Маладосць" (1994 г.) і "ARCHE" (1999 г.). Досьледы кнігавыдавецкага пытаньня працягваліся ў наступныя гады, а іх вынікам былі дзьве чарговыя працы: "Беларуская кніга ў міжваеннай Польшчы 1921—1939" і "Беларуская кніга пад нямецкім кантролем 1939—1944".

Пытаньні жыцьця ў гады нямецкай акупацыі цікавілі мяне, па сутнасьці, заўсёды, на што ўплывалі ўласныя назіраньні і дасьведчаньні ў Дукштах і Вільні. Вайна перш за ўсё прадухіліла далейшую дэпартацыю насельніцтва Літвы савецкімі ўладамі, і таму прыход немцаў успрымаўся з палёгкай. Хутка была створана літоўская адміністрацыя і самаахова, якая здолела даволі пасьпяхова забясьпечыць край перад разьвіцьцём савецкай партызаншчыны, і таму насельніцтва бадай не адчувала жорсткасьцяў партызанскай вайны. У той час я вучыўся ў пачатковай школе і гімназіі, не адчуваў фашысцкай ідэалягічнай індактрынацыі і ў сваім 12—15-гадовым узросьце амаль не цікавіўся вялікай палітыкай. Аб падзеях у Беларусі ведаў толькі тое, пра што паведамлялі ў віленскім штотыднёвіку "Беларускі Голас".

11 ліпеня 1944 г. у Дукшты вярнулася Чырвоная Армія, і ў той самы дзень адбыўся мітынг насельніцтва, на якім савецкі афіцэр расказаў нам аб нашых цярпеньнях падчас нямецкай акупацыі. "Зьвесткі" афіцэра, які лепш за нас саміх ведаў нашае становішча, пачаткова выклікалі зьдзіўленьне і кпіны, аднак неўзабаве іх сталі паўтараць франтавыя газэткі, якія распаўсюджваліся салдатамі. Успомніўся савецкі анэкдот пра агітатара, які славіў нейкае зьдзяйсьненьне ў абласным горадзе і на заўвагу аднаго з прысутных, што нічога падобнага той там ня бачыў, адказаў: "Ты лучше по городам не шляйся, а газеты читай!" Але трактоўка акупацыі была не да сьмеху. Загадзя былі падрыхтаваны прапагандысцкія тэзы, якія неўзабаве сталі абавязковымі для дасьледчыкаў акупацыі. Іх нязгодныя выказваньні маглі трактавацца як прапаганда фашызму, высоўвацца зь імі было рызыкоўна.

Бадай найбольш жорсткія прынцыпы асьвятленьня пытаньняў акупацыі былі ўстаноўлены ў Беларусі. Спатрэбілася нават прынятая ў лютым 1945 г. спэцыяльная рэзалюцыя ЦК КПБ аб перавыхаваньні грамадзтва ў духу савецкага патрыятызму і нянавісьці да нямецкіх акупантаў, якіх у той час ужо не было на беларускай зямлі. Згодна з такімі патрабаваньнямі, беларускія савецкія гісторыкі, публіцысты, пісьменьнікі і мастакі судзейнічалі стварэньню і пашырэньню мітаў аб гераічнай барацьбе народу зь нямецкімі захопнікамі, шальмавалі беларускіх палітычных дзеячоў, якія імкнуліся выкарыстаць умовы акупацыі для ўмацаваньня нацыянальных сіл і іх падрыхтоўкі да змаганьня за дзяржаўную незалежнасьць краіны. Замоўчвалася або фальсыфікавалася дзейнасьць беларускага школьніцтва, праца ўстановаў культуры, выдавецтваў, Саюзу Беларускай Моладзі. Выключную нянавісьць выклікаў галоўны рэжысэр гэтых мерапрыемстваў генэральны камісар Вільгельм Кубэ, якому прапагандысты надалі эпітэт "ката беларускага народу" і губляліся ў сваіх здагадках, колькі мільёнаў беларусаў імкнуўся ён зьнішчыць.

Прапагандысцкія прыёмы ня толькі выключалі магчымасьць альтэрнатыўных дасьледаў, але таксама ўзбуджалі пачуцьцё небясьпекі і страху сярод патэнцыйных невыгодных сьведкаў. Таму ім лепш было нічога ня ведаць, маўчаць, каб ня быць западозранымі ў калябарацыянізьме. З такім стаўленьнем я сутыкнуўся падчас падрыхтоўкі прац аб беларускіх школах, якія ў гады нямецкай акупацыі існавалі на Беласточчыне і ў Варшаве, — цяжка было ад іх настаўнікаў атрымаць неабходную інфармацыю. Маючы за сабой літоўскі досьвед, я проста не разумеў, у чым прычына такога стаўленьня. Калі восеньню 1944 г., г.зн. ужо ў савецкай Літве, вярнуўся ў сваю гімназію, вучылі нас пераважна тыя самыя настаўнікі, што і падчас акупацыі. Ніхто іх за гэта не рэпрэсаваў, а тагачасны прафэсар Віленскага ўнівэрсытэту Тадас Іванаўскас, дарэчы, брат Вацлава Іваноўскага, у 1946 г. атрымаў нават мэдаль "За доблестный труд в годы Великой Отечественной войны" за тое, што ў той цяжкі час рупіўся аб адукацыі літоўскай моладзі. А беларускія пэдагогі за тое самае гібелі ў савецкіх турмах і лягерох.

Літоўскі досьвед і звычайная лёгіка пераконвалі, што пытаньні нямецкай акупацыі можна разглядаць ня толькі праз прызму інтарэсаў Масквы, Бэрліна і Варшавы, але перш за ўсё з гледзішча беларускага нацыянальнага інтарэсу. Такое палажэньне адлюс-

троўвалі мае працы аб дзейнасьці Вацлава Іваноўскага, але, шырэйшы паглыблены экскурс у акупацыю адбыўся не па маёй ініцыятыве. У 1982 г. прафэсар Пётар Ласоўскі з Інстытуту Гісторыі ПАН пасьля азнаямленьня з маёй працай "Беларускае пытаньне ў палітыцы лёнданскага лягеру" прапанаваў мне падрыхтаваць доктарскую дысэртацыю аб асноўных пытаньнях акупацыі ў Беларусі. Я згадзіўся: некалькі гадоў працаваў у архівах, бібліятэках, ліставаўся з удзельнікамі і сьведкамі тагачасных падзей. Пасьля пасьпяховай абароны дысэртацыі ў 1986 г. даволі хутка надышлі выдавецкія прапановы. Кніга пад загалоўкам "Беларусь пад нямецкай акупацыяй" мела два выданьні ў Польшчы (1989 і 1993 г.) і адно ў Беларусі ў перакладзе Валерыі Ждановіч (1993 г.), а яе часопісны варыянт у перакладзе Ўладзімера Панады яшчэ ў 1991 г. надрукавала "Чырвоная Зьмена".

Кніга карысталася значным посьпехам, хутка зьнікала з польскіх і беларускіх кнігарняў, нават прадавалася па спэкуляцыйных цэнах, аднак новая трактоўка акупацыйнай гісторыі прыйшлася недаспадобы беларускім уладам і афіцыйным гісторыкам, стрымана паставіліся да яе і беларускія эмігранцкія публіцысты. Праўда, ніхто зь іх не аспрэчыў прыведзеных дакумэнтаваных фактаў, аднак, відаць, ім было выгадней трымацца ранейшых прыгожых мітаў.

Што ж, гісторыя быццам нічога не перадвызначае, але спрыяе мысьленьню, пошукам аптымальных рашэньняў на будучыню і, такім чынам, датыкае палітыкі. Аднак у сутыкненьні з палітыкай яна часта бясьсільная. Камэнтуючы ў лістападзе 1993 г. выпуск кнігі "Беларусь пад нямецкай акупацыяй", тагачасны прэм'ер ураду Рэспублікі Беларусь Вячаслаў Кебіч заявіў: "Гісторыя сказала сваё слова", — маўляў, яе перагляд непатрэбны.

Юры Туронак

Нацыянальная мова і сьвядомасьць

Па плёнах пазнаеце іх

Такой фразай закончыў А. Каваль свой артыкул, прысьвечаны 100–гадоваму юбілею Івана Луцкевіча (Ніва. 7 чэрвеня)[1]. Вывад лягічны, паколькі ацэнка дзейнасьці чалавека, які адыграў акрэсьленую гістарычную ролю, павінна абапірацца на вывучаных і несумненных актах — яго жыцьцёвых плёнах.

Чытаючы тыя фрагмэнты артыкула Каваля, якія датычаць пецярбурскага "Круга Беларускай Народнай Прасьветы" і Беларускай Сацыялістычнай Грамады, узьнікае пытаньне — а які быў канкрэтны ўдзел Івана Луцкевіча ў іх заснаваньні і дзейнасьці? Каваль абыходзіць гэтае пытаньне, агульна сьцьвярджаючы выдатную ролю юбіляра ў беларускім адраджэнскім руху данашаніўскай пары. Прыведзеныя прыклады яго дзейнасьці на заводзе Якабсона ў Менску падчас расейскай рэвалюцыі 1905 г. (палкая прамова, сыгнал забастоўкі), вядома, не вычэрпваюць пытаньня.

Гэтая справа істотная ня толькі для вывучэньня жыцьцяпісу Івана Луцкевіча, але і ў шырэйшым гістарычным кантэксьце. Што нам па сутнасьці вядома пра пецярбурскі "Круг" ці БСГ, пра іх заснавальнікаў, пра напрамкі і вынікі іх дзейнасьці? Словам, пра ўсё тое, што трапна акрэсьліў Каваль як пачатак палітычнай самаарганізацыі дэмакратычных сіл Беларусі на грунце барацьбы супроць нацыянальнага і сацыяльна–палітычнага прыгнёту. Усе кажуць гатовымі фармулёўкамі, рознакаляровымі цэтлікамі, якіх ня толькі ацэньні, але і істота мяняецца ў залежнасьці ад патрабаваньняў часу, у якім мы жывем. А дзе факты, канкрэты?

Вось толькі адзін прыклад з гісторыі БСГ. Вядомы публіцыст Антон Луцкевіч найбольш угрунтаваў погляд, што папярэдніца БСГ — Беларуская Рэвалюцыйная Грамада — паўстала ў Пецярбургу *ўвосень 1903 г.* Гэты погляд у наш час паўтараецца менскімі гісторыкамі (гл. Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, пяцітомнік "Гісторыя БССР" і іншыя). Тым часам гектаграфічны часопіс "Свабода", які быў адбіты ў двары Іваноўскіх — у Лябёдцы на Лідчыне, — быў выдадзены Беларускай Рэвалюцыйнай Грамадой *у пачатку студзеня 1903 г.*, а падрыхтаваны ў Пецярбургу ў канцы 1902 г.! Але ж і БРГ не была першай. Яе папярэдніца — Беларуская Рэвалюцыйная Партыя — нарадзілася ў Пецярбургу не пазьней *чэрвеня 1902 г.*, калі яшчэ братоў Луцкевічаў там увогуле не было.

Цяжка паверыць, каб Антон Луцкевіч ня ведаў аб тым, што першая беларуская палітычная партыя арганізавалася *на год зь лішнім раней*, чым падаваў ён неаднаразова ў сваіх публікацыях. Можна затое зразумець матыў гэтай "дробязі", якая чамусьці засталася па–за ўвагай гісторыкаў: яны жадалі стварыць у асобе брата Івана "патрыярха" адраджэнскага руху, яго пачынальніка, што патрабавала адпаведнай падтасоўкі датаў узьнікненьня самой Грамады.

Гэтай асноўнай тэндэнцыі падпарадкоўваліся некаторыя дадзеныя ў біяграфіі Івана Луцкевіча, якія пасьля яго сьмерці падаваў Антон у сваіх брашурах (Памяці Івана Луцкевіча. Вільня 1920 г.; За 25 гадоў. Вільня 1928 г.) і шматлікіх артыкулах. Яны былі па сутнасьці адзінай крыніцай інфармацыі, у выніку чаго адыгралі вырашальную ролю ў

[1] Маецца на ўвазе артыкул Алеся Каваля (Аляксандра Каўкі) "Іван Луцкевіч. 1881—1919". Акрамя Туронка, у дыскусіі выступіла Аляксандра Бэргман, якая 26 ліпеня 1981 г. надрукавала артыкул "Спрэчка пра Івана Луцкевіча", дзе крытыкавала пэўныя выказваньні як Каваля, так і Туронка. — *А.П.*

фармаваньні нашых ведаў пра Івана Луцкевіча. Некаторыя з гэтых дадзеных зь несумненна добрай верай паўтараў і Каваль. Вось прыклады:

1. Артыкул Івана Луцкевіча ў часопісе "Ukrainische Rundschau" (Вена 1904 г.), які выдаваўся д–рам Кушнірам... Праверка ў бібліятэцы Варшаўскага ўнівэрсытэту паказала, што такі часопіс сапраўды выходзіў у Вене, але толькі з 1906 году, а ў 1904 г. выдаваўся "Rutenische Rundschau" і да таго ня Кушнірам, а Яворскім, Косам і Сембратовічам[2]. Ужо гэта падрывае верагоднасьць інфармацыі, што аўтарам адзінага артыкула пра Беларусь "Totgesagte Weissrussland" (прыгавораная да сьмерці Беларусь), які паявіўся ў № 19 (1904 г.) за подпісам Г. Палісандэра, можна лічыць Івана Луцкевіча (наўрад ці гэты энтузіяст беларускай справы даў бы такі пэсымістычны загаловак...).

2. Іван Луцкевіч сабраў значную колькасьць экспанатаў для пазьнейшага Беларускага музэю ў Вільні, але гэтага яшчэ мала, каб ацэньваць яго як "дасьледчыка матэрыяльнай і духоўнай культуры старажытнай Беларусі". Наколькі вядома, не паявілася ў друку ніводная яго навуковая распрацоўка. Ня быў Луцкевіч і адкрывальнікам кітабаў — яны ўжо ў палове XIX ст. вывучаліся прафэсарам Пецярбурскага ўнівэрсытэту А. Мухлінскім[3].

3. Не магу пагадзіцца зь сцьвярджэньнем, што Іван Луцкевіч адыграў вырашальную ролю ў заснаваньні "Нашай долі", якую пачалі выдаваць Францішак Умястоўскі і Іван Тукеркес[4]. Праўда, браты Луцкевічы імкнуліся пераняць кіраўніцтва газэтай і, калі гэта не ўдалося, пасьля выпуску чацьвертага нумару "адкалоліся" і пачалі выдаваць "Нашу Ніву". Факт, што ў падзагалоўку "Нашай Нівы" падавалася "*першая* беларуская газэта з рысункамі", у гэтым кантэксьце вельмі сымптаматычны: ён адлюстроўваў тэндэнцыю непрызнаваньня ў той час "не сваёй" "Нашай долі".

На заканчэньне некалькі слоў аб "эвалюцыі" Івана Луцкевіча і грамадаўцаў, якія, паводле Каваля, пасьля паразы рэвалюцыі 1905 г. адыйшлі ад актыўнай рэвалюцыйнай барацьбы на асьветніцкія пазыцыі. Погляд, вядома, ня новы: ужо ў 20–я гады менавіта так ацэньвалі нашаніўцаў камуністы і эсэры. Варта, аднак, на гэтую "эвалюцыю" глянуць ня толькі зь левых пазыцый, але і з правых. Вось як характарызаваў нашаніўцаў *сучасьнік* Рамуальд Зямкевіч у лісьце да Аляксандра Ельскага ад 21 сакавіка 1909 г.:

> Niektorych pisarzy białoruskich i prowodyrów ruchu znam osobiście. Nie podobają mi się jedynie z tego względu, iż *zamiast pracować nad oświatą ludu, prowadzą propagandę socyalistyczną,*

---

[1] "Ukrainische Rundschau" ("Украінскі агляд") — украінскі штомесячны часопіс, які выходзіў у 1903—1915 г. (да 1905 г. называўся "Ruthenische Revue") на нямецкай мове ў Вене. Прызначаўся для іншаземных дыпляматычных і культурніцкіх колаў. Выдаўцом часопіса лічыўся В. Яворскі, а галоўным рэдактарам — В. Кушнір

Яворскі Васіль (1854—1926) — украінскі грамадзка–палітычны дзяяч з Галіччыны, паводле адукацыі юрыст, у 1900—1907 г. дэпутат аўстрыйскага парлямэнту.

Сембратовіч Раман (1875—1905) — украінскі грамадзка–палітычны дзяяч з Галіччыны, журналіст і публіцыст, інфарматар нямецкага грамадзтва пра ўкраінскія справы. Сябра студэнцкага таварыства "Січ" у Вене. — *Алесь Пашкевіч (далей А.П.).*

[3] Прафэсар турэцкае мовы і пісьменства Пецярбурскага ўнівэрсытэту Аляксандар Восіпавіч Мухлінскі (1808—1877) у 1857 г. выдаў працу "Исследование о происхождении и состоянии литовских татар". — *А.П.*

[4] У дадзеным выпадку Аўтар выкарыстоўвае зьвесткі, зьмешчаныя ўва ўспамінах Ф. Умястоўскага "Аб «Нашай Долі»", зьмешчаных у газэце "Беларускія ведамасьці" за 26 верасьня 1921 г. Між тым, да гэтай інфармацыі таксама належыць ставіцца крытычна, хоць бы з увагі на наступную адносна невялікую ў параўнаньні з братамі Луцкевічамі заангажаванасьць у беларускі рух Францішка Ўмястоўскага і асабліва Івана Тукеркеса. — *А.П.*

rozbudzając walkę klasową (падкрэсьлена намі. — *Ю.Т.*). Perswazje i spory z nimi na nic się zdały, próbowalem tego w Wilnie, lecz na próżno[5].

Як бачым, тое, што ў нашаніўцаў сёньня ацэньваецца часам як "белае", калісь выглядала аж надта "чырвоным". Паўтараецца старая праўда, што тэорыя адноснасьці можа прымяняцца ня толькі ў фізыцы...

Ушаноўваючы памяць выдатнага сына Беларусі Івана Луцкевіча з нагоды 100–годзьдзя з дня яго нараджэньня, з жалем даводзіцца заўважыць, што гэты юбілей мы адзначаем амаль з пустымі рукамі. Не дасьледаваныя найбольш элемэнтарныя факты яго біяграфіі, не праверабы недакладныя і не заўсёды аб'ектыўныя зьвесткі, апублікаваныя яго братам Антонам. Як піша Антон Луцкевіч, восеньню 1902 г. Іван паступіў у Пецярбурскі Археалягічны інстытут, які закончыў на працягу двух (!) гадоў. Паводле Беларускай Савецкай Энцыкляпэдыі, археалёгію закончыў ён у Маскве, а А. Бэргман[6] падае, што ў Вене. Сапраўды, можна было б пасьмяяцца, калі б не было так сумна... Час, вялікі час выправіць памылкі і паказаць нашчадкам праўдзівую постаць Івана Луцкевіча і верагодны яго жыцьцёвы плён.

Друкуецца паводле: Ніва. 1981. 21 чэрвеня.

[5] Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie, Zespół Prozorów i Jelskich. Materiały dot. literatury białoruskiej.

[6] Бэргман Аляксандра (1906—2005) — польскі гісторык, у міжваенны пэрыяд актыўная дзяячка Камуністычнае партыі Заходняй Беларусі, пасьля вайны — аўтарка шэрагу навуковых прац па гісторыі беларускага нацыянальнага і рэвалюцыйнага руху. — *А.П.*

Па сьлядох “Свабоды”

Па-рознаму склаліся лёсы беларускіх пазацэнзурных пэрыёдыкаў другой паловы XIX і пачатку XX ст. Некаторыя зь іх, як, напрыклад, “Мужыцкая праўда” (1862) і “Гомон” (1884), дачакаліся шматлікіх распрацовак і, тым ня менш, далей прыцягваюць увагу дасьледчыкаў.

У гэтых адносінах рашуча не шанцавала “Свабодзе”, задуманай як падпольны рэвалюцыйны часопіс. На гэта былі істотныя прычыны: па-першае, наколькі вядома, часопіс не распаўсюджваўся і, па-другое, да гэтай пары ня знойдзены яго поўны тэкст. Усё ж само зьяўленьне “Свабоды” было цікавай і немалаважнай падзеяй у беларускім руху, у сувязі з чым зьвесткі пра яе неаднаразова паяўляліся як у даваенных, так і пасьляваенных выданьнях. Пры гэтым не абышлося і без кантравэрсіяў, між іншым, адносна даты выпуску.

Першы па гэтым пытаньні выказаўся Максім Гарэцкі, які ў сваёй “Гісторыі беларускае літаратуры” (1920. С. 206) падаў, што “Свабода” выйшла ў *1903 годзе*. Аляксандар Бурбіс крыху пазьней пісаў, што яна паўстала ў *1902 годзе* (Вестник Наркомпрос БССР. 1921. № 1), а Антон Луцкевіч ня раз заяўляў, што яе выданьне адбылося ў *1905 годзе* (гл. яго. За дваццаць пяць гадоў. 1903—1928. С. 16; Народная справа. 1926. № 20). Сам жа выдавец “Свабоды”, Вацлаў Іваноўскі, у сваім лісьце Адаму Станкевічу ад 16 лістапада 1934 г. сьцьвердзіў, што яна паўстала *зімой 1899/1900 году*, на што Станкевіч заўважыў, што, на яго думку, адбылося гэта “*якімі двума гадамі пазьней*” (гл. яго “Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня”. 1934. С. 73). На гэтую інфармацыю Іваноўскага абапіраюцца сучасныя дасьледчыкі і публіцысты (гл.: История белорусской дооктябрьской литературы. Минск, 1977. С. 353).

Як бачым, атрымаўся значны разнабой, які магла вырашыць адпаведная першакрынічная інфармацыя. Вядома, такую інфармацыю магла б даць сама “Свабода”, аднак яе пошукі ў Польшчы і СССР пакуль што не далі жаданага выніку. Ці была яшчэ іншая магчымасьць адшукаць загадкавую “Свабоду” або хаця б дакладныя зьвесткі пра яе?

Такую магчымасьць падказваў Іваноўскі, які ў цытаваным лісьце Станкевічу адзначыў, што адбіты на цыклястылі (гектографе) у двары яго бацькоў у Лябёдцы на Лідчыне тыраж “Свабоды” 200 экзэмпляраў ён адвёз неадкладна ў Варшаву, на кватэру свайго брата Юр’я, акуль мелі яе распаўсюджваць варшаўскія беларусы. На жаль, у сувязі з арыштам Юр’я на яго кватэры адбыўся ператрус і амаль увесь дастаўлены зь Лябёдкі тыраж дастаўся царскай паліцыі.

Гэтая інфармацыя сугеравала мэтазгоднасьць пошукаў у актах варшаўскай ахранкі. Тут нам крыху пашанцавала. У Галоўным Архіве Даўніх Актаў былі знойдзены матэрыялы Пракурора Варшаўскай Судовай Палаты, а ў іх ліку — аб’ёмістая справа Юр’я Іваноўскага (сыгнатура 3107). Як сьведчаць дакумэнты, ён быў арыштаваны ў ноч з 14 на 15 студзеня 1903 г. (новага стылю, прынятага ў польскіх губэрнях). Адначасова на яго кватэры быў учынены ператрус і складзены пратакол канфіскаваных рэчавых доказаў яго “праступнай дзейнасьці”. У іх ліку ў пратаколе значыўся... *№ 1 за 1903 год революционного журнала на белорусском языке “Свабода”*!

Такім чынам былі атрыманы першыя дакумэнтальныя зьвесткі пра “Свабоду”, якія дазволілі дакладна акрэсьліць час яе выпуску. Супастаўляючы гэтыя зьвесткі зь літаратурнымі дадзенымі, у прыватнасьці, з цытаванай кніжкай Станкевіча, можам рэканструяваць ход падзей, якія папярэдзілі паўстаньне “Свабоды”.

Задума стварэньня нелегальнага і незалежнага беларускага выдавецтва паўстала ў студэнта Пецярбурскага тэхналягічнага інстытуту В. Іваноўскага не пазьней вясны 1902 г. Першым крокам у ажыцьцяўленьні гэтага праекту было здабыцьцё апарату для размножваньня тэкстаў, на што ён прызначыў увесь свой заробак зь летняй студэнцкай практыкі. Восеньню 1902 г. гэты апарат (цыклястыль) быў куплены нелегальна, у чым Іваноўскаму дапамог Мечыслаў Міхаловіч — тагачасны дзяяч ППС у Пецярбургу і пазьнейшы прафэсар і рэктар Варшаўскага ўнівэрсытэту[1].

Восеньню гэтага ж году ў Пецярбург прыбылі некалькі студэнтаў–першакурсьнікаў, якія неўзабаве ўключыліся ў падрыхтоўку "Свабоды". У іх ліку Алёйзія Пашкевічанка (Цётка), якая дэбютавала менавіта на старонках гэтага часопіса (верш "Мужыцкая доля"). Паводле Іваноўскага, у рэдакцыйнай працы ўдзельнічаў таксама Іван Луцкевіч, чаго, аднак, не пацьвердзіў Антон Луцкевіч ні ў воднай сваёй публікацыі. У гэтай справе Іваноўскаму дапамагаў яшчэ і Лявон Малецкі. Рукапісныя матрыцы (кірыліцай) падрыхтавалі Рамуальд Мілер і Вінцук Валейка. Тэхнічная работа была выканана ў Лябёдцы ў часе канікулаў у канцы сьнежня 1902 году па старым стылі. Тут адбіваньнем "Свабоды" займаліся Вацлаў і Тадас Іваноўскія і Антон Валейка з братам.

Вернемся яшчэ да лёсу гэтага часопіса, паколькі пададзеную вышэй вэрсію аб яго канфіскацыі нельга лічыць здавальняючай. Справа ў тым, што, як паказвае пратаколператрусу, на кватэры Юр'я Іваноўскага быў знойдзены *не амаль увесь тыраж "Свабоды", а толькі адзін яе экзэмпляр*. У гэтым не было сумневу: пратакол быў надта падрабязны, у ім падавалася нават колькасьць чыстых паштовак.

Што ж тады сталася з "Свабодай", куды падзеўся яе наклад? Няўжо Юры Іваноўскі пасьпеў перадаць яго ў адпаведныя рукі, пакінуўшы сабе толькі адзін адбітак? Думаю, што не. У наступныя гады абодва браты былі ж у цесным кантакце і аб такой перадачы Вацлаў быў бы паінфармаваны.

Выглядае, што прэзэнтаваная В. Іваноўскім вэрсія аб канфіскацыі ў Варшаве не адпавядала сапраўднасьці. Да таго гэта не была яго адзіная вэрсія. Так, напрыклад, Луцкевіч, спасылаючыся на расказ Іваноўскага, пісаў у сваіх успамінах, што *ўвесь тыраж "Свабоды" быў зьнішчаны яшчэ ў Лябёдцы*, прычынай чаго было набліжэньне паліцыі. Аднак і гэтая вэрсія малапераканаўчая, паколькі паліцыя канфіскавала б і цыклястыль, якім карыстацца без дазволу ўладаў было забаронена. Тым часам апарат быў спакойна адпраўлены ў Пецярбург і працягваў служыць беларускай справе (у 1903—1904 гг. на ім адбіваліся "Калядная" і "Велікодная пісанкі").

Такім чынам, паколькі не было канфіскацыі ў Варшаве і налёту паліцыі на двор у Лябёдцы, можна меркаваць, што "Свабода" была зьнішчана без удзелу паліцыі. Ведаем, што адбіты тыраж знаходзіўся ў руках Вацлава Іваноўскага, аднак, неверагодна, што ён сам зьнішчыў плён сваёй і таварышавай працы. Праўдападобна, у справу ўмяшаўся бацька, правадзейны стацкі саветнік, які на Каляды прыехаў зь Пецярбургу ў Лябёдку і прытармазіў "рэвалюцыйныя парывы" 22–гадовага сына.

Аб гэтым дазваляе меркаваць яшчэ адна вэрсія, апублікаваная ў 1921 годзе Бурбісам, вэрсія тонкая і вымоўная, паводле якой ужо толькі "*пры паліцэйскіх варунках* усё выданьне прыйшлося зьнішчыць". Так ці інакш, справа закончылася няўдачай, пасьля чаго трэба было неяк растлумачыць таварышам факт зьнікненьня "Свабоды". Пры гэтым Іваноўскі быў непасьлядоўны і, як бачым, даваў штораз іншае тлумачэньне.

Узьнікае пытаньне, чаму гэты твор пецярбурскіх студэнтаў аказаўся такім небясьпечным, што спатрэбілася яго зьнішчэньне. Поўны адказ на гэтае пытаньне можа даць толькі дэталёвае знаёмства са зьместам "Свабоды", калі камусь пашчасьціць яе адшукаць. З актаў справы Юр'я Іваноўскага яна зьнікла. Можна думаць, што падзяліла лёс

[1] Міхаловіч Мечыслаў (1876—1965) — польскі палітычны і грамадзкі дзяяч, лекар. Рэктарам Варшаўскага ўнівэрсытэту быў у 1930—1931 гг. — *А.П.*

іншых канфіскаваных прадметаў, згодна з рэзалюцыяй начальніка Варшаўскага жандарскага ўпраўленьня генэрал–маёра Чаркасава ад 14 чэрвеня 1903 г.: "Вещественные доказательства уничтожить".

Усё ж пэўную характарыстыку зьместу часопіса прывесьці можна. Так, напрыклад, з кніжкі Станкевіча ведаем, што на яго васьмі старонках вялікага (канцылярскага) фармату быў зьмешчаны адзін артыкул на палітычную тэму і другі аб асобнасьці беларускага народу ў параўнаньні з суседнімі народамі. Іх зьмест нам невядомы. Вядомы затое ўспомнены верш Цёткі "Мужыцкая доля", які не вызначаўся выразна рэвалюцыйным ці антыўрадавым характарам і неўзабаве быў перадрукаваны ў "Каляднай пісанцы на 1904 год".

Істотнае значэньне для акрэсьленьня ідэйнай накіраванасьці "Свабоды" мае чарговы верш зь яе першага нумару, знойдзены нядаўна ў фондзе лёнданскага архіву ППС, які захоўваецца ў Цэнтральным Архіве ЦК ПАРП у Варшаве (сыгнатура 305/III/55 pt. 12). Гэта верш Сыракомлі "Добрыя весьці", які пасьля перапрацоўкі рэдактарамі "Свабоды" атрымаў цалкам іншы сэнс, дастасаваны да новых умоваў рэвалюцыйнай барацьбы. Перапрацоўка верша адбывалася ў двух напрамках:

— па–першае — зьмены ўсіх антырускіх акцэнтаў. Так, напрыклад, такія радкі Сыракомлі, як "лягчэй будзе сэрцу, як згінець маскаль", або "ня прыйдзе вораг з маскоўскага краю", атрымалі ў "Свабодзе" наступнае гучаньне: "лягчэй будзе сэрцу, як згіне наш цар" і "ня прыйдзе вораг з чужога краю".

— па–другое — прапагандаваная Сыракомлем клясавая згода і супрацоўніцтва паміж шляхтай і сялянствам у "Свабодзе" замяняецца ідэяй рабоча–сялянскай салідарнасьці. Вось характэрны прыклад перапрацоўкі:

Сыракомля:	**"Свабода":**
Мужык з панамі стаіць за–пан–браце,	Мужык з рабочым стаіць за панбраце
Рука за руку, а грудзь за грудзь.	Рука за руку, грудзь за грудзь.
Пяром на карце, ды сахой на ніве	Рукой у фабрыцы, сахой на ніве
Адзін другому роўнасьць засьцярог...	Адзін другому вольнасьць засьцярог...

Цікава і тое, што перапрацаваны верш "Добрыя весьці" праектаваўся выдаўцамі "Свабоды" як лятучка для распаўсюджваньня сярод беларускага насельніцтва. На гэта паказвае наступны дапісак на архіўным дакумэнце: "Wicek prosi o wydrukowanie 2000 egz"[2]. "Wicek" — гэта псэўданім Яна Руткевіча — чальца Цэнтральнага Рабочага Камітэту ППС. Аднак лятучка не была надрукавана, а тэкст верша вярнуўся ў Варшаву. Дзякуючы гэтаму, у наш час ён ёсьць цікавым і рэдкім сьведчаньнем аб "Свабодзе".

Урэшце, некалькі слоў да пытаньня, якая арганізацыя выдала гэты адзіны нумар "Свабоды". І тут выказваліся неаднолькавыя погляды. Бурбіс і Станкевіч лічылі, што яе выдаў пецярбурскі Круг Беларускай Народнай Прасьветы, а Гарэцкі і Луцкевіч — што яна была органам Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады (БРГ). Другі погляд выказваў і аўтар гэтых радкоў.

Аднак знойдзены архіўны дакумэнт ("Добрыя весьці") змушае перагледзець усе гэтыя выказваньні. На ім зьнізу знаходзіцца наступны дапісак: "З № 1 "Свабоды" Б.П.Р.". Гэта ініцыялы *Беларускай Рэвалюцыйнай Партыі — папярэдніцы БРГ*. Да гэтай пары было вядома, што БПР у 1902 годзе выдала ў Пецярбургу толькі адну гектаграфаваную адозву "Да інтэлігенцыі". Сёньня маем дакумэнтальную падставу для сьцьвярджэньня, што другім яе выданьнем была "Свабода".

Друкуецца паводле: Ніва. 1981. 25 кастрычніка, 1 лістапада.

[2] "Віцэк просіць надрукаваць 2000 паасобнікаў" (пол.). — *А.П.*

Удзел М. Фальскага ў беларускім выдавецкім руху

Ува ўмовах існых да 1905 г. забаронаў і абмежаваньняў царскіх уладаў магчымасьці выданьня беларускіх кніг на тэрыторыі Расейскай імпэрыі былі вельмі невялікія. Таму энтузіясты гэтай справы, як, напрыклад, Францішак Багушэвіч, Аляксандар Ельскі, Напалеон Чарноцкі, Мар'ян Абрамовіч і іншыя, а таксама дзеячы Польскай Сацыялістычнай Партыі выкарыстоўвалі магчымасьці друку за мяжой, найперш у Тыльзыце, Кракаве, Львове і Лёндане.

У 1903 г. нелегальную беларускую выдавецкую дзейнасьць за мяжой (у Кракаве) распачала тройца студэнтаў, у якую ўваходзілі: Мар'ян Фальскі з Політэхнічнага інстытуту ў Варшаве, Вацлаў Іваноўскі з Тэхналягічнага інстытуту ў Пецярбургу і Сьцяпан Багушэўскі зь Ягелонскага ўнівэрсытэту ў Кракаве. Праект такога прадпрыемства ўзьнік, мабыць, улетку 1903 г. у выніку дамоўленасьці Іваноўскага з Багушэўскім, які той парой праводзіў вакацыі ў свайго швагра д–ра Амброжага Кастравіцкага ў Лідзе, паблізу якой знаходзіўся маёнтак Іваноўскіх у Лябёдцы. Багушэўскі паходзіў зь Меншчыны і ўдзельнічаў у беларускім руху, між іншым, у Беларускай Сацыялістычнай Грамадзе і Беларусім Сялянскім Саюзе. Ён ведаў Фальскага з той пары, калі яны разам вучыліся ў Менскай гімназіі, і бадай у найбольшай ступені спрычыніўся да яго заангажаваньня ў беларускую выдавецкую справу.

Удзел Фальскага ў гэтым прадпрыемстве палягаў у падрыхтоўцы да друку пераважнай часткі заплянаваных матэрыялаў. У канцы 1903 г. ён пераклаў на беларускую мову "Янку Музыканта" Генрыка Сянкевіча, "Да свайго Бога" Стэфана Жаромскага і апавяданьне неўстаноўленага аўтара "Ведзьма", узяўшы псэўданім Янка Сваяк. Апрача гэтага, ён падрыхтаваў тэкст вялікай адозвы "Царская гаспадарка", выкарыстоўваючы для гэтай мэты выдадзеныя ППС у Лёндане беларускія агітацыйныя брашуры, перш за ўсё беларускі пераклад "Ojca Szymona", які выйшаў пад назвай "Гуторка об тым, куды мужыцкіе грошы ідуць".

Істотную дапамогу ў рэалізацыі гэтага праекту аказала славутая піяністка, а пасьля і залвіца Іваноўскага, Катажына Ячыноўская, якая ахвяравала неабходныя фінансавыя сродкі, каб пакрыць выдаткі на друк. У пачатку студзеня 1904 г. атрыманыя такім чынам грошы і рукапісы Фальскага і іншых Багушэўскі прывёз у Кракаў, дзе яны былі выдрукаваныя ў друкарні Ўладзіслава Тэадарчука ў сакавіку і красавіку 1904 г. Для поўнай рэалізацыі выдавецкай праграмы не хапіла толькі апавяданьня Жаромскага "Да свайго Бога", што, мабыць, абумовілі тэхнічныя прычыны. Яно было закароткае і не надавался да друку ў выглядзе асобнай брашуры, якая б налічвала толькі дзьве старонкі. Аднак гэтае апавяданьне было троху пазьней выдадзенае ў Вільні літаграфічным спосабам. Адзіны ў Польшчы асобнік знаходзіцца ў Галоўным архіве старадаўніх актаў у Варшаве і калекцыі Прозараў і Ельскіх (справа 140–2), на якім відаць уласнаручную дапіску Фальскага "litogr. Wilno 1904".

Варта заўважыць, што пад адозвай "Царская гаспадарка" не фігураваў ні псэўданім аўтара, ні таксама подпіс нейкай арганізацыі. У міжваенную пару гэтую адозву намагаліся зьвязаць зь дзейнасьцю пэўнай партыі. Акадэмік Я. Карскі цьвердзіў, што яе выдала Беларуская Сацыялістычная Грамада, а Аляксандар Бурбіс і Антон Луцкевіч — што Сацыялістычная Партыя Белай Русі[1]. Выглядае на тое, што яна не была вядомая такса-

[1] Як праклямацыя СПБР гэты дакумэнт апублікаваны ў кнізе "Сацыялістычны рух на Беларусі ў праклямацыях 1905 году". Менск, 1927. — *Анатоль Сідарэвіч (далей А.С.).*

ма Леану Васілеўскаму, аднаму з найлепшых знаўцаў ППС у нацыянальных пытаньнях, які, зрэшты, у 1904 г. жыў у Кракаве. (пар. яго. Litwa i Białoruś. Kraków, 1912). Гэтыя акалічнасьці паказваюць, што ініцыяваная Іваноўскім, Фальскім і Багушэўскім выдавецкая актыўнасьць была цалкам самайстойная і не кіравалася або інсьпіравался ні ППС, ні БСГ. З Кракава гэтыя выданьні паступова перавозілі празь зялёную мяжу ў Варшаву, а адтуль на Беларусь, дзе іх распаўсюджвалі як дзеячы ППС, так і БСГ, а таксама энтузіясты, якія не належалі да ніводнай з гэтых партыяў.

Увосень 1904 г. пасьля пачатку расейска–японскай вайны група сяброў ППС у Варшаве і Горадні, да якой належалі ў тым ліку Мар'ян Фальскі, Францішак Завадзкі і Станіслаў Трускоўскі, пачала выдаваць адозвы на беларускай мове. Згодна з прынятай у чэрвені 1903 г. пастановай Цэнтральнага рабочага камітэту ППС аб невыдаваньні пад эгідай гэтай партыі прапагандысцкай літаратуры на беларускай мове, адозвы былі падпісаныя імем фікцыйнай Сацыялістычнай Партыі Белай Русі. У цэнтральным архіве ЦК ПАРП захаваліся арыгіналы пяці гэтых адозваў. Гэта "Братцы мужыкі", "Прызыўные"[2] і "Якая карысьць народу з выборнаго правіцельства" (кастрычнік 1905).

Варта наапошку паказаць на пэўную ролю Фальскага ў падрыхтоўцы практычна першага беларускага лемантара, за напісаньне якога — дзеля нястачы адпаведных філёлягаў — узяўся ў канцы 1904 г. інжынэр–хімік Іваноўскі. Згодна з вусным паведамленьнем, атрыманым у траўні 1979 г. ад Марыі Арнольдавай зь сям'і плоцкіх Альтбэргаў, у якіх Іваноўскі быў частым госьцем, ён тады праходзіў пасьлядыплёмную практыку ў цукроўні Баравічкі і разам з Фальскім удзельнічаў у напісаньні гэтага лемантара. Цяжка сказаць, у чым палягаў гэты суўдзел, бо і Фальскі ня быў тады філёлягам, а інжынэрам. Аднак як узор для пераймальня быў узяты лемантар Промыка, па якім, мабыць, абодва яны і вучыліся чытаць і пісаць.

Удзел Фальскага ў беларускай дзейнасьці доўжыўся менш за два гады і — як пісаў Фальскі ў сваіх успамінах — быў адно яго другарадным грамадзкім інтарэсам. Аднак яго гэтая дзейнасьць пакінула цямкі сьлед у гісторыі беларускага пісьменства.

Крыніцы:

1) Архіў Ягелонскага ўнівэрсытэту, справа S II 797: Акты беларускага акадэмічнага гуртка ў Кракаве (1904 г.).

2) Цэнтральны Архіў ЦК ПАРП, справа 305/III/3 вопіс 3: Пратакол канфэрэнцыі ЦРК ППС ад 17 сьнежня 1903 г., а таксама 305/V/14 вопіс 12: Падаўстрыйская Польшча: адозвы 1892—1918.

3) Галоўны архіў старадаўніх актаў у Варшаве, калекцыя Празораў і Ельскіх, справа 140–2.

4) Вуснае паведамленьне Марыі Арнольдавай у траўні 1979 г.

5) Александровіч С. Пуцявіны роднага слова. Мінск, 1971.

Пераклад зроблены паводле: Przegląd Historyczno–Oświatowy. 1982. № 3—4.

[2] Гэтая ўлётка таксама апублікаваная ў кн.: Сацыялістычны рух на Беларусі ў праклямацыях 1905 году. Менск, 1927. — *А.С.*

Вакол абставінаў публікацыі "Дзядзькі Антона"

У 1892 годзе беларускай моваю зьявілася ананімная брашура, поўная назва якой гучала: "Дзядзька Антон або Гутарка аб усім чыста што баліць, а чаму баліць — ня ведаім". Брашура была надрукаваная лацінскім шрыфтам і зьмяшчала 46 старонак невялікага фармату (16°). На тытульнай бачыне напісана, што яна была выдадзеная ў Вільні ў друкарні Марыі Красоўскай, а на адвароце была пастаўленая прыпіска "Дозволено цензурою. Вильна, 10 ноября 1891 г." Насамрэч, "Дзядзька Антон" быў пераробкаю польскай агітацыйнай брашуры "Ojciec Szymon"[1], прызначанай да змаганьня з царызмам і прапаганды сацыялістычных ідэяў у Беларусі. Пададзеныя выдаўцом зьвесткі аб месцы выданьня, друкарні й цэнзуры былі тыповай канспірацыйнай выдумкай і мелі мэтаю зрабіць выгляд, што выданьне легальнае і тым самым пазбавіць ад магчымых клопатаў яго распаўсюднікаў і чытачоў. Адначасова ў той самай друкарні зьявіліся дзьве нелегальныя брашуры на польскай мове — "Kilka uwag" і "Jan Skiba"[2].

Першыя згадкі пра зьяўленьне гэтых брашураў, зьмешчаныя ў лёнданскім „Przedświcie"[3], з зразумелых прычынаў не зьмяшчалі ніякіх падрабязнасьцяў, якія маглі б указваць на сапраўднае месца іх выданьня ці на выдаўца[4].

Толькі ў 1910 годзе сацыялістычны дзяяч Фэлікс Пэрль[5] прызнаўся, што яны былі выдадзеныя ня ў Вільні, а ў Тыльзыце, але, дарма што мінулася шмат гадоў, ува ўмовах царскага рэжыму ён не наважыўся раскрыць асобу выдаўца, пакідаючы толькі ягоныя ініцыялы — М.А.[6].

Прозьвішча выдаўца, а быў гэта жыхар Масквы й былы студэнт Маскоўскага ўнівэрсытэту 22-гадовы Мар'ян Абрамовіч[7], было раскрытае толькі ў міжваенныя гады Напалеонам Чарноцкім, Людвікам Абрамовічам[8] і згаданым Пэрлем[9].

---

[1] Гэтая польская народніцкая брашура выйшла ў сьвет у 1878 г. у двух варыянтах пад назвамі: "Opowiadanie starego gospodarza" ("Апавяданьне старога гаспадара") і "Opowiadanie o biedzie" ("Апавяданьне пра бяду"). Толькі ў пазьнейшыя часы брашура стала называцца "Ojciec Szymon". Яе аўтарам лічыцца вядомы польскі сацыяліст Шымон Дыкштэйн (1858—1884). — *А.П.*

[2] Аўтарам другой брашуры лічыцца вядомы польскі філёзаф і палітычны дзяяч Эдвард Абрамоўскі (1868—1918). — *А.П.*

[3] "Przedświt" — сацыялістычны часопіс на польскай мове, які выдаваўся ў 1881—1905 гг. у розных эўрапейскіх гарадох: Жэнэве, Ляйпцыгу, Лёндане, Парыжы і Кракаве. У 1884—1886 гг. быў органам арганізацыі "І Пралетарыят", з 1888 г. — арганізацыі "II Пралетарыят", з 1893 г. — Замежнага зьвязу польскіх сацыялістаў, з 1900 г. — Польскай сацыялістычнай партыі. — *А.П.*

[4] Z tajnej drukarni // Przedświt. 1892. № 35. S. 1; а таксама: Bibliografia wydawnictw nielegalnych // Przedświt. 1893. № 1. S. 27.

[5] Пэрль Фэлікс (1871—1927) — польскі палітычны дзяяч габрэйскага паходжаньня, адзін зь лідэраў Польскай Сацыялістычнай Партыі. — *А.П.*

[6] Perl F. Dzieje ruchu socjalistycznego w zaborze rosyjskim. Warszawa, 1910. T. I. S. 351.

[7] Абрамовіч Мар'ян (1871—1925) — польска-беларускі культурны дзяяч, удзельнік рэвалюцыйнага руху. — *А.П.*

[8] Абрамовіч Людвік Кароль (1879—1939) — польскі гісторык, грамадзкі дзяяч, журналіст, выдавец. У 1911—1939 гг. рэдагаваў віленскую польскую газэту "Przegląd Wileński". — *А.П.*

[9] Czarnocki N. Marian Abramowicz (wspomnienie pośmiertne) // Przegliąd Wilenski. 1925. ą 1. S. 5—6; Abramowicz L. Abramowicz Marian // Polski Słownik Biograficzny. Kraków, 1935. T. I. S. 13—14; Perl F. Dzieje ruchu socjalistycznego w zaborze rosyjskim (do powstania PPS). Warszawa, 1932. S. 393.

Абставіны, пры якіх Абрамовіч выдаў польскамоўныя брашуры "Kilka uwag" і „Jan Skiba", дагэтуль не прыцягнулі ўвагі дасьледнікаў, што, магчыма, вынікала з факту, што сацыялістычнай літаратуры на польскай мове досыць шмат было ў тыя часы, а зьяўленьне новых выданьняў, як правіла, не было выключнай падзеяй. Але ж справа выданьня "Дзядзькі Антона" набыла цалкам іншае літаратуразнаўчае значэньне дзеля таго, што гэта была адна зь першых спробаў, скіраваных на адраджэньне беларускага пісьменства. Гэтая акалічнасьць, відавочна, цікавіла дасьледнікаў беларускай літаратуры, у выніку чаго паходжаньне "Дзядзькі Антона" зрабілася прадметам падрабязных дасьледаваньняў.

Пры гэтым не абышлося бяз спрэчак, якія асабліва датычыліся аўтарства беларускай пераробкі "Ojca Szymona" і яе выдаўца. Першым сярод беларускіх літаратуразнаўцаў на гэты конт выказаўся ў 1920 годзе Максім Гарэцкі, сьцьвярджаючы, што выдаўцом "Дзядзькі Антона" быў студэнт Пецярбурскага тэхналягічнага інстытуту Адам Гурыновіч. Пры гэтым Гарэцкі не пацьвердзіў свайго выказваньня ніводным доказам, зрэшты, ён ня быў абавязаны рабіць гэтага ў сваім прызначаным для вучняў сярэдніх школаў падручніку літаратуры[10].

У той самы час Рамуальд Зямкевіч прадставіў іншую вэрсію, паводле якой аўтарам "Дзядзькі Антона" быў Абрамовіч, а яе выдаўцамі — тыльзыцкія літоўцы[11].

Нічога новага ў гэтую справу не дадаў Яўхім Карскі, каторы ў 1922 годзе без камэнтароў паўтарыў вэрсіі Гарэцкага й Зямкевіча[12].

Такім чынам, гэты знакаміты навукоўца, безумоўна, ненаўмысна, спрычыніўся да зьяўленьня ў беларускім літаратуразнаўстве доўгатрывалых спрэчак пра асобу аўтара й выдаўца "Дзядзькі Антона".

У пяцьдзясятыя гады беларускія дасьледнікі Іван Лушчыцкі[13] і Сьцяпан Майхровіч[14], ня ведаючы пра згаданыя вэрсіі Чарноцкага, Людвіка Абрамовіча і Пэрля, а таксама пра апублікаваныя Вацлавам Ластоўскім успаміны тыльзыцкага друкара гэтай брашуры Марціна Янкуса[15] ці ігнаруючы іх, надалей сьцьвярджалі, што яе выдаўцом быў Гурыновіч, прычым адсутнасьць доказаў пакрывалі аўтарытэтам Карскага. Лушчыцкі пісаў, што "такі сур'ёзны дасьледнік, як акадэмік Карскі, ня мог галаслоўна сьцьвярджаць гэтага факту"[16].

---

[10] Гарэцкі М. Гісторыя беларускай літаратуры. Вільня, 1920. С. 101. Варта заўважыць, што ўжо ў пазьнейшыя гады Гарэцкі адмовіўся ад свайго сьцьверджаньня. Гл.: Гарэцкі М. Гісторыя беларускай літаратуры. Выд. 4. Менск, 1926. С. 162.

[11] Карский Е.Ф. Белорусы. Петроград, 1922. Т. III. Ч. 3. С. 154.

[12] Тамсама. С. 77 і 154.

[13] Лушчыцкі Іван (1907—1973) — беларускі філёзаф, сярод іншага дасьледаваў сьветапогляд многіх беларускіх культурных і грамадзка-палітычных дзеячоў. — *А.П.*

[14] Майхровіч Сьцяпан (1908—1981) — беларускі літаратуразнаўца. — *А.П.*

[15] Ластоўскі В. Беларускія (крыўскія) друкі ў Тыльзыце // Крывіч. Коўна. 1926. № 1(11). С. 106. Згаданая інфармацыя знаходзіць пацьверджаньне ў дзёньніках Янкуса, што знаходзяцца ў Аддзеле рукапісаў Бібліятэкі Акадэміі Навук Літоўскай ССР у Вільні. Пар. Merkys V. Lietuvos valstiečiai ir spauda XIX a pabaigoje — XX a pradžioje. Vilnius, 1982. S. 229. — *Ю.Т.*

Водгукам на гэтую публікацыю В. Ластоўскага была зацемка А. Луцкевіча (гл: . L.A.[Łuckiewicz Antoni] Miscellanea białoruskie // Przegląd Wileński. № 15. 1926.).

Луцкевіч вяртаўся да гэтага пытаньня ў сваім рэфэраце "Białorusini i ich organ "Homon" (Przyczynek do ewolucji ideologji politycznej Białorusinow w XIX wieku)", машынапіс якога захоўваецца ў БДАМЛІМ (ф. 3, воп. 1, адз. захав. 271, арк. 3—17). Тамсама (арк. 19—23) захоўваюцца 4 рукапісныя ўстаўкі да гэтага тэксту. Ува ўстаўцы да с. 8 машынапісу гаворка ідзе — са спасылкаю на ліст Н. Чарноцкага — пра слуцкую рэвалюцыйную моладзь, у прыватнасьці, пра Антона Ражава і Валасовіча. — *А.С.*

[16] Лушчыцкі І. Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі ў Беларусі ў другой палавіне XIX веку. Мінск, 1958. С. 338.

Разьвіваючы сваю тэзу, Лушчыцкі дайшоў да высновы, што Гурыновіч быў ня толькі выдаўцом, але й суаўтарам "Дзядзькі Антона"[17]. Яшчэ далей у сваіх домыслах пасунуўся Майхровіч, згодна зь якімі Гурыновіч быў і выдаўцом, і аўтарам гэтай брашуры[18].

Беспадстаўнасьць гэтых домыслаў выявіў у 1961 годзе Сьцяпан Александровіч, які, аналізуючы гісторыю "Дзядзькі Антона", падсумаваў дагэтулешні стан ведаў пра абставіны выданьня гэтай брашуры і паставіў Абрамовіча на належнае яму месца, то бок на месца яе выдаўца[19]. Таксама Александровіч паспрабаваў вызначыць аўтара тае брашуры, хаця й ня меў добрага матэрыялу для доказаў. Таму паўсталі новыя домыслы, паводле якіх гэтым разам як суаўтарам, так і аўтарам (sic!) беларускай пераробкі "Ojca Szymona" быў Абрамовіч[20]. Тэза гэтая абапіралася на перакананьне Александровіча, быццам Абрамовіч добра ведаў беларускую мову[21]. Гэтая аргумэнтацыя была даволі пераканаўчаю, у сувязі з чым справа "Дзядзькі Антона" выглядала скончанаю.

Але неўзабаве былі выяўленыя новыя нечаканасьці. Ужо напрыканцы 1971 году Генадзь Каханоўскі[22] на старонках менскага "Полымя" абвесьціў вынікі сваіх дасьледаваньняў у львоўскім гістарычным архіве, дзе натрапіў на невядомае да гэтага часу беларускае выданьне пад назваю "Старая прысказка". Гэтая брашура была надрукаваная лацінкаю ў Польскай друкарні ў Львове ў 1887 годзе. Як паказваў паліцэйскі рапарт ад 25 лютага 1887 году, наклад яшчэ не зброшураванай "Старой прыказкі" быў канфіскаваны, прычым два яе асобнікі былі далучаныя да судовай справы й шчасьліва захаваліся для дасьледнікаў[23].

На падставе аналізу тэксту Каханоўскі сьцьвярджаў, што "Старая прысказка" была на пяць гадоў ранейшым варыянтам "Дзядзькі Антона", а брашура, выдадзеная Абрамовічам у Тыльзыце, была нязначна папраўленым перадрукам яе ранейшага львоўскага варыянту[24].

Гэта было сэнсацыйнае адкрыцьцё, якое цалкам па–новаму ставіла пытаньне паходжаньня "Дзядзькі Антона". У першую чаргу, зьнікалі дагэтулешнія мудраваньні, якія тычыліся аўтарства Абрамовіча, бо, як заўважыў Каханоўскі, у часе падрыхтаваньня "Старой прысказкі" да друку ён быў яшчэ занадта малады. У полі ўвагі дасьледнікаў зьяўляліся новыя неідэнтыфікаваныя дзеячы, якія значна раней, чым Абрамовіч, паспрабавалі выдаць "Ojca Szymona" на беларускай мове. Хто былі гэтыя людзі, як брашура была выдрукаваная ў Львове, нарэшце, якім чынам асобнік канфіскаванай "Старой прысказкі" трапіў у рукі Абрамовіча — вось пытаньні, якія некалькі дзясяткаў год цярпліва чакалі адказу[25].

На новыя абставіны, якія ў значнай ступені спрычыніліся да высьвятленьня гэтых пытаньняў, указваюць апублікаваныя ў 1923 г. успаміны Напалеона Чарноцкага[26].

У восемдзясятыя гады XIX ст. ён вучыўся ў гімназіі ў Слуцку і браў удзел у нелегальным моладзевым руху. З 1883 году цягам некалькіх гадоў ён быў адказны за тайную школьную бібліятэку, у якой, апроч расейскіх сацыялістычных выданьняў, мелася некалькі дзясяткаў польскіх кніжак, ахвяраваных Эмай Дмахоўскай з роду Яленскіх[27]. Але

[17] Тамсама. С. 339.

[18] Майхровіч С. Нарысы беларускай літаратуры XIX стагоддзя. Мінск, 1959. С. 308. .

[19] Александровіч С. Гісторыя з "Дзядзькам Антонам" // ЛіМ. 1961. № 61(1595). С. 4.

[20] Александровіч С. Пуцявіны роднага слова. Мінск, 1971. С. 78—79.

[21] Тамсама. С. 79.

[22] Каханоўскі Генадзь (1936—1994) — беларускі краязнаўца, літаратуразнаўца, фальклярыст. — *А.П.*

[23] Каханоўскі Г. Львоўскае рэха // Полымя. 1971. № 11. С. 222—225.

[24] Тамсама.

[25] Тамсама. Гл. таксама: Каханоўскі Г. У неспакойным стагоддзі // Маладосць. 1979. № 2. С. 189.

[26] Czarnocki N. Przyczynki do historii PPS // Księga Pamiątkowa PPS. Warszawa, 1923. S. 48—61.

[27] Дмахоўская (Яленская–Дмахоўская) Эма (1864—1919) — польска–беларуская культурная дзяячка, пісьменьніца, рэдактарка шэрагу віленскіх асьветніцкіх выданьняў. — *А.П.*

аддамо слова Чарноцкаму:

Я пару гадоў належаў да гуртка самаадукацыі, які пачаўся зь вельмі сур'ёзнага калектыўнага вывучэньня "Гістарычных лістоў" Міртава[28], якія зрабіліся для нас чымсьці накшталт катэхізісу "індывіда, які мысьліць крытычна". З гэтага вывучэньня вырасла патрэба прапаганды набытых поглядаў. Таму мы пераклалі на беларускую мову вядомую папулярную брашуру "Ojciec Szymon" (у перакладзе "Дзядзька Антон") і надрукавалі яе на ўласным гектографе.
Адзін зь сяброў, які праз працяглую хваробу быў адлічаны з гімназіі, атрымаў пасаду памочніка валаснога пісара, сабраўся з дапамогай гэтай брашуры прапагандаваць ідэі сацыялізму і напісаў ліст падзякі двум сябрам гуртка: Ражаву і Шыльдкрэту. Раптам абрынулася вестка пра арышт Ражава, у якога звычайна зьбіраўся гурток, дзе перапісвалі й друкавалі брашуру, пасьля дыхтоўнага ператрусу, калі, на шчасьце, наклад брашуры ўжо быў забраны, а гектограф знаходзіўся ўжо ў мяне, бо павінен быў быць адасланы ў вёску да маіх бацькоў, для чаго ў той жа дзень знайшлася аказія. Ліквідацыяй гэтага "пагрому" мы ўдзячныя дасьведчанасьці нашага калегі Ражава, ягонаму самавалоданьню, дзейнаму характару і дабрадзейнасьці ягонай сям'і (бацька — велікарус, незаможны сталяр, маці — беларуска, сам Антон Ражаў вучыўся ў восьмай клясе, адзіная надзея сям'і). Нягледзячы на пераконваньні жандараў, што толькі шчырыя прызнаньні, а таксама выдача інструктара й суўдзельнікаў уратуе Ражава ад згубы, дарма што ягоная сям'я ведала ўсіх сяброў гуртка, яны ня толькі нікога ня выдалі, але й загадзя папярэдзілі ўсіх пра небясьпеку. У доўгіх і быццам бы шчырых прызнаньнях Ражаў узяў усё на сябе.
У тым выпадку, як і ў шматлікіх іншых, энтузіязм жандараў і школьных уладаў эфэктыўна стрымліваў вядомы памочнік пракурора Ягораў. <...> Дзякуючы ягонай пратэкцыі Ражаву было дазволена скончыць гімназію, а паўгоду зьняволеньня ён адбыў у Дэрпце ўжо як студэнт вэтэрынарнага інстытуту. Ражаў быў найшляхетнейшым з прыяцеляў–маскалёў, якіх я меў у гімназіі і ўнівэрсытэце. Як вайсковы вэтэрынар ён быў сьведкам вядомага кровапраліцьця ў Пецярбургу 9 студзеня 1905 году[29] і раптоўна памёр ад гэтага ўражаньня (меў ган сэрца)[30].

Успаміны Чарноцкага сьведчаць, што першы беларускі варыянт "Дзядзькі Антона" зьявіўся ў Слуцку, а яго перакладам, ці, дакладней, пераробкай і гектаграфічным выданьнем, занялася група слуцкіх гімназістаў з Чарноцкім і Ражавым на чале. Пра тое, што Чарноцкі ведаў беларускую мову, сьведчыць ягоная пазьнейшая творчасьць на гэтай мове (пра што ніжэй). Несумнеўна, што яе ведаў таксама Ражаў, гэта, паводле расказу Чарноцкага, вынікае з нацыянальнасьці ягонай маці, грамадзкага стану бацькі (незаможны сталяр) і, урэшце, факту пражываньня сям'і ў Слуцку. Далейшыя дасьледаваньні ў гэтым кірунку былі б, як падаецца, бясплённыя, асабліва таму, што Чарноцкі сьціпла змаўчаў пра свой уласны ўнёсак у рэдакцыйную падрыхтоўку "Дзядзькі Антона". Урэшце, можна дапусьціць, што ён быў вынікам калектыўнае працы.

Паспрабуем яшчэ раз акрэсьліць дату гэтага выданьня. Вось жа, паводле архіўных дакумэнтаў, якімі карыстаўся Александровіч, у сакавіку 1886 году за чытаньне гэтай брашуры быў прыцягнуты да адказнасьці пісар Пукаўскай воласьці Ігуменскага павету на Меншчыне[31]. Ігнат Ластоўскі (напэўна, пра яго згадваў Чарноцкі), які ў сваю чаргу

[28] Міртаў — псэўданім вядомага расейскага пісьменьніка і палітычнага дзеяча, аднаго зь лідэраў народавольцаў Пятра Лаўравіча Лаўрова (1821—1900). "Гістарычныя лісты" — адзін з найбольш вядомых ягоных твораў, які ўпершыню зьявіўся ў друку ў 1868—1869 гг. — *А.П.*

[29] Маецца на ўвазе т.зв. "крывавая нядзеля" 9 студзеня 1905 г., калі войскі расстралялі мірную дэманстрацыю, якая кіравалася да царскага палацу. Гэтую дату прынята лічыць за пачатак першай расейскай рэвалюцыі 1905—1907 гг. — *А.П.*

[30] Czarnocki N. Тамсама. С. 51—52.

[31] Пукаў — цяпер вёска Камсамольская ў Капыльскім раёне. У 1890 г. Пукаўская воласьць была пераведзеная ў Слуцкі павет. — *А.С.*

атрымаў яе ад слуцкага гімназіста Івана Андрусевіча[32].

Паколькі слуцкі варыянт "Дзядзькі Антона" распаўсюджваўся ўжо ў першыя месяцы 1886 году, то як праўдападобную дату яго нараджэньня можна было б прыняць прыблізна канец 1885 году[33]. Доля слуцкага "Дзядзькі Антона" была шчасьлівейшай, чымся ягонага пазьнейшага львоўскага варыянту — "Старой прыскаэкі". Як вынікае з згаданага пераказу Александровіча, падчасператрусу ў доме Ражава паліцыя знайшла толькі рукапіс гэтай брашуры. Таксама Чарноцкі пацьвердзіў, што ўвесь наклад быў ўратаваны, з чаго можна зрабіць выснову, што яна была распаўсюджаная сярод людзей[34].

З Слуцку ці ягоных ваколіцаў "Дзядзька Антон" трапіў да Львова, дзе была зробленая няўдалая спроба выдаць яго друкам. Ня выключана, што пэўную ролю ў гэтым адыграў Вітальд Ёдка–Наркевіч[35], які хаця й пражываў у Варшаве, быў частым госьцем у сямейным маёнтку Бабоўня Слуцкага павету[36], а летам 1884 году здаваў экзамэны ў Слуцку. Красамоўны таксама факт ягонага перабываньня ў Львове ў першыя месяцы 1886 году, дзе ён хутка быў арыштаваны й высланы па–за межы Аўстра–Вугоршчыны. Але гэтая справа патрабуе далейшых дасьледаваньняў.

Увосень 1887 году Чарноцкі выправіўся ў Маскву і пачаў вывучаць мэдыцыну ўва ўнівэрсытэце.

> Даўно існавала тут, — пісаў Чарноцкі, — традыцыйная арганізацыя г.зв. "зямляцтваў", то бок студэнцкіх гурткоў, што пераважна гуртаваліся па прынцыпе нацыянальнасьці. Мы знайшлі тут "беларускі" гурток, да якога належалі ўсе палякі, беларусы і расейцы з Слуцку, але гэты гурток з моўна-культурнага гледзішча быў чыста расейскім. Пэўная даніна беларушчыне была аддадзеная толькі праз выданьне па–беларуску "Сыгналу" Гаршына[37]. Але даўно існаваў тут і "польскі" гурток, зь бібліятэкай, польскімі балямі, аматарскімі прадстаўленьнямі і грамадзянскай тэндэнцыяй калектыўнай падрыхтоўкі да будучай дзейнасьці ў краіне[38].

[32] Александровіч С. Пуцявіны... С. 78. Гэты аўтар кажа, што слуцкая брашура была выдадзеная на расейскай мове. Несумненна, гаворка пра тую ж самую брашуру, пра якую пісаў Чарноцкі. У гэтым Чарноцкі ня мог памыляцца: па–першае, ён адрозьніваў беларускую мову ад расейскай і, па-другое, ён бы з пэўнасьцю не рызыкаваў падстаўляць сябе пад рэпрэсію за нелегальную выдавецкую дзейнасьць на расейскай мове. Можна дапускаць, што слуцкі "Дзядзька Антон" быў напісаны кірыліцай, што паўплывала на акрэсьленьне яго паліцыяй як брашуры на расейскай мове. Зрэшты, у той час улады не прызнавалі існаваньня беларускае мовы, лічачы яе дыялектам мовы расейскай.

[33] У часе выданьня брашуры, г.зн. у навучальным годзе 1885/86, Ражаў вучыўся ў восьмай клясе, Чарноцкі ж — у сёмай. У наступным школьным годзе яны вучыліся разам, таксама разам у 1887 годзе скончылі гімназію. Адсюль вынікае, што Ражаў другі год быў у восьмай клясе. Імаверна, акрамя адбываньня кары ў дэрпцкай турме, ён меў таксама перапынак у гімназійным навучаньні — мог сядзець пад арыштам у часе сьледзтва, мог быць часова пазбаўлены правоў вучня — пар.: Глебов И. Историческая записка о Слуцкой гимназии. Вильно, 1903. С. 214.

[34] "Старая прыскаэка" была адзначаная ў "Bibliografii" Паўлі Жэготы (1814—1895) з наступнай прыпіскай: "Гэта мусіць быць перадрук з выдадзенай у Менску кніжкі", — пар. Biblioteka Jagiellońska w Krakowie, Dział Rękopisów 5386. T. I. K. 132. Такім парадкам, Паўлі ведаў, што брашура гэта была прывезеная ў Львоў зь Беларусі, але ня ведаў іншых падрабязнасьцяў гэтай справы. Пры аказіі дзякую сп. Г. Каханоўскаму за падказку крыніцы, а Бібліятэцы Інстытуту славяназнаўства ПАН за перадачу з Кракава адпаведнага мікрафільму.

[35] Ёдка–Наркевіч Вітальд (1864—1924) — польскі сацыялістычны палітык і публіцыст, паплечнік Юзафа Пілсудзкага. — *А.П.*

[36] Бабоўня — цяпер вёска ў Капыльскім раёне. — *А.С.*

[37] Гаршын Усевалад Міхайлавіч (1855—1888) — расейскі пісьменьнік і літаратурны крытык. — *А.П.*

[38] Czarnocki N. Тамсама. С. 52.

Розьніца паміж абодвума гурткамі была сур'ёзнаю. Калі Беларускі гурток быў рэгіянальнай студэнцкай арганізацыяй, пазбаўленай нацыянальных рысаў, дык Польскі гурток быў патрыятычнай арганізацыяй, якая ўсьведамляла свае мэты. Да таго ж, ён дзейнічаў ня ў рамах унівэрсытэту, а па–за імі і аб'ядноўваў прадстаўнікоў розных прафэсіяў, між іншага, студэнтаў, якія былі, як правіла, найактыўнейшымі яго ўдзельнікамі. У такой сытуацыі аднучасовая прыналежнасьць студэнтаў, што паходзілі зь Беларусі, да абодвух гурткоў была досыць частаю зьяваю і не стварала ніякіх праблемаў маральнага пляну. Увосень 1888 году Мар'ян Абрамовіч паступіў у Маскоўскі ўнівэрсытэт і неўзабаве стаў вядомы як адзін з найбольш актыўных удзельнікаў Польскага гуртка. У той час у Маскве таксама вучыліся Амброжы Кастравіцкі, Антон Лявіцкі (пазьней выступаў як беларускі празаік пад псэўданімам Ядвігін Ш.) і шмат іншых маладых людзей зь беларускіх земляў.

У тым асяродку паступова высьпявала ідэя распачаць выдавецкую дзейнасьць на беларускай мове. Першы праект — выданьне "Сыгналу" Гаршына ў перакладзе Лявіцкага — Беларускі гурток у 1891 годзе зьдзейсьніў цалкам легальна. Амаль аднучасова ў рамах Польскага гуртка пачалася нелегальная дзейнасьць, падрабязнасьці якой у пэрыяд, які нас цікавіць, Чарноцкі апісваў наступным чынам:

> Мы выдалі "Ojca Szymona" па–польску і па–беларуску і пераклад зь нямецкае "Гісторыі рэвалюцыйных рухаў у Расеі" Туна[39]. Гэта значыць, мы перакладалі, зьбіралі грошы, але рукапісы і грошы з дадаткам некалькіх падрабязных даручэньняў Мар'ян Абрамовіч вывез за мяжу; пасьля прывозіў гатовыя выданьні ў Маскву і арганізоўваў іх распаўсюд[40].

Што да гэтага ня вельмі дакладнага паведамленьня паўстае пытаньне: што канкрэтна перакладалася тады ў Маскве — толькі праца Туна на польскую мову ці таксама "Ojciec Szymon" на мову беларускую? Пытаньне істотнае, паколькі мы ведаем, што беларускі тэкст "Дзядзькі Антона" ўжо існаваў у выглядзе слуцкага выданьня, яго асобнік, безумоўна, быў у Чарноцкага і ён мог перадаць яго Абрамовічу. Згаданае тэкстуальнае падабенства львоўскага і тыльзыцкага выданьняў дае падставу дапускаць, што не было зроблена новага перакладу ці пераробкі, а толькі, магчыма, ужо існы тэкст быў перапісаны лацінкаю й былі ўнесеныя пэўныя праўкі. Гэта вынікае з пазьнейшага паведамленьня Чарноцкага, паводле якога Польскі гурток у Маскве толькі пераклаў працу Туна і "пастанавіў выдаць" "Ojca Szymona" па–польску і па–беларуску[41].

У 1891 годзе, перад выездам у Тыльзыт, Абрамовіч выяўляў надзвычайную рухлівасьць. Як было высьветлена ў ходзе сьледзтва, праведзенага падпалкоўнікам Івановым з Варшаўскай губэрнскай управы жандармэрыі, у тыя часы ён неаднаразова выяжджаў з Масквы ў Варшаву, Вільню, Менск і Пецярбург[42]. Ня выключана, што ў той час ён зьяжджаў таксама і за мяжу, адкуль дастаўляў нелегальныя сацыялістычныя выданьні. Але ж сярод гэтых выданьняў яшчэ не было "Дзядзькі Антона" і дзьвюх іншых выдадзеных у Тыльзыце брашураў. Іх рукапісы Абрамовіч прывёз у Тыльзыт у першыя дні студзеня 1892 году, пасьля чаго адразу перадаў іх у друкарню Янкуса. Пра гэта Абрамовіч павінен быў праінфармаваць сваіх ня здольных захоўваць тайны сяброў у Кракаве, дзе знаходзіўся ў красавіку 1892 году, пра што сьведчыць захаваная ў сьледчых актах на-

[39] Маецца на ўвазе кніга нямецкага навукоўца, прафэсара Базэльскага ўнівэрсытэту ў Швайцарыі Альфонса Туна. Упершыню на нямецкай мове выйшла ў 1883 г., пасьля неаднаразова перавыдавалася ў Расеі ў перакладзе на расейскую мову. — *А.П.*

[40] Czarnocki N. Тамсама. С. 54.

[41] Czarnocki N. Marian Abramowicz (wspomnienie pośmiertne) // Przegliąd Wilenski. 1925. № 1. S. 5—6.

[42] Archiwum m.st. Warszawy, zespół Warszawskiego Gubiernialnego Zarządu Żandarmerii, sygn. 31, sprawa Mariana Abramowicza, k. 49—50: protokoł przesłuchania z 18.05.1892.

ступная справаздача варшаўскай паліцыі:

Кракаўская паліцыя мае дадзеныя, што ў студзені бягучага году прыбыў у Тыльзыт невядомы чалавек, які ў тамтэйшай друкарні Мар'яна (памылка, павінна быць — Марціна. — *Ю.Т.*) Янкуса замовіў выдрукаваньне значнай колькасьці рэвалюцыйных выданьняў з мэтаю дастаўкі іх у Расею. Невядомы прадставіўся спачатку як Абрамовіч, а пазьней — як Маліноўскі-Залеўскі і Штэле (Stelle)[43].

Даручэньне Абрамовіча Янкус выканаў вельмі хутка — магчыма, цягам двух-трох тыдняў, так што ў канцы студзеня 1892 году "Дзядзька Антон", "Kilka uwag" і "Jan Skiba" былі ўжо надрукаваныя і зброшураваныя. Адразу пасьля гэтага Абрамовіч выехаў у Бэрлін, адкуль 8 лютага 1892 г. пісаў да лёнданскіх таварышаў з рэдакцыі "Przedświtu" наступнае: "Таксама я нядаўна паслаў Вам сьвежавыдадзеныя тры брашуркі (адна зь іх беларуская); гэта рэчы ня новыя, але на сёньняшні час вельмі патрэбныя"[44].

Такім чынам, было скончанае запляняванае Чарноцкім, Абрамовічам і іншымі дзеячамі маскоўскага Польскага гуртка пачынаньне. Яго высока ацаніла рэдакцыя „Przedświtu", зьмясьціўшы ў канцы лютага на бачным месцы наступнае паведамленьне:

Апошнім часам мы атрымалі тры новыя выданьні, якія выпусьціла ў сьвет краёвая арганізацыя ў падрасейскай Польшчы. <…> Усе тры кнігі адзначаюцца вельмі добрым друкам і нават зброшураваныя. Дзейнасьць нашых таварышаў заслугоўвае сапраўднай павагі. Энэргія, якую выказвае тайная друкарня, вартая перайманьня. Мы сьпяшаемся ў некалькіх словах выразіць нашыя найлепшыя пажаданьні таварышам, якія так сумленна робяць сваю працу[45].

Абрамовіч тымчасам працягваў сваё падарожжа, набываючы сацыялістычныя выданьні на польскай, расейскай і габрэйскай мовах, якія накіроўваў да Янкуса ў Тыльзыт. З Бэрліну ён накіраваўся ў Франкфурт, Жэнэву і Цурых, быў таксама ў Львове і Кракаве, адкуль у канцы красавіка 1892 году прыехаў у Варшаву, дзе 2 траўня быў арыштаваны падчас расклейваньня ў Лазенкаўскім парку патрыятычных адозваў[46]. Адсюль вынікае, што дастаўкай "Дзядзькі Антона" ў краіну, а тым больш яго распаўсюдам Абрамовіч займацца ня мог. Якім жа чынам цікавая нам брашура трапіла да беларускіх чытачоў?

[43] Тамсама. К. 304: Данясеньне Варшаўскага Акруговага Ўпраўленьня жандармэрыі, 14.09.1892.

[44] Centralne Archiwum KC PZPR, szgn. 305/VII/60, k. 1: list Abramowicza z 08.02.1892.

[45] Z tajnej drukarni // Przedświt. 1892. № 35. S. 1. Тайная нацыянальная друкарня Марыі Красоўскай, пра дзейнасьць якой так падрабязна пісаў "Przedświt", насамрэч не існавала. Але постаць Марыі Красоўскай не была прыдуманая. Як вынікае зь сьледчае справы Абрамовіча, гэта была на год маладзейшая ад яго студэнтка фэльчарскіх курсаў у Маскве, адкуль яна была выключаная за ўдзел у студэнцкіх бунтах у студзені 1891 году. На падставе знойдзеных 33 лістоў і фатаграфіі, падпісанай Абрамовічу, варшаўская паліцыя ўстанавіла, што яны кахалі адно аднаго. Але ў сярэдзіне лістапада 1891 году Красоўская выйшла замуж за доктара Юліяна Ганусовіча і пасялілася ў мястэчку Шаты Вількамірскага павету ў Літве. Абрамовіч увекавечніў прозьвішча сваёй каханай на тыльзыцкіх брашурах, прычым прыблізная дата іх шлюбу была пададзеная як дата дазволу цэнзуры на іх друк.

[46] Абрамовіч атрымаў суровы прысуд: 2 гады правёў у зьняволеньні падчас сьледзтва, 3 гады ў пецярбурскіх "Крестах" і 6 гадоў у сасланьні ў Верхаянску. Пасьля вайны жыў у Варшаве, дзе памёр 7.01.1925 г. Пры аказіі варта паправіць дату яго нараджэньня — 13.01.1871 г., падаваную часта ў розных публікацыях, напэўна, паводле яго біяграфіі, надрукаванай Людвікам Абрамовічам у "Polskim Słowniku Biograficznym". Насамрэч ён нарадзіўся 13.03.1870 г., што вынікае з дакумэнтаў, якія знаходзяцца ў яго сьледчай справе.

Шмат паказвае на тое, што да гэтага спрычыніўся Аляксандар Сулькевіч[47], які з 1890 году цягам некалькіх наступных гадоў працаваў на мытні на расейска–ўсходнепрускай мяжы, адначасова займаючыся буйнамаштабнай кантрабандай нелегальнай літаратуры ў межы Расеі[48].

У канцы сьнежня 1891 году ён сустракаўся з Абрамовічам у Варшаве і, напэўна, дапамог яму ў небясьпечнай пераправе праз зялёную мяжу[49]. Але пасьпяхова надрукаваць "Дзядзьку Антона" не азначала яшчэ, што ўсе клопаты скончыліся, бо й гэтая брашура не пазьбегла канфіскацыі, на шчасьце, часовай, гэтым разам прускай паліцыяй на пачатку красавіка 1892 году. Вось паведамленьне Сулькевіча з гэтай нагоды, якое адначасова паказвае яго ролю ўва ўратаваньні "Дзядзькі Антона":

> Шаноўны Таварышу! — пісаў Сулькевіч 2 чэрвеня 1892 году ў Лёндан. — Кагадзе атрымаў Ваш ліст. Пра канфіскацыю ў Тыльзыце ведаю толькі наступнае: Сьцізорык (вядомы ў Тыльзыце пад прозьвішчам А. Маліноўскі)[50], акрамя выдадзеных там, прывёз зь некалькіх месцаў вялікую колькасьць кніжак для перавозкі ў Каралеўства і ўсё гэта склаў у Янкуса — уласьніка друкарні. Будучы ў Швайцарыі, Сьцізорык перадаў на адрас Янкуса дзьве пасылкі кніжак, адну зь якіх канфіскаваў прускі ўрад, далей быў зробленыператрус у Янкуса і забраныя ўсе кнігі, якія толькі былі на складзе, а Янкуса прыцягнулі да адказнасьці. Суд прызнаў яго невінаватым, але кнігі не вярнулі. Я намагаўся вярнуць канфіскаванае праз знаёмых у Тыльзыце, але ўсе намаганьні былі безвыніковыя... Праз нейкія пару тыдняў я паеду ў Тыльзыт, каб пераканацца, ці насамрэч зварот канфіскату немагчымы[51].

У выніку тых намаганьняў прускія ўлады згадзіліся вярнуць канфіскаваныя кнігі, пра што Сулькевіч з палёгкай далажыў у ліпені таго ж году[52].

З таго часу невялічкія пачкі зь "Дзядзькам Антонам" паступова перасылаліся праз мяжу, што працягвалася, напэўна, пару год. Паводле справаздачы Польскай Сацыялістычнай Партыі, яшчэ ў 1895 годзе праз пераходны пункт каля Таўрогаў (Tauróg) ля прускай мяжы былі перапраўленыя 332 асобнікі нейкіх беларускіх выданьняў[53]. Відавочна, гэта быў "Дзядзька Антон". Паводле згодных міжсобку ацэнак беларускіх дасьледнікаў, гэтая брашура ў канцы XIX ст. адыграла істотную ролю ў распаўсюджваньні рэвалюцыйных ідэяў у Беларусі. Хутка новыя патрэбы ў гэтай галіне паўплывалі на выданьне чарговай, чацьвертай яе рэдакцыі ў 1902 годзе ў Лёндане, у 1904 годзе — у Кракаве (у выглядзе адозвы "Царская гаспадарка") і ў 1907 годзе — у Пецярбургу. У суме выйшла прынамсі шэсьць беларускіх варыянтаў "Ojca Szymona", што ў тыя часы было беспрэцэдэнтнаю зьяваю.

Дасьледаваньні абставінаў выданьня "Дзядзькі Антона" выяўляюць першыя яшчэ нясьмелыя пачынаньні групы энтузіястаў, якія сьведчылі пра борздае ўзьнікненьне і разьвіцьцё беларускага нацыянальнага руху. Сярод іх заўважную ролю адыграў Чар-

---

[47] Сулькевіч Аляксандар (1867—1916) — дзяяч польскага сацыялістычнага руху, адзін зь лідэраў ППС. — *А.П.*

[48] Zyciorys Aleksandra Sulkiewicza // Kronika Ruchu Revoluczjnego w Polsce. 1937. № 3. S. 145. — *Ю.Т.*
Гл. таксама нэкралёг А. Луцкевіча "Аляксандар Сулькевіч (Пасьмертны ўспамін)", падпісаны псэўданімам "Грамадзянін" // Гоман. 1916. 17 кастрычніка. — *А.С.*

[49] Centralne Archiwum KC PZPR, sygn. 305/VII/60, k. 4: list Sulkiewicza z 14.06.1892. — *Ю.Т.*
Выразам "зялёная мяжа" на прафэсійным жаргоне кантрабандыстаў абазначаліся палі і лясы ўздоўж дзяржаўнай мяжы, праз якія ажыцьцяўлялася незаконная перапраўка тавару. — *А.П.*

[50] "Сьцізорык", Маліноўскі — гэта былі псэўданімы Абрамовіча. — *Ю.Т.*

[51] Centralne Archiwum KC PZPR, sygn. 305/VII/60, k. 2: list Sulkiewicza z 2.6.1892.

[52] Тамсама. К. 12: list Sulkiewicza z 22.07.1896.

[53] Materyały do historyi PPS i ruchu rewolucyjnego w zaborze rosyjskim 1893—1897. Warszawa, 1907. S. 173.

ноцкі, пра якога ў беларускай літаратуры мы знаходзім толькі дробныя і абрывачныя зьвесткі. Варта на заканчэньне прысьвяціць яму некалькі словаў. Напалеон Казімер Чарноцкі нарадзіўся 13 ліпеня 1866 году ў сямейным маёнтку Нач Слуцкага павету (адкуль паходзіў таксама Мар'ян Фальскі). Узгадоўваўся ён у атмасфэры сьветлага і дэмакратычнага дому. Атрымаўшы ў 1894 годзе ў Маскве дыплём пра вышэйшую мэдычную адукацыю, працаваў лекарам у Беларусі — у Міры, Іўі, Нясьвіжы, Наваградку й Сьвіслачы. У 1908—1912 гадах жыў у Канадзе, а па вяртаньні — у Варшаве й Вільні. У 1934 годзе кінуў лекарскія заняткі і заснаваў плянтацыю лячэльных расьлінаў у Лябёдцы каля Ліды. Тут і памёр 14 лютага 1937 году[54].

Пасьля выданьня ў 1892 годзе "Дзядзькі Антона" Чарноцкі, наколькі вядома, цягам некалькіх год не займаўся беларускім пісьменствам. Да гэтай дзейнасьці вярнуўся на пачатку XX ст. пад уплывам актывізацыі беларускага нацыянальнага руху. У 1906—1908 гг. ён працуе над тэатральным рэпэртуарам, перарабляючы ці перакладаючы на беларускую мову камэдыі Чэхава "Сватаньне" і Крапіўніцкага[55] "Па рэвізіі" і "Пашыліся ў дурні", выдадзеныя ў 1910—1911 годзе ў Пецярбургу суполкаю "Загляне сонца і ў наша аконца"[56]. Адначасова ён апрацаваў дзьве брашуры грамадзка-эканамічнага зьместу: "Як будзе зь зямлёю" і "Што дзяліць, а што не, каб спакой быў на сьвеце", першая зь якіх зьявілася ў 1907 годзе ў Пецярбургу[57].

Ён пакінуў сур'ёзную публіцыстычную спадчыну ў выданьнях "Наша Ніва" (дзе, між іншага, пісаў пад псэўданімам Апанас К.), "Минский Курьер"[58], "Głos" (Варшава)[59], „Źródła mocy" (Вільня)[60], і іншых.

Творчасьць Чарноцкага ахоплівала шырокі дыяпазон грамадзка-культурных праблемаў — ён быў папулярызатарам і крытыкам маладой беларускай літаратуры, ён клапаціўся пра грамадзкае разьвіцьцё і асьвету для беларускага народу на роднай мове, яго цікавіў народны тэатар і фальклёр. Гэтая творчасьць заслугоўвае сур'ёзнага дасьледаваньня й ацэнкі.

Пераклад зроблены паводле: Slavia Orientalis. 1983. № 3.

---

[54] Пра Чарноцкага пісалі: Адам Прухнік у "Polskim Słowniku Biograficznym" (T. IV), Аляксандар Сьнежка ў "Ziemi Lidzkiej", 1937. № 8. Вялікі біяграфічны матэрыял быў апублікаваны ў "Księdzie Pamiętkowej PPS". Warszawa, 1923. S. 48—61.

[55] Крапіўніцкі Марка Лукіч (1841—1910) — украінскі актор камічных і драматычных роляў, драматычны пісьменьнік. — *А.П.*

[56] Некаторыя літаратуразнаўцы (П. Ахрыменка, Т. Кабржыцкая, В. Рагойша) прытрымліваюцца думкі, што пераклад Крапіўніцкага "Па рэвізіі" быў зроблены Чарноцкім ужо ў 1902 годзе. Гэта непаразуменьне. Аўтарам таго перакладу быў Юры Уласаў. Пар.: Аляхновіч Ф. Беларускі тэатар. Вільня, 1924. С. 85. — *Ю.Т.*

Пішучы пра пастаноўку п'есы "Па рэвізіі" ўвесну 1906 г., А. Бурбіс у сваіх успамінах "Колькі слоў аб беларускім тэатры і хоры" перакладчыкам гэтага твору назваў Н. Чарноцкага. Ня выключана, што п'есу перакладаў і Ю. Уласаў. — *А.С.*

[57] Другую брашуру "Што дзяліць…" называе Прухнік у сваёй біяграфіі Чарноцкага, не падаючы месца і даты яе выданьня. Гэтую брашуру я не разглядаю.

[58] "Минский курьер" — грамадзка-палітычная і літаратурная газэта, якая выходзіла ў Менску з 27 студзеня па 8 кастрычніка ў Менску. — *А.П.*

[59] "Głos" ("Голас") — грамадзка-палітычны і культурны штотыднёвік, які выходзіў у Варшаве з 1886 г. Спачатку меў народніцкае аблічча, пасьля зрушыўся на больш правыя пазыцыі. — *А.П.*

[60] "Źródła mocy" ("Крыніцы сілы") — грамадзка-палітычны і культурны часопіс, які выдаваўся ў Вільні ў 1927—1931 гг. — *А.П.*

Генэза і аўтарства першага беларускага лемантара

У 1906 годзе ў Пецярбургу суполкай "Загляне сонца і ў наша аконца" быў выдадзены ананімны "Беларускі лемэнтар або Першая навука чытаньня", што сьведчыла пра імкненьні выдаўцоў распачаць у Беларусі народную асьвету на беларускай мове. Выхад лемантара на цэлае дзесяцігодзьдзе апярэдзіў узьнікненьне першых беларускіх публічных школаў, таму яго выкарыстаньне абмяжоўвалася хатнім ужыткам, а таксама падпольнымі беларускімі школкамі, што паўставалі пасьля рэвалюцыі 1905 году. Ён быў выдадзены як лацінкай, так і кірыліцай, з чаго вынікала, што прызначаўся лемантар як для каталікоў, гэтак і для праваслаўных. У той жа час гэты падручнік упершыню ў гісторыі быў спробай акрэсьліць асноўныя прынцыпы правапісу сучаснай беларускай мовы, прапаноўваў некаторыя беларускія лінгвістычныя тэрміны, а таксама спэцыфічную для гэтай мовы графіку. І таму "Беларускі лемэнтар" служыў для пісьменьнікаў і выдаўцоў хоць і не абвязковым, але адзіным да першай сусьветнай вайны свайго роду практычным дапаможнікам па мове[1]. Пры такім стане рэчаў значэньне падручніка можна разглядаць ня толькі ў грамадзкай і пэдагагічнай плашчыні, але таксама і ў кантэксьце разьвіцьця беларускага мовазнаўства[2].

У абедзьвюх гэтых галінах на пачатку XX ст. яшчэ практычна не існавала ніякіх узораў і дазнаньняў, што было абумоўлена галоўным чынам тагачасным грамадзкім статусам беларускай мовы як мовы мужыцкай, з абмежаваным пэўнай мясцовасьцю выкарыстаньнем. Таму распачатыя ў XIX ст. мовазнаўчыя студыі беларускай мовы Івана Насовіча і Яўхіма Карскага[3], нягледзячы на іх важнасьць з навуковага пункту гледжаньня, непасрэдна не спрычыніліся да яе ўкараненьня ў практычнай пэдагагічнай і літаратурнай дзейнасьці. Звычайна гэта тлумачыцца абмежавальнай палітыкай царызму і афіцыйным трактаваньнем *беларускай мовы* як дыялекту расейскай мовы. Аднак трэба заўважыць, што нават найвыдатнейшыя творцы беларускай літаратуры XIX ст. так і ня здолелі, у адрозьненьне ад літоўцаў, выдаць падручнік для практычнага навучаньня беларускай мове[4]. Гэтую сытуацыю таксама не зьмяняе факт выданьня

[1] Чакаючы зьяўленьня падручніка, беларуская паэтка Алёйзія Пашкевіч (Цётка) пісала 28.06.1906 г. зь Львова Браніславу Эпімах–Шыпілу ў Пецярбург: "Я хачу даведацца ад Вас, што чутно з букваром, ці ўжо гатоў, ці ў нас будзе фанэтыка наша беларуская. Гэта вельмі важна, бо буду цяпер выдаваць папулярныя рэчы для народу, дык ня ведаю, як чаго трымацца" // Арабей Л. Стану песней. Москва, 1982. С. 114. — *Ю.Т.*

Гл. таксама: Цётка. Выбраныя творы. Мінск, 2001. С. 215. — *А.С.*

[2] Семашкевіч Р.М. Беларускі літаратурна–грамадскі рух у Пецярбурзе. Мінск, 1971. С. 98—102; а таксама: Германовіч І.К. Карусь Каганец як мовазнавец // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя Леніна. Сер. IV. 1974. № 3. С. 33.

[3] Гэтымі двума навукоўцамі ў др. п. XIX ст. быў выдадзены шэраг беларускіх мовазнаўчых прац, сярод якіх можна адзначыць перш за ўсё "Словарь белорусского наречия", выдадзены Іванам Насовічам (1788—1877) у 1870 г. і "Обзор звуков и форм белорусской речи" Яўхіма Карскага, выдадзены ў 1885 г. — *А.П.*

[4] Антон Лявіцкі (Ядвігін Ш.), які ў 1877—1878 гг. наведваў школку, што трымаў Вінцэнт Дунін–Марцінкевіч — піянэр беларускай літаратуры XIX ст., — паведамляе, што вучылі там расейскай, польскай, францускай мовам, розным прадметам, за выняткам гісторыі Беларусі й беларускай мовы. Вучні нават ня ведалі беларускіх твораў Марцінкевіча. Паводле Лявіцкага, Марцінкевіч, хаця й пісаў па–беларуску, не адважыўся "беларускую ідэю прыстасаваць да жыцьця". Гл.: Ядвігін Ш. Выбраныя творы. Мінск, 1976. С. 297—298. У гэтым пляне ня вельмі адрозьніваўся і Францішак Багушэвіч, якога часта называюць праро-

ў 1862 годзе ў Варшаве “Элемэнтажа для добрых дзеток каталікоў”, бо ў аснове сваёй гэта быў рэлігійны падручнік і, акрамя назвы, меў мала супольнага з падручнікам для навучаньня мове[5]. “Беларуски лемэнтар” жа ня меў прэцэдэнту ў гісторыі, і таму мэтазгодна дасьледаваць яго паходжаньне на падставе нявыкарыстаных дагэтуль польскіх крыніц.

Дагэтуль таксама засталося нявысьветленым пытаньне ананімнасьці гэтага асаблівага падручніка, хаця яно даўно прыцягвала ўвагу беларускіх дасьледчыкаў. У дваццатых гадох Мікола Касьпяровіч на падставе дасьледаваньня рукапісаў Казімера Кастравіцкага (вядомага ў літаратуры пад псэўданімам Карусь Каганец) і яго ліставаньня са старшынём выдаўнічай суполкі “Загляне сонца і ў наша аконца” Вацлавам Іваноўскім выказаў думку, што аўтарам лемантара быў згаданы Кастравіцкі[6].

Гэтага погляду таксама прытрымліваюцца сучасныя дасьледчыкі[7], якія, аднак, не тлумачаць, чаму прозьвішча ці то псэўданім Кастравіцкага, калі ён быў аўтарам лемантара, не было названае выдаўцамі. Пытаньне падаецца істотным, калі ўлічыць, што ўжо ў 1907 г. неўзабаве пасьля выхаду лемантара гэтая суполка выдала “Гутаркі аб небе і зямлі”, называючы прозьвішча Кастравіцкага як аднаго зь перакладчыкаў гэтай кнігі. Да таго ж у выпадку зь лемантаром ня трэба было асьцерагацца выкрыцьця Кастравіцкага — актыўнага дзеяча Беларускай Сацыялістычнай Грамады ў 1904—1905 гадох, — тым больш што на час выданьня згаданай публікацыі ён ужо быў вызвалены з турмы, у якую трапіў за сваю рэвалюцыйную дзейнасьць[8].

Напасьледак, выданьне ананімных кніг не было характэрна для пецярбурскай суполкі, пра гэта сьведчыць той факт, што зь некалькіх дзясяткаў выдадзеных кніг толькі на адным лемантары не было пазначана прозьвішча ці псэўданім аўтара.

Задума стварэньня першых беларускіх школьных падручнікаў зьявілася толькі на пачатку XX ст. у асяродку дзеячоў Беларускай Рэвалюцыйнай Партыі, створанай студэнтам Пецярбурскага тэхналягічнага інстытуту Вацлавам Іваноўскім. Пра гэта сьведчыць выдадзеная восеньню 1902 г. адозва партыі “Да інтэлігенцыі”, у якой упершыню была сфармулявана амбітная праграма пачынаньня беларускай народнай асьветы і разьвіцьця выдавецкай дзейнасьці[9]. Першым пунктам гэтай праграмы значылася стварэньне працаў над удасканаленьнем беларускай мовы і выданьнем граматыкі, для распрацоўкі якой плянавалася зьвярнуцца да спэцыялістаў. Не вядома, ці зьвярталіся і да каго зьвярталіся тады з гэтай нагоды дзеячы БРП, бо фактычна ніхто зь вядомых моваведаў таго часу распрацоўкай граматыкі не заняўся. У рэшце рэшт, толькі ў 1918 годзе гэтую справу выканаў Браніслаў Тарашкевіч, заахвочаны і прысьпешаны Іваноўскім[10]. А лемантар мог бы

кам беларускага адраджэньня. І хаця ў прадмове да свайго зборніка “Дудка беларуская” (Кракаў, 1891) ён заклікаў: “Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмерлі!”, — у тым жа 1891 г. практычна займаўся арганізацыяй нелегальных польскіх школак для простага люду ў Вільні. Гл.: Krzywicki L. Na marginesie starej fotografii // Niepodległość. T. III. 1933. Zesz. 1(5). S. 74.

[5] Вядома, мы не бяром пад увагу лемантары і граматыкі старацаркоўнаславянскай мовы, што выдаваліся на Беларусі ў XVI—XVIII стст.

[6] Касьпяровіч М. Карусь Каганец (да 10-й гадавіны сьмерці) // Маладняк. Менск, 1928. № 10. С. 102.

[7] Германовіч І.К. Тамсама. С. 33; Александровіч С. (прадмова да) Каганец Карусь. Творы. Мінск, 1979. С. 17. Гэтай думкі прытрымліваецца таксама Макмілін А. (A History of Byelorussian Literature. Giessen, 1977. S. 136). Аднак Лідзія Арабей сьцьвярджае, што аўтарам лемантара была Алёйзія Пашкевіч (Цётка). Пар.: Арабей Л. Стану песней. Москва, 1982. С. 114.

[8] Каганец Карусь. Творы. Мінск, 1979. С. 261.

[9] Przedświt. Лёндан, 1903. № 2. С. 53—54. Тамсама поўны тэкст адозвы “Да інтэлігенцыі”. — *Ю.Т.*

[10] Гл. ліст Янкі Купалы да Тарашкевіча за 04.08.1913 г., апублікаваны В. Рагойшам у зборніку “Нашы песьняры”. Мінск, 1972. С. 254. — *Ю.Т.*

Гл.: Янка Купала. Поўны збор твораў. Т. 9. Кн. 1. С. 239. — *А.С.*

быць распрацаваны ўласнымі сіламі і, што найбольш важна, у адносна кароткі час.

Пільная патрэба стварыць гэты падручнік была выклікана ў значнай ступені патрэбай распрацоўкі адзіных прынцыпаў беларускага правапісу ў сувязі з тым, што плянавалася распачаць пастаянную выдавецкую дзейнасьць. Найменшыя цяжкасьці з гэтага пункту гледжаньня ўзьнікалі пры адаптацыі для патрэб беларускай мовы лацінкі, пры ужываньні якой абапіраліся на нормы польскага правапісу. У выкарыстаньні ж кірыліцы ужо на мяжы XIX—XX стст. выявіліся інавацыйныя тэндэнцыі, якія мелі на мэце прыстасаваць тагачасны расейскі альфабэт да патрабаваньняў беларускай фанэтыкі. Першы крок у гэтым кірунку быў зроблены ў канцы XIX ст. Аляксандрам Ельскім, які ў сваіх брашурах, выдадзеных кірыліцай, выкарыстаў новы знак "Ґ" як адпаведнік неіснуючай у расейскім альфабэце літары "h", а таксама спалучэньне "іо" (віоска) замест ужыванай дагэтуль "ё" (вёска)[11].

Далейшыя зьмены ў гэтым кірунку былі зробленыя ў 1902—1904 г. дзякуючы выдаўцам Польскай Сацыялістычнай Партыі, якія ў друкаваных у Лёндане агітацыйных брашурах ("Гутарка аб тым, куды мужыцкіе грошы ідуць" і інш.)[12], а таксама выдадзеных у краіне адозвах ("До браці мужыкоў", "Таварышы", "Браця мужыкі") адмовіліся ад выкарыстаньня цьвёрдага знаку "ъ" і "ѣ", замяняючы апошні літарай "е". Яны таксама выкарысталі прапанаванае Ельскім спалучэньне "іо", аднак не прынялі ягонай ідэі адносна знаку "Ґ".

Беларускія выдаўцы ў Пецярбургу спачатку стрымана паставіліся да новых прынцыпаў артаграфіі, выкарыстаных у публікацыях Ельскага і ППС. Пра гэта сьведчыць пасьлядоўнае ўжываньне правілаў традыцыйнага правапісу ў іх першых публікацыях. Так, у выдадзенай у сьнежні 1902 г. газэце "Свабода" адзіным новаўвядзеньнем была літара "Ґ"[13].

Але ўжо ў наступнай публікацыі — зборніку вершаў Янкі Лучыны "Вязанка" (1903 г.) — гэтай літары няма, аднак выкарыстоўваецца "е" на месцы ранейшага "ѣ", што не рабіла-такі прынцыповых зьмен. Аднак разам з актывізацыяй выдавецкай дзейнасьці расла і колькасьць прыхільнікаў рэформы правапісу. Тэндэнцыі гэтых зьменаў выразна выявіліся ў канцы 1903 — пачатку 1904 гадоў, калі былі падрыхтаваныя да друку кірыліцай чарговыя пункты выдавецкай праграмы — "Велікодная пісанка", "Казкі", "Песьні" і "Царская гаспадарка". У апрацоўцы гэтых тэкстаў удзельнічалі галоўным чынам Вацлаў Івановскі, Казімер Кастравіцкі і Мар'ян Фальскі, кожны зь якіх выкарыстоўваў уласныя падыходы і канцэпцыі беларускага правапісу. Таму ў першыя гады XX ст. паўстала шмат розначытаньняў (гл. табл. 1), уніфікацыя якіх зрабілася істотнай праблемай, якая абумовіла далейшае разьвіцьцё беларускага пісьменства.

Гэткай жа важнай праблемай, якая паўстала перад выдаўцамі, была праблема альфабэту, бо і тут бракавала вартых перайманьня ўзораў. На працягу XIX ст. сфармавалася практыка друкаваньня беларускіх кніг і іншых выданьняў альтэрнатыўна — лацінкай або кірыліцай, якая адлюстроўвала ня толькі спэцыфіку рэлігійнай сытуацыі у Беларусі,

---

[11] Ельскі А. Слова аб праклятай гарэлцы. Пецярбург, 1900.

[12] Дакладней кажучы, брашуру выпусьціла ППС у Літве — філіяльная арганізацыя ППС, якая ў 1906 г. аб'ядналася зь Літоўскай Сацыял-Дэмакратычнай Партыяй. — *А.С.*

[13] Поўны тэкст "Свабоды" дагэтуль ня выяўлены, аднак вядома, што клішэ першай старонкі гэтага выданьня ўручную прыгатаваў Рамуальд Мілер, а астатніх — пецярбурскі гімназіст Вінцэнт Валейка. Пар.: Станкевіч А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня. Вільня, 1934. С. 74. Выяўленай мной у Цэнтральным Архіве ЦК ПАРП часткі тэксту "Свабоды" зь вершам "Добрые весьці" (syg. 305//III/55 pt. 12) даволі, каб сьцьвердзіць асаблівасьці правапісу. Аб тым, што гэта арыгінальны тэкст, сьведчыць ідэнтычны характар пісьма зь іншымі рукапісамі Вінцэнта Валейкі, доступ да якіх увесну 1984 г. мне забясьпечыў яго сын, Марк Валейка, за што ў гэтым месцы я складаю яму падзяку.

Табліца 1. Асноўныя разьбежнасьці ў адным з варыянтаў беларускага правапісу — кірыліцы — у 1902—1904 гг.

Назва публікацыі і час выданьня	Цьвёрды знак	Мяккі знак	ѣ	jo	h
Ельскі А. Слова аб праклятай гарэлцы. Пецярбург, 1900	ъ	ь	j	io	Γ̂
Гуторка аб тым, куды мужыцкіе грошы ідуць. Лёндан, кастрычнік 1902	—	ь	—	io	Г
"Свабода". Пецярбург (? — *Рэд.*), сьнежань 1902	ъ	ь	j	e	Γ̂
"Вязанка". Пецярбург, вясна 1903	ъ	ь	ё	ё	Г
Песьні. Кракаў, красавік 1904	—	ь,'	j	io	Г
Царская гаспадарка. Кракаў, красавік 1904	ъ[a]	ь,'	j, e	io	Г
Велікодная пісанка. Пецярбург, красавік 1904	—	ь	j, e	io	Г
Казкі. Пецярбург, лета 1904	ъ	ь,'	—	io	Г
Беларускі лемэнтар. Пецярбург, лета 1906	—[b]	ь	—	io	Г

[a] спарадычна, непасьлядоўна
[b] спарадычна; магчыма, памылка карэктуры

але і культурныя і нават палітычныя матывацыі паасобных аўтараў[14]. Існаваньне двух альфабэтаў для адной мовы было ненармальнай зьявай, і толькі цягам далейшага грамадзкага разьвіцьця Беларусі пытаньне было вырашана на карысьць кірыліцы. Аднак жа ў першыя гады XX ст. праблема альфабэту — важная для разьвіцьця культуры і выдавецкай дзейнасьці — саступала перад спробамі піянэраў беларускага адраджэньня нэўтралізаваць адмоўныя наступствы рэлігійнай разьяднанасьці грамадзтва шляхам абуджэньня агульнанацыянальнай сьвядомасьці. Аргумэнтацыя выдаўцоў лемантара ў гэтай складанай справе гучала наступным чынам:

> Ведаем мы ўсе, што меж нами палешуками, беларусами, ци як мы сябе яшчэ называем — тутэйшыми йосьць каталики и праваслаўные, каталики больш да лацинских литэр — што йих несправядлива "польскими" называюць, прывыкли; праваслаўные — да славянских — ци як кажуць да "руских" прывыкли. Гэтые руские — гэтаж нашы спрадвечные беларуские, а лацинскими цяпер увесь сьвет пишэ. Ци раз у нас сварка бывае: зыдуцца каталик з праваслаўным и сваруцца "ах ты, кажэ, паляк, — а ты маскаль". И абодва ня ведама што кажуць: ани той паляк, ани гэты маскаль, абодва яны хоць рознае веры, а народуаднаго, бо абодва вырасли на зямельцы тутэйшай палескай — беларускай и першае слова ў мови нашай бацькаўскай ад бацькоў пачули, а сваруцца тольки сабе на крыўду и на сорам, людзям на сьмех. Вось і знарок выдаем лемэнтар дваякими знаками, выбирай, што спанараўна, каб усяки пазнаў, што ци такие, ци сякие знаки, а зыки, склады и словы тыеж, мова — таяж и людзи што мовай адной гаворуць — браты родные[15].

Рашэньне выдаць лемантар двума альфабэтамі ўлічвала канкрэтныя ўмовы грамадз-

[14] Багушэвіч быў перакананым прыхільнікам лацінкі, выкарыстаньне якой, верагодна, лічыў адным са сродкаў супрацьстаяньня русіфікацыйнай палітыцы царызму. Гэтым альфабэтам ён выдаў усе свае кніжкі, а ня выдадзеную пры жыцьці кніжку "Скрыпачка беларуская" даручыў падрыхтаваць да друку жонцы, толькі з той умовай, што зборнік будзе выдадзены лацінкай. Гл.: Семашкевіч Р.М. Тамсама. С. 99. Зь іншага боку, ППС выдавала беларускія брашуры і адозвы выключна кірыліцай з той прычыны, што яна імкнулася ўплываць на беларускае праваслаўнае насельніцтва. Да беларусаў–каталікоў ППС адрасавала агітацыйную літаратуру на польскай мове.

[15] Беларуски лемэнтар або Першая навука чытаньня. Пецярбург, 1906. С. 4—5 (лацінка) і С. 6—7 (кірыліца).

на-культурнага разьвіцьця Беларусі і, у адрозьненьне ад практыкі XIX ст., не надавала перавагі і не перадвызначала будучыні аднаго з двух альфабэтаў. Рашэньне гэтае, праўда, падвойвала выдаткі на друк небагатай выдавецкай суполкі, але яны не былі занадта высокія ў параўнаньні са спадзяваным вынікам, г.зн. разьвіцьцём нацыянальнай сьвядомасьці і інтэграцыяй беларускага грамадзтва на падставе агульнанацыянальнай культуры. Таму можна пагадзіцца зь Семашкевічам, што на тагачасным гістарычным этапе гэта было адзіна правільнае рашэньне[16]. З двух заплянаваных варыянтаў лемантара першым узьнік лацінкавы. Пра гэта сьведчыць зьмешчанае ў ім указаньне адносна спосабу, якім чытачы могуць выказаць крытычныя заўвагі пра зьмест кнігі: “Prosim nie lanicca, a usio, szto sustreniecie blahoha, zapisać i padać tudy, skul hety lemantar dastali”[17].

Такім чынам, гэтыя заўвагі кнігараспаўсюднікі мусілі перадаць невядомаму выдаўцу, а не выдавецкай суполцы “Загляне сонца і ў наша аконца”, якая была зарэгістравана ў траўні 1906 г. і ў часе распрацоўкі гэтага варыянту кнігі пра яе, напэўна, яшчэ нават і ня думалі[18]. На тое, што лацінкавы варыянт узьнік раней, паказвае таксама іншая акалічнасьць. Так, у часе працы над лемантаром Алёйзія Пашкевіч (Цётка) працавала над чарговым падручнікам, які быў выдадзены ў 1906 г. у Пецярбургу пад назвай “Першае чытаньне для дзетак беларусаў”. Пра гэта ведаў аўтар лацінкавага варыянту, аднак ён яшчэ ня ведаў дакладнай назвы рыхтаванай да выданьня чытанкі, у сувязі з чым акрэсьліў яе толькі прыблізна — “Першая ксёнжка да чытаньня”[19].

Працай над лацінкавым варыянтам лемантара заняўся восеньню 1904 г. Іваноўскі, калі пасьля сканчэньня навучаньня праходзіў пасьлядыплёмную практыку на цукровым заводзе ў Баравічках пад Плоцкам. У той час ён быў у блізкім кантакце з сваім пецярбурскім прыяцелем, жыхаром Плоцку Люцыянам Альтбэргам, сястра якога, Марыя Арнольдзіха, расказала мне 17 траўня 1979 г. наступнае:

> Люцыян часта бываў у Іваноўскага ў Баравічках і бачыў, як ён карпеў над складаньнем беларускага лемантара. Брат гаварыў пра гэта часта і з пэўнай іроніяй, маўляў, гэта дзяцінства, фантазіі: “Такі паважаны чалавек займаўся беларускім лемантаром! Ды гэта ж дыялект, а ня мова...” Ах, калі б брат быў разумнейшым, ён бы ведаў, што нават адзін чалавек у гэтай галіне мог зрабіць пераварот. Бо з гэтага лемантара вырасла цяпер уся беларуская літаратура.

Гэтае паведамленьне пацьвярджае ліст Іваноўскага да Ельскага ад 24 лютага 1905 г., дзе ён інфармаваў, што праца над лемантаром блізкая да завяршэньня (“будзе гатоў да друку за месяц”). Таму можна дапусьціць, што лацінкавы варыянт лемантара Іваноўскі скончыў сама позна вясной 1905 г.

Цытаваны ліст Іваноўскага зьмяшчае інфармацыю, што прыкладам для стварэньня гэтага падручніка быў польскі лемантар Казімежа Промыка (псэўданім Конрада Прушынскага)[20].

---

16 Семашкевіч Р.М. Тамсама. С. 99. Гэтая дарагая, але эфэктыўная практыка паралельнага друку лацінкай і кірыліцай пазьней выкарыстоўвалася рэдакцыяй беларускіх газэт “Наша Доля” і “Наша Ніва” (да канца 1912 г.). (Лацінкаю “Нашу Ніву” выдавалі да 18(31) кастрычніка 1912 г. — *А.С.*) Двума альфабэтамі да першай сусьветнай вайны быў выдадзены шэраг беларускіх кніг. — *Ю.Т.*

17 Biełaruski lementar abo pierszaja nawuka czytańnia. Pieciarburh, 1906. S. 23.

18 Пар. лісты В. Іваноўскага да А. Ельскага за 24 лютага, 31 красавіка і 15 траўня. Archiwum Glównie Akt Dawnych, Zespól Prozorów i Jelskich, syg. 1402.

19 Biełaruski lementar... S. 23. У выдадзеным кірыліцай лемантары прысутнічаюць адрозныя фармулёўкі. У ім чытачоў просяць скіроўваць заўвагі беспасярэдне да выдавецкай суполкі і правільна называецца назва чытанкі Цёткі. Пар.: Беларуски лемэнтар. С. 30. Гэтыя разьбежнасьці былі яўным недаглядам карэктараў выдавецтва.

20 Promyk K. Elementarz na którym nauczysz czytać w 5 albo 8 tygodni. Wydanie 37. Warszawa, 1903.

Гэты лемантар у сувязі з забаронай навучаньня польскай мове ў школах Расейскай імпэрыі прызначаўся ў прынцыпе для хатняга ўжытку і найперш служыў навучаньню чытаць. З гэтага пункту гледжаньня ён быў больш адпаведны беларускім умовам, чым расейскія лемантары, што ўжываліся ў публічных школах. Як вынікае з аналізу зьместу абодвух лемантароў, гэткае перайманьне сягала вельмі далёка. Так, з падручніка Промыка Іваноўскі пераняў мэтодыку навучаньня ды ў сутнасьці канцэпцыю ўкладаньня матэрыялу, г.зн. мэтадычныя ўказаньні для таго, хто навучае, як пазнаваць літары і склады, уступныя практыкаваньні, альфабэт, тлумачэньне галосных і зычных, напісаньне імёнаў уласных і лічбаў і, урэшце, назвы знакаў прыпынку. Была адаптавана нават частка ілюстрацыйнага матэрыялу. Некаторыя элемэнты гэтага падручніка былі перакладзены на беларускую мову: дзе–нідзе даслоўна, дзе–нідзе зь неістотнымі мадыфікацыямі, што ілюструецца наступнымі прыкладамі:

"Elementarz" Промыка	Беларускі лемантар, варыянт лацінкай
s. 3—4: "Przeczytaj, bracie, jeżeli zechcesz kogo uczyć czytać, to ucz koniecznie tak, jak ci poradzę i jak w tym elementarzu pokazano. Dotąd jeszcze uczą nieraz tak, że potrzeba roku albo dwóch lat, żeby czytać nauczyć; a tymczasem jest daleko lepszy nowy sposób, że można nauczyć w 8, a nawet w 5 tygodni... Nie zaczynaj od razu uczyć całego abecadła, ale pokaż tylko kilka liter, które są na początku w tym elementarzu, i ucz od początku aż do końca tak, jak w tymże elementarzu napisano. Zanim zaczniesz uczyć w nowiem miejscu, to wpierw przeczytaj radę, która jest wydrukowana dla ciebie drobnemi literami i ucz zapełnie tak, jak tam powiedziano".	s. 3: "Praczytajcie! Kali budziecie wuczyć kaho czytać na hetym lemantaru, wuczycie tak, jak tut radżu i jak u lemantaru napisana. Dauniej wuczyli czytać hod abo i dwa, a ciapier i u dwa miesiacy nawyczysz. Nie pakazuj zaraz usich znakau, a tak, jak tut napisana: literu za literaj i adrazu wuczy czytać cely skład i słowa, skład pa składzi... Pakul paczniesz wuczyć czytać u nowym miejscy, praczytaj radu, szto drobnymi literami napisana".
s. 21: "Te litery, czyli głoski, co się ich uczyłeś na samym początku, na pierwszej stronicy, można wymawiać głośno, bez innych znaków. Dlatego nazywają się onie samogłoski... A tych znaków, co się ich uczyłeś później, nie można czytać samych, lecz tylko razem z tamtemi samogłoskami, to jest spólnie z samogłoskami, dlatego nazywają się one spółgłoski".	s. 20: "Zyki bywajuc dwajakije: adny, jak na prykład haworuczy a, o, e — nazywajucca samohałoskami, a to prosta hałosnymi, bo jany haworacca samy saboju biaz pomoczy druhich zykou, a tyje, katorych biaz pomoczy hałosnych trudna wyhawaryć — nazywajucca sahałosnymi".
s. 22: "Litera większa kładzie się zawsze na początku, jak tylko co nowego zaczynają pisać. Litera większa kładzie się też zawsze na początku każdego imienia i nazwiska...".	s. 21: "Wialiki znak piszecca z paczatku, jak paczynajem pisać szto nowaje. Wialiki znak piszecca na paczatku imieńnia i prozwiska...".

Цікавая рыса згаданага лемантара ў мовазнаўчым аспэкце ў тым, што ў ім упершыню выкарыстоўваецца беларуская лінгвістычная тэрміналёгія. Гэта былі агульныя тэрміны, тыповыя, напэўна, для ўсіх эўрапейскіх моваў, аднак іх ахоп, які супадае з тэрмінамі, ужыванымі ў падручніку Промыка, сьведчыць пра тое, што апошні выкарыстоўваўся як аснова для апрацоўкі беларускіх паняткаў. Трэба заўважыць, што некаторыя зь іх ('знаки застановочные', 'працяжка') больш дакладна адлюстроўвалі значэньне, чым тэрміны, прапанаваныя Промыкам ('znaki pisarskie', 'kreska', замененыя цяпер на 'znaki

interpunkcyjne', 'pauza' ('знакі пунктуацыі', 'працяжнік')). Новаўвядзеньнем, якое прапаноўваў лемантар у графіцы, было выкарыстаньне знакаў "č", "š", "ž" замест традыцыйных "cz", "sz", "ż", што, напэўна, мела на мэце адрозьніць беларускую лацінку ад польскага альфабэту. Створаныя ў канцы 1904 — на пачатку 1905 г. першыя беларускія мовазнаўчыя тэрміны пасьля былі дапрацаваныя. Некаторыя зь іх былі моцна зьмененыя (напр., 'коска' заместа 'закавыка'), але большасьць зь іх зрабіліся трывалым набыткам беларускага мовазнаўства і былі прыняты ў такім жа гучаньні ('склад', 'галосны', 'клічнік' і інш.) ці толькі з фанэтычнымі і марфалягічнымі зьменамі, як, напрыклад, 'пытанник' — 'пытальнік', 'працяжка' — 'працяжнік' і інш. (гл. табліцу 2).

Табліца 2. Параўнаньне асобных мовазнаўчых тэрмінаў

"Elementarz" Промыка	"Беларускі лемэнтар"	Сучасная беларуская тэрміналёгія
litera	литэра	літара
sylba	склад	склад
—	ударэньне	націск
głoska	зыки, галаскі́	гукі
samogłoska	самагалосны, галосны	галосны
spółgłoska	сагалосны	зычны
znaki pisarskie	знаки застоновочные	знакі прыпынку
kropka	кропка	кропка
dwukropek	двукропе	двукроп'е
przecinek	закавыка	коска
średnik	кропка з закавыкай	кропка з коскай
wykrzyknik	кличник	клічнік
pytajnik	пытанник	пытальнік
cudzysłów	чужэслоў	двукосьсе
nawias	—	дужкі
kreska	працяжка	працяжнік
łącznik	злуч	злучнік
—	недасказ	шматкроп'е

Затое больш арыгінальным у беларускім лемантары быў дыдактычны матэрыял. Як трапна заўважыў Семашкевіч, усе ілюстрацыі, словы ці тлумачэньні гукаў абапіраліся на прыклады з жыцьця беларускай вёскі, што мусіла спрыяць лепшаму засваеньню вучнямі зьместу[21].

Гэтым самым мэтам служылі зьмешчаныя ў ім тры кароткія апавяданьні (іх не было ў падручніку Промыка), сярод якіх прынамсі адно — "Дзед і баба" — было пераробкай папулярнага верша Ю.І. Крашэўскага "Żył sobie dziad i baba, bardzo starzy oboje..." ("Нейк жылі дзед і баба, састарэлі абое..." у перакладзе Ул. Мархеля. — *Рэд.*). Можна дакладна сьцьвярджаць, што "Беларуски лемэнтар" быў створаны ня толькі пад уплывам падручніка Промыка, але і іншых польскіх крыніц. У сувязі з гэтым не падаецца абгрунтаваным меркаваньне, што нібыта прыкладам для стварэньня лемантара быў падручнік К.Д. Ушынскага "Родное слово"[22].

Лацінкавы варыянт лемантара быў асновай для стварэньня другога варыянту, надрукаванага кірыліцай, укладаньне якога Івалоўскі даручыў Казімеру Кастравіцкаму. Сьведчаньнем таму — дыскусія паміж імі адносна мовазнаўчых аспэктаў гэтага падручніка,

[21] Семашкевіч Р.М. Тамсама. С. 101.

[22] Нарысы па гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. Мінск, 1986. С. 228.

якую прыводзіць Касьпяровіч[23].

Да гэтай працы Кастравіцкі прыступіў сама рана вясной 1905 г., неўзабаве пасьля атрыманьня ад Іваноўскага тэксту лацінкай, а скончыў яе — сама позна ў сярэдзіне сьнежня, бо зь 19 сьнежня 1905 г. да сярэдзіны траўня 1906 г. ён быў у зьняволеньні[24].

Паколькі існаваў плян выдаць два паралельныя варыянты лемантара, задача Кастравіцкага была, несумненна, лягчэйшая, бо палягала ў перапісаньні кірыліцай лацінкавага тэксту і распрацоўцы ілюстрацый для абодвух варыянтаў.

Найважнейшая праблема, якую неабходна было вырашыць падчас працы над другім варыянтам, была ў тым, як унікнуць існуючых разыходжаньняў ува ўжываньні беларускай кірыліцы. Аднак цяжка сьцьвярджаць, у якой ступені да гэтага спрычыніўся Кастравіцкі, бо, як вынікае зь ягоных рукапісаў, што захоўваюцца ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя Леніна ў Менску[25], ён ня меў наконт гэтага ўстойлівага меркаваньня[26].

Да прыкладу, ён карыстаўся рознымі знакамі зьмякчэньня — апострафам і мяккім знакам (мысл', болиць), нескладовае "и" выражаў аднолькава як літарай "й", так і "ї" (рай, маї), а "о" пасьля мяккага зычнага — ці пры дапамозе "ё", ці "іо", ці нават "їо" (ён, іон, їон). Затое ў рукапісах Кастравіцкага мы не сустрэнем літары "щ", якую ён пасьлядоўна замяняў складзеным зь дзьвюх літараў знакам "шч". Таму не вядома, якой са сваіх канцэпцыяў правапісу ён трымаўся ў прыгатаваным тэксьце лемантара. Натуральна, апошняе слова ў гэтай справе належала выдавецтву, канкрэтней — Іваноўскаму, а зьяўленьне ў надрукаваным тэксьце спалучэньня "йо"(замест "ё" ці "іо"), якога не было ў рукапісах Кастравіцкага, сьведчыла, што ня ўсе ягоныя ідэі былі прынятыя. Затое несумненным вынаходніцтвам Кастравіцкага быў новы знак "шч", які быў прыняты выдавецтвам і назаўсёды ўвайшоў у беларускі альфабэт.

Не знайшла падтрымкі выдавецтва канцэпцыя Кастравіцкага выкарыстоўваць паўднёва-заходні дыялект як аснову для стварэньня беларускай агульнанароднай мовы. Іваноўскі аддаваў перавагу цэнтральным беларускім гаворкам, таму прыгатаваны Кастравіцкім тэкст быў папраўлены[27].

Але, нягледзячы на намаганьні карэктараў, ня ўсе паўднёва-заходнія дыялектызмы былі выдаленыя з гэтага тэксту, пра што гавораць, сярод іншага, сьляды оканьня (познаваць, покажы, богатый). Не ўжываў Кастравіцкі таксама некаторых лексэмаў, якія сустракаліся ў лацінкавым варыянце, папракаў Іваноўскага за ўжываньне паланізмаў і ўвёў у свой тэкст шматлікія словы, якія адрозьніваліся ад прынятых у лацінкавым варыянце з пункту гледжаньня фанэтыкі, марфалёгіі, а часам і сэнсу (гл. табліцу 3). Гэтыя разыходжаньні маюць істотнае значэньне для высьвятленьня аўтарства лемантара, будучы дадатковым довадам, які пацьвярджае, што два варыянты падручніка былі справай не аднаго, а двух аўтараў.

Гэтыя акалічнасьці ўзьнікненьня лемантара тлумачаць прычыну таго, чаму ён выйшаў ананімна. У пэўнай ступені яна вынікае з характару гэтага падручніка, два варыянты якога былі своеасаблівай кампазыцыяй адаптаваных з падручніка Промыка элемэнтаў і арыгінальнага беларускага дыдактычнага матэрыялу. Абедзьве гэтыя складовыя часткі былі істотныя, што рабіла праблемным дакладнае вызначэньне аўтара лемантара. Апрача гэтага, вынаходніцтва формулы, якая б указала на аўтара лемантара, было магчымым толькі ў выпадку з лацінкавым варыянтам. Сытуацыю ўскладнялі абставіны працы над другім варыянтам (кірыліцай), а менавіта зробленыя выдавецтвам зьмены ў

[23] Касьпяровіч М. Тамсама. С. 96—97.

[24] Каганец Карусь. Творы. Мінск, 1979. С. 261.

[25] З 1992 г. Нацыянальная бібліятэка Беларусі. — *А.С.*

[26] Погляды Кастравіцкага адносна гэтага пытаньня выклалі: Касьпяровіч М. Тамсама. С. 96—99 і Германовіч І.К. Тамсама. С. 31—37.

[27] Касьпяровіч М. Тамсама. С. 96—97.

Табліца 3. Асобныя разыходжаньні ў двух варыянтах "Беларускага лемэнтара" (у дужках падаюцца старонкі адпаведнага выданьня)

Варыянт, выдадзены лацінкай	Варыянт, выдадзены кірыліцай
na lementáru (3)	на лемэнтары? (5)
litéra za litéraju (3)	знак за знакам (5)
skład pa składzi (3)	склад за складам (5)
dauniéj (3)	раней (5)
swáracca (4)	сваруцца (5)
abója (5)	абодва (7)
zubámi (7)	зубми (9)
múchy (7)	мухи (9)
ja báczu czarauniká (14)	нихто николи ня бачыў чараўника (18)
żółudzi (16)	жалуды (21)
użé (16)	ужо (22)
siahódnia (17)	сягоньня (23)
wot (20)	вось (26)
Wílnia (22)	Вильна (27)
prózwiska (21)	прозвишча (27)
ksiónżka (апошняя старонка без нумарацыі)	книга (апошняя старонка без нумарацыі)

тэксьце Каставіцкага. Гэтыя зьмены былі ўнесеныя безь яго ўдзелу і згоды[28], у сувязі з чым гэты варыянт ня мог быць выдадзены пад ягоным прозьвішчам, што для раўнавагі вымагала ананімнасьці таксама і лацінкавага варыянту.

"Беларускі лемэнтар" трапіў да друкарні К. Пянткоўскага (K. Piątkowskiego) у Пецярбургу яшчэ да афіцыйнай рэгістрацыі выдавецкай суполкі "Загляне сонца і ў наша аконца". На гэта ўказвае ліст Іваноўскага за 17 красавіка 1906 г., у якім ён паведамляў Ельскаму, што лемантар ужо друкуецца[29].

Гэта сьведчыць пра тое, што падручнік выдаваўся сьпехам, што, пэўна, паўплывала на ўзьнікненьне згаданых карэктарскіх недаглядаў — вельмі карысных для дасьледчыкаў ягонай генэзы. У чарговым лісьце за 1 жніўня 1906 г. Іваноўскі мог нарэшце паведаміць Ельскаму пра зьяўленьне падручніка[30], з чаго вынікае, што кніга выйшла з друку ў ліпені 1906 г. Гэта быў лацінкавы варыянт — першы пункт выдавецкай праграмы гэтай суполкі. Другі варыянт (кірыліцай) быў надрукаваны на некалькі тыдняў пазьней, што было выклікана неабходнасьцю дапрацаваць тэкст Каставіцкага. Навіну пра выхад гэтага падручніка першай зьмясьціла віленская "Наша Доля" ў нумары 2 за 15 верасьня 1906. "Беларускі лемэнтар" спаткаў моцную зацікаўленасьць спажыўцоў, пра гэта гаворыць той факт, што падручнік зьнік з публікаваных у прэсе абвестак суполкі нашмат хутчэй, чым выдадзеныя раней беларускія кніжкі ("Вязанка" Янкі Лучыны, "Казкі" і інш.).

Гэтая акалічнасьць была зьвязана з попытам грамадзтва на беларускія школьныя падручнікі, які ўзьнік ува ўмовах першай рэвалюцыі ў Расеі 1905 г. Характэрную ілюстрацыю тагачасных настрояў дае ліст Ядвігі Ціхінскай з маёнтку Прусан каля Крычава Магілёўскай губэрні да Ельскага ад 3 чэрвеня 1905 г.:

Шаноўны пане! Пара было б сёньня ўзяцца за складаньне беларускага лемантара, калі б вы падумалі аб тым. З той пары, калі можна стала адчыняць прыватныя школы (мы ўжо таксама

[28] Тамсама.
[29] AGAD. Zespół Prozorów i Jelskich, syg. 1402.
[30] Тамсама.

> пачынаем будаваць і зьбіраць на гэта грошы), трэба даць падручнікі–лемантары і беларускія кніжкі. Ведаю, што вы пішаце па–беларуску. Мой бацька складае беларуска–польска–расейскі слоўнік, і гэта даказвае, што ён беларускі патрыёт... Прашу даслаць мне каталёг альбо сьпіс беларускіх кніжак і падаць адрас, дзе можна дастаць для сялян сёньня хоць пару асобнікаў...[31]

Падобных просьбаў у архіўным зборы Ельскіх знойдзем і больш. Але надзеі на дазвол царскіх уладаў адкрыць афіцыйныя беларускія школы ня спраўдзіліся, таму ў шматлікіх мясцовасьцях было арганізаванае падпольнае навучаньне. Такую школку стварыла, між іншых, Леантына Корсак (Korsakowa) у Бардзіловічах Дрысенскага павету на Віцебшчыне і выпісала зь Пецярбургу для сваіх вучняў "Беларускі лемэнтар"[32]. Падобную школку арганізаваў Канстанцін Гардзялкоўскі ў Папоўцы Сянскога павету таксама на Віцебшчыне (у ёй выкладаў у 1908 г. Якуб Колас)[33].

Выданьне беларускага лемантара летам 1906 г. прыпала на час, калі попыт грамадзтва на беларускія кніжкі абудзіўся рэвалюцыйнымі падзеямі, але не яны вызначылі зьяўленьне падручніка. Як было сказана вышэй, Іваноўскі прыступіў да працы над ім восеньню 1904 г., задума гэтага пачынаньня нарадзілася яшчэ ў 1902 г. Гэта былі перадрэвалюцыйныя гады, а тагачасныя ўмовы, у якіх знаходзілася грамадзтва, ня вельмі адрозьніваліся ад часоў Багушэвіча. Ідэя выданьня лемантара, да якой яшчэ не дасьпелі Марцінкевіч, Багушэвіч і іх сучасьнікі, была для тых часоў рэвалюцыйнай, бо выражала разрыў з традыцыяй XIX ст. Яе рэалізатары прыступалі да працы ў той час, калі набыткі рэвалюцыі яшчэ не былі ім вядомыя. Гэта сьведчыць ня столькі пра іхныя прарочыя здольнасьці, колькі пра рашучасьць намеру выдаць лемантар нават у нелегальных умовах і ў гэтых абставінах абудзіць цікавасьць грамадзтва да сваёй ініцыятывы[34].

Сярод разрозьненых, лягічна не зьвязаных паміж сабой сказаў, якія служылі матэрыялам для пачатковага навучаньня чытаць, знайшоўся адзін асаблівы, які мала што значыў для вучняў, але выражаў стаўленьне ягоных стваральнікаў — Іваноўскага і Кастравіцкага — да рэалізаванай задачы. Гучаў ён у абодвух варыянтах аднолькава: "Jany biarucca za heta dzieła i dumając, szto im udasca jano". Гэтым "дзелам" было стварэньне агульнанацыянальнай беларускай мовы і яе папулярызацыя, чаго і мусіў дасягнуць выдадзены падручнік. Сфармуляваныя ў ім прынцыпы акадэмік Я. Карскі красамоўна назваў пачаткам спэцыфічнага беларускага правапісу[35].

Цягам часу яны былі разьвітыя і ўдасканаленыя, але на пачатку XX ст. яны стварылі ў гэтым абсягу адбыты факт, над якім можна было спрачацца, але які немагчыма было ігнараваць.

Пераклад зроблены паводле: Slavia Orientalis. T. XXXV. 1986. № 3.

[31] Тамсама. Syg. 140—1. K. 151—152.
[32] Паведамленьне дачкі Л. Корсак, Зоф'і Дабрынскай, ад 12.04.1984.
[33] Александровіч С. На шырокі прастор. Аповесць пра Якуба Коласа. Мінск, 1979. С. 276—279.
[34] На гэта ўказвае цытаваны вышэй зварот да чытачоў з просьбай перадаваць кнігараспаўсюднікам усе заўвагі адносна зьместу лемантара — тыповы спосаб для канспірацыйнай выдавецкай дзейнасьці.
[35] Karskij E. Geschichte der weissrussischen Volksdichtung und Literatur. Berlin—Leipzig, 1926. S. 147.

З гісторыі беларускага выдавецкага руху ў 1902—1905 гадох

На парозе XX ст. беларускі выдавецкі наробак быў яшчэ надзвычай сьціплы. Гэта было абумоўлена шэрагам гістарычных перадумоваў, у тым ліку асабліва русіфікацыйнай палітыкай царызму. Паводле Юліі Бібілы, з часу паўстаньня 1864 г. да 1900 г., г.зн. амаль на працягу сарака гадоў, на абсягах Расейскай імпэрыі вялікага пярэчаньня цэнзуры ня выклікалі ўсяго толькі дзевяць брашур, выдазеных на беларускай мове агульным аб'ёмам у 160 старонак невялікага фармату[1]. У гэты самы час за мяжою зьявілася сем ці восем кніг з удвая большым агульным аб'ёмам[2]. Нягледзячы на цяжкасьці, выкліканыя нелегальным характарам іхнага распаўсюду, яны зрабілі вялікі ўплыў на разьвіцьцё беларускай мастацкай літаратуры і прагрэсіўнай грамадзка–палітычнай думкі. Адмысловае значэньне мелі ў гэтым пляне творы Францішка Багушэвіча, якія былі свайго роду альфай і амэгай для дзеячаў беларускага адраджэньня. Варта адзначыць, што амаль уся гэтая выдавецкая прадукцыя паўстала ў апошнім дзесяцігодзьдзі XIX ст., што можна ацаніць як важны сымптом нараджэньня грамадзкага попыту на беларускую кніжку.

Лёнданскія брашуры ППС

Выразнае ажыўленьне выдавецкае дзейнасьці пачалося на пачатку XX ст., за яе — поруч з самімі беларусамі — дзеля рэалізацыі сваіх палітычных мэтаў узялася Польская Сацыялістычная Партыя (ППС). Гэтыя мэты, акрэсьленыя на арганізацыйным зьезьдзе ППС у Парыжы (лістапад 1892 г.) і разьвітыя на III зьезьдзе ў Вільні (чэрвень 1895 г.), прадугледжвалі пашырэньне партыйнае дзейнасьці на Літву, Беларусь і Украіну, абуджэньне і падтрымку сэпаратысцкіх тэндэнцыяў сярод мясцовых сацыялістычных арганізацыяў, а таксама іх згуртаваньне пад эгідаю ППС для барацьбы з царызмам[3]. Аднак у першым дзесяцігодзьдзі свайго існаваньня ППС не распачала выдавецкай дзейнасьці на беларускай мове, арганізоўваючы затое нелегальны ўвоз некаторых беларускіх замежных выданьняў праз мяжу Расейскай імпэрыі[4].

Істотныя зьмены ў гэтым аспэкце прынесьлі пастановы VI зьезду ППС у Любліне

[1] Летапіс беларускага друку. Ч. 2. Пасобныя выданьні на беларускай мове 1835—1916. Склала Ю.І. Бібіла. Выдавецтва Беларускай Дзяржаўнай Бібліятэкі. Менск, 1929. Гэта былі наступныя выданьні: Гаршын У. Сыгнал. Масква, 1891. — 31 с.; Ельскі А. Сынок! Пецярбург, 1895. — 13 с.; Ельскі А. Выбіраймася ў прочкі! Скарэй у Томск! Пецярбург, 1896. — 24 с.; Ельский А. Наши переселенцы. Віцебск, 1896. — 15 с.; Ельскі А. Слова аб праклятай гарэлцы. Пецярбург, 1900. — 9 с.; Тарас на Парнасе. Горадня, 1896. — 12 с.; тое ж. Віцебск, 1896. — 15 с. і 1898. — 17 с.; тое ж. Магілёў, 1900. — 24 с. Не разглядаюцца тут творы А. Пшчолкі, напісаныя збольшага па–расейску.

[2] Тамсама. Пра багацтво да беднасьць. Жэнэва, 1881. — 32 с.; Багушэвіч Ф. Дудка беларуская. Кракаў, 1891. — 77 с. і 1896. — 78 с.; яго ж. Тралялёначка. Кракаў, 1892. — 11 с.; яго ж. Смык беларускі. Познань, 1894. — 40 с.; Міцкевіч А. Пан Тадэуш. Пералажыў А. Ельскі. Львоў, 1893. — 41 с.; Дзядзька Антон. Тыльзыт, 1892. — 46 с. Паводле Ю. Бібілы, у 1891 г. за мяжою была выдадзеная "Вязанка" Я. Лучыны, якая, праўда, дагэтуль не была знойдзеная.

[3] Materiały do historii PPS i ruchu rewolucyjnego w zaborze rosyjskim 1893—1897. Warszawa, 1907. S. 19 i 149.

[4] Тамсама. С. 173. У 1895 г. праз перапраўны пункт каля Таўруг цераз прускую мяжу было правезена 332 асобнікі беларускіх выданьняў.

(чэрвень 1902 г.), якія прадугледжвалі шырэйшы ўлік нацыянальнай спэцыфікі ў партыйнай працы ў Літве і Беларусі. Між іншым была створаная асобная акруга ППС для літоўска–беларускіх земляў (т.зв. "ППС у Літве"), а Цэнтральны Рабочы Камітэт (ЦРК) быў упаўнаважаны выдаваць агітацыйную літаратуру на мясцовых мовах. Зьезд пастанавіў пры гэтым, што "ППС пакідае за сабою паўнамоцтвы ўплываць на беларускі народ даступнымі ёй сродкамі, якія не супярэчаць прынцыпам і інтарэсам Беларускай сац[ыялістычнай] арг[анізацыі]"[5]. Такое рашэньне зьезду стварыла падставы для таго, каб ППС распачала ў Літве выданьне трох агітацыйных брашур на беларускай мове: "Гуторка об тым, куды мужыцкіе грошы ідуць", "Як зробіць каб людзям стало добрэ на сьвеці" і "Хто праўдзівы прыяцель бедного народу"[6].

Ідэя выданьня гэтых брашур, аднак, нарадзілася не на VI зьезьдзе ППС, а ППС паўстала крыху раней, імаверна, сярод сяброў ейнага гарадзенскага аддзяленьня. Паводле Браніслава Шушкевіча — аднаго зь дзеячоў гэтай арганізацыі, — іх апрацаваньнем занялася Яніна Міхнёўская, абшарніца зь Міневічаў Гарадзенскага павету, якая ў 1901 г. далучылася да дзейнасьці ППС у Горадні. Гэта, аднак, былі не звычайныя пераклады папулярных у той час польскіх агітацыйных брашур ("Ojciec Szymon", "Dobra Nowina") і інш., а творчая іх перапрацоўка, прыстасаваная да паняцьцяў беларускіх сялянаў[7].

Міхнёўская скончыла працу над брашурамі сама позна ўвесну 1902 г., пасьля чаго іх рукапісы былі перададзеныя Вітальду Ёдку–Наркевічу; ён у той час знаходзіўся ў Львове і летам 1902 г. пераслаў іх кіраўніку партыйнай друкарні ў Лёндане Баляславу Антаніну Енджэёўскаму (псэўд. Канёўскі).

Як вынікае са зьместу лістоў Ёдкі–Наркевіча да Енджэёўскага, дзеячоў асабліва хвалявала пытаньне шрыфту, якім меліся быць надрукаваныя беларускія брашуры. Енджэёўскі меў намер выдаваць іх кірыліцай, пра што хутчэй за ўсё ў жніўні паінфармаваў Ёдку–Наркевіча. Той, аднак, аддаў перавагу лацінцы, што ў лісьце ад 21 верасьня 1902 г. абгрунтоўваў наступным чынам: "Я б друкаваў беларускія рэчы польскаю абэцэдаю; 1. яна больш адпаведная, бо мае *ć, ś, dź*, 2. там (на Беларусі. — *Ю.Т.*) ня ўмеюць чытаць ані "кірыліцай", ані лацінскімі літарамі, таму ўсё адно, як друкаваць, а інтэлігенцыя, якая будзе чытаць гэта сялянам, нашу абэцэду знае"[8]. Час, відавочна, прысьпешваў, таму Енджэёўскі, не чакаючы ўзгадненьня справы, вырашыў друкаваць брашуры кірыліцаю, на што ўказвае наступны ліст Ёдкі–Наркевіча ад 20 кастрычніка 1902 г.: "Пераходжу да твайго (ліста. — *Ю.Т.*) ад 21 м[інулага] м[есяца]. Мяне надзвычай засмучае, што вы робіце набор беларускай рэчы кірыліцаю"[9].

Як паказваюць даты гэтага ліставаньня, набор першай брашуры быў пачаты да 21 верасьня 1902 году. Гэта была "Гуторка об тым, куды мужыцкіе грошы ідуць", якая выйшла ўжо ў кастрычніку ці ў лістападзе. За некалькі тыдняў — у лістападзе ці сьнежні — выйшла друкам наступная брашура "Як зробіць каб людзям стало добрэ на сьвеці". Брашуры налічвалі адпаведна 16 і 13 старонак невялікага фармату, наклад кожнай зь іх складаў 2000 асобнікаў, а кошт выданьня 52 рублі 80 капеек[10]. Такім чынам, хаця ўсе тры

[5] Centralne Archiwum Komitetu Centralnego Polskiej Zjednoczonej Partii Robotniczej [далей — CA PZPR] 305/III/1 pt. 2. K. 36—40, Матэрыялы VI зьезду ППС.

[6] Сёньня гэтыя брашуры — бібліяграфічная рэдкасьць. "Хто праўдзівы прыяцель бедного народу" захоўваецца ў Бібліятэцы інстытуту славяназнаўства ПАН, астатнія ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве.

[7] Szuszkiewicz B. Organizacja grodzieńska PPS w latach 1898—1910 // Niepodległość. 1937. № 3(44). S. 529, 539. Шушкевіч піша пра тое, што Міхнёўская выканала пераклад трох брашураў, хаця прыводзіць назву толькі адной — "Гуторкі..." Лінгвістычны аналіз тэкстаў (лексыка, граматыка, ідыёмы, правапіс) пацьвярджае, што ўсе тры брашуры былі падрыхтаваныя адным аўтарам.

[8] CA PZPR 305/VII/49 pt. 1, ліст В. Ёдкі–Наркевіча ад 21.09.1902 г.

[9] Тамсама. Ліст В. Ёдкі–Наркевіча ад 20.10.1902 г.

[10] Przedświt. 1902. № 11—12. S. 445, 517; 1903. № 1. S. 37.

брашуры былі выдадзеныя з датаю 1903 г., першыя дзьве выйшлі ўжо ў апошніх месяцах 1902 г., і толькі трэцяя — "Хто праўдзівы прыяцель бедного народу" (16 старонак) — зьявілася ў студзені 1903 г., імаверна, тым сама накладам і тым сама коштам[11]. Іх набор рабіў Дамінік Сямашка, сябра Замежнага аддзяленьня ППС, які быў дэлегаваны з гэтаю мэтай з Парыжу ў Лёндан. У канцы студзеня 1903 г. увесь наклад гэтых брашураў быў перасланы ў Кракаў, адкуль яны былі дастаўленыя ў Беларусь. Гэтая нелегальная перавозка была скончаная, напэўна, у сакавіку—красавіку 1904 г., паколькі з таго часу яны перасталі зьяўляцца ў анонсах выданьняў ППС, друкаваных на вокладках "Przedświtu".

Напрыканцы 1902 г. "Гасло" — орган Украінскай рэвалюцыйнай партыі — прывітала выхад "Гуторкі..." наступным чынам:

> Перад намі ляжыць невялічкая брашурка на беларускай мове, на той мове, якая найбліжэйшая да ўкраінскае. Але выдадзеная яна была не ўкраінскімі, не беларускімі і не расейскімі сацыялістамі. Як вядома, беларускай сацыялістычнай партыі не існуе[12], таму што, на жаль, беларускія сяляне і работнікі ня маюць уласнай інтэлігенцыі, якая б працавала сярод гэтага няшчаснага, эксплёатаванага народу. Мы лічым надзвычай вялікай заслугаю ППС, што яно ўзьняло пытаньне пра неабходнасьць сацыялістычна-рэвалюцыйнай прапаганды на Белай Русі на мове ейнага народу. <...> Выданьне гэтай брашуры яшчэ раз яскрава даводзіць усім, што ППС далёкая ад якога-кольвек нацыяналістычнага ўхілу <...>[13].

Камэнтуючы гэтае выказваньне, рэдакцыя "Przedświtu" зазначыла, што "распачатае намі выданьне беларускіх кніжак ёсьць непасрэдным наступствам таго, што нашая партыя прыступіла да шырокай агітацыйнай працы ў Літве"[14].

Гэтае наступства, аднак, не было такім непасрэдным, як яго ацаніў "Przedświt", а тэндэнцыя да агітацыйнай працы на беларускай мове не трывала доўга. Наступным і адначасова апошнім беларускім выданьнем, самастойна падрыхтаваным ППС у Літве, была адозва да працоўных з-пад Скідзеля "До браці мужыкоў", надрукаваная ў траўні 1903 г. у мясцовай (krajowej) падпольнай друкарні[15]. Беручы пад увагу падабенства лексыкі і ўжытага правапісу, падаецца, што, як і тры лёнданскія брашуры, яна была апрацаваная Міхнёўскай з гарадзенскай арганізацыі ППС. Дарэчна заўважыць, што гэтыя публікацыі, часта прапагандаваныя ў кракаўскім "Przedświcie", замоўчваліся ў органе ППС у Літве — віленскай "Walce"; гэта сьведчыла, што паміж імі існавалі разыходжаньні наконт прапаганды на беларускай мове.

Наагул пазытыўна ў той жа час лёнданскія брашуры былі прынятыя ў беларускіх колах, якія ў значнай ступені спрычыніліся да іх распаўсюду. Брашуры гэтыя выконвалі, магчыма, не зусім прадугледжаную выдаўцамі падвойную ролю: яны пашыралі ў грамадзтве элемэнтарныя прынцыпы рэвалюцыйнага мысьленьня і адначасова папулярызавалі беларускую мову, узбагачаючы яе грамадзка-палітычнаю лексыкай, і павышалі статус гэтай мовы, спрычыняючыся адначасова да разьвіцьця нацыянальнай сьвядомасьці беларусаў. Як сьцьвярджаў праз гады Рамуальд Зямкевіч, "Гуторка..." і іншыя лёнданскія брашуры адыгралі вялікую ролю ў яго зацікаўленасьці беларушчынай[16].

Мусіць, гэта іх меў на ўвазе Янка Купала, кажучы пра вырашальны ўплыў рэвалю-

[11] Тамсама. 1903. № 2. S. 78.

[12] Адсюль можна зрабіць выснову, што напрыканцы 1902 г. "Гасло" ня ведала пра існаваньне Беларускай Рэвалюцыйнай Партыі.

[13] Przedświt. 1903. № 1. S. 21—22.

[14] Тамсама.

[15] Тамсама. 1903. № 6. S. 246. Арыгінальны тэкст адозвы захоўваецца ў CA KC PZPR 305/III/36 pt. 8. K. 1. Матэрыялы ППС у Літве.

[16] Шлюбскі А. Новыя матэрыялы па гісторыі "Нашае Долі" // Полымя. 1929. № 3. С. 204.

цыйных адозваў на беларускай мове на тое, што ён пачаў тварыць па–беларуску[17].

Вялікая папулярнасьць лёнданскіх брашураў ППС у беларускіх асяродках спрычынілася да зьяўленьня ў гістарычнай літаратуры сьцьверджаньняў, нібыта Беларуская Рэвалюцыйная Грамада брала ўдзел у іх выданьні. Так, напрыклад, у 1923 г. Антон Луцкевіч пісаў, што "Гуторка..." была выдадзеная адно "пры дапамозе і пад эгідаю ППС", адзначаючы адначасова ролю ў гэтай справе свайго брата Івана, які ўвосень 1902 г. нібыта распачаў у Пецярбургу збор сродкаў на яе выданьне[18]. Вэрсія гэтая ў крыху іншай форме была ім паўтораная ў 1928 годзе[19].

У сьвятле прыведзеных фактаў гэтыя выказваньні, магчыма, не заслугоўвалі б увагі, калі б не служылі для фармуляваньня падобных ацэнак таксама і сучасным аўтарам[20].

Выдавецкія спробы БРП

Публікацыі Польскай Сацыялістычнай Партыі, аднак, не закранаді праблемы беларускага нацыянальнага адраджэньня і нават выразна яе ігнаравалі[21].

Ясная рэч, што справа беларускай асьветы, культуры і нацыянальнай сьвядомасьці была задачаю не ППС, а саміх беларусаў. Захады ў гэтым кірунку рабіліся імі ў недалёкай мінуўшчыне ("Гомон", Адам Гурыновіч і іншыя), аднак яны былі адзінкавымі, і хоць і пакінулі заўважны сьлед у гісторыі і літаратуры, аднак не спарадзілі ані шырэйшага грамадзкага розгаласу, ані сталага выдавецкага руху.

Чарговую спробу распачаць выдавецкую дзейнасьць зрабіў Вацлаў Іваноўскі, які, скончыўшы гімназію ў Варшаве, увосень 1899 г. прыехаў у Пецярбург і паступіў на хімічны факультэт Тэхналягічнага інстытуту. Тут ён арганізаваў беларускі гурток, які неўзабаве атрымаў назву Беларуская Рэвалюцыйная Партыя. Між іншымі ён залучыў да супрацоўніцтва студэнтаў Тэхналягічнага інстытуту — віленчука Лявона Малецкага і Антона Неканду–Трэпку зь Менску, а таксама дзеячоў пецярбурскай арганізацыі ППС — Мечыслава Міхаловіча і Рамуальда Мілера. Задачаю БРП была перадусім арганізацыя незалежнага беларускага выдавецтва, аднак яе выкананьне сустракала сур'ёзныя перашкоды. Адсутнічалі фінансавыя сродкі, адпаведныя спэцыялісты і нават асновы граматыкі і правапісу беларускай мовы, чаму істотна паспрыялі створаныя царскімі ўладамі абмежаваньні друку на гэтай мове. Цяжкасьці гэтыя не разахвоцілі Іваноўскага, які верыў — кажучы ягонымі словамі — у магчымасьць стварыць "штосьці зь нічога". Ён пачаў з адносна сьціплай справы, а менавіта зь нелегальнай куплі памнажальнага апарату, на што патраціў усё заробленае падчас студэнцкай практыкі, адбытай улетку 1902 году[22].

Першаю адбітай на гектографе публікацыяй Беларускай Рэвалюцыйнай Партыі была адозва "Да інтэлігенцыі", якая зьявілася ў кастрычніку 1902 году. Як сьцьвярджае Аляксандар Бурбіс, яна была напісаная Малецкім у Вільні[23], гэта магло б сьведчыць пра тое,

---

[17] Кісялёў Г. Пуцявінамі Янкі Купалы. Дакументы і матэрыялы // Мінск: Навука і тэхніка, 1981. С. 7. — *Ю.Т.*
Гл. таксама: Купала Я. Поўны збор твораў. Т. 9. Кн. 1. С. 271. — *А.С.*

[18] Г.Б. Дваццатыя ўгодкі БРГ // Змаганьне. 1923. № 21.

[19] Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў. 1903—1928. Вільня, 1928. С. 13.

[20] Александровіч С. Пуцявіны роднага слова. Мінск, 1971. С. 118.

[21] Выдаўцы лёнданскіх брашураў не цікавіліся фактам, што беларускія дзеці не маглі засвойваць школьныя прадметы на роднай мове; у той жа час яны абураліся на царскія ўлады з нагоды забароны іх адукацыі на польскай мове. Пар.: Як зробіць, каб людзям стало добра на сьвеці. Лёндан, 1903. С. 8.

[22] Станкевіч А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня. Вільня, 1934. С. 69.

[23] Бурбіс А. Беларуская Соцыялістычная Грамада ў першым пэрыядзе яе працы // Беларусь. Нарысы гісторыі, эканомікі, культуры і рэволюцыйнага руху. Менск, 1924. С. 178. — *Ю.Т.*
Поўная вэрсія гэтае працы — пад загалоўкам "Кароткі агляд беларускага нацыянальна–рэвалюцыйнага руху" — надрукаваная ў беларускім дадатку да часопіса "Вестник Народного Комиссарита Просвещения". Менск, 1921. № 1—2. — *А.С.*

што яна паўстала падчас летніх вакацыяў 1902 г., якія аўтар правёў у бацькоўскім доме. Варта заўважыць, што яна была напісаная і выдадзеная па–польску, для прасьцейшага яе прыняцьця адрасатамі — палянізаванаю інтэлігенцыяй Беларусі. Адозва апісвала долю цёмнага ашуканага і эксплёатаванага беларускага народу, абвінавачвала сацыяльныя пласты, якія патураюць царскаму рэжыму "сыстэматычна абкрадаць народ свой зь лепшай долі" і заклікала:

> Дайце народу асьвету, але дайце яе на роднай мове. Інакш яна ніколі не праточыцца ў нізы. Розум дзіцяці, які зь цяжкасьцю засвойвае агульныя паняцьці, робіць падвойную працу, засвойваючы іх на чужой мове. Адсюль недакладнасьць, хаос, зьнеахвочанасьць да вучэньня. Родная мова — гэта ж выраз душы, яе пачуцьцяў, думак. Урад ведае, што робіць, калі кідае жабрачыя аб'едкі асьветы па–расейску: ён ці ўвогуле адбівае ахвоту да навукі, ці стварае блытаніну паняцьцяў, разрывае непасрэдную еднасьць з народам у самых здольных, робіць зь іх слугаў, што мысьляць па–расейску, у зародку нішчыць нацыянальную адметнасьць, затрымлівае разьвіцьцё беларускай культуры. З усіх яго злачынстваў гэтае, бадай, найвялікшае: катаваньне дзяцінага розуму, скрыўленьне інтэлектуальнага разьвіцьця, маральнае разбэшчваньне — а ў пэрспэктыве — ператварэньне ў маскаля мовай і розумам, а калі ты яшчэ і праваслаўны — перад беларусам адкрываецца шлях да ганаровых пасадаў і дабрабыту — цаной здрады народу.
> Дайце народу спазнаць сваё мінулае. Чалавек, які ня памятае таго, што рабіў, адчуваў, думаў, які не распараджаецца нават уласным досьведам, — ня ведае, як распараджацца сабой, робіцца лялькай, людзкім пасьмешышчам. Ён можа толькі весьці вэгетатыўнае існаваньне. Гэта амаль быдла. І гэта — доля народу, які ня памятае гісторыі продкаў. Дык вы сталі нявольнікамі ня толькі таму, што вас зламалі паразы — вы сталі нявольнікамі праз свае душы — вы вернападданыя маскоўскага цара. Дзе вашыя законы? У пыле, забытыя, гніюць у бібліятэках, затое ўсемагутны бізун вісіць над вамі... Тым, чым для кожнай душы ёсьць сьвядомасьць, якая нанізвае на адну нітку пражытыя імгненьні, тое для нацыяў — злучэньне мінулых стагодзьдзяў зь цяперашчынай; аволодаваньне ёй, рахункам сумленьня, крыніцай, зь якой струменіць жаданьне новай працы для будучыні[24].

Выдаўцы адозвы разумелі, што распачаць шырокую асьветніцкую працу сярод беларускага народу пакуль немагчыма. "Даць людзям асьвету, пазнаёміць з роднай гісторыяй, — пісалі яны, — але як? Народнай літаратуры амаль, няма, няма гісторыі..." Але ж яны высунулі пастулят, просты на словах, ды такі складаны на справе: "Іх належыць стварыць!" Цяпер гэта было штосьці большае, чым пажаданьне: да яго далучалася канкрэтная праграма стварэньня элемэнтарных арганізацыйных і матэрыяльных умоваў, якія мусілі зрабіць магчымымі калектыўны культуратворчы высілак. Выглядаў ён так:

1. Засноўваць гурткі для працы над роднай мовай (граматыка!), краязнаўствам, гісторыяй, літаратурай. Зьвярнуцца да спэцыялістаў з просьбай прачытаць лекцыі і напісаць адпаведныя творы. Палегчыць ім гэтую працу, даўшы матэрыяльную дапамогу.
2. Прыступіць да перакладу адпаведных твораў з польскай і расейскай літаратураў.
3. Арганізаваць збор сродкаў на выдавецкія мэты.
4. Арганізаваць продаж альбо распаўсюд выданьняў[25].

Апошні пункт праграмы ("Выказваць пагарду тым, хто гэтага рабіць ня будзе") паказваў таксама на рашучасьць дзеяньняў БРП, а таксама на яе імкненьне стварыць адпаведны грамадзкі клімат, які б спрыяў разгортваньню запланаванай выдавецкай і асьветніцкай дзейнасьці. Адозва "Да інтэлігенцыі" фармулявала намеры, якія Іваноўскі разьвіваў з часу свайго прыбыцьця ў Пецярбург і якія былі асновай ягонай грамадзкай дзейнасьці цягам больш чым дзесяці наступных год. Такім чынам, можна зрабіць выс-

[24] Przedświt. 1903. № 2. S. 53—54. Тамсама поўны тэкст адозвы.
[25] Тамсама.

нову, што праграма гэтая была распрацаваная пад ягоным непасрэдным кіраўніцтвам.

Чарговым выданьнем Іваноўскага была газэта "Свабода", задуманая як орган Беларускай Рэвалюцыйнай Партыі. Першы і адзіны яе васьмістаронкавы нумар быў надрукаваны на гектографе ў канцы сьнежня 1902 году (з датаю 1903 г.), а ў яго падрыхтоўцы ўжо ўдзельнічала невялікая група студэнтаў, у склад якой, апроч Іваноўскага і Малецкага, уваходзілі: Рамуальд Мілер, Антон Валейка, Вінцэнт Валейка, а таксама Алёйзія Пашкевіч (Цётка) і, імаверна, Іван Луцкевіч, якія ўвосень 1902 г. прыехалі ў Пецярбург. Аднак дзеля непрадбачаных абставінаў амаль увесь наклад "Свабоды" быў зьнішчаны і аніводзін з ацалелых асобнікаў ня быў да гэтага часу выяўлены[26].

Такім чынам, "Свабода" не была распаўсюджаная, у сувязі з чым яе выданьне мае значэньне адно для вывучэньня поглядаў яго стваральнікаў. Як паведамляў Адам Станкевіч, спасылаючыся на ліст Іваноўскага ад 16 лістапада 1934 г., у "Свабодзе" былі зьмешчаныя два артыкулы, зь якіх адзін быў прысьвечаны палітычнай тэматыцы, а другі — адметнасьці беларускай нацыі ад суседніх. Зьмест тых артыкулаў дагэтуль невядомы. Аднак вядомы паэтычны дэбют Цёткі — верш "Мужыцкая доля", які, аднак, ня меў ніякіх рэвалюцыйных ці антыўрадавых акцэнтаў[27].

Затое істотнае значэньне для характарыстыкі ідэйнай накіраванасьці "Свабоды" мае іншы зьмешчаны на яе старонках верш, выяўлены нядаўна ў Лёнданскім архіве ППС, які захоўваецца ў Цэнтральным архіве ЦК ПАРП[28].

Гэта верш Уладзіслава Сыракомлі "Добрыя весьці", які пасьля адпаведнай перапрацоўкі рэдактарамі "Свабоды" атрымаў абсалютна іншае гучаньне, прыстасаванае да новых умоваў рэвалюцыйнай барацьбы. Пераробка вершу адбылася ў двух кірунках: па-першае, былі зьнішчаныя ўсе антырасейскія акцэнты. Так, напрыклад, такія фармулёўкі Сыракомлі, як "лягчэй будзе сэрцу, як згінець маскаль" альбо "ня прыйдзе вораг з маскоўскага краю", атрымалі ў "Свабодзе" наступнае гучаньне: "лягчэй будзе сэрцу, як згіне наш цар" і "ня прыйдзе вораг з чужога краю"; па-другое, прапагандаваныя Сыракомлем клясавая згода і супраўцоўніцтва сялянства са шляхтаю былі замененыя ў "Свабодзе" ідэяй рабоча-сялянскай салідарнасьці. Вось характэрны прыклад пераробкі:

Сыракомля:	**"Свабода":**
Мужык з панамі стаіць за-пан-браце	Мужык з рабочымі стаіць за панбраце
Рука за руку, а грудзь за грудзь.	Рука за руку, грудзь за грудзь.
Пяром на карце, ды сахой на ніве	Рукой у фабрыцы, сахой на ніве
Адзін другому роўнасьць засьцярог.	Адзін другому вольнасьць засьцярог.

Верш гэты, а ў прыватнасьці зьнішчэньне ў ім антырасейскіх акцэнтаў, мог быць успрыняты кіраўніцтвам ППС як адмова БРП прапагандаваць сэпаратысцкія ідэі. Насамрэч, БРП бачыла рашэньне беларускага пытаньня не ў аддзяленьні ад Расеі, а ў рэвалюцыі і дэмакратычных пераўтварэньнях у гэтай дзяржаве. Імаверна, гэта быў асноўны крытэр, які абумовіў стаўленьне ППС да БРП, выклікаўшы крытыку яе праграмы культурна-асьветніцкай працы, выражанай у адозьве "Да інтэлігенцыі". У лютым 1903 г. зь ёй выступіў "Przedświt", нэгатыўна ацэньваючы шанцы беларускага нацыянальнага

[26] Доля гэтай газэты пададзена мной больш разгорнута ў артыкуле: Па сьлядох "Свабоды". [Стар. гэтага выданьня].

[27] Пар.: Цётка. Творы. Мінск: Мастацкая літаратура, 1976. С. 68—70. Прынагодна варта зьняпраўдзіць зьмешчаную там інфармацыю (с. 291), нібыта гэты верш быў упершыню надрукаваны ў "Каляднай пісанцы", выдадзенай у Пецярбургу ў 1903 г.

[28] CA PZPR 305/III/55, pt. 12; Сыракомля У. Добрыя весьці // Свабода. 1903. № 1.

адраджэньня і прадказваючы БРП долю, якая за дваццаць год да гэтага напаткала рэдакцыю "Гоману"[29].

Праявай гэтых тэндэнцыяў была прынятая на прапанову Пілсудзкага пастанова віленскай канфэрэнцыі ЦРК (чэрвень 1903 г.), згодна зь якой ППС устрымлівалася ад далейшага самастойнага выданьня агітацыйнай літаратуры на беларускай мове[30].

Гэтая пастанова мела істотнае практычнае значэньне. У 1903 г. беларускія дзеячы, яшчэ разьлічваючы на выдавецкую дапамогу ППС, падрыхтавалі да друку некалькі чарговых агітацыйных брашураў на беларускай мове (у тым ліку аб прыгоне, а таксама пераклад расейскай брашуры "Бойкот и стачка") і пачалі збор сродкаў на іх друк. Брашуры гэтыя былі накіраваныя ў ЦРК ППС, аднак выдадзеныя не былі[31]. Ня быў выдадзены таксама і згаданы верш Сыракомлі "Добрыя весьці", які плянавалася выдаць у форме ўлёткі накладам 2000 асобнікаў[32].

Беларускі "Круг" у Пецярбургу

Гэтыя цяжкасьці паглыбілі зьмены, якія ў той час пачаліся ў адзінай дагэтуль арганізацыі ў Пецярбургу. Напрыканцы 1903 г. там дзейнічаюць ужо дзьве суполкі: Беларуская рэвалюцыйная грамада і "Круг Беларускай Народнай Прасьветы і Культуры".

Пакідаючы ўбаку палітычныя ці асабістыя перадумовы разыходжаньняў, якія ўзьніклі паміж гэтымі групоўкамі, падаецца мэтазгодным зьвярнуць увагу на іх выдавецкія аспэкты. Вось жа, Беларуская Рэвалюцыйная Грамада, неўзабаве перайменаваная ў Беларускую Сацыялістычную Грамаду, не пачала выдавецкай дзейнасьці ані ў 1903, ані ў 1904 годзе, а сваю першую адозву, названую "Цараво жніво", яна выдала адно ў студзені 1905 году[33]. Затое выдавецкую дзейнасьць працягваў пецярбурскі "Круг...", які ў той час быў галоўнай сфэрай грамадзкіх зацікаўленьняў Іваноўскага. У 1903 г. ён прыцягнуў да супрацоўніцтва студэнта Тэхналягічнага інстытуту Францішка Ўмястоўскага (псэўд. Дзядзька Пранук) і Казімера Кастравіцкага (псэўд. Карусь Каганец), а таксама яго брата Амброжага зь Ліды, наўпоблізь якой знаходзілася сядзіба Іваноўскіх у Лябёдцы — гэта ўзручняла іх узаемны кантакт. Нягледзячы на памяркоўныя культурныя і асьветніцкія мэты, "Круг..." ня мог дзейнічаць легальна і фармальна быў усяго прыватным хаўрусам людзей добрай волі, натхнёных супольным імкненьнем папулярызаваць беларускую кнігу. З гэтай прычыны пад эгідай "Круга..." выйшлі толькі нелегальныя брашуры пад назвамі "Калядная пісанка" і "Велікодная пісанка". Абедзьве былі выдадзеныя ў Пецярбургу на гектографе накладам у некалькі дзясяткаў асобнікаў кожная[34].

Як паведамляе прафэсар Сьцяпан Александровіч, "Калядная пісанка" зьявілася перад Раством 1903 г. і налічвала шэсьць старонак пісанага лацінкаю ад рукі і пасьля памножанага тэксту. Апроч кароткай прадмовы, яна зьмяшчала вершы Лучыны ("Роднай старонцы"), Каганца ("Малітва"), Цёткі, якая выступала тут пад псэўданімамі Банадысь Асака і Гаўрыла ("Мужыцкая доля" і "Мужык не зьмяніўся"), Дзядзькі Пранука ("Вецер") і дагэтуль невядомага паэта І. Стаўбуна ("Хто я?")[35].

Лепшаю з графічнага гледзішча была "Велікодная пісанка", выдадзеная падчас перадвелікоднага тыдня (у красавіку 1904 г.). Яна налічвала сем старонак памножанага машынапіснага тэксту ("кірыліцай") і, апроч прадмовы, зьмяшчала вершы Каганца ("Адважна

[29] Przedświt. 1903. № 2. S. 55—57.

[30] Sprawozdanie z konferencji CKR PPS z czerwca 1903 r. // Niepodległość. 1939. № 1(54). S. 111.

[31] CA PZPR 305/III/3, pt. 3. Пратакол канфэрэнцыі ЦРК ППС ад 16—17 сьнежня 1903 г.

[32] CA PZPR 305/III/55, pt. 12. Верш "Добрыя весьці".

[33] Бурбіс А. Тамсама. С. 179.

[34] Умястоўскі Ф. Праўда аб "Нашай Долі" // Беларускі Дзень. 1927. № 1; гл. таксама: Наша Ніва. 1914. № 5.

[35] Александровіч С. Тамсама. С. 113.

брацьце ўперад ідзіце...”), Гаўрылы–Цёткі (“Нямаш, але будзе” і “Музыкант беларускі”), а таксама апавяданьне Стэфана Жаромскага “Да свайго Бога” ў перакладзе Антося Дурнога. Цікавай публікацыяй, якая заканчвала “Велікодную пісанку”, была бібліяграфічная інфармацыя пра беларускую мастацкую і навуковую літаратуру[36].

Такім чынам, апроч перадрукаванага вершу Лучыны “Роднай старонцы”, у абедзьвюх “Пісанках” былі прадстаўлены сьціплы, аднак арыгінальны беларускі творчы наробак, які стаўся першым крокам у рэалізацыі праграмы, зьмешчанай у адозьве “Да інтэлігенцыі”.

Вялікае значэньне для папулярызацыі беларускай кнігі мела выданьне ў Пецярбургу дзьвюх друкаваных кніжак: зборніка вершаў Янкі Лучыны “Вязанка” (1903 г., 21 с.) і зборніку народных казак “Казкі” (1904 г., 31 с.). Александровіч мяркуе, што яны былі выдадзеныя “Кругам...”[37], што пацьвярджае найперш іх аднолькавы наклад (па 5000 асобнікаў) і той факт, што яны былі надрукаваныя ў адной і той жа друкарні К. Пянткоўскага. Аднак вядома, што “Круг...” быў нелегальнай арганізацыяй, дзеля чаго ня мог зьвяртацца да ўладаў у выдавецкіх пытаньнях. Такія дзеяньні маглі зьдзейсьніць толькі прыватныя асобы, аднак не заўсёды яны былі схільныя прыцягваць да сябе ўвагу. Мусіць, з гэтай прычыны на тытульным аркушы “Вязанкі” не фігуравала імені выдаўца, а на зборніку “Казкі” стаялі ініцыялы А.К.

Абставіны выданьня “Вязанкі” былі цягам многіх дзесяцігодзьдзяў прадметам разнастайных, часта контравэрсійных меркаваньняў. У 1920 г. зьявілася інфармацыя, што ўкладаньнем і падрыхтоўкай да друку пасьмяротнай паэтычнай спадчыны Лучыны займаўся Іван Луцкевіч[38].

Гэта аспрэчыў Зямкевіч, сьцьвярдзіўшы, што Луцкевіч быў толькі выдаўцом “Вязанкі”, якая была падрыхтаваная да друку самім аўтарам, яшчэ пры жыцьці[39]. Урэшце, трэцяя вэрсія цьвердзіла, што патрэбы зьбіраць спадчыну Лучыны ўвогуле не існавала, бо “Вязанка”, выдадзеная ў 1903г., была перадрукам яе першага замежнага выданьня 1891 году[40].

Спрэчкі вяліся і наконт асобы яе выдаўца. Так, напрыклад, Зямкевічавае сьцьверджаньне, што выдавец “Вязанкі” — Луцкевіч, выклікае спаважныя сумневы, калі браць пад увагу факт, што за некалькі дзён пасьля выдачы пецярбурскай цэнзураю дазволу на ейны друк (24 красавіка 1903 г.) Луцкевіч быў арыштаваны і некалькі месяцаў правёў у турме, пасьля чаго быў высланы паліцыяй зь Пецярбургу ў Менск[41].

Ня меншай з гэтага гледзішча загадкаю зьяўляюцца “Казкі”, якія дагэтуль не прыцягвалі вялікай увагі гісторыкаў літаратуры. Гэты зборнік быў не арыгінальным выданьнем, а перадрукам пяці выбраных казак, зьмешчаных П.В. Шэйнам у другім томе ягоных працаў “Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо–западного края” (Пецярбург, 1893 г.). Як паказвае параўнаньне двух тэкстаў, рэдактар зборніку “Казкі” ўнёс у сваё выданьне пэўныя моўныя зьмены, а таксама першы раз у

[36] У польскіх бібліятэках няма “Велікоднай пісанкі” ў арыгінале. Ксэракопія гэтага зборніку захоўваецца ў бібліятэцы Інстытуту славяназнаўства ПАН у Варшаве.

[37] Александровіч С. Тамсама. С. 109.

[38] Памяці Івана Луцкевіча. Вільня, 1920. С. 8.

[39] Зямкевіч Р. Ян Няслухоўскі (Янка Лучына) і яго няведамыя вершы // Нёман. 1932. № 2. С. 59.

[40] Майхровіч С. Янка Лучына. Жыццё і творчасць. Мінск, 1952. С. 41—42.

[41] Памяці Івана Луцкевіча. Вільня, 1920. С. 8—9; Луцкевіч А. Тамсама. С. 12. — *Ю.Т.*

Як паказвае Алена Глагоўская ў беластоцкай “Ніве” за 16.12.2001, “кніжачку беларускіх вершаў” Я. Лучыны дапамог паэту — “хаця пасьля сьмерці” — выпусьціць ягоны пляменьнік (сын ягонай сястры) А. Неканда–Трэпка, які вучыўся ў Пецярбургу адначасова з В. Іваноўскім і братамі Луцкевічамі і ўваходзіў у Круг Беларускае Народнае Прасьветы і Культуры, а з Луцкевічамі, да таго ж, быў амаль суседам у Менску. — *А.С.*

гісторыі беларускага правапісу ўжыў знак памякчэньня пры дапамозе апострафу (*с'пиць, з'бираюць, м'не, лед'ве, ободз'ве*).

Прыхільнікам і прапагандыстам такога правапісу быў Казімер Кастравіцкі[42], з чаго можа вынікаць, што ён браў удзел у падрыхтоўцы зборніку "Казкі" да друку. У гэтым выпадку ня выключана, што сродкі на выданьне ахвяраваў ягоны брат, лідзкі лекар Амброжы Кастравіцкі, чые ініцыялы (А.К.) былі зьмешчаныя на тытульнай старонцы кніжкі.

Вынікі выдавецкай дзейнасьці пецярбурскага "Кругу..." былі сьціплыя як колькасна, так і якасна. "Вязанка" не зьмяшчала рэвалюцыйнага ці антыцарскага зьместу, а "Казкі" былі ўсяго толькі чарговым фальклёрным зборнікам, хіба што ў беларускім афармленьні. Цікавейшымі і больш пэрспэктыўнымі ў пляне разьвіцьця ліатаратуры былі абедзьве "Пісанкі", аднак з прычыны мінімальнага накладу, прымітыўнай тэхнікі і нелегальнага характару іх значэньне было абмежаваным. Да таго ж, легальна выдаваць у Пецярбургу грамадзка–палітычную літаратуру, як і якія–кольвек беларускія тэксты лацінскім шрыфтам, было немагчыма.

Кракаўская місія Багушэўскага

Аднак гэткія магчымасьці існавалі за мяжою, і іх выкарыстаньнем занялася тройца студэнтаў, да якой належаў Вацлаў Іваноўскі зь Пецярбурскага тэхналягічнага інстытуту, Мар'ян Фальскі з Варшаўскага політэхнічнага інстытуту і Сьцяпан Багушэўскі зь Ягелонскага ўнівэрсытэту ў Кракаве. Праект новага выдавецкага прадпрыемства паўстаў, хутчэй за ўсё, улетку 1903 г. у выніку дамоўленасьці Іваноўскага з Багушэўскім, якія ў той час бавілі вакацыі ў свайго швагра Абмрожага Кастравіцкага ў Лідзе. Багушэўскі паходзіў зь Меншчыны і ўдзельнічаў у беларускім руху, у тым ліку ў Беларускай Сацыялістычнай Грамадзе і Беларускім сялянскім саюзе. Ён быў знаёмы з Фальскім з часоў, калі яны разам вучыліся ў Менскай гімназіі, і бадай у найбольшай ступені паўплываў на прыцягненьне Фальскага да беларускай выдавецкай дзейнасьці. Дзейнасьць гэтая, аднак, працягвалася менш чым два гады і — як пісаў Фальскі ў сваіх успамінах — была для яго адно пабочным грамадзкім зацікаўленьнем. Плёнам супрацоўніцтва гэтых маладых людзей былі наступныя кніжкі на беларускай мове, якія неўзабаве пабачылі сьвет у Кракаве:

1. Янка Музыкант. Па польскі напісаў Г. Сенкевіч на беларускі язык пэрэлажыў Янка Сваяк [1904 г., 10 с., лацінка, бязь месца выданьня];
2. Ведзьма (аповесьць). З польскаго пэрэлажыў Янка Сваяк [1904 г., 16 с., лацінка, бязь месца выданьня];
3. Песьні [1904 г., 48 с., кірыліца, бязь месца выданьня];
4. Адозва "Царская гаспадарка". [налічвала 3,5 старонкі вялікага фармату, кірыліца, бязь месца выданьня].

Першыя два выданьні — "Янка Музыкант" і "Ведзьма" — і невялічкае апавяданьне Стэфана Жаромскага "Да свайго Бога" пераклаў Фальскі, які ужываў псэўданім Янка Сваяк. Апрача таго, ён распрацаваў тэкст адозвы "Царская гаспадарка", выкарыстоўваючы для гэтай мэты лёнданскія беларускія брашуры, а перадусім "Гуторку об тым, куды мужыцкие грошы ідуць". Калі першыя тры апавяданьні Фальскі напісаў лацінкай, а дакладней нерэфармаванай польскай абэцэдаю (захоўваючы нават насавыя знакі –*ę* –*ą*), то тэкст "Царскай гаспадаркі" ён даў тагачаснай расейскай абэцэдаю, ужываючы пры гэтым знакі зьмякчэньня, прынятыя ў "Казках". Аднак падчас працы над адозваю Фальскі

[42] Германовіч І.К. Карусь Каганец як мовазнавец // Веснік Беларускага Дзяржаўнага універсітэта імя У.І. Леніна. Серыя 1974. № 3. С. 33.

ня бачыў яшчэ ані асобніка зборніку “Казкі”, ані іншага выданьня, якое служыла б яму за ўзор для пераймаўньня гэтых знакаў зьмякчэньня[43]. Гэта даводзіць, што ідэя ўжываньня ў “Царскай гаспадарцы” гэтага знаку выйшла зь пецярбурскага асяродка “Круга…”, зацікаўленага ў выданьні адозвы кірыліцаю.

Іншымі, аднак, былі абставіны выданьня “Песень”, у падрыхтоўцы якіх Фальскі ня браў удзелу. На гэта паказваюць дзьве акалічнасьці: па–першае, мяркуючы па ўспамінах Фальскага, зборнік гэты ня быў яму вядомы[44], і, па–другое, ён адрозьніваўся ад “Царскай гаспадаркі” граматыкаю і правапісам. Гэта была, як на тагачасныя абставіны, досыць тоўстая кніжка, якая зьмяшчала некалькі дзясяткаў ананімных вершаў Багушэвіча з замежных выданьняў “Дудкі…” і “Смыка…”, а таксама тры неапублікаваныя вершы Каганца (“Окліч” і “Ой, у полі вецер вые”) і Цёткі (“Мужыцкая доля”)[45].

Тэксты апошніх твораў маглі падаць толькі іх аўтары альбо Іваноўскі, і таму можна меркаваць, што ўкладаньнем “Песень” займаўся хтосьці з кола гэтых людзей. Цалкам імаверна, што ў апрацоўцы гэтага зборніку ўдзельнічаў таксама і Багушэўскі, гэта тлумачыла б вышэйзгаданыя непасьлядоўнасьці ў граматыцы і правапісе, у тым ліку досыць абмежаванае ўжываньне апострафа як знаку зьмякчэньня.

Апрача падрыхтоўкі рукапісаў, важным чыньнікам рэалізацыі выдавецкага праекту былі грашовыя сродкі. Гэтым разам іх нельга было знайсьці шляхам публічнага збору, бо праект быў закансьпіраваны ад царскіх уладаў. Нічым скончыліся й спробы атрымаць фінансавую дапамогу ад ППС. Пра гэта сведчыць сьнежаньскі пратакол (1903 г.) канфэрэнцыі яе Цэнтральнага Рабочага Камітэту, цягам якое была прадстаўленая прапанова старшыні пецярбурскага “Кругу…” (Іваноўскага) аб выданьні супольна з ППС беларускіх кніжак (“лацінскімі і расійскімі літарамі”). ЦРК не прыняў, аднак, ніякіх рашэньняў у гэтай справе[46].

Урэшце, на дапамогу прыйшла вядомая піяністка, а ў хуткім часе швагерка Іваноўскага, Катажына Ячыноўская, якая ахвяравала пэўную суму грошай на заплянаваныя беларускія выданьні[47].

На пачатку студзеня 1904 г. знойдзеныя такім чынам грошы і ўжо гатовыя рукапісы Багушэўскі перавёз у Кракаў. На першым этапе ён прыступіў да стварэньня пры Ягелонскім унівэрсытэце таварыства пад назваю Акадэмічны краязнаўчы беларускі гурток. У студзені—лютым ён распрацаваў праект статуту Гуртка, які 9 сакавіка быў зацьверджаны сэнатам унівэрсытэту[48] і за некалькі дзён перасланы на зацьверджаньне імпэратарскаму намесьніку графу Анджэю Патоцкаму ў Львоў. Патоцкі, аднак, заблякаваў стварэньне Гуртка, сябрамі якога — як прадугледжаваў праект статуту — маглі быць ня толькі студэнты і супрацоўнікі Ягелонскага ўнівэрсытэту, але і “кожны, каму агуль-

[43] “Казкі” былі надрукаваныя прыкладна ў канцы верасьня альбо напачатку кастрычніка 1904 г., на што паказвае факт, што кантрольны асобнік гэтай кнігі быў дастаўлены ў пецярбурскае Галоўнае ўпраўленьне па справах друку цягам кастрычніка 1904 г. Пар.: Список книг, вышедших в России в 1904 году. Петербург, 1905. Пункт 11662.

[44] Falski M. Okruchy wspomnień. С. 10. Машынапіс, прадстаўлены сям'ёю. Фальскі напісаў свае ўспаміны ў сярэдзіне 1960–х гадоў.

[45] “Мужыцкая доля” была зьмешчаная ў “Свабодзе”, якая, аднак, не была распаўсюджаная, а таксама ў зборніку “Калядная пісанка”, які падчас падрыхтоўкі “Песень” да друку яшчэ ня быў выдадзены.

[46] CA PZPR 305/III/3, pt. 3. Пратакол канфэрэнцыі ЦРК ППС ад 16—17 сьнежня 1903 г.

[47] Пра фінансавую дапамогу Ячыноўскай пісаў Фальскі. Пар.: Александровіч С. Тамсама. С. 122. У траўні 1979 г. у размове з аўтарам дадзенай публікацыі пра гэта згадвала Марыя Арнольдзіха зь сям'і плоцкіх Альтбэргаў, у якіх у 1904 г. Іваноўскі быў частым госьцем. У той час ён праходзіў пасьлядыплёмную практыку на цукроўні Баравічкі пад Плоцкам.

[48] Archiwum Uniwersytetu Jagiellońskiego w Krakowie S II 84, Пратаколы паседжаньняў акадэмічнага сэнату.

ным сходам гэты гонар будзе дадзены". Рашэньне гэтае было перасланае 2 красавіка 1904 г. да ведама дырэкцыі Кракаўскай паліцыі і сэнату Ягелонскага ўнівэрсытэту з адначасовым загадам азнаёміць зь ім студэнта Багушэўскага сама позна 12 красавіка[49]. Пасьля гэтага Гурток мог праводзіць толькі дзейнасьць, накіраваную на самалiквідацыю.

Беларускі гурток пры Ягелонскім унівэрсытэце быў неабходны як юрыдычная інстытуцыя для правядзеньня самастойнай выдавецкай дзейнасьці. Пра іншыя ягоныя мэты можна меркаваць са зьместу двух надрукаваных Багушэўскім апытальнікаў, якія зьмяшчалі падрабязныя пытаньні пра грамадзка–эканамічны і культурна–асьветніцкі стан жыхароў вёсак і мястэчак Беларусі. Яны тычыліся таксама і канфэсійных і моўных дачыненьняў, стану адукацыі, бібліятэк і характарыстыкі іх кнігазбораў, навыкаў чытаньня і пісаньня, запатрабаваньня на кніжкі і т.п. Асабліва красамоўна ў гэтым пляне гучыць наступны пункт культурнага апытальніка: "Як можа быць прынятая ў гэтым краі народная літаратура на беларускай мове, друкаваная лацінскімі літарамі і не абмежаваная расейскай цэнзураю?"[50].

Гэта паказвае, што, апроч выдавецкай дзейнасьці, Гурток плянаваў правядзеньне з дапамогаю сваіх сяброў сацыялягічнага апытаньня ў Беларусі, якое, між іншым, было паклікана пракласьці дарогу беларускай кніжцы. Варта заўважыць, што абодва апытальнікі ня маюць на сабе надпісу кракаўскага гуртка, а на знойдзеных асобніках бачны толькі ягоны штэмпэль. Гэта наводзіць на думку, што яны маглі быць прызначаныя для выкарыстаньня таксама і падобнымі беларускімі арганізацыямі на тэрыторыі Расейскай імпэрыі, перадусім пецярбурскім "Кругам".

Карыстаючыся з правоў, якія аб'яднаньні атрымлівалі падчас пэрыяду рэгістрацыі, Багушэўскі ўзяўся за друк прывезеных рукапісаў. "Янка Музыкант" і "Ведзьма" былі надрукаваныя ў друкарні Ўладыслава Тэадарчука сама позна ў канцы сакавіка, пра што сьведчыць паведамленьне аб іх публікацыі, зьмешчанае ў красавіку 1904 году ў кракаўскім "Przewodniku Bibliograficznym". Там, аднак, нічога не было паведамлена пра "Песьні", з прычыны чаго месца выданьня гэтай кніжкі дагэтуль не было вядомае. Гэтае пытаньне ня так лёгка было высьветліць, бо апроч надпісаў "Дозволено цензурой СПБ (Санкт–Петербург. — *Ю.Т.*) 17 декабря 1903 г." і "Синодальная типография", зьмешчаных, каб увесьці ў зман царскія кантрольныя органы, у "Песьнях" не пададзена ніякіх зьвестак, якія б казалі пра месца выданьня. Аднак гэтую інфармацыю нам паведаміў сам Тэадарчук, пакінуўшы прынамсі на адным асобніку "Песень" замест "Синодальная типография" зьвесткі пра сваю друкарню. Гэты рарытэтны (магчыма, адзіны) асобнік, які ня быў прызначаны для нелегальнага экспарту ў Беларусь, нядаўна быў знойдзены мною ў Ягелонскай бібліятэцы ў Кракаве. Вераемна, Тэадарчук перадаў яго туды, каб задакумэнтаваць свой удзел у беларускай выдавецкай справе, якая, відавочна, не была яму абыякавая.

Пра тое, што "Царская гаспадарка" была выдадзеная ў Кракаве, пісалі як Карскі, так і Фальскі[51], але ніхто зь іх не ўдакладніў, у якой друкарні яна была выдадзеная. Аднак не выклікае сумневаў, што гэтая адозва выйшла ў друкарні Тэадарчука, што ўскосна пацьвярджаецца ідэнтычным характарам шрыфтоў "Царскай гаспадаркі" і "Песьняў". Можна таксама паспрабаваць дакладней акрэсьліць час, калі была выдрукаваная "Царская гаспадарка". Важную інфармацыю зьмяшчае ліст сябра ЦРК ППС Баляслава Чаркоўскага ("Леана"), высланы 18 красавіка 1904 г. з Варшавы Пілсудзкаму, які ў той час знаходзіўся ў Галіччыне. Там знаходзім наступнае: "Па беларускую

[49] Тамсама. S II 797, Акты Акадэмічнага беларускага гуртка ў Кракаве.

[50] CA PZPR 305/VII/4, pt. 12. Падаўстрыйская Польшча, адозвы 1892—1918. На абодвух апытальніках стаяць авальныя пячаткі з надпісам: "Koło Białoruskie przy Uniwersytecie Jagiellońskim w Krakowie".

[51] Карский Е.Ф. Белорусы. Т. 3. Ч. 3. Петроград, 1922. С. 155; Falski M. Тамсама. С. 10.

адозву мусіць прыехаць нейкі беларус у Кракаў"[52]. Паколькі да таго часу ў Кракаве ніякіх іншых беларускіх адозваў выдадзена не было, інфармацыя Чаркоўскага магла тычыцца толькі "Царскай гаспадаркі", паказваючы, што яна была надрукаваная ў першай палове красавіка. Вераемна, у той самы час выйшлі друкам таксама і "Песьні". Такім чынам, Багушэўскі рэалізаваў складзеную менш за год да таго выдавецкую праграму ў друкарні Тэадарчука ў сакавіку—красавіку 1904 г., плённа скарыстоўваючы часавы ліміт, утвораны працэдурай рэгістрацыі Беларускага гуртка пры Ягелонскім унівэрсытэце[53].

Варта дадаць, што пад "Царскай гаспадаркай" не фігуравала подпісу нейкай партыі ці арганізацыі. Што было прычынай гэтаму — невядома. З часам гэтую адозву паспрабавалі зьвязаць зь дзейнасьцю той ці іншай партыі. Карскі сьцьвярджаў, што яе выдала Беларуская Сацыялістычная Грамада, а Бурбіс і Луцкевіч — што Сацыялістычная партыя Белай Русі[54]. Падобныя меркаваньні выказваліся і адносна "Песень", маўляў, яны былі справай рук альбо БСГ (Карскі), альбо БПР (Бурбіс), і нават вынікам супрацоўніцтва БРГ і ППС (Максім Багдановіч)[55]. Гучэлі таксама галасы, што, маўляў, "Песьні" былі выдадзеныя ў Лёндане[56]. Вельмі павярхоўнае ўяўленьне пра кракаўскія беларускія публікацыі меў і Леан Васілеўскі — адзін з найлепшых экспэртаў ППС у нацыянальных пытаньнях, які да таго ж у 1904 г. знаходзіўся ў Кракаве[57].

Гэтыя акалічнасьці пацьвярджаюць, што Іваноўскі, Багушэўскі і Фальскі ў Кракаве распачалі абсалютна самастойную выдавецкую дзейнасьць, якая не кіравалася ці натхнялася ані ППС, ані БРГ. Багушэўскі, аднак, выкарыстаў прыхільнасьць кракаўскіх сацыялістаў, у тым ліку друкара Тэадарчука і Енджэёўскага, які, вярнуўшыся зь Лёндану, кіраваў Выдавецкай суполкай "Książka", што месьцілася на вул. Гродзкай, 50, у Кракаве[58]. Гэтая суполка была галоўным складам замежных беларускіх выданьняў, сярод якіх знаходзіліся таксама "Песьні"[59]. З Кракава гэтыя выданьні паступова перапраўляліся праз зялёную мяжу ў Варшаву, а адтуль — у Беларусь, дзе іх распаўсюджвалі як мясцовыя арганізацыі БРГ/БСГ і ППС, так і энтузіясты, якія не належалі да ніводнай з гэтых партыяў[60].

---

[52] CA PZPR 305/III/3, pt. 3. Матэрыялы канфэрэнцыі ЦРК ППС ад 16—17 сьнежня 1903 г.: ліст "Леана" ад 18 красавіка 1904 г.

[53] Для поўнай рэалізацыі гэтай праграмы бракавала толькі апавяданьня Жаромскага "Да свайго Бога", якое, відаць, не было надрукаванае з тэхнічных прычынаў. Яно было закароткае і яго немажліва было выдаць асобнай брашураю, якая налічвала б усяго дзьве старонкі. Гэтае апавяданьне было выдадзена крыху пазьней у Вільні літаграфічным спосабам. Адзіны ў Польшчы асобнік гэтага выданьня захоўваецца ў Галоўным Архіве Старых Актаў (AGAD) у Варшаве ў зборы Прозараў і Ельскіх (шыфр. 1402). На ім зроблены ўласнаручны зацем Фальскага: "litogr. Wilno 1904".

[54] Карский Е.Ф. Тамсама; Бурбіс А. Тамсама. С. 179; Луцкевіч А. Тамсама. С. 21.

[55] Багдановіч М. Збор твораў. Т. 2. Мінск: Навука і тэхніка, 1968. С. 230.

[56] Бурбіс А. Тамсама. С. 178; Александровіч С. Тамсама. С. 118 і 119.

[57] Wasilewski L. Litwa i Białoruś. Kraków, 1912. S. 278.

[58] Wojewódzkie Archiwum Państwowe w Krakowie, IT 1603, Акты Выдавецкай суполкі "Książka".

[59] AGAD, збор Прозараў і Ельскіх 140_2, ліст В. Іваноўскага А. Ельскаму ад 31.04.1905.

[60] Адным зь іх быў Зыгмунт Нагродзкі — уладальнік складу земляробчых прыладаў у Вільні. Ён распаўсюджваў творы Багушэвіча "Дудку..." і "Смык...", а таксама — як ён згадваў — зборнік ягоных вершаў пад назваю "Тралялёначка" (пар.: Луцкевіч А. Жыцьцё і творчасьць Фр. Багушэвіча ў успамінах яго сучасьнікаў // Запісы Беларускага Навуковага Таварыства. Вільня, 1938. С. 29—30). Нагродзкі, аднак, памыляўся, паколькі "Тралялёначка" не была зборнікам вершаў. Гаворка ішла, мусіць, пра "Песьні", аўтарства якіх часам прыпісваюць Багушэвічу.

Перад новым этапам

Партыйная публіцыстычная дзейнасьць на беларускай мове ажывілася падчас расейска–японскай вайны і першай расейскай рэвалюцыі 1905 г., а ейным ініцыятарам ізноў была Польская Сацыялістычная Партыя. У сакавіку 1904 г. яна выдала антываенную адозву "Таварышы" на польскай, беларускай, літоўскай і латыскай мовах, падпісаную прадстаўнікамі чатырох сацыялістычных партыяў, у тым ліку Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады. У сярэдзіне году зьявілася яшчэ адна адозва "Браты сяляне!" (гэтым разам толькі ў польскай і беларускай вэрсіях), якая мела пад сабой подпісы ППС і БРГ[61].

Увосень 1904 г. група сяброў ППС у Варшаве і Горадні, да якой належалі ў тым ліку Станіслаў Трускоўскі, Мар'ян Фальскі і Францішак Завадзкі, прыступіла да выданьня адозваў па–беларуску, падпісаных назовам фікцыйнае Сацыялістычнае партыі Белай Русі. У кастрычніку гэтая група выдала адозву "З вайны" (лацінкаю), у лютым 1905 г. — "Настаў час!" (лацінкаю) і, урэшце, у кастрычніку 1905 г. тры наступныя адозвы кірыліцай — "Братцы мужыкі!", "Прызыўные!" і "Якая карысьць народу з выборнага правіцельства". Гэта была адмысловая форма непасрэднага ўзьдзеяньня ППС на беларускі народ, якая фармальна не парушала пастановы чэрвеньскай (1903 г.) канфэрэнцыі ЦРК аб невыдаваньні пад эгідай гэтай партыі прапагандысцкай літаратуры на беларускай мове. Імаверна, гэтым жа мэтам мусіла служыць і беларуская друкарня, заснаваная ў 1904 г. пры ўдзеле Аляксандра Прыстара і Валера Славэка ў кватэры Міхнёўскай у Горадні. Цяжка казаць, якія былі вынікі дзейнасьці гэтай друкарні, бо ў канцы 1904 г. у кватэры Міхнёўскай быў учыненыператрус, у выніку якога гаспадыня была арыштаваная, а друкарня ліквідаваная[62].

Самастойна выдаваць праклямацыі БСГ узялася на пачатку 1905 г. Ейная першая адозва "Цараво жніво", прысьвечаная расстрэлу дэманстрацыі працоўных у расейскай сталіцы, была надрукаваная на гектографе ў Пецярбургу ў студзені таго году, наступныя ж былі надрукаваныя ў Вільні і Менску. Паводле сьпісу, складзенага Бібілай (найпаўнейшага з дагэтуль надрукаваных), дапоўненага матэрыяламі з калекцыі ЦА ПАРП, цягам 1905 году БСГ выдала агулам 21 адозву, зь іх як мінімум 13 зьявіліся ў Вільні. Значную іх частку складалі вершы Цёткі "Хрэст на свабоду", "Мора" і "Пад штандарам", выдадзеныя ў кастрычніку 1905 г. у выглядзе ўлётак лацінкаю і кірыліцай. Паводле зьместу засталыя адозвы можна падзяліць наступным чынам:

1. Барацьба за канстытуцыйны лад: "Што такое конституцыя", "Далоў цараву "думу"!", "Царава «дума»", "Товарышчы работнікі!";
2. Прапаганда аграрнай праграмы: "Першы мужыцкі зьезд", "Братке гаспадарэ!", "Да тых мужыкоў, якія возяць дровы на Тальку і Мар'іну Горку", "Да ўсіх работнікоў і работніц дваровых, да ўсіх дзеравенскіх людзей тутошней зямлі Беларуской";
3. Барацьба за грамадзкую салідарнасьць: "Чым цар ратуецца", "Да салдатаў!", "Браты хрысьціяне!";
4. Іншыя: "Цараво жніво", "За свабоду!", "Да ўсіх работнікоў і работніц Віленской бальніцы", "Очерк программы БСГ".

Апроч адозваў БСГ, цягам 1905 г. Літоўская сацыял–дэмакратычная партыя (ЛСДП) надрукавала ў выглядзе ўлётак верш Цёткі "Хрэст на свабоду" (лацінкай і кірыліцай), а напрыканцы таго году Беларускі сялянскі саюз выдаў адозву пад назваю "Беларускі Крестьянскі Союз". Усе згаданыя адозвы, за выняткам "Царава жніва", былі надрукаваныя ў друкарнях ППС і ЛСДП у Вільні, а таксама РСДРП у Менску. Толькі на пачатку 1906 г. БСГ заснавала ў Менску ўласную друкарню, якою кіраваў Фэлікс Стацкевіч. Гэта

[61] Przedświt. 1904. № 3. S. 133—135 і № 7. S. 301—305. Тэксты абедзьвюх адозваў захоўваюцца ў ЦА ПАРП.
[62] Szuszkiewicz B. Тамсама. С. 529.

паўплывала на далейшы рост выдавецкай актыўнасьці партыі цягам 1906 г., пра якую, аднак, не стае канкрэтных дадзеных[63]. Адсутнічаюць таксама (апрача Цёткі) падрабязнасьці пра аўтараў адозваў БСГ, якія ў значнай частцы былі арыгінальнымі распрацоўкамі.

Нарастаньне рэвалюцыйнай хвалі схіліла расейскі ўрад да пэўных саступак у яго тагачаснай нацыянальнай палітыцы, што праявілася ўва ўказе цара Мікалая II ад 25 сьнежня 1904 г., які скасоўваў абмежаваньні на ўжываньне мясцовых моваў у заходніх губэрнях імпэрыі. Гэты ўказ меў істотнае значэньне для беларускай выдавецкай дзейнасьці, бо ён ствараў мажлівасьці яе больш плянамернага разьвіцьця, у прыватнасьці, арганізацыі самастойнага выдавецтва. Варта ўвагі тое, што ў Пецярбургу прыгатаваньні ў гэтым кірунку былі распачатыя сама менш за колькі месяцаў да абвяшчэньня царскага ўказу. Як пісаў Іваноўскі Аляксандру Ельскаму ў лісьце ад 24 лютага 1905 г.:

> Тутака так сама ёсьць людцоў колькі, што перэлажылі ксёнжачэк крыху, толькі з грашмі кепска... Але так сама ўшоў не апускаючы прыгатавалі: "Сыгнал" Гаршына, "Міхалка" Пруса, "Крыста" Канапніцкае, "Гутаркі аб небе і зямлі". Лемэнтарык (паводлуг Промыка) будзе гатоў за месяц[64].

Апроч гэтых кнігаў, якія — судзячы з цытаванага ліста — былі апрацаваныя цягам 1904 і на пачатку 1905 г., у наступныя месяцы быў падрыхтаваны да друку шэраг іншых выданьняў, у тым ліку Цётчына "Першае чытаньне для дзетак беларусаў".

Поруч з тэндэнцыяй выданьня папулярнай літаратуры новым элемэнтам гэтай дзейнасьці была задума стварыць першыя беларускія школьныя падручнікі, якія зьявіліся на цэлае дзесяцігодзьдзе раней за беларускія школы. Дзеля нястачы адпаведных філёлягаў падрыхтоўкай лемантара заняўся інжынэр-хімік Іваноўскі, а чытанак — фэльчарка Цётка. "Гутаркі аб небе і зямлі", якія па сутнасьці былі падручнікам геаграфіі і астраноміі, апрацавалі Казімер Кастравіцкі і С. Шаўлоўскі, аніводзін зь якіх ня быў спэцыялістам у гэтай галіне. У той жа час гэтыя людзі, а асабліва Іваноўскі і Кастравіцкі, выпрацавалі ўніфікаваныя правілы беларускага правапісу як кірыліцаю, так і лацінкаю, уводзячы ў апошнім выпадку ейную новую сыстэму, заснаваную на чэскай абэцэдзе. За некалькі год гэтыя правілы былі прынятыя іншымі беларускімі выдавецтвамі, а таксама "Нашай Нівай". Урэшце, цягам 1905 г. у Пецярбургу была праведзеная арганізацыйная і матэрыяльная падрыхтоўка, якая зрабіла магчымай дзейнасьць створанай увесну 1906 г. першай легальнай выдавецкай суполкі пад паказальнаю назваю "Загляне сонца і ў наша аконца".

У гісторыі беларускага выдавецкага руху 1902—1905 гг. утвараюць пераходны пэрыяд ад адзінкавых індывідуальных выдавецкіх высілкаў апошняй дэкады XIX ст. да скаардынаванай дзейнасьці выдавецкай суполкі "Загляне сонца і ў наша аконца". Між найважнейшых вяхоў гэтага пэрыяду асаблівай увагі заслугоўваюць: пасьлядоўнае імкненьне дасягнуць мэтаў, пастаўленых у адозьве "Да інтэлігенцыі", а таксама калектыўны характар дзеяньняў невялікай групы энтузіястаў выдавецкай справы. З прычыны неспрыяльных палітычных умоваў гэтая дзейнасьць не магла быць яшчэ цалкам плянамернай, тым ня менш яна была працяглаю, што зрабіла мажлівым сыстэматычнае назапашваньне досьведу і яго выкарыстаньне для будучай выдавецкай дзейнасьці. Гэтыя дасягненьні пецярбурскіх выдаўцоў сталі ў выніку сур'ёзнай сілаю, якая паўплывала на разьвіцьцё творчых зацікаўленасьцяў перадусім Цёткі, Каганца і Купалы, якія распачалі новы этап у гісторыі беларускай літаратуры.

Пераклад зроблены паводле: Studia polono-slavica-orientalia. Acta litteraria IX. 1985.

---

[63] Луцкевіч А. Тамсама. С. 25—26.

[64] AGAD, збор Прозараў і Ельскіх 140_2, ліст В. Іваноўскага А. Ельскаму ад 24 лютага 1905 г.

Узаемадачыненьні ППС зь беларускім рэвалюцыйным рухам у 1902—1906 гадох

Перш чым пачаць аналіз дачыненьняў ППС да беларускага рэвалюцыйнага руху, які ў 1902—1906 гадох прэзэнтавалі тры арганізацыі, якія пачаргова зьмянялі адна адну, а менавіта Беларуская Рэвалюцыйная Партыя (БРП), Беларуская Рэвалюцыйная Грамада (БРГ) і Беларуская Сацыялістычная Грамада (БСГ), трэба высьветліць простае на выгляд пытаньне: калі і ў якіх акалічнасьцях паўстала гэтая першая беларуская палітычная арганізацыя. Гэта ня лёгка, бо практычна ўся літаратура, датычная гэтага прадмету, абапіраецца не на дакумэнтальныя крыніцы, але галоўным чынам на ўспаміны Антона Луцкевіча і Аляксандра Бурбіса[1].

Абодва яны належаць да кола стваральнікаў гэтай партыі, таму іх выказваньні разглядаліся як аўтарытэтная крыніца інфармацыі і паўтараліся даслоўна ці зь невялікімі мадыфікацыямі гісторыкамі і публіцыстамі[2].

Першыя зьвесткі ў гэтым пытаньні Луцкевіч падаў у 1909—1910 гадох, г.зн. усяго праз некалькі гадоў пасьля стварэньня гэтай партыі. Тады ён пісаў, што ў 1902 г. у Пецярбургу прыбылыя зь Менску дзеячы арганізавалі Крут Беларускай Народнай Прасьветы, які пад уплывам чынных царскімі ўладамі цяжкасьцяў у разьвіцьці асьветнай дзейнасьці неўзабаве раздваіўся. Адна частка чальцоў гэтага круга адмовілася ад далейшай дзейнасьці, іншая ж, радыкальная іх частка, зімой 1902/1903 г. заклала падваліны першай беларускай палітычнай арганізацыі — БРГ, якая ў канцы 1903 г. зьмяніла сваю назву на БСГ[3].

У 1921 г. наконт гэтага выказаўся Бурбіс, які, мабыць, карыстаўся згаданай вэрсіяй Луцкевіча і паўтарыў яе з адным істотным выняткам. Вось жа, на думку гэтага аўтара, частка чальцоў арганізаванага ў 1902 г. Круга Беларускай Народнай Прасьветы ў тым самым 1902 г. заснавала не БРГ, а Беларускую Рэвалюцыйную Партыю, якая да канца таго ж 1902 г. была перайменаваная ў БРГ, а тая на сваім першым зьезьдзе ў 1903 г. прыняла назву БСГ[4].

---

[1] У 1930-х гг. А. Луцкевіч напісаў працу "Да гісторыі Беларускае Рэвалюцыйнае (пасьля Сацыялістычнае) Грамады (Даты і факты)", аднак яна цалкам не захавалася (гл.: Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. Мінск, 2003.). — *А.С.*

Стары Ліпіп (Бурбіс А.). Кароткі агляд беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху // Весьнік Народнага Камісарыяту Асьветы Сацыялістычнай Радавай Рэспублікі Беларусі. 1921. № 1—2; Новина А. (Луцкевіч А.) Белорусы // Формы национального движения в современных государствах. Петербург, 1910; idem. Odrodzenie narodowe Białorusinów // Litwa. 5.3.1909. № 4(10); Г.Б. (Луцкевіч А.). Двaццaтыя ўгодкі // Змаганьне. 1923. 23 сьнежня; Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў... Вільня, 1928. — *Ю.Т.*

Да гэтага сьпісу літаратуры можна дадаць працу А. Луцкевіча "Дваццацілецьце Беларускае Сацыялістычнае Грамады", а таксама яго ўласныя паказаньні НКУС БССР (гл.: Луцкевіч А. Да гісторыі...). — *А.С.*

[2] Біч М., Палуян У. Беларуская Сацыялістычная Грамада // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. Т. II. Мінск, 1970; Гісторыя Беларускай ССР. Т. II. Мінск, 1972; Ігнатоўскі У. Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецьця. Менск, 1926; Мялешка М. Сацыялістычны рух на Беларусі ў праклямацыях 1905 году. Менск, 1927; Недасек Н. Большевизм в революционном движении Белоруссии. Мюнхен, 1956; Панцэвіч В. Беларуская адраджэнская ідэалёгія // Беларуская Царква. Чыкага, 1965. № 29; Станкевіч А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня. Вільня, 1935; Турук Ф. Белорусское движение. Москва, 1921.

[3] Nowina A. (Луцкевіч А.). Odrodzenie narodowe Białorusinów // Litwa. № 4(10). 05.03.1909. S. 52; яго ж. Белорусы // Формы национального движения в современных государствах. Петербург, 1910. С. 390—392.

[4] Стары Ліпіп (Бурбіс А.). Кароткі агляд... 1921. № 1. С. 6—7.

У міжваенныя гады Луцкевіч адступіў ад сваёй спачатнай вэрсіі. У 1923 г. ён сьцьвярджаў, што БРГ паўстала ў самым канцы 1903 г.[5], а ў 1928 г. пісаў, што гэта адбылося ўвосень 1903 г.[6].

Адначасна ён сьцьвярджаў, што БРГ набыла назву БСГ у канцы 1905 г., г.зн. на два гады пазьней, чым ён казаў папярэдне. Луцкевіч не зьмяніў думкі толькі ў пытаньні БРП, існаваньне якой ён пасьлядоўна ігнараваў, увесь час падкрэсьліваючы, што першай беларускай палітычнай арганізацыяй была БРГ.

Сьведчаньні Луцкевіча зьмяніліся ня толькі ў пытаньні датаў, але таксама і ў пытаньні акалічнасьцяў узьнікненьня БРГ. Гэтак, у 1923 г. ён пісаў, што яна была створаная яго братам Іванам Луцкевічам — лідэрам радыкальнай групы чальцоў круга[7], а ў 1928 г. сьцьвярджаў, што ўзьнікненьне як круга, так і БРГ было вынікам калектыўных дзеяньняў Івана і Антона Луцкевічаў і Вацлава Іваноўскага, якіх ён называў "добра сьпетай тройкай, узяўшай на сябе кіраўніцтва" беларускага студэнцкага руху ў Пецярбургу. Пры гэтым заміж спачатнай канцэпцыі раздваеньня ці дыфэрэнцыяцыі сярод дзеячоў круга ён падаў новую вэрсію аб радыкалізацыі паглядаў усёй гэтай кіраўнічай тройкі[8].

Такім чынам, Луцкевіч меў прынамсі тры вэрсіі генэзы БСГ, а менавіта — у 1909—1910, у 1923 г. і ў 1928 г., пры гэтым пазьнейшыя яго выказваньні пярэчылі ранейшым. Павялічылася таксама разьбежнасьць паміж вэрсіямі Луцкевіча і Бурбіса. Гэта выклікала паняцьцёвую блытаніну вакол генэзы беларускага нацыянальнага і рэвалюцыйнага руху. Гэтую праблему ўжо на пачатку 1929 г. адзначыла віленская "Biełaruskaja Krynica", якая, ацэньваючы кагадзе выдадзеную брашуру Луцкевіча "За дваццаць пяць гадоў", пісала:

> Ясная рэч, што такая падзея, як узьнікненьне першай беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі, павінна быць дакладна акрэсьленая ў часе. Дык жа паводле аўтара згаданай брашуркі, Беларуская Рэвалюцыйная Грамада паўстала ўвосень 1903 г. у Пецярбургу. У канцы 1905 г. адбыўся партыйны зьезд гэтай арганізацыі, які перайменаваў яе ў Беларускую Сацыялістычную Грамаду. Між тым А. Бурбіс, выдатны чалец БРГ, сьцьвярджае штосьці іншае. <...> Такім чынам, мы бачым, што гады, пададзеныя п. А. Луцкевічам, сумнеўныя, і ўвогуле пытаньне гэтае застаецца адкрытым. Дзеля дакладнага вызначэньня гэтых так важных для нас гадоў шмат мог бы зрабіць перадусім Вацлаў Іваноўскі, цяпер прафэсар Варшаўскай Палітэхнікі, а таксама Францішак Умястоўскі — адны зь першых піянэраў тагачаснага беларускага руху[9].

Аднак Іваноўскі, які ў гэтай справе мог сказаць ня менш за Луцкевіча, не адгукнуўся на заклік "Biełaruskaj Krynicy". Няшмат ён патлумачыў у гэтай справе таксама і ў 1934 г. у сваім лісьце да ксяндза Адама Станкевіча, у якім, аднак, ён паведаміў іншую важную дэталь, а менавіта, што ўжо перад 1902 г. у Пецярбургу існавала нефармальнае кола беларускіх студэнтаў, якое фактычна было пачаткам БСГ[10].

Ад таго часу мінула паўстагодзьдзя, аднак дасьледаваньні генэзы БСГ не пасунуліся наперад[11]. Пра гэта сьведчыць далейшая разьбежнасьць ацэнак сучасных гісторыкаў, зь якіх адныя трымаюцца думкі, што БРГ узьнікла ў 1902 г., а іншыя — у 1903 г.[12]

[5] Г.Б. (Луцкевіч А.). Дваццатыя ўгодкі // Змаганьне. 1923. 23 сьнежня. № 21. С. 2—3.

[6] Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў. Вільня, 1928. С. 10.

[7] Г.Б. (Луцкевіч А.). Дваццатыя ўгодкі...

[8] Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў... С. 8—9.

[9] Biełaruskaja Krynica. 01.02.1929. № 5.

[10] Станкевіч А. Тамсама. С. 69.

[11] У БССР вывучэньне гэтага пытаньня не ўхвалялі. —*А.С.*

[12] Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. Т. II. Мінск, 1970. С. 230; Гісторыя Беларускай ССР. Т. II. Мінск.

Няцяжка заўважыць, што гэтыя супярэчнасьці ўзьнікаюць у пытаньні стаўленьня да БПР. Бо тыя аўтары, якія ўсьлед за Луцкевічам адмаўляюць яе існаваньне, сьцьвярджаюць, што БРГ паўстала ў 1903 г., а тыя, якія схіляюцца да пазыцыі Бурбіса, трымаюцца думкі, што яна была створаная ўжо ў 1902 г.

Такім чынам, пажаданьне "Biełaruskaj Krynicy" ня страціла актуальнасьці. Гэта абгрунтоўвае дасьледаваньне дадзенага пытаньня на падставе архіўных дакумэнтаў і публікацыяў БРП—БРГ—БСГ ды ППС.

У канцы XIX ст. польскі сацыялістычны рух намагаўся выкарыстаць пачуцьцё нацыянальнай адметнасьці, якое абуджалася ў беларусаў, літоўцаў і ўкраінцаў, для стварэньня супольнай плятформы для вызвольнай барацьбы супраць царызму, мэтай якой мела быць адбудова Рэчы Паспалітай у межах 1771 г. Пра гэта сьведчаць пастановы арганізацыйнага зьезду ППС у Парыжы (лістапад 1892), разгорнутыя на III зьезьдзе ў Вільні (чэрвень 1895), якія прадугледжвалі пашырэньне партыйнай дзейнасьці ў Беларусі, Літве і Украіне, абуджэньне і падтрымку сэпаратысцкіх тэндэнцыяў сярод мясцовых сацыялістычных арганізацыяў, а таксама іх згуртаваньне пад эгідай ППС для барацьбы супраць царызму[13].

Аднак усьлед за гэтымі дэкларацыямі ППС у першае дзесяцігодзьдзе свайго існаваньня не высоўвала ніякіх ініцыятываў для арганізацыі беларускай партыі ці выданьня агітацыйнай літаратуры на беларускай мове[14].

Асобныя дзеячы ППС, асабліва Аляксандар Сулькевіч, арганізоўвалі адно нелегальную перавозку ў Беларусь некаторых выданьняў на беларускай мове, друкаваных па–за межамі расейскай дзяржавы (напрыклад, "Дудка Беларуская" і "Смык Беларускі" Ф. Багушэвіча, "Дзядзька Антон" і іншых).

Істотныя зьмены ў гэтым аспэкце прынесьлі рэзалюцыі VI зьезду ППС у Любліне (чэрвень 1902 г.), якія прадугледжвалі наданьне большай увагі нацыянальнай спэцыфіцы ў партыйнай працы ў Літве і Беларусі. У той час была створаная асобная акруга ППС для літоўска–беларускіх земляў (т.зв. ППС у Літве), і Цэнтральны Рабочы Камітэт быў упаўнаважаны выдаваць агітацыйную літаратуру на мясцовых мовах[15].

Згодна з гэтай рэзалюцыяй, ППС выдала ў Літве тры брашуры на беларускай мове ("Гуторка об тым, куды мужыцкіе грошы ідуць", "Як зробіць, каб людзям стало добрэ на сьвеці" і "Хто праўдзівы прыяцель бедного народу"), якія ў канцы 1902 г. і ў студзені 1903 г. былі надрукаваныя ў пэпэсаўскай друкарні ў Лёндане. Апроч таго, у траўні 1903 г. літоўскі аддзел ППС выдаў на беларускай мове адозву да земляробаў з–пад Скідзеля ("До браці мужыкоў").

У дзейнасьці ППС, якая ў той час распачынала прапагандысцкую дзейнасьць на ўсіх мовах жыхароў Літвы і Беларусі, згаданыя публікацыі не былі чымсьці выключным. Але ў колах беларускай інтэлігенцыі яны ацэньваліся іначай, бо яны папулярызавалі ня толькі рэвалюцыйныя ідэі, але таксама і беларускую мову. Мабыць, гэтым тлумачыцца зробленае ў 1917 г. Аляксандрам Прушынскім (Алесем Гаруном) сьцьвярджэньне, што ППС "запачаткавала беларускі сацыялістычны рух, бо, працуючы сярод нашых работнікаў і сялян, гэтая партыя старалася абудзіць іх нацыянальнае пачуцьце"[16].

Падобнага пагляду пазьней трымаліся Адам Станкевіч, дзеячы ППС Мэнахім Вай-

---

1972. С. 313; Kosman M. Historia Białorusi. Wrocław—Warszawa—Kraków—Gdańsk, 1979. S. 263; Jurkiewicz J. Rozwój polskiej myśli politycznej na Litwie i Białorusi w latach 1905—1922. Poznań, 1983. S. 97—98.

[13] Materiały do historii PPS i ruchu rewolucyjnego w zaborze rosyjskim 1893—1897. Warszawa, 1907. S. 19 i 149.

[14] Адна зь першых агітацыйных брашураў на беларускай мове "Дзядзька Антон" была выдадзеная на пачатку 1892 г. у Тыльзыце Мар'янам Абрамовічам, які ніколі ня быў чальцом ППС, а сродкі на яе выданьне сабраў Польскі гурток у Маскве, які яднаў сяброў розных палітычных арыентацыі.

[15] Матэрыялы VI Зьезду ППС. Цэнтральны архіў ЦК ПАРП, 305/III/1. Справа 2. В. 36—40.

[16] Станкевіч А. Тамсама. С. 71—72.

нэр, Уладзіслаў Побуг–Маліноўскі і іншыя, падкрэсьліваючы вялікую ролю ППС ува ўзьнікненьні першай беларускай рэвалюцыйнай партыі[17].

Адносна нядаўна на гэтую тэму выказаўся Вацлаў Пануцэвіч, сьцьвярджаючы, што ўжо ў 1896 г. ува ўлоньні ППС паўстала беларуская група пад назвай Беларуская Рэвалюцыйная Партыя, кіраўніцтва якой складалі Вацлаў і Тадэвуш Іваноўскія, Іван і Антон Луцкевічы, Лявон Малецкі, Л. Мілер, Мечыслаў Міхаловіч і Аляксандар Бурбіс[18].

Не падлягае сумневу, што, выказваючы гэты погляд, Пануцэвіч выкарыстаў зьвесткі, якія паведаміў Станкевіч, паводле якіх В. Іваноўскі распачаў дзейнасьць у Пецярбургу ў 1896 г.[19]

Аднак гэтая інфармацыя не адпавядала рэчаіснасьці. У 1896 г. В. і Т. Іваноўскія былі яшчэ вучнямі Варшаўскай гімназіі і мелі 16 і 14 гадоў. Яшчэ маладзейшыя былі браты Луцкевічы (15 і 12 гадоў), а Бурбісу было ўсяго 11 гадоў. Трохі замала для кіраваньня партыйнай працай.

Вось жа, Пануцэвіч відавочна памыліўся. Насамрэч, В. Іваноўскі толькі ў 1899 г. скончыў гімназію і ўвосень таго году прыбыў у Пецярбург, дзе пачаў навучаньне ў Тэхналягічным інстытуце. Адначасна ён распачаў дзейнасьць на ніве беларускага нацыянальнага адраджэньня. З гэтай мэтай сярод пецярбурскіх студэнтаў рэвалюцыйнай і сацыялістычнай арыентацыі ён стварыў беларускай кола, якое не пазьней за 1901/1902 акадэмічны год прыняло назву Беларускай Рэвалюцыйнай Партыі. У ліку іншых ён далучыў да супрацы студэнтаў Тэхналягічнага інстытуту Антона НекандУ–Трэпку, Лявона Малецкага, Генрыка і Францішка Умястоўскіх, а таксама дзеячоў пецярбурскай арганізацыі ППС — Мечыслава Міхаловіча і Рамуальда Мілера. Да гэтай групы належаў Бурбіс — тагачасны вучань віленскай гімназіі[20] уцягнуты, напэўна, Алёйзіяй Пашкевіч (Цёткай), якая даўно была ў кантакце з Іваноўскім[21].

Увосень 1902 г. у кола дзеячоў БРП уліліся браты Луцкевічы, якія прыехалі вучыцца ў Пецярбург. Тут жа апынулася Пашкевіч, а таксама — на кароткі час — натхнёны ёй Фэлікс Стацкевіч[22].

Прынятая назва "рэвалюцыйнай партыі" была, можа быць, занадта прэтэнцыёзнай з гледзішча яе тагачаснай дзейнасьці, тым ня менш яна выражала аптымізм Іваноўскага што да пэрспэктываў гэтага руху. Пра гэта сьведчыць цікавы факт, што ўжо вясной 1902 г. вядучыя дзеячы БРП зьбіраліся неўзабаве склікаць свой партыйны зьезд. Гэтае пытаньне разглядалася ў чэрвені 1902 г. на VI Зьезьдзе ППС, які, як сьведчыць прынятая яго ўдзельнікамі адмысловая "беларуская рэзалюцыя", даручыў выканаўчаму камітэту паслаць сваіх дэлегатаў на беларускі зьезд, каб "выказаць ім сымпатыю і пажаданьні

---

[17] Тамсама. С. 72; Pobóg–Malinowski W. Najnowsza historia polityczna Polski. T. II. Londyn, 1967. S. 335; Wajner M. Do historii PPS na Litwie // Niepodległość, 1937. T. XV. S. 329.

[18] Panucewicz W. Odrodzenie Białorusi i jej współczesne perspektywy // Pamiętnik Wileński. Polska Fundacja Kulturalna. Londyn, 1972. S. 334.

[19] Станкевіч А. Тамсама. С. 69. — Ю.Т.

[20] А. Луцкевіч пісаў (БДАМЛМ, ф. 3, воп. 1, адз. захав. 267), што А. Бурбіс вучыўся ў гімназіі, а Ф. Стацкевіч ува ўспамінах "Зь мінуўшчыны беларускага руху" (Беларускі летапіс. 1937. № 6—7. С. 133) сьцьвярджаў, што ён быў вучнем рэальнай вучэльні. — *А.С.*

[21] Тамсама. С. 74; Кайрыс С. З маіх успамінаў пра Цётку // Конадні. 1954. № 2. С. 68—69. — *Ю.Т.*

Гэтыя ўспаміны друкаваліся таксама ў: На суд гісторыі. Успаміны, дыялёгі. Мінск, 1994; Цётка. Творы. Мінск, 2001. — *А.С.*

[22] Стацкевіч Ф. З маіх успамінаў. Рукапіс у аўтара, бяз даты. — *Ю.Т.*

Тэкст Ф. Стацкевіча "З маіх успамінаў" з прадмоваю В. Адамчыка надрукаваны ў: ЛіМ. 7.08.1990. На жаль, у публікацыі, як і ў гэтым артыкуле, не паведамлена, дзе захоўваецца арыгінал гэтага тэксту. Апроч таго, Ф. Стацкевіч ёсьць аўтарам "Успамінаў", рукапіс якіх знаходзіцца ў БДАМЛМ: Ф. 55/4. Воп. 1, адз. захав. 1. — *А.С.*

імкнуцца да незалежнасьці і фэдэрацыйных стасункаў з намі". Адначасна рэзалюцыя сьцьвярджала, што "ППС пакідае за сабой права ўзьдзейнічаць на беларускі народ даступнымі ёй сродкамі, якія не супярэчаць прынцыпам і інтарэсам Беларускай сацыялістычнай арганізацыі"[23].

Дэлегаты ППС, аднак, не змаймелі магчымасьці прэзэнтаваць гэтую пазыцыю на зьездзе БРП, бо гэты зьезд не адбыўся. Аднак праект скліканьня гэтага зьезду выклікаў згаданую рэзалюцыю, якая ў выніку стала важным дакумэнтам, які сьведчыў пра арганізацыйную і ідэйную незалежнасьць БРП ад ППС. Інструкцыя для пэпээсаўскіх дэлегатаў, якая ўтрымлівала палітычныя пажаданьні (незалежнасьць, фэдэрацыя), гучала б іначай у выпадку, калі б БРП узьнікла з ініцыятывы ППС як яе аддзяленьне, на што паказвала б выказваньне Пануцэвіча.

Істотнае значэньне для пацьверджаньня гэтай ацэнкі мае другая частка цытаванай рэзалюцыі, якая паказвае, што ППС ня мела намеру выпускаць з рук беларускі "вучастак", ні дзяліцца сваім уплывам зь беларускай саюзьніцай. У гэтым выпадку запэўненьне VI Зьезду ППС у павазе да пазыцыі і інтарэсаў беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі было дэкларацыяй, якая ні ў чым не ўціскала інтарэсаў ППС, бо арганізацыйны і матэрыяльны патэнцыял дзеяньня абедзьвюх партыяў быў непараўнальны. Гэта красамоўна адлюстроўвае той факт, што толькі летам 1902 г. Іваноўскі пачаў працу, каб зарабіць грошы для набыцьця памнажальнага апарату для выданьняў БРП. Вось жа, гэтая арганізацыя, пэўна, была вельмі слабой. Аднак цяжка было прадбачыць, як пойдзе яе далейшая дзейнасьць. У гэтай сытуацыі пастанова VI Зьезду ППС аб выданьні агітацыйнай літаратуры на беларускай мове была задумана як сродак утрымаць у сваіх руках ініцыятыву ў прапагандысцкай дзейнасьці ў Беларусі.

Першым вядомым сёньня дакумэнтам БПР была гектаграфічная адозва "Да інтэлігенцыі", выдадзеная ў Пецярбургу ўвосень 1902 г., якая заклікала да стварэньня граматыкі беларускай мовы, літаратуры, краязнаўства і айчыннай гісторыі, а таксама да разьвіцьця выдавецкай дзейнасьці ў гэтай сфэры[24].

Такім чынам, гэта была тыповая праграма культурна–асьветнай дзейнасьці, якая, аднак, не вычэрпвала ўсіх праграмных намераў БРП. Пра гэта сьведчыць выдадзены ў апошнія дні 1902 г. орган гэтай партыі "Свабода", у якой знаходзіліся характэрныя для сацыялістычных партыяў ідэі рабоча–сялянскай салідарнасьці і змаганьня супраць царскага дэспатызму[25].

Аднак у выніку зьнішчэньня амаль усяго накладу "Свабода" не была распаўсюджаная, у зьвязку з чым адозва "Да інтэлігенцыі" заставалася адзіным дакумэнтам, на падставе якога ППС фармавала сваё стаўленьне да БРП.

У лютым 1903 г. гэтае стаўленьне на бачынах "Przedświtu" выказаў вядучы дзяяч ППС Вітальд Ёдка–Наркевіч, які пасьля запэўненьня ў гатоўнасьці ППС да судзеяньня ў працэсе ператварэньня беларускага народу ў нацыю з акрэсьленым характарам, г.зн. зь літаратурнай мовай, пісьменствам, інтэлігенцыяй, школьніцтвам і г.д., пісаў наступнае:

> Аднак калі мы поўнасьцю прызнаем права кожнага народу на разьвіцьцё і самастойнасьць, то з гэтага зусім не вынікае, што мы павінны некрытычна разглядаць шанцы падобнага разьвіцьця. Дык што датычыць беларусаў, то трэба прызнаць, што пэрспэктывы ператварэньня гэтага народу ў нацыю прынамсі ў сёньняшніх палітычных варунках вельмі малыя. (...) Ці будзе беларускі народ шчасьлівы, калі ператворыцца ў беларускую нацыю? Адказ вельмі лёгкі. Ці польскі, французскі, нямецкі народ мае ўсё, што яму трэба? Відавочна, што не. Таму сапраўдны беларускі

[23] Матэрыялы VI Зьезду ППС (Беларуская пастанова), ЦА ЦК ПАРП, 305/III/1. Справа. 2. В. 36—40.
[24] Odezwa "Do inteligencji" // Przedświt. 1903. № 2. S. 53—54. — *Ю.Т.*
Пераклад гэтага дакумэнту гл. на сайце Беларускай сацыял–дэмакратычнай партыі (Грамады). — *А.С.*
[25] Гл. арт. "Па сьлядох «Свабоды»" ў гэтай кнізе. С...

патрыёт ня можа абмежавацца зьбіраньнем народных казак, сьпеваў і замоваў, дасьледаваньнем граматыкі, але павінен займацца разьвіцьцём сьвядомасьці гэтага народу, тлумачыць яму, што яго эксплёатуюць і ўціскаюць, і стварацъ зь яго адну вялікую палітычную сілу, якая б здолела заваяваць сабе лепшую будучыню. Мы зусім не пярэчым, што нацыі, якая мае ўласную інтэлігенцыю, жывецца лепей, чым народу, які стаіць на ўзроўні беларускага народу, але пачатак грамадзкай дзейнасьці з стварэньня гэтай інтэлігенцыі сярод народу, які ня мае самых асноўных людзкіх правоў і стаіць на гэтак нізкім узроўні культуры, як беларускі народ, было б будаваньнем замку на пяску. А калі цяпер зьвярнуць увагу на тое, што пашырэньне грамадзкай сьвядомасьці сярод карэннага беларускага насельніцтва павінна адбывацца на беларускай мове, што вымагае як дасканалых ведаў самой мовы, так і стварэньня ўсёй літаратуры — брашур, кніжак, часопісаў, — то мы прыйдзем да пераканаваньня, што такая дзейнасьць, якую рэкамэндуем мы (г.зн. выданьне агітацыйнай літаратуры на беларускай мове. — *Ю.Т.*), будзе больш плённай з нацыянальнага пункту гледжаньня, чымся праца, прапанаваная аўтарамі адозвы. Сацыялістычную брашуру, умела напісаную, чытаюць тысячы, часам дзясяткі і сотні тысяч людзей, адначасова ўпэўніваючыся ў веданьні роднай мовы, тады як збор этнаграфічных дасьледаваньняў нават у культурных краінах разыходзіцца часам толькі ў дзясятках асобнікаў. Таму рэвалюцыянэр, які працуе для народу, тым самым спрычыняецца да стварэньня матэрыялу для будучай нацыі[26].

Важным чыньнікам, які ўзмацняў гэтую аргумэнтацыю ППС, была "Гуторка" ды іншыя лёнданскія брашуры, якія ад пачатку 1903 г. пачалі трапляць у Беларусь і ў Пецярбург. Яны рабілі вялікае ўражаньне на беларускіх дзеячоў, якія ацэньвалі іх як канкрэтны довад інтэрнацыяналістычных намераў ППС. Крытыка "Przedświtu", падтрыманая выдавецкімі высілкамі ППС, у вялікай ступені паўплывала на дыфэрэнцыяцыю і раскол у беларускім асяродзьдзі ў Пецярбургу, што ў выніку прывяло да заняпаду "асьветнай" БРП і стварэньня Іванам Луцкевічам "рэвалюцыйнай" Грамады. Гэта была не адзіная прычына. Важную ролю ў гэтым адыгралі таксама асабістыя дачыненьні між вядучымі пецярбурскімі дзеячамі. Браты Луцкевічы, маючы за плячыма пэўны досьвед арганізацыйнай працы ў Менску, прэтэндавалі на вядучую ролю ў беларускім руху ў Пецярбургу, што мусіла прывесьці да канфлікту з Іваноўскім — фактычным стваральнікам гэтага руху. У выніку дарогі гэтых дзеячоў на пэўны час разышліся, аднак гэта здарылася не ў канцы 1902 г., пра што сьведчыць той факт, што яшчэ ў апошнія дні сьнежня 1902 г. была выдадзеная "Свабода" як орган БРП з датай 1903 г.[27].

Раскол у кіраўнічай тройцы адбыўся, напэўна, на пачатку 1903 г. Ад таго часу Іваноўскі ўласнымі сіламі ажыцьцяўляў задачы, вылучаныя ў адозьве "Да інтэлігенцыі", цяпер пад шыльдай Круга Беларускай Народнай Прасьветы, засяроджваючыся галоўным чынам на выдавецкай дзейнасьці. Луцкевічы ж прыступілі да стварэньня новай арганізацыі — Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады. Праз гады пасьля гэтага Іваноўскі лічыў за лепшае не ўспамінаць гэтых падзеяў, Луцкевіч жа колькі разоў вяртаўся да іх, намагаючыся давесьці, што падваліны беларускага руху ў Пецярбургу былі закладзеныя Іванам Луцкевічам. Аднак гэтаму супярэчыла заснаваная Іваноўскім БРП, таму Луцкевіч яе проста ігнараваў, а выдадзеныя ёй публікацыі прыпісваў альбо Кругу Беларускай Народнай Прасьветы (адозва "Да інтэлігенцыі"), альбо Беларускай Рэвалюцыйнай Грамадзе ("Свабода")[28].

Калі ўзьнікла БРГ? Пададзеныя напачатку зьвесткі Луцкевіча (зіма 1902/1903, восень 1903 г., канец 1903 г.) паказваюць, што ён сам як адзін зь яе стваральнікаў ня мог дакладна вызначыць гэтага. У любым выпадку гэта было не ў 1902 г. Напэўна, на пачатку 1903 г. Іван Луцкевіч прыступіў да яе арганізацыі ў Пецярбургу, аднак у канцы кра-

[26] Wroń. (Jodko-Narkiewicz W.) Z powodu odezwy białoruskiej // Przedświt. 1903. № 2. S. 54—57.

[27] Туронак Ю. Тамсама.

[28] Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў... С. 9 і 16; Народная справа. 1926. 21 верасьня. № 20. С. 3.

савіка трапіў у турму на колькі месяцаў, што выклікала адтэрміноўку арганізацыйных дзеяньняў. Падаецца, што за найбольш праўдападобную дату стварэньня БРГ можна прыняць восень 1903 г., бо ўжо ў лістападзе і сьнежні ў крыніцах ППС зноў зьяўляецца інфармацыя аб існаваньні беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі[29].

Цяжка з пэўнасьцю сказаць, ці разьлічвалі Луцкевічы, пачынаючы стварэньне БРГ, на падтрымку ППС. Калі гэта было так, то неўзабаве ім давялося расчаравацца, бо ўжо ў чэрвені 1903 г. канфэрэнцыя РЦК ППС у Вільні пастанавіла спыніць выданьне пад шыльдай ППС агітацыйнай літаратуры на беларускай мове[30].

Падаецца, што гэта было выклікана не меркаваньнямі ляяльнасьці да беларускай партыі, якія абумоўлівалі неўмяшаньне ў яе сфэру дзейнасьці, бо ў чэрвені 1903 г. БПР ужо не існавала, а БРГ яшчэ не была створаная. На гэта паказвае таксама пацьверджаны Менскай канфэрэнцыяй ЦРК (сьнежань 1903 г.) прынцып працягваць дзейнасьць ППС сярод беларускага насельніцтва[31].

Як сьведчыць пратакол Віленскай канфэрэнцыі, гэтая важная пастанова была прынятая на прапанову Пілсудзкага, на думку якога беларускі народ ня быў схільны карыстацца выданьнямі на яго роднай мове. Тым самым пераканаўчая аргумэнтацыя Ёдкі–Наркевіча губляла дагэтулешні грунт, а БРГ заставалася без прапагандысцкай літаратуры, за выняткам ужо выдадзеных "Гуторкі" і іншых лёнданскіх брашур, якія яна атрымлівала за плату і ў абмежаваных колькасьцях[32].

Стаўленьне ППС да БРГ, як і ў 1902 г. да БРП, фармавалася пад уплывам двух чыньнікаў. Адным зь іх была мабілізацыя беларускага народу на змаганьне з царызмам, а другім, нягледзячы на афіцыйнае адпрэчаньне гэтага, — непрыхільнае стаўленьне ППС, ува ўсякім выпадку, вядучых чальцоў яе кіраўніцтва, да беларускага нацыянальнага адраджэньня, рэалізацыя якога адкладалася на час пасьля зрыненьня царызму[33].

У гэтым апошнім выпадку паміж абедзьвюма партыямі выявілася прынцыповая супярэчнасьць: непрызнаньне з боку ППС беларускай нацыянальнасьці ў 1903 г. ставіла пад сумнеў канструктыўнае разьвязаньне беларускага нацыянальнага пытаньня таксама і па меркаваным зрыненьні царызму.

У беспасярэдняй сувязі з гэтым асноваснжным пытаньнем была справа будучага палітычнага статусу літоўска–беларускіх земляў. Абедзьве партыі ў прынцыпе былі згодныя, што Літва і Беларусь павінны скласьці асобную аўтаномную палітычную адзінку ў рамках расейскай дзяржавы з краёвым соймам у Вільні. Але гэта была часовая, а не канчатковая праграма. У далейшай пэрспэктыве, у кантэксьце імкненьня ППС да адбудовы незалежнай польскай дзяржавы, адкрывалася іншае пытаньне, а менавіта: якая канцэпцыя фэдэрацыі сасьпее ў БРГ — з Польшчай ці з Расеяй? У сьнежні 1903 г. ППС атрымала непамысную ў гэтай справе інфармацыю, бо ў кагадзе распрацаванай праграме БРГ (notabene: распрацаванай самастойна, без кантакту з ППС) пастулят фэдэрацыі з Польшчай адсутнічаў[34].

Адсюль у кіраўніцтве ППС узьнікалі абгрунтаваныя асьцярогі, што БРГ аддае перавагу фэдэрацыйнаму зьвязу з рэспубліканскай Расеяй, што, зрэшты, адпавядала рэчаіснасьці. Таму пры такім раскладзе беларускія дзеячы спадзяваліся атрымаць больш эфэктыўную процівагу моцным польскім палітычным, эканамічным і культурным уплывам у Беларусі. ППС таксама правільна ацэньвала пазыцыю БРГ у аграрным пытаньні,

[29] Walka. 1903, listopad. № 3. S. 5; Пратакол Менскай канфэрэнцыі ЦРК ППС ад 16—17.12.1903 г., ЦА ЦК ПАРП 305/III/3, справа 3.

[30] Справаздача ЦРК ППС ад чэрвеня 1903 г. // Niepodległość. 1939. T. XX. S. 111.

[31] Пратакол Менскай канфэрэнцыі ЦРК ППС.

[32] Тамсама.

[33] Nasze stanowisko na Litwie // Walka. 1903, listopad. № 3. S. 5.

[34] Пратакол Менскай канфэрэнцыі ЦРК ППС... (Канфэрэнцыя адбылася ў сьнежні 1903).

якая эвалюцыянавала ў кірунку аслабленьня пазыцыяў польскіх земляўласьнікаў у Беларусі.

У гэтым стане рэчаў стаўленьне ППС да БРГ было стрыманым і чакальным, наступствам чаго было нежаданьне падтрымліваць такога няпэўнага саюзьніка. Гэтая акалічнасьць, як і раскол у зародкавым беларускім руху, а таксама часовая адсутнасьць шырокай грамадзкай падтрымкі абумовілі мізэрныя вынікі дзейнасьці БРГ у першы год яе існаваньня. Па сутнасьці, апроч свайго першага зьезду (сьнежань 1903 г.) і праграмы, пра якую дакладна не вядома, ці яна была апублікаваная, БРГ не пакінула дакумэнтальных сьлядоў свайго існаваньня ў выглядзе самастойна выдадзенай адозвы ці іншай публікацыі[35].

У літаратуры таксама адсутнічаюць якія–колечы згадкі пра іншыя акцыі БРГ. Яна таксама не даслала сваіх дэлегатаў на канфэрэнцыю апазыцыйных і рэвалюцыйных партыяў расейскай дзяржавы, якая адбылася ў верасьні 1904 г. у Парыжы[36]. Таму можна пагадзіцца з ацэнкай некаторых гісторыкаў, што БРГ у той час больш нагадвала інтэлігенцкі клюб, чымся палітычную партыю.

Рост актыўнасьці беларускага рэвалюцыйнага руху адзначаецца толькі пачынаючы з восені 1904 г., на што паўплывала як ажыўленьне рэвалюцыйных настрояў у Беларусі, так і зьмены ў гэтым руху, якія былі зьвязаныя з узьнікненьнем Беларускай Сацыялістычнай Грамады (БСГ). На жаль, таксама і гэтае пытаньне не пазбаўленае супярэчнасьцяў. Як было паказана напачатку, Луцкевіч сьцьвярджаў, што гэта адбылося альбо ў канцы 1903 г., альбо ў канцы 1905 г., хаця Бурбіс, а ўсьлед за ім і сучасныя гісторыкі, трымаецца думкі, што ператварэньне БРГ у БСГ адбылося на яе першым зьезьдзе ў канцы 1903 г. Зьвернем увагу, аднак, што абедзьве згаданыя антываенныя адозвы, зь якіх першая была выдадзена ў сакавіку, а другая — у чэрвені ці ліпені 1904 г., былі падпісаныя яшчэ БРГ, а не БСГ[37]. Таксама запрашэньне на Парыскую канфэрэнцыю было скіраванае да БРГ, а не БСГ[38].

Назва БСГ упершыню зьявілася на дэклярацыях Парыскай канфэрэнцыі, да якіх, ужо пасьля гэтай канфэрэнцыі, далучылася БСГ[39].

Гэта, напэўна, адбылося ў кастрычніку 1904 г., пра што мы можам меркаваць на падставе ліста Ёдкі–Наркевіча ад 10 лістапада 1904 г., у якім ён паведамляў, што беларуская партыя зьмяніла сваю назву на БСГ[40].

Такім чынам, абапіраючыся не на суб'ектыўныя ўспаміны, а на дакумэнты, можна сьцьвердзіць, што БСГ узьнікла ані ў канцы 1903 г., ані ў канцы 1905 г. Пры гэтым я сьвядома ўнікаю азначэньняў накшталт "ператварэньне" ці "зьмена назвы". Той факт, што БСГ была створаная прыкладна ў кастрычніку 1904 г., ёсьць бясспрэчна інтрыгоўным, як інтрыгоўнай ёсьць таксама і тэндэнцыя Луцкевіча да зацямненьня гэтага факту[41].

[35] У сакавіку 1904 г. зьявілася адозва "Таварышы" на польскай, беларускай, літоўскай і латыскай мовах з подпісамі ППС, БРГ, а таксама літоўскай і латыскай сацыял–дэмакратычных партыяў, а ў сярэдзіне таго ж году — адозва "Браця Мужыкі" на польскай і беларускай мовах, падпісаная ППС і БРГ. Абедзьве адозвы былі выдадзеныя ППС і зь яе ініцыятывы. Параўн.: Przedświt. 1904. № 3. S. 133—135 і 151; а таксама № 7. S. 305.

[36] Przedświt. 1904. № 10—12. S. 1.

[37] Параўн. тэксты адозваў "Таварышы!" і "Браця Мужыкі" ў ЦА ЦК ПАРП, 305/III/36, справа 8.

[38] Przedświt. 1904. № 10—12. S. 1.

[39] Тамсама. С. Ibidem. S. 407—408.

[40] Ліст Ёдкі–Наркевіча ад 10.11.1904, ЦА ЦК ПАРП, 305/VII/49. Справа 2. Арк. № 688.

[41] Калі А. Луцкевіч сьвядома ігнараваў факт існаваньня БРП, дык, мусіць, ён не лічыў гэтую арганізацыю цалкам палітычнаю (зрэшты, адозва "Да інтэлігенцыі" сьведчыць пра яе культурніцкі ўхіл), што ж датычыць справы ператварэньня БРГ у БСГ, то Луцкевіч вяртаўся да яе ўва ўжо названай працы "Да гісторыі Беларускае Рэвалюцыйнае (пасьля Сацыялістычнае) Грамады (Даты і факты)". Агулам трэба зацеміць, што Луцкевіч вельмі часта пакладаўся на памяць. Адсюль ягоныя памылкі ў цытаваньні паз-

Гэтыя акалічнасьці выклікаюць сумнеў у тым, ці было тое звычайнай зьменай назвы партыі. Ня выключана, што ў гэтым выпадку мы маем справу з БСГ як новай партыяй.

Пакідаючы адкрытым пытаньне аб падрабязных акалічнасьцях канца БРГ і пачатку БСГ, выпадае зьвярнуць увагу на адзін важны яго аспэкт. Вось жа, у адной з ранейшых сваіх публікацыяў Луцкевіч сьцьвярджаў, што існуючы ў перадрэвалюцыйныя гады (г.зн. перад 1905 г. — *Ю.Т.*) дыфэрэнцыяваны, двухкірункавы беларускі рух, г.зн. культурна-асьветны і рэвалюцыйны, у вырашальны момант рэвалюцыйнага ажыўленьня злучыўся ў адну плынь[42].

Хоць гэтае выказваньне ня ўтрымлівае больш падрабязных дэталяў, найперш прозьвішчаў, што ў варунках царскага рэжыму было зразумелае, не падлягае сумневу, што яно азначала новае наладжаньне супрацы паміж Івапоўскім і Луцкевічамі. Гэты факт меў вялікае значэньне для дзейнасьці БСГ. Аддаўшы ў яе распараджэньне свой выдавецкі досьвед і магчымасьці, Іваноўскі ў вялікай ступені спрычыніўся да таго, што БСГ пачала самастойную прапагандысцкую дзейнасьць. У выніку, толькі ў 1905 г. БСГ выдала больш за 20 адозваў на беларускай мове, на пачатку 1906 г. адкрыла ўласную друкарню ў Менску, а таксама спэцыяльнае выдавецтва "Грамада" ў Пецярбургу. Агульная выдавецка-прапагандысцкая прадукцыя БСГ ацэньвалася на сотні тысяч асобнікаў адозваў і брашур, распаўсюджаных у Беларусі[43].

У шырэйшым маштабе разгарнулася таксама страйкавая дзейнасьць БСГ, асабліва сярод земляробаў. Паводле ацэнкі Бурбіса, у той час адбылася радыкальная зьмена характару партыі, якая стала масавай арганізацыяй.

У гэтай сытуацыі, пачынаючы ад восені 1904 г., у ППС выяўляецца імкненьне навязаць супрацу з БСГ. Папярэдні кантакт ППС з БСГ, які абмяжоўваўся выданьнем супольных антываенных адозваў, пэпээсаўскія крыніцы ацэньвалі як часовую дамоўленасьць і прэлюдыю да гэтае супрацы[44].

Першым крокам у гэтым кірунку было далучэньне БСГ да рэзалюцыяў Парыскай канфэрэнцыі, якія прадугледжвалі стварэньне кааліцыі рэвалюцыйных партыяў, што дзейнічалі ў расейскай дзяржаве. Далейшым супольным крокам ППС і БСГ, зробленым на пачатку 1905 г. напярэдадні Жэнэўскай канфэрэнцыі (сакавік 1905 г.), было ўзгадненьне пазыцыяў у справе адасабленьня гістарычнай Літвы (Літвы і Беларусі) як аўтаномнага абшару расейскай дзяржавы з рэгіянальным соймам у Вільні[45].

Неўзабаве абедзьве партыі зрабілі шэраг супольных акцыяў, як, напрыклад, страйк работнікаў больніцы ў Новай Вялейцы (жнівень 1905 г.) ці ўсеагульны палітычны страйк у Вільні (сьнежань 1905 г.)[46]. ППС падтрымлівала таксама прапагандысцкую дзейнасьць БСГ, даючы для друку некаторых беларускіх адозваў свае друкарні.

Не падлягае сумневу, што ў часткі кіраўніцтва ППС у той час выяўляліся тэндэнцыі да пабудовы стасункаў і супрацы з БСГ на прынцыпе партнэрства і павагі да беларускіх нацыянальных інтарэсаў. Аднак вызначальную ролю мелі тыя чальцы кіраўніцтва (Пілсудзкі, Пэрль), для якіх гэтая супраца была толькі пытаньнем тактыкі ў іх імкненьні да рэалізацыі палітыкі анэксіі. І хоць афіцыйныя дакумэнты ППС надалей абвяшчалі

тычных твораў і ў датах. Так, у 1921 г. ён пісаў пра спробу выдаць "падпольную "Свабоду" (на цыклястылі)" у 1903 г. (А.Л. З-пад пылу архіваў // Наша Думка. 1921. 1 красавіка). І гэта больш-менш правільная дата, калі ўлічыць сьвяткаваньне "праваслаўных" Калядаў паводле старога (канец 1902 г.) і новага (пачатак 1903 г.) стыляў. Пазьней ён жа датаваў гэтую падзею 1905 годам. — *А.С.*

[42] Новина А. (Луцкевіч А.) Белорусы // Формы национального движения... С. 392—393.

[43] Навіна А. (Луцкевіч А.) На дарозі да новага жыцьця // Маладая Беларусь. Сшытак 1. Пецярбург, 1912. С. 21.

[44] Przedświt. 1903. № 10—12. S. 409.

[45] Przedświt. 1905. № 4—5. S. 176.

[46] Параўн. Адозвы БСГ і ППС "Po zwycięstwo", "За свабоду" і "До ўсіх работнікоў і работніц Вялейскае бальніцы" // ЦА ЦК ПАРП, 305/III/36, справа 8, в. 48 і 63—64.

лёзунгі правоў усіх нацыянальнасьцяў Літвы і Беларусі[47], тым ня менш — як сьцьвярджае Анна Жарноўская — Пілсудзкі не прызнаваў роўнасьці Польшчы і гэтых нацыянальнасьцяў у правах на самавызначэньне[48].

Гэтыя тэндэнцыі перамаглі падчас першай расейскай рэвалюцыі, калі ў сьвятле растучых надзеяў на хуткае атрыманьне Польшчай незалежнасьці падыход да нацыянальнага пытаньня, як літоўскага, так і беларускага, атрымаў іншае, больш канкрэтнае вымярэньне. У такім кантэксьце ў гэтых колах польскіх сацыялістаў пастулявалася ўлучэньне Ковенскай, Віленскай, Гарадзенскай і Менскай губэрняў у склад будучай польскай дзяржавы[49]. Гэта азначала імкненьне да падзелу Беларусі і анэксіі яе заходніх абшараў.

Пры такім стане рэчаў саюз ППС і БСГ быў магчымы толькі ў плашчыні барацьбы з царызмам. У іншых жа абсягах, з прычыны разьбежных у пэрспэктыве мэтаў, гэтая супраца была немагчымая, у зьвязку з чым ППС магла пакладацца толькі на ўласныя дзеяньні. Аднак яе магчымасьці беспасярэдняга ўзьдзеяньня на беларускі народ, асабліва вяскоўцаў, былі невялікія, і з тактычных меркаваньняў іх не выпадала ўжываць. Нягледзячы на гэта, ППС не адмаўлялася ад такога ўзьдзеяньня і шукала адпаведныя формы яго рэалізацыі. Можна меркаваць, што ўзьнікненьне БРГ паскорыла рэалізацыю гэтай задумы, на што паказвае зацікаўленасьць удзельнікаў Менскай канфэрэнцыі ЦРК (сьнежань 1903 г.) да існуючай у Варшаве т.зв. беларускай групы[50].

На базе гэтай групы ППС спрабавала стварыць падкантрольную ёй арганізацыю, якая публічна павінна была выступіць як паралельная БРГ/БСГ беларуская партыя. Летам 1904 г. гэтая група прыняла назву Сацыялістычнай партыі Белай Русі (СПБР), а яе дзеячамі былі маладыя пэпэсаўцы Мар'ян Фальскі, Францішак Завадзкі, браты Станіслаў і Казімер Трускоўскія, Браніслаў Шушкевіч ды іншыя. Усе яны паходзілі зь Беларусі, галоўным чынам зь Меншчыны і Гарадзеншчыны, ведалі беларускую мову і мелі за плячыма пэўны досьвед нелегальнай рэвалюцыйнай і асьветнай дзейнасьці[51].

Апроч Варшавы, Горадні і Менску, дзе засяроджваліся дзеячы ППС, якія выступалі пад шыльдай СПБР, гэтая арганізацыя ня мела іншых рэгіянальных асяродкаў, а адзіным яўным вынікам яе дзейнасьці былі колькі адозваў, выдадзеных у Варшаве на беларускай мове[52], якія пераважна распаўсюджваліся чальцамі БСГ[53].

Асноўнай задачай СПБР, такім чынам, была не канкурэнтная праца ў рэгіёнах, але супраца з БСГ, якая мела прывесьці да аб'яднаньня абедзьвюх партыяў[54], што ў выніку забясьпечыла б больш эфэктыўны ўплыў ППС на БСГ. З гэтай мэтай у канцы 1904 г. Фальскі распачаў перамовы з прадстаўнікамі БСГ, якія, аднак, скончыліся фіяска. Прычыну гэтай няўдачы Фальскі бачыў у тым, што СПБР стаяла на пазыцыі сацыялістычнай ідэалёгіі, БСГ ж не ішла на перагляд сваёй нацыяналістычнай пазыцыі[55].

Тым часам Луцкевіч ня бачыў паміж гэтымі партыямі прынцыповых разьбежнасьцяў у абсягу сацыяльнай ідэалёгіі, а абвінавачаньні СПБР на адрас БСГ тлумачыў "страхам

[47] Zadania proletariatu na Litwie i Białorusi // Walka. 24.3.1906. № 4. S. 2.

[48] Żarnowska A. Geneza rozłamu w Polskiej Partii Socjalistycznej 1904—1906. Warszawa, 1965. S. 122—123.

[49] Тамсама.

[50] Пратакол Менскай канфэрэнцыі ЦРК ППС...

[51] Зь іх Фальскі супрацоўнічаў з Іваноўскім і Багушэўскім у выданьні беларускіх брашур і адозвы "Царская гаспадарка" ў Кракаве. Аднак гэта было перад стварэньнем СПБР. Параўн.: "Удзел М. Фальскага ў беларускім выдавецкім руху" ў гэтай кнізе. [С. 20—21 нашага выданьня. — *Рэд.*]

[52] Першая адозва СПБР "З вайны" зьявілася ў кастрычніку 1904 г., пасьля — "Настаў час!" у лютым 1905 г., "Братцы мужыкі", "Прызыўные!" і "Якая карысьць народу з выборнаго правіцельства" ў кастрычніку 1905 г. Параўн.: ЦА ЦК ПАРП, 305/II/42. Няпольскія ўлёткі.

[53] Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў... С. 21.

[54] Бурбіс А. Тамсама. С. 7.

[55] Falski M. Fragmenty prac z zakresu oświaty 1900—1944. Studia Pedagogiczne. T. 31. Wrocław—Warszawa—Kraków—Gdańsk, 1974. S. 22—24.

перад будзімшыся тады *нацыянальным* пачуцьцём у беларускіх масах"[56].

Справа СПБР як філіі ППС паказвае, што за пастуляваным ППС злучэньнем усіх сілаў пралетарыяту Літвы і Беларусі, г.зн. аб'яднаньнем польскай, беларускай, літоўскай і жыдоўскай сацыялістычных партыяў, хаваліся памкненьні ППС да гегемоніі над аб'яднанай краёвай сацыялістычнай арганізацыяй. Ясная рэч, што такое разьвязаньне не магло быць прынятае БСГ і Літоўскай Сацыял–Дэмакратычнай Партыяй. Пры такім стане рэчаў скліканая вясной 1906 г. з ініцыятывы ППС канфэрэнцыя[57] ў справе аб'яднаньня гэтых партыяў скончылася няўдачай. Пытаньне непрыняцьця з боку ППС аграрнай праграмы БСГ, што ацэньваецца як галоўная прычына няўдачы тых перамоваў[58], па сутнасьці мела толькі фармальнае значэньне. Гэта пацьвердзіў выдатны дзяяч ППС у Літве Мэнахім Вайнэр наступным выказваньнем:

> Мы таксама ня ведалі іх палітычных сілаў, на якія мы маглі б абапірацца. Мы заўсёды кантактавалі з двума іх прадстаўнікамі, якія спэцыяльна для гэтага прыяжджалі ў Вільню і зь якіх адзін, калі я не памыляюся, зваўся Іваноўскім, а другі Ўласавым. Прынцыповыя адрозьненьні ў паглядах адразу паказалі, наколькі неактуальным ёсьць пытаньне злучэньня зь імі[59].

Такім чынам, ёсьць дастаткова падставаў для цьверджаньня, што, апроч малазначных дэкларацыяў і нерэгулярнага ўзаемадзеяньня, у 1902—1906 гадох супрацы паміж ППС і беларускім рэвалюцыйным рухам, рэпрэзэнтаваным БРП, БРГ і БСГ, не было. Прычыны гэтай зьявы ацэньваюцца па–рознаму, галоўным чынам у залежнасьці ад стаўленьня да БСГ у кантэксьце беларускага пытаньня ўвогуле. Гэтак, калі Фальскі закідаў БСГ беларускі нацыяналізм[60], то Побуг–Маліноўскі бачыў у ёй хутка растучыя расейскія рэвалюцыйныя ўплывы[61].

Гэтай апошняй ацэнкі, аднак, не пацьвярджаюць савецкія аўтары, якія нярэдка абвінавачвалі БСГ у тым, што яна падпадала пад польскія ўплывы[62].

Пераклад зроблены паводле: Studia polsko–litewsko–białoruskie. Warszawa, 1988.

---

[56] Луцкевіч А. За двадцаць пяць гадоў ... С. 21.

[57] Канфэрэнцыя БСГ адбылася 3—4 чэрвеня 1906 г. на кватэры Цёткі па вул. Хівінскай у Вільні. — *А.С.*

[58] I Zjazd Socjalno–Demokratycznej Partii Litwy (dawniej PPS na Litwie) // Walka. 12(25).7.1906. № 8. — *Ю.Т.*

Аб тым, што разыходжаньні ў аграрнай праграме былі галоўнаю перашкодаю на шляху аб'яднаньня ППС і БСГ, піша А. Луцкевіч. Аб'яднаньню ж БСГ і Літоўскай Сацыял–Дэмакратычнай Партыі перашкаджала імкненьне апошняй уключыць у склад будучай літоўскай дзяржавы этнаграфічна беларускія часткі Віленскай і Гарадзенскай губэрняў. Гл. А. Луцкевіч. За двадцаць пяць гадоў... Мінск, 1991. С. 34—36. — *А.С.*

[59] Wajner M. Op. cit. S. 340.

[60] Прыпісваць нацыяналізм беларускім (украінскім, літоўскім і г.д.) сацыялістам і выстаўляць сябе як інтэрнацыяналістаў — гэта ўстойлівы прыём у тактыцы ППС. Асабліва ахвотна гэтым прыёмам дзеячы партыі карысталіся ў 1920–х гг. У гэтым сэнсе тактыка ППС нагадвала бальшавіцкую. — *А.С.*

[61] Pobóg–Malinowski W. Тамсама. С. 355.

[62] Большая Советская Энциклопедия. Т. IV. Москва, 1950. С. 529.

Нежаданая рэспубліка

На працягу стагодзьдзяў расейскі імпэрыялізм імкнуўся авалодаць Беларусьсю і Украінай, безь якіх немагчымай была яго актыўная палітыка ў Эўропе. Пасьля падзелаў Рэчы Паспалітай, асабліва пасьля паўстаньняў 1831 і 1863 г., пачалася плянавая русіфікацыя Беларусі, якая павінна была ўвекавечыць панаваньне Расеі ў гэтай краіне. Афіцыйна не прызнавалася беларуская нацыя і мова, што абумовіла забарону друку — гэтай перадумовы нацыянальнай сьвядомасьці. Аднак у 1904—1906 гадох, у выніку прайгранай вайны зь Японіяй і рэвалюцыі, царызм быў вымушаны лібэралізаваць сваю ўнутраную палітыку. І хаця надалей не прызнавалася беларуская нацыя і мова, усё ж былі скасаваныя абмежаваньні выдавецкай і культурнай дзейнасьці, што спрыяла росту нацыянальнай сьвядомасьці.

Гэтыя магчымасьці пасьпяхова выкарысталі дзеячы маладога беларускага нацыянальнага руху, які, нягледзячы на розныя яго недахопы, напярэдадні першай сусьветнай вайны быў ужо заўважным грамадзкім фактарам. Невыпадкова да першай сусьветнай вайны асноўным напрамкам беларускай палітычнай думкі была арыентацыя на аўтаномію Беларусі ў складзе дэмакратычнай Расеі.

У выніку ваенных падзеяў у верасьні 1915 г. Беларусь была падзелена: прыкладана 25% яе тэрыторыі акупавалі немцы, а другая, значна большая яе частка, заставалася пад уладай Расеі. На абшары сваёй акупацыі Нямеччына як першая вялікая дзяржава хутка прызнала асобнасьць беларускай нацыі і мовы, што стварыла падставу для разьвіцьця беларускага школьніцтва, выдавецкай дзейнасьці і іншых галін грамадзкага і культурнага жыцьця. На ўсходніх абшарах Беларусі падобныя магчымасьці ўзьніклі ў 1917 г., пасьля Лютаўскай рэвалюцыі. У сакавіку ў Менску паўстае Беларускі Нацыянальны Камітэт, у ліпені яго зьмяняе больш радыкальная Рада беларускіх партый і арганізацый, якая ў кастрычніку рэарганізуецца ў Вялікую Беларускую Раду як прэтэндэнта да вярхоўнага нацыянальнага прадстаўніцтва.

Аднак, нягледзячы на дэкляраваныя Лютаўскай рэвалюцыяй свабоды, мэты і дзейнасьць Рады ігнараваліся петраградзкім часовым урадам, які надалей стаяў на варце інтарэсаў "адзінай і непадзельнай" Расеі. Яго прэм'ер А. Керанскі ў адказ на высунуты Радай пастулят аўтаноміі Беларусі заявіў: "Россия — не этнографический музей!"

Першы Ўсебеларускі зьезд

Таму Вялікая Беларуская Рада спадзявалася, што ў дадзенай палітычнай сытуацыі больш рэальным чыньнікам вырашэньня пытаньня беларускай дзяржаўнасьці ёсьць нацыянальная праграма Леніна (самавызначэньне аж да аддзяленьня). Неўзабаве пасьля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў палове лістапада 1917 г. Рада выступіла з пастулятам заключыць мір зь Нямеччынай, аб'яднаць акупаваныя немцамі заходнебеларускія абшары і стварыць Беларускую дэмакратычную рэспубліку *як складовую частку савецкай Расеі*. Такім чынам, Рада не выказвала сэпаратысцкіх дзеяньняў, у чым яе вінавацяць беларускія савецкія гісторыкі.

У гэтым пляне асаблівую цікавасьць уяўляе Ўсебеларускі зьезд, які быў скліканы Вялікай Беларускай Радай і эсэраўскім Беларускім Абласным Камітэтам у сьнежні 1917 г. у Менску. Зьезд не закончыў сваёй работы на падставе рашэньня старшыні Савету Народных Камісараў Заходняй вобласьці К. Ландэра. Гэтая акалічнасьць абумовіла наступную, нібыта лягічную, тэзу ўсходніх і заходніх вучоных: калі зьезд быў разагнаны бальшавікамі, то гэта значыць, што ён быў антысавецкі, антыбальшавіцкі, з чаго ўжо просты

вывад аб яго буржуазных, сэпаратысцкіх і незалежніцкіх імкненьнях.

Усё ж гэтую тэзу часам даводзілася абгрунтоўваць, з чым "сумленныя" дасьледчыкі спраўляліся лёгка і даволі пасьпяхова. Вось прыклад з заходняга боку: у зборніку дакумэнтаў "За дзяржаўную незалежнасьць Беларусі" (Лёндан, 1960), адрэдагаваным Радаславам Астроўскім (дарэчы, удзельнікам зьезду), прыводзіцца тэкст прынятага дэлегатамі першага пункту рэзалюцыі зьезду, як наступнае:

> I. Замацоўваючы сваё права на самавызначэньне, абвешчанае расейскай рэвалюцыяй, і зацьвярджаючы рэспубліканскі дэмакратычны лад у межах Беларускай Зямлі, для ўратаваньня роднага краю і захаваньня яго ад падзелу, I Усебеларускі Кангрэс пастанаўляе безадкладна ўтварыць із свайго складу орган краёвае ўлады, які часова становіцца на чале кіраўніцтва краем, уваходзячы ў зносіны з цэнтральнай уладай.

Таму пададзены тэкст рэзалюцыі павінен выклікаць уражаньне, што зьезд меў незалежніцкі і сэпаратысцкі характар, што на добры лад павінна апраўдаць рашэньне Ландэра як праціўніка незалежнай Беларусі.

А цяпер прыклад з усходняга боку. Вадзім Круталевіч у сваёй кніжцы "Рождение Белорусской Советской Республики" (Мінск, 1975. С. 134) так прадстаўляе цытаваную рэзалюцыю: "...съезд принял резолюцию о создании органа краевой власти "в лице Всебелорусского Совета крестьянских, рабочих и солдатских депутатов" и "республиканского строя". Краевому совету должна была перейти власть в Белоруссии. Такое решение означало непризнание существующей Советской власти в Западной области. И не только непризнание, но и узурпацию власти. Этим решеним съезд противопоставил себя Октябрьской революции". Дык жа, паводле Круталевіча, інакш і быць не магло, паколькі "на съезде господствовали мелкобуржуазные партии, не признававшие новой власти" (с. 128).

Перш чым выкажам свае заўвагі, прапануем цярпліваму чытачу поўны тэкст прынятага зьездам першага пункту рэзалюцыі з падкрэсьленымі аўтарам яе элемэнтамі, прапушчанымі Астроўскім і часткова Круталевічам:

> I. Закрепляя свое право на самоопределение, провозглашенное Российской Революцией, и утверждая демократический республиканский строй в пределах Белорусской земли, для спасения родного края и ограждения его от раздела *и отторжения от Российской демократической федеративной Республики*, I Всебелорусский съезд постановляет: немедленно образовать из своего состава орган краевой власти *в лице Всебелорусского Совета Крестьянских, Солдатских и Рабочих Депутатов*, который временно становится во главе управления краем, вступая в деловые отношения с Центральной властью, *ответственной перед Советом Рабочих, Солдатских и Крестьянских Депутатов"* (Белорусская Рада. 1917. № 12).

Як бачым, зьезд паклікаў не буржуазны, а *савецкі* орган краёвай улады і выказаўся не за аддзяленьне, але *супроць аддзяленьня Беларусі ад РСФСР*. А паколькі гэты пункт рэзалюцыі быў прыняты аднагалосна, то вывад Круталевіча аб тым, што дробнабуржуазныя партыі, якія "господствовали" на зьезьдзе, не прызнавалі савецкай улады, ёсьць неабгрунтаваным. Згодныя з праграмай бальшавіцкай партыі былі таксама праекты іншых пунктаў рэзалюцыі зьезду, у тым ліку: патрабаваньне неадкладнай перадачы зямлі бяз выкупу працоўнаму сялянству, устанаўленьне народнага кантролю над прамысловасьцю і гандлем, вывад польскіх легіёнаў (генэрала Доўбар-Мусьніцкага[1]. — *Ю.Т.*) зь Бела-

[1] Доўбар-Мусьніцкі Юзаф (1867—1937) — польскі вайсковы дзяяч, генэрал. У 1917—1918 гг. быў арганізатарам і камандуючым I Польскага корпусу ў Расеі. У пачатку 1918 г. пасьля спробы бальшавіцкіх уладаў разброіць корпус яго камандаваньне не падпарадкавалася іх загадам, і на некаторы час палякі занялі шэраг населеных пунктаў ува Ўсходняй Беларусі. — *А.П.*

русі і г.д. Асаблівую цікавасьць уяўляе праект рэзалюцыі аб дэлегаваньні прадстаўнікоў Беларусі на мірныя перамовы ў Берасьці, якія павінны былі змагацца за яе тэрытарыяльную суцэльнасьць і неаддзяленьне ад Савецкай Расеі. У сувязі з разгонам зьезду, гэтыя пункты рэзалюцыі не маглі быць пастаўлены на галасаваньне.

Аб тым, што Ўсебеларускі зьезд ня быў антысавецкі, сэпаратысцкі і г.д., сьведчаць таксама іншыя акалічнасьці. Па-першае, дазвол і грошы на яго правядзеньне даў петраградзкі Народны Камісарыят Нацыянальнасьцяў, якім кіраваў Сталін. Па-другое, падчас работы зьезду старшыня яго прэзыдыюму Савіч зьвяртаўся па прамым провадзе да Сталіна з запытаньнямі і атрымоўваў яго адказы, што сьведчыць аб узаемных дзелавых стасунках (гл.: Белоруская Рада. 1917. № 10). І, урэшце, трэцяе важнае сьведчаньне: паведамляючы цэнтральныя ўлады ў Петраградзе аб разгоне Ўсебеларускага зьезду, Ландэр не хаваў, што зьезд выказаўся "в принципе за признание Советской власти" (гл.: Турук Ф. Белорусское движение. Москва, 1921. С. 108).

Гэтыя факты замоўчваліся Астроўскім і Круталевічам, каб даказаць тое, чаго не было. Пры тым Астроўскі імкнуўся стварыць міт аб незалежніцкім характары Ўсебеларускага зьезду, а Круталевіч падпарадкоўваўся ідэалягічным патрабаваньням "застойнага" часу для апраўданьня расейскага шавінізму кіраўнікоў Заходняй вобласьці. У гэтых адносінах нічога не зьмяніла і перабудова, аб чым сьведчыць нядаўняе выступленьне І. Ігнаценкі[2] ў друку (Рэспубліка, якая не адбылася // Чырвоная зьмена. 22.06.1989). У сапраўднасьці зьезд быў разагнаны за яго імкненьне стварыць на беларускай зямлі свой, беларускі, орган савецкай улады, замест прэтэндуючых на яе чужых камісараў, якія надалей, напрыклад, Мураўёў і Керанскі, не прызнавалі беларускай нацыі і пасьлядоўна — яе права на самавызначэньне. Характэрна, што такое імкненьне зьезду Круталевіч назваў "узурпацыяй".

Такім чынам, сярод беларускіх палітычных дзеячоў, якія арыентаваліся на савецкую ўладу, у сьнежні 1917 г. узьнікла першая крыза недаверу да гэтае ўлады, паколькі ленінскім дэкларацыям не адпавядалі практычныя дзеяньні, якія нагадвалі старую імпэрскую палітыку. І памыляюцца тыя гісторыкі і публіцысты, якія лічаць, што разгон Усебеларускага зьезду быў рэзультатам валюнтарызму ці недысцыплінаванасьці бальшавіцкіх дзеячоў Заходняй вобласьці. Не інакш думалі і ў Петраградзе. Як пісала газэта "Революционная ставка"[3] (09.12.1917), "наша партия никогда не стояла за разрушение создавшихся больших государственных организмов и создание мелких национальных республик. Наша партия в данном случае готова признать известные заслуги империализма (чытай — расейскага. — *Ю.Т.*), приведшего к созданию нового типа государства — наднационального государства". Такую лінію нацыянальнай палітыкі неўзабаве пацьвердзілі мірныя перамовы ў Берасьці, падчас якіх беларускае пытаньне дэлегатамі Леніна ўвогуле ня ставілася.

Адмоўнае стаўленьне бальшавікоў да беларускай савецкай дзяржаўнасьці ў канцы 1917 і на пачатку 1918 г. судзейнічала росту незалежніцкай арыентацыі беларускіх палітычных дзеячоў, хаця значная, калі не пераважная, іх частка ўсё яшчэ азіралася на Леніна і Сталіна.

Беларуская Народная Рэспубліка

18 лютага 1918 г. нямецкая армія пачала чарговы наступ і ў кароткім часе выйшла на

[2] Ігнаценка Іларыён (1919—2002) — беларускі гісторык, дасьледчык рэвалюцыйных падзеяў 1917 г. на тэрыторыі Беларусі. — *А.П.*

[3] "Революционная ставка" — бальшавіцкая газэта, орган Ваенна-рэвалюцыйнага камітэту пры Стаўцы вайсковага камандаваньня, з 19 сьнежня 1917 г. — Цэнтральнага камітэту дзейсных армій і франтоў. Выдавалася штодзённа з канца лістапада 1917 г. па канец лютага 1918 г. ў Магілёве. Рэдактарам газэты быў С. Забкоў. — *А.П.*

лінію Дняпра, захапіўшы звыш 85% усёй тэрыторыі Беларусі. Нямецкую палітыку ў гэтым раёне вызначаў неўзабаве падпісаны Берасьцейскі трактат, згодна зь якім Беларусь трактавалася як частка Расеі і як своеасаблівы заклад пад кантрыбуцыю, якую ўрад РСФСР абавязваўся заплаціць Нямеччыне (6 млрд. рублёў у золаце).

Аднак, заняўшы Менск (25 лютага), нямецкая X армія сустрэла там пакліканы Ўсебеларускім зьездам орган краёвай улады, які выйшаў з падпольля і абвясьціў сябе часовым урадам (Народным Сакратарыятам) Беларусі. Немцы аднесьліся да яго так, як да ўраду варожай дзяржавы. Праўда, Народны Сакратарыят ня быў разагнаны, але была забароненая яго дзейнасьць, канфіскаваная каса, а зь яго сядзібы быў зьняты бел–чырвона–белы сьцяг. Неўзабаве пасьля гэтага інцыдэнту Народны Сакратарыят паклаў камандуючаму X арміяй, генэралу Э. Фалькенгайну[4], мэмарыял. Патрабуючы, між іншым, высьненьня яго стаўленьня да справы беларускай дзяржаўнасьці. Гэты крок меў важныя наступствы: хаця бэрлінскі ўрад надалей афіцыйна не прызнаваў Беларусі, камандаваньне акупацыйнай арміі, магчыма, на ўласную руку, дазволіла Народнаму Сакратарыяту разьвіваць дзяржаўную дзейнасьць.

Мэты і напрамкі гэтай дзейнасьці прадстаўляла другая ўстаўная грамата Выканаўчага Камітэту Рады Ўсебеларускага зьезду (09.03.1918 г.). Грамата зьмяшчала асноўныя прынцыпы канстытуцыі Беларусі, між іншым, скасаваньне прыватнай уласнасьці на зямлю і яе перадачу бяз выкупу тым, хто на ёй працуе. Грамата ўпершыню акрэсьліла назву дзяржавы як Беларускую Народную Рэспубліку, аднак абыходзіла маўчаньнем яе юрыдычны статус, не мяняючы такім чынам яе становішча як складовай часткі фэдэратыўнай Расеі. 18 сакавіка Рада Ўсебеларускага зьезду праклямуе сябе Радай БНР.

Урэшце, у ноч з 24 на 25 сакавіка Рада БНР прыняла трэцюю ўстаўную грамату, якая абвяшчала Беларусь незалежнай і вольнай дзяржавай і скідала "апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасьці, якое гвалтам накінулі расійскія цары". Паводле Круталевіча, трэцяя грамата была прынята нязначнай большасьцю галасоў чальцоў Рады БНР, што сьведчыць аб усё яшчэ існаваўшай значнай апазыцыі стасоўна ідэалу незалежнай Беларусі. Дарэчы, нават цытаванае толькі што "ярмо" было царскага паходжаньня, а гэта значыць, што рэдактары граматы не адважыліся так фармуляваць сваё стаўленьне да рэвалюцыйнай Расеі. Такім чынам, можна меркаваць, што сымпатыі чальцоў Рады да новай Расеі ўсё яшчэ заставаліся значнымі.

Акт 25 сакавіка адлюстроўваў надзею Рады БНР на юрыдычнае прызнаньне Беларускай Народнай Рэспублікі ўрадам Нямеччыны і іншых дзяржаваў. Аднак і гэты крок не зьмяніў становішча бэрлінскіх уладаў. У адказ на ноту Народнага Сакратарыяту канцлер Георг Гертлінг заявіў, што Нямеччына надалей разглядае Беларусь як частку Расеі і, паводле Берасьцейскага трактату, ня можа бяз згоды ўраду Леніна прызнаць незалежнасьць Беларусі. Безвыніковымі былі і іншыя захады Рады БНР у гэтай справе.

Чакаючы на зьмену міжнароднай каньюнктуры, непрызнаваная Бэрлінам Рада БНР карысталася дзейснай падтрымкай Фалькенгайна і зь яго ведама і дазволу пачала арганізоўваць свой мясцовы апарат улады. Неўзабаве немцы перадалі органам БНР ведамствы прамысловасьці, гандлю, асьветы, грамадзкай апекі і іншыя, якімі кіраваў Народны Сакратарыят пад кантролем акупацыйных уладаў. 27 траўня Фалькенгайн прыняў прадстаўнікоў Рады і ўраду БНР і заявіў, што іх дзейнасьць "неўзабаве дасьць Беларусі пазытыўныя рэзультаты", што гэтымі дзеячамі ўспрымалася як намінка на юрыдычнае прызнаньне БНР.

Важнай сфэрай практычнай дзейнасьці ўладаў БНР было школьніцтва і культура. Пры Народным Сакратарыяце Асьветы паўстала бюро для апрацоўкі школьных падруч-

[4] Фалькенгайн (Фалькенгайм) Эрых (1861—1922) — нямецкі генэрал, з 1918 г. камандаваў X арміяй, якая дысьлякавалася на тэрыторыі Беларусі. — *А.П.*

нікаў і таварыства "Прасьвета", якое займалася іх выпускам. Былі арганізаваны курсы для настаўнікаў і школьная інспэкцыя, пашырана сетка пачатковых і сярэдніх школаў, у Менску ствараўся Пэдагагічны інстытут, пачалася падрыхтоўка да адкрыцьця беларускага ўнівэрсытэту, працаваў беларускі тэатар, Таварыства Драмы і Камэдыі і іншыя ўстановы культуры. Пад кантролем Народнага Сакратарыяту выходзіла рэкордная да гэтай пары колькасьць беларускіх газэт і часопісаў (14). Беларуская мова ўпершыню стала дзяржаўнай.

Цікава заўважыць, што да кампэтэнцыі Народнага Сакратарыяту належала таксама сфэра замежнай палітыкі. Зь яго ініцыятывы ўлетку 1918 г. нямецкае камандаваньне пачало перамовы з урадам РСФСР аб далучэньні да БНР задняпроўскіх абшараў, якія тады знаходзіліся пад расейскай адміністрацыяй. У гэтай самай справе, а таксама з мэтай прызнаньня БНР у Маскву езьдзіла беларуская надзвычайная камісія. Былі акрэдытаваны дыпляматычныя прадстаўнікі БНР у некалькіх краінах, а ў Кіеве дзейнічала Беларуская Гандлёвая Палата. Грамадзяне краіны пры выезьдзе за граніцу атрымоўвалі пашпарты, якія выдаваліся ад імя БНР.

Усё гэта сьведчыць, што ў 1918 годзе існавалі дзьве тактыкі нямецкай палітыкі стасоўна Беларусі: непрызнаваньне БНР у Бэрліне і адначасова яе стварэньне пад аховай X арміі. Магло б здавацца, што гэта была супярэчлівая палітыка, аднак у сапраўднасьці яна адлюстроўвала эвалюцыю нямецкіх поглядаў на беларускае пытаньне. Займаючы 25 лютага Менск, немцы былі перакананыя аб няздольнасьці беларусаў да дзяржаўнага будаўніцтва. Аднак яны сустрэлі тут дынамічны беларускі цэнтар, дзейнасьць якога хутка вызваляла заснулыя ў народзе нацыянальныя сілы. Гэта ўплывала на рост зацікаўленьня патэнцыяльнымі магчымасьцямі беларускага руху. Больш недаверліва ставіўся да яго афіцыйны Бэрлін, затое дасьведчаньні мясцовай акупацыйнай адміністрацыі былі больш аптымістычнымі[5].

Стварэньне незалежнай беларускай дзяржавы адлюстроўвала надзею Фалькенгайна на ліквідацыю небясьпечнага расейскага кліну, які, згодна з пастановамі Берасьцейскага міру, уяўляла Беларусь і які разьдзяляў наваствораныя дзяржавы — з аднаго боку Украіну і з другога — Літву, Латвію і Эстонію. У кантэксьце гэтага палітычнага імкненьня хутка мяншалася значэньне тых фактараў, якія раней выклікалі абыякавасьць немцаў да беларускага пытаньня. Прафэсар бэрлінскага ўнівэрсытэту Фрыц Куршман, які летам 1918 г. адведаў Беларусь і пазнаёміўся зь існым становішчам, не пярэчыў, што беларускі патэнцыял яшчэ слабы, але адначасова бачыў хуткі яго рост і дасьпяваньне, а таксама ўспрыманьне насельніцтвам. Бачыў ён і недахопы Рады БНР, аднак і ў гэтым выпадку выказваў перакананьне, што "калі беларусы ўжо сядзяць у сядле, то навучацца і ехаць" (Deutsche Rundshau. B. 176. 1918. S. 274, 292). Акрамя таго, немцы ўсьведамлялі карысьць, якую давала БНР у іх цэлай усходняй палітыцы. Такім чынам, падтрым-

[5] Характэрна, што ў даведцы аб дзейнасьці Народнага Сакратарыяту БНР за восень 1918 году, г.зн. на час апошніх месяцаў нямецкай акупацыі, адзначалася:

> Усталяваўшы ўладу, Германскае Камандаваньне зьменшыла правы Народнага Сакратарыяту, але ў той жа час Германскае Камандаваньне лічылася і лічыцца да гэтае пары з Народным Сакратарыятам і (Радай) як зь вярхоўным органам Беларусі, неафіцыйна прызнаючы за ім усе правы, але афіцыйна, на падставе Берасьцейскае Дамовы і права акупацыі, трымаючы ўсе галіны кіраваньня ў вайсковых руках. У апошнія месяцы працяглыя перамовы з Германскім Камандаваньнем прывялі да таго, што гандаль, прамысловасьць (Гандлёвай Палаты), асьвета, пошта, зносіны пакрысе пераходзяць у рукі беларускіх арганізацыяў. Мала таго — Германскае Камандаваньне запатрабавала, каб Народны Сакратарыят прызначыў сваіх дарадцаў (асаблівыя пасады нагляду) ў Літоўскую частку Беларусі (Ваўкавыск і інш.), а таксама і ў Украінскую частку Беларусі (Брэст-Літоўск, Гомель і інш.).

Крыніца: Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. Вільня—Нью-Ёрк—Менск—Прага, 1998. С. 268. — *А.П.*

ка Рады БНР і Народнага Сакратарыяту выяўляла імкненьне акупацыйнай адміністрацыі падрыхтаваць гэтыя органы да пераняцьця ў спрыяльных умовах рэальнай улады ў Беларусі. Паводле Куршмана, Народны Сакратарыят "быў рэзэрвавым урадам, фармальнае прызнаньне якога залежала перш за ўсё ад выніку вайны".

Далейшы лёс БНР перакрэсьліла параза Нямеччыны на Заходнім фронце. Гэтая акалічнасьць спрычынілася да заключэньня 27.08.1918 г. пагадненьня з Савецкай Расеяй, якое прадугледжвала датэрміновую эвакуацыю нямецкіх войск з раёнаў паміж Дняпром і Бярэзінай. Працэс эвакуацыі прысьпешыла рэвалюцыя ў Нямеччыне і яе капітуляцыя ў лістападзе 1918 г. На пачатку сьнежня немцы перадалі Менск савецкім уладам, а Рада БНР і яе ўрад эвакуаваліся ў Горадню, дзе працягвалі дзейнічаць да вясны 1919 г., г.зн. да адступленьня нямецкіх войск з гэтага абшару.

Савецкае Вялікае Княства Літоўскае

У той час, калі на акупаванай немцамі Беларусі разьвівалася дзяржаўнае будаўніцтва, савецкія ўлады не выказвалі ніякага зацікаўленьня стварэньнем беларускай савецкай дзяржавы як процівагі для БНР. Гэтай ацэнкі не мяняе дзейнасьць створанага ад пачатку 1918 г. пры Петраградзкім Народным Камісарыяце яго аддзелу — Камісарыяту да спраў беларусаў, т.зв. Белнацкаму, які быў пакліканы галоўным чынам для палітычнай агітацыі сярод насельніцтва задняпроўскіх абшараў Беларусі і беларусаў–уцекачоў у Расеі.

Адным з найважнейшых напрамкаў агітацыйнай дзейнасьці Белнацкаму было імкненьне дыскрэдытаваць маладую беларускую дзяржаву, якая паўставала на тэрыторыі, непадкантрольнай уладам РСФСР. У гэтай дзейнасьці асабліва вызначыўся З. Жылуновіч, які мог шальмаваць БНР, пераконваць уцекачоў у тым, што "спасение Белоруссии — в единстве с русским народом", аднак, акрамя сваіх несумненна шчырых пажаданьняў ня мог сказаць нічога пра тое, як вырашаецца савецкімі ўладамі пытаньне беларускай дзяржаўнасьці.

А гэтае пытаньне па–ранейшаму ігнаравалася на ўсіх узроўнях савецкай улады. Восеньню 1918 г., калі Куршман з сымпатыяй выказваўся ў бэрлінскім часопісе аб нацыянальным і дзяржаўным адраджэньні Беларусі, сакратар Паўночна–заходняга абласнога камітэту РКП(б) В. Кнорын заяўляў: "Мы считаем, что белорусы не являются нацией, и что те этнографические особенности, которые их отделяют от остальных русских, должны быть изжиты" (Звезда. 1918. 6 октября). З гэтых пазыцыяў эвакуаваныя ў лютым у Смаленск кіраўнікі Заходняй вобласьці змагаліся зь Белнацкамам, між іншым, ліквідавалі яго аддзелы ў Смаленску і Віцебску. Ня лепш было і ў сталіцах — Петраградзе і Маскве, дзе пытаньне стварэньня БССР не разглядалася цэнтральнымі партыйнымі і дзяржаўнымі органамі амаль да канца 1918 г. Факт, што ў гэтым часе Беларусь была пад нямецкай акупацыяй, не высьняе справы да канца, паколькі гэтая акупацыя лічылася тымчасовай.

Становішча Жылуновіча было вартым жалю. Ні яго спасылкі на дэкларацыі Леніна, ні верная служба савецкай уладзе, улучна з аплёўваньнем БНР, ня здолелі палепшыць стаўленьня вярхоўных органаў РСФСР да пытаньня беларускай савецкай дзяржаўнасьці. Пасьля V Усерасейскага зьезду Саветаў (ліпень 1918) і прыняцьця канстытуцыі РСФСР Белнацкам выступае з больш памяркоўным праектам: калі ўжо немагчыма дабіцца прызнаньня БССР, то ці ня можна было б стварыць "інтэрнацыянальную" тэрытарыяльную адзінку шляхам перайменаваньня Заходняй вобласьці ў Беларуска–Літоўскую, накшталт савецкага Вялікага Княства Літоўскага? Характэрная і аргумэнтацыя Белнацкаму, якая зыходзіла не з жыцьцёвых інтарэсаў беларускай нацыі, але з таго, што такім чынам лягчэй будзе паралізаваць дзеяньні незалежнікаў, калі Чырвоная Армія будзе вяртацца на Беларусь. Аднак у верасьні праект Белнацкаму быў адхілены III зьездам Саветаў

Заходняй вобласьці, пасьля чаго ў кастрычніку гэтае яго рашэньне было зацьверджана цэнтральнымі ўладамі РСФСР. Беларуская, ці Беларуска–Літоўская, Савецкая Рэспубліка надалей была нежаданай.

Справа стварэньня БССР ажыла раптоўна толькі пад канец сьнежня 1918 г., а папярэдзіла гэта здарэньне, аб значэньні якога можам меркаваць прыблізна, у палове кастрычніка, калі быў закончаны першы этап эвакуацыі нямецкай арміі зь Беларусі, а у Менску была паклікана новая Рада Міністраў БНР з сацыял–дэмакратам Антонам Луцкевічам як яе прэм'ерам. Паколькі рыхтаваўся чарговы этап адступленьня немцаў, чальцы новага кабінэту не маглі не спадзявацца, што дні Беларускай Народнай Рэспублікі ўжо палічаны, а яе альтэрнатывай можа быць Беларуская Савецкая Рэспубліка. Пасьлядоўна Рада БНР і яе ўрад лічылі на магчымасьць перамоваў з урадам РСФСР, які пакуль што ня быў зьвязаны прызнаньнем альтэрнатыўнай (савецкай) беларускай дзяржаўнасьці.

Як паведаміў Вацлаў Іваноўскі — тагачасны міністар асьветы БНР, — у лістападзе 1918 г. Луцкевіч выехаў у Маскву з мэтай выкладаньня Леніну канцэпцыі стварэньня кааліцыйнага ўраду Савецкай Беларусі, у які ўваходзілі б камуністы (група Жылуновіча) і сацыял–дэмакраты — прадстаўнікі Рады БНР (Запісы. Кн. І. 1962. С. 160—162). Можна не сумнявацца, што аўтары праекту, разьлічваючы на яго ўхвалу, спадзяваліся запэўніць працягласьць беларускай дзяржаўнасьці, паскорыць прызнаньне кіраўнікамі РСФСР Беларускай Савецкай Рэспублікі і яе ўраду як легітымнага пераемніка БНР і забясьпечыць перад разбурэньнем здабыткі БНР у галіне нацыянальнага будаўніцтва (асьвета, культура і т.п.).

Гэтая, здавалася б, непраўдападобная місія Луцкевіча ў Маскву пакуль што пацьвярджаецца толькі ягоным інтэрвію, апублікаваным у петраградзкім "Чырвоным Шляху" (1918. 30 лістапада), у якім аднак ня згадвалася пра перамовы з уладамі РСФСР. Нам не вядома, якія былі іх вынікі. Аднак адмоўная ацэнка Луцкевіча ў "Чырвоным Шляху" і далейшы ход падзей пераконваюць, што стаўленьне ўладаў РСФСР да канцэпцыі ўраду БНР не было іншым, чым да прапановы Белнацкаму. Аб гэтым, між іншым, сьведчыць тэлеграма Леніна, высланая ў канцы лістапада галоўнакамандуючаму Я. Вацэцісу:

> С продвижением наших войск на запад и на Украину создаются областные временные Советские правительства, призванные укрепить Советы на местах. Это обстоятельство имеет и ту хорошую сторону, что отнимает возможность у шовинистов *Украины, Литвы, Латвии, Эстляндии* (падкр. намі. — *Ю.Т.*) рассматривать продвижение наших частей как оккупацию, и создает благоприятную атмосферу для дальнейшего продвижения наших войск.

На адмоўнае стаўленьне кіраўнікоў РСФСР да пытаньня стварэньня Беларускай ССР паказвае таксама ажыцьцяўленьне цытаванага ленінскага ўказаньня. 10 сьнежня немцы перадалі Менск савецкім уладам, аднак ні тады, ні ў наступныя дні не была абвешчана БССР і створаны яе ўрад. Затое ўрад савецкай Літвы быў створаны ўжо 8 сьнежня ў Вільні. Калі Чырвоная Армія была яшчэ далёка ад літоўскай сталіцы. Адначасова, пачынаючы ад 12 сьнежня, савецкія органы ў Менску арганізавалі шэраг рэзалюцый, зваротаў і выказваньняў аб аб'яднаньні Беларусі і Літвы (гл.: Круталевич В. Рождение Белорусской Советской Республики. Минск, 1979. С. 121—122). Уся гэтая акцыя была інсьпіраванай зьверху (такая акцыя праводзілася і ў Літве), а гэта дае падставу меркаваць, што для ўладаў РСФСР болей прывабнай была ідэя Савецкай Літвы, у склад якой увайшла б частка абшараў Беларусі. У такім "інтэрнацыянальным катле" беларускае нацыянальнае пытаньне не станавіла б непажаданай праблемы. Акрамя таго, усходнія абшары Беларусі маглі б заставацца ў межах Расеі.

У такіх варунках прынятае ў канцы сьнежня рашэньне ЦК РКП(б) аб абвяшчэньні

БССР было ня толькі нечаканым, але і сэнсацыйным. Што наўплывала на так раптоўную і радыкальную зьмену палітычнага курсу стасоўна пытаньня беларускай дзяржаўнасьці? Вось жа, пасьля адступленьня немцаў у Менску засталася левая частка Рады БНР і яе ўраду, якая ўсё яшчэ лічыла на магчымасьць стварэньня кааліцыйнага ўраду Савецкай Беларусі. Аднак гэтыя спадзяваньні БНРаўскіх палітыкаў закончыліся іх арыштам. Такім чынам, савецкімі ўладамі была адхілена апошняя спроба супрацоўніцтва паміж сацыял–дэмакратамі і камуністамі. У выніку, неўзабаве пасьля эвакуацыі ў Горадню ўрад БНР разгарнуў дыпляматычную кампанію, пратэстуючы супраць бальшавіцкай акупацыі Беларусі, а паколькі не існавалі ні БССР, ні яе ўрад, гэтыя пратэсты былі абгрунтаваныя з гледзішча крытэраў міжнароднага права.

Такой сытуацыі Ленін не жадаў і, магчыма, не прадбачыў. Давялося выпраўляць памылку, што і выканаў Сталін уласьцівымі яму мэтадамі. На працягу літаральна некалькіх дзён было зроблена ўсё неабходнае: арганізаваная воля народу, перакананыя кіраўнікі Заходняй вобласьці, апрацаваны маніфэст і вызначаны асабовы склад ураду з Жылуновічам як прэм'ерам. Цырымоніі адбыліся ў Смаленску, і 1 студзеня 1919 г. быў абнародаваны маніфэст, які абвяшчаў паўстаньне незалежнай Беларускай Савецкай Рэспублікі. Была прынята пастанова і аб яе тэрыторыі, якая ахоплівала Менскую, Гарадзенскую, Магілёўскую, Віцебскую і Смаленскую губэрні. Цяпер пратэсты БНР былі ўжо нявшкоднымі — сьвет мог пераканацца, што акупацыя Беларусі маскоўскімі бальшавікамі — гэта "злосная выдумка нацыяналістычнай контрарэвалюцыі".

Аднак ледзь толькі Жылуновіч са сваім урадам прыехаў у Менск, аказалася, што з гэтай незалежнай дзяржавы застаўся адно прыгожы ўспамін. 16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б) з удзелам Леніна прыняў рашэньне аб аддзяленьні з БССР Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губэрняў і іх далучэньні да РСФСР. Астатнія дзьве губэрні — Менская і Гарадзенская — павінны былі ўзьяднацца зь Літвой і стварыць новае адміністрацыйнае фармаваньне — Літоўска–Беларускую Савецкую Рэспубліку (Літбел). Гэтае рашэньне абазначала ліквідацыю БССР. У адрозьненьне ад сучасных гісторыкаў, тагачасны старшыня Ўсерасейскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Я. Сьвярдлоў не хаваў, што матывам гэтага аб'яднаньня было "стремление ЦК обезопасить эти республики от возможности проявления в них национально–шовинистических стремлений" (Круталевіч В. Тамсама. С. 188). А гэта значыць, што не адбылася ніякая зьмена курсу ленінскай партыі стасоўна беларускага пытаньня, якое па–ранейшаму ігнаравалася.

Узьнікае пытаньне, навошта кіраўнікам Савецкай Расеі спатрэбілася ствараць БССР, якая ліквідавалася ледзь ня ў дзень свайго нараджэньня? Вось жа, акрамя згаданых зьнешнепалітычных абумоўленьняў, стварэньне, ці больш правільна — абвяшчэньне гэтай незалежнай рэспублікі дало ім і іншыя карысьці. Цяпер, калі ўжо "існавала" БССР, ленінскі плян яе ліквідацыі мог быць праведзены рукамі "сувэрэнных" органаў рэспублікі ад імя вольнага беларускага народу. Імем гэтага народу прыкрываліся разгром здабыткаў БНР у галіне нацыянальнай асьветы, ліквідацыя ўсіх беларускамоўных газэт і часопісаў, выгнаньне беларускай мовы зь дзяржаўнага ўжытку, словам, тых "национально–шовинистических стремлений", аб якіх гаварыў Сьвярдлоў.

А Жылуновіч, адзін з "айцоў" БССР? Той, здаецца, зразумеў сваю халуйскую ролю. Стараўся выратаваць ад пагрому расейскіх шавіністаў доўгачаканую рэспубліку, не пагаджаўся і пратэставаў супроць ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі. Урэшце гэты трагічны прэм'ер вольнай дзяржавы быў арыштаваны — імем беларускага народу[6].

[6] Зьміцер Жылуновіч не арыштоўваўся бальшавікамі ў 1919 г. Аднак 8—10 лютага 1919 г. былі арыштаваныя іншыя тры былыя сябры Часовага рабоча–сялянскага савецкага ўраду Беларусі — беларусы Язэп Дыла, Усевалад Фальскі і Фабіян Шантыр. — *А.П.*

Ажыцьцяўленьне рашэньня ЦК РКП(б) ад 16 студзеня 1919 году аб ліквідацыі толькі што абвешчанай БССР па сутнасьці не патрабавала ніякіх практычных дзеяньняў. Апублікаваны 1 студзеня 1919 г. "маніхвэст" Жылуновіча аказаўся папяровай дэклярацыяй, а не зыходным пунктам рэальнага будаўніцтва беларускай савецкай дзяржаўнасьці. Патрэбная была толькі фармальная працэдура, якая імем беларускага народу ўхваліла б рашэньне ЦК аб лёсе беларускай дзяржаўнасьці. З такой мэтай быў арганізаваны т.зв. першы Ўсебеларускі зьезд Саветаў, які адбыўся 2—3 лютага 1919 г. у Менску.

Зьезд як "вярхоўная ўлада сувэрэннай дзяржавы" прыняў канстытуцыю БССР, якая заканадаўча замацоўвала нараджэньне беларускай савецкай дзяржаўнасьці, і адначасова прызнаў неабходным ліквідацыю гэтай дзяржаўнасьці. У прыватнасьці, зьезд выказаўся за перадачу Расеі Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губэрняў, г.зн. большай часткі тэрыторыі Рэспублікі, і зьліцьцё рэштак яе тэрыторыяў зь Літвой. Фактычна, гэткай рэштай была толькі адна Меншчына, паколькі на Гарадзеншчыне яшчэ былі немцы, а ўся Віленшчына яшчэ раней лічылася абшарам Літвы, рашэньне зьезду папярэдзіла жорсткае падаўленьне апазыцыі беларускіх камуністаў[7], пасьля чаго Мясьнікоў[8] і яму падобныя прадстаўнікі "беларускага народу" маглі задаволіць патрабаваньні Леніна.

Абвешчанае 28 лютага 1919 г. новае адміністрацыйнае ўтварэньне — Літоўска-Беларуская Савецкая Рэспубліка (Літбел) — ні ў чым не нагадвала беларускай дзяржавы. У яе кіраўнічыя органы — Цэнтральны Выканаўчы камітэт і Савет Народных Камісараў — уваходзілі расейскія, жыдоўскія, польскія і крыху літоўскіх камуністаў, але беларусаў сярод іх не было[9]. Нягледзячы на тое, што ў склад Літбел уваходзіла толькі невялікая частка беларускіх абшараў, надалей працягвалася іх перадача Савецкай Расеі. Як піша В. Круталевіч, у сакавіку 1919 г. уладамі Літбел былі перададзеныя Рагачоўскі і Дзісенскі паветы, што ўваходзілі ў Менскую губэрню (гл. яго: Станаўленьне дзяржаўнасці. Мінск, 1989. С. 54).

Паводле сучасьніка А. Грыгор'ева, у гэтай Літоўска-Беларускай рэспубліцы "...началось преследование всего белорусского. Белорусское национальное движение было объявлено "буржуазным предрассудком", в белорусских школах был введен русский язык, все белорусское — книгоиздательство, курсы, театр, хор были национализированы и очень скоро сведены на нет" (Варшавское Слово. 1920. 2 мая). Аднак такое становішча працягвалася нядоўга.

Вясной 1919 г. пачаўся наступ польскіх войск, якія 21 красавіка захапілі сталіцу Літбел — Вільню. Тады была абвешчана адозва Юзафа Пілсудзкага, у якой падкрэсьлівалася, што польскае войска ня ёсьць акупантам, але вызваліцелем і гарантам свабоднага рашэньня насельніцтва Літвы і Беларусі аб сваім лёсе.

Ніякай Беларусі!

Страта Вільні і адозва Пілсудзкага зрабілі значнае ўражаньне на Маскву. У прыватнасьці, адозва, адрасаваная "Да жыхароў Вялікага Княства Літоўскага", успрымалася там як імкненьне палякаў аднавіць гістарычную фэдэрацыю Польшчы зь Літвой і Беларусьсю. Яе пасьпяховае ажыцьцяўленьне спрыяла б далучэньню Ўкраіны і стварэньню

[7] Маецца на ўвазе арышт Язэпа Дылы, Усевалада Фальскага і Фабіяна Шантыра. — *А.П.*

[8] Мясьнікоў (Мясьнікян) Аляксандар (1886—1925) — савецкі партыйны і дзяржаўны дзяяч, у 1918—1919 гг. фактычны кіраўнік савецкіх уладных структураў на тэрыторыі Беларусі. — *А.П.*

[9] Сярод усіх сяброў ураду Літбел беларускае паходжаньне меў хіба што толькі камісар шляхоў зносін Іван Савіцкі, які нарадзіўся ў 1887 г. у вёсцы Козіна Слонімскага павету ў сялянскай сям'і. Аднак сваю беларускасьць ён ніколі і нідзе не дэманстраваў, таму сьцьверджаньне пра адсутнасьць у кіраўніцтве Літбел беларусаў можна лічыць цалкам слушным. — *А.П.*

пад эгідай Польшчы вялікай канфэдэрацыі ўсходнеэўрапейскіх народаў, здольнай супрацьпаставіцца расейскаму і нямецкаму імпэрыялізмам. Такая пэрспэктыва пагражала інтарэсам Расеі, тым больш што нельга было выключыць магчымасьці яе падтрымкі беларускімі палітычнымі дзеячамі, расчараванымі варожым стаўленьнем уладаў РСФСР да беларускае дзяржаўнасьці.

Паколькі сілы Чырвонай Арміі былі недастатковыя для паўстрыманьня наступу польскіх войск, давялося выкарыстоўваць дыпляматычныя магчымасьці. З такой мэтай 17 ліпеня 1919 г. упаўнаважаны Леніна, Юліян Мархлеўскі, перайшоў лінію савецка–польскага фронту. Хутка ён быў перавезены ў Белавежу, а потым у Мікашэвічы, дзе адбываліся перамовы[10].

Пераход Мархлеўскага праз лінію фронту папярэдзіла важнае здарэньне: 16 ліпеня ЦК КП Літвы і Беларусі прыняў рашэньне аб роспуску ўраду Літбел, што адпавядала фактычнай ліквідацыі гэтай рэспублікі. Гэтага патрабаваў Сталін, які ў сярэдзіне ліпеня прыбыў у Менск, дзе знаходзіліся эвакуаваныя зь Вільні ўлады Літбел. Патрабаваньне Сталіна сьведчыць адназначна аб тым, што аб ліквідацыі Літоўска–Беларускай рэспублікі, так як і аб яе ўтварэньні, рашэньне прымала Масква, а не мясцовыя органы савецкай улады ці, тым больш, народ. Па–другое, гэтае важнае рашэньне было прынята найхутчэй у першыя дні ліпеня, калі значная частка тэрыторыі Літбел яшчэ не была акупавана польскімі войскамі — Менск яны захапілі толькі праз месяц (8 жніўня), а да ракі Бярэзіны, на якой фронт стабілізаваўся, дайшлі яшчэ пазьней.

Выглядае на тое, што, ня маючы магчымасьці паўстрымаць наступ палякаў, улады РСФСР загадзя рыхтаваліся перадаць ім тыя часткі беларускіх і літоўскіх абшараў, што ўваходзілі ў склад Літбел, а ліквідацыя гэтай рэспублікі павінна была аблегчыць перамовы. Цяпер, калі Літоўска–Беларуская Савецкая Рэспубліка зьнікала з карты Эўропы, Мархлеўскі мог свабодна дамаўляцца з прадстаўнікамі Польшчы аб лёсе Літвы і Беларусі не як "сувэрэнных дзяржаваў", але як тэрыторыяў зь неакрэсьленым дзяржаўным статусам, якія ў залежнасьці ад канкрэтнага ваенна–палітычнага становішча маглі быць перададзеныя ў сфэру ўплыву Польшчы ці Расеі або падзеленыя паміж імі. Аб гэтым сьведчыць наступнае заяўленьне Мархлеўскага, зробленае пад канец ліпеня ў Белавежы:

> Ленін выразна сказаў: "Калі б палякі мелі намер правесьці плебісцыт у Літве і Беларусі, то не разыйдземся адносна таго, як гэты плебісцыт будзе праведзены; таксама не разыйдземся адносна лёсу Беларусі" (Гарліцкі А. Пілсудзкі—Ленін // Polityka.1987. 27 чэрвеня).

Усё ж Ленін пераацэньваў намеры і магчымасьці Пілсудзкага. Няўзабаве выявілася, што, захапіўшы Вільню, ён ушанаваў сувэрэнітэт незалежнай Літоўскай рэспублікі, відаць, маючы надзею на яе добраахвотнае ўхваленьне фэдэрацыйнай ідэі. Такім чынам, справа плебісцыту ў Літве рабілася беспрадметнай. З другога боку, гэтая акалічнасьць давала Савецкай Расеі магчымасьць дыфэрэнцыяванага стаўленьня да паасобных патэнцыяльных чальцоў праектаванай фэдэрацыі. Першым крокам была стаўка на элімінацыю Літвы з гэтай фэдэрацыі, што патрабавала падтрымкі незалежніцкіх імкненьняў літоўскай Тарыбы[11], нягледзячы на яе "буржуазны" характар. 4 верасьня 1919 г. урад РСФСР запрапанаваў літоўскаму ўраду пачаць перамовы аб узаемных дачыненьнях, у выніку чаго 4 красавіка ён юрыдычна прызнаў Літоўскую рэспубліку, такім чынам адмаўляючыся ад канцэпцыі літоўскай савецкай дзяржаўнасьці.

Аднак жа ліквідацыя Літбел абазначала фармальнае адмаўленьне Масквы і ад бела-

[10] Перамовы, якія доўжыліся да 15 сьнежня 1919 г., не прывялі да заключэньня пагадненьня, якое нейкім чынам абавязвала б бакі. Быў падпісаны толькі дакумэнт аб двухбаковым абмене закладнікамі. — *А.П.*

[11] Літоўская Тарыба (Рада) была створаная ў верасьні 1917 г. і адыгрывала ролю вярхоўнага органа ўлады ў Літве. Існавала да траўня 1920 г. 16 лютага 1918 г. яна абвясьціла незалежнасьць Літвы. Дзеячы Віленскай беларускай рады цесна супрацоўнічалі з Тарыбай і нават каапатаваліся ў яе склад. — *А.П.*

рускай савецкай дзяржаўнасьці, што, дарэчы, адпавядала яе фактычнаму стаўленьню да гэтага пытаньня перад і пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі. У адрозьненьне ад Літвы, не прызнавалася таксама і "буржуазная" дзяржаўнасьць Беларусі. Карацей кажучы, Расея не хацела ніякай Беларусі — ні савецкай, ні "буржуазнай". Невыпадкова на парадку дня перамоваў было ў гэтай справе толькі адно пытаньне — ці задаволіць палякаў узамен на мір тая частка беларускай зямлі, што знаходзілася ў складзе Літбел. Цяпер няцяжка ўявіць, што мэтай далучэньня трох усходнебеларускіх губэрняў, зацьверджанага па патрабаваньні Леніна першым Усебеларускім зьездам Саветаў, было іх "забесьпячэньне" ад магчымых польскіх прэтэнзіяў, як "ісьцінарасейскіх" абшараў, што ўжо тады адлюстроўвала намер Леніна аб падзеле Беларусі паміж Польшчай і РСФСР.

Такая канцэпцыя рашэньня беларускага пытаньня заставалася нязьменнай на працягу шматмесячных савецка–польскіх перамоваў. Паводле сьведчаньня ўдзельнікаў польскай дэлегацыі, у кастрычніку 1919 г. Мархлеўскі ад імя Леніна надалей заяўляў аб яго незацікаўленасьці Беларусьсю і аб тым, што паміж Польшчай і РСФСР няма ніякіх спрэчных тэрытарыяльных праблемаў, а Польшча атрымае ўсё, чаго пажадае. Урэшце, ад лістапада 1919 г. да лютага 1920 г. савецкі ўрад некалькі разоў прапаноўваў Польшчы мір зь вечнай граніцай па рэках: Дзьвіна, Ула, Бярэзіна, Пціч.

Правал фэдэрацыйных плянаў

На гэтай лініі польская армія стаяла амаль цэлы год, але Пілсудзкі не рашаўся ні на мір, ні на далейшы паход на Віцебск, Магілёў і Смаленск. Якія ж былі прычыны такога становішча? Польскія гісторыкі лічаць, што, стабілізуючы ваенныя дзеяньні, Пілсудзкі імкнуўся дапамагчы бальшавікам у іх змаганьні з айчыннымі і замежнымі праціўнікамі савецкай улады, паколькі лічыў, што белая Расея больш небясьпечная для Польшчы, чым чырвоная.

Здавалася б, пры такім стаўленьні да бальшавікоў Пілсудзкі мог згадзіцца з прапановамі Леніна і заключыць мір зь вельмі выгаднай для Польшчы ўсходняй граніцай, якую не ўскладняла б ніякая Беларусь. На думку гісторыкаў, адмаўленьне Пілсудзкага адлюстроўвала яго імкненьне рэалізаваць фэдэрацыйную задуму, якая ўлучала ня толькі літбелаўскія рэшткі беларускай зямлі, але ўсю Беларусь зь Віцебскам, Магілёвам, а можа, і Смаленскам. Летам 1919 г. такая канцэпцыя ўхвальвалася амаль усімі беларускімі партыямі і арганізацыямі, якія, дзякуючы нігілістычнаму стаўленьню савецкай улады, лічылі яе адзінай рэальнай альтэрнатывай рашэньня пытаньня беларускай дзяржаўнасьці.

Непасьлядоўную пазыцыю Пілсудзкага ўмела выкарыстала Масква. Паколькі стабілізацыя польскага фронту на Бярэзіне спрыяла перамогам Чырвонай Арміі на іншых франтах грамадзянскай вайны, то можна было не хваляваюца і працягваць мірныя перамовы. Затое трэба было ўсімі сродкамі змагацца з фэдэрацыйнымі плянамі Пілсудзкага, перш за ўсё выкарыстоўваючы польска–беларускія супярэчнасьці. Аб гэтым пераканаўча сьведчыць падтрымка, аказаная Літоўскай рэспубліцы, што ў значнай меры паўплывала на яе адмоўнае стаўленьне да фэдэрацыі з Польшчай.

У Беларусі такая апэрацыя магла быць рэалізавана меншым коштам. Гэтаму спрыялі тры фактары: кантрыбуцыі і рабункі польскіх войск, рэстаўрацыя канфіскаванай памешчыцкай уласнасьці і эгаістычныя, недальнабачныя дзеяньні польскай адміністрацыі ў галіне нацыянальнай палітыкі. Усё гэта дыскрэдытавала афіцыйныя заяўленьні Пілсудзкага і выклікала абгрунтаваную незадаволенасьць беларускага насельніцтва і палітычных дзеячоў, якіх лёгка было схіліць да актыўных супроцьпольскіх выступленьняў.

Тут важную ролю адыграла Партыя беларускіх сацыялістаў–рэвалюцыянэраў (эсэраў)[12].

---

[12] Партыя беларускіх сацыялістаў–рэвалюцыянэраў (БПСР) утварылася ў выніку расколу ў Беларускай Сацыялістычнай Грамадзе ў 1918 г., дзейнічала да 1924 г. — *А.П.*

праграмныя патрабаваньні якой былі блізкія бальшавцкім лёзунгам, хаця спалучаліся з ідэяй незалежнай Беларусі. Эсэры, якія яшчэ ў жніўні ўдзельнічалі ў прывітаньні Пілсудзкага ў Менску[13], хутка паразумеліся з савецкімі ўладамі і восеньню 1919 г. заключылі зь імі ў Смаленску дамову аб супрацы. Згодна з дамовай, эсэры атрымоўвалі савецкую матэрыяльную падтрымку і разгарнулі агітацыю і партызанскую барацьбу супраць польскіх акупантаў. Пераважнай была роля эсэраў у беларускіх грамадзкіх і культурных арганізацыях і, у прыватнасьці, у адноўленай Радзе БНР, што ў сьнежні 1919 г. давяло да яе расколу[14].

Калі беларускія эсэры лічылі бальшавікоў сваімі саюзьнікамі, то бальшавікі трактавалі іх інструмэнтальна як памагатых у ажыцьцяўленьні сваіх плянаў. Апазыцыйная дзейнасьць эсэраў хутка выклікала жорсткія рэпрэсіі польскай адміністрацыі, што судзейнічала ня толькі актывізацыі антыпольскага падпольля, але і палітычнай дыскрэдытацыі тых беларускіх гуповак, якія ўсё яшчэ арыентаваліся на Польшчу. У выніку ў варунках узрастаючай варожасьці на пачатку 1920 г. не было ўжо рэальных чыньнікаў для рэалізацыі фэдэралісцкай задумы, якую сам Пілсудзкі пазьней ацаніў як "беларускую фікцыю"[15].

Правал фэдэрацыйных плянаў быў важным дасягненьнем Масквы, якая ўмела разыграла польска–беларускія супярэчнасьці.

Рыскі трактат

4 ліпеня 1920 г. пачаўся наступ Чырвонай Арміі на Заходнім фронце, і ўжо 11 ліпеня палякам давялося пакінуць Менск. Зноў вярталася ў Беларусь савецкая ўлада, аднак пра беларускую савецкую дзяржаўнасьць пакуль што гутаркі не было. Затое праз адзін дзень — 12 ліпеня — была падпісана савецка–літоўская дамова, згодна зь якой Літве перадаваліся значныя заходнебеларускія абшары[16]. Як бачым, Масква па–ранейшаму задавальняла тэрытарыяльныя патрабаваньні суседзяў на кошт Беларусі. Гэтым разам стасавалася канцэпцыя "Літбел навыварат", якая магла судзейнічаць антаганізацыі бе-

---

[13] Ю. Пілсудзкі прыяжджаў у Менск 19 верасьня 1919 г. — *А.П.*

[14] Маецца на ўвазе раскол Рады БНР 13 сьнежня 1919 г. на Народную Раду на чале зь Пятром Крачэўскім і Найвышэйшую Раду на чале з Антонам Луцкевічам. Прыхільнікі першай трымаліся выразна антыпольскіх пазыцыяў, а дзеячы другой не рашыліся ў тых умовах на разрыў з Польшчай, бо, як лічыў А. Луцкевіч:

> Пасьледзтвы паўстаньня проці польскай акупацыі пры гэткай непадгатоўленасьці і без заручкі са стараны бальшавікоў і літвіноў маглі бы быць катастрафальнымі, бо вызвалі бы пагалоўныя рэпрэсіі са стараны палякаў проці ўсяго беларускага, як "бальшавіцкага", зьнішчылі і так слабую нашу нацыянальную работу і той адпор, каторы мы сяк так даем ладжанаму плебісцыту і панаваньню польшчыны, а ўрэшці аканчацельна пахаранілі бы нашу справу ў вачах Антанты і памаглі бы паляком атрымаць ад яе мандат на "ўпарадкаваньне" Ўсходніх Зямель, чаго палякі цяпер асабліва дабіваюцца.

Крыніца: Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. Вільня—Нью-Ёрк—Менск—Прага, 1998. С. 599—600). — *А.П.*

[15] Ёсьць меркаваньне, што Пілсудзкі ад самага пачатку трымаўся фэдэралісцкай канцэпцыі толькі з тактычных меркаваньняў. Пра гэта, можа, сярод іншага, сьведчыць ягонае выказваньне ў лісьце, скіраваным да Леана Васілеўскага 9 красавіка 1919 г.:

> Не хачу быць ані імпэрыялістам, ані фэдэралістам, пакуль няма мажлівасьці казаць пра гэтыя справы больш–менш сур'ёзна... Дзеля таго, што на Божым сьвеце пачынае, здаецца, перамагаць балбатня пра братэрства людзей і народаў і амэрыканскія дактрынкі, ахвотна схіляюся на бок фэдэралістаў.

Крыніца: Piłsudski J. Pisma zbiorowe. T. V. Warszawa, 1937. S. 73. — *А.П.*

[16] Згодна з гэтай дамовай, савецка–літоўская мяжа мусіла праходзіць у непасрэднай блізкасьці ад такіх беларускіх гарадоў, як Горадня і Маладэчна. — *А.П.*

ларуска–літоўскіх дачыненьняў і, такім чынам, прадухіліць магчымую беларуска–літоўскую супольнасьць. Такая магчымасьць не выключалася, паколькі ў Коўні апынуўся старшыня Рады БНР Вацлаў Ластоўскі і іншыя эсэраўскія дзеячы, якія прасьледаваліся польскай адміністрацыяй у Менску.

Новым становішчам у Беларусі найбольш расчараваныя былі эсэры, якія, згодна з Смаленскай дамовай, лічылі на працяг канструктыўнага супрацоўніцтва з бальшавікамі і на ўдзел ва ўрадзе БССР. Неўзабаве адправіўся ў Маскву намесьнік старшыні Рады БНР Васіль Захарка, які 17 ліпеня 1920 г. падаў народнаму камісару замежных справаў РСФСР Георгію Чычэрыну[17] ноту. Паколькі гэты цікавы дакумэнт быў нядаўна апублікаваны Вітаўтам і Зорай Кіпелямі ў зборніку "Беларуская дзяржаўнасьць" (Нью–Ёрк, 1988. С. 94), працытуем толькі яго фрагмэнты, найбольш характэрныя для эсэраўскага пункту гледжаньня:

> Дзеля дасягненьня нацыянальна–палітычнага адраджэньня, вякамі прыгнечаны беларускі народ пайшоў на адкрытую барацьбу са ўсімі гвалтаўнікамі працоўнага народу. Ён глыбока верыў, што ў гэтай барацьбе за зьністажэньне ненавіснага ўціску парабацыеляў і эксплёататараў і (за) сваё законнае адраджэньне, ён знойдзе моцную падтрымку ва ўсім расейскім пралетарыяце і перш усяго ў Камуністычнай партыі.
>
> К жалю прыходзіцца канстатаваць, што гэтыя надзеі зусім ня зьдзейсьніліся. Калі сумленна прааналізаваць адношаньні Расеі да Беларусі, то нявольна прыходзіцца прыйсьці да досыць сумных вынікаў. Усе яны былі такога зьместу, што ў канцы канцоў толькі адпіхала, а не прыбліжала да сябе беларускі народ. <...>
>
> Падыходзячы да трэцяга прыходу радавае ўлады ў м. Менск і актыўна памагаючы ёй у барацьбе з Польшчаю, кіруючая працоўным беларускім народам большая частка сацыялістычных партыяў мела глыбокае перакананьне ў тым, што на гэты раз радавая ўлада не дапусьціць папярэдніх абмылак і стане на новы шлях братэрскага адношаньня да працоўнага беларускага народу. Пры такім адношаньні радавай улады працоўны беларускі народ ахвотна пайшоў бы на верную і чэсную сувязь зь ёю.
>
> Задавальненьне законных імкненьняў беларускага народу дало б радавай уладзе таксама падтрымку і з боку палітычных групаваньняў, стоячых за палітычную незалежнасьць Беларусі і нацыянальна–культурнае адраджэньне яе.
>
> Гэтае новае эры чакаў зь нецярплівасьцю ўвесь беларускі народ, які нават не дапускаў думкі, што радвая ўлада аслабаніўшы Беларусь з–пад уціску Польшчы можа аддаць хаця б частку яе ў карыстаньне другога суседа. Аднак падпісаная мірная ўмова зь Літвою вышэй успамянутыя надзеі яшчэ раз разьбіла і беларускі народ мае няшчасьце быць сьведкаю таго акту, які яму здаваўся зусім недапусьцімым і немажлівым. <...>
>
> Настолькі несправядлівае і незаслужанае адношаньне да беларускага народу нанесла новы ўдар трэцяму моманту зьбліжэньня Беларусі з Радаваю Расеяю і разам з тым, яно кладзе пачатак новаму падзелу Беларусі і аддае беларускую рэвалюцыйную дэмакратыю на аслабленьне яе сілаў, шкоднае інтарэсам сацыяльнай рэвалюцыі.
>
> Зьяўляючыся паўнамоцным прадстаўніком Беларускай Народнай Рэспублікі я, ад імя майго народу, складаючагося ў большасьці зь левых беларускіх сацыялістаў, уступіўшых у рэвалюцыйную барацьбу за вызваленьне Беларусі з–пад усіх акупантаў, лічу сваім абавязкам заявіць перад урадам Расейскай Сацыялістычнай Фэдэрацыйнай Радавай Рэспублікі рашучы пратэст супраць уступкі клерыкальна–буржуазнай Літве беларускай тэрыторыі.
>
> Хачу верыць, што такі несправядлівы ў адносінах да беларускага народу акт не атрымае аканчальнага зацьвярджэньня і што з аканчальнай пабедаю Чырвонай Арміі Радавай Расеі над

[17] Чычэрын Георгій (1872—1936) — народны камісар замежных справаў РСФСР (з 1922 г. — СССР) у 1918—1930 гг. — *А.П.*

панскай Польшчай вызваленаму працоўнаму беларускаму народу будзе дадзена незалежнасьць дзеля рэальнай магчымасьці зьдзяйсьненьня нацыянальна–палітычнага і сацыяльнага адраджэньня.

Старшыня Надзвычайнай Дыпляматычнай Місіі
Намесьнік старшыні Рады БНР
В. Захарка

Пратэстацыйная нота Захаркі не зьмяніла рашэньня Масквы што да падараваных Літве беларускіх абшараў, аднак, магчыма, не была цалкам безвыніковая. У прыватнасьці, Захарка лічыў, што яго націск на Чычэрына, акрамя "вонкавых абставін", паўплываў на рашэньне савецкіх уладаў аб паўторным абвяшчэньні БССР. Усё ж выпадае заўважыць (калі Захарка не памыляўся), што такое рашэньне Масквы няшмат каштавала, паколькі не зьмяніла яе ранейшага стаўленьня да гэтага пытаньня.

Аб гэтым сьведчыць сама працэдура ўтварэньня гэтай "незалежнай дзяржавы". Перш за ўсё разгледзім пытаньне, хто і як яе ўтварыў? Вось жа, паводле Круталевіча, 31 ліпеня 1920 г. у Менску сабраліся прадстаўнікі чатырох арганізацый — Кампартыі Літвы і Беларусі, прафсаюзаў, Беларускай камуністычнай арганізацыі[18] і "Бунду"[19] і падпісалі "Дэклярацыю аб абвяшчэньні незалежнасьці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі, якая абвесьціла аб узнаўленьні беларускай савецкай дзяржаўнасьці (гл. яго: Станаўленьне дзяржаўнасьці. Мінск, 1989. С. 108). Як бачым, юрыдычная падстава гэтага акту была непараўнальная з абвяшчэньнем незалежнасьці БНР, якое савецкімі гісторыкамі ацэньваецца як "неправамоцнае". Чым жа тады, калі не насьмешкай, было другое абвяшчэньне БССР, якое ў выпадку патрэбы лёгка было прызнаць неправамоцным або нейкім банальным недаразуменьнем.

Фікцыйнасьць юрыдычнага статусу БССР падкрэсьліваў іншы факт: летам 1920 г. ня быў створаны ўрад рэспублікі, замест якога паўстаў у Менску Ваенна–рэвалюцыйны камітэт з кампэтэнцыямі губэрнскага органу ўлады. Усё гэта сьведчыла аб ваганьні і няўпэўненасьці кіруючых органаў РСФСР што да лёсу Беларусі. Аднак на ўсякае ўсё была акрэсьлена яе тэрыторыя ў складзе 18 паветаў Менскай і Гарадзенскай губэрняў. Вялікая ўсходняя частка Беларусі па–ранейшаму заставалася ў Расеі, а беларускія раёны Віленшчыны — у Літве.

Пасьля паразы Чырвонай Арміі пад Варшавай у другой палове жніўня пачаўся контранаступ польскіх войск, які працягваўся да 18 кастрычніка. У яго выніку 12 паветаў новай Беларускай ССР патрапілі на польскі бок, і толькі 6 — на савецкі (Меншчына). У такой сытуацыі адбылося здарэньне, аб якім маўчыць савецкая гістарыяграфія, але якое красамоўна адлюстроўвала стаўленьне Савецкай Расеі да беларускага пытаньня: на пачатку мірных перамоваў у Рызе старшыня савецкай дэлегацыі Адольф Іофэ схіляўся аддаць пад польскі ўплыў усю Беларусь узамен на прызнаньне палякамі Савецкай Украіны (Dąbski J. Pokój Ryski. Warszawa, 1931. S. 78). Паколькі "ўся Беларусь" складалася з 18 паветаў, гэтая прапанова абазначала магчымасьць перадачы Польшчы астатніх незанятых польскімі войскамі 6 паветаў Меншчыны і гатоўнасьць РСФСР пазбыцца беларускага пытаньня.

Магчыма, гэта быў адзін з парадоксаў гісторыі: большасьць дэлегацыі Польшчы, не

[18] Беларуская камуністычная арганізацыя (БКА) — беларуская палітычная арганізацыя камуністычнага кірунку, якая існавала ў студзені — жніўні 1920 г. Дабівалася аднаўленьня БССР, якая будавала б свае адносіны з РСФСР на фэдэрацыйных асновах. Старшынём БКА быў Усевалад Ігнатоўскі. 20 жніўня 1920 г. увайшла ў склад КП(б)Б. — *А.П.*

[19] Усеагульны габрэйскі рабочы саюз — нацыянальная сацыял–дэмакратычная габрэйская арганізацыя, якая дзейнічала з 1897 г. Ва Ўсходняй Беларусі існавала да 2–й паловы 1920–х гг., у Заходняй — да 1939 г. — *А.П.*

ўхвальваючы фэдэрацыйнай канцэпцыі пілсудчыкаў, адмовілася ад прапановы Іофэ. Гэтае рашэньне паўплывала на лёс БССР, а можа, нават вызначыла яе існаваньне. Толькі з гэтага часу пачаўся рэальны працэс тварэньня рэспублікі — трэба ж было нешта зрабіць з шасьціпавятовай Меншчынай, якая, дзякуючы палякам, засталася на савецкім баку лініі фронту.

Па гэтай прычыне БССР не была сыгнатарам ганебнага Рыскага трактату, паколькі не была суб'ектам, але прадбачаным да ліквідацыі прадметам мірнай канфэрэнцыі. Пазьнейшае савецкае зацікаўленьне юрыдычным прызнаньнем Беларускай ССР Польскай Рэспублікай было ўжо толькі звычайнай пасьлядоўнасьцю вырашэньня яе будучыні ў Рызе.

Друкуецца паводле: Кантакт. 1989. № 2; 1990. № 1 (3).

Памяці Браніслава Туронка

Ад аўтара

У чэрвені 1942 году я закончыў пачатковую школу ў Дукштах, пасьля чаго рыхтаваўся паступіць у гімназію. Час быў ваенны, але ўсходні фронт знаходзіўся недзе далёка і ў Летуве было параўнальна спакойна, ва ўсякім разе для нас, дзяцей. Працавалі ня толькі пачатковыя і сярэднія школы, але і ўнівэрсытэт. Усё ж мая задума паступіць у віленскую гімназію магла здавацца маларэальнай. Па–першае, не было ў нас на тое патрэбных сродкаў і, па–другое, не было ў Вільні знаёмых, у якіх можна было б затрымацца на даўжэйшы час. Былі затое: цьвёрдае жаданьне вучыцца і мае 13 гадоў, калі цяжкасьці яшчэ мала ўсьведамляюцца. Дарэчы, у Вільню выбіраўся ня сам, але з "больш вопытным", бо 15–гадовым, сябрам Альфонсам Мікштасам.

Прыбыўшы ў канцы верасьня ў Вільню, мы адразу накіраваліся ў гімназію, якая знаходзілася пры Вялікай вуліцы побач касьцёла сьвятога Казімера. На панадворку спаткалі нейкага пана, які запытаў, чаго нам трэба. "Вучыцца!" — адказалі мы. "О, гэта вельмі добра", — сказаў незнаёмы і пацікавіўся адкуль мы прыехалі і як называемся. "Туронак", — адказаў я, пасьля чаго наш субяседнік запытаў: "Ці твой бацька лекар?" "Так", — адказаў я, але ўжо не жыве. Незнаёмы неяк задумаўся і запрасіў прыйсьці заўтра да дырэктара.

На другі дзень аказалася, што мы размаўлялі з дырэктарам Першай Віленскай гімназіі Труканасам. Нашая справа была аформлена хутка і пасьпяхова: дырэктар прыняў нас у гімназію, звольніў ад платы за навуку (100 райхсмарак у год), забясьпечыў месца ў інтэрнаце. Гэта было ўсё, аб чым можна было тады марыць.

2 чэрвеня 1943 г., перад канцом школьнага году, сакратар гімназіі Юлія Жукаўскайтэ паведаміла, што дырэктар просіць мяне на сваю кватэру. Калі я туды зьявіўся, Труканас сказаў наступнае: "Часы няпэўныя і невядома, ці давядзецца яшчэ спаткацца. Хачу табе толькі сказаць, што я ведаў твайго бацьку. Разам дзейнічалі — я змагаўся за сваю Летуву, а ён — за сваю Беларусь. Разам і цярпелі ад палякаў за гэтую нашую дзейнасьць". Шмат пазьней даведаўся, што да 1926 году Труканас жыў у Вільні.

Падобныя эпізоды, хоць ужо ня так важныя для мяне і ня так калярытныя, здараліся і пазьней — у Беластоку, Новай Всі каля Лемборку (у акоўскай кампаніі Віцькі), Шчэціне, Варшаве, а нават у Менску і на Захадзе. Ня раз давялося спатыкаць там людзей, якія ведалі Браніслава Туронка, прычым у адных выпадках імя бацькі памагала ў маіх жыцьцёвых справах, а ў іншых — бывала прычынай стрыманага або зьедлівага да мяне стаўленьня. Цікава, што нават некаторыя мініапаратчыкі зь Беларускага грамадзка–культурнага таварыства ў Польшчы, хоць і не арыентаваліся ў бацькавай біяграфіі, ня раз перашэптваліся: "Ну, Туронак, быццам нічога, але ж яго бацька!.."

Усё гэта несумненна інтрыгавала і зацікаўляла жыцьцёвым шляхам і грамадзкай дзейнасьцю бацькі. Аднак найбольшую патрэбу ў гэтай справе я пачаў адчуваць у ходзе досьледаў заходнебеларускага руху 20–х гадоў. Хацелася знайсьці адказ на пытаньне, які быў канкрэтны ўдзел бацькі ў гэтым руху. Гэтыя зацікаўленьні стымулявала "змова маўчаньня" вакол дзейнасьці бацькі, якая панавала ў сямейным асяродзьдзі. Тут традыцыя яго змаганьня не перадавалася нашчадкам. Можа, толькі акрамя скупаватых расказаў мамы, а таксама майго дзядзькі, кс. Язэпа Рэшаця, які яшчэ ў 1947 годзе прыслаў мне кароткі пасьмертны ўспамін Язэпа Найдзюка пра Браніслава Туронка, які быў зьмеш-

чаны ў кастрычніку 1938 году ў віленскім "Шляху Моладзі".

Трыццаць гадоў пазьней гэты газэтны выразак пачаў абрастаць дакумэнтамі, здымкамі, лістамі, нататкамі. Стварылася аб'ёмістая папка. Зьвесткі аб сямейным асяродзьдзі і маладосьці Браніслава былі атрыманыя ад ягоных сясьцёр Антаніны Каравай (Грыфіна, каля Шчэціна) і Фартунаты Вайніловіч (Забор'е, Шаркаўшчынскага раёну Віцебскай вобласьці), брата Яна Туронка (Малькі, Браслаўскага раёну Віцебскай вобласьці) і зроднага брата, кс. Язэпа Туронка (Стрый, Украіна).

Важныя матэрыялы аб грамадзкай дзейнасьці бацькі былі знойдзены ў даваенных віленскіх часопісах і іншых выданьнях. Дапоўнілі іх успаміны ягоных калегаў д–ра Францішка Пяткевіча (Крынкі) і д–ра Міколы Марцінчыка (Горадня), а таксама ўспаміны мамы. І урэшце ўспаміны мамы і мае ўласныя паслужылі для апісаньня апошніх гадоў жыцьця бацькі ў Дукштах.

Гэтыя матэрыялы мелі быць падставай біяграфічнага нарысу, які плянаваўся да 40–годзьдзя сьмерці Браніслава Туронка (1978 г.). Аднак у першай яго рэдакцыі аказаліся немалыя прагалы, якія датычылі перш за ўсё віленскага пэрыяду ягонага жыцьця. Спатрэбілася яшчэ экскурсія ў Цэнтральны Дзяржаўны архіў Літоўскай ССР, якую ўдалося мне ажыцьцявіць у ліпені 1979 г. Дзякуючы дапамозе яго дырэктара В. Даўнене, у архіве была знойдзена студэнцкая асабовая папка Браніслава Туронка, а таксама акты яго справы ў Віленскім Акруговым судзе (1925 г.). Некаторыя дакумэнты, між іншым, арыгінальнае пасьведчаньне Яраслаўскай гімназіі з 1917 г. (матуральнае), я атрымаў пазьней з гэтага архіву праз савецкае пасольства ў Варшаве.

Акрамя архіўных здабыткаў, на працягу апошніх трох гадоў былі знойдзены новыя біяграфічныя матэрыялы ў бібліятэках Вільні, Варшавы і Прагі, а таксама ў Беларускай Бібліятэцы імя Ф. Скарыны ў Лёндане. Адначасова былі атрыманыя ўспаміны Веры Карчэўскай (Матэйчук) з Супрасьлі і Язэпа Найдзюка, якія ўзбагацілі сабраны да гэтае пары матэрыял. Усім асобам, якія дапамаглі мне інфармацыяй, дакумэнтамі, здымкамі, выказваю сардэчную падзяку.

Варшава, у жніўні 1981 г.

Дзісеншчына — радзіма Туронкаў

На пачатку нашага тысячагодзьдзя тэрыторыя Сярэдняга Наддзьвіньня, падобна як і ўсёй паўночна–заходняй паласы сёньняшняй Беларусі, прадстаўляла пераходную этнічную зону між Полацкай зямлёй на ўсходзе і Летувой на захадзе. Стварылася яна шляхам калянізацыйнай экспансіі беларускага насельніцтва Полаччыны на абшары, якія раней поўнасьцю засялялі балцкія плямёны. Этнічная неаднароднасьць, у сваю чаргу, абумовіла веравызнаўчую дыфэрэнцыяцыю жыхароў Дзісеншчыны.

Ва ўмовах сумеснага пражываньня хутка наступала моўная асыміляцыя балцкіх аўтахтонаў, чаму судзейнічаў вышэйшы ў беларусаў тып культуры, якая стваралася на базе хрысьціянства. Прыгадаем, што ўжо ў XIV ст. старабеларуская мова была афіцыйнай моваю Вялікага Княства Літоўскага. Варта, аднак, заўважыць, што ўсьлед за моўнай асыміляцыяй не наступілі істотныя зьмены ў веравызнаўчых адносінах.

Ва ўмовах суіснаваньня абедзьвюх плыняў хрысьціянства на працягу мінулых стагодзьдзяў адбывалася фармаваньне грамадзтва Дзісеншчыны. За гэты час, шляхам незьлічоных сужэнстваў, насельніцтва грунтоўна перамяшалася, у выніку чаго немагчыма ўжо адрозьніць ці выдзяліць нашчадкаў колішніх полацкіх перасяленцаў ці аўтахтонаў.

Частку насельніцтва Дзісеншчыны складалі расейскія старавеpы, колішнія эмігранты з Маскоўшчыны, а таксама жыды і дробныя групы мусульманскіх татараў.

Паводле "Первой Всеобщей переписи населения Российской империи", у канцы XIX

ст. моўная і веравызнаўчая структура насельніцтва Дзісенскага павету выглядала гэтак:

Структура насельніцтва Дзісенскага павету ў 1897 годзе

паводле роднай мовы			паводле веравызнаньняў		
Агулам	204923	100%	Агулам	204923	100%
У тым ліку:			У тым ліку:		
Беларусы	166141	81,1%	Праваслаўныя	107953	52,7%
Жыды	20684	10,1%	Каталікі	66294	32,4%
Расейцы	12152	5,9%	Юдэі	20732	10,1%
Палякі	4928	2,4%	Стараверы	9484	4,6%
Іншыя	1018	0,5%	Іншыя	460	0,2%

У гэтых адносінах цікавым было становішча ў Новапагосцкай воласьці, якой беларускае насельніцтва, паводле перапісу з 1921 году, падзялялася амаль у роўнай меры на каталікоў (41,6%) і праваслаўных (40,7%). Такім чынам, абедзьве групы насельніцтва былі тут аднолькава шматлікімі, у сувязі з чым ні адзін, ні другі бок не знаходзіўся ў меншасьці і не адчуваў комплексу непаўнавартасьці. Грамадзкі сэнс такога становішча быў надзвычай важны.

Сацыяльны склад насельніцтва Дзісенскага павету менш адрозьніваўся ад паказчыкаў, характэрных для ўсёй Беларусі. Паводле цытаванай статыстыкі, у 1897 годзе пераважную частку складалі сяляне (162 817 чалавек, або 79,5%) і мяшчане (33 014 чалавек, або 16,1%). Колькасьць дваран (8 084 чалавек), купцоў (317 чалавек) і духавенства (233 чалавек) складала разам толькі каля 4% усяго насельніцтва, аднак іх роля ў эканамічным, культурным і палітычным жыцьці была вырашальнай. У прыватнасьці, у іх руках канцэнтравалася значная частка зямлі, тады як сялянства (да 1861 г. прыгоннае) цярпела на вялікую яе нястачу і нярэдка было вымушана арандаваць панскія маёнткі. Адначасова, у выніку слабога разьвіцьця вытворчых сіл, амаль не існавалі магчымасьці заробаткаў у іншых сфэрах народнай гаспадаркі.

Вострыя сацыяльныя супярэчнасьці паглыбляліся нацыянальным прыгнётам. Важную ролю ў гэтай галіне іграла польскае (ці дакладней — апалячанае) і расейскае дваранства, а таксама каталіцкае і праваслаўнае сьвятарства, якое выкарыстоўвала Касьцёл і Царкву для пашырэньня ў беларускім народзе палянафільскіх і русафільскіх ідэяў. Адначасова нізкі ўзровень асьветы беларускага сялянства абмяжоўваў разьвіцьцё нацыянальнай культуры і сьвядомасьці.

Заўважым, што на парозе XX ст. на Дзісеншчыне было пісьменнымі 45,7 тыс. чалавек (ва ўзросьце ад 8 гадоў узвыш), што складала толькі 28,9% усяго насельніцтва павету.

Па сутнасьці, не было яшчэ ў той час сьвядомай беларускай інтэлігенцыі, ва ўсякім разе ў шырэйшым маштабе. Як пісала ў сваіх успамінах Паўліна Мядзёлка (аднагодка Бранiслава Туронка), усю мясцовую інтэлігенцыю можна было пералічыць на пальцах. “Адны лічылі сябе палякамі і групаваліся ля ксяндза, другія — рускімі. І ксяндзы і папы ўбівалі людзям у галаву пераканаьне ў тым, што калі ты католік, ходзіш маліцца ў касьцёл — значыць ты паляк, а калі праваслаўны — дык рускі. Словы ж “Беларусь”, “беларус” у той час зусім не ўжываліся ў друку і рэдка ў гутарках. “Северо–западный край” — так называлі нашу бацькаўшчыну”. (Мядзёлка Паўліна. Сцежкамі жыцця. Мінск 1974. С. 9).

Аднак гэтая дэзынтэграцыйная палітыка памешчыкаў і сьвятарства мела тут даволі абмежаваны абсяг. Праўда, яна судзейнічала захоўваньню традыцыйных падзелаў, аднак не змагла замяніць “тутэйшую” сьвядомасьць сялянскіх мас якой–небудзь іншай.

Варта яшчэ зьвярнуць увагу на адну акалічнасьць, якая не парушыла мясцовай ся-

лянскай "тутэйшасьці". Як сьведчаць гістарычныя крыніцы, сялянства Дзісеншчыны не падтрымала Студзеньскага паўстаньня 1863 г. (Смирнов А.Ф. Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии. Москва, 1963. С. 215). Гэты факт, а таксама аддаленасьць Дзісеншчыны ад польска–беларускай этнічнай мяжы ў значнай меры абумовілі тут больш памяркоўную дзейнасьць мураўёўшчыны пасьля Студзеньскага паўстаньня. Між іншым, расейскія ўлады ў той час не закранулі ў гэтым павеце ніводнага парафіяльнага касьцёла, тады як, напрыклад, на Беласточчыне зачынілі, разбурылі або ператварылі ў праваслаўныя цэрквы 22 касьцёлы, зьмяншаючы такім чынам агульную іх колькасьць у гэтым раёне амаль на 40%, правакуючы гэтым самым вострыя антаганізмы між аднамоўным беларускім насельніцтвам (гл.: Туронак Ю. Нарыс разьвіцьця школьніцтва на Беласточчыне ў пэрыяд 1773—1939 гг. [стар. 730—750 нашага выданьня. — *Рэд.*]. Падобныя зьявы на Дзісеншчыне сустракаліся рэдка.

Зь сямейнай хронікі

Сямейным гняздом Туронкаў здаўна лічылася вёска *Дзянісы*, якая знаходзіцца ў 3—4 кілямэтрах на поўнач ад валаснога і парафіяльнага цэнтру — мястэчка Новы Пагост. Тут, паводле ацэнкі майго дзядзі Яна Туронка (15.03.1978), у 1824 годзе нарадзіўся мой прадзед Сьцяпан Туронак, тут жылі яго бацькі і дзяды. "Яна дужа старынная наша прапрадзедаўшчына, — пісаў дзядзя Ян, — напэўна ёй каля тысячы лет". Наўрад ці гэты погляд адпавядае гістарычнай дакладнасьці, няма затое сумненьня, што ён адлюстроўвае сямейную традыцыю, зьвязаную з гэтай вёскай.

Паводле гістарычных зьвестак, у XVI ст. Новы Пагост належаў да канцлера Вялікага Княства Літоўскага Лява Сапегі, які ў 1593 годзе пабудаваў тут касьцёл. Зь няпамятных часоў існавала ў Новым Пагосьце і царква — пачаткава праваслаўная, пасьля 1596 году — уніяцкая і ад 1839 году — ізноў праваслаўная. Вельмі праўдападобна, што ў склад землеўладаньняў гэтага магната ўваходзіла і недалёкая вёска Дзянісы.

На працягу вякоў нярэдка мяняўся ўладальнік дзянісаўскіх прыгонных сялян. Аднак перад Студзеньскім паўстаньнем 1863 году вёска ўжо лічылася "казёншчынай", а яе жыхары на прыгон не хадзілі, адраблялі павіннасьці ў воласьці. Мяркуецца, што такі іх сацыяльны статус датаваўся ад Лістападаўскага паўстаньня 1831 г., калі царскі ўрад канфіскаваў маёмасьць памешчыкаў, якія ўдзельнічалі ў паўстаньні.

Насельніцтва вёскі Дзянісы здаўна было неаднародным у веравызнаўчых адносінах. Паводле перапісу з 1921 году, вёска налічвала 29 двароў з 131 жыхаром, зь якіх было 72 каталікі і 59 праваслаўных (55 і 45%). Не было тут жыдоў і расейскіх старавераў, якіх ва ўсёй Новапагосцкай воласьці налічвалася разам амаль 18%. Цікава заўважыць, што ў часе перапісу 1921 году (польскага!) усе жыхары Дзянісаў акрэсьлілі сваю нацыянальнасьць як беларускую.

З гэтых Дзянісаў адлучыўся на парозе свайго сталага жыцьця прадзед Сьцяпан Туронак, якога ачаравала на год за яго старэйшая Ефрасіньня Гарбачонак зь вёскі Гарбачонкі, што знаходзілася ў адлегласьці каля трох кілямэтраў ад Дзянісаў. Прабабцы Ефрасіньні давялося асабіста перажыць "возсоединение западнорусских униатов", і, выходзячы замуж, яна лічылася праваслаўнай. Паводле цёткі Фартуні (18.01.1979), іх шлюб адбыўся ў Новапагосцкім касьцёле, можна думаць, каля 1860 году, пасьля чаго прадзед пайшоў у прымакі да жонкі ў яе вёску Гарбачонкі. Ня мог ведаць прадзед Сьцяпан, што гэтая яго пастанова паложыць пачатак бясконцаму бадзяньню нашчадкаў па чужых засьценках...

Вёска Гарбачонкі была напалову меншай за Дзянісы. У 1921 годзе яна налічвала ўсяго 70 жыхароў, у тым ліку 34 каталікоў і 36 праваслаўных. І тут, як у Дзянісах, пражывалі толькі мясцовыя беларусы.

Пасьля адмены прыгоннага права ў 1861 годзе прадзед Сьцяпан атрымаў у Гарбачонках 4 дзесяціны надзельнай зямлі. З часам прыйшла на сьвет чародка дзяцей (чарговасьць няпэўная):

Казімер — найстарэйшы, бацька Сатурніна, Банона і іншых;

Язэп;

Сьцяпан — мой дзед, нарадзіўся каля 1860 г.;

Іаанна (Югася);

Пракседа — замужам Абаровіч, жыла ў Латвіі;

Ігнат — наймаладзейшы, будучы ксёндз.

Невялікая гаспадарка не магла забясьпечыць патрэбаў сям'і, якая налічвала восем душ. Тым больш яна не стварала ніякай магчымасьці акумуляцыі, што магло быць адзіным сродкам яе разьвіцьця. На месцы дадатковых заробаткаў амаль не было, а эміграваць у Сібір ці Амэрыку, відаць, не было ахвоты. Адначасова, у меру росту дзяцей, расла і вытворчая здольнасьць сям'і. У гэтых умовах прадзед Сьцяпан вырашыў арандаваць памешчыцкую зямлю.

У 1875 годзе прадзеды пакінулі Гарбачонкі і пераехалі ў недалёкія Пестуны Навапагосцкай воласьці, дзе арандавалі фальварак. У Гарбачонках застаўся сын Сьцяпана, Язэп, які далей гаспадарыў на бацькаўскіх чатырох дзесяцінах. Пасьля яго сьмерці, на прадзедаўшчыне гаспадарыў яго сын Ігнат, які яшчэ ў 1979 годзе жыў у Гарбачонках.

Пестуны не лічыліся нават вёскай, толькі фальваркам, засьценкам. Паводле дадзеных з 1921 году, тут было ўсяго 10 двароў з 73 жыхарамі. Адсюль прадзедавы дзеці паступова разыходзіліся па сьвеце. Вышлі замуж Югася і Пракседа. У 1907 годзе наймаладзейшы Ігнат паступіў у Віленскую каталіцкую духоўную сэмінарыю, якую закончыў у 1912 годзе. У Пестунах засталіся Казімер і Сьцяпан, якія доўгі час гаспадарылі разам з прадзедам.

Каля 1890 году маладзейшы Сьцяпан Туронак ажаніўся з Канстанцыяй Баркоўскай зь вёскі Шаўляны суседняй Барадзеніцкай парафіі. Стварылася сям'я маіх дзядоў. Бабка была на дзесяць год маладзейшая за дзеда. Жылі яны ў Пестунах каля дзесяці гадоў. Тут нарадзіліся першыя сыны: Уладзіслаў (1892), Браніслаў (1896) і Ян (1899).

Расьлі Казімерава і Сьцяпанава сем'і, і ў Пестунах пад адным дахам было цесна. Давялося разьдзяліцца. У Пестунах засталіся Казімер з прадзедам Сьцяпанам, а маладзейшы Сьцяпан з жонкай і сынамі ў 1900 годзе пасяліўся ў Янопалі, дзе арандаваў фальварак, які належаў да Уладзіслава Козел–Паклеўскага — нашчадка вядомага на Дзісеншчыне памешчыцкага роду. Праз год (1901) у Пестунах памёр прадзед Сьцяпан. Прабабка Ефрасіньня адыйшла з гэтага сьвету ўжо ў 80–я гады мінулага стагодзьдзя.

Янопаль знаходзіўся зусім непадалёк родных Гарбачонкаў. Гэта была тыповая пустэча: паводле статыстыкі 1921 году, тут пражывала усяго 11 чалавек (усе беларусы–каталікі), з чаго можна зрабіць вывад, што акрамя Туронкаў жылі тут яшчэ 2—3 іншыя асобы. У Янопалі прыйшла чарга на сэрыю дачок — Фартунату (1901), Антаніну (1904) і Агнешку (1906).

У 1908 годзе невядомая прычына прымусіла дзеда Сьцяпана спыніць Янопальскую арэнду і пасяліцца ў недалёкай Яцкоўшчыне, дзе на працягу пяці гадоў арандаваў фальварак маскаля Апанаса (прозьвішча не ўстаноўлена). Тут у 1909 годзе нарадзіўся сын Ігнат, які, у адрозьненьне ад усіх дзяцей, быў ахрышчаны ў Барадзеніцкім касьцёле, паколькі Яцкоўшчына была ў складзе гэтай парафіі. У 1913 годзе сям'я ізноў вярнулася ў Янопаль, дзе ў 1916 г. нарадзіўся пяты сын і восьмае дзіця — Віцька.

На арэндах у Янопалі і Яцкоўшчыне, у меру росту сямейнай вытворчай сілы, дзед Сьцяпан паступова разгарнуў даволі значную гаспадарчую дзейнасьць. Паводле сьведчаньня цёткі Антаніны, на гаспадарцы трымалі ў сярэднім 5 коней, 12 кароў, 25 авечак, 50 гусей. Дзед Сьцяпан сам шыў боты, рабіў бочкі, вёдры ды іншыя хатнія прылады і

гаспадарчае абсталяваньне. Жанчыны ткалі сукно на адзеньне і палатно на бялізну. Увогуле, як успамінае цётка, жылося "даволі добра", хоць усе вельмі цяжка працавалі на гаспадарцы. Усе сямейныя сілы былі накіраваныя на ажыцьцяўленьне асноўнай задумы дзеда, якой было імкненьне купіць уласную зямлю. Гэтай ідэі падпарадкоўваўся ўвесь сямейны эканамічны рэжым. Усё паказвала на рэальнасьць гэтай задумы: умовы арэнды (ў Янопалі 200 рублёў у год) былі даволі выгадныя, гаспадарка разьвівалася, расла і акумуляцыя. Напярэдадні першай сусьветнай вайны ў дзедавай касе было ўжо 3300 рублёў, аднак зямлі не купіў. Магчыма, хацеў назьбіраць яшчэ больш грошай. У часе вайны, а потым рэвалюцыі грошы абясцэніліся. Потым імі абклейвалі сьцены... У часе сусьветнай вайны восеньню 1915 г. фронт затрымаўся на лініі Дзьвінск—Браслаў—Паставы—Нарач, у выніку чаго да другога нямецкага наступу ў лютым 1918 году Дзісеншчына знаходзілася ў прыфрантовай зоне на тэрыторыі, якую займалі расейскія войскі. Потым тут былі немцы, чырвонаармейцы і, урэшце, польскія легіёны. Іх бясконцыя рэквізыцыі давялі гаспадарку да руіны. Абарваліся ўсе дзедавы пляны і надзеі, што адмоўна адбілася на ягоным здароўі. Памёр дзед Сьцяпан на запаленьне лёгкіх два тыдні пасьля Вялікадня 1920 году ў 60–гадовым узросьце. Пахавалі на могілках у Новым Пагосьце.

Пасьля сьмерці дзеда, летам 1921 году, вярнуўся ў Янопаль Ул. Козел–Паклеўскі. Туронкам давялося ізноў разглядацца за новай арэндай. Гэтым разам лёс кінуў іх у невялікі засьценак Бірукі, які знаходзіўся ў некалькіх кілямэтрах ад вёскі Дзянісы. Быў гэта, паводле цёткі Антаніны, маёнтак "на 10 сох" (адна "саха" адпавядала колькасьці зямлі, якую можна было апрацаваць адным канём). Арандавалі яго тры сям'і — Вярцінскія (5 сох), Туронкі (3 сахі) і Стацэвічы (2 сахі). У Біруках арэнда трывала каля пяці гадоў. Тут у 1924 годзе памерла бабка Канстанцыя. У панядзелак пасьля Вялікадня захварэла на запаленьне лёгкіх і ў наступны панядзелак памерла. Як дзед Сьцяпан. Пахавалі на могілках у Новым Пагосьце.

Пасьля сьмерці бабкі асірацелыя Туронкі пакінулі ў 1926 годзе ваколіцы Новага Пагосту, дзе была іх прапрадзедаўшчына, і падаліся на поўнач ад возера Абстэрна, у бок Друі. Некалькі год жылі ў маёнтку Дамбравова, дзе арандавалі зямлю пана Ожэха. Сярод іх не было ўжо Фартуні, якая выйшла замуж за Рычарда Вайніловіча ў Забор'е, а таксама Бранiслава, які вучыўся ў Вільні. У 1926 годзе жанаты ўжо Уладзіслаў пасяліўся ў жончынай вёсцы Боўк каля Новага Пагосту.

У Дамбравове галавой сям'і быў 26–гадовы Ян, які апекаваўся малодшымі Антанінай, Агнешкай, Ігнатам і Віцькам. У 1930 годзе Антаніна выйшла замуж за Адама Каравая ў Масальшчыну. Выбыў таксама і Віцька, які вучыўся ў Друйскай гімназіі. Гэтую яго вучобу фінансавала ўся сям'я: Браніслаў плаціў за навуку 25 злотых у месяц, а іншыя пакрывалі кошты кватэры, харчаваньня і г.д.

У 1931 годзе Ян, Агнешка і Ігнат пасяліліся ў Ідольце, дзе арандавалі зямлю пана Сьвідэрскага. Праз два гады Ян ажаніўся і купіў ад Сьвідэрскага 14 гектараў зямлі. У 1934 годзе выйшла замуж Агнешка за Сымона Кабялку ў Боркі, а Ігнат ажаніўся і пайшоў у прымакі да жонкі Янкі ў Стайкі над Дзьвіной. Разам справілялі вясельле.

Юнацтва Браніслава Туронка

Пачатковая і сярэдняя адукацыя

Браніслаў Туронак нарадзіўся 10 чэрвеня (старога стылю) або 22 чэрвеня (новага стылю) 1896 году ў фальварку Пестуны Новапагосцкай воласьці. Шмат гадоў пазьней яго наймалодшы брат Віцька, які хацеў быць палякам, у фальваркавым паходжаньні дашукоўваўся свайго "шляхецтва". На сьмешнасьць гэтых пажаданьняў Віцькі паказ-

ваюць зьвесткі з папярэдняга разьдзелу.

Хрост Браніслава адбыўся 22 чэрвеня (ст. ст.) або 4 ліпеня (н. ст.) 1896 году ў Новапагосцкім касьцёле. Хроснымі былі: ягоны дзядзька Ігнат і Люцыя Сямашка.

У Пестунах Браніслаў жыў чатыры гады. У 1900 годзе сям'я перасялілася ў Янопаль, дзе пачалося яго сьвядомае жыцьцё. Можна думаць, што яно не адрозьнівалася ад жыцьця іншых сялянскіх дзяцей той пары, хіба толькі тым, што ў янопальскай пустэчы бадай не было суседзкіх дзяцей.

Пэўную цікавасьць выклікае справа адукацыі Браніслава. Як ужо ведаем, пры акумуляцыйнай палітыцы дзеда Сьцяпана лічылася ня толькі кожная капейка, але і кожная пара рабочых рук. Аднак, нягледзячы на напружанае матэрыяльнае становішча, ён імкнуўся выпусьціць частку дзяцей "у людзі".

Такую магчымасьць даваў дзед ня толькі Бранісдаву. Праўда, Уладзіслаў як найстарэйшы сын, згодна з традыцыяй, прызначаўся насьледнікам будучай уласнай гаспадаркі, у сувязі з чым, закончыўшы чатыры клясы народнай вучэльні ў Новым Пагосьце, ён спыніў далейшую адукацыю. У гэтую вучэльню пасылаўся і Ян, аднак — як сьцьвярджала цётка Антаніна — вучыцца ён не хацеў і пасьля двух гадоў перастаў наведваць школу. У галіне адукацыі больш дасягнула Фартуня. Яна закончыла пачатковую школу і падрыхтавалася паступіць у чацьвёртую клясу гімназіі, чаму, аднак, перашкодзіла вайна.

Як сьведчыць дзядзька Ян (15.03.1978), Браніслаў вучыўся ў Новым Пагосьце, дзе закончыў шасьціклясную народную вучэльню. У сувязі з гэтай інфармацыяй нельга разумець даслоўна вестку ў пасьмертнай біяграфіі, зьмешчанай у "Шляху Моладзі", паводле якой Бранісдаў вучыўся "ўдома". Гэта абазначае, што вучыўся ён жывучы пры бацьках, у сваёй мясцовасьці, а не на пэнсіі.

Няма затое дакладных вестак, у якім часе вучыўся ён у Новым Пагосьце. У гімназію паступіў у 1912 годзе, што паказвае на 2—3 гадавое спазьненьне ў нармальным адукацыйным рытме. Магчыма, у Новапагосцкую школу пачаў хадзіць толькі ў 9—10-гадовым узросьце, дакуль зь Янопалю было каля пяці кілямэтраў. Такая адлегласьць была для малога дзіцяці немалаважнай перашкодай.

Істотную ролю ў далейшай адукацыі Бранісдава адыграў ягоны дзядзька Ігнат Туронак, які ў 1907—1912 гг. вучыўся ў Віленскай духоўнай сэмінарыі. Паколькі ў час вучобы Ігнат быў ужо круглым сіратою, яго брат Сьцяпан аказваў яму матэрыяльную дапамогу, за што пазьней Ігнат меў дапамагчы Бранісдаву. Восеньню 1912 году, ужо будучы на парафіі, Ігнат уладкаваў 16-гадовага Бранісдава ў чацьвёртую клясу віленскай гімназіі і часткова фінансаваў яго вучобу. У гэтым часе Бранісдаў атрымаў ад свайго дзядзькі і хроснага, ксяндза Ігната Туронка, чорную "Амэгу"[1] і туалетную скрынку, якія захаваліся да гэтай пары.

Пра вучобу Бранісдава ў Вільні дайшлі да нас вельмі скупыя весткі. Паводле біяграфіі (праўдападобна, не аўтарызаванай бацькам), надрукаванай 28 лютага 1928 году ў "Biełaruskaj Krynicy", ("Нашы кандыдаты — Др. Бранісдаў Туронак")[2], ён паступіў "у прыватную О.Р.С.А. гімназію, у якой прабыў да заняцьця Вільні праз немцаў". Аб гэтай гімназіі знаходзім наступныя весткі ў "Памятной книжке Виленского учебнаго округа на 1915 год" (Вильна, 1915. С. 22—23): "частная, 8-класная, с правами правительственных, мужская гимназія Общества распространения среднего образования" (О.Р.С.А). Гімназія знаходзілася ў наёмным будынку пры Юнкерскім завулку, № 21 (побач Буфаловай гары). Яе дырэктарам быў Фэрдынанд Вэлер, выпускнік фізмат. факультэту Казанскага ўнівэрсытэту.

Аднак, паводле цытаванай "Памятной книжки", гэтая гімназія была заснаваная толькі

[1] "Амэга" — наручны швайцарскі гадзіньнік. — *А.П.*

[2] Згаданая біяграфія друкавалася перад выбарамі ў польскі сойм, на якіх Бранісдаў Туронак выступаў у якасьці кандыдата ў паслы ад Блёку нацыянальных меншасьцяў у Беластоцкай акрузе. — *А.П.*

ў 1914 годзе, з чаго просты вывад, што Браніслаў мог там вучыцца ўсяго адзін год (1914/15), у шостай клясе. Значыць, раней наведваў нейкую іншую гімназію. Цяжка сказаць, якая была прычына пераходу з аднае школы ў іншую. Найхутчэй была яна фінансавая. Гімназія О.Р.С.А. была найтаньнейшая ў Вільні, а плата за навуку ў шостай клясе складала тут 150 рублёў у год. У іншых жа гімназіях навука каштавала амаль столькі, колькі дзед Сьцяпан плаціў у год Козел–Паклеўскаму за арэнду Янопалю.

Летам 1915 году пачаўся наступ нямецкіх войскаў на ўсходнім фронце. У Вільні ствараліся розныя камітэты, якія займаліся эвакуацыяй насельніцтва, установаў і школаў. У адзін такі камітэт быў накіраваны духоўнымі ўладамі кс. Ігнат Туронак, які з групай уцекачоў выехаў у Арэнбург, дзе выконваў душпастырскія абавязкі (памёр там у 1916 г.). Вось жа, перад сваім выездам ён уключыў Браніслава ў групу эвакуаванай моладзі, якой кіраваў віленскі пэдагог Вінцэнты Віхурскі.

На працягу 1915/16 школьнага году Віхурскі разам із сваімі падапечнымі перабываў у Віцебску, а восеньню 1916 г. пераехаў далей ад зоны ваенных дзеяньняў — у Яраслаўль над Волгай, дзе, відавочна, былі лепшыя ўмовы для навукі і пражываньня. Групай гімназістаў апекаваўся камітэт для ўцекачоў, які дбаў пра іх навуку і матэрыяльныя патрэбы. Як успамінаў пазьней бацька, у гэты ваенны час без дапамогі камітэту вучыцца было амаль немагчыма, нягледзячы на тое, што ён ня быў цалкам адарваны ад сваіх бацькоў. У той час Дзісеншчына яшчэ не была акупаваная немцамі і Браніслаў мог вяртацца дамоў на канікулы.

Такім чынам, у 1915/16 школьным годзе Браніслаў вучыўся ў Віцебскай гімназіі, дзе закончыў сёмую клясу. Тут вясной 1916 г. яго адведала сястра Фартуня, якая пасьля пахаваньня кс. Ігната Туронка вярталася з Арэнбургу дамоў. У кастрычніку 1916 г. Браніслаў уступіў у восьмую клясу яраслаўскай гімназіі Д.Н. Шчогалева. Тут 7 траўня 1917 году атрымаў атэстат сталасьці.

Што можна сказаць пра асяродзьдзе, у якім перабываў Браніслаў у часе сваёй вучобы ў гімназіях Вільні, Віцебска і Яраслаўлю? Як яно ўплывала на разьвіцьцё яго асабовасьці і поглядаў, асабліва ў аспэкце пазьнейшай зацікаўленасьці бацькі беларускім адраджэнскім рухам?

Перш за ўсё заўважым, што ў выніку самаадданай працы крыху старэйшай генэрацыі будзіцеляў, як Іваноўскага, Луцкевічаў, Уласава, Ластоўскага і іншых, у дзясятыя гады нашага стагодзьдзя на беларускай цаліне зелянела ўжо шматабяцальная рунь, як жа непадобная да тых парасткаў, якія нясьмела паяўляліся дзясяткам гадоў раней. У гэтых адносінах Браніславу ўжо не даводзілася рабіць вялікіх адкрыцьцяў — трэба было браць тое, што настойліва цярэбіла сабе дарогу ў народ. Да таго і выбар быў не такі ўжо абмежаваны: жыла нацыянальная ідэя, былі беларускія кніжкі і часопісы, адбываліся беларускія канцэрты і вечарыны, выступленьні тэатру Буйніцкага (між іншым, у 1910 г. у Дзісьне) і іншыя мерапрыемствы.

Няма сумненьня, што "Маладая Беларусь" была ў сьвядомасьці Браніслава–гімназіста зьявай натуральнай, можа, пакуль што не заўсёды зразумелай у дэталях. У значнай меры ўплывала на тое атмасфэра бацькоўскага дому: тут ня толькі гаварылі па–беларуску, тут у той час усе лічылі сябе беларусамі. І не ў "тутэйшасьці", не ў этнаграфіі справа: неўзабаве, у 1919 годзе, старэйшыя сыны дзеда Сьцяпана працягнуць рукі па зброю дзеля абароны роднага краю.

Тым часам, перабываючы ў Вільні, Віцебску і Яраслаўлі, Браніслаў наглядаў і вывучаў тыповыя кантрасты: у гімназіях навучаньне адбывалася па–расейску. І ў духу "преданности престолу и отечеству". Бліжэйшае асяродзьдзе складалася ў асноўным з ураджэнцаў Віленшчыны, большасьць якіх лічыла сябе палякамі. І урэшце, побач, а нават супраць гэтых дзьвюх магутных традыцыйных плыняў будзіўся да жыцьця — свой родны, беларускі адраджэнскі рух. Выбар, вядома, быў справай сумленьня, чэснасьці.

У такіх умовах кожны дзень прыносіў нагоды для роздумаў над сваёй нацыянальнай самабытнасьцю, над ажыцьцяўленьнем нацыянальнай ідэі. Гэтаму спрыяла палітычнае становішча ў першыя гады вайны і, у прыватнасьці, слабасьць царскага рэжыму, які яшчэ ня так даўно выглядаў на ўсемагутны і непарушны. Асабліва істотнае значэньне мела ў гэтай галіне Лютаўская рэвалюцыя 1917 году, якую Браніслаў сустрэў у Яраслаўлі. Натхняла яна і клікала да дзейнасьці. Гэтаму спрыяла і немалая група беларусаў, якія ў той час перабывалі ў гэтым месьце (М. Багдановіч, Р. Астроўскі і інш.). Тры месяцы пазьней, у канцы траўня 1917 году, ужо з матурай у руках і зь вялікім багажом ідэяў, 21-гадовы Браніслаў вярнуўся праз Маскву і Віцебск у родную Дзісеншчыну.

Дзейнасьць на Дзісеншчыне 1917—1919 гг.

Пасьля Лютаўскай рэвалюцыі актывізавалася нацыянальная праца і на неакупаванай немцамі тэрыторыі Беларусі. Арганізаваліся беларускія школы (у акупаваных немцамі раёнах яны ўзьніклі значна раней), ствараліся палітычныя, вайсковыя, культурныя і рэлігійныя ўстановы ды арганізацыі, разьвівалася выдавецкая дзейнасьць.

У гэты рух уключылася і Дзісеншчына. Найбольш актыўнай была тут Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя (БХД). Як пісаў пазьней яе лідэр кс. Адам Станкевіч, для беларускай адраджэнскай працы наогул і хадэцкай у прыватнасьці былі ў гэтым раёне спрыяльныя ўмовы — перш за ўсё, адпаведныя людзі, а ў іх ліку жменя ідэйных ксяндзоў беларусаў[3].

Істотную ролю ў разбуджэньні беларускага жыцьця на грунце хрысьціянскім на Дзісеншчыне адыграў архібіскуп Эдуард Роп, які, аб'яжджаючы летам 1917 году тую частку сваёй Віленскай дыяцэзыі, якая знаходзілася на ўсход ад расейска-нямецкай лініі фронту, дазваляў гаварыць у касьцёлах казаньні па-беларуску. Заахвочваў ён таксама беларусаў-каталікоў, як духоўных, так і сьвецкіх, закладаць гурткі Хрысьціянскай Дэмакратыі, дапасоўваючы яе да беларускае душы. Неўзабаве ўзьніклі гурткі БХД у Дзісьне, Друі, Барадзенічах, Іказьні і Шаркаўшчыне[4].

Першае на Дзісеншчыне казаньне па-беларуску сказаў 20 ліпеня 1917 году кс. Адам Станкевіч у час візытацыі архібіскупа Э. Ропа ў Дзісьне. Пасьля яны гаварыліся ў Друі (1917—1930), у Ідольце (кс. І. Бобіч, 1917—1920), Шаркаўшчыне (кс. М.Пятроўскі і кс. З. Якуць, 1917—1924), Барадзенічах (кс. В. Шутовіч, 1917—1927) і час ад часу ў Іказьні, Гэрманавічах, Замошы, Мёрах, Далёкіх і Новым Пагосьце[5].

Кс. А. Станкевіч пісаў:

> Гэтыя казаньні рабілі на народ неапісанае ўражаньне. Здалёку ішлі людзі ў тую парафію, дзе спадзяваліся, што будзе беларускае казаньне, а трапіўшы на такое, слухалі з захапленьнем... Пачуўшы словы мовы роднай, твар слухачоў ажывіўся, заясьнеў. Запанавала сьвятая цішыня. Кожнае слова слухачы, здаецца, жыўцом глыталі. Узрушаньне маё сардэчнае хутка ўдзялілася ўсёй велізарнай грамадзе слухаючых, і нямую ціш у касьцёле замяніў нічым ня ўстрыманы плач галосны. Ліліся сьлёзы ручаём многаводным, сьлёзы радасьці і шчасьця з вачэй гаротнага, паднявоенага беларуса...[6]

Гэтыя ўмовы і атмасфэра, якія летам 1917 г. сустрэў Браніслаў Туронак на Дзісеншчыне, дазволілі яму належна ацаніць вялікую карысьць беларусізацыі Каталіцкага Касьцёлу для нацыянальнага і дзяржаўнага адраджэньня Беларусі. Гэта была важнейшым чынь-

[3] Гл.: Беларускі Хрысьціянскі Рух. Вільня, 1939. С. 131.

[4] Тамсама. С. 132—133.

[5] Станкевіч. А. Родная мова ў сьвятынях. Вільня, 1929. С. 98—124.

[6] Тамсама. С. 100.

нікам ягоных пазьнейшых сувязяў з БХД. Істотнае значэньне ў гэтай справе і наогул у ягонай далейшай грамадзкай дзейнасьці меў таксама запачаткаваны ў той час асабісты кантакт зь лідэрам БХД — ксяндзом Адамам Станкевічам.

Вельмі праўдападобна, што пад яго ўплывам летам і раньняй восеньню 1917 г. Браніслаў разгарнуў значную дзейнасьць у галіне арганізацыі беларускіх школаў на Дзісеншчыне. Улічваючы тагачаснае ваенна-палітычнае становішча, нельга было спадзявацца на падтрымку ўладаў у гэтай справе. Вось жа, як пішуць кс. А. Станкевіч і Я. Найдзюк у пасьмертных біяграфіях бацькі, Браніслаў Туронак згуртаваў некалькі мясцовых інтэлігэнтаў і зь іх дапамогай арганізаваў 15 беларускіх пачатковых школаў, якія на працягу двух гадоў (1917/18—1918/19, г.зн. да прыходу палякаў) працавалі на грамадзкіх падставах.

Аднак Браніслаў не спалучаў сваіх плянаў на будучыню з кар'ерай сельскага настаўніка. Яшчэ будучы ў Яраслаўлі ў палове траўня 1917 г. ён паслаў прашэньне з дакумэнтамі ў Харкаўскі ўнівэрсытэт з надзеяй паступіць на юрыдычны факультэт. Між іншым, выслаў у Харкаў арґінальны атэстат сталасьці, пакідаючы сабе чатыры копіі, зробленыя 13 траўня 1917 г. яраслаўскім натарыюсам. Пастанову аб прыняцьці ва ўнівэрсытэт атрымаў, відавочна, у Янопалі і ў кастрычніку 1917 г. выехаў у Харкаў. Тут прабыў усяго некалькі тыдняў — ва ўмовах ажыўленьня ваенных дзеяньняў і новай, Кастрычніцкай, рэвалюцыі далейшую вучобу давялося адкласьці да больш спрыяльнага часу.

Позьняй восеньню 1917 г. Браніслаў вярнуўся дамоў. Настаўнічаў у беларускіх пачатковых школах — адзін год у Більдзюгах каля Янопалю (1917/18) і другі — у Новым Пагосьце (1918/19). Час быў ненадзейны, неспакойны. Пасьля некалькіх месяцаў, калі ніхто дакладна ня ведаў, да каго належыць улада — да белых ці чырвоных, у лютым 1918 г. пачаўся новы наступ нямецкіх войскаў, якія займалі Дзісеншчыну амаль да канца 1918 г. Потым тут былі бальшавікі, а летам 1919 г. прыйшлі палякі.

Усе гэтыя зьмены балюча адчувала мясцовае насельніцтва. Па сутнасьці не абавязвалі ніякія законы, у выніку чаго значна пагоршыліся ўмовы бясьпекі. Пашыраўся хаос, бандытызм, расло бяспраўе, самасуды. Частыя рэквізыцыі, якія праводзіліся арміямі ўсіх "вызваліцеляў", даводзілі сялян да поўнай руіны. У такіх умовах на Дзісеншчыне тварыліся ўзброеныя аддзелы самаабароны, якія ў народзе называліся "зялёнай арміяй". Як інфармавала цётка Антаніна, адзін такі аддзел дзейнічаў і ў ваколіцах Янопалю. У яго склад уваходзілі між іншымі Ўладзіслаў, Браніслаў і Ян Туронкі. Кожны зь іх меў сваю стрэльбу. Гэтая зялёная армія бараніла насельніцтва ад рабункаў і рэквізыцыяў, якія праводзіліся немцамі і бальшавікамі. Часам сілай адбіралася сялянскае дабро, забранае чужымі жаўнерамі.

На падставе апавяданьняў мамы і цёткі Антаніны можна рэканструяваць наступны эпізод. Аднойчы зімою ці раньняй вясною 1919 г. да дзеда Сьцяпана прыехалі чырвонаармейцы і патрабавалі аўса для коней. Дзед адмовіўся і сказаў: "Для беларускага войска даў бы, а вам — ня дам!" Салдаты адыйшлі, затое праз некалькі дзён арыштавалі дзеда Сьцяпана і ягоных сыноў Уладзіслава, Браніслава і Яна за нелегальнае перахоўваньне зброі. Усіх трымалі пад вартай у адным з пакояў Новапагосцкай школы. На другі дзень прыйшлі ў школу дзеці і расказалі чырвонаармейцам хто іх настаўнік. Тады Браніслава адпускалі на заняткі, а пасьля іх заканчэньня ізноў зачынялі яго ў пакоі для арыштаваных. Так працягвалася тры дні. Потым вызвалілі ўсіх за хабар, які Фартуня прывезла зь Янопалю.

Вясной і летам 1919 г. дзейнасьць "зялёнай арміі" ажывілася, прычым яна набывала напрамак змаганьня за незалежную беларускую дзяржаву. Удзельнікі гэтага руху спадзяваліся на падтрымку Польшчы. У той час якраз пачалася польска-бальшавіцкая вайна, і 19 красавіка 1919 г. польскае войска заняло Вільню. Праз некалькі дзён там была абвешчана адозва Пілсудзкага да жыхароў Вялікага Княства Літоўскага[7], які заявіў між

[7] Згаданая адозва была абвешчаная 22 красавіка 1919 г. — *А.П.*

іншым: "Польскае войска прывёў я з сабою на тое, каб скінуць панаваньне гвалту і насільля, каб скінуць уладу, нязгодную з воляй насельніцтва краю. Войска гэтае нясе вам вызваленьне і свабоду. Я хачу даць вам магчымасьць разьвязаць унутраныя нацыянальныя і рэлігійныя справы так, як вы самі захочаце — безь ніякага гвалту ці націску з боку Польшчы".

Гэтыя словы Пілсудзкага даляцелі празь лінію фронту і ў Дзісеншчыну, выклікаючы вялікія спадзяваньні ў беларусаў, якія стаялі на незалежніцкім грунце. Ды што гаварыць пра дзісенцаў, а ў іх ліку і пра Туронкаў, — неўзабаве сам цэнтральны беларускі актыў з Гаруном і Купалам вітаў у Менску армію Пілсудзкага... Летам 1945 г. дзядзька Ян у размове са мной так "падсумаваў" гэтую арыентацыю: "Другі раз палякі не ашукаюць!"

Аднак у той час жылі фэдэралістычныя ілюзіі. Усіх прыцягвала Вільня, дзе паводле чутак, якія пранікалі праз фронт, арганізаваліся беларускія ўстановы ды беларускае войска...

У гэтую Вільню вырашыла прабіцца празь лінію фронту група дзісенскіх зялёнаармейцаў, сярод якіх былі Браніслаў і Уладзіслаў Туронкі (няма пэўных вестак аб удзеле ў гэтым мерапрыемстве трэцяга брата — Яна). Выехалі на конях, са стрэльбамі. Аднак ня ўсе дасягнулі мэты. У час перастрэлкі з чырвонаармейцамі ў Браніслава быў паранены ці мо забіты конь, а яздок — вельмі перапалоханы. Аднаму рухацца далей было небясьпечна. Павесіў тады Браніслаў высока на дрэве сваю стрэльбу з патронамі і пехатой вярнуўся дамоў (гэты эпізод памятаю з расказу бацькі). Хутка ўцёк у Латвію, дзе некалькі тыдняў хаваўся ў сваёй цёткі Прakседы Абаровіч, дом якой стаяў у лесе.

Па нейкім часе дзед Сьцяпан наняў праваднікa, які без асаблівых прыгод перавёў Браніслава празь лінію польска–савецкіх войскаў. Такім чынам, у ліпені 1919 году Браніслаў ізноў апынуўся ў Вільні.

Зноў Вільня (1919—1928)

Цяжка сказаць зь якімі намерамі кіраваўся Браніслаў у Вільню. Можна не сумнявацца, што ён ня ведаў нічога пэўнага ня толькі аб праектаваным адкрыцьці ўнівэрсытэту, але нават аб тым, як будзе вырашаны лёс самой Вільні і якая ўсталюецца тут улада — савецкая, польская ці летувіская. Па–другое, не было ўжо ў Вільні дзядзькі Ігната, які дапамагаў яму ў часе вучобы ў гімназіі. Не было таксама іншых пратэктараў, на якіх можна было абаперціся. Мог лічыць толькі на ўласныя сілы, тым больш, што ў выніку ваеннага ліхалецьця выехаў з бацькоўскай хаты амаль з пустымі кішэнямі. Мог яшчэ спадзявацца на ўсьмешку лёсу.

Настаўніцкі курс

У адным можна не сумнявацца: у Вільні Браніслаў імкнуўся далучыцца да беларускага руху. Таму, прыбыўшы сюды, неадкладна скантактаваўся з ксяндзом Адамам Станкевічам, зь якім летам 1917 году пазнаёміўся на Дзісеншчыне.

Якраз у гэты час, з пачаткам жніўня 1919 году, адчыняўся ў Вільні курс для настаўнікаў беларускіх школаў. Была гэта спрыяльная нагода: можна было ня толькі атрымаць бясплатнае ўтрыманьне на цэлы месяц, паглыбіць здабытыя хатнім спосабам веды ў галіне беларусазнаўства, але і пашырыць знаёмствы, кантакты. Дарэчы, для гэтага былі адпаведныя падставы, паколькі Браніслаў раней настаўнічаў. Такім чынам ён паступіў на гэты курс, які працягваўся чатыры тыдні і закончыўся на пачатку верасьня.

Аб гэтым цікавым мерапрыемстве мне не вядомыя ніякія друкаваныя матэрыялы, у сувязі з чым давялося абмежавацца наступнымі крыніцамі: захаванай у сямейным архіве фатаграмай "Беларускія Вучыцельскія Курсы ў Вільні 1919" і ўспамінамі Веры Карчэўскай (тады Матэйчук), запісанымі ў 1979 г. у Супрасьлі.

Кіраўніком курсаў быў лідэр тагачаснай Беларускай народнай партыі Янка Станкевіч, які адначасова выкладаў беларускую мову і ўжо тады "славіўся" сваім наватарствам у галіне мовазнаўства (на гэта паказвае, між іншым, правапіс прозьвішчаў курсантаў). Першыя крокі ў галіне беларускай літаратуры рабіў тут Максім Гарэцкі, які карыстаўся хіба найбольшай папулярнасьцю і сымпатыяй курсантаў. Выкладчыкам гісторыі Беларусі быў Вацлаў Ластоўскі — вядомы дзяяч беларускіх сацыялістаў–рэвалюцыянэраў (эсэраў), пазьнейшы старшыня эміграцыйнага ўраду БНР у Коўне і сакратар Беларускай Акадэміі Навук у Менску. Іншыя прадметы выкладалі А. Дмахоўскі, К. Дуж–Душэўскі, Ждановіч (тэатар), М. Мараўская (псыхалёгію), Кахановіч, Н. Ласковіч. Частка гэтых выкладчыкаў працавала пазьней у Віленскай беларускай гімназіі, якая арганізавалася ўвосень 1919 г.

На памяткавай фатаграме зьмешчаны здымкі 109 курсантаў. Былі гэта пераважна маладыя людзі з розных ваколіц заходняй часткі Беларусі, піянэры беларускага школьніцтва. Сярод іх знаходзім некалькі вядомых постацяў, як, напрыклад, Івана Бялькевіча, пазьнейшага лінгвіста і аўтара "Краёвага слоўніка ўсходняй Магілёўшчыны", Веру Матэйчук і яе сястру Аўгіню — удзельніц антыпольскага паўстанчага руху на Беласточчыне ў 1921—1922 гг., а таксама Ўладзіслава Казлоўшчыка, аўтара некалькіх зборнікаў паэзіі, пазьнейшага дзеяча Партыі беларускіх нацыянал–сацыялістаў і рэдактара "Беларускай газэты", якая выдавалася ў Менску ў час нямецкае акупацыі 1941—1944.

Гэты настаўніцкі курс быў ня толькі месцам павышэньня пэдагагічных кваліфікацыяў настаўнікаў, але і своеасаблівай школай грамадзкіх дзеячоў, а нават партыйнай "біржай". Найбольшую актыўнасьць праяўлялі тут эсэры (Ластоўскі, Дуж–Душэўскі і іншыя), дзейнічалі народнікі, хадэкі. Усе гэтыя партыі імкнуліся пашырыць свае ўплывы на настаўнікаў, з чым спалучаліся іх надзеі на разьвіцьцё дзейнасьці на вёсцы.

А цяпер некалькі слоў пра курсанта Браніслава Туронка. Цытуем успамін Веры Матэйчук, пазьнейшай Карчэўскай:

> Туронак быў вясёлы, не прапускаў ніводнай танцавальнай вечарынкі. Нечым адрозьніваўся ад іншых. Заўсёды любіла зь ім гаварыць. Сымпатычны быў. Мяне тады ўжо моцна пацягнула рэвалюцыйная дзейнасьць, была вялікай энтузіясткай Ластоўскага і яго ідэалёгіі. Крыху агітавала і Туронка, але ён не выказваў ніякага зацікаўленьня гэтым кірункам.

Здаецца, што ніякага асаблівага зацікаўленьня не праяўляў Браніслаў і іншымі "кірункамі" і не ўлучаўся ні ў якую партыйную працу. Паводле Веры Матэйчук, не прапагандаваў нават Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыі, чаго можна было спадзявацца, беручы пад увагу ягоную ранейшую і пазьнейшую дзейнасьць. Праўдападобна, больш вузкапартыйных праграмаў цаніў агульнанацыянальную плятформу і практычную дзейнасьць, накіраваную на ўмацоўваньне ў народных масах нацыянальнае сьвядомасьці. Безь яе любы прагрэс мог адбывацца толькі на карысьць польскіх або расейскіх інтарэсаў.

На Віленскім унівэрсытэце

Якраз у летнія месяцы 1919 г. адбывалася падрыхтоўка да адчыненьня Віленскага ўнівэрсытэту, які быў зачынены расейскімі ўладамі яшчэ ў 1832 г. Між іншым, праводзілася рэгістрацыя кандыдатаў на студэнтаў. Браніслаў вырашыў паступіць на мэдыцынскі факультэт.

У студэнцкай асабовай папцы Браніслава Туронка, якая захоўваецца ў Цэнтральным Дзяржаўным архіве Літоўскай ССР, знойдзены "Апытальнік для кандыдатаў на студэнтаў", запоўнены Браніславам 4–га жніўня 1919 году. Гэтая дата сьведчыць аб тым, што, паступаючы на настаўніцкі курс, ён меў ужо іншыя намеры, чым праца ў школе. Такім

чынам, акрамя агульнай падрыхтоўкі ў галіне беларусаведы, курс даваў Браніславу магчымасьць афармляць на месцы ўсе неабходныя справы, зьвязаныя з паступленьнем на ўнівэрсытэт. У апытальніку Браніслаў падаў крыху дадзеных аб сваім матэрыяльным становішчы. Між іншым акрэсьліў свае гадавыя расходы на суму 5000 марак, заўважыў, што яго ўласныя сродкі недастатковыя для пакрыцьця гэтых расходаў, выказаў жаданьне атрымаць стыпэндыю і месца ў інтэрнаце.

26 верасьня 1919 г. Браніслаў злажыў фармальнае прашэньне і неўзабаве быў ужо студэнтам. 22 кастрычніка атрымаў індэкс Віленскага ўнівэрсытэту № 00012. Як успамінае мама, ён меў студэнцкую легітымацыю № 6. Такім чынам, Браніслаў Туронак быў адным зь першых студэнтаў адноўленага ўнівэрсытэту.

Так пачаліся студэнцкія гады Браніслава. Праходзілі яны ў складаных палітычных умовах. Першы курс студыяў адбываўся ва ўмовах польскай улады (1919/20). У палове ліпеня 1920 г. Вільню заняла Чырвоная Армія, а ў жніўні места было перададзена Летуве[8]. Пасьля "цуду над Віслаю" (15.08.1920) пачаўся новы наступ польскіх войскаў, якія пакуль што Вільні не чапалі. У кастрычніку 1920 г. быў інсцэнаваны "бунт" Жэлігоўскага, войскі якога занялі Вільню (09.10.1920) і абвясьцілі яе сталіцай Сярэдняй Літвы — "дзяржавы", якая складалася з трох паветаў. На пачатку 1922 г. Вільня была далучаная да Польшчы[9].

Усе гэтыя зьмены ня мелі істотнага ўплыву на ход унівэрсытэцкіх заняткаў. Можа, толькі восеньню 1920 г. пачаліся яны зь невялікім спазьненьнем. Потым становішча стабілізавалася, і Браніслаў вучыўся бязь ніякіх перапынкаў. Поўны курс мэдыцынскага факультэту закончыў летам 1924 году.

Незайздросным было матэрыяльнае становішча студэнта Туронка, якое пасьля сьмерці бацькі ў 1920 г. значна пагоршылася. Канікулы праводзіў у Янопалі працуючы на гаспадарцы. Ад сям'і атрымоўваў саматканую вопратку і бялізну, харчовыя прадукты (перш за ўсё мяса), крыху грошай. У Вільні займаўся карэпэтыцыямі, паколькі стыпэндыі не атрымоўваў. Стала адчуваў нястачу грошай і эканоміў іх на чым толькі мог, нават на чыгуначных білетах. Аднойчы прыйшоў зь Вільні ў Янопаль пехатой — гэтую адлегласьць (каля 200 км) "адмахаў" у чатыры дні.

У час вучобы пражываў у прыватных кватэрах, за што плаціў часткова грашыма, а часткова сушанымі баравікамі. Вось некалькі ягоных тагачасных адрасоў: 4 жніўня 1919 г. жыў на Дабрачынным завулку (цяпер Лабдару), № 2а, кв. 7; у кастрычніку 1919 г. — на Набярэжнай вуліцы (цяпер Пажэлас), № 12, кв. 6; будучы на трэцім курсе, вясной 1922 г., жыў на вуліцы Скапоўка, 9, кв. 9; а ў лютым 1924 г. — на Львоўскай, 12, кв. 2.

Пасьля заканчэньня ўнівэрсытэту і двухгадовай практыкі Б. Туронак атрымаў урэшце дыплём доктара лекарскіх навукаў. З гэтай нагоды "Сялянская Ніва" зьмясьціла 11 ліпеня 1926 г. наступную інфармацыю:

> У суботу 3 ліпеня с.г. у аўлі калюмновай Віленскага ўнівэрсытэту адбылася прамоцыя на доктара ўсіх лекарскіх навук рэдактара "Крыніцы", а цяперашняга супрацоўніка "Biełaruskaj Krynicy" Браніслава Туронка.

Пасьлядыплёмны стаж адбываў Браніслаў у "Літоўскай клініцы" на Віленскай вуліцы пад кіраўніцтвам доктара Лігейкі. Афіцыйны дазвол на выконваньне лекарскай практыкі атрымаў 17 траўня 1927 г., пасьля чаго ў гэтай жа клініцы працаваў да вясны 1928 году.

[8] Перадача бальшавікамі Вільні літоўцам адбылася згодна з умовамі савецка-літоўскай дамовы ад 12 ліпеня 1920 г. — *А.П.*

[9] Вільня была афіцыйна далучаная да Польшчы 20 лютага 1922 г. пасьля адпаведнае пастановы Віленскага сойму. Фармальнае ж прызнаньне гэтага акту з боку Лігі нацыяў адбылося толькі 15 сакавіка 1923 г. — *А.П.*

Беларускі Студэнцкі Саюз

Як паведамляў "Наш Шлях"[10], Беларускі Студэнцкі Саюз (БСС) пры Віленскім унівэрсытэце быў арганізаваны ў сьнежні 1921 г. перад самымі калядамі, а яго нармальная дзейнасьць пачалася ў студзені 1922 г. У гэты час Браніслаў быў на трэцім курсе мэдыцыны.

Задума стварыць беларускую студэнцкую арганізацыю пры Віленскім унівэрсытэце ўзьнікла крыху раней. Паводле цытаванага "Нашага Шляху"[11], яшчэ ў 1920/21 навучальным годзе студэнты беларусы пачалі думаць аб сваёй арганізацыі. Было праведзена некалькі сходаў, на якіх быў апрацаваны статут арганізацыі пад назовам "Гурток Студэнтаў Беларусаў". Аднак атрымалася затрымка з зацьверджаньнем статуту, які да канца гэтага акадэмічнага году ня быў перададзены на паседжаньне ўнівэрсытэцкага сэнату.

Восеньню 1921 г. быў апрацаваны новы статут арганізацыі, якая гэтым разам атрымала новы назоў — "Саюз Студэнтаў Беларусаў". Крыху пазьней быў выбраны Выканаўчы камітэт студэнтаў, заданьнем якога былі стараньні аб зацьверджаньні статуту. Далейшая працэдура адбывалася бязь цяжкасьцяў, і ў сьнежні 1921 году статут быў зацьверджаны ўнівэрсытэцкім сэнатам. У склад першай управы Саюзу, выбранай на арганізацыйным сходзе, уваходзілі студэнты-мэдыкі: Антон Абрамовіч (старшыня), Тодар Куніцкі (сакратар), Браніслаў Туронак (скарбнік), С. Малафееў і С. Грынкевіч (сябры ўправы). Пры БСС былі арганізаваныя культурна-асьветная, выдавецкая і навуковая сэкцыі, а таксама бібліятэка-чытальня.

Значную ролю ў заснаваньні і дзейнасьці Беларускага Студэнцкага Саюзу адыграў Браніслаў Туронак, на што паказваюць ягоныя пасьмертныя біяграфіі ў "Chryścjanskaj Dumcy"[12] і "Шляху Моладзі"[13], а таксама ўспаміны ягоных калегаў-мэдыкаў і актыўных дзеячоў БСС — Міколы Марцінчыка і Францішка Пяткевіча, дасланыя аўтару 12 верасьня і 3 кастрычніка 1978 г. Ужо ў першыя свае студэнцкія гады ён гуртаваў вакол сябе студэнтаў Віленскага ўнівэрсытэту, зь якіх пасьля арганізаваўся Беларускі Студэнцкі Саюз. Акрамя працы ў яго ўправе, Б. Туронак быў адказным рэдактарам органа БСС — месячніка "Наш Шлях", выпуск якога пачаўся ў сакавіку 1922 г.

Узьнікае істотнае пытаньне: адкуль у небагатых студэнтаў былі сродкі на выдаваньне свайго часапіса? У гэтай сувязі цікавую і важную інфармацыю падае сам "Наш Шлях" (№ 2—3) у выглядзе наступнага сьпісу ахвярадаўцаў (у польскіх марках):

Знамяроўскі — 10 000, кс. Германовіч — 5000, кс. Станкевіч — 1000, кс. Жук — 1000, Тарашкевіч — 1000, Лупкевіч — 1000, Латышонак — 1000, Грынкевіч — 1000, Дзімітрыеў — 650, Красінскі — 500, Пяткевіч — 500, Туронак — 200, Абрамовіч — 100, Русецкая — 100 і тры невядомыя асобы — 400. Разам: 23 450 м.

З гэтага бачым, што асноўную ролю ў фінансаваньні выпуску "Нашага Шляху" адыгрывалі ахвяраваньні Знамяроўскага — тагачаснага рэдактара хадэцкай "Крыніцы" і ксяндзоў Германовіча, Станкевіча і Жука. Разам яны складалі 17000 польскіх марак, г.зн. амаль 75% усіх ахвяраваньняў. Адсюль няцяжка зразумець, што матэрыяльнай базай "Нашага Шляху" была беларуская хадэцыя, а ідэйна-палітычным дыспанэнтам часапіса быў яе лідэр, кс. Адам Станкевіч.

Гэтая акалічнасьць, відаць, абумовіла і тую "значную ролю", якую Туронак граў у БСС і яго ўправе. Таксама яна паказвае на тое, што ранейшае яго знаёмства з кс. А. Станкевічам набывала ўжо канкрэтны характар і выражалася ў цесным супрацоўніцтве. Усё ж Б. Туронак ня быў тады, прынамсі фармальна, сябрам БХД, на што паказвае

[10] Наш Шлях. 1922. № 2—3. Красавік—травень. С. 25.

[11] Тамсама. 1922. № 1. Сакавік.

[12] Chryścjanskaja Dumka. 10.10.1938.

[13] Шлях моладзі. 1938. 26 кастрычніка.

сьведчаньне М. Марцінчыка аб яго беспартыйнасьці.

Факт, што за сьпінай "Нашага Шляху" стаяла БХД, дазваляе меркаваць, што яна і была асноўнай крыніцай інсьпірацыі арганізатараў Студэнцкага Саюзу. Аб гэтым сьведчыць перш за ўсё агульнанацыянальная і культурна–асьветніцкая плятформа БСС, а таксама яе адмоўнае стаўленьне да вузкапартыйнай дзейнасьці. "Наша арыентацыя, — пісаў "Наш Шлях" у № 2—3, с. 23, — гэта не арыентацыя на Польшчу, Расею, Летуву ці кагось іншага, а на беларускі народ". Дзеля гэтага вясной 1922 г. БСС і яго орган вымушаны былі адбіваць атакі палянафільскай "Краёвай Сувязі" П. Алексюка, а таксама газэты "Беларускі Звон", якую выдаваў Францішак Аляхновіч.

На падставе хронікі, зьмешчанай у № 2—3 "Нашага Шляху", можна атрымаць поўнае ўяўленьне аб напрамках працы БСС у вясеньнія месяцы 1922 г. Найбольшую ўвагу ўправы і актыву прыцягавала: выдаваньне свайго часопіса, рэпрэзэнтацыя БСС навонкі, арганізацыя штотыднёвых публічных лекцыяў, а таксама экскурсіяў і вечароў мастацкае самадзейнасьці.

Між іншым, 25 траўня 1922 г. БСС наладзіў у Вільні вечар у сувязі з прыездам сына А. Міцкевіча — Уладзіслава, а 28 траўня — лекцыю кс. А. Станкевіча "Гістарычныя пачаткі Беларусі і яе самабытнасьць". 28 траўня ў залі Беларускага музыкальна–драматычнага гуртка адбылася вечарына з пастаноўкай "Лесу" Караленкі і выступленьнем беларускага хору пад кіраўніцтвам Альбіна Стэповіча. На 4—5 чэрвеня 1922 г. плянавалася экскурсія–маёўка ў Трокі ("з удзелам старэйшага грамадзянства і калегаў палякоў").

Значную цікавасьць выклікае наступнае паведамленьне "Нашага Шляху"[14]: "16 красавіка г.г. была дэлегацыя (кал. Абрамовіч і Пяткевіч) ад Саюзу ў начальніка Польскае дзяржавы Я. Пілсудзкага. Начальнік Гаспадарства надта цікавіўся працай нашага Саюзу, а асабліва выдавецтвам часопісі, каторую прасіў прысылаць".

Аб гэтай візыце М. Марцінчык напісаў наступнае[15]:

> Антон Абрамовіч і Франук Пяткевіч у 1923 годзе, паколькі я памятаю (памылка — павінна быць у 1922 г. — *Ю.Т.*), хадзілі на аўдыенцыю да Ю. Пілсудзкага. Аб чым яны гутарылі, я ня ведаю. Яны хадзілі самачынна. Ніхто аб гэтым ня ведаў. І ні перад кім яны не адлічваліся. Гэта былі людзі экстравагантныя — кожны ў сваім стылі і таму зрабілі такую вылазку.

Як бачым, абедзьве інфармацыі супярэчлівыя. Відаць, аднак, гэтая візыта не была толькі "вылазкай", калі "Наш Шлях" акрэсьліў яе як "дэлегацыю ад Саюзу". Таксама малапраўдападобна, што "ніхто аб гэтым ня ведаў", паколькі аб візыце ў Пілсудзкага паведамлялася ў друку. Справа цікавая і няясная, а яе разгадка чакае свайго дасьледчыка. Нельга, аднак, выключыць і такую магчымасьць, што Марцінчык спрабаваў крышку "паправіць" гісторыю, між іншым, з увагі на сваю пазьнейшую дзейнасьць у Грамадзе.

З "Нашым Шляхам" супрацоўнічалі Натальля Арсеньнева, Мікола Марцінчык, Зоська Верас, С. Радзіміч, С. Дрыгуновіч, Л. Леўскі, П. А., Франук Маркотны і іншыя. Пад мянушкай Зоська Верас выступала вядомая Людвіка Сівіцкая–Войцікава. Псэўданімам Франук Маркотны або Ф.М. паслугоўваўся Францішак Пяткевіч[16], а Б. Туронак, паводле няпэўных вестак, пісаў пад псэўданімам С. Радзіміч.

З пачаткам чэрвеня 1922 г. рэдакцыя "Нашага Шляху" перайшла на Віленскую, 12. Раней яна зьмяшчалася на вуліцы Біскупскай, 12. Вясною 1923 г. часопіс перастаў выходзіць. Ці паўплывала на тое партыйная барацьба, ці іншыя прычыны — пакуль што невядома.

Аднак БСС працягваў сваю дзейнасьць. Як паведамляла газэта "Змаганьне"

[14] Наш шлях. 1922. № 2—3. Красавік–травень. С. 26

[15] Ліст да аўтара ад 12.09.1978.

[16] Тамсама.

(25.02.1923), 18 лістапада 1923 г. адбыўся агульны сход студэнтаў беларусаў Віленскага ўнівэрсытэту, які выбраў новую ўправу Студэнцкага Саюзу ў наступным складзе: І. Лабанец (старшыня), А. Зянюк (намесьнік старшыні), Т. Куніцкі (сакратар), Б. Туронак (скарбнік) і М. Марцінчык (сябра ўправы). Адначасова была выбраная рэвізійная камісія, у якую ўвайшлі: Вера Тарашкевіч, Альбін Стэповіч і П. Трэмбовіч.

На заканчэньне яшчэ два выказваньні М. Марцінчыка:

> Сьпярша Беларускі Студэнцкі Саюз меў напрамак і думкі, калі можна так сказаць, як і ўсё жыцьцё беларускае, — агульнабеларускі, дбаючы аб грамадзкім, нацыянальным і культурным разьвіцьці беларусаў, дбаў аб разьвіцьці нацыянальнай сьвядомасьці шырокіх пластоў народу, дбаў аб разьвіцьці беларускіх школаў, дабрабыту. Пасьля Студэнцкі Саюз пахіліўся ўправа...[17].
>
> Як я паступіў на першы курс мэдыцыны, то ён (Б. Туронак. — *Ю.Т.*) быў на трэцім курсе мэдыцыны — значыць мы разам вучыліся і разам былі ў Беларускім Студэнцкім Саюзе. Гэта быў чалавек дадатні ў кожным сэнсе: сьвядомы беларус, апалітычны, спакойны, беззаганны сябра, культурны, працавіты. Ён добра вучыўся і, лічыць, кожны дзень быў у памешканьні Студэнцкага Саюзу. Адным словам, калі б усе людзі былі як с.п. Браніслаў Туронак, то быў бы рай на зямлі[18].

З рапартаў польскай контравыведкі

Ніжэй прыведзена інфармацыя, зьмешчаная ў выдадзенай у студзені 1928 г. польскім Генэральным Штабам справаздачы "Krótki zarys zagadnienia białoruskiego" (захоўваецца ў Бібліятэцы Варшаўскага ўнівэрсытэту, сыгнатура 324176 сім), была для мяне ашаламляльнай і амаль неверагоднай. Усё ж нельга абысьці яе маўчаньнем, паколькі яна знайшла адлюстраваньне ў рапарце славутай "Двойкі" (С. 264—266). Падаем яе зь невялікімі скарачэньнямі ў перакладзе на беларускую мову:

> У лютым 1924 г. у Менску паўстаў Беларускі Рэвалюцыйны Камітэт у выніку зьезду, на якім эсэры аб'ядналіся з камуністамі.
>
> Мэтай Беларускага Рэвалюцыйнага Камітэту было імкненьне арганізаваць узброенае паўстаньне на польскай Беларусі, адарваць ад Польшчы абшары па Буг і Нарву і далучыць іх да Савецкай Беларусі.
>
> Кіроўны цэнтар Беларускага Рэвалюцыйнага Камітэту знаходзіўся ў Менску. У яго склад уваходзілі: Бердні́к, Бадунова, Хануцкі, Дабаль, Каліноўскі, Кароль, Мамонька, Асьвенцімскі, Пашкевіч (старэйшы), Хмара-Разумовіч, Шолкаў і Трафімаў. Дэлегатамі ад Заходняй Беларусі былі: Касьцевіч Макар, Козіч, Лагіновіч, Мятла Пётар, Родзевіч, Русак і Жылка.
>
> Арганізацыя змагла пакрыць сеткай сваіх "ячэек" Віленшчыну і Наваградчыну. У Віленскім ваяводзтве асабліва значна яна разьвілася ў Дунілавіцкім, Дзісенскім, Ашмянскім, Вялейскім і Валожынскім паветах.
>
> Беларускі Рэвалюцыйны Камітэт стварыў тэрарыстычныя атрады, арганізаваў на тэрыторыі Савецкай Беларусі дывэрсійна-паўстанчыя банды, якія, паводле дырэктываў зь Менску, нападалі на польскія пагранічныя заставы, маёнткі і г.д. Апрача таго, праектавалася ўзрываньне мастоў, нішчэньне чыгункі і г.д.
>
> Апрацоўваючы плян паўстаньня, было падумана і аб афіцэрскіх кадрах. Яны мелі рэкрутавацца зь беларусаў — сяброў Беларускай Вайсковай Камісіі і былой Слуцкай брыгады, афіцэраў Войска Польскага і іншых. На першы кліч усе гэтыя афіцэры мелі адправіцца ў акрэсьленыя мясцовасьці і ўзяць камандаваньне над паўстанчымі аддзеламі. Разам з афіцэрамі-беларусамі мела пакінуць Войска Польскае значная колькасьць салдатаў-беларусаў.

[17] Тамсама.

[18] Зь ліста М. Марцінчыка да Людвікі Войцікавай, якая пераслала мне гэтую цытату 10.06.1978 г.

Праектаваліся напады з тэрыторыі Літвы, Савецкай Беларусі і нават Латвіі. Апрача таго, беларусы скантактаваліся з украінскімі паўстанчымі атрадамі. Узбраеньне і ваенныя матэрыялы мелі пастаўляцца з СССР і Нямеччыны.

Як было ўстаноўлена, у паўстаньні мелі ўдзельнічаць наступныя афіцэры: Анусевіч, Бендрык, Бернік, Бандарчук, Булыгін, Гаўрыловіч, Андрэй Якубецкі, палкоўнік Езавітаў, Канапелька, Каршун, Корзун, Касьцевіч, Машчынскі, Навумовіч, Новікаў, Ян Пашкевіч, Плескачэўскі, Пракаповіч, Міхал Русак, Канстанцін Сак, Сарока, Сыманенка, Шклярэўскі, Сьвятагор–Штэпін і Браніслаў Туронак.

У канцы красавіка 1924 г. арганізацыя была выкрытая польскімі адміністрацыйнымі ўладамі.

Дык наколькі гэтая інфармацыя польскай контравыведкі адпавядала рэчаіснасьці? Як паказваюць пасьляваенныя распрацоўкі беларускіх гісторыкаў, агульнае становішча польскі Генэральны Штаб ацэньваў даволі правільна[19]. Цяжка затое сказаць што–небудзь пэўнае аб арганізатарах і ўдзельніках праектаванага паўстаньня, а ў іх ліку і пра Браніслава Туронка. Яго сувязі з БХД хіба не стаялі на перашкодзе, тым больш, што палітычны аўтарытэт Савецкай Беларусі дасягаў тады свайго апагею. Праўда, Туронак не служыў у арміі і афіцэрам ня быў, але ня можна выключыць, што як студэнт пятага курсу мэдыцыны намячаўся арганізатарам санітарнай службы.

Усё гэта, вядома, толькі здагадкі, якія яшчэ ні аб чым ня сьведчаць. Нельга выключыць і таго, што прозьвішча Туронка ў гэтым афіцэрскім сьпісе знайшлося выпадкова, што нейкі інфарматар "Двойкі" проста перастараўся. Усё ж, відаць, ён ня быў цалкам "чысты", аб чым можна меркаваць з наступнага даручэньня, якое ў 1924 г. атрымаў пастарунак паліцыі ў Германавічах: "Устанавіць месца пражываньня Браніслава Туронка". Гэтая запіска захоўваецца ў актах судовай справы Туронка ў Цэнтральным Дзяржаўным архіве Літоўскай ССР.

Судовыя справы рэдактара "Крыніцы"

На пятым курсе ўнівэрсытэцкіх студыяў дыяпазон грамадзкай дзейнасьці Браніслава Туронка пашырыўся. Як ужо заўважалася, 18 лістапада 1923 г. ён увайшоў у склад новай управы Беларускага Студэнцкага Саюзу, а некалькі дзён раней быў выбраны сакратаром Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, дзе старшынём быў кс. А. Станкевіч[20].

У сьнежні 1923 г. Б. Туронак стаў адказным рэдактарам "Крыніцы", якім да гэтага часу быў У. Знамяроўскі. Першы нумар "Крыніцы", які быў падпісаны да друку рэдактарам–выдаўцом Б. Туронкам (№ 15), выйшаў 10 сьнежня 1923 году, а апошні № 35—23

[19] Сапраўды, большасьць матэрыялаў польскай выведкі адзначаюцца даволі глыбокім аналізам агульнай сытуацыі і, што ня менш істотна, грунтоўным веданьнем фактычнага боку справы. Аднак жа нярэдка ў бягучых справаздачах і аналітычных распрацоўках II аддзелу Генэральнага штабу сустракаюцца і пэўныя недакладнасьці па прычыне атрыманьня першаснай інфармацыі зь неймаверных крыніцаў. Мяркуючы па характары пададзенай Аўтарам інфармацыі пра Беларускі Рэвалюцыйны Камітэт, яна была, хутчэй за ўсё, атрыманая II аддзелам ад кагосьці з уласных канфідэнтаў. Трэба мець на ўвазе, што апошнія не заўсёды добрасумленна выконвалі даручаныя ім заданьні і часам сьвядома дэзынфармавалі сваё начальства. Найбольш характэрнай у гэтым сэнсе выглядае сытуацыя з працай на II аддзел Генэральнага штабу вядомага беларускага дзеяча Вячаслава Адамовіча (Дзергача). Інфармацыю пра прыдуманую ім антыпольскую арганізацыю "Камітэт чыну" Дзергачу ўдавалася пасьпяхова прадаваць польскім спэцслужбам на працягу некалькіх гадоў (падрабязьней гл.: Пашкевіч А.В., Чарнякевіч А.М. Атаман Дзяргач: невядомыя старонкі біяграфіі, ці Да гісторыі палітычнага авантурызму ў беларускім нацыянальным руху // Берасцейскі хранограф. 2004. Вып. 4. С. 314—334). — *А.П.*

[20] Змаганьне. 1923. 8 лютага.

жніўня 1925 г. Такім чынам, у гэтай рэдакцыі працаваў ён 1 год і 8 месяцаў.

"Крыніца" прызначалася ў асноўным для беларусаў–каталікоў. Яна лічылася органам беларускай хадэцыі, аднак рэдакцыя не падкрэсьлівала партыйнасьці сваёй газэты. Замест гэтага ў падзагалоўку падавалася: "Тыднёвая сялянская газэта". Выдавалася з 1917 г. пачаткова ў Петраградзе і ў Менску, а з 1919 г. — у Вільні. Друкавалася лацінкай. Рэдакцыя зьмяшчалася пры вуліцы Завальнай, 7. Шырэй гісторыю "Крыніцы" прывёў А. Станкевіч[21].

"Крыніца", падобна як усе віленскія беларускія газэты, была мерапрыемствам дэфіцытным і патрабавала грашовае дапамогі. Субсыдыявалася яна часткова беларускімі ксяндзамі, якія працавалі ў Заходняй Беларусі, і часткова — эміграцыйным урадам Ластоўскага ў Коўне[22].

Як казала цётка Антаніна, да працы ў "Крыніцы" Браніслава заангажаваў ксёндз Адам Станкевіч. Мама лічыла, што ён быў толькі фармальным "зіцрэдактарам" (рэдактарам для адседкі), які адказваў перад уладамі за зьмест тыднёвіка. Магчыма, за гэтае рэдактарства Браніслаў атрымоўваў крыху грошай, якімі латаў свой студэнцкі бюджэт. Аднак акрамя "зіцрэдактарства" Б. Туронак займаўся і публіцыстыкай, зьмяшчаючы ў "Крыніцы" свае матэрыялы пад псэўданімам "Тамашні".

Аб умовах працы Туронка як рэдактара "Крыніцы" красамоўна сьведчыць наступны факт: зь ліку 20 нумароў падпісаных ім да друку, польскія ўлады канфіскавалі 9, зь якіх у 1924 г. — 4 і ў 1925 г. — 5[23]. У 1924 г. ён быў упершыню прыцягнуты да судовай адказнасьці за рэдагаваную газэту. Гэтым разам справа закончылася толькі грашовым штрафам.

У 1926 г. значна павялічыліся канфлікты паміж "Крыніцай" і ўладамі, якія мелі сур'ёзнае значэньне як для самой газэты, так і для яе рэдактара. Адбываліся яны на фоне змаганьня за беларускую мову ў касьцельных набажэнствах у Жодзішках. Генэзу гэтае справы прывёў Адам Станкевіч у сваёй кніжцы "Родная мова ў сьвятынях", (Вільня, 1929. С. 153—162), якая перадаецца тут у вялікім скарачэньні[24]:

> У 1921 годзе пробашчам парафіі ў Жодзішках быў назначаны кс. Вінцук Гадлеўскі. Пазнаўшы сваю парафію, якая ў велізарнай большасьці была беларуская, 7 верасьня 1924 г. пачаў ён гаварыць казаньні на беларускай мове. Паводле А. Станкевіча, "сярод народу з казаньняў у роднай мове было задаволеньне неапісанае. Касьцёл заўсёды быў біткам набіты. Былі толькі нездаволены кругі дворскія і ўрадавыя. У выніку гэтага палітычнага нездаволеньня Дэлегат польскага ўраду ў Вільні зьвярнуўся да біскупа Матулевіча, каб спыніць шкодную, як казаў, для Польшчы дзейнасьць кс. В. Гадлеўскага".

Пачалася перапіска паміж кс. Гадлеўскім і бп. Матулевічам, у выніку якой біскуп паслаў у Жодзішкі камісію, якая павінна была на месцы дасьледаваць справу. У склад камісіі ўваходзілі тры ксяндзы–палякі. Не была яна аб'ектыўнай. Адначасова польская паліцыя пачала адпаведную "апрацоўку" ксяндза Гадлеўскага. На працягу 1925 г. ён быў арыштаваны двойчы: у чэрвені і ў верасьні, а ў сакавіку 1926 г. ён быў прысуджаны да двухгадовага турэмнага зьняволеньня.

У красавіку 1925 г. названая камісія прыбыла ў Жодзішкі для правядзеньня плебіс-

[21] Беларускі Хрысьціянскі Рух. Вільня, 1939. С. 211—219.

[22] Гл.: Krótki zarys zagadnienia białoruskiego. С. 167.

[23] Беларускі Хрысьціянскі Рух. С. 216.

[24] Падрабязьней пра разьвіцьцё жодзіскае справы можна даведацца з наступных публікацыяў: Zatarg o język kazań w Żodziszkach w kwietniu 1925 roku (dokumenty wybrał i opracował J. Tomaszewski) // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 1996. № 1(5). S. 123—164; Zatarg o język kazań w Żodziszkach, cd. (dokumenty wybrała i opracowała M. Moroz) // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 1998. № 10. S. 124—165". — *А.П.*

…сыту. Гэтую падзею апiсаў Б. Туронак у артыкуле "Праўда аб Жодзiшках" ("Тамашнi"), як наступае:

Праўда аб Жодзiшках[25]

Як чуваць, нашае жодзiснае галасаваньне, адбытае 25.IV. нарабiла многа шуму. Аб iм гаворыцца ня толькi ў Польшчы, але i загранiцай. Усе iнтэрэсуюцца прабуджаючымся да новага жыцьця беларускiм народам i прыглядаюцца зь вялiкай увагай да ўсiх рухаў, якiя сьведчаць аб новым жыцьцi нашага народу.

Але ўсе весткi, якiя мне давялося чытаць у газэтах, вельмi былi раптоўны, не спраўджаны — i дзеля гэтага мне прыходзiцца узяць за пяро, каб высьвятлiць праўду i паказаць на факты, каторыя могуць памагчы ў досьледах гэтай праўды.

Вось–жа, як толькi былi ўведзены ў Жодзiшны касьцёл беларускiя навукi адразу яны здабылi сабе вялiкую папулярнасьць. Людзi ня толькi з сваеей парахвii, але i чужых (часам нават вельмi далёкiх) прыходзiлi, каб паслухаць навуку ў роднай мове, або пачуць беларускую рэлiгiйную песьню.

Навука ў роднай мове i песьнi рабiлi на нiкаторых вялiкае ўражаньне — i яны вярнуўшыся да хаты расказвалi аб усiм што вiдзелi i чулi. Пры гэтым казалi: "мы думалi, што з нашай мовай сапраўды нiкуды ня можна паказацца, а тымчасам як запяюць песьню ў роднай мове, то так бярэ за сэрца, што аж плакаць хочацца". I сапраўды, нiкаторыя плакалi, асаблiва пачуўшы песьню "Матачка Божая", або "О мой Божа, веру Табе". Гэтае ўсё рабiла вялiкi розгалас па ўсей аколiцы — усе сьпяшылi ў Жодзiшкi, каб самым пераканацца аб праўдзiвасьцi казанага i чутага. Дык народу–ж, народу набралася ў касьцёл — проста як на фэст, або якую вялiкую ўрачыстасьць!

З другога боку польскай навукi нiхто не хацеў слухаць: нi беларусы, бо яна iм абрыдла, нi "палякi", бо яны разумеючы па беларуску (а праўду кажучы i самi беларусы, толькi прыкiдаюцца палякамi) ужо не хацелi слухаць навукi польскае. Затым i аставалася на навуцы польскай асоб ня больш як 20—30. А праўдзiвыя палякi, як паны, палiцыя i вучыцялi з рэлiгiяй нiколi ня мелi да чыненьня, то iх не было нi на беларускай, нi на польскай навуцы.

Гэтак не магло доўга цягнуцца, бо трудна ж было гаварыць да пустых сьцен (на першы дзень Вялiкадня гэтага году асталася на польскую навуку толькi адна кабета), дык была вызначана Вiленскiм Бiскупам адумысловая камiсiя, каторай было даручана дасьледзiць на месцы i аб усiм данясьцi Бiскупу. (Рабiць галасаваньне цi плебiсцыт ей даручана не было). Камiсiя была моцна аднастаронная, бо складалася з адных палякоў i нават замаскаваных эндэкаў, як напр.Сьвiрскi дзекан, або пробашч з Данюшава. Але i гэтая камiсiя перад многiмi дзiвiлася, што справа *беларуская*, а ў камiсii няма нiводнага беларуса, што саўсiм пярэчыць галоўным падставам такту i справядлiвасьцi. Ды нiчога не парадзiш — калi на гэтую аднастароннасьць была зьвернута ўвага Вiленскага Бiскупа, то прадстаўнiкi беларусаў атрымалi адказ, што ўжо перарабiць ня можна...

Вось–жа гэтая камiсiя прыехаўшы ў Жодзiшкi ўмела ўзялася за работу. Яна была пэўная, што пратэсту ўнутры яе ня будзе — пiсаць можна, што хочаць i рабiць таксама можна што хочаць. Дык назначыла галасаваньне, на цьвiнтары перад касьцёлам. Было абвешчана з амбоны, каб людзi ўжо выходзячы з касьцёла дзялiлiся так: беларусы каб iшлi ўлева ад касьцельных дзьвярэй, а палякi — управа. Людзi гэтак i зрабiлi — i хоць для палякоў была дужа лепшая старана (правая), аднак туды пайшла саўсiм невялiчкая група людзей. Здаецца галасаваньне ўжо адбылося — i камiсii толькi трэба было выйсьцi перад касьцёл i спытацца ў левай стараны, цi яна сапраўды хоча беларускай навукi, а ў правай — цi яна хоча польскай — i справа была–б скончана. Аднак–жа камiсiя паступiла iнакш. Яна на чале з дэканам урэзалася ў самую беларускую гушчу i iзноў прыказала дзялiцца, але ўжо саўсiм наадварот: беларусам падацца ўправа, а палякам улева. Усякi мог дапусьцiць, што пры гэткiм новым пераходжаньнi магло дайсьцi да крыку, пагроз,

[25] Артыкул друкаваўся лацiнкаю. У гэтым тэксьце захоўваюцца ўсе асаблiвасьцi мовы, артаграфii i пунктуацыi арыгiналу.

а мо і чаго большага, бо як ужо пісалася ў "Крыніцы", паны, вучыцялі і шляхта з усей вакругі прыехалі ўваружаныя рэвальвэрамі, выймалі іх і гразілі беларусам. Аднак камісія загадала ізноў пераходзіць...

Калі пры такіх абставінах сапраўды не дайшло да "масакраваньня" і біцьця палякоў, дык у гэтым вялікая заслуга тутэйшага пробашча, каторы ўзьдзяржаў беларусаў ад усялякіх гвалтаў. Бо ўжо пачалі крычаць: "адабраць ад іх рэвальвэры!"... а калі б пачалі адбіраць, то мусіць не памагла б ні паліцыя ні прынесены ею кулямёт... Рэвальвэры і кулямёт падражнілі беларусаў да астатку... З мужчын ніхто не кранууся ні перад кулямётам, ні перад рэвальвэрамі — усе чулі сілу народнай масы... а перад ею нішто не ўстаіць.

А што-ж камісія? Камісія заварыўшы кашу пайшла сабе — і напісала, што было беларусаў 60%, а палякоў 40%. На пратэсты дзекан бясстыдна заяўляў, што нічога яму не перашкаджае напісаць і 100% палякоў! Дык вот якая камісія!..

Але ня ў гэтым уся справа. Галаўнейшае тое, якія скуткі прынясло гэтае галасаваньне? А скуткі для беларусаў вялікія. Беларускі народ можа першы раз у гісторыі апошніх дзён выявіў сваю волю ў касьцельным жыцьці — і выявіў яе так моцна, што водгукі ягонага голасу не даюць спаць публіцыстам з "Дзен. Віль" і ім падобным, (а ўжо гэтая галасьба эндэцкіх газэт можа найлепш сьведчыць аб тым, якая сапраўды была беларуская большасьць пры жодзісьным галасаваньні — што там было беларусаў куды болей за 60%!). Пры гэтым народ зразумеў, што мова ў касьцеле залежыць ад яго волі, а не ад волі польскага духавенства — бо аб гэтай волі прыехала ў яго пытацца аж цэлая камісія... Ізноў-жа народ ясна відзеў, хто хоча і хто стаіць нават з аружжам у руках за мову польскую: паны, падпанкі, шляхта, чыноўнікі, вучыцялі, панскія парабкі і панскія падлізы. А працоўны народ увесь як адзін чалавек стаў за сваю родную, бо зразумеў, што ў гэтым яго лепшая доля.

А яшчэ адзін важны вынік з гэтага галасаваньня — разышлася вестка па ўсей Беларусі, а нават заграніцай, як наш народ змагаецца над кулямётам за свае правы. Гэтая вестка будзіць усіх сыноў Беларускага народу да змаганьня за лепшае жыцьцё, каб змагаючыся за родную *мову* здабыць родную *зямлю і волю*.

Затым-то і змаганьне пашыраецца зь вялікай шпаркасьцю на ўвесь край. Людзі і па другіх парахвіях дзеляцца і арганізуюцца: з аднэй стараны польскія паны і шляхта, а з другой беларускія мужыкі. Хто возьме верх — сказаць лёгка: яго возьме беларуская сярмяжная маса і паставіць свае правы ўсюды: у касьцёле, у гміне, у школе і ўва ўсім краі.

Тамашні

Kryniсa. № 22, 24.5.1925 г., 2—4 стар.

Артыкул "Праўда аб Жодзішках" спаткаўся з зацікаўленьнем ня толькі беларускай і польскай прэсы, але і віленскай паліцыі, якая ў траўні 1925 г. правяла ператрус на кватэры Б. Туронка[26]. За гэты артыкул, па загаду камісара ўраду на места Вільню, быў канфіскаваны адпаведны нумар "Крыніцы"[27]. Праз некалькі дзён у справе гэтай канфіскаты Беларускі Пасольскі Клюб злажыў міністру ўнутраных спраў інтэрпэляцыю ў сойм, да якой быў далучаны цытаваны артыкул[28]. У чэрвені гэтая справа разглядалася Віленскім Акруговым судом, які канфіскату зацьвердзіў. Неўзабаве справай зацікавілася пракуратура. Вось што пісала аб гэтым "Bielaruskaja Kryniсa" 20 верасьня 1925 году:

[26] Беларуская Доля. 1925. № 29.

[27] Крыніца. 25.5.1925.

[28] Далучэньне сканфіскаванага артыкула да тэксту пасольскае інтэрпэляцыі давала магчымасьць абысьці цэнзурныя перашкоды, бо, згодна з польскім заканадаўствам, законна пададзеныя інтэрпэляцыі не маглі канфіскоўвацца ні пры якіх абставінах. Пасьля падачы інтэрпэляцыі тэкст "крамольнага" артыкула зноў зьяўляўся на старонках беларускага друку, маючы ўжо парлямэнцкую недатыкальнасьць. (Крыніца. 31.05.1925) — *А.П.*

Доля "Крыніцы" і яе рэдактара. 17 жніўня па загаду сьледаваццеля III вокругу места Вільні быў арыштаваны рэдактар "Крыніцы" Б. Туронак і пасаджаны ў вастрог на Лукішках. Аб арышце беларускага рэдактара польскія ўлады нават і не пафатыгаваліся паведаміць ані рэдакцыю, ані каго–колечы зь беларусаў. Праз два тыдні аб Б. Туронку нічога не было ведама. Толькі пасьля двух тыдняў супрацоўнікі рэдакцыі "Крыніца" даведаліся дзе знаходзіцца рэдактар.

Пры арышце Б. Туронку было заяўлена, што ён можа застацца на свабодзе, калі заплаце 500 зл. залогу. Грошай не было, дык прышлося сесьці ў турму.

З турмы рэдактар "Крыніцы" напісаў да пракурора просьбу аб зьмяншэньні яму залогу. Калі пасол кс. А. Станкевіч, жадаючы дапамагчы рэд. Туронку, зьявіўся ў суд і прасіў яго таксама аб зьмяншэньні залогу, дык суд залог гэты замест зьменшыць павялічыў да... тысячы злотых.

Жаданыя грошы, дзякуючы добрым людзям, знайшліся і былі ўнесены, а Б. Туронак застаўся да суду на свабодзе. (Адначасова ён быў адданы пад нагляд паліцыі, аб чым паведамляла "Chryścjanskaja Dumka". 10.10.1938. — *Ю.Т.*) За ім лічыцца да дзесяцёх спраў за розныя стацьці ў розных нумарох "Крыніцы" за два апошнія гады.

Але не канец на гэтым. Камісар ураду на места Вільню паведаміў рэдакцыю "Крыніцы", што па загаду пракурора "Крыніца" да разгляду справы спыняецца. Такім чынам, як бачым, найстарэйшая ў Вільні беларуская газэта, пратрываўшы 9 гадоў (два ў Менску і Петраградзе, а 7 у Вільні), скончыла сваё мучаніцкае жыцьцё сьмерцяй ненатуральнай.

Мусім тут адзначыць, што "Крыніца" стойка трывала ў барацьбе за вызваленьне беларускага сярмяжніка і чэсна спаўняла перад ім свой доўг.

Празь некалькі месяцаў справу Б. Туронка разглядаў Віленскі Акруговы суд. Інфармацыю аб гэтым працэсе зьмясьцілі некалькі беларускіх газэтаў, між іншага, "Biełaruskaja Krynica" (1925. 6 сьнежня), "Беларуская Ніва" (1925. 2 сьнежня) і "Грамадзкі Голас" (1925. 10 сьнежня). Ніжэй цытуем справаздачу "Biełaruskaj Krynicy":

Суд над рэд. Туронкам. 30 лістапада Віленскі Акружны суд разглядаў 7 спраў рэд. "Крыніцы" Б. Туронка, якога абвінавачвалі паводле арт. 129, 263 і 298 к. к. за розныя стацьці, зьмешчаныя ў "Крыніцы". Бараніў рэдактара адв. Б. Родзевіч. (Памылка — у актах справы падаецца Вацлаў Родзевіч. — *Ю.Т.*).

Сьведкі беларусы пасол Ярэміч, дыр. Астроўскі і іншыя дамагаліся, каб суд прывёў іх да прысягі у роднай беларускай мове. Суд, парадзіўшыся ў працягу 15 мінут, дамаганьне сьведкаў адкінуў. Тады сьведкі цалком адмовіліся ад прысягі. Суд на гэта згадзіўся. Тут трэба адзначыць, што разам зь беларускімі інтэлігентамі адмовіліся ад прысягі ў польскай мове таксама і сьведкі беларускія сяляне.

Суд прысудзіў рэд. Б. Туронка на два месяцы турмы, а "Крыніцу" зачыніў назаўсёды. Рэдактар прысудам нездаволены і падае апэляцыю.

Здаецца, што "Biełaruskaja Krynica" і іншыя газэты дапусьцілі акрамя імя адваката яшчэ адну недакладнасьць. Як паказваюць архіўныя акты справы Б. Туронка, ён быў прысуджаны да трохмесячнага турэмнага зьняволеньня з устрыманьнем пакараньня на працяг пяці гадоў. Аб гэтым пазьней пісалі "Сялянская Ніва" (1927. 18 чэрвеня) і А. Станкевіч у кніжцы "Беларускі Хрысьціянскі Рух" (С. 216). Цікава заўважыць, што ў час судовай расправы Б. Туронак ня выявіў аўтара артыкула "Праўда аб Жодзішках", якім быў ён сам. Гэтым, магчыма, унікнуў большага пакараньня.

Эпілёг справы рэдактара "Крыніцы" адбыўся 26 студзеня 1928 г. у Віленскім Апэляцыйным судзе, які зацьвердзіў ранейшы трохмесячны прысуд, вынесены Акруговым судом, з устрыманьнем яго выкананьня на працяг пяці гадоў[29]. Такім чынам, далейшая прэсавая дзейнасьць пагражала б Б. Туронку аўтаматычна трохмесячнай адседкай на Лукішках.

[29] Biełaruskaja Krynica. 6.2.1928.

Паміж Станкевічам і Рагулем

Аднак судовы вырак не пазбавіў Браніслава Туронка ахвоты да далейшай грамадзкай працы. Не зьмянілася і асноўная арыентацыя яго дзейнасьці, якая па–ранейшаму апіралася на супрацоўніцтва з БХД і ў прыватнасьці з ксяндзом Адамам Станкевічам. Аб гэтым, як цеснымі былі іх сувязі, сьведчыць, між іншым, факт, што ў 1926—1927 гадох ён наймаў пакой у доме пры вуліцы Полацкай, 4, у якім зьмяшчаўся галоўны "штаб" беларускае хадэцыі.

Гэта быў бурны і вельмі цікавы пэрыяд у палітычным жыцьці Заходняе Беларусі, перш за ўсё з увагі на ролю, якую ў ім адыграла Беларуская Сялянска–Работніцкая Грамада. Як вядома, яна стваралася пад непасрэдным кіраўніцтвам КПЗБ, якая вызначала мэты і заданьні Грамады, прымала актыўны ўдзел у яе рабоце[30]. Дадайма, што гэтая работа фінансавалася кампартыяй праз кіраваны Радаславам Астроўскім Беларускі каапэратыўны банк.

На фоне хутка ўзрастаючых у сялянскіх масах уплываў Грамады 10 лістапада 1925 г. з ініцыятывы паслоў Фабіяна Ярэміча і Васіля Рагулі паўстала новая партыя — Беларускі Сялянскі Саюз. Як сьведчаць ня толькі савецкія, але і даваенныя польскія крыніцы (між іншым, "Krótki zarys...". С. 37), Беларускі Сялянскі Саюз быў створаны ў процівагу Грамадзе. Падобна як усе беларускія партыі і арганізацыі, Сялянскі Саюз дамагаўся надзелу зямлі бяз выкупу, высоўваў і іншыя радыкальныя патрабаваньні. Апрача таго, стаяў ён на грунце незалежнай Беларусі, чым прынцыпова розьніўся ад Грамады. Прэсавым органам Сялянскага Саюзу была газэта "Сялянская Ніва".

Варта заўважыць, што праграма БСС была амаль аднолькавай з праграмай БХД. Па сутнасьці адзіным адрозьненьнем было тое, што Сялянскі Саюз менш цікавіўся пытаньнямі рэлігіі, высоўваючы на першы плян справы нацыянальныя. Як паведамляў "Круткі зарыс..." (с. 37), у канцы студзеня 1926 г. адбыліся перамовы паміж Рагулем і Ярэмічам з аднаго боку і ксяндзом А. Станкевічам з другога, рэзультатам якіх было пагадненьне аб супрацоўніцтве і ўзаемнай падтрымцы БХД і БСС.

24 сакавіка 1926 г. у Вільні ў хадэцкім "штабе" на Полацкай, 4, адбыўся першы зьезд Сялянскага Саюзу з удзелам ксяндза А. Станкевіча, А. Стаповіча, Б. Туронка і іншых. Зьезд выбраў Цэнтральны Камітэт БСС, у складзе якога былі: В. Рагуля (старшыня), Ярэміч і Куніцкі (намесьнікі старшыні), Більдзюкевіч (сакратар), Туронак (намесьнік сакратара). Адначасова Туронак як прадстаўнік Сялянскага Саюзу ўвайшоў у склад Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні. Быў яго сябрам да 18 верасьня 1926 г., г.зн. да выступленьня БХД і БСС з гэтага камітэту.

Як паведамляла "Сялянская Ніва"[31], у выбраны на чарговым зьезьдзе БСС яго Цэнтральны Камітэт увайшлі: Рагуля (старшыня), Ярэміч і Юхнавец (нам. старшыні), Туронак (сакратар), Куніцкі, Більдзюкевіч і Сьвістун. Такім чынам, Туронак быў сябрам кіраўніцтва Сялянскага Саюзу прынамсі да лета 1928г., г.зн. практычна да канца існаваньня гэтай партыі.

Узьнікае пытаньне, якое было тады стаўленьне Браніслава Туронка да Беларускай Хрысьціянскай Дэмакратыі, тым больш, што, як паведамляла "Сялянская Ніва"[32], у той самы час акрамя ўдзелу ў ЦК БСС ён быў яшчэ і супрацоўнікам "Biełaruskaj Krynicy" — органа БХД? Здаецца, што адказ на гэтае пытаньне выцякае з пагадненьня аб супрацоўніцтве паміж БДХ і БСС, якое ў студзені 1926 г. заключылі лідэры гэтых партыяў. Як паказваюць матэрыялы зьездаў БХД, Туронак ніколі не ўваходзіў у склад яе Цэнтральнага Камітэту, аднак у хадэкаў лічыўся "сваім чалавекам". Можна думаць, што, займа-

[30] Революционный путь компартии Западной Белоруссии. Минск, 1966. С. 132.

[31] 1927. 30 ліпеня.

[32] 1926. 11 ліпеня.

ны пост сакратара ЦК БСС, ён ажыцьцяўляў, між іншым, пастаянную сувязь паміж гэтымі партыямі.

Рэзультатам супрацоўніцтва БХД і БСС быў, між іншым, Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры. БІГіК быў арганізаваны ў Варшаве 26 траўня 1926 г., а праз месяц — 26 чэрвеня — адкрыўся яго Віленскі аддзел. На арганізацыйным сходзе аддзелу, які адбыўся на Полацкай, 4, выступіў ад імя цэнтральнай управы БІГіК кс. Адам Станкевіч, які распавёў пра мэты і заданьні новай арганізацыі. Была выбраная ўправа аддзелу, у склад якой увайшлі кс. А. Станкевіч, В. Багдановіч, адвакат Казлоўскі, Б. Туронак (сакратар) і Ярэміч (скарбнік).

На чарговым сходзе Віленскага аддзелу, які адбыўся 6 лютага 1927 г., Б. Туронак быў выбраны старшынём яго ўправы. У яе склад увайшлі: Ярэміч (намесьнік старшыні), кс. А. Станкевіч (скарбнік), а таксама Каруза і Дубейкаўскі (сябры).

Віленскім аддзелам БІГіК Б. Туронак кіраваў да вясны 1928 г., г.зн. да свайго выезду зь Вільні. Таксама ўзначальваў ён, разам зь Янам Васілеўскім і Адамам Більдзюкевічам, Гандлёва–прамысловы банк, арганізаваны Беларускім Інстытутам Гаспадаркі і Культуры ў красавіку 1928 г. у Вільні[33].

М. Ачарот пісаў у беластоцкай “Ніве”[34]:

> Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры быў заснаваны з мэтай падтрыманьня і разьвіцьця народнай прамысловасьці, рамяства, тэхнікі, народнага мастацтва, духовай культуры і асьветы, і краёвага земляробства. БІГіК закладаў і вёў прыкладныя гаспадаркі і пасекі, майстэрні земляробчых і пасечных вырабаў, праводзіў меліярацыю, падтрымоўваў вырошчваньне садовых дрэваў, арганізаваў экскурсіі з мэтай пазнаньня земляробства, пчалаводзтва, агародніцтва, малочніцтва, народнай прамысловасьці, тэхнікі, высылаў інструктараў, даваў парады і прафэсійную дапамогу як з навуковага, так і матэрыяльнага боку, склікаў зьезды сяброў, арганізаваў выстаўкі і конкурсы, праводзіў лекцыі, гутаркі, спрэчкі.
>
> Беларускім Інстытутам Гаспадаркі і Культуры арганізаваліся тэатральныя пастаноўкі, канцэрты, выдаваліся і распаўсюджваліся кніжкі, брашуры, часопісы і ўтрымліваліся чытальні, бібліятэкі, кнігарні, музэі і народныя дамы.

Усе гэтыя мерапрыемствы былі — паводле У. Палуяна — накіраваныя на тое, “каб вырваць працоўных з–пад уплыву КПЗБ і прагрэсіўных нацыянальна–вызваленчых арганізацыяў Заходняй Беларусі”[35]. Словам — хто не з намі, той супроць нас. Падобных прыяцеляў БІГіК меў таксама ў лягеры “Цэнтрасаюзу”.

У канцы 1927 г. беларускія палітычныя партыі і арганізацыі рыхтаваліся да выбараў у польскі сойм, якія мелі адбыцца на пачатку сакавіка 1928 г. Гэтая падрыхтоўка адбывалася ва ўмовах вострага ўзаемнага змаганьня, якое значна аслабляла і так невялікія іх сілы і ўплывы ў масах. БХД, БСС і іншыя групоўкі стварылі т.зв. Беларускі аб’яднаны выбарчы камітэт[36], які ішоў на выбары ў рамках Блёку Нацыянальных Меншасьцяў (сьпісак № 18).

На пасяджэньні гэтага камітэту, якое адбылося 28 сьнежня 1928 г., Б. Туронак як сакратар ЦК БСС і старшыня Віленскага аддзелу БІГіК быў вылучаны кандыдатам Блёку ад Беластоцкай выбарчай акругі (Беластоцкі, Сакольскі і Ваўкавыскі паветы). Першае месца сярод кандыдатаў гэтае акругі ў сойм займаў варшаўскі жыд, купец Шыя

[33] Гл.: Sprawy narodowościowe. 1928. № 2. С. 224.
[34] 1956. 12 жніўня.
[35] Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. Т. 2. С. 240
[36] Поўная назва гэтага камітэту — Беларускі цэнтральны аб’яднаны выбарчы камітэт (БЦАВК). Акрамя БХД і БСС, да яго далучыліся Беларускае праваслаўнае дэмакратычнае аб’яднаньне на чале зь Вячаславам Багдановічам і адзін з двух існых у той час Віленскіх Беларускіх нацыянальных камітэтаў. — *А.П.*

Гесель Фарбштэйн[37], другое — Туронак і астатнія: Грыневіч і Наруш[38].

У час выбараў Блёк Нацыянальных Меншасьцяў атрымаў у Беластоцкай акрузе толькі адзін пасольскі мандат. Згодна з выбарчым рэглямэнтам, ён выпаў на долю Фарбштэйна.

Акрамя грамадзка-палітычнай дзейнасьці, у 1926—1928 гадох Б. Туронак займаўся таксама папулярызацыяй аховы здароўя. У Вільні і ў сельскіх гуртках БІГіК выступаў з адпаведнымі лекцыямі, крыху пісаў. Адзін яго артыкул "Аб сухотах" быў зьмешчаны ў выдадзеным Беларускім Інстытутам Гаспадаркі і Культуры зборніку "З роднае нівы" (Вільня, 1928. С. 49—55). Крыху большая праца — "Гігіена ўзгадаваньня дзіцяці" — друкавалася вясной 1928 г. у "Biełaruskaj Krynicy" (№ 23—31).

У траўні 1928 г. выпусьціла яе асобнай брашурай выдавецтва "Biełaruskaja Krynica". Кніжачка налічвала 40 старонак невялікага фармату ды была надрукавана ў друкарні імя Ф. Скарыны (Я. Найдзюк) накладам у 1000 асобнікаў. Яе абавязковы асобнік, які быў перасланы аўтарам у Камісарыят ураду на места Вільню, пасьля многіх гадоў трапіў у Нацыянальную Бібліятэку ў Варшаве, у якой захоўваецца і цяпер.

У гэты час зьмянілася асабістае жыцьцё Браніслава Туронка. У 1926/27 г. пазнаёміўся з маладзейшай на 9 гадоў Марыяй Рэшаць, сястрой тагачаснага прафэсара Віленскай духоўнай сэмінарыі кс. Язэпа Рэшаця. Як успамінала мама, у Вільні адбываліся тады беларускія набажэнствы ў касьцёле сьв. Мікалая[39], дзе паведамлялі аб розных акадэміях, імпрэзах. На адной такой сустрэчы (паводле Язэпа Найдзюка — на Полацкай, 4) пазнала Браніслава.

Шлюб адбыўся ў Вільні 31 студзеня 1928 г. у касьцёле сьв. Якуба каля Лукіскай плошчы. У студзені 1928 г. Браніслаў жыў на вуліцы Якуба Ясінскага, 1 (цяпер Пятро Цьвіркос), г зн. у раёне парафіі сьв. Якуба.

Вясельле спраўлялі ў новай кватэры мамы на Ліповай, 13 (Зьвярынец). Прысутнічалі: з бацькавай сям'і — сястра Антаніна і браты Ян і Віцька, зь сям'і мамы — яе маці Ганна Рэшаць, брат кс. Язэп Рэшаць і сястра Лёня з мужам. Акрамя іх былі на вясельлі Апака і Ян Стэповіч. Не былі запрошаны бацькавы сябры з БХД, БСС, БІГіК і іншыя. Чаму?

Жаніцьба Браніслава Туронка была пачаткам карэнных пераменаў ягонага жыцьця. У прыватнасьці, давялося адмовіцца ад ранейшай актыўнай працы на беларускай ніве. Вясной 1928 г. пакінуў ён Вільню і пасяліўся ў жыдоўска-летувіска-польскім мястэчку Дукшты каля Турмонтаў. Гэтая пастанова, улічваючы ранейшую грамадзкую заангажаванасьць Б. Туронка, выклікае прынамсі зьдзіўленьне. Чаму ён пакінуў Вільню і чаму замяніў яе на небеларускія Дукшты? На ваколіцу, у якой нават пры найбольшым жаданьні няшмат ужо мог зрабіць для беларускай справы.

Ці быў расчараваны вынікамі сваёй грамадзкай дзейнасьці? Можа, і быў, але, напэўна, ня больш, чым іншыя дзеячы, якія, нягледзячы на цяжкасьці, не пакідалі баявой пазыцыі. Можа, пацягнула пэрспэктыва большых заробаткаў на правінцыі ці паўплывалі нейкія сямейныя акалічнасьці? Цяжка сказаць што-небудзь пэўнае... Урэшце, у жыцьці лічацца толькі факты, а не пажаданьні ці нават пастановы.

---

[37] Фарбштэйн Шыя Гесэль (Гірш) (1870—1948) — габрэйскі дзяяч у міжваеннай Польшчы, адзін зь лідэраў сіяністцкага руху, у 1918 — 1931 гг. — старшыня сіяністцкай партыі "Мізрахі" ў Польшчы. У 1922—1930 г. — пасол польскага сойму. З 1931 г. — у Палестыне, у 1938—1945 гг. старшыня гарадзкой рады Ерусаліму. — *А.П.*

[38] Гл.: Сялянская Ніва. 1928. 1 студзеня і Biełaruskaja Krynica. 1928. 9 і 12 лютага.

[39] Беларускія каталікі ня мелі ўласнага касьцёла ў міжваеннай Вільні. Касьцёл сьв. Мікалая належаў віленскім літоўцам і выкарыстоўваўся беларусамі па дамоўленасьці зь імі. Звычайна беларускую імшу ў гэтым касьцёле служыў кс. Адам Станкевіч. — *А.П.*

На пэрыфэрыі руху

У Дукштах бацька пачаткова наняў кватэру ў доме Іцка Арона, якраз насупраць пастарунку паліцыі. Праз некалькі месяцаў, летам 1928 г., прыехала сюды і маці. У 1931 ці 1932 г. сям'я перасялілася ў дом пры вуліцы Бербецкага, № 51 (у 1939—1945 гг. — вуліца Лайсвесу № 61), уласьнікам якога быў доктар вэтэрынарыі Часлаў Доўбар. У 1935 г. бацька купіў гэты дом прыблізна за 4000 злотых. Стаяў ён на арандаваным пляцы, які належаў да сялян вёсак Гіруцішкі і Канюкі.

Дом быў драўляны, шасьціпакаёвы, з вэрандай з фронту і зь сенцамі ад панадворку. Два пакоі займалі кабінэт і пачакальня для пацыентаў, а ў астатніх чатырох пакоях і кухні кватаравала сям'я. Акрамя прыватнай практыкі, бацька працаваў у дукштанскай "Касе хворых" і разы два ў тыдзень езьдзіў цягніком у Турмонты, дзе абслугоўваў тамашні мэдпункт.

На панадворку стаяў хлеў, у якім трымалі карову і адну—дзьве сьвіньні, была таксама вялікая піўніца. Пазьней, у палове 30-х гадоў, бацька пабудаваў яшчэ лазьню з пустакоў. На даволі вялікім агародзе быў пасаджаны сад, была і сажалка з карасямі (і трытонамі).

Такім чынам, былі створаны адпаведныя матэрыяльныя ўмовы для сям'і, якой Бог наслаў трох сыноў. Нарадзіліся:

Юрка — 27.04.1929;
Андрэй — 24.02.1931;
Міхась — 20.03.1935.

Усе сыны прыйшлі на сьвет у віленскай клініцы, аднак былі ахрышчаныя ў Дукштах, у сувязі з чым гэтае мястэчка фармальна лічыцца месцам іх нараджэньня.

Сямейныя кантакты не былі асабліва частымі, праўдападобна, з той прычыны, што і бацькава Дзісеншчына і матчына Беласточчына знаходзіліся даволі далёка. Наколькі памятаецца, езьдзілі мы адзін год, летам, да адных дзядзькоў і цётак, а другі год — да другіх. Варта заўважыць, што сувязі з бацькавай сям'ёй мелі асаблівы падтэкст. Усе, акрамя Фартуні, яго браты і сёстры лічыліся беднымі, а бацька, які лічыўся найбагацейшым, дапамагаў ім хіба ня толькі ў рамках кампэнсацыі за дапамогу, атрыманую ў студэнцкія гады. Ішлі грошы асабліва на падтрыманьне гаспадаркі Ўладзіслава ("меў многа дзяцей") і Яна (між іншым, на куплю зямлі ў Ідольце), а таксама на адукацыю Віцькі. Здаецца, што ў гэтай справе здаволеных было мала.

Дукштанскія будні значна адрозьніваліся ад віленскіх, поўных напружаньня і самааданай грамадзкай працы, карысьць якой не вымяралася залатоўкамі. Праўда, і тут бацька шмат працаваў, часта і па начах, калі даводзілася езьдзіць да хворых у вакалічныя вёскі. Праўда таксама, што гэтая ягоная праца мела вялікі гуманітарны сэнс. Усё ж біяграфіі лекараў, як правіла, вымяраюцца іншымі крытэрамі, чым жыцьцяпісы грамадзкіх дзеячоў.

Стыль дукштанскага жыцьця быў тыпова правінцыйным. Памятаюцца частыя "гарбаткі" ці ўзаемныя візыты з больш канкрэтным, чым чай, рэпэртуарам. Мясцовы войт Шэйка, Лянцэвічы, Оркіш і Навагонская з Антанова (з брычкай), можа, яшчэ хтосьці — такая была найчасьцей мясцовая кампанія. Здаецца, што ўсе гэтыя сустрэчы адбываліся больш для "забіцьця часу", чым для душы, а нават для інтарэсу.

Нельга сказаць, што пасьля выезду зь Вільні цалкам спыніўся ўдзел бацькі ў беларускім руху. У палове ліпеня 1928 г. ён удзельнічаў разам з мамай ва ўрачыстай сустрэчы кс. В. Гадлеўскага пасьля ягонага звальненьня з Макатоўскай турмы. З лютага 1929 г. бацька быў выбраны ў склад Цэнтральнай управы Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ў якасьці намесьніка яе сябра[40]. Потым, на працягу двух наступных гадоў

[40] Bielaruskaja Krynica. 8.2.1929.

(1930/31 і 1931/32), не спатыкаем ягонага прозьвішча ва ўладах БІГіК.

Як паведамляла "Biełaruskaja Krynica"[41], у канцы лютага 1932 г. адбыўся сход Віленскага аддзелу БІГіК, які выбраў Б. Туронка дэлегатам аддзелу ў Раду БІГіК. На гадавым сходзе Рады, які адбыўся 24.04.1932 г., ён быў выбраны сябрам Цэнтральнай управы БІГіК[42]. На гэты самы пост выбіраўся ён яшчэ на 1933/34 год[43]. У гэтыя гады старшынём Цэнтральнай управы БІГіК быў кс. В. Гадлеўскі, ягонымі намесьнікамі — А. Клімовіч і Ф. Ярэміч, сакратаром — М. Пецюкевіч, скарбнікам — айцец А. Коўш і сябрамі, акрамя Б. Туронка, — Я. Пазьняк і Я. Малецкі. Ад вясны 1934 г. бацька больш ужо не выбіраўся ў Цэнтральную ўправу БІГіК. Дарэчы, 4 сьнежня 1936 г. гэтая арганізацыя была зачыненая польскімі ўладамі.

Можна думаць, што гэтыя "выбары" больш за ўсё адлюстроўвалі імкненьне Гадлеўскага не адпускаць бацьку з круга дзейнасьці БІГіК, мабілізаваць яго да далейшай працы. Аднак гэтыя спробы выразна рваліся, а яго ўдзел у БІГіК у пэрыяд 1929—1934 гг. быў хіба толькі намінальным. На перашкодзе стаяла пастаяннае пражываньне па-за віленскім асяродзьдзем.

У Дукштах, як падавалася ў пасьмертных біяграфіях, ён мог ужо толькі "трымаць кантакт", мог здалёк цікавіцца рухам. У 30-я гады бацька выпісваў "Biełaruskuju Krynicu", "Шлях Моладзі", "Самапомач", "Калосьсе", "Chryścjanskuju Dumku", гадавікі якіх захоўваліся ў скрынях на страсе і да якіх я неаднаразова заглядаў. Тамсама былі калекцыі кніжак пецярбурскіх і віленскіх беларускіх выдавецтваў. Адначасова падтрымоўваў грашыма, між іншым, "Шлях Моладзі" (гл. яго 13 нумар за 1933 г.), непэрыядычныя выданьні (між іншым, зборнікі вершаў М. Машары[44]), дасылаў складчыны на іншыя мэты (між іншым, на пабудову помніка Ядвігіну Ш[45]). Ня раз заглядалі да бацькі ў Дукшты кс. А. Цікота, Я. Малецкі, П. Сергіевіч і іншыя беларусы, якія ехалі зь Вільні на Браслаўшчыну ці наадварот.

Вялікую ўвагу бацька зьвяртаў на ўзгадаваньне дзяцей у беларускім духу, што практычна ажыцьцяўляла мама. Бацькі гаварылі па-беларуску між сабою і зь дзецьмі, а таксама патрабавалі, каб і дзеці так між сабою гаварылі. Аднак за парогам была вуліца, дзе панавала афіцыйная польшчына. Што тут гаварыць, імпанавала нам малым польская мова (школа, касьцёл, установы, сябры), у выніку чаго пачынаў часам і я перашэптвацца з Андрэем па-польску. Калісь пачуў гэта бацька, і старэйшы сын атрымаў адпаведнае павучэньне папругай, пасьля чаго такія экспэрымэнты больш не паўтараліся.

У гэтых адносінах істотную ролю грала агульная хатняя атмасфэра. На сьценах віселі партрэцікі Багушэвіча з вусамі, Купалы і Сваяка, якія я вучыўся пазнаваць будучы яшчэ вельмі малым. Пад вокам мамы вучыўся чытаць і пісаць па-беларуску зь "Першых Зярнятак" Паўловіча. Памятаюцца першыя вершыкі "Я шавец маладзец", "Жылі ў бацькі тры сыны", а таксама песьні, якія бацька сьпяваў і граў на гітары, — "Камар лазьню тапіў", "Чаму ж мне ня пець", "Конь бяжыць, зямля дрыжыць". Найхутчэй дзеля гэтых узгадаваўчых мэтаў была запрошана з Браслаўшчыны служанка Яня, якая працавала ў нас некалькі гадоў.

На нацыянальным фоне ўзьнік канфлікт паміж бацькам і яго наймаладзейшым братам Віцькам, які, закончыўшы Друйскую гімназію (каля 1935 г.), адрокся сваёй беларускай нацыянальнасьці і паступіў у афіцэрскую школу. Тады спыніліся паміж імі адносіны і да сьмерці бацькі Віцька ў нас не бываў.

---

[41] 1932. 6 сакавіка.

[42] Biełaruskaja Krynica. 1.5.1932.

[43] Biełaruskaja Krynica. 14.5.1933.

[44] Машара Міхась (1902—1976) — заходнебеларускі паэт, у міжваенны пэрыяд выдаў некалькі зборнікаў вершаў: "Малюнкі" (1928), "Напрадвесьні" (1935), "З-пад стрэх саламяных" (1937). — *А.П.*

[45] Шлях Моладзі. 1937. № 5.

А цяпер некалькі бытовых эпізодаў, якія засталіся ў маёй памяці:

— Бацька шмат курыў. Купляў розныя гатункі тытуню, сам рабіў мяшанкі і набіваў гуткі.

— Любіў зброю. Хацеў мець пісталет, але не атрымаў дазволу ад старасты. Вядома, прычына была ў нацыянальнасьці. Купляў тады “страшакі”, якімі забаўляўся і я. Майстраваў нам пісталеты зь вінтовачнай гільзы — “прапіканы” — і вучыў імі паслугоўвацца (“мерыць заўсёды вышэй вока!”).

— Калі забівалі кабана, сам рабіў каўбасы. Вэндзілі іх шынкі і маскаля Юліна. Потым ён іх прывозіў. Павінны былі вісець у кладоўцы пад сходамі на гару некалькі месяцаў.

— Бацька часта хадзіў на возера (“Прасьветы”) купацца, вядома, разам зь сям'ёю. Яшчэ часьцей хадзіў на рыбы, у чым часам удзельнічаў і я. Аднойчы стаялі аж да абеду і нічога не злавілі. Ідучы назад, бацька купіў у жыда вялікага шчупака і прыказаў мне не гаварыць маме, што куплены.

— Найбольш дастаў я ад бацькі “ў скуру” за “акцыю” здабыцьця матэрыялу на пабудову казармаў для майго войска. У выніку гэтай акцыі накралі мы зь недалёкага тартаку шмат дошак, якія схавалі пад нашай вэрандай (“Што ж гэта за войска без казармаў...”). Пасьля “правалу” ўсё давялося аднесьці ў тартак і яшчэ перапрасіць яго ўладальніка. А гэта было, бадай, горшае, чым папруга...

Гэтыя эпізоды запісаліся ў памяці 9–гадовага хлопчыка. Столькі мне было гадоў, калі памёр бацька. 15 ці 16 верасьня 1938 г. паехаў ён да хворага за возера. Ехаў на маторнай лодцы, прастудзіўся, тры дні была высокая гарачка і ніякай лекарскай дапамогі. Памёр 19 верасьня 1938 г. каля 5–й гадзіны раніцай.

Як гэта сталася, што бацька быў пахаваны не на парафіяльных, “агульных”, могілках каля вёскі Канюкі, а на невялічкім магільніку ў Старых Дукштах, які належаў да маёнтку Занаў, доўгі час мне не было вядома. Нічога ў гэтай справе не магла выясьніць і мама, якая тады была хворая і ў пахаваньні ня ўдзельнічала. Аб гэтым расказаў мне ў 1979 г. у Варшаве Тамаш Зан: ён сам заняўся пахаваньнем і выбраў месца вечнага супачынку Браніслава Туронка.

Памятаю, што было тады многа народу, шмат вянкоў... З бацькавай сям'і была сястра Фартуня і брат Уладзіслаў. Зь віленскіх сяброў, здаецца, не было нікога. Магчыма, ніхто іх не паведаміў.

* * *

У 1958 г. я адведаў бацькаву магілу. Крыж спарахнеў і паваліўся. Паставіў яго і прывязаў дротам да жалезнай агароджы. Другі раз быў на магіле ў 1979 г. Усё было па–старому.

І яшчэ. Калі ў ліпені 1979 г. я шукаў у Віленскім унівэрсытэце бацькаву студэнцкую папку, адбылася з служачай яго рукапіснага аддзелу такая вось размова:

Яна: ... А калі памёр?

Я: У 1938 годзе.

Яна: Ой, могуць быць цяжкасьці...

Я: Але памёр на тагачаснай польскай тэрыторыі...

Яна: Ах, як добра! Тады дырэктар хіба дазволіць...

Можна думаць, што Браніслаў Туронак памёр “своечасова”, хоць было яму толькі 42 гады. Праз год прыйшла ў Дукшты Чырвоная Армія і многія бацькавы сябры разьвіталіся з родным краем на многія гады, або назаўсёды...

Ацэны

Як ужо ведаем, пасьля сьмерці бацькі 10 кастрычніка 1938 г. віленская “Chryścjanskaja Dumka” зьмясьціла артыкул кс. Адама Станкевіча, прысьвечаны жыцьцю і дзейнасьці

Браніслава Туронка. Падобны артыкул Язэпа Найдзюка зьявіўся і ў "Шляху Моладзі"[46]. Абодва артыкулы пазытыўна ацэньвалі ягоны жыцьцёвы шлях, падкрэсьлівалі заслугі перад беларускім народам.

Гэтыя ацэнкі выклікалі рэпліку штомесячніка "Беларускі Фронт" — "незалежнага народна–радыкальнага часапісу", які быў органам групоўкі кс. Вінцука Гадлеўскага — колішняга старшыні Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. У склад яго рэдакцыйнай калегіі ўваходзілі Вінцук Гадлеўскі, Лявон Дубейкаўскі, Вацлаў Папуцэвіч і Мікола Шкялёнак. 7 лістапада 1938 г. у гэтым часапісе была зьмешчана наступная нататка:

> *Сьмерць Д–ра Туронка.* У канцы верасьня сёлета памёр у Дукштах, Брасл. пав. др. Браніслаў Туронак. Будучы студэнтам, прыймаў даволі дзейнае ўчасьце ў беларускім нацыянальным і грамадзкім жыцьці, пасьля ж, здабыўшы дыплём доктара мэдыцыны і становішча, ад бел. працы адыйшоў. Хоць частка беларускай прэсы пасьля сьмерці д–ра Туронка пісала аб ім пахвальныя словы, то справядлівасьць вымагае сьцьвердзіць, што др. Туронак да самай сьмерці аставаўся ў радох бязьдзейнай беларускай інтэлігенцыі. Уважаем, што замест пахвальных гімнаў трэба праўду пісаць ня толькі за жыцьця бязьдзейнага інтэлігента, але і пасьля ягонай сьмерці — на вечны ўспамін жывучым!

На гэтыя заўвагі "Беларускага Фронту" 20 лістапада 1938 году "Chryścjanskaja Dumka" адказала як наступае:

> De mortibus aut bene aut nihil[47]
>
> ...Крыўду зрабіла сьв. п. др. Б. Туронку адна беларуская газэта, стаўляючы яму закід бязьдзейнасьці на беларускай ніве. Тымчасам св. п. др. Б. Туронак ня толькі будучы студэнтам, але і пасьля, працуючы на правінцыі, заўсёды быў з намі ў кантакце, выпісваў беларускія газэты (Chryścjanskaja Dumka, Шлях Моладзі, Калосьсе, Самапомач), гадаваў дзяцей у беларускім народным духу і падтрымліваў матэрыяльна беларускую прэсу і розныя беларускія імпрэзы.
> Праўда, сьв. п. др. Б. Туронак не займаўся палітыканствам, але гэта так жа яму трэба залічыць не на мінус, а на плюс.

Палеміка працягвалася, і 7 сьнежня 1938 г. у "Беларускім Фронце" зьявіўся чарговы адказ "Chryścjanskaj Dumcy":

> ...Тыя довады, якія Хрысьціянская Думка высоўвае ў абароне д–ра Туронка (чытаньне беларускае прэсы, гутарка зь дзяцьмі па–беларуску і іншыя) яшчэ не пераконваюць, каб на падставе гэткай "дзейнасьці" лічыць беларускага інтэлігента дзейным. Уважаем, што каб пісаць аб такім інтэлігенце пахвальныя словы, трэба каб ён заслужыў на іх сваёй грамадзкай дзейнасьцяй, якой нажаль др. Туронак пасьля сканчэньня ўнівэрсытэту не праяўляў. Аб гэтым усім ведама. <...> Уважаем, што пісаньне праўды аб нябошчыку мае вялікае маральнае і ўзгадаваўчае значэньне для жывучых!

На гэта "Chryścjanskaja Dumka" не адказала больш нічога.

Цікава заўважыць, што пасьля апублікаваньня ў "Беларускім Фронце" першай нататкі[48] яго рэдкалегію пакінулі Дубейкаўскі і Шкялёнак, у выніку чаго адзіным рэдактарам часопісу застаўся кс. Гадлеўскі, а студэнт Папуцэвіч значыўся як яго выдавец. На

[46] 1938. 25 кастрычніка.
[47] Пра нябожчыкаў або добра, або нічога (лац.). — *А.П.*
[48] 1938. 7 лістапада.

запытаньне аб прычыне гэтага расколу Язэп Найдзюк адказаў, што Дубейкаўскі і Шкялёнак не згаджаліся з нападкамі "Беларускага Фронту" на дзеячоў БХД[49]. Уся гэтая справа ўзьнікла, несумненна, на фоне палемікі вакол Б. Туронка, паколькі ў лістападзе 1938 г. толькі ён быў прадметам спэцыяльнага зацікаўленьня "Беларускага Фронту".

Хоць гэтая палеміка адбывалася ананімна, няма сумневу, што яе аўтарамі былі Станкевіч і Гадлеўскі. Кожны зь іх меў падставу для сваіх выказваньняў. Ацэнка Станкевіча апіралася на добрае супрацоўніцтва з бацькам у 20–я гады, затое Гадлеўскі як былы старшыня БІГіК цяпер асуджаў бясплоднае фігуранцтва бацькі ва ўладах Інстытуту ў 1929—1934 гг. Пры гэтым дапускалася недакладнасьць, паколькі — як ведаем — пасьля атрыманьня дыплёму (1926) яго актыўная дзейнасьць працягвалася яшчэ два гады — да выезду зь Вільні. Аднак, вядома, істота справы ня ў гэтых двух гадох, а ў выезьдзе бацькі на пастаяннае пражываньне ў Дукшты — на пэрыфэрыю руху.

* * *

Што дасягнуў бацька за сваё жыцьцё? Жыў мала — 42 гады, большую частку якіх прысьвяціў здабыцьцю прафэсіі. Лекарам працаваў толькі 11 гадоў. У гэты час імкнуўся стварыць адпаведныя ўмовы для сям'і. Былі немалыя здабыткі ў Дукштах, якія, аднак, у ліпені 1944 г. пайшлі з дымам.

Разам зь імі згарэлі ўсе калекцыі кнігаў, часопісаў, альбомы і іншыя паперы. Засталася вельмі скромная друкаваная спадчына.

Людзі, якім нёс дапамогу, па нейкім часе яшчэ ўспаміналі свайго лекара, а пазьней — забыліся.

Урэшце дзеці — хіба найбольшая "інвэстыцыя" і надзея бацькі — асірацелі ў 9, 7, і 3–гадовым узросьце, у сувязі з чым цяжка ацэньваць і рэзультаты ўзгадаваўчых мерапрыемстваў. Старэйшым застаўся даволі абстрактны вобраз і ўспамін бацькі, а наймаладзейшы ня меў і таго.

Нягледзячы на супярэчлівыя ацэнкі, найбольш трывалай спадчынай бацькі аказалася яго грамадзкая дзейнасьць у Беларускім Студэнцкім Саюзе, "Крыніцы", Беларускім Сялянскім Саюзе і Беларускім Інстытуце Гаспадаркі і Культуры. Яе вартасьць можна разглядаць у гістарычным вымярэньні.

Ці гэтыя дасягненьні былі б большыя, калі б у 30–я гады бацька жыў у Вільні? Думаю, што не. У той выключна неспрыяльны для Беларусі час дасягненьняў наогул было мала — і на Усходзе і на Захадзе. Хто ня выехаў зь Вільні сам, таго ў канцы 30–х гадоў палякі высялялі адміністрацыйным парадкам[50]. Магчыма, праяўляецца тут тэндэнцыйнасьць аўтара, якая грунтуецца на эмацыйным субстраце сына да бацькі. Няхай іншыя судзяць больш аб'ектыўна.

Друкуецца паводле кнігі: Туронак Ю. Памяці Браніслава Туронка. Варшава–Нью–Ёрк. БІНіМ. 1990.

[49] Ліст да аўтара ад 21.11.1979 г.

[50] Маецца на ўвазе высяленьне зь Вільні ў канцы 1938 г. ксяндзоў Адама Станкевіча, Вінцэнта Гадлеўскага і Уладзіслава Талочкі, а таксама сьвецкага дзеяча БХД Адольфа Клімовіча. — *А.П.*

Дзейнасьць беларускага выдавецтва "Загляне сонца і ў наша аконца" ў Пецярбургу[1]

Першая легальная беларуская выдавецкая суполка пад назвай "Загляне сонца і ў наша аконца" была зарэгістраваная ў Пецярбургу ў траўні 1906 г. За колькі месяцаў у Вільні выйшлі першыя беларускія тыднёвікі — "Наша Доля" (у верасьні) і "Наша Ніва" (у лістападзе). Абодва выдавецкія асяродкі адыгралі перад першай сусьветнай вайной вызначальную ролю ў пашырэньні беларускага друку, разьвіцьці беларускай мовы і літаратуры і ў пашырэньні сярод беларусаў нацыянальнай сьвядомасьці. Аднак беларуская і замежная гістарыяграфія аддавала рашучую перавагу "Нашай Ніве", здаўна правакуючы жарсныя дыскусіі наконт яе генэзы, ідэйных кірункаў і ролі ў працэсе беларускага нацыянальнага адраджэньня. Нярэдка рабіліся спробы ахарактарызаваць увесь беларускі літаратурна-грамадзкі рух у 1906—1914 гг. як "нашаніўскую пару". На беспадстаўнасьць гэтага зьвярнуў увагу Алег Лойка, слушна зазначыўшы, што такая назва ня ўлічвала ўсіх сілаў, інсьпірацыяў і кірункаў думкі, якія ўплывалі на лёс новай беларускай літаратуры[2]. Няма сумневу, што акурат такая ацэнка значэньня "Нашай Нівы" схіліла некаторых аўтараў да цьверджаньняў, якія ў сьвятле пададзенай вышэй храналёгіі ня маюць падставаў, а менавіта, што калектыў "Нашай Нівы" адыграў значную ролю ўва ўзьнікненьні, між іншым, беларускага выдавецтва ў Пецярбургу[3].

Перабольшаньне ролі "Нашай Нівы" было як прычынай, так і вынікам негрунтоўных ведаў аб дзейнасьці пецярбурскага выдавецтва "Загляне сонца...". І сапраўды, на працягу многіх дзесяцігодзьдзяў гісторыкі беларускай літаратуры надавалі яму няшмат увагі. У дваццатыя гады Максім Гарэцкі і Ўсевалад Ігнатоўскі абмежаваліся кароткай агульнай згадкай пра дзейнасьць гэтага выдавецтва, падкрэсьліваючы ролю Вацлава Іваноўскага як яго арганізатара[4]. Не нашмат больш зьвестак пра пецярбурскую суполку падаў у 1935 г. А. Станкевіч, пры гэтым значна занізіўшы вынік яе дзейнасьці і выпукліўшы ролю Браніслава Эпімаха-Шыпілы як вядучага дзеяча гэтага выдавецтва[5]. Гэтыя

[1] Назва выдавецтва ў артыкуле падаецца паводле сучаснага беларускага правапісу. Яго арыгінальная назва, зьмяшчаная на выдаваных кнігах, гучэла: "Загляне сонцэ і ў нашэ ваконцэ". Гэтая прымаўка, якая выражае надзею на лепшую будучыню, у канцы XIX ст. выкарыстоўвалася як слоган для нелегальных беларускіх выданьняў, напрыклад: Боровик Д. Письма о Белоруссии (1882), а таксама выданьне пад назвай Дзядзька Антон (Тыльзыт, 1892).

[2] Лойка А. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд. Ч. II. Мінск, 1980. С. 19.

[3] Antologija poezji białoruskiej. Wyb. i oprac. J. Huszcza, wstęp — A. Barszczewski. Wrocław: Ossolineum, 1978. S. 23; Vakar N.P. Belorussia. The making of a nation. Harward University Press Cambridge (Mass), 1956. S. 88.

[4] Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня, 1921. С. 132, 205; Ігнатоўскі У. Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецьця. Менск, 1926. С. 218.

[5] Станкевіч А. Прафэсар Браніслаў Эпімах-Шыпіла. Вільня, 1935. С. 17; Станкевіч распачаў навучаньне ў рыма-каталіцкай духоўнай Акадэміі ў Пецярбургу ўвосень 1914 г., у пару, калі суполка "Загляне сонца..." ужо спыніла сваю дзейнасьць. Дзеля гэтага зробленая Станкевічам ацэнка ролі Шыпілы як "душы" гэтага выдавецтва не была вынікам асабістых назіраньняў, а хутчэй выразам пашаны, якую ён меў да постаці прафэсара як мовазнаўцы і выкладніка Духоўнай акадэміі — гл. у сувязі з гэтым: Ксёндз Адам Станкевіч у 25-ыя ўгодкі сьвяшчэнства і беларускай нацыянальнай дзейнасьці (10.01.1915—

зьвесткі Станкевіча ў 1960 г. паўтарыў Віталь Вольскі, з чаго вынікае, што з 1935 г. дасьледаваньняў гэтай праблематыкі практычна не вялося[6]. Адно ў 1968—1971 гг. зьявіліся працы Сьцяпана Александровіча і Рыгора Семашкевіча, у якіх давалася характарыстыка ўсёй дзейнасьці суполкі, якая ацэньвался як найбольшая да першай сусьветнай вайны беларуская выдавецкая арганізацыя з выдатнымі заслугамі ў разьвіцьці беларускай літаратуры[7].

Працяг дасьледаваньняў гісторыі суполкі "Загляне сонца..." грунтаваўся перадусім на польскіх архіўных матэрыялах, у т.л. асабліва перапісцы Іваноўскага зь Ельскім (1905—1906 гг.), а таксама іншых крыніцах, якія не былі выкарыстаныя памянёнымі беларускімі дасьледнікамі. Яны дазваляюць лепш разглядзець генэзу гэтага выдавецтва і паказаць яго стваральнікаў, каторых дагэтуль узгадвалі, тлумачачы яго ўзьнікненьне як у пэўным сэнсе аўтаматычны вынік расейскай рэвалюцыі 1905 г. У гэтым кантэксьце асабліва важным пытаньнем уяўлялася ацэнка новай нацыянальнай палітыкі расейскага ўраду. Дасьледаваньні аўтара дазволілі таксама зьняпраўдзіць некаторыя зьвесткі аб выдавецкім працэсе, абвергнуць удзел Янкі Купалы ў дзейнасьці суполкі, а таксама даць новы погляд на заканчэньне яе дзейнасьці. Адносна менш увагі прысьвечана падрабязным ацэнкам значэньня паасобных выдадзеных суполкай твораў і іх літаратуразнаўчаму аналізу. Гэтае пытаньне шырока і кампэтэнтна абгаварылі С. Александровіч і Р. Семашкевіч.

Юрыдычнай падставай легальнай выдавецкай дзейнасьці на беларускай мове быў выдадзены 12 (25) сьнежня 1904 г. указ цара Мікалая II, які скасоўваў ранейшыя абмежаваньні ўжытку мясцовых моваў у заходніх губэрнях Расейскай імпэрыі — Гарадзенскай, Кіеўскай, Ковенскай, Менскай, Магілёўскай, Падольскай, Віленскай, Віцебскай і Валынскай[8]. Прыняцьце гэтага рашэньня наконадні першай расейскай рэвалюцыі было адным з захадаў ураду, які меў на мэце перадухіленьне сацыяльнай напружанасьці, якая ўзмацнілася на фоне непапулярнай расейска–японскай вайны. Рэвалюцыйныя настроі ахоплівалі сапраўды вялікія абшары расейскай дзяржавы, аднак у заходніх губэрнях яны мелі спэцыфічны характар — бо тут сацыяльная перадумовы спляталіся з нацыянальным прыгнётам.

Фармальна палажэньні ўказу ў роўнай меры тычыліся ўсіх моваў гэтага абшару (беларускай, літоўскай, польскай, украінскай, жыдоўскай і іншых), што, аднак, не забясьпечвала іх фактычнай роўнасьці. Гэтаму спрыялі наступствы нацыянальнай палітыкі расейскага ўраду, якая ў гэтай галіне здаўна была вельмі дыфэрэнцыяваная. Таму ў той час, калі — нягледзячы на абмежаваньні — адметнасьць літоўскай, польскай і жыдоўскай моваў ня ставілася пад сумнеў, то родныя ўсходнеславянскія мовы, беларуская і украінская ("маларуская"), афіцыйна трактаваліся як гаворкі расейскай мовы. З гэтай прычыны, імкнучыся процідзеяць узьнікненьню альбо разьвіцьцю непажаданых сэпаратысцкіх тэндэнцыяў, расейскія ўлады тармазілі разьвіцьцё гэтых моваў і нацыянальных літаратур. У 1899 г., забараняючы публікацыю кнігі Францішка Багушэвіча "Беларускія апавяданьні", царская цэнзура выказала асьцярогу, "ці ня крыецца ў такіх тво-

(10.01.1940). Зрэдагаваў і выдаў магістар Ян Шутовіч. Вільня, 1940. С. 39; На грунце меркаваньня, выказанага Станкевічам, у сучаснай беларускай навуцы аб літаратуры ўкараніўся памылковы погляд, быццам Браніслаў Эпімах–Шыпіла быў ініцыятарам і фактычным кіраўніком дадзенай выдавецкай суполкі.

[6] Вольскі В. Матэрыялы да біяграфіі Янкі Купалы 1882—1910 // Любімы паэт беларускага народа. Мінск, 1960. С. 76.

[7] Александровіч С. Гісторыя і сучаснасць. Мінск, 1968; яго ж. Пуцявіны роднага слова. Мінск, 1971; Семашкевіч Р. Браніслаў Эпімах–Шыпіла. Мінск, 1968; яго ж. Беларускі літаратурна–грамадскі рух у Пецярбурзе. Мінск, 1971.

[8] Шлюбскі А. Адносіны расійскага ўраду да беларускае мовы ў XIX ст. // Запіскі аддзелу гуманітарных навук Інстытуту Беларускай Культуры. Кн. 2. Працы клясы філёлёгіі. Т. I. Менск, 1928. С. 303.

рах тэндэнцыя стварэньня, апрача "маларускай", яшчэ і беларускай літаратуры, а тым самым падрыву і аслабленьня адзінства літаратуры і нацыянальнасьці, а ў выніку — таксама палітычнай магутнасьці расейскага народу"[9]. Троху раней кіеўскі цэнзар Рафальскі, пішучы аб узьнікаючым беларускім нацыянальным руху, заклікаў: "Трэба яго задушыць у пачатках, у зародку, бо пазьней у нас будзе такі ж самы клопат, як з украінафільствам"[10].

Таму ўказ Мікалая II, скасоўваючы абмежаваньні друку таксама на беларускай і ўкраінскай мовах, азначаў істотную зьмену традыцыйнай расейскай палітыкі да гэтых нацыяў. Што выклікала гэтае важнае і беспрэцэдэнтнае рашэньне? Шматлікія меркаваньні, што яно было наступствам рэвалюцыі 1905 г., якая прымусіла валадара Расеі выдаць такі ўказ, не тлумачаць справы да канца, а асабліва матываў гэтага рашэньня. Па-першае, царскі ўказ быў выдадзены да рэвалюцыі і, па–другое, ніводная зь дзейных тады ў Беларусі ўплывовых палітычных партыяў не патрабавала такога роду саступкі да беларускай мовы.

Ніякага ўплыву на рашэньне цара не аказаў таксама грамадзкі попыт на беларускую кнігу, якая на зломе XIX і XX ст. была яшчэ надзвычай рэдкай зьявай[11].

Таму няма сумневу, што рашэньне скасаваць абмежаваньні ў друку на беларускай мове было ў сутнасьці наступствам памянёных палітычных перадумоваў на заходніх ускрайках імпэрыі. Непрызнаньне нацыянальнай адметнасьці беларусаў і тармажэньне разьвіцьця іх мовы і літаратуры спрыяла пашырэньню сярод інтэлігенцыі апазыцыйных настрояў, якія прыводзілі яе ў польскі незалежніцкі рух, чаму спрыялі традыцыйныя ўплывы польскай культуры ў Беларусі. Асабліва небясьпечнай з гледзішча дзяржаўных інтарэсаў Расеі была актывізацыя дзейнасьці Польскай Сацыялістычнай Партыі (ППС), якая ў канцы XIX ст. сфармулявала праграму супольнае барацьбы з царызмам ды імкнулася да пашырэньня сваёй дзейнасьці сярод беларусаў, літоўцаў і ўкраінцаў, паслугуючыся, між іншага, агітацыйнай літаратурай на іхніх мовах[12]. Палітычныя саступкі царызму яўна адпавядалі культурным імкненьням гэтых народаў і былі разьлічаныя на тое, каб заручыцца іх лаяльнасьцю да Расеі і тым самым стварыць процівагу польскім палітычным уплывам.

Цяжэй адназначна ацаніць, ці гэты крок ураду сапраўды сьведчыў пра прызнаньне права беларускага народу на вольнае разьвіцьцё мовы і літаратуры, ці быў толькі тактычным ходам. Аб прапагандысцкім аспэкце ўказу сьведчыць даволі абмежаваная сфэра ўжытку беларускай мовы. Да таго ж не адбылося афіцыйнага прызнаньня яе адметнасьці. Яе не дапусьцілі і да ўжытку ў дзяржаўных школах нават у такім сьціплым маштабе, як польскую і літоўскую. Аднак ацэнка такога стаўленьня да беларускай мовы павінна браць пад увагу факт, што толькі ўвосень 1904 г. была распачатая распрацоўка першага беларускага лемантара, а да выхаду першай граматыкі заставалася яшчэ чатырнаццаць гадоў[13]. Такім чынам, не існавала найменшых перадумоваў для таго, каб сытуацыя зь беларускай мовай адразу зьмянілася. Дзеля гэтага, пакідаючы ўбаку больш ці менш абгрунтаваныя ацэнкі нацыянальнай палітыкі ўраду, можна з пэўнасьцю сьцьвердзіць, што ўказ Мікалая II стварыў магчымасьць для дзеяньняў на карысьць зьмены сытуацыі з гэтай мовай у будучыні. Урад сапраўды ня быў зацікаўлены ў паскарэньні гэтага працэсу, але прынцыпова не тармазіў, пакідаючы яго ажыцьцяўленьне беларускай інтэлігенцыі.

---

[9] Александровіч С. Гісторыя... С. 166.

[10] Беларускія пісьменнікі другой паловы XIX стагоддзя. Зборнік тэкстаў. Мінск, 1956. С. 317.

[11] Александровіч С. Гісторыя... С. 205—207.

[12] З гісторыі беларускага выдавецкага руху ў 1902—1905 гадох. С. 41—54 гэтага выданьня. — *Рэд.* Płochacki L. (Wasilewski L.) We wspólnym jarzmie. Londyn, 1901.

[13] Генэза і аўтарства першага беларускага лемантара. С. 31—40 гэтага выданьня. — *Рэд.*

Выкарыстаць гэтую магчымасьць узяўся малады выпускнік Пецярбурскага тэхналягічнага інстытуту інжынэр–тэхноляг Вацлаў Івaноўскі, які пасьля праходжаньня ў другой палове 1904 г. пасьлядыплёмнай практыкі ў цукроўні Баравічкі пад Плоцкам у пачатку 1905 г. вярнуўся ў Пецярбург і распачаў навуковую працу ў лябараторыі інстытуту. Выдавецкую дзейнасьць ён пачаў яшчэ падчас сваёй вучобы, засноўваючы з гэтай мэтай нелегальныя арганізацыі — у 1902 г. Беларускую Рэвалюцыйную Партыю, а пасьля яе распаду на пачатку 1903 г. "Круг Беларускай Народнай Прасьветы". Вынікам гэтай дзейнасьці было некалькі выданьняў, што выйшлі ў 1902—1904 гг. у Пецярбургу і Кракаве[14]. Аднак у новых варунках, якія дазвалялі разьвіваць пастаянную і значна шырэйшую дзейнасьць, неабходныя былі таксама большыя сродкі для дзейнасьці — перш за ўсё грошы і адпаведныя супрацоўнікі. З гэтага гледзішча сытуацыя беларускіх выдаўцоў была найцяжэйшай. Гэта пацьвярджае той факт, што ў 1905 г., г.зн. неўзабаве пасьля выхаду царскага ўказу, у Вільні пачалі выходзіць польскія і літоўскія кнігі і часопісы, аднак не было выдадзена ніводнай беларускай кнігі[15].

Шукаючы супрацоўнікаў з адпаведнымі творчымі інтарэсамі і фінансавымі магчымасьцямі, Івaноўскі ўскладаў асаблівыя надзеі на Аляксандра Ельскага — памешчыка з Замосься Менскай губ., аўтара шматлікіх артыкулаў пра Беларусь, яе мінуўшчыну, мову і літаратуру, аўтара і выдаўца колькіх папулярных кніжак па–беларуску, перакладніка першай кнігі "Пана Тадэвуша" Адама Міцкевіча на беларускую мову, якую выдаў у 1893 г. у Львове[16]. Пра гэта сьведчаць захаваныя ў Галоўным архіве старадаўніх актаў у Варшаве лісты Іваноўскага да Ельскага, якія ўтрымліваюць у тым ліку каштоўныя зьвесткі пра іншыя аспэкты беларускай выдавецкай дзейнасьці на пачатку XX ст, у т.л. пра арганізацыю суполкі "Загляне сонца..."[17]. (У дадатку зьмешчаны фатакопіі ўсіх гэтых лістоў на беларускай мове).

24 лютага 1905 г. Іваноўскі адправіў Ельскаму свой першы ліст:

Пане Шанаваны,

Чуў я ня раз ад усялякіх людзей і ад панаваго братанца, што вельмі Вы любіце нашу мову і пішэце самы іншы раз у нашай мове. То я хацеў пазнаёміцца з Вамі хаця праз пісулькі, бо што ж, Вы жывецё ў Міншчыні, а я ў Пецербурху.

А такіх людцоў, што нашу мову дый нашага мужыка любяць, мала на сьвеце, то трэба каб хаця кампаніі пілнавалі. А Вы, Пане, самы шмат рабілі, мо і цяпер тае працы не кінулі. Здаецца, мелі Вы выдаць "Марыю" Мальчэўскага, праўда?

Тутака таксама ёсьць людцоў колькі, то пералажылі ксёнжачак крыху, толькі з грашмі кепска... (далей нечытальны выраз. — *Ю.Т.*)

Але таксама, ушоў не апушчаючы, прыгатавалі "Сыгнал" Гаршына, "Міхалка" Пруса, "Крыста" Канапніцкае, "Гутаркі аб небе і зямлі". Лемантарчык (павэдлуг Промыка) будзе гатоў да друку за месяц.

---

[14] Гэтую дзейнасьць я падрабязна прааналізаваў у артыкуле "З гісторыі беларускага выдавецкага руху ў 1902—1905 гадох" (гл. зацем 12), у якім абгрунтаваў тэзу, што выданьне ў 1904 г. колькіх беларускіх тэкстаў у Кракаве было справай пецярбурскага Кругу Беларускай Народнай Прасьветы. Цягам далейшых дасьледаваньняў я выявіў, што аналягічны пагляд на дадзенае пытаньне ў 1918 г. выказаў прафэсар Бэрлінскага ўнівэрсытэту Фрыц Куршман. Гл. яго ж. Die Weissruthenen. Ein erwaschendes slavisches Bauernvolk // Deutsche Rundschau. T. 176. Berlin, 1918. Гэтае пацьверджаньне асабліва істотнае на фоне дагэтулешніх меркаваньняў, што арганізатарам кракаўскіх выданьняў быў Мар'ян Фальскі. Гл. Александровіч С. Пуцявіны... С. 120—122.

[15] Александровіч С. Гісторыя... С. 207.

[16] Шырэй аб Ельскім гл.: Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. Т. 4. Мінск, 1971. С. 380.

[17] AGAD, zespoł Prozorów i Jelskich, sygn, 140_2.

І так мне здаецца, што Вы ня менш маеце чаго, от каб усё зараз і выдрукаваць — от былобы дабро. Адпішыце, Паночку, калі часу знойдзеце крыху.

В. Івяноўскі.

На ўвагу заслугоўвае другі абзац ліста, у якім Іваноўскі паведамляў пра прыгатаваньня "колькімі людцамі" пераклады. Вядома, што брашура Ўсевалада Гаршына ў беларускім перакладзе была выдадзена ў Маскве ў 1891 г., а яе другое нязьмененае выданьне зьявілася ў Вільні ў 1914 г., таму інфармацыя пра ейны пераклад у Пецярбургу не адпавядала сапраўднасьці. Ніколі таксама суполка "Загляне сонца..." ня выдала згаданых апавяданьняў Пруса і Канапніцкай, што дазваляе меркаваць, што і гэтая інфармацыя была фікцыйнай або што пераклад абодвух гэтых апавяданьняў толькі яшчэ задумваўся. Таму можна меркаваць, што гэта своеасаблівая містыфікацыя была разьлічана на тое, каб зрабіць на Ельскага ўражаньне, быццам выдавецкая дзейнасьць у Пецярбургу пачынае разьвівацца, што ў ёй удзельнічае ўжо "колькі людцоў", і ў выніку падштурхнуць яго даць дадатны адказ.

Насамрэч, сытуацыя была горшая, чым яе акрэсьліў Іваноўскі. Пераклад згаданай у лісьце "Гутаркі аб небе і зямлі", як пададзена на тытульнай старонцы гэтай кнігі (выдадзенай у 1907 г.), меўся быць зроблены Казімерам Кастравіцкім і С. Шаўлоўскім. Аднак постаць Шаўлоўскага зусім невядомая ў беларускай літаратуры, што дае падставу дапушчаць, што гэта быў псэўданім Вацлава Іваноўскага, які або пераклаў кнігу разам з Кастравіцкім, або таксама — што здаецца больш праўдападобным — грунтоўна паправіў пераклад Кастравіцкага. Той факт, што яна мела 68 старонак друку, дазваляе меркаваць, што пераклад быў падрыхтаваны не пасьля выхаду царскага ўказу, але крыху раней. Лемантар гэтаксама апрацоўваў Іваноўскі. Да таго ж Кастравіцкі ня жыў у Пецярбургу, як і Алёйзія Пашкевіч (Цётка), якая рыхтавала ў той самы час першую беларускую чытанку. Такім чынам, гэтай парой у гэтай галіне ў Пецярбургу дзеяў адзін Іваноўскі, і таму зьмешчаная ў яго лісьце інфармацыя аб калектыве, які складаецца зь некалькіх чалавек, адпавядае барждзэй перабольшаньням аўтара, што маюць мала супольнага з сапраўднасьцю.

Як сьведчыць далейшая карэспандэнцыя, адказ Ельскага на прапанову зьяднаць выдавецкія намаганьні быў адмоўны ці расплывісты. Істотнай прычынай гэтага быў удзел Іваноўскага ў Беларускай Сацыялістычнай Грамадзе, што магло ўзбуджаць у Ельскага — прыхільніка сацыяльнага кансэрватызму — асьцярогу, што выдавецкая дзейнасьць у Пецярбургу будзе адлюстроўваць радыкальныя праграмныя палажэньні гэтай партыі. Ня выключана таксама, што, стоячы на грунце традыцыйнай у ягоным асяродку формулы "gente Rutheni, natione Poloni", ён не салідарызаваўся з мэтамі моладабеларускага руху. Пра гэта можа сьведчыць шматзначная зацемка на канвэрце атрыманага ліста: "Białorusin Iwanowski"[18].

Аднак у тагачасных умовах практычна толькі памешчыцкі асяродак быў у стане забясьпечыць істотнымі фінансавымі сродкамі выдавецкую дзейнасьць. Духавенства ж, якое было важным натхняльнікам нацыянальнага руху ў Літве, у тагачасных беларускіх умовах яшчэ не ўваходзіла ў разьлік. Пры такім стане рэчаў, нягледзячы на першую няўдачу, Іваноўскі 31 красавіка 1905 г. зноў зьвяртаецца да Ельскага:

Ці ня маеце знаёмых якіх, што захацелі б ксёнжачак выдаць па-нашаму? Тож ёсьць напісаныя. Кажуць, што Вайніловіч — той мог бы выдаць, мо знаеце яго?

Задума абаперціся на Эдварда Вайніловіча была сьмелая і далёкасяжная: Вайніловіч

[18] Тамсама.

быў ня толькі земляўласьнікам у Беларусі, але і старшынём Сельскагаспадарчага таварыства ў Менску, у сувязі з чым ягоная прыхільнасьць рэальна паўплывала б на пазыцыю і падтрымку беларускага абшарніцтва. На добры лад, гэтая задума не была цалкам беспадстаўная — Вайніловіч ставіўся з сымпатыяй да выдавецкай дзейнасьці Ельскага на беларускай мове, пра што Іваноўскі, напэўна, ведаў[19]. Аднак з прычыны рэвалюцыйных падзеяў 1905 г. і Вайніловіч адмовіўся дапамагаць. Пра тое, што Вайніловіч кіраваўся клясавымі поглядамі, ён недвухсэнсоўна напісаў у сваіх "Успамінах":

> Ад беларускіх суполак заўсёды, беручы ў іх сякі–такі матэрыяльны ўдзел, я ўрэшце адыйшоў, бо праца, пачатая ў іх у кірунку самапазнаньня і нацыянальнага адраджэньня ("Лучынка", "Саха", "Загляне сонца і ў наша аконца" і г.д.), у канцы набыла сацыялістычныя лёзунгі і кірунак, якому я ня мог пакланяцца насуперак маім перакананьням[20].

Увесну 1905 г. Іваноўскі абдумваў таксама іншую канцэпцыю, што прадугледжвала стварэньне выдавецкага таварыства, якое б дзеяла паводле прынцыпаў каапэратыву ці акцыйнай суполкі. Ён выклаў гэтую задуму ў лісьце да Ельскага ад 15 траўня 1905 г. гэтак:

> Пане сваяча, а каб зрабіць таварыства для друкаваньня беларускіх ксёнжачак, так, як Украінцы маюць, то добра было. Здаецца мне, што можна было б знайсьці людцоў, хто плацілі б у год — мо рублёў па дзесяць — тож знайсьці можна людцоў з 20 на пачатак — от і дзьве ксёнжкі штогод аддрукавалі б.

Цяжка сьцьвярджаць, ці задума стварэньня суполкі была выключна вынікам немагчымасьці знайсьці сярод абшарнікаў адпаведнага мэцэната. Дата зацытаванага паказвае, што ён быў напісаны адносна рана, а таму можна яго трактаваць барджджэй як альтэрнатыўную канцэпцыю. Аднак ужо найбліжэйшая будучыня паказала, што толькі шляхам калектыўных высілкаў можна было стварыць неабходныя падставы для дзейнасьці, хаця з прычыны малалікасьці, незаможнасьці і ў вялікай ступені абыякавасьці беларускай інтэлігенцыі і такі шлях напачатку не даваў надзеі сабраць сур'ёзныя фінансавыя сродкі. Пра гэта красамоўна сьведчыў разьлік выдаваць толькі дзьве кніжкі ў год.

Вынік арганізацыйнай дзейнасьці ў другой палове 1905 г. і на пачатку 1906 г. быў, аднак, больш аптымістычны. 1 студзеня 1906 г. у суполцы налічвалася ўжо 45 удзельнікаў з унёскамі па 10 руб., значыць, суполка распараджалася прынамсі 450 руб. Адначасова была створаная ўправа з шасьці г.зв. сяброў–заснавальнікаў, якія ўнесьлі 250 руб. Такім чынам, агульны капітал суполкі склаў на пачатку 1906 г. 700 руб., што дазваляла распачаць выдавецкую дзейнасьць.

Працы Александровіча і Семашкевіча не даюць адказу на пытаньне, хто ж былі першыя супольнікі выдавецтва. Аднак, мяркуючы па дзесяцірублёвых унёсках, сярод іх не было Вайніловіча ці іншых багатых людзей. Вядомы склад управы суполкі. Старшынём стаў Вацлаў Іваноўскі, а сакратаром — пецярбурскі службовец Уладзіслаў Сталыгва.

---

19 У гэтым кантэксьце варта прывесьці характэрнае выказваньне Эдварда Вайніловіча, пададзенае ў лісьце да Ельскага (ад 12 траўня 1896 г.) пасьля атрыманьня яго беларускіх брашур: "Шаноўны Пане Дабрадзею, я перакананы, што гэтыя беларускія брашуркі борзда разыйдуцца <...>, калі наша шматлікае абшарніцтва зьбярэцца на пасяджэньні Сельскагаспадарчага Таварыства ў Менску: кожны з нас засынаў у калысцы пад народныя песьні нашых нянек і выхавацелак. *Кожны на гэтай мове <...> гаворыць зь мясцовым народам*, і ўсе *старадаўнія радавыя дакумэнты* звычайна *напісаныя на гэтай мове*: таму чэсьць Шаноўнаму пану, што пасьля доўгай пярэрвы да нас адазваліся так па–свойску". Тамсама, справа 140, к. 141—144 (вылучана мною. — *Ю.Т.*).

20 Вайніловіч Э. Успаміны 1847—1928. Ч. 1. Вільня, 1931. С. 210—211.

Сябрамі ўправы былі пэдагог і супрацоўнік унівэрсытэцкай бібліятэкі Браніслаў Эпімах–Шыпіла, інжынэр–тэхноляг Юры (Ежы) Іваноўскі — старэйшы брат Вацлава, дзяяч ППС; студэнт Горнага інстытуту Вінцэнт Валейка і настаўнік школы пры лютаранскім храме сьв. Пятра ў Пецярбургу Уладзіслаў Калашэўскі[22].

13 траўня 1906 г. згаданыя сябры–заснавальнікі ўклалі да канца 1908 г. натарыяльную дамову, паводле якой несьлі салідарную адказнасьць за дзейнасьць і абавязаньні суполкі[23]. Але ў беспасярэдняй дзейнасьці выдавецтва яны выконвалі розную ролю. На першым яе этапе (да канца 1908 г.) практычна ўсю рэдакцыйную працу рабілі два чалавекі — Вацлаў Іваноўскі і Браніслаў Эпімах–Шыпіла. Абодва вылучаліся вялікай працавітасьцю, прычым энэргія і прадпрымальнасьць першага ўдала дапаўнялася эрудыцыяй і скрупулёзнасьцю другога. Яны былі знаёмыя колькі гадоў, але Шыпіла, нягледзячы на зацікаўленьне беларускаю літаратурай, у 1902—1904 гг. ня браў удзелу ў выдавецкай дзейнасьці нелегальных беларускіх арганізацыяў у Пецярбургу[24]. Ён далучыўся да гэтай дзейнасьці толькі ў 1905 г., ужо ў легальных умовах, перадаўшы ў распараджэньне суполкі частку свае кватэры на Васільеўскім востраве (4 лінія, кв. 45)[25]. Астатнія сябры ўправы выконвалі адміністрацыйныя функцыі, як Сталыгва, ці абмяжоўваліся фінансавым удзелам[26].

Спрэчным застаецца пытаньне, калі суполка "Загляне сонца..." пачала выдавецкую дзейнасьць. На думку Александровіча, гэта адбылося толькі пасьля яе фармальнага заснаваньня ў траўні 1906 г., і тады ж — пісаў ён — "досыць апэратыўна <...> пачынаецца праца над рукапісамі беларускіх падручнікаў, якія неўзабаве былі здадзеныя ў друк і вышлі ў кастрычніку—лістападзе 1906 г."[27]. У сапраўднасьці, як я заўважыў вышэй, рукапісы гэтых падручнікаў, г.зн. лемантара, чытанкі Цёткі і "Гутарак аб небе і зямлі", былі падрыхтаваныя ўжо ў 1904—1905 гг. Іваноўскі ў чарговым лісьце да Ельскага ад 17 красавіка 1906 г. паведаміў важныя зьвесткі наконт таго, калі быў распачаты іх друк[28]:

> Некалькі людцоў "тутэйшых", што ў Пецярбурху жывуць, залажылі выдаўніцкую суполку. Цяпер адбіваецца элемэнтар, будзе дваякімі знакамі, гэта значыць, папросту кажучы, зразу будуць два элемэнтары. Ці не прыступілібы і Вы да тае суполкі? Удзялы, з правам карыстаньня з зыску, будуць па 10 рублёў кожны.
>
> Не гуляючы будзе адбіты ўстаў суполкі, то Вам яго прышлю поштаю.

Зацытаваная інфармацыя Іваноўскага сьведчыць, што дату ўкладаньня натарыяльнай дамовы сяброў–заснавальнікаў суполкі (13 траўня 1906 г.) нельга атаясамліваць з

[22] Тамсама: AGAD, zesp. Prozorow i Jelskich, 140_1, k. 160. Ліст Сталыгвы да Ельскага 29.07.1906.

[23] Наша Ніва. 1909. 22 кастрычніка.

[24] Што да сустраканых часам у літаратуры на гэтую тэму адрозных поглядах на гэтую справу трэба сказаць, што Цётка — актыўная дзяячка гэтых арганізацыяў падчас свайго перабываньня ў Пецярбургу (1902—1904 гады), наагул ня ведала Браніслава Шыпілы. Гэта несумненна пацьвярджае яе ліст да Шыпілы (ад 28 чэрвеня 1906 г.), у якім яна, між іншым — пісала: "Выбачайце, што незнаёмая і пішу да вас. Я Пашкевічанка, вам аба мне казаў Іваноўскі, бо то калісь прабавала вершы пісаць і іх вам чыталі". Гл.: Бібіла Ю. Матар'ялы да біографіі Цёткі // Запіскі аддзелу гуманітарных навук ІБК. Кн. 2. Працы клясы філёлёгіі. Т. I. Менск, 1928. С. 296.

[25] Перадача часткі кватэры пад сядзібу суполкі, безумоўна, была формай матэрыяльнага ўнёску Б. Шыпілы.

[26] Такой была ў прыватнасьці роля Юр'я Іваноўскага. Бо ў адрозьненьне ад малодшых братоў, Вацлава і Тадэвуша, адзін зь якіх самаакрэсьліўся як беларус, а другі — як літовец, Юры ўважаў сябе за паляка, што прынамсі не перашкаджала яму падтрымліваць беларускія ініцыятывы брата.

[27] Александровіч С. Гісторыя... С. 170, 172.

[28] Ліст не датаваны. Штамп пецярбурскай пошты на капэрце сьведчыць, што ён быў высланы 17 красавіка 1906. Гл.: AGAD, zesp. Prozorów i Jelskich, 140_2.

датаю яе заснаваньня. Суполка ўзьнікла раней і сама позна ў пачатку красавіка 1906 г. здала ў друк першыя кнігі. Таму найбліжэйшаю да сапраўднасьці датаю заснаваньня суполкі трэба было б лічыць 1 студзеня 1906 г.— дату яе першае фінансавае справаздачы.

Ранейшае, чым меркавалася, узьнікненьне суполкі "Загляне сонца...", а не яе асаблівая апэратыўнасьць (хаця і з гэтага гледзішча яна была бездакорная), тлумачыць хуткае ажыцьцяўленьне праграмы выданьня падручнікаў. Ужо ў ліпені быў надрукаваны "Biełaruski lemantar abo pierszaja nawuka czytańnia" (лацінскі варыянт) і сэрыя паштовак[29], а на працягу бліжэйшых тыдняў яго варыянт кірыліцай і "Першае чытаньне для дзетак беларусаў" Цёткі (таксама ў абодвух графічных варыянтах). У сярэдзіне верасьня суполка прапаноўвала памянёныя кнігі і 12 розных паштовак[30]. Трэці падручнік, "Гутаркі аб небе і зямлі", выйшаў на пачатку 1907 г.

Чарговым пунктам праграмы суполкі было выданьне твораў беларускай клясыкі XIX ст. (сэрыя "Народныя песьняры"). Гэтая праграма была апублікаваная 2 сьнежня 1906 г. у "Нашай Ніве", а на пачатку 1907 г. была троху пашыраная. Яна прадугледжвала выданьне па падпісцы твораў Багушэвіча: "Дудка беларуская", "Смык беларускі" і "Скрыпачка беларуская", дзьве першыя кнігі "Пана Тадэвуша" ў перакладзе Вінцэнта Дуніна–Марцінкевіча і ягоных арыгінальных твораў "Гапон", "Вечарніцы", "Шчароўскія дажынкі", "Стаўры–Гаўры" і "Купала". Выдавецтва ў 1906 г. абяцала скончыць сэрыю найпазьней да вясны 1908 г.[31] Прычынаю такой пасьпешлівасьці мог быць меркаваны працяглы выезд Іваноўскага ў Мюнхэн: у тамтэйшым політэхнічным інстытуце ён рыхтаваўся да абароны доктарскай дысэртацыі, прысьвечанай вырошчваньню цукровага бурака ў Віленскай губэрні.

Аднак на гэты раз суполка пераацаніла свае выдавецкія магчымасьці, бо да сакавіка 1908 г. у гэтай сэрыі зьявіліся толькі 4 кнігі: "Дудка беларуская" і "Смык беларускі" Багушэвіча, "Пан Тадэвуш" у перакладзе В. Дуніна–Марцінкевіча і ягоны "Гапон". Акрамя таго, калі меркаваць па абвестцы ў "Нашай Ніве" 11 сакавіка 1908 г., у лютым ці сакавіку таго году суполка выдала першы томік вершаў Янкі Купалы "Жалейка".

Абставінам выхаду першай кнігі будучага вялікага беларускага паэта гісторыкі прысьвяцілі шмат увагі. Антон Луцкевіч прыпісваў у гэтай справе вялікія заслугі кіраўніцтву "Нашай Нівы", зазначаючы, што "моцным імпульсам для яго (Купалы. — *Ю.Т.*) было выданьне ў Вільні ў канцы 1906 г. першых легальных беларускіх газэт — "Нашай Долі" і "Нашай Нівы". "Рэдакцыя, — пісаў А. Луцкевіч, — адразу ацаніла здольнасьці паэта і пачала зьмяшчаць на пачэсным месцы ягоныя творы"[32]. Насамрэч, аднак, у "Нашай Долі" не было надрукавана ніводнага твору Купалы, а першы ягоны верш — "Касцу" — "Наша Ніва" надрукавала толькі 11 траўня 1907 г. Тым часам ужо ў канцы 1906 г. рукапіс "Жалейкі" знаходзіўся ў выдавецтве "Загляне сонца...", куды яго пераслаў апякун маладога паэта менскі публіцыст Уладзімер Самойла[33]. Пра тое, што пецярбурская суполка высока ацаніла творчасьць Купалы, найлепш сьведчыць факт, што ўжо ў лістападзе 1906 г. яна паведаміла пра хуткае выданьне "Жалейкі", просячы адначасна дасылаць грошы на адрас Уладзіслава Сталыгвы[34].

Робячы стаўку на Пецярбург, а не на Вільню, Купала, безумоўна, разьлічваў, што такім чынам ён барджэй дачакае асобнага кніжнага выданьня сваіх вершаў, што, відавочна, цаніў вышэй, чым іх публікацыю ў расьцярушаным газэтным выглядзе. І сапраўды, выданьне "Жалейкі" доўжылася каля 16 месяцаў, лічачы ад згаданай абвесткі, што і на сёньняшнія меркі ня надта доўга. Да таго ж выдавецтва мела сваю ўласную праграму

[30] Гл. рэпрадукаваны ліст В. Іваноўскага да Ельскага ад 1 жніўня 1906 г.

[31] Наша Доля. 1906. 15 верасьня.

[32] Бурачок М. (Багушэвіч Ф.). Дудка беларуская. Пецярбург, 1907. Абвестка суполкі на вокладцы.

[33] Навіна А. (Луцкевіч А.). Адбітае жыцьцё. Вільня, 1929. С. 43.

[34] Пуцявінамі Янкі Купалы. Дакументы і матэрыялы. Мінск, 1981. С. 55.

— выданьне беларускіх клясыкаў, да якіх Купала тады не належаў. Відавочна, аднак, ён не адзначаўся асаблівай сьціпласьцю і цярплівасьцю, пра што сьведчыць наступная вершаваная эпіграма, напісаная ў чаканьні "Жалейкі":

Горы абяцаці —
Ня споўніць крыхі —
Не сьвятыя лепяць
Гэтыя гаршкі.

Ёсьць у нас "суполка" —
Цешся, беларус,
Тваёй мовай кніжак
Надрукуе стус.

Ой, сьпяшыць суполка
Кніжкі выдаваць,
Хіба на тым сьвеце
Будзем іх чытаць[35].

Да вясны 1908 г. суполка "Загляне сонца..." выдала дзесяць кніг і паўтара дзясяткі паштовак. Імкнучыся пашыраць сваю прапанову, суполка ўзяла на склад колькі ранейшых беларускіх пецярбурскіх выданьняў ("Вязанка" Я. Лучыны, "Казкі", "Кароткі катэхізм" Філяхоўскага), а таксама пару пазыцыў, выдадзеных "Нашай Нівай", і розныя беларусазнаўчыя працы на расейскай і польскай мовах, у тым ліку "Словарь белорусского наречия" І. Насовіча, "Piosnki wieśniacze znad Niemna i Dźwiny" Я. Чачота, працы М. Доўнар–Запольскага, Я. Карскага і іншыя. Адначасова суполка арганізавала дыстрыбуцыйную сетку, укладаўшы дамовы з кнігарнямі. Увесну 1908 г. беларуская кніга была даступная ня толькі ў Пецярбургу, але ў колькіх віленскіх кнігарнях, у Менску, Віцебску, Горадні, Магілёве, Гомелі, Слоніме, а таксама ў варшаўскай кнігарні Габрыэля Цэнтэршвэра на Маршалкоўскай, 143[36].

Першы этап дзейнасьці суполкі вызначыла дамова, укладзеная паміж яе заснавальнікамі, якая дзеяла да канца 1908 г. Аднак фактычна гэты этап закончыўся ўжо ўвесну, што вынікае з факту, што з таго часу аж да восені 1909 г. суполка ня выдала ніводнай кнігі. На гэта паўплывалі дзьве акалічнасьці. Адной зь іх быў выезд Іваноўскага ў Мюнхэн, безь якога, як высьветлілася, астатнія сябры ўправы няшмат маглі зрабіць. Другою ж прычынай была пастанова Пецярбурскай судовай палаты, прынятая ўвосень 1908 г. пасьля звароту Віленскага камітэту па справах друку (цэнзуры), аб затрыманьні пераважнай непрададзенай часткі накладу твораў Багушэвіча "Дудка беларуская" і "Смык беларускі" і пачатку сьледзтва для высьвятленьня вінаватых у выданьні гэтых "нядобранадзейных" твораў. На кароткі час пагроза канфіскацыі навісла таксама над "Жалейкай" Купалы[37].

Гэтыя здарэньні гнятліва паўплывалі на Шыпілу, які, зважаючы на сваё службовае становішча, стараўся ўнікаць сутыкненьняў з уладай. Істотную ролю пры гэтым адыгрывала тая акалічнасьць, што сядзіба суполкі знаходзілася ў ягонай кватэры, і ён пачуваўся асабліва адказным за яе дзейнасьць, хоць і ня быў яе кіраўніком. Ня выключана, што Шыпіла здагадваўся пра сувязі Іваноўскага зь нелегальным выдавецтвам "Грамада".

[34] Наша Ніва. 1906. 24 лістапада.
[35] Полымя. 1929. Сакавік. С. 86.
[36] Наша Ніва. 1908. 11 сакавіка.
[37] Александровіч С. Гісторыя... С. 177; Пуцявінамі Янкі Купалы... С. 59—69.

што павялічвала пачуцьцё небясьпекі[38]. Таму пасьля сканчэньня 31 сьнежня 1908 г. дзеяньня дагэтулешняй дамовы заснавальнікаў ён выйшаў з управы суполкі, параіўшы ёй пашукаць іншае памяшканьне. Пры адсутнасьці Іваноўскага справамі суполкі займаўся яе бухгальтар Антон Грыневіч, які ў другой палове 1908 г. жыў у яе памяшканьні, г.зн. у Шыпілы[39].

Канец крызіснай сытуацыі паклала новая дамова сяброў–заснавальнікаў, укладзеная ў Пецярбургу 30 красавіка 1909 г., згодна зь якой аднаўлялася дзейнасьць выдавецкага таварыства "Загляне сонца...". З ранейшага складу ўправы выбылі Шыпіла і Уладзіслаў Калашэўскі, засталіся Вацлаў і Юры Іваноўскія, Сталыгва і Валейка. Акрамя таго, далучыліся новыя сябры: Сабіна Іваноўская (жонка Вацлава), адзін з старэйшых беларускіх дзеячоў у Пецярбургу інжынэр–тэхноляг Антон Неканда–Трэпка разам з жонкай Юліяй, Антон Грыневіч і Генрык Ражноўскі. Паводле палажэньняў новай дамовы, кіраўніком выдавецтва надалей застаўся Вацлаў Іваноўскі, а ягоны брат стаў адказным рэдактарам. Адначасна быў заяўлены новы адрас суполкі, якая цяпер разьмяшчалася ў зьнятай кватэры на Васільеўскім востраве, 6 лінія, 1, кв. 20[40].

Шмат сьведчыць пра тое, што гэты другі склад сяброў суполкі быў падабраны з увагі на фінансавыя патрэбы. Новыя сябры зрабілі значна большыя ўнёскі. Мабыць, павялічылі свае ўнёскі і дагэтулешнія сябры. Сукупны аб'ём унёскаў сяброў–заснавальнікаў, які ў 1906—1908 гг. павялічыўся толькі з 220 да 315 рублёў, 1 красавіка 1910 г. склаў 800 руб., доля акцыянэраў склала 750 руб., а ўсе актывы суполкі сягнулі 4070 руб.[41]. Паляпшэньне эканамічнай сытуацыі стварала магчымасьць пашырэньня выдавецкай дзейнасьці, аднак яе выкарыстаньне залежала ад вырашэньня кадравых цяжкасьцяў. Функцыя Юр'я Іваноўскага як адказнага рэдактара ад пачатку была фікцыйная, да таго ж у 1910 г. ён зьехаў на некалькі гадоў зь Пецярбургу ў Маскву. Увосень таго ж году, скончыўшы Горны інстытут, зь Пецярбургу зьехаў Валейка, а ўсьлед за ім Сталыгва[42]. Аднак абнадзейваў Грыневіч, які праяўляў як творчыя зацікаўленьні, гэтак і выдавецкія амбіцыі[43]. Таму Іваноўскі ў 1909 г. пасяліў яго ў новым памяшканьні выдавецтва і даверыў яму на летні час выконваць абавязкі яго кіраўніка[44].

У канцы 1909 г. Іваноўскі запрасіў у Пецярбург Купалу, які з восені 1908 г. жыў у Вільні, дзе працаваў у бібліятэцы "Знание" Барыса Даніловіча і супрацоўнічаў з рэдакцыяй "Нашай Нівы". Гэтае запрашэньне адлюстроўвала як інтарэсы выдавецтва "Загляне сонца..." (мелася ўзмацніць яго рэдакцыйныя сілы), гэтак і асабісты інтарэс паэта, які такім чынам здабываў магчымасьць паглыбленьня свае адукацыі, творчага разьвіцьця і, галоўнае, — беспасярэдняга ўдзелу ў выданьні сваіх чарговых твораў. 4 сьнежня 1909 г. Купала ўжо быў прапісаны ў памяшканьні суполкі на 6–й лініі, дом 1, дзе на працягу

---

[38] Выдавецтва "Грамада" выдала ў Пецярбургу прынамсі чатыры брашуры: I.Cігов (I.Sihow) Што такое свабода? 1906; Чы будзе для ўсіх зямлі? 1906; Гуторка об тым куды мужыцкіе грошы ідуць. 1907; Забастоўка. 1907. Як назва выдавецтва, так і памянёныя агітацыйныя брашуры паказваюць, што яго дзейнасьцю кіравала Беларуская Сацыялістычная Грамада.

[39] Весь Петербург на 1909 г.

[40] Наша Ніва. 1909. 22 лістапада.

[41] Маладая Беларусь. 1912. Сш. 1. С. 153; Александровіч С. Гісторыя... С. 178.

[42] Як сьведчаць асабістыя дакумэнты В. Валейкі, якімі валодае ягоная сям'я ў Варшаве, 15 лістапада 1910 г. ён пачаў працаваць горным інжынэрам у Шчарбінаўскай шахце ў Данбасе. Паводле інфармацыі Людвікі Войцік (Зоські Верас) зь Вільні, Сталыгва ўжо ў 1912 г. жыў у Варшаве і належаў да мясцовага беларускага гуртка.

[43] Былі гэта досыць незвычайныя амбіцыі. Пра гэта сьведчыць выдадзеная ў 1909 г. у Вільні "кніга" А. Грыневіча "Як бараніцца ад халеры", якая налічвала цэлыя... 2 старонкі.

[44] Александровіч С. Гісторыя... С. 179; Весь Петербург на 1910 г.

некалькіх месяцаў жыў разам з Грыневічам і толькі ў чэрвені 1910 г. стаў кутнікам Шыпілы[45].

У асобе Купалы суполка здабыла каштоўнага супрацоўніка, прычым карысьць ад гэтага супрацоўніцтва была ўзаемная — тут, у Пецярбургу, выйшла шэсьць першых кніг Купалы: "Жалейка", "Адвечная песьня", "Гусьляр", "Сон на кургане", "Паўлінка" і "Шляхам жыцьця". Гэтае дасягненьне далёка выходзіла за асабістыя матывацыі, бо мела неперайзыходнае значэньне для беларускай літаратуры.

Значэньне Купалы як рэдакцыйнага супрацоўніка зьвязана і зь нечаканаю адмоваю Грыневіча ўдзельнічаць у суполцы і пачаткам ягонай самастойнай выдавецкай дзейнасьці ў Пецярбургу. Згодна з дасьледаваньнямі Сьцяпана Александровіча, гэты "разрыў" адбыўся ўвосень 1910 г., аднак дасьледнік не правёў аналізу яго прычынаў[46]. Між тым гэтая падзея выглядае настолькі дзіўнай, што патрабуе тлумачэньня — з аднаго боку, удзел у "Загляне сонца..." ня толькі не перашкаджаў Грыневічу рэалізаваць свае выдавецкія задумы, але значна іх палягчаў, а з другога — цяжка дапусьціць, каб адасабленьне Грыневіча было наступствам асабістых канфліктаў з Іваноўскім.

Думаецца, прычына гэтага дзіўнага адыходу Грыневіча вынікала з тагачаснай пазыцыі суполкі. Нягледзячы на спазьненьні ў ажыцьцяўленьні выдавецкай праграмы, ужо ў 1909—1910 гг. суполка набыла вялікую папулярнасьць і ўзбуджала спадзяваньні аўтараў на выданьне сваіх твораў. Праўда, былі спробы заснаваць іншыя выдавецкія таварыствы, аднак яны былі або безвыніковыя (таварыствы "Мінчук" у Менску і "Палачанін" у Вільні), або апыналіся ў цяжкіх матэрыяльных умовах і дзеля гэтага мелі невялікія магчымасьці ("Наша Ніва" ці віленская суполка "Наша Хата"). На гэтым фоне пецярбурская суполка выглядала салідна і спадзеўна, у сувязі з чым да яе сьцякаліся адносна шматлікія выдавецкія прапановы. На яе разьлічвалі ня толькі Купала і Грыневіч, але таксама Якуб Колас, Напалеон Чарноцкі, Вацлаў Ластоўскі ды іншыя. Рамуальду Зямкевічу паабяцалі выдаць ягоныя гісторыю беларускай літаратуры і слоўнік[47], а іншаму (невядомаму) аўтару — працы пра лубін і сэрадэлю[48]. У такой сытуацыі выданьне за кароткі час шасьці Купалавых кніг аўтары, што стаялі ў чарзе, маглі расцэньваць як выкарыстаньне магчымасьцяў суполкі дзеля асабістых мэтаў ейных супрацоўнікаў. Такіх пагалосак Іваноўскі спрабаваў унікаць, у сувязі з чым нават уласныя творы імкнуўся выдаваць не ў Пецярбургу, а ў Вільні і пад рознымі псэўданімамі[49].

Таму асобнае выдавецтва Грыневіча не было канкурэнтным прадпрыемствам, але асаблівао формай супрацоўніцтва, разьлічанай на павелічэньне публікацыяў, каб пры гэтым ня мець непажаданых закідаў. Пра гэта, у прыватнасьці, сьведчыць гісторыя выданьня зборніка вершаў Купалы "Гусьляр". Выдаць яго спачатку плянавала суполка "Загляне сонца...", на што паказвае інфармацыя, зьмешчаная на вокладцы выдадзенай ёй у 1910 г. кніжкі Дуніна-Марцінкевіча "Шчароўскія дажынкі", якая абвяшчала, што "Гусьляр" выйдзе неўзабаве. Аднак, абдумаўшы справу, заканчэньне рэалізацыі гэтага

[45] Пра тое, што, прыбыўшы ў Пецярбург, Купала жыў у памяшканьні суполкі, а не ў Шыпілы, сьведчаць даты прапісак у ягоным пашпарце, апублікаваныя ў кн. "Пуцявінамі Янкі Купалы" (Мінск, 1981. С. 48—49). Пра запрашэньне Купалы Іваноўскім гл. таксама ліст У. Самойлы да Шыпілы ад 2 сьнежня 1909 г. і інфармацыю Ф. Умястоўскага: Беларускі Дзень. 1928. № 6(46). С. 7.

[46] Александровіч С. Гісторыя... С. 184.

[47] Ліст Р. Зямкевіча да Ельскага ад 21.03.1909. AGAD, zesp. Prozorów i Jelskich, 140_2.

[48] Ажэшка Э. Хам (Мужык). Пецярбург, 1912. Інфармацыя суполкі на вокладцы.

[49] Гэта былі: арыгінальная праца В. Іваноўскага, выдадзеная пад псэўданімам Вацюк Тройца, "Цукар. З гутарак зь Дзядзькам Сымонам" (Вільня, 1908), а таксама яго пераклады папулярных брашур А. Семпалоўскага "Гутаркі аб гаспадарцы" і Дулебы К. "Як ратаваць уздутую жывёлу", абедзьве выдадзеныя ў Вільні ў 1909 пад псэўданімамі перакладніка Антось Асіна (А. Карніцкі) і Антось Хатні. Усе тры працы былі раней апублікаваныя ў "Нашай Ніве".

праекту перадалі Грыневічу, у выдавецтве якога ў канцы 1910 г. урэшце і выйшла кніга. Раней ён выдаў "Адвечную песьню" Купалы і "Беларускія песьні з нотамі" (Т. 1) ува ўласнай апрацоўцы. Пра добрыя дачыненьні і супрацоўніцтва паміж абодвума выдавецтвамі сьведчыць таксама факт, што выдадзеныя Грыневічам кнігі суполка "Загляне сонца..." прымала на свой склад і прапаноўвала разам з уласнымі выданьнямі. Ня выключана, што яна "паціху" пакрывала частку выдаткаў на іх.

Другі этап дзейнасьці суполкі "Загляне сонца..." пачаўся з выданьня ў жніўні ці верасьні 1909 г. чарговай кнігі Дуніна–Марцінкевіча "Вечарніцы". Амаль адначасова ў Вільні пад маркаю "Загляне сонца..." выйшла кніга К. Дулебы "Як ратаваць уздутую жывёлу" (кірыліцай і лацінкай) у перакладзе Іваноўскага, а у студзені 1910 г. падручнік Якуба Коласа "Другое чытаньне для дзяцей беларусаў", выдадзены разам зь віленскім таварыствам "Наша Хата". У сярэдзіне таго году выйшлі з друку адным томам два наступныя творы Дуніна–Марцінкевіча "Шчароўскія дажынкі" і "Купала" з прадмоваю — вялікім артыкулам Іваноўскага "Вінцук Дунін–Марцінкевіч і яго жыцьцё". Гэта была адна зь першых спробаў паказу складанай фігуры гэтага пісьменьніка XIX ст. і ацэнкі ягонага значэньня для беларускай літаратуры. Выхадам гэтай кнігі сэрыя "Народныя песьняры" была закончаная. Урэшце, у лістападзе 1910 г. пасьля працяглых захадаў суполкі, якія пацягнулі значныя выдаткі, пецярбурская Судовая палата скасавала рашэньне пра канфіскацыю кніг Багушэвіча "Дудка беларуская" і "Смык беларускі"[50].

Нягледзячы на гэта, суполка не наважылася выдаць ягоную трэцюю кнігу "Скрыпачка беларуская", што прадугледжвалася ў 1906 г.[51].

Апрача гэтага, у 1910—1912 гг. пецярбурская суполка літаграфічным спосабам і накладам 200 або 400 асобнікаў выдала рэпэртуарную сэрыю са сцэнічных твораў. Гэта было як крокам насустрач патрэбам узьнікаючых беларускіх аматарскіх тэатральных трупаў, так і інсьпірацыяй і дапамогай тэатральнаму руху. У сэрыі выйшлі наступныя камэдыі: "Модны шляхцюк" Каруся Каганца (1910), "Сватаньне" Антона Чэхава ў перакладзе Напалеона Чарноцкага (1910), "Пашыліся ў дурні" (1910) і "Па рэвізіі" (1911) Маркі Крапіўніцкага, абедзьве ў апрацоўцы Чарноцкага, і "Міхалка", нібыта перапрацоўка польскай камэдыі, выкананая, як пададзена на тытульнай старонцы, Далецкімі (1911)[52]. Акрамя таго, суполка выдала два драматычныя творы Элізы Ажэшкі — "У зімовы вечар" (1910, пераклад Власта — Вацлава Ластоўскага) і "Хам" (1912), і камэдыю Купалы "Паўлінка" (студзень 1913 г.).

У 1911 г. выйшлі яшчэ два выданьні: невялікае апавяданьне А. Новіча "У дому лепей" і адносна вялікі дапаможнік для пчаляроў Генрыка Бярозкі "Пчаліна — жывёлка малая, а карысьці дае многа". Як сьцьвярджае Ян Станкевіч, псэўданім "Бярозка" належаў ксяндзу Генрыку Бэту — прафэсару духоўнай сэмінарыі ў Сейнах[53].

Такім чынам, пасьля шматмесячнага застою зь вясны 1909 г. дзейнасьць суполкі разьвівалася вельмі пасьпяхова. Разам з узрастаючай колькасьцю выдаваных кніжак павялічыўся іх продаж, які нарэшце пачаў прыносіць прыбытак. Гэта ўмагчыміла рост актываў суполкі. Калі 1 красавіка 1910 г. яны складалі 4070 рублёў, то на працягу наступных 15 з паловай месяцаў яны ўзрасьлі на 50% і 15 верасьня 1911 г. дасягнулі амаль 6000 руб. Асабліва моцна ўзрос у той час аб'ём унёскаў сяброў–заснавальнікаў, які дасягнуў 1500 руб.[54]. Здаровае фінансавае становішча дазволіла суполцы ня толькі пакрываць уласныя выдаткі (на друк, памяшканьне, склад, рэкляму і інш.), але і дафінанса-

[50] Александровіч С. Гісторыя... С. 182.

[51] Дунін–Марцінкевіч В. Шчароўскія дажынкі. Купала. Пецярбург, 1910. Інфармацыя суполкі на вокладцы.

[52] "Далецкія" быў псэўданім В. Іваноўскага. Гл.: Seduro V. The Byelorussian Theatre and Drama. New York, 1955. P. 432.

[53] Станкевіч Я. З гісторыі Беларусі. Мюнхэн, 1958. С. 71.

[54] Маладая Беларусь. 1912. Сш. 1. С. 153.

ваць выданьне календара "Нашае Нівы" на 1911 г.[55]. З гэтага гледзішча суполка "Загляне сонца..." ня мела аналёгіі сярод іншых тагачасных беларускіх выдавецтваў. Дзеля гэтага цяжка пагадзіцца з ацэнкай Рыгора Семашкевіча, што яна была вельмі беднай арганізацыяй[56].

Рацыянальная і пасьлядоўная дзейнасьць суполкі давала таксама менш адчувальную, але надзвычай важную для беларускай літаратуры карысьць — уплывала на яе папулярызацыю, пабуджала да творчай актыўнасьці маладых празаікаў і паэтаў. У 1911 г. у выдавецкім партфэлі чакалі свайго часу ня толькі чарговыя творы Цёткі, Купалы і Коласа, але і новых аўтараў — Зьмітрака Бядулі, Канстанцыі Буйлы, Тодара Чарнышэвіча, Цішкі Гартнага, Алеся Гурла, Янкі Журбы ды іншых. Усё гэта паўплывала на пазыцыю Шыпілы, які аднавіў супрацу з суполкаю, хаця гэтым разам у неафіцыйнай форме. Гэтым, не бяз гонару за ўласныя дасягненьні, суполка скончыла фінансавую справаздачу на 15 лістапада 1911 г. словамі:

> Пасылаючы гэты наш атчот вельміпаважаным нашым Сябруком, Супольнікам і Дабрадзеём — урад Суполкі ад усяго сэрца дзякуе за прыхільные рады, працу і помач Суполцэ і зь ясным вокам паглядае на прышласьць, веруючы, што і далей не будзець недастатку ў чыстых, шчырых і прыязных беларускіх сэрцах[57].

Гэту сьвятлейшую прышласьць кіраўніцтва суполкі бачыла ня толькі ў пашырэньні кнігавыданьня, але і ў стварэньні першага беларускага часопіса. Сапраўды, да вясны 1912 г., калі ў Вільні пачаў выходзіць сельскагаспадарчы месячнік "Саха", адзіным беларускім пэрыядычным выданьнем была "Наша Ніва", якая з гэтай прычыны займалася ўсімі галінамі жыцьця — ад вялікай палітыкі да гаспадарчых парадаў, бо мусіла ўлічваць інтарэсы разнародных катэгорыяў чытачоў. Пецярбурская суполка сапраўды уважала мэтазгодным выдаваць спэцыяльны месячнік для інтэлігенцыі, аднак рэальна ацэньвала ўсё яшчэ недастатковыя магчымасьці публіцыстаў і таму не наважвалася на выдаваньне месячніка. Замест яго ў канцы 1911 г. распачалася падрыхтоўка да выданьня сталага альманаху пад назвай "Маладая Беларусь". Ён ня меў пэўнай пэрыядычнасьці, аднак выходзіў прыблізна штопаўгоду. Нягледзячы на гэта, "Маладая Беларусь" мела рысы часопіса, на што паказвае нумарацыя, разьмяшчэньне матэрыялаў, рэцэнзіі, абвесткі, бягучая інфармацыя. Усяго выйшлі тры сшыткі: першы — у траўні 1912 г., наступныя — у канцы 1912 г. і ў сярэдзіне 1913 г. Кожны налічваў каля 160 старонак вялікага фармату.

Тэматычны профіль альманаху меўся ахопліваць тры наступныя аддзелы: актуальныя пытаньні грамадзкага жыцьця на Беларусі, навуковыя працы, прысьвечаныя Беларусі, а таксама аддзел літаратуры і мастацтва[58]. На практыцы, аднак, пераважалі творы Купалы, Коласа, Цёткі, Бядулі, Гартнага, Гурла, Буйлы, Чарнышэвіча, Новіча, Журбы і Петрашкевіча. Напрыклад, паэма Купалы "Сон на кургане" займала больш чым палову першага сшытку альманаху. Навукова–папулярную тэматыку прадстаўлялі пераважна артыкулы А. Навіны (Антона Луцкевіча), адзін зь якіх — "На дарозе да новага жыцьця" — суполка выдала асобнаю брашурай. На старонках "Маладой Беларусі" выступіў таксама прафэсар Аляксандар Пагодзін з артыкулам, прысьвечаным беларускай моладзі, а А. Янулайціс апублікаваў матэрыял пра паэта Паўлюка Багрыма, які жыў у Крошыне ў XIX ст.

Можна дапусьціць, што і мэта, і назва альманаху — "Маладая Беларусь", — і ягоны

[55] Тамсама. С. 155.

[56] Семашкевіч Р. Беларускі літаратурна–грамадскі рух у Пецярбурзе. Мінск, 1971. С. 118.

[57] Маладая Беларусь. 1912. Сш. 1. С. 55.

[58] Тамсама. С. 4.

граматычны профіль былі зьвязаны са стварэньнем пры Пецярбурскім унівэрсытэце студэнцкага Беларускага літаратурна–навуковага гуртка. Ягоным ініцыятарам быў Яўген Хлябцэвіч, які неўзабаве пасьля паступленьня ўва ўнівэрсытэт у лютым 1909 г. наладзіў сувязі зь дзеячамі суполкі "Загляне сонца..."[59]. Пра гэта сьведчыць яго інфармацыя пад псэўданімам Халімон, зьмешчаная ў пецярбурскай газэце "Русь", у якой ён падаў мэты суполкі і горача заклікаў чытачоў падтрымаць яе дзейнасьць[60]. Зь цягам часу вакол суполкі гуртавалася ўсё больш беларускай студэнцкай моладзі, для якой яна стала першаю школай нацыянальнай культурнай і грамадзкай працы. На частых сустрэчах–"суботніках" у кватэрах Іваноўскага і Шыпілы моладзь заахвочвалася да вывучэньня айчыннай гісторыі, мовазнаўства, літаратуры ды іншых галінаў беларусазнаўства[61]. Акурат у гэтым трэба шукаць крыніцу зацікаўленьня студэнта Браніслава Тарашкевіча стварэньнем беларускай граматыкі; там — на "суботніках" — фармаваліся погляды многіх іншых студэнтаў, якія за колькі гадоў далі плён у выглядзе навуковай, культурнай і грамадзка–палітычнай дзейнасьці.

Таму, калі 30 студзеня 1912 г. Рада прафэсараў унівэрсытэту зацьвердзіла статут Беларускага літаратурна–навуковага гуртка, ягоныя сябры ўжо ў вялікай меры ўсьведамлялі мэты і кірункі свае будучае навуковае працы. Гэтым яны былі абавязаныя Іваноўскаму і Шыпілу, якія абодва з гэтай прычыны былі запрошаныя на інаўгурацыйны сход сяброў гуртка. Як паказвае справаздача Пецярбурскага ўнівэрсытэту за 1912 г., Іваноўскі прывітаў стварэньне гуртка як нараджэньне "Маладой Беларусі" і прысьвяціў свой выступ важнай праблеме навуковых дасьледаваньняў духоўнай і матэрыяльнай культуры беларускага народу[62]. Апублікаваць вынікі гэтых дасьледаваньняў разьлічвала рэдакцыя альманаху "Маладая Беларусь".

Аднак неўзабаве ў становішчы суполкі адбыліся важныя зьмены, якія перадвызначылі лёс часопіса і ўсёй выдавецкай дзейнасьці ў Пецярбургу. Іх абумовіў выезд у чэрвені 1913 г. Іваноўскага і Купалы ў Вільню. Бесьпярэчна, гэта было нялёгкае рашэньне: для суполкі яно азначала страту дасьведчанага кіраўніка, а для Іваноўскага — адмову ад навуковай кар'еры ў Пецярбургу[63]. Такое рашэньне было прадыктаванае перадусім патрэбамі беларускага руху, наколькі Вільня давала большыя магчымасьці для дзейнасьці на яго карысьць. Тут стварыўся дынамічны асяродак руху, пачалі ўзьнікаць новыя пэрыядычныя выданьні і грамадзка–культурныя арганізацыі, урэшце, адсюль лягчэй было разьвіваць дзейнасьць у краі. Перад гэтым ад'ездам увесну 1913 г. суполка выдала ў

[59] Я. Хлябцэвіч быў першым супрацоўнікам суполкі "Загляне сонца..." у асяродзьдзі моладзі, якая навучалася ў пецярбурскіх ВНУ. Ён адыграў вялікую ролю ў грамадзка–культурнай дзейнасьці гэтай моладзі. Падрабязны аналіз яго постаці зьмешчаны ў магістарскай працы Марыі Базылюк, напісанай у 1986 г. на катэдры беларускай філялёгіі Варшаўскага ўнівэрсытэту.

[60] Русь. 1907. 5 ноября. № 296 (приложение). Факт, што газэта "Русь" прапанавала свае старонкі для прапагандаваньня мэтаў суполкі, сведчыць аб аднабаковасьці тых дасьледнікаў, якія ацэньвалі стаўленьне расейскай прэсы да моладабеларускага руху выключна праз прызму чарнасоценных выданьняў "Окраины России", "Минское слово" і інш.

[61] Навіна А. (Луцкевіч А.). Роля моладзі ў пачатках адраджэнскага руху // Родныя Гоні. 1927. № 5. С. 23; яго ж. Адбітае жыцьцё... С. 44. Пра "суботнікі" ў Іваноўскага і Шыпілы пісаў і Б. Тарашкевіч у сваёй аўтабіяграфіі 1933 г., якая знаходзіцца ў Архіве Гісторыі Партыі пры ЦК КПСС у Маскве. Дзякую спадарыні Аляксандры Бэргман за магчымасьць азнаёміцца з адпаведным фрагмэнтам аўтабіяграфіі.

[62] Отчет о состоянии и деятельности императорского С.–Петербургского университета за 1912 г. С.–Петербург, 1913. Приложение. С. 92, 106.

[63] У апошнія гады жыцьця ў Пецярбургу Іваноўскі быў дацэнтам Тэхналягічнага інстытуту, выкладчыкам у жаночым політэхнічным інстытуце, кансультантам у міністэрстве сельскай гаспадаркі, выдаў таксама шэраг навуковых працаў што да перапрацоўкі прадукцыі сельскай гаспадаркі. Гл.: Politechnika Warszawska 1915—1925. Księga pamiątkowa / red. Prof. L. Staniewicza. Warszawa, 1925. S. 430—432.

Пецярбургу найлепшы твор Купалы — “Шляхам жыцьця”.

Ад’езд Іваноўскага і Купалы ў Вільню запачаткаваў трэці і адначасна апошні этап дзейнасьці суполкі “Загляне сонца...”. 1 чэрвеня 1913 г. адбылася рэарганізацыя яе ўправы, у якую вярнуўся Шыпіла, а таксама ўвайшлі доктар мэдыцыны Аляксандар Ярэміч і студэнт Язэп Сушынскі[64]. Выглядае, гэтая зьмена не была для суполкі нечаканаю, на што паказвае факт, што пасьля колькігадовага перабываньня ў арандаваным памяшканьні на 1–й лініі і ў кватэры Іваноўскага на вул. Вярэйскай, 37, ужо ў траўні 1912 г. яна зноў месьцілася на кватэры Шыпілы на 4–й лініі[65]. Ярэміч таксама ня быў новаю фігурай ува ўправе суполкі: Купала прысьвяціў яму кнігу “Шляхам жыцьця”, што дазваляе меркаваць, што ён спрычыніўся да яе выданьня.

Новае кіраўніцтва суполкі было рашуча настроенае працягваць выдавецкую дзейнасьць. 7 чэрвеня 1913 г. яно абвясьціла ў “Нашай Ніве” конкурс на новыя драматычныя творы. Увесну і ўлетку 1914 г. суполка давала шматлікія абвесткі, у якіх інфармавала аб сваіх намерах выдаваць навуковую літаратуру, бэлетрыстыку і інш., а таксама аб падрыхтоўцы чарговага, чацьвертага, сшытку “Маладой Беларусі”. У сувязі з гэтым яна зьвярталася да аўтараў з прапановаю прысылаць для публікацыі рукапісы, імкнулася прыцягнуць новых сяброў і супольнікаў, унёскі якіх (у памеры 50 і 10 руб.) былі пакліканыя паправіць фінансавую сытуацыю выдавецтва[66].

Аднак у новых арганізацыйных умовах магчымасьць ажыцьцяўленьня гэтых праектаў была вельмі абмежаваная. У другой палове 1913 г. суполка выдала літаграфічным спосабам дзьве чарговыя камэдыі: “Мядзьведзь” Чэхава і “Як яны жаніліся” А. Валодзьскага ў перакладзе Ластоўскага. Адначасна выйшлі друкам чатыры выданьні — “Батрак” Коласа, “Абразкі” Бядулі, “Песьні” Гартнага і “Амэрыканец” Новіча[67]. Аднак гэтыя творы ўжо былі надрукаваныя ў другім і трэцім сшытках “Маладой Беларусі” і гэтым разам выдадзеныя як асобныя адбіткі ў выглядзе кніжак. Нарэшце, прыкладна ў сярэдзіне 1914 г. была перавыдадзеная, гэтым разам у няпоўным выглядзе, “Дудка беларуская” Багушэвіча[68]. Гэта было апошняе выданьне суполкі. Нягледзячы на амбітныя задумы, дзейнасьць суполкі на гэтым апошнім этапе ў сутнасьці абмежавалася заканчэньнем распачатых праектаў і выданьнем у форме кніжак раней апублікаваных тэкстаў.

Гісторыкі беларускай літаратуры сьцьвярджаюць, што дзейнасьць суполкі “Загляне сонца...” перапыніла першая сусьветная вайна. Насамрэч гэта ня быў найважнейшы чыньнік, асабліва ў аддаленым ад лініі фронту Пецярбургу. Як паказваюць пададзеныя акалічнасьці хады падзеяў, новае кіраўніцтва суполкі ўжо зь сярэдзіны 1913 г. не было ў стане самастойна ажыцьцяўляць новыя выдавецкія ініцыятывы. У прыватнасьці, яно ня здолела здабыць неабходных фінансавых сродкаў для далейшага разьвіцьця дзейнасьці, а таксама прыцягнуць новых аўтараў і рэдакцыйных супрацоўнікаў, безь якіх Шыпіла — дзеля сваёй пэдагагічнай нагрузкі — няшмат мог зрабіць[69].

[64] Александровіч С. Гісторыя... С. 179.

[65] Пра сядзібу суполкі на вуліцы Вярэйскай інфармавала “Наша Ніва” (1911. 3 лістапада і 22 сьнежня), а таксама зборнік “Нашай Нівы” (№ 2, Вільня 1912) — абвестка на вокладцы. Зьвесткі аб вяртаньні суполкі ў кватэру Шыпілы былі зьмешчаныя ў альманаху “Маладая Беларусь” (1912. Сш. 1), які выйшаў у траўні таго ж году. Гл. рэцэнзію, зьмешчаную у “Нашай Ніве” (ад 7 чэрвеня 1912).

[66] Гэтыя абвесткі зьмяшчаліся на вокладках кніжак, выдадзеных у 1914 г. Беларускім Выдавецкім Таварыствам у Вільні (у тым ліку: Буйло К. Курганная кветка; Ядвігін Ш. Васількі.).

[67] Першая абвестка аб публікацыі гэтых кніжак зьявілася ў “Нашай Ніве” 12 сьнежня 1913.

[68] Наша Ніва. 1914. 28 жніўня.

[69] У 1905—1913 гг. Б. Шыпіла працаваў ува ўнівэрсытэцкай бібліятэцы, рыма–каталіцкай Духоўнай акадэміі, мужчынскай гімназіі пры касьцёле сьв. Кацярыны і на агульнаадукацыйных курсах Чарняева. Апрача гэтага, у 1914 г. распачаў працу ў Магілянскай жаночай гімназіі. Гл.: Весь Петербург... за 1905—1915 гады.

Аднак абмежаваныя магчымасьці новага кіраўніцтва не былі адзінай прычынай заняпаду суполкі "Загляне сонца...". Як засьведчылі падзеі, якія разгарнуліся неўзабаве, Іваноўскі, пакідаючы Пецярбург, зусім ня меў намеру адмаўляцца ад выдавецкай дзейнасьці, але лічыў больш карысным весьці яе ў Вільні. 1 ліпеня 1913 г. у Вільні было заснаванае Беларускае Выдавецкае Таварыства (далей — БВТ), старшынём якога стаў Іваноўскі, а сакратаром — Купала[70]. БВТ разьмясьцілася на кватэры Іваноўскага па вул. Каштанавай, д. 5, кв. 4 (цяпер Angariečio), дзе пасяліўся і Купала. Акрамя памяшканьня, Іваноўскі перадаў у распараджэньне новага выдавецтва значны грашовы ўнёсак, які забраў зь пецярбурскай суполкі. Гэта стварыла добрую базу для дзейнасьці БВТ, пра што сьведчыць факт, што за месяц ад заснаваньня яно было ў стане выдаткаваць 3000 руб. на куплю ўсіх выдадзеных "Нашаю Нівай" кніг і календароў, якія заставаліся на складзе[71]. Магчыма, немалыя грашовыя сродкі БВТ атрымлівала і ад княгіні Магдалены Радзівіліхі[72].

У такіх умовах БВТ распачало жвавую дзейнасьць у беспрэцэдэнтным для дагэтулешняга беларускага выдавецкага руху маштабе. За кароткі час да наступу нямецкага войска і эвакуацыі Іваноўскага і Купалы ў Арол яно пасьпела выдаць 14 кніг сукупным накладам каля 45 тыс. асобнікаў[73]. Апрача гэтага, БВТ удзельнічала ў выданьні некалькіх кніг, дзе ня быў пазначаны выдавец[74]. Гэты вынік, які перавышаў наклад 50 тыс. асобнікаў, адпавядаў прыкладна палове прадукцыі выдавецкай суполкі "Загляне сонца..." за 8 гадоў яе дзейнасьці. Трэба сказаць, што БВТ да вайны было адзіным беларускім выдавецтвам, якое плаціла аўтарскія ганарары[75], што павышала ягоны прэстыж і прыцягвала супрацоўнікаў. Імкнучыся палепшыць распаўсюд кніг, БВТ удзельнічала ў заснаваньні ўвосень 1913 г. першай беларускай кнігарні Вацлава Ластоўскага ў Вільні на вул. Завальнай, 7, спрычынілася да разьвіцьця кнігагандлёвай сеткі на ўсёй Беларусі[76].

Пры такой дынамічнай дзейнасьці БВТ пецярбурская суполка "Загляне сонца..." ужо ня мела вялікіх шанцаў на разьвіцьцё. Гэта пацьвярджае погляд, што яе роля фактычна скончылася ў сярэдзіне 1913 г. разам з ад'ездам Іваноўскага і Купалы. Гэтую ролю ня здолелі вярнуць амбітныя пляны новага кіраўніцтва. Аднак у сутнасьці замёрла дзейнасьць прадпрыемства "Загляне сонца...", але не выдавецкай дзейнасьці, якая эфэктыўна разьвівалася ў новай форме.

Як паказвае прыведзеная ніжэй зводная табліца, суполка "Загляне сонца..." выдала 38 кніг (лічачы выданьні кірыліцай і лацінкай як асобныя пазыцыі) сукупным накла-

[70] Аб гэтым сьведчыць ліст Купалы да Тарашкевіча (ад 4 верасьня 1913), апублікаваны В. Рагойшам у зб.: Народныя песьняры. Зборнік артыкулаў. Мінск, 1972. С. 254.

[71] Александровіч С. Гісторыя... С. 199.

[72] На пяцёх кнігах, выдадзеных БВТ у Вільні ў 1914 г. (а менавіта: "Родныя зьявы" Коласа, "Рунь" Гарэцкага, "Курганчая кветка" Буйлы, "Якім Бяздольны" Беларуса і "Васількі" Ядвігіна Ш.) фігураваў ...давы герб княгіні Магдалены Радзівіліхі — лебедзь на хвалях. Александровіч вызначыў яго як "exlibris" гэтага выдавецтва (гл. яго ж. Пуцявіны роднага слова... С. 156). У сутнасьці гэта быў не "exlibris", а выраз фінансавай дапамогі княгіні ў выданьні вышэйпамянёных кніг. Гэты герб быў таксама зьмешчаны на кнізе М. Багдановіча "Вянок", выдадзенай Вацлавам Іваноўскім і Іванам Луцкевічам у Вільні пад канец 1913 г.; гэтую цікавую драбніцу вытлумачыў В. Ластоўскі (яго ж. Мае ўспаміны аб М. Багдановічу // Крывіч. 1926. № 1 (11). С. 66.).

[73] Бібіла Ю. Летапіс беларускага друку. Ч. II: Паасобныя выданьні на беларускай мове 1835—1916 гг. Менск, 1929.

[74] Сярод іх трэба згадаць "Вянок" М. Багдановіча, выдадзены ў Вільні (на мяжы 1913—1914 гг. накладам 2000 экз.), а таксама "Вялікодную пісанку" — у 1914 г. накладам 3000 асобнікаў (у гэтым апошнім выданьні гл.: Наша Ніва. 1914. 8 траўня).

[75] Александровіч С. Пуцявіны... С. 147.

[76] Ліст В. Ластоўскага да Людвікі Сівіцкай ад 1 сьнежня 1913 г. Асабісты архіў Людвікі Войцік у Вільні; Наша Ніва. 1913. 4 лістапада — 12 сьнежня.

дам, паводле падлікаў Сьцяпана Александровіча, больш як 100 тыс.[77]. Акрамя таго яна выдала больш як 20 розных паштовак з партрэтамі старадаўніх паэтаў і іншых дзеячоў культуры, гістарычнымі помнікамі, краявідамі і г.д. Суполка выцягнула з забыцьця і пашырыла найлепшыя творы беларускай літаратуры XIX ст., выдала першыя беларускія падручнікі, сэрыю сцэнічных твораў, дапаможнікі для гаспадароў, заахвочвала да творчасьці маладых аўтараў і тым самым выдатна спрычынялася да фармаваньня новай беларускай літаратуры. Больш за тое, суполка адначасна выпрацоўвала прынцыпы правапісу беларускай мовы, прынятыя пазьней астатнімі выдаўцамі.

Вынікі дзейнасьці суполкі мелі першараднае і бесьпярэчнае значэньне для разьвіцьця беларускай культуры. Аднак поўная ацэнка іх значэньня павінна ўлічваць перадусім піянэрскі характар гэтай дзейнасьці. Яшчэ ў першыя гады XX ст. намаганьні будзіць нацыянальную сьвядомасьць сярод беларусаў, разьвіваючы такія яе асноўныя элемэнты, як літаратуру і агульнанацыянальную мову, былі справаю адзінак і заставаліся амаль незаўважныя ў кантэксьце пануючых на Беларусі расейскай і польскай культураў[78]. Таму выхад у ліпені 1906 г. першага лемантара сучаснай беларускай мовы быў успрыняты ў зацікаўленых колах як беспрэцэдэнтны заклік да народу адраджаць сваю культуру і адначасова — як выклік бязьлітаснай гісторыі. "Дык існуе і беларуская культура?" — зь зьдзіўленьнем пытаўся віленскі "Kurier Litewski", які выхад лемантара прызнаў падзеяй, вартай вялікага камэнтара на відным месцы газэты[79]. У гэтай падзеі, што пачала дзейнасьць суполкі "Загляне сонца і ў наша аконца", памянёная газэта ўгледзела прамень нацыянальнай культуры, які ад тае пары зазіраў усё часьцей у вокны беларускіх хатаў.

Пералік кніг, выдадзеных суполкай "Загляне сонца і ў наша аконца"

Тлумачэньні:
Л — выданьне лацінкай;
К — выданьне кірыліцай;
Л+К — два асобныя выданьні лацінкай і кірыліцай;
ЛК — адно выданьне часткова лацінкай, часткова кірыліцай;
Месца выданьня: П — Пецярбург, В — Вільня.
Год выданьня ў дужках азначае год выданьня, пададзены на ўнутранай вокладцы, калі ён не супадае з пададзеным на тытульнай старонцы ўнутры кнігі.

[77] Александровіч С. Гісторыя... С. 169.
[78] З гісторыі беларускага выдавецкага руху ў 1902—1905 гадох. С. 41—54 гэтага выданьня. — *Рэд.*
[79] Elementarz Białoruski // Kurier Litewski. 25.07.1906. S. 1; перадавы артыкул падпісаны ініцыялам "J". Можна меркаваць, што напісаў яго Чэслаў Янкоўскі — рэдактар гэтай газэты.

Назва	Шрыфт	Месца і год выданьня	Старонак	Наклад
Школьныя падручнікі				
Беларускі лемэнтар або першая навука чытаньня	Л+К	П 1906	23 і 30	
Цётка. Першае чытаньне для дзетак беларусаў	Л+ФК	П 1906	32 і 31	
Гутаркі аб небе і зямлі. На беларускую мову пераклалі К. Кастравіцкі і С. Шаўлоўскі	К	П 1907	68	
Колас Я. Другое чытаньне для дзяцей беларусаў. Пераглядзеў і прыпісаў прадмову Л. Сяўрук	К	П 1909 (1910)	112	6000
Мастацкая літаратура				
А. Сэрыя "Народныя песьняры"				
Бурачок М. (Багушэвіч Ф.). Дудка беларуская	Л	П 1907	67	
Міцкевіч А. Пан Тадэвуш. На беларускую гутарку перавярнуў Вінцук Марцінкевіч	Л	П 1907	64	3300
Дунін-Марцінкевіч В. Гапон. Аповесьць беларуская	Л	П 1907 (1908)	32	4300
Рэўка С. (Багушэвіч Ф.). Смык беларускі	Л	П 1908	39	
Дунін-Марцінкевіч В. Вечарніцы. Аповесьці беларускія.	Л	П 1909	32	4300
Дунін-Марцінкевіч В. Шчароўскія дажынкі. Купала. Аповесьці.	Л	П 1910	47	4300
Бурачок М. (Багушэвіч Ф.). Дудка беларуская.	Л	П 1914	64	
Б. Творы сучасных аўтараў				
Купала Я. Жалейка. Вершы	К	П 1908	161	
Новіч А. У дому лепей. Апавяданьне.	К	П 1911	8	4000
Купала Я. Сон на кургане.	К	П 1912 (1913)	100	
Купала Я. Шляхам жыцьця.	К	П 1913	264	3000
Колас Я. Батрак. Апавяданьне з жыцьця палешукоў.	Л	1913	28	
Бядуля З. Абразкі. Вершы ў прозе	Л	П 1913 (1914)	40	
Гартны Ц. Песьні	Л	П 1913	50	
Новіч А. Амэрыканец. Апавяданьне.	К	П 1913	23	
Сцэнічныя творы (рэпэртураная сэрыя, літаграфічныя выданьні)				
Каганец К. Модны шляхцюк. Бытавая камэдыя ў 1 дзеі.	К	П 1910	21	200
Чэхаў А. Сватаньне. Жарцік. Пераклажыў з расейскае на беларускую мову Н. Чарноцкі.	К	П 1910	22	200
Крапіўніцкі М. Пашыліся ў дурні. Жарцік у 3-х дзеях. Пераложана (з папраўкамі) з украінскае на беларускую мову.	К	П 1910	62	200
Ажэшка Э. У зімовы вечар. Сцэна зь сялянскага жыцьця. На беларускую мову з рукапісу пераклаў Власт	К	П 1910	33	200
Крапіўніцкі М. Па рэвізіі. Камэдыя ў 1 дзеі. Перароблена з украінскае мовы.	К	П 1911	34	400

Назва	Шрыфт	Месца і год выданьня	Старонак	Наклад
Міхалка. Камэдыя ў 1 дзеі. С польскага на беларускі лад перарабілі Далецкія.	К	П 1911	30	400
Ажэшка Э. Хам (Мужык)	К	П 1912	74	
Купала Я. Паўлінка. Сцэны із шляхоцкага жыцьця ў двух актах.	К	П 1913	85	
Валодзьскі А. Як яны жаніліся. (Жарт). Вольны пераклад Власта.	К	П 1913	28	
Чэхаў А. Мядзьведзь, Жарт у 1-м акце. Пераклад з расейскаго.	К	П 1913 (1914)	27	
Земляробчая літаратура				
Дулеба К. Як ратаваць уздутую жывёлу? Пералажыў на беларускую мову Антось Хатні.	Л+К	В 1909	16 і 16	3000 +3000
Бярозка Г. Пчаліна — жывёлка малая, а карысьці дае многа.	Л	П 1911	103	4000
Палітычная літаратура				
Навіна А. На дарозі да новага жыцьця. Літаратурна-грамадзкія альманахі	К	П 1912	28	
Маладая Беларусь. Ч. 1.	ЛК	П 1912	166	1500
Маладая Беларусь. Ч. 2.	ЛК	П 1912	160	
Маладая Беларусь. Ч. 3.	ЛК	П 1913	152	1000

Крыніца: Бібіла Ю. Летапіс беларускага друку. Ч. II: Паасобныя выданьні на беларускай мове 1835—1916 гг. Менск, 1929.



Pieciarburch 24/II 1905 r.

Panie Szanowany,
Czuŭ ja nie raz ad usiełakich ludziej i ad panawaho bratanca, szto wielmi Wy lubicie naszu mowu i piszecie samy inszy raz u naszaj mowi. To ja chacieŭ parnajomicca z Wami chacia praz pisulki, bo sztoż, Wy żywiecie u Miensczyni, a ja u Piecierburchu.
A takich ludziej, szto naszu mowu dyj naszaho muzyka lubiać mała na świeci, to treba kab chacia kampani pitrawali. A Wy, Panie, samy szmat rabili, mo i ciapier tajoj pracy nie kinuli. Zdajecca, mieli Wy wydać

Фота 1. Пачатак першага ліста Вацлава Іваноўскага да Аляксандра Ельскага ад 24 лютага 1905 г.



Maaju Małoruskaho, praŭda!
Tutaka tak sama jość ludcoŭ
kolki to pieraŭaryli kniazia-
cak krychu, tolki z ~~kbat~~
krasami kiepska- maniu bla-
kije.

Ale tak sama usiaŭ nie
apaslajucy, pryhatavali
Michałka — Pnesa Harszyna
Krysta Kanapinickaje
Hutarki ab niebie i ziamli
Lamentacyja (paŭodług Promyja)
ludzie katoŭ za drotku za mie-
siac;

I tak mnie zdajecca, szto i Wy
nie miensz majecie ochako, ot
kab usio zaraz i wydrukowa-
ć bytoby dabro.

Adpiszycie, Panoczku, kali czasu
znojdziecie krychu
W. Iwanoŭski.

Фота 2. Працяг ліста В. Іваноўскага да А. Ельскага ад 24 лютага 1905 г., які пацьвярджае задуму публікацыі твораў на беларускай мове.


Адресъ:
С. Петербургъ.
Технологическій Институтъ
Лабораторія Питательныхъ Веществъ
Лаборанту Инжен. Техн.
Вацлаву Ивановскому.

Фота 3. Заканчэньне ліста В. Іваноўскага да А. Ельскага (адрас адпраўніка) ад 24 лютага 1905 г.



Pieciarburch 3/IV 1905

Panie Szanawany,
Dziakuju wielmi Wam
za listok, ale ja dumaŭ,
szto Wy pa naszki mnie
adkażecie, ażno wyjszło
nie toje.
Ksiażki, szto Wy pisali,
maju usie, i znoju,
ich dobra. Ale wot
szto kiepska - Wašaho
„Pana Tadeusza" nijak
znajści nie mahu, na-
pisycie, hdzie jon na
składzi za hranicaj.
Ci nie mahli by Wy
addać jaho na skład
do „Książki" Kraków
-Grodzka N 50.

Фота 4. Пачатак ліста В. Іваноўскага да А. Ельскага ад 3 красавіка 1905 г., які датычыць выданьня перакладу "Пана Тадэвуша" А. Міцкевіча.



Tam słauny skład
„Dudki" „Smyka" dzie
„Песни"
niatkaj i „Pan Tadeusz"
byŭ by u kampanii.
A tak widzicie, ja sam
mała dwa hady cha-
wau choć adzin
dastaŭ – i nie dapytajasia.
Nie zaŭdzieciu zrobić hetaho,
napiszycie da „Krynicy",
i nie majecie znajomych
jakich, što zachacieli by
knižak wydać pa nasza-
mu. Toŭ jošč napisa-
nyje. Kažuć, što Woj-
niłłowicz – toj moh
by wydać, ...ma zna-
jecie jaho?

Фота 5. Ліст В. Іваноўскага да А. Ельскага ад 3 красавіка 1905 г., які датыкае пытаньня выданьня твораў Ф. Багушэвіча і перакладу "Пана Тадэвуша" А. Міцкевіча на беларускую мову.


Szto u Was czuwać,
jak muzyki, szto
hawarać mież saboj!?
Cikawy czas ciapier,
cikawy i strašny
razam.

Budźcie zdarowy

W. Iwanoŭski.

Фота 6. Заканчэньне ліста В. Іваноўскага да А. Ельскага ад 3 красавіка 1905 г.



Pieciarburh 15/V. 1905.

Panie Szanawany i Swajacze
Pana Tadeusza" i pisulku
Waszu dastau. Da pana Kali-
ny mio napisau, i dumaju
szto za jaki miesiac knyżka
ksionżak tutaka budzie.
Ale wy, Susiedzie, napiszycie
kaniecznie da p. Kaliny, kab
jon z jakuju tysiaczu addau
na skład da „Ksionżki"
- Krakau - Grodzka №50.
Tady możnia budzie mieci z
kraka tyje ksionżki ciakom.
A może taja „Macież Polska"
pradała by usieniek nakład,
kolki jana zachoce, i kolki
jości ezi? Panie Swajacze, za

Фота 7. Першая старонка ліста В. Іваноўскага да А. Ельскага, напісанага 15 траўня 1905 г. у Пецярбургу.


kab žal zrabić tawarystwo dla
drukawańnia biełaruskich kniżak,
taj, jak Ukraincy majuć,
to dobra byłob... zdajecca mnie,
szto možna byłob znajści
ludziej, szto płacili by [illegible]
-nu rubloŭ pa dziesiaci... toi
znajści možna ludziej z 20
na pačatak [illegible] i drukuje
kniżki szto kodu wydrukawa-
li by.
Padumajcie, swajacie,
adkažycie chutka.
Mo my u letka pabačymsia,
kali budu u Minščyni,
pastarajusia Was
pabačyć.
W. Iwanoŭski.

Фота 8. Другая старонка ліста В. Іваноўскага да А. Ельскага ад 15 траўня 1905 г., які пацьвярджае задуму стварыць суполку для выданьня кніжак на беларускай мове.



Piecierburh 6^го [illegible] 19[illegible].

Szanoŭny!

Ŭ [illegible] czasi pisali wy

niekoliści, ci nia mohby ja

dastać „Pana Tadeusza". O-

woś ciapier, kali wola Wasza,

możecie dastać u mianie

[illegible] z piatnaccać. Kaštawa-

li jany mnie niešto pa

kapiejek 55 na sztuku.

To, kali chočecie, napiszycie,

a ŭraz wam i wyšlu.

Niekolki ludziej „tutejszych",

szto u Piecierburhu żywuć,

załažyli wydawieckuju supołku,

ciapier adbiwajecca ŭsio elementar,

budzie dwajakimi znakami,

ŭ heta znaczyć, pa prostu kažu-

czy, z razu budzie dwa elementa-

ry. Ci nie prystupili-b i wy

Фота 9. Чарговы ліст В. Іваноўскага да А. Ельскага ад 17 красавіка 1906 г. (пачатак).



Da taje supołki? Udziały, z
prawam karystania z zysku, budzi
po 10 rubloŭ koźny.
Nie hulajecca budzie adkryty
ustaŭ supołki; to Wam
jako pryprou paslaju.
Jszcze, kali łaska, napiszycie
adres synaŭca Wanako, zabyŭsia
imia, studenta Technologicznaho
Instytutu, wielmi Wam dzia-
kawai budu.

Budźcie zdarowy, kłaniajecca
Wam
W. Jwanoŭski.
Ps. Synaŭca Wanana imia
Adwardak, prypomniŭ. W. J.

Фота 10. Працяг ліста В. Іваноўскага да А. Ельскага ад 17 красавіка 1906 г. (прапанова далучыцца да выдавецкай суполкі).



Piecierburh 1/VIII. 1906.

Panie Szanoŭny!

Wybačajcie, što z razu na
Wašu pisulku nie adkazoŭ,
ale, bačycie, hramada ra-
boty było, pakul usio z ma-
pothoj naładzili. Ciapier,
dziakuj Bohu, lementar
wyjšoŭ na świet boży,
ludzi dobryje pamahajuć.
Za pisulki ad Was nale-
žycca za 45 pa 5 kap. -
2, 25 kap. počta ničoha
bolš, jak za pisulki.
Lementar Pani [illegible]
wyšlu.

Budźcie zdarowy

W. Iwanoŭski.

Фота 11. Ліст В. Іваноўскага да А. Ельскага ад 1 жніўня 1906 г. (інфармацыя аб выданьні беларускага лемантара)

Вацлаў Іваноўскі і адраджэньне Беларусі

Ад аўтара

Сустракаючы надыход новага 1942 году, Вацлаў Іваноўскі павучаў сваіх маладых супрацоўнікаў у Менску: "Вынайсьці порах важна, але ня менш важна навучыцца яго выкарыстоўваць". Пры дапамозе гэтага афарызму ён паказваў, што рэалізацыя ідэі значыць ня меней за самую ідэю. Ён быў хімік–тэхноляг і ў гэтым няблага разьбіраўся.

Такім чынам ён перадаваў свой досьвед. Выстаўляючы ў 1902 г. пастулят стварэньня мадэрнай беларускай нацыі і будаўніцтва Маладой Беларусі, ён трактаваў гэта ня проста як прыгожую ідэю. Былі і да яго яе вынаходнікі: Францішак Багушэвіч, Казімер Кастравіцкі, народавольцы ды іншыя. Але яны ня здолелі перайсьці ад маралізатарства да практычнай дзейнасьці. Адно Вацлаў Іваноўскі пачаў гэтую ідэю ператвараць у сапраўднасьць.

Гэта быў выклік гістарычна сфармаванаму палітычнаму і культурнаму ўкладу ў Беларусі, пальчатка, кінутая Расеі і Польшчы, якія ўважалі гэты край за сфэру сваіх інтарэсаў і заўзята вялі за яго ідэалягічную вайну.

Ён быў рацыянальным рамантыкам. Ён разумеў, што пачынаць трэба зь вяртаньня з забыцьця ўласных спрадвечных каштоўнасьцяў, іх памнажэньня і распаўсюду; з засваеньня майстэрства незалежнага палітычнага мысьленьня; нарэшце, ад разрыву псыхалягічнай пупавіны, якая трымала яго нацыю ў залежнасьці ад культураў суседніх нацыяў і дзяліла на "рускіх" і "палякаў". І таму ён пачаў ствараць маладую беларускую інтэлігенцыю, сьвядомую ў сваіх мэтах.

Іваноўскі вызначаўся вялікай працавітасьцю, здольнасьцю арганізоўваць калектыўную дзейнасьць. Ён умеў знаходзіць сродкі, гуртаваць супрацоўнікаў, дзеяць самастойна, з разьлікам найперш на ўласныя сілы. Ён заахвочваў маладыя таленты і творчыя ініцыятывы, адкрыў сьвету найвялікшага прарока беларускага нацыянальнага адраджэньня — Янку Купалу[1], узьвёў на айчынны Парнас Алёйзію Пашкевічанку–Цётку ды іншых. І пры гэтым заставаўся надзвычай сьціплым, вылучаў на першы плян іншых — не сябе.

Яму сьнілася незалежная Беларусь. Толькі гэтай мэце былі падпарадкаваныя ўсе яго намаганьні абудзіць і зрабіць масавай нацыянальную сьвядомасьць. Ужо маладым студэнтам ён зразумеў, што дасягнуць гэтай мэты будзе немагчыма без рэальнай вонкавай падтрымкі. І таму супрацоўнічаў з Расеяй, Польшчай, Нямеччынай — усё залежала ад абставінаў, часу, ад здольнасьці і зацікаўленасьці патэнцыйнага саюзьніка падтрымліваць інтарэсы Беларусі. Бо толькі ёй адзінай прысягнуў ён на непарушную вернасьць, на іншых жа глядзеў праз прызму беларускіх інтарэсаў і чакаў разуменьня і помачы.

Гэтым шляхам ён ішоў усё жыцьцё, і дзейнасьць яго рэдка здавальняла суседзяў — ён не хацеў ім падпарадкоўвацца. Таму стаўленьне да Іваноўскага польскіх, расейскіх і савецкіх дзеячоў і публіцыстаў звычайна адпавядала іх стаўленьню да памкненьняў беларускага незалежніцкага руху. І адны, і другія часта расцэньвалі гэты рух як скіраваную супраць іх варожую інтрыгу. А ўжо адсюль была найкарацейшая дарога да дзіўных закідаў, паклёпаў і агідных абразаў.

Постаць Іваноўскага была выкрасьленая з гісторыі беларускай культуры і нацыянальнага руху. Згодна з дырэктывамі камуністычных уладаў Беларусі, яго падавалі як

---

[1] Дакладней было б сказаць, што талент Я. Купалы адкрыў У. Самойла, а В. Іваноўскі даў магчымасьць яму рэалізавацца праз кнігі, бо зь сямі кнігаў Я. Купалы, што выйшлі да першае сусьветнае вайны, чатыры ("Жалейка, "Сон на кургане", "Паўлінка" і "Шляхам жыцьця") выпусьціла ўзначаленая В. Іваноўскім выдавецкая суполка "Загляне сонца і ў наша аконца". — *А.С.*

ворага народу, польскага або нямецкага служаку, захопніка і акропленую чалавечай крывёй пачвару. У менскіх навуковых колах аб ім гаварылі ўпотай. Дайшло нават да таго, што віленскі мастак Пётра Сергіевіч баяўся прызнацца, што ў 1943 г. выканаў партрэт Вацлава Іваноўскага, і толькі ў 1985 г., ужо пасьля сьмерці мастака, было высьветленае яго аўтарства, дый тое ня ў Менску, а ў Злучаных Штатах.

Трэба падкрэсьліць, што асуджэньне Іваноўскага савецкімі ўладамі было выкліканае ня толькі яго пазыцыяй часоў нямецкай акупацыі, яно датычыла ўсёй яго дзейнасьці ўвогуле. Яно было выражэньнем непераборлівай на сродкі палітычнай барацьбы і таму не заслугоўвае скрупулёзнай крытыкі. Тым ня меней, гэтае асуджэньне мела сур'ёзныя наступствы. Галоўным зь якіх бадай было эфэктыўнае блякаваньне многія дзесяцігодзьдзі магчымасьці дасьледаваньня ў Беларусі жыцьця і дзейнасьці гэтага чалавека.

Усё гэта абуджала ўва мне супраціў і падштурхоўвала да самастойных досьледаў. Я распачаў іх у канцы 70–х гадоў з марудных, але надзвычай захапляльных дасьледаваньняў у польскіх архівах і бібліятэках, зь перапіскі і размоваў з асобамі, якія ведалі і супрацоўнічалі з Вацлавам Іваноўскім.

Аказалася, што іх нямала. Шмат каштоўнай інфармацыі пра жыцьцё і дзейнасьць Вацлава Іваноўскага, а таксама здымкаў і дакумэнтаў я атрымаў у 1978—1980 гг., асабліва — ад Марыі Арнольдзіхі, Зоф'і Дабрынскай, Ганны Іваноўскай–Карнэцкай — дачкі Вацлава Іваноўскага, Аўгена Калубовіча, Язэпа Найдзюка–Александровіча, Марка Валейкі, Тамаша Зана і Бэрнарда Закшэўскага, за што сардэчна ім дзякую.

Шэраг найбольш істотных аспэктаў дзейнасьці Вацлава Іваноўскага я падаў у сваіх артыкулах і досьледах, якія выйшлі ў сьвет у 80–я гг. у польскай навуковай пэрыёдыцы: "З гісторыі беларускага выдавецкага руху 1902—1905 гг." (Studia polono–slavica–orientalia. Acta litteraria. T. IX. 1985 [с. 41—52 у гэтым выданьні]); "Генэза і аўтарства першага беларускага лемантара" (Slavia Orientalis. 1986. № 3 [с. 31—40 у гэтым выданьні]); "Узаемадачыненьні ППС зь беларускім рэвалюцыйным рухам у 1902—1906 гадох" (Studia polsko–litewsko–białoruskie. Warszawa, 1988 [с. 55—65 у гэтым выданьні]) і "Беларускае пытаньне ў палітыцы лёнданскага лягеру 1941—1944" (Studia z dziejów ZSRR i Europy Środkowej. T. XIX. 1983 [с. 464—484 у гэтым выданьні]).

Абставіны яго палітычнай дзейнасьці падчас другой сусьветнай вайны я стараўся падрабязна разгледзець у кнізе "Беларусь пад нямецкай акупацыяй" (Варшава—Уроцлаў, 1989).

Варшава, студзень 1992 г.

Gente Rutheni, natione..?

Мае размовы зь людзьмі, да якіх я зьвяртаўся, каб выпытаць дэталі з жыцьця і дзейнасьці Вацлава Іваноўскага, звычайна пачыналіся з таго, што мне рабілі адно й тое найважнейшае паведамленьне, якое мусіла прагучаць, як вялікая сэнсацыя: "А, Іваноўскія... Іх было некалькі братоў — Юрка быў паляк, Вацлаў — беларус, а Тадэвуш — літовец..." Вакол нязвыклых, незразумелых падзеяў часта паўстаюць легенды, таму я не зьдзівіўся, калі аднойчы шаноўная паня сказала, што, калі гэтыя браты сустракаліся, кожны гаварыў па–свойму і ня мог адзін аднаго зразумець.

Добраахвотнае нацыянальнае самавызначэньне, пра якое пойдзе гаворка, у прынцыпе — справа сьвядомага выбару чалавека. І таму мы маглі б прамінуць гэтае рашэньне братоў Іваноўскіх і не паглыбляцца ў яго матывацыю, калі б гэта засталося іх прыватнай справай. Але ж было іначай. Кожны з братоў адыграў выбітную ролю ў абранай ім нацыянальнай галіне, і таму іх самавызначэньне стала прадметам публічных, часта вельмі эмацыйных камэнтароў. Натуральна, літоўцы ахвотна прынялі выбар Тадэвуша, затое беларусы часта глядзелі на выбар Вацлава падазрона, як на выбрык шляхецкай фантазіі.

Але найбольш папрокаў было з польскага боку, гэтак жа, як і ў гучным выпадку Шаптыцкіх[2]: маўляў, з гэткай добрай абшарніцкай сям'і, ды раптам адзін — беларус, а другі — літовец... Гэта называлі адшчапенствам, здрадай нацыі (польскай!), у найлепшым выпадку — анамаліяй. У гарачым жаданьні пашырыць межы сваіх нацыянальных уплываў палякі не хацелі альбо не маглі зразумець, што спэцыфічная гісторыя гэтай сям'і абумовіла ўсе тры варыянты яе нацыянальнага самавызначэньня.

Ключом да разуменьня гэтага ўяўнага парадоксу было складанае мінулае Вялікага Княства Літоўскага і яго сацыяльнай эліты, зь якой паходзіў род Іваноўскіх. Гэтая дзяржава, што паўстала ў выніку задзіночаньня дзьвюх аўтахтонных стыхіяў — літоўскай і рускай — ужо ў першую фазу свайго існаваньня была неаднастайнай з этнічнага, рэлігійнага і моўна-культурнага гледзішча, а яе далейшае тэрытарыяльнае разьвіцьцё паглыбіла гэтую неаднастайнасьць да незвычайных памераў. На пераломе XIV і XV ст., калі Вялікае Княства Літоўскае распасьціралася ад Балтыкі да Чорнага мора і ад Вязьмы на ўсходзе аж да Холму на захадзе, аўтэнтычныя літоўцы складалі толькі крыху больш за 10% ад яе жыхароў, тады як пераважную большасьць — продкі цяперашніх беларусаў і ўкраінцаў. Пасьля таго, як, згодна з умовамі Люблінскай уніі (1569), Падляшша і ўкраінскія землі адышлі да Польшчы, Вялікае Княства, куды цяпер уваходзілі абшары Літвы і Беларусі, стала больш аднастайным, але па-ранейшаму ў ім пераважаў рускі элемэнт, на гэты раз — беларускі[3].

Перапляценьне гэтых двух элемэнтаў заходзіла вельмі далёка. Намесьнікі вялікіх літоўскіх князёў надавалі землям Белай Русі новую дзяржаўную арганізацыю, а наўзамен прымалі — найчасьцей разам з жонкамі — праваслаўную веру, мясцовую культуру, звычаі і беларускую мову. У выніку гэтая мова ў старабеларускім яе варыянце стала дзяржаўнай. Эфэктыўна праходзіла і моўная беларусізацыя літоўскіх плямёнаў, у выніку літоўскі этнічны прасьцяг, які напачатку сягаў аж па Менск, скараціўся да віленскіх ваколіцаў. Такім чынам, адбывалася цікавая паняткавая трансфармацыя: беларускі баярын з-пад Горадні ці Менску самавызначаўся як ліцьвін, тым часам як карэнныя літоўцы станавіліся — паводле сёньняшніх крытэраў — беларусамі. Экспансія ішла як бы ў двух кірунках.

Важныя наступствы ў гэтым абсягу меў хрост Літвы (1387). Па-першае, паганская частка эліты ВКЛ прыняла каталіцкае веравызнаньне, што замарудзіла ў гэтай сацыяльнай сфэры пашырэньне праваслаўя і беларушчыны. Па-другое, дзякуючы таму, што каталіцтва стала прывілеяванай і пануючай рэлігіяй, праваслаўная частка эліты апынулася ў горшай сытуацыі за каталіцкую. Пачалася доўгатрывалая вайна праваслаўных магнатаў і шляхты за раўнапраўе, за доступ да высокіх урадавых пасадаў і прывілеяў, падтрыманая і выкарыстаная маскоўскімі царамі дзеля ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы дзяржавы. Канец гэтай канфліктнай сытуацыі паклаў прывілей Жыгімонта Аўгуста ад 1563 г. — згодна зь ім іншаверная шляхта ВКЛ атрымала тыя самыя правы, якімі з часоў Ягайлы карысталіся каталікі.

Тэарэтычна зьнішчэньне рэлігійных бар'ераў магло дадатна адбіцца на разьвіцьці і захаваньні традыцыйных ідэйных каштоўнасьцяў, такіх, як праваслаўе і беларушчына. Аднак, насамрэч, усё атрымалася наадварот. Раўнапраўе праваслаўнай эліты дало ёй большыя магчымасьці для ўдзелу ў грамадзкім жыцьці дзяржавы, што ў сваю чаргу прывяло да росту зацікаўленьня ў атрыманьні адукацыі. Але Праваслаўная Царква мала што магла прапанаваць у гэтай галіне і ў гэтым сэнсе не магла спаборнічаць з асьветніцкай дзейнасьцю Каталіцкай Царквы, асабліва езуітаў, якія падчас Контрарэфармацыі

[2] Маецца на ўвазе, што са спольшчанага роду Шаптыцкіх выйшлі выдатныя дзеячы ўкраінскага руху: прадстаяльнік Грэка-Каталіцкай Царквы Андрэй (да пострыгу Раман) Шаптыцкі і ягоны брат архімандрыт Клімэнт (у сьвеце Казімер). — *А.С.*

[3] Трэба мець на ўвазе, што ў той час праваслаўныя хрысьціяне Кіеўскай (Наваградзкай) мітраполіі называлі сябе рускімі, а сваіх усходніх суседзяў — масквою, маскавітамі. Адпаведна і Цэрквы былі Руская і Маскоўская. Такі падзел прасочваецца і ў літаратуры. — *А.С.*

арганізавалі шматлікія школы на чале зь Віленскай Акадэміяй. Яны сталі важным асяродкам палянізацыі і акаталічваньня сваіх выхаванцаў, дзейсна прычыніліся да пашырэньня гэтых тэндэнцыяў сярод эліты ВКЛ.

У пачатку XVII ст. працэс палянізацыі і акаталічваньня вялікалітоўскіх магнацкіх родаў быў, у прынцыпе, завершаны; падпала пад яго і частка беларускай шляхты. Прагрэс культурнай уніфікацыі эліты, тагачаснай палітычнай нацыі, хоць і меў вялікае значэньне для ўзмацненьня дзяржаўнага адзінства, аднак не перакрэсьліваў пачуцьця палітычнай адметнасьці. Вялікае Княства Літоўскае заставалася адным з элемэнтаў Рэчы Паспалітай, але па–ранейшаму захоўвала дзяржаўную самастойнасьць з пэўна акрэсьленымі межамі, уласным заканадаўствам і г.д. Сярод магнатаў ВКЛ ня раз нараджаліся сэпаратысцкія тэндэнцыі, хоць, на думку польскіх гісторыкаў, яны мелі пераважна тактычны характар і вынікалі з жаданьня захаваць сваю ідэнтычнасьць і партнэрскі статус–кво ў дачыненьнях з Каронай. Такім чынам, моўна–культурная палянізацыя не супярэчыла літоўскай палітычнай сьвядомасьці. Януш Радзівіл у 1615 г. пісаў свайму брату Крыштапу: "Хоць ліцьвінам я нарадзіўся і ліцьвінам давядзецца мне памерці, аднак даводзіцца нам на радзіме нашай ужываць мову польскую".

Аднак гэты "прымус" выкарыстаньня польскай мовы нараджаўся не з распараджэньняў "зьверху" (хто ж мог у гэтай справе загадваць Радзівілам ці Сапегам?), але зь незацікаўленасьці вялікалітоўскай эліты ў разьвіцьці ўласнай, накшталт Рэя і Каханоўскага, культуры на падставе народных літоўскіх і беларускіх элемэнтаў. Пасьля выдатных дасягненьняў XVI ст. (выдавецкая дзейнасьць Францішка Скарыны, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, Статут ВКЛ ды інш.) гэта прывяло да значнага рэгрэсу беларускага пісьменства, якое абмежавалася толькі царкоўнай сфэрай.

Стаўленьне эліты ВКЛ да роднай культуры рэдка прыцягвала ўвагу гісторыкаў, хоць гэта ня менш цікавае пытаньне, чымся культывацыя палітычнай адметнасьці. Бо, нягледзячы на поступ палянізацыі, беларуская і літоўская шляхта ня толькі захоўвала веданьне мовы сваіх продкаў, якую звычайна выкарыстоўвала ў размовах з простым людам, але практычна няшмат зрабіла для яго палянізацыі. Гэта выразілася ў асаблівым вырашэньні рэлігійнага пытаньня ў Беларусі. Няма сумневу, што ў атмасфэры Контрарэфармацыі акаталічаная эліта ВКЛ магла, кіруючыся прынцыпам *cuius regio eius religio* (хто гаспадар, таго і вера — *лац.*), навязаць рымскі каталіцызм сваім праваслаўным падданым. Гэта пацьвярджае дзейснае выкарыстаньне гэтага прынцыпу ў іншых абшарах, між іншым, Радзівіламі–пратэстантамі ў іх валоданьнях у ваколіцах Біржаў у Літве, якія і па сёньняшні дзень застаюцца выспай пратэстантызму сярод каталіцкага літоўскага насельніцтва. Але ў Беларусі, калі не лічыць спарадычных выпадкаў, гэтым прынцыпам не кіраваліся, і таму да масавай лацінізацыі сялянства і мяшчанства не дайшло — для іх знайшлі іншае вырашэньне — Уніяцкую Царкву, створаную ў 1596 г. на Берасьцейскім саборы.

Ці было прыняцьце уніі для Беларусі карысьнейшае за лацінізацыю — пытаньне спрэчнае, затое не падлягае сумневу факт, што яно дазволіла захаваць царкоўную апрычонасьць, якая была важным культуратворчым фактарам. У прыватнасьці, захавалася неабходнасьць у выпуску кірылічнай рэлігійнай літаратуры і ўменьні яе чытаць. Уніяцкае духавенства, як, зрэшты, і праваслаўнае, падпадала пад уплыў польскай культуры, але ў вясковых цэрквах аж да скасаваньня уніі ў 1839 г. ужывала мясцовыя гаворкі беларускай, а ня польскай мовы. Таму Уніяцкая Царква стала важным асяродкам для захаваньня моўна–культурнай традыцыі і эфэктыўным бар'ерам, які запавольваў лацінізацыю і апалячваньне ніжэйшых праслоек беларускага грамадзтва, што часта выклікала крытыку рыма–каталіцкага духавенства. І хоць мясцовая праваслаўная герархія фармальна прыняла царкоўную унію, яе галоўным правадніком стаў канцлер ВКЛ Леў Іванавіч Сапега, што прадвызначыла падтрымку з боку магнатаў і шляхты і прывяло да посьпеху уніі ў Беларусі.

Стаўленьне эліты да акаталічваньня і палянізацыі простага люду не заўсёды тлума-

чылася яе безахвоцьцем. Так, напрыклад, моўную палянізацыю прыгоннага сялянства стрымлівала ці рабіла ўвогуле немагчымай яго сацыяльнае становішча. Затое ў рэлігійнай сфэры гэткіх перашкодаў не ўзьнікала, і таму пазыцыя эліты мела шматлікія рысы сьвядомага дзеяньня. Цяжка, аднак, гэтую пазыцыю ацэньваць як выражэньне талерантнасьці вялікалітоўскіх вяльможаў, да якой яны былі ня надта прызвычаеныя. Сапраўдная прычына хавалася глыбей і адлюстроўвала найперш іх адданасьць айчынным традыцыям і павазе да тых духоўных каштоўнасьцяў, якія абумовілі адметнасьць і культурную спэцыфіку краіны. Адсюль вынікае, што эліта ў Беларусі спрыяла яе захаваньню сярод простага люду, хоць і не была сама зацікаўленая ў разьвіцьці айчыннай культуры.

Традыцыя дзяржаўнай самастойнасьці Вялікага Княства Літоўскага аказвала значны ўплыў на фармаваньне палітычнай сьвядомасьці беларускай і літоўскай шляхты нават у апошнія гады Рэчы Паспалітай і пасьля яе заняпаду. Пра гэта сьведчаць спробы вярнуць Вялікаму Княству статус суб'екта, скасаваны травеньскай канстытуцыяй 1791 г., ход паўстаньня Касьцюшкі дый, урэшце, намаганьні аднавіць ВКЛ пад скіпэтрам Раманавых[4]. І хоць спроба не дала практычных вынікаў, гэта не мяняе факту: літоўскія вяльможы былі гатовыя вырашаць лёс сваёй бацькаўшчыны шляхам супрацоўніцтва з Расеяй. Гэта адлюстроўвала, па сутнасьці, тыя самыя інтарэсы і пазыцыі, якія раней схілялі іх дабівацца швэдзкай пратэкцыі (Кейданскі акт 1655 г.) ці ў Масквы (дамова зь Пятром І 1703 г.). Таму шмат гаворыць за тое, што г.зв. літоўскі сэпаратызм быў не выпадковаю зьяваю, але вынікам пэўнай палітычнай стратэгіі, скіраванай на захаваньне суб'ектнасьці ВКЛ у найбольш карысным фэдэрацыйным саюзе з Польшчай альбо зь іншай рэальнай сілай.

У першыя дзесяцігодзьдзі расейскага панаваньня становішча беларускай і літоўскай шляхты істотна не зьмянілася. Яе сацыяльна–эканамічныя пазыцыі парушаныя не былі, доступ да мясцовых органаў улады не абмяжоўваўся, свабодна дзейнічала Каталіцкая Царква, а пад апекай Адама Чартарыйскага пашыралася польскае школьніцтва, працаваў Віленскі ўнівэрсытэт. Па–ранейшаму, аж да 1840 г., дзейнічаў Статут ВКЛ, а значыць, выконваліся нормы традыцыйнага заканадаўства. Новая палітычная сытуацыя задавальняла большасьць шляхты і не давала падставаў для буйнамаштабнай апазыцыйнай дзейнасьці. Гэтыя настроі падзяляў і Адам Міцкевіч, які ў прадмове да выдадзенага ў 1828 г. "Конрада Валенрода" захапляўся асобаю Аляксандра І, жадаючы, "каб імя Айца гэтулькіх народаў ува ўсіх пакаленьнях на ўсіх мовах у роўнай меры праслаўлена было".

Істотныя зьмены ў становішчы шляхты прынесьлі польскія паўстаньні 1830 і асабліва 1863 г., якія выклікалі перамены ў расейскай палітыцы. У абодвух паўстаньнях удзельнічала толькі частка шляхты, прычым у большай ступені ў Літве, чым у Беларусі, але для расейскіх уладаў гэты ўдзел быў дастатковым прэтэкстам для таго, каб распачаць барацьбу ўва ўсім краі з польскімі культурнымі і палітычнымі ўплывамі. Таму, з аднаго боку, шырока разгарнуліся рэпрэсіі: закрыцьцё польскіх школаў і ўнівэрсытэту, абмежаваньне дзейнасьці Каталіцкай Царквы, выцясьненьне польскай мовы з грамадзкага ўжытку, кантрыбуцыі і канфіскацыі маёнткаў, высылкі і г.д. — а з другога боку, пачалася плянамерная русіфікацыя краю.

У пэўным сэнсе мэтады русіфікацыі былі супрацьлегласьцю памянёным рэпрэсіўным захадам: пашырэньне расейскага школьніцтва, масавае перасяленьне расейскіх каляністаў, чыноўніцтва і духавенства, падтрымка праваслаўя і распаўсюджваньне расейскай мовы. У сыстэме гэтых захадаў асаблівую ролю адыгрывала скасаваньне царкоўнай уніі і далучэньне беларускіх уніятаў да Праваслаўнай Царквы (1839 г.). Гэта была ціхая рэвалюцыя, якая мела вельмі вялікае значэньне ня толькі ў сэнсе рэлігійным, але і палітычным: уцягваньне пераважнай масы беларускага сялянства і часткі мяшчанства ў ар-

[4] Вядомы праект аднаўленьня ВКЛ, распрацаваны графам М.К. Агінскім і пададзены 15 траўня 1811 г. цару Аляксандру І у выглядзе памятнай запіскі. Гл.: Адраджэнне: Гістарычны альманах. Вып. 1. Мінск: Універсітэцкае, 1995. — *А.С.*

біту расейскага праваслаўя адкрывала магчымасьць, з аднаго боку, для паступовага прышчапленьня расейскасьці самай вялікай групе беларускіх вернікаў, з другога боку, пакідала ў ідэйнай ізаляцыі пераважна каталіцкую шляхту. Важную ролю ў ажыцьцяўленьні палітыкі грамадзкай дэзынтэграцыі адыгрывала распальваньне рэлігійных супярэчнасьцяў паміж праваслаўным і каталіцкім насельніцтвам, што дасягалася ў тым ліку шляхам закрыцьця і разбурэньня каталіцкіх касьцёлаў у мяшаных асяродзьдзях альбо іхператварэньня ў праваслаўныя цэрквы. Стымуляваўся і пераход каталікоў у праваслаўе.

У выніку гэтых дзеяньняў у другой палове XIX ст. адбыліся пэўныя зрухі ў канфэсійнай структуры насельніцтва Беларусі: павялічылася доля праваслаўных, затое паменшала каталікоў. Паводле зьвестак першага агульнарасейскага перапісу насельніцтва, у 1897 г. на тэрыторыі Беларусі (у сучасных яе межах) 70,4% жыхароў належала да Праваслаўнай, 13,5% — да Каталіцкай Царквы, 14,0% вызнавала юдаізм. Трэба адзначыць, што такая канфэсійная структура насельніцтва, хоць і сфармавалася пад націскам уладаў, набыла, тым ня меней, трывалы характар, пра гэта сьведчыць, у прыватнасьці, і той факт, што пасьля абвяшчэньня ў 1905 г. царскага маніфэсту аб свабодзе сумленьня толькі каля 50 тыс. жыхароў Менскай, Гарадзенскай і Віленскай губэрняў перайшло з праваслаўя ў каталіцтва[5]. Гэта не прынесла істотных зьменаў у канфэсійным складзе насельніцтва краю, дзе каталікі па-ранейшаму заставаліся толькі колькасна невялікай рэлігійнай меншасьцю.

Ува ўмовах нарастаньня пасьля 1830 г. ідэалягічнай канфрантацыі шляхце заставалася ўсё менш і менш месца для культывацыі традыцыйнай "літоўскай" палітычнай сьвядомасьці, якая ўжо не адпавядала тагачасным рэаліям. Гэта прымушала яе перагледзець адвечныя каштоўнасьці, асабліва ў дачыненьні да нацыянальнага самавызначэньня. Пры такім стане рэчаў, калі не лічыць безаблічных апартуністцкіх пазыцыяў, пачалі вымаўлёвацца дзьве тэндэнцыі. Частка шляхты ў выніку культурнай паланізацыі і расейскай палітыкі яе адчужэньня ад "адзінакроўнага народу" прыняла польскую нацыянальную сьвядомасьць, стала палякамі. Затое іншая частка, трымаючыся традыцыі своеасаблівасьці сваёй Бацькаўшчыны і адчуваючы роднаснасьць з простым народам, схілялася да беларускай ці літоўскай нацыянальнай сьвядомасьці.

Цяжка нават прыблізна вызначыць прапорцыі гэтых пазыцыяў. Паводле зьвестак першага агульнарасейскага перапісу насельніцтва, на парозе XX ст. у Беларусі (у цяперашніх яе межах) пражывала 153 тыс. чальцоў шляхецкіх сем'яў. Сярод іх 43,3% лічыла роднай беларускую мову, 33,8% — польскую, а 19,1% — расейскую[6]. І хоць у тагачасных умовах было б памылкова атаясамліваць родную мову з палітычнай сьвядомасьцю, тым ня менш гэтыя дадзеныя паказваюць як на беспадстаўнасьць поглядаў аб амаль поўнай спальшчэласьці беларускай шляхты, так і на існаваньне значнай патэнцыйнай грамадзкай базы для разьвіцьця беларускага нацыянальнага руху. У канцы XIX ст. Эдвард Вайніловіч, буйны землеўладальнік у Беларусі і старшыня Сельскагаспадарчага Таварыства ў Менску, зьвяртаўся з падзякаю да Аляксандра Ельскага за прысланую беларускую кніжку і так выказваўся пра стаўленьне гэтай шляхты да сваёй мовы:

> Шаноўны Пане Дабрадзею, я перакананы, што гэтыя беларускія брашуркі борзда разыйдуцца <...>, калі наша шматлікае абшарніцтва зьбярэцца на пасяджэньні Сельскагаспадарчага Таварыства ў Менску: кожны з нас засынаў у калысцы пад народныя песьні нашых нянек і выхавацелак. Кожны на гэтай мове <...> гаворыць зь мясцовым народам, і ўсе старадаўнія радавыя дакумэнты звычайна напісаныя на гэтай мове: таму чэсьць Шаноўнаму пану, што пасьля доўгай пярэрвы да нас адазваліся так па-свойску[7].

[5] Католицизм в Белоруссии. Минск, 1987. С. 37.

[6] Церашковіч П.У. Асноўныя тэндэнцыі развіцця беларускага этнасу ў эпоху капіталізму // Весці Акадэміі Навук Беларускай ССР. 1986. № 5. Серыя грамадскіх навук. С. 94.

[7] Ліст Э. Вайніловіча да А. Ельскага ад 12.05.1896 г. Галоўны Архіў Старых Актаў у Варшаве (далей — AGAD), zesp. Prozorów i Jelskich, sygn. 140, k. 141—144.

У такіх умовах разьбежнасьці ў нацыянальным самавызначэньні ў землях былога Вялікага Княства Літоўскага былі зьявай досыць частай нават у межах аднае сям'і. Пра гэта сьведчыць польска–літоўскі выбар Ромэраў, Тышкевічаў, Мілашаў і польска–беларускі — Скірмунтаў, Кастравіцкіх, Багушэвічаў ды многіх іншых. Сярод пазьнейшых польскіх, беларускіх і літоўскіх гісторыкаў, заклапочаных сваімі нацыянальнымі інтарэсамі, гэтае пытаньне асьвятлялася вельмі эмацыйна, тады як у сямейных колах яно вырашалася звычайна досыць гладка, і толькі калі–нікалі паўставалі драматычныя або гумарыстычныя сытуацыі. Адну зь іх намаляваў Юзаф Мацкевіч:

> Бо цёця Пафця выйшла замуж за ліцьвіна яшчэ тады, калі ўсе жыхары б. Вялікага Княства Літоўскага самі называлі сябе ліцьвінамі. Але пакуль падрастаў Генрых, іх ужо пачалі называць "літваманамі". Тады ліцьвіны пачалі зваць сябе палякамі, а літваманы — ліцьвінамі. Справа аказалася досыць заблытаная, а часам непрыемная. "Мама, — спытаў ён, — ці наша цёця Пафця — літваманка, ці яна ліцьвінка–полька, але не ліцьвінка?.."[8]

У параўнаньні з такой падвойнай арыентацыяй (польска–літоўскай і польска–беларускай) выбар трох кірункаў братамі Іваноўскімі быў зьявай бадай выключнай і на першы погляд — нелягічнай. Цяжка сабе ўявіць, каб адна сям'я была адначасова траістага паходжаньня. Перад намі паўстае праблема разуменьня, якім чынам на парозе XX ст. адбыўся падзел тых каштоўнасьцяў, што некалі ўтваралі непадзельную цэласьць. Варта прыгадаць у гэтым кантэксьце твор Міколы Гусоўскага, паэты XVII ст., "Carmen de bisonte" ("Песьня пра зубра"), перакладзены з лаціны на польскую, беларускую і літоўскую мовы і залічаны сур'ёзнымі гісторыкамі літаратуры ўсіх трох народаў ува ўласны культурны набытак. Трапна заўважыў Юзаф Мацкевіч, што на парозе новай эпохі ў Вялікага Княства як гістарычнай цэласьці не было пераемнікаў[9]. У адрозьненьне ад гэтага, лёсы трох нацыяў, трох культур складваліся самастойна, так, як тое выбралі нашчадкі вялікалітоўскіх радоў. Прыгледзьмася да гэтай эвалюцыі на прыкладзе роду Іваноўскіх.

Самыя раньнія дакумэнтальныя зьвесткі з гісторыі гэтай сям'і сягаюць сярэдзіны XVII ст. і зьвязаны з асобай Крыштапа Іваноўскага, патомнага ўладара маёнткаў Пурпішкі і Гайжуны ў Вількамірскім павеце ў Літве[10]. Аднак тое, што Крыштап жыў на тэрыторыі спрадвечнай Літвы, яшчэ ня значыла, што яго сям'я была літоўскага паходжаньня. Этымалёгія прозьвішча паказвае, што заснавальнікам роду павінен быць нейкі Іван, а гэта сьведчыць пра яго беларускае паходжаньне. Але ўжо ў XVI ст. можна было сустрэць Іваноўскіх ад Ковеншчыны да Менску і Воршы, гэта значыць, на розных абшарах Вялікага Княства, дзе за дзяржаўныя заслугі іх продкі атрымлівалі зямельныя надзелы і пасады. Іх фамільнай эмблемай стаў герб Рагач, які з Польшчы быў перанесены ў ВКЛ у эпоху Люблінскай уніі і, паводле апісаньня Войцеха Каяловіча–Віюка, езуіцкага пісьменьніка XVII ст., геральдыка і прафэсара Віленскай Акадэміі, уяўляў сабой "... аленеў рог у першым, белым баку поля і рог зубрыны леваруч, у полі чырвоным, а ў шаломе з правага боку — рог зубрыны, зь левага — алені"[11].

Герб з такімі сымбалямі належаў ня толькі ўжо згаданаму Крыштапу Іваноўскаму, але і Міхалу Іваноўскаму, менскаму гродзкаму старасту, што ў тагачасных умовах сьведчыла пра роднаснасьць беларускай і літоўскай галіны роду. Напэўна, гэтая роднаснасьць спрычынілася да таго, што менавіта ў Літве Міхал шукаў ратунку ад маскоўскага нашэсьця і ў 1669 г. адбудаваў разбураны маскалямі касьцёл Вітаўта Вялікага ў Коўне. Пра

[8] Mackiewicz J. Pod każdym niebem. Londyn, 1964. S. 15.

[9] Mackiewicz J., Toporska B. Droga Pani. Londyn, 1984. S. 41.

[10] Bonecki A. Herbarz polski. T. VIII. Warszawa, 1905. S. 72.

[11] Piekosiński F. Studya, rozprawy i materyały z dziedziny historyi polskiej i prawa polskiego. T. II; ks. Wojciecha Kojałowicza Herbarz rycerstwa W. X. Litewskiego, tak zwany Compendium. Kraków, 1897. S. 264.

гэты ўчынак і па сёньняшні дзень сьведчыць мармуровая дошка ў самім касьцёле, а надпіс на ёй вянчае апісаны Каяловічам герб Рагач. Істотную дэталь, якая кідае сьвятло на генэалёгію гэтай сям'і, удалося высьветліць Марыі Б. Тапольскай: у Міхала Іваноўскага захоўвалася Эвангельле, выдадзенае ў 1644 г. віленскім праваслаўным брацтвам Сьвятога Духа[12]. А гэта сьведчыць пра патрэбу ды ўменьне чытаць кірыліцай, што выключна рэдка сустракалася сярод карэнных літоўцаў, якія ад паганства перайшлі наўпрост да каталіцызму.

Шмат зьвестак пра ўдзел Іваноўскіх у грамадзкім жыцьці Вялікага Княства можна знайсьці ў крыніцах XVIII ст. Асаблівай увагі заслугоўвае Менскае староства, якое доўгія дзесяцігодзьдзі заставалася ў руках гэтай сям'і. Апрача згаданага Міхала, гэтую пасаду з 1745 г. займаў Язэп Іваноўскі, які раней быў менскім гараднічым і даводзіўся родным братам менскаму гродзкаму судзьдзю, што памёр да 1741 г. Пасьля сьмерці Язэпа гродзкім старастам у Менску стаў яго сын Ігнат, які займаў гэтую пасаду амаль дваццаць гадоў, да канца існаваньня Рэчы Паспалітай[13]. Захаваліся сьведчаньні і пра Міхала Іваноўскага, ковенскага чашніка, якога Аўгуст III прызначыў падкаморым (камэргерам) каралеўскага двара; а таксама — пра Антона, які падпісаў акт выбраньня Станіслава Аўгуста ад Вількамірскага павету[14]. Таму на парозе XX ст. маладыя Іваноўскія маглі прасачыць як беларускія, гэтак і літоўскія карані свайго роду, хоць іх продкі служылі адной бацькаўшчыне, дзе праблема паходжаньня ў такім аспэкце звычайна не паўставала.

Тое самае датычыла і сямейнай рэзыдэнцыі. Ужо згаданы Крыштап, апрача Пурпішак і Гайжунаў у карэннай Літве, меў яшчэ фальварак Забалоцьце ў тагачасным Навагрудзкім ваяводзтве. Гэты фальварак амаль да канца XVIII ст. быў сядзібай продкаў Вацлава. У 1720 г. яго ўспадкаваў сын Крыштапа, Міхал, які ў 1750 г. перадаў яго сыну Дамініку, той, у сваю чаргу, у 1776 г. пакінуў Забалоцьце сваім сынам Язэпу і Людвіку, а яны прадалі яго ў 1790 г. князю Радзівілу. Гэтак напярэдадні ўпадку Рэчы Паспалітай продкі Вацлава пазбыліся спрадвечнай радавой маёмасьці. Неўзабаве сын Язэпа, Тамаш, за частку спадчыны, што перайшла да яго, купіў фальварак Руда Яворская ў Слонімскім павеце. Маёнтак, відаць, быў ня дужа вялікі, бо двое яго сыноў — Вінцэнт і Станіслаў — пазьней не маглі падзяліць яго міжсобку. Паводле адвечнага звычаю, ён перайшоў у спадчыну да старэйшага сына, Вінцэнта, Станіславу ж давялося пакласьціся на волю лёсу.

Станіслаў быў дзедам Вацлава. Нарадзіўся ён у 1819 г. у Рудзе Яворскай, ажаніўся з Антанінай, адзінай дачкой Юр'я Андрэевіча Рылы–Быкоўскага, уладальніка фальварку Лябёдка ў воласьці Старыя Васілішкі Лідзкага павету Віленскай губэрні. У адрозьненьне ад Іваноўскіх, якія не сядзелі доўга ў адным гнязьдзе, Быкоўскія гаспадарылі ў Лябёдцы колькі стагодзьдзяў. Паводле "Геаграфічнага слоўніка Каралеўства Польскага і іншых славянскіх краін", гэты фальварак пад назвай Дварэц 07.11.1510 г. быў дараваны прывілеем Жыгімонта Старога яго дваране, Івашку Рылу–Быкоўскаму, і з таго часу, пераходзячы ад бацькі да сына, заставаўся ў валоданьні гэтай сям'і. У сярэдзіне XIX ст. ён займаў 666 маргоў (каля 370 га), пасьля вызваленьня сялян з–пад прыгону ў 1861 г. у ім засталося 325 маргоў (каля 180 га). Гэты адносна невялікі маёнтак і атрымала ў спадчыну Антаніна і да самай сваёй сьмерці заставалася яго ўладальніцай[15].

Дзеля гэтага Станіслаў вымушаны быў пагадзіцца на другарадную ролю ў Лябёдцы. Яго сацыяльная і маёмасная пазыцыя была тыповая для сярэдняй шляхты і мала чым

[12] Topolska M.B. Czytelnik i książka w Wielkim Księstwie Litewskim w dobie Renesansu i Baroku. Wrocław, 1984. S. 233.

[13] Boniecki A. Op. cit. S. 71; Matuszewski M. Diariusz życia mego. T. I. Warszawa, 1986 (гл. сьпіс імёнаў) // AGAD, zesp. Radziwiłłów, dz. V.

[14] Boniecki A. S. 71.

[15] Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. T. V. Warszawa, 1884. S. 111.

Радавод Іваноўскіх

Імя	Рэзыдэнцыя і час валоданьня
Крыштап	Пурпішкі, Гайжуны, Забалоцьце, XVIII ст.
Міхал	Забалоцьце, 1730—1750 гг.
Дамінік	Забалоцьце, 1750—1776 гг.
Язэп	Забалоцьце, 1776—1790 гг.
Тамаш	Руда Яворская, 1790 (?) — ...
Станіслаў	Лябёдка[a]
Леанард	Лябёдка, каля 1880—1919 гг.
Юры, Вацлаў, Тадэвуш, Галена, Станіслаў	

[a] Уласнасьць жонкі Антаніны

Крыніца: Boniecki A. Herbarz polski. T. VIII. Warszawa, 1905. S. 72; Ivanauskas T. Memuarai [б. м. в. — машынапіс у сямейным архіве].

розьнілася ад сытуацыі, пры якой яго продкі жылі яшчэ колькі дзесяцігодзьдзяў таму назад. Зьместам доўгага жыцьця Станіслава (памёр у 1900 г.) быў клопат аб гаспадарцы і гарачае імкненьне да павелічэньня маёмасьці, што паўплывала, між іншым, на яго палітычны апартунізм. Бурлівыя гады паўстаньня 1863 г. ён пераседзеў у Лябёдцы, унікаючы незалежніцкай дзейнасьці. Такім чынам, ён пазьбег высылкі і канфіскацыі жончынай маёмасьці. Пасьля заўчаснай сьмерці Антаніны (яна памерла ў 1852 г., маючы 35 гадоў) маёмасныя меркаваньні схілілі яго да шлюбу з Каралінай Клімантавічанкай, а пасьля яе сьмерці ў 1856 г. ужо 58–гадовы Станіслаў ажаніўся трэці раз з дужа маладзейшай за сябе Станіславай Губарэвічанкай з суседняга фальварку Галавічполь. У выніку, Лябёдка павялічылася на частку зямель гэтага фальварку.

Адзіным спадкаемцам Станіслава і Антаніны быў народжаны 02.11.1845 г. Леанард, які пасьля сьмерці маці стаў паўнапраўным гаспадаром Лябёдкі. Цяжка меркаваць, у якой ступені бацька зьвязваў будучыню сына з гэтым маёнткам, прынамсі адукацыя, якую ён вырашыў даць сыну, ня веставала вялікіх надзеяў на тое, што ён будзе займацца сельскай гаспадаркай. Ён накіраваў Леанарда спачатку ў Віленскую гімназію, пасьля — у Пецярбурскі тэхналягічны інстытут, які той скончыў у 1868 г., атрымаўшы ступень інжынэра–тэхноляга. Затым, аж да 1891 г., Леанард працаваў на будоўлях прамысловых прадпрыемстваў у Сібіры, на Урале ды ў іншых аддаленых рэгіёнах Расеі, у тым ліку недзе каля 15 гадоў правёў у мясцовасьці Краснае Навахапёрскага павету Варонескай губэрні. На той час гэта быў вельмі прыбытковы занятак.

У 1874 г. два літоўскія будрысы — Леанард Іваноўскі і яго сябар Вацлаў Карафа-Корбут — пабраліся шлюбам зь сёстрамі Ядвігай і Галенай Райхелянкамі з ваколіц Пятркова. Але дзяўчаты не былі стопрацэнтнымі ляшкамі: іх бацька, Амон барон фон Райхель, паходзіў з Эльзасу, у мінулым — кадравы вайсковец, які пасьля выхаду ў адстаўку купіў сабе маёнтак Замосьце каля Пятркова, затое матка паходзіла з дому Хржаноўскіх з Трамбоўлі. Сёстры былі выхаванкамі курсаў прафэсара Баранецкага ў Кракаве і, як на тыя часы, былі добра адукаваныя. Леанард атрымаў за жонкай у якасьці пасагу частку маёнтку Райхеля ля ракі Вальборка каля Вальбромя. Але чужая старана яго ня вабіла. Ён прадаў гэтую маёмасьць і за выручаныя грошы павялічыў гаспадарку ў Лябёдцы.

Але і пасьля жанімства Леанард не асеў у Лябёдцы на стала. Разам з жонкай ён вярнуўся ў Краснае, пасьля 1891 г. некалькі гадоў правёў у Варшаве, нарэшце, найпазьней у 1899 г., уладкаваўся ў Пецярбургу. Тут ён дасягнуў вяршыні сваёй прафэсійнай кар'еры: стаў правадзейным дзяржаўным раднікам, сябрам Тэхналягічнага камітэту Галоўнага акцызнага ўпраўленьня і кіраўніком яго інвэстыцыйнага аддзелу, а таксама —

чальцом Дзяржаўнай Рады па справах харчовых прадуктаў[16]. Леанард часта выяжджаў за мяжу, у тым ліку арганізоўваў расейскія эканамічныя выставы ў Парыжы, Турыне і Бэрліне. Добра ведаў некалькі моваў. Супрацоўнічаў зь Дзьмітрыем Мендзялеевым, разам зь ім езьдзіў у Лёндан, дзе ў Каралеўскім Хімічным Таварыстве перакладаў на ангельскую мову яго даклад аб пэрыядычнай сыстэме хімічных элемэнтаў[17]. Пра тое, наколькі яго прыцягвала прафэсійная кар'ера, вымоўна сьведчыць той факт, што толькі першая сусьветная вайна прымусіла амаль 70–гадовага Леанарда адмовіцца ад дзяржаўнай службы і вярнуцца ў Лябёдку, на гэты раз — назаўсёды.

Лябёдка была іншым захапленьнем Леанарда. Тут ён праводзіў кожную вольную хвіліну, аддаваў шмат грошай і ўвагі на разьвіцьцё і мадэрнізацыю сваёй гаспадаркі. Паступова ён павялічыў яе да 500 га, задрэнаваў глебы і лугі, засадзіў лесам няўдобіцы, увёў у дзеяньне ўсе асноўныя сельскагаспадарчыя машыны, пабудаваў паравы млын. Асаблівую ўвагу надаваў ён садоўніцтву, у 1868 г. заклаў матачны сад, затым — расаднік, нарэшце, у 80–х гг. — вялікі 20–гектарны гандлёвы сад. Усе тры аддзелы ўзаемадапаўнялі адзін аднаго: гатункі, што прайшлі выпрабаваньне ў экспэрымэнтальным садзе, памнажаліся ў расадніку і пасьля пераходзілі ў гандлёвы. Такім чынам, да першай сусьветнай вайны ў садовай гаспадарцы Леанарда было выпрабавана каля 400 гатункаў яблынь, 100 — груш і 80 — сьліваў, вішняў, чарэшань. Садавіну зь Лябёдкі вывозілі на пецярбурскія і маскоўскія рынкі, а на ўсерасейскіх выставах яна двойчы атрымлівала залаты мэдаль[18]. У гонар яго заслуг Варшаўскае садаводчае таварыства абрала Л. Іваноўскага сваім старшынём. У першыя гады XX ст. у Лябёдцы была завершаная будоўля новай сямейнай рэзыдэнцыі.

Апрача рэалізацыі сямейных амбіцыяў, дзейнасьць Леанарда была нацэленая на тое, каб ператварыць Лябёдку ў цэнтар агратэхнічнага прагрэсу, які б ахопліваў прылеглыя абшары Віленскай і Гарадзенскай губэрняў. Дзеля разьвіцьця садоўніцтва ў 1888 г. Л. Іваноўскі распачаў продаж прышчэпаў садовых дрэваў, прыстасаваных да мясцовых кліматычна–глебавых умоваў. Ён арганізоўваў выставы збожжа, гародніны, садавіны і свойскай жывёлы, каб заахвоціць земляробаў да паляпшэньня эфэктыўнасьці сваёй гаспадаркі. Дзеля гэтага Леанард здабываў сродкі ў міністэрстве сельскае гаспадаркі на ўзнагароды ўдзельнікам выставы, галоўным чынам — малазямельным сялянам. Ён арганізоўваў агранамічныя кансультацыі, дбаў пра забесьпячэньне земляробаў найлепшымі гатункамі насеньня, саджанцаў і жывёлы на завод. Маладых сялян прымалі ў маёнтку на практыку паляводамі, жывёлаводамі, садаводамі і пчалярамі. У 1913 г. меркавалася адкрыць курсы перапрацоўкі малака. Дзеля гэтага Леанард заваяваў вялікі аўтарытэт і павагу сярод мясцовых земляробаў.

Можна дапускаць, што з гледзішча нацыянальнай сьвядомасьці Леанард належаў да апошняга пакаленьня беларускай шляхты, якое не разьмяняла яшчэ традыцыйнага паняцьця вялікалітоўскай бацькаўшчыны на тры мадэрныя нацыянальныя опцыі. Дый, зрэшты, жыў ён у тыя часы, калі і не паўставала неабходнасьці вызначаць мадэрную нацыянальнасьць. Закранаючы гэтае пытаньне, яго сын Тадэвуш напісаў у сваіх успамінах, што бацька лічыў сябе за ліцьвіна ў гістарычным сэнсе[19].

Гэта вынікала і зь яго стаўленьня да нацыянальных праблемаў на рубяжы XIX і XX ст. Гэтак, ніводзін з дасьледчыкаў польскага руху ў Расеі ня згадвае пра які–небудзь удзел Леанарда ў працы польскіх арганізацыяў, няма згадак і пра тое, каб ён цікавіўся літоўскім ці беларускім нацыянальным рухам. Ён нязьменна аддаваўся перш за ўсё прафэсійнай кар'еры і сваёй Лябёдцы. Гэтак сама, як яго бацька Станіслаў і шмат якія

[16] Весь Петербург на 1911 г.

[17] Ivanauskas T. Gyvenimas ir veikla. Vilnius, 1976. P. 7.

[18] Cennik szczepów owocowych Wacława Iwanowskiego w Bojarach. Warszawa, бяз даты. S. 3—4.

[19] Ivanauskas T. Memuari. Машынапіс, які належыць сям'і ў Літве, бяз даты.

іншыя прадстаўнікі шляхты, ён вызначаўся палітычным апартунізмам. Польская мова ў доме зусім не перашкаджала гэткай прыцыповай пазыцыі.

Нічога невядома аб пазыцыі жонкі Леанарда, Ядзьвігі, якая, зрэшты, мела ў галаве шмат больш канкрэтных клопатаў. У сям'і сцьвярджалі, што, нягледзячы на сваё польска-нямецкае паходжаньне, яна была цалкам спальшчэлая. Аднак гэта цяжка назваць вычарпальнай падставай для вынясеньня адназначнай высновы: у 1915 г., пасьля таго, як немцы занялі Віленскую губэрню, яе брат борзда адчуў нямецкую кроў і старанна прыслужваўся акупантам[20].

Нельга, аднак, абыйсьці маўчаньнем больш позьнія ацэнкі нацыянальнай сьвядомасьці Леанарда, пакліканыя растлумачыць нацыянальны выбар яго сыноў. Так, Юры Іваноўскі, які лічыў сябе палякам і быў зацікаўлены ў тым, каб падкрэсьліць польскія карані сваёй сям'і, пісаў наступнае:

> Мы паходзім са Шчучынскага павету, з ваколіцы, дзе жыве беларускі люд, сям'я наша асела колькі стагодзьдзяў таму і заўсёды лічыла сябе за палякаў. Бацька-інжынэр большую частку жыцьця правёў у Расеі, аднак заўсёды адчуваў сваю польскасьць і браў удзел у польскім грамадзкім жыцьці[21].

З дапамогай маленькай рэдакцыйнай купюры дыямэтральна супрацьлеглую думку прывялі выдаўцы ўспамінаў Тадэвуша Іваноўскага: яны выразалі тую частку фразы, дзе гаварылася, што Леанард лічыў сябе за ліцьвіна ў *гістарычным сэнсе*. Так выказваньне Тадэвуша набыло зусім іншы сэнс:

> Леанардас Іванаўскас лічыў сябе ліцьвінам, хоць па-літоўску гаварыць ня ўмеў. Такіх літоўскіх інтэлігентаў было ў той час нямала. Л. Іванаўскас, хоць і выхоўваўся пад уплывам польскай культуры, не паддаваўся дэнацыяналізацыі, змагаўся з апалячваньнем і вучыў сваіх дзяцей змагацца з прыніжэньнем ліцьвінаў і Літвы[22].

Адно толькі супастаўленьне гэтых цытат ужо магло б выклікаць усьмешку, калі б ня тое, што акурат гэтак ставіцца да спадчыны Вялікага Княства Літоўскага шмат польскіх і літоўскіх аўтараў. Для адных найважнейшым крытэрам ацэнкі нацыянальнай пазыцыі ёсьць польская мова і культура, для іншых — гістарычная назва "ліцьвін". Для поўнага камплекту падобных ацэнак пакуль бракуе беларускай вэрсіі, але няцяжка ўявіць яе прыкладны зьмест. Гэта было б трыё накшталт ужо прыгаданага выпадку Міколы Гусоўскага і яго "Carmen de bisonte".

У 1876—1887 гг. у сям'і Леанарда і Ядзьвігі нарадзілася пяцёра дзяцей: Юры, Вацлаў, Тадэвуш, Галена і Станіслаў. Паводле мэтрычных запісаў рыма-каталіцкай парафіі ў Старых Васілішках, Юры нарадзіўся ў Красным, а рэшта дзяцей — у Лябёдцы. З гэтага вынікае, быццам кожны раз перад родамі маці пераадольвала сотні кілямэтраў ад Краснага да свайго маёнтку. Гэта здаецца малаверагодным, тым болей, што паміж датамі народзін і хрышчэньня малых Іваноўскіх існуе вялікая разьбежнасьць: апошняе адбывалася пераважна падчас летняга адпачынку, калі сям'я пераяжджала ў Лябёдку. З гэтага вынікае, што калі ня ўсе, дык большасьць дзяцей пабачыла сьвет у Красным Варонескай губэрні, дзе жылі бацькі. Гэтае несупадзеньне з сапраўдным станам тлумачыцца найперш традыцыяй, паводле якой месцам нараджэньня дзяцей лічылася сямейнае гняздо, а не часовае прыстанішча бацькоў.

Аднак да выхаваньня дзяцей Леанард ставіўся неабыякава. Ён вызначыў яго прынцы-

[20] Тамсама.

[21] Iwanowski J. Dialog polsko-litewski. // Kultura. Paryż, 1956. № 1(99).

[22] Ivanauskas T. Gyvenimas... P. 8.

Даты народзін і хрышчэньня маладых Іваноўскіх (паводле старога стылю)

	Дата народзінаў	Дата хрышчэньня	Хросныя бацькі
Юры	29.01.1876	22.06.1876.	Станіслаў Іваноўскі і Флярэнтына Райхель
Вацлаў	25.05.1880	28.06.1881	Надворны раднік, д-р мэд. Ян Петрашкевіч і Галена Корбуціха
Тадэвуш	16.12.1882	22.07.1884	Надворны раднік, д-р мэд. Уладзіслаў Вышынскі і Станіслава Іваноўская
Галена	зьвесткі адсутнічаюць		
Станіслаў	04.12.1887	26.12.1888	Юры Іваноўскі і Галена Корбуціха

Крыніца: Мэтрычныя кнігі парафіі Старыя Васілішкі.

повы кірунак у духу традыцыяў Вялікага Княства. Рэалізавала яго перадусім цётка Галена Корбуціха, сястра Ядзьвігі, якая пасьля заўчаснай сьмерці мужа стала жыла разам з Іваноўскімі. Яна абудзіла ў Вацлава і яго братоў зацікаўленьне да гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і паўплывала на фармаваньне іх гістарычнай сьвядомасьці. Мастацкай асновай гэтага ўсьведамленьня былі ў першую чаргу паэмы А. Міцкевіча "Гражына" і "Конрад Валенрод", а таксама творчасьць "літоўскага сэпаратыста" Уладзіслава Сыракомлі.

У 1891 г. сям'я Іваноўскіх пераехала з Краснага ў Варшаву і пасялілася ў кватэры на вуліцы Маршалкоўскай, 60, кв. 3. Што змусіла іх прыняць такое важнае рашэньне? Сапраўды, Леанард атрымаў тут нейкую дзяржаўную пасаду, але ён ня быў цесна зьвязаны з Варшавай. Ён часта ад'яжджаў у розныя гарады Расеі, нарэшце, на колькі гадоў асеў у Пецярбургу, тады як жонка зь дзецьмі жылі ў Варшаве. Таму можна меркаваць, што пярэбары з Краснага ў Варшаву абумовілі не інтарэсы бацькі, а жаданьне даць дзецям добрую адукацыю. Гаворка, рэч ясная, ішла не аб самім навучаньні ў гімназіі, у якой, як і ў іншых мястох Расейскай імпэрыі, выкладаньне вялося па-расейску, але аб фармаваньні дзяцей у польскім асяродзьдзі. Бо тут існавалі лепшыя ўмовы, каб прышчапіць ім імунітэт супраць русіфікацыі, якую ўважалі за найбольшую пагрозу сямейным традыцыям.

У пачатку 90-х гг. Вацлаў паступіў у V мужчынскую гімназію, якая мясьцілася ў прыватнай камяніцы на рагу вуліц Маршалкоўскай і Пекнай, і скончыў яе ў чэрвені 1899 г. Аўгуст Іванскі, аднаклясьнік Вацлава, так характарызаваў вучнёўскае асяродзьдзе ды атмасфэру, што панавала ў школе:

> Вучні V гімназіі былі пераважна сынамі настаўнікаў, прафэсараў, адвакатаў, лекараў, судзьдзяў — адным словам, прадстаўнікоў гарадзкой інтэлігенцыі. Памешчыцкія сыны складалі меншасьць. Сялянскіх сыноў, прынамсі ў маёй клясе, не было зусім; жыдоў <...> няшмат, маскалёў яшчэ меней. Узровень заможнасьці сярод маіх аднаклясьнікаў быў досыць высокі. Не было, бадай, аніводнага бедняка. <...> Паміж вучнямі былі найлепшыя сяброўскія стасункі. Мы стойка супрацiўляліся безупынным нападкам школы на нашу нацыянальнасьць, рэлігію і нацыянальную годнасьць. Выпадкі даносаў, калі і здараліся спарадычна ў іншых клясах, заўсёды клеймаваліся і выпальваліся гарачым жалезам пагарды і бязьлітаснага байкоту ня толькі самога вінаватага, але і кожнага, хто толькі хоць бы крыху салідарызаваўся зь ім. Заўсёды і паўсюль панавала здаровая атмасфэра салідарнасьці[23].

У гімназіі Вацлаў выявіў надзвычайныя здольнасьці. Аўгуст Іванскі, які залічаў Іваноўскага ў вузкае кола аднаклясьнікаў, зь якімі яго зьвязвала "вельмі цесная дружба", пісаў аб ім наступнае: "Змалку быў ён абдораны быстрым розумам і featureзнабаковымі здольнасьцямі. Яшчэ ў гімназічныя часы ён перакладаў *proprio motu* (з уласнай ініцыятывы — *лац.*) адзін з плятонаўскіх дыялёгаў, а пазьней яшчэ доўгі час не расставаўся з Гамэ-

[23] Iwański A. (senior). Pamiętniki 1832—1876; Iwański A. (junior). Wspomnienia 1881—1939. Warszawa, 1968. S. 301—302.

рам, якога свабодна чытаў у арыгінале"[24]. Змалку Вацлаў вучыўся нямецкай і французскай моваў, якімі валодаў як вусна, так і пісьмова. Вялікую, хоць не заўсёды ўдалую, цікаўнасьць праяўляў у галіне хіміі. Яшчэ ў трэцяй клясе гімназіі Вацлаў паспрабаваў самастойна зрабіць набой для дубальтоўкі і пры гэтым страціў другі і трэці палец на правай руцэ. У іх памяць у Лябёдцы пасадзілі два клёны, а тры асталыя паслужылі матывам для выбару пазьнейшага псэўданіму — "Вацюк Тройца". Вялікі ўплыў на фармаваньне характару Вацлава аказаў бацька, які падчас вакацыяў у Лябёдцы на сваёй гаспадарцы вучыў сына асновам добрай працы.

Патрыятычная атмасфэра, якая панавала ў V гімназіі, узьдзеяла на станаўленьне асобы яе выхаванцаў. Шмат хто зь іх адыграў важную ролю ў барацьбе за незалежнасьць Польшчы і ў розных галінах жыцьця адроджанай дзяржавы. Назавём хаця б Уладзіслава і Станіслава Грабскіх, Уладзіслава Татаркевіча, Тадэвуша Катарбінскага, Марцэля Гандэльсмана, Казімежа Саснкоўскага альбо біскупа Зыгмунта Лазінскага. У такой атмасфэры гадаваліся Вацлаў Іваноўскі і яго браты. Адсюль яны вынесьлі пачуцьцё абавязку грамадзкай дзейнасьці, тут адбылося іх нацыянальнае самавызначэньне. У асяродзьдзі сяброў выбар Вацлава меў прысмак сэнсацыі. Іванскі, успамінаючы гімназічныя гады, называў гэты выбар "скрайнім беларускім нацыяналізмам" і "вычварэньнем", якое дзіўным чынам кантраставала з клясычнымі густамі яго прыяцеля[25]. Аднак гэта ня выклікала ні аслабленьня іх прыяцельскіх дачыненьняў, ні практычных наступстваў, бо гэткіх "нацыяналістаў" у гімназіі болей не было.

Ува ўмовах бурлівага разьвіцьця нацыянальных рухаў ува Ўсходняй Эўропе на пачатку XX ст. гэтае самавызначэньне было непазьбежным. Традыцыйная пазыцыя продкаў сталася для маладых Іваноўскіх нелягічнаю і непрыдатнаю. Яны мусілі вырашыць, да якой нацыянальнай супольнасьці хочуць належаць: польскай, беларускай або літоўскай. Не адчуваючы катэгарычнай волі бацькоў, яны вызначаліся наконт гэтага цалкам добраахвотна на падставе ўласных развагаў, на якія ўплывала агітацыя цёткі Галены, сямейная сытуацыя і досьвед, атрыманы ў беларускім (Лябёдка), расейскім (Краснае) і польскім (Варшава) асяродзьдзі.

Польская сьвядомасьць Юр'я была наступствам культурнай паланізацыі сям'і. Гэта быў фактар вялікай сілы, так што выбар Юр'ем гэтай нацыянальнасьці быў зьявішчам вельмі натуральным і не вымагаў асаблівага інтэлектуальнага высілку. Наадварот, ён нават стымуляваўся як асяродзьдзем беларускай і літоўскай шляхты, так і польскай інтэлігенцыяй. Такім чынам, Юры плыў з агульным струмянём, заплюшчваючы вочы на мінуўшчыну, якую ведаў ня горш за Тадэвуша і Вацлава. Ён меў права яе ігнараваць, але не павінен быў апэляваць да яе і падаваць яе ў перакручаным выглядзе. Да канца свайго жыцьця ён трымаўся пераканаланьня, што верхавіну грамадзтваў у Беларусі і Літве складалі палякі, якія адыгралі ролю натхняльнікаў беларускага і літоўскага нацыянальнага адраджэньня. Наймалодшы брат, Станіслаў, таксама выбраў польскасьць, але ў адрозьненьне ад Юр'я зрабіў гэта моўчкі, без спасылак на польскае паходжаньне продкаў.

Беларускае самавызначэньне Вацлава і літоўскае Тадэвуша мела супольную перадумову. Тадэвуш сьцьвярджаў, што на яго выбар дужа паўплывала прышчэпленае цёткай Галенай Корбуціхай захапленьне Вялікім Княствам Літоўскім, а яшчэ больш — Варшава, дзе зь яго хатняй пальшчызны сьмяяліся гімназічныя сябры. Але трэба заўважыць, што ў гэткім духу выхоўваліся ўсе маладыя Іваноўскія, усе яны гаварылі гэткай самай польскай мовай і сутыкаліся з крытыкай, але для Юр'я і Станіслава гэта ня стала перашкодай для выбару польскасьці. Значыцца, сапраўдная прычына была іншая. Вацлаў і Тадэвуш не адмаўлялі культурнай польскасьці сям'і, але адкідалі польскую нацыянальную сьвядомасьць як неадпаведную іх паходжаньню. Аднак дарога ад такога адмаў-

[24] Тамасама. С. 4—305.

[25] Тамасама. С. 305.

леньня да прыняцьця новых вартасьцяў была яшчэ вельмі далёкая. Яны здавалі сабе справу зь няпольскага паходжаньня сваіх продкаў, з таго, што яны былі ліцьвінамі ў гістарычным сэнсе, але што з гэтага мусіла вынікаць для іх? Кім яны павінны былі стаць? Сучасным палякамі, беларусамі ці літоўцамі? Заўважым, што ні Вацлаў, ні Тадэвуш не пайшлі сьлядамі Юр'я, ня сталі падганяць мінуўшчыну пад свае перакананьні і не сьцьвярджалі, што іх продкі ўважалі сябе за сучасных беларусаў ці літоўцаў. Паўстае, урэшце, важнае пытаньне: чаму іх выбар быў не на карысьць адной нацыянальнасьці, але адзін зь іх стаўся беларусам, а другі — літоўцам?

Традыцыі і выхаваньне, бесьпярэчна, уплывалі на фармаваньне сьвядомасьці Вацлава і Тадэвуша, але не адыгралі вырашальнай ролі ў іх самавызначэньні. Настойваючы на паходжаньні як на аб'ектыўным фактары, яны ў сутнасьці не былі ў лепшым лягічным становішчы, чымся Юры, які бачыў такую аб'ектыўную прычыну ў культурнай сытуацыі сям'і. Таму можна меркаваць, што ўсе іх падставы самавызначэньня насамрэч мелі другараднае значэньне, а іх разгляд высьвятляе няшмат і толькі прыхоўвае найважнейшы матыў, які абумовіў, што браты Іваноўскія зрабілі, на першы погляд, парадаксальны выбар на карысьць розных нацыянальнасьцяў. Гэтым вядучым матывам была воля змагацца за палітычную самастойнасьць нацыяў былой Рэчы Паспалітай. Яны вынесьлі яе з прышчэпленай у бацькоўскім доме гістарычнай сьвядомасьці і згодна з уласным перакананьнем ператварылі ў тры нацыянальныя галіны, кожная зь якіх мела лягічнае абгрунтаваньне. Пры гэтым яны выкарысталі атмасфэру, якая панавала ў V гімназіі, адаптуючы яе да сваіх собскіх палітычных мэтаў. Таму Леанард не абмыліўся, выправіўшы сыноў у Варшаву.

На мяжы XIX і XX ст., калі Тадэвуш акрэсьліўся як літовец, літоўскі нацыянальны рух меў за сабой блізка дваццаці гадоў разьвіцьця і здолеў ужо выпрацаваць уласную фундамэнтальную праграмную канцэпцыю. Выстаўляючы пакуль на першы плян задачы культурнай эмансыпацыі, ён зьвяртаўся з заклікам да супрацоўніцтва ня толькі да простага люду, але і да спальшчэлых паноў. Плян моўна-культурнай інтэграцыі шляхты з простым людам быў дужа сьмелай, але не безнадзейнай задумай, для гэтага ў Літве існавалі вельмі важныя перадумовы, найперш — супольнае каталіцкае веравызнаньне, да якога належала ледзь ня ўся шляхта і просты люд, за выняткам невялічкай высьпы пратэстантаў з ваколіцаў Біржаў. Абедзьве гэтыя часткі грамадзтва адчувалі на сабе пагрозу страты ўласнай веры, асабліва пасьля паўстаньня 1863 г., і разам выступалі ў іх абарону. Аднак сярод паноў мэты нацыянальнага літоўскага руху ацэньваліся па-рознаму. Шмат хто бачыў у яго памкненьнях пагрозу для польскасьці ў Літве, часта трактаванай як правінцыя колішняй Рэчы Паспалітай, і таму быў настроены варожа. Аднак сярод паноў знаходзілася і нямала прыхільнікаў гэткіх ідэяў, так што Тадэвуш мог крочыць па ўжо пратаптанай сьцежцы.

Затое Вацлаў ня мог скарыстаць нават з такога магніту, якім для Тадэвуша была канцэпцыя літоўскага руху. У XIX ст. працэс беларускага нацыянальнага адраджэньня цягнуўся надзвычай марудна і, хаця й меў патэнцыйную грамадзкую базу сярод беларускай шляхты, заставаўся ўсё ж зьявай эфэмэрнай і амаль незаўважнай. Звычайна гэта тлумачаць рэпрэсіўнай палітыкай царызму, асабліва абмежаваньнямі ў выдавецкай дзейнасьці, а таксама — адсутнасьцю нацыянальнага "П'емонту" за мяжой[26], якім для літоўцаў была Ўсходняя Прусія, а для ўкраінцаў — Галіччына. Напэўна, гэта былі важныя акалічнасьці, аднак найважнейшай перашкодай для беларускага руху заставалася парадаксальная ідэйная сытуацыя: яго праваднікамі ў краіне, дзе пераважала праваслаўнае насельніцтва, сталі галоўным чынам прадстаўнікі каталіцкай шляхты. Яны сапраўды ўсьведамлялі сваю этнічную адметнасьць, аднак не маглі ўзьняцца па-над рэлігійным

[26] Гл. заўвагу 1 да да артыкула "Прарасейскі выбар Беларусі". — *А.С.*

бар'ерам, рэальна ацаніць існуючае становішча і сфармуляваць агульнанацыянальную праграму культурнай і палітычнай дзейнасьці, прымальную і для адной, і для другой часткі грамадзтва, асабліва — для праваслаўнай большасьці.

Беларуская паэзія XIX ст., якая звычайна не выходзіла за рамкі этнаграфізму і сацыяльна-бытавой праблематыкі, падаванай з пазыцыі клясавай згоды памешчыцтва і сялянства, апрача абмежаванай папулярызацыі мовы, не ўплывала на гэта. Падчас паўстаньня 1863 г. зьявілася беларускамоўная агітацыйная публіцыстыка, пакліканая прыцягнуць сялян да ўзброенай барацьбы з царызмам. Аднак пры гэтым паміж прыхільнікамі кансэрватыўнага і радыкальнага крыла паўстаньня ў Літве і Беларусі не заўважалася якіх-кольвек істотных — з нацыянальнага гледзішча — ідэйных адрозьненьняў. Апрача ўзаемных супярэчнасьцяў у аграрным пытаньні, літаратура абедзьвюх плыняў ідэалізавала былую Рэч Паспалітую, выступала ў абарону Каталіцкай Царквы і прапагандавала адзінства палітычных інтарэсаў Польшчы і Беларусі як яе правінцыі. Пальмяны заклік Канстанціна Каліноўскага да беларускага народу змагацца за свае правы, "бо тагды толькі жыць будзеш шчасьліва, калі ўжэ Маскаля над табой ня будзе" — гэта яшчэ не незалежніцкая дэклярацыя, бо абмінае ня менш важнае пытаньне польскай гегемоніі. Нават крытыка сацыяльнай несправядлівасьці ў адозвах радыкалаў ("Мужыцкая праўда" ды інш.) мае выразную антымаскоўскую афарбоўку, аднак не закранае мясцовых паноў.

Таму беларускамоўная літаратура XIX ст. разьвівалася ў вялікай меры ў рэчышчы польскай палітычнай думкі і польскай барацьбы з Расеяй за незалежнасьць. У выніку такіх абставінаў у ёй прасочваецца рэзкая антыправаслаўная тэндэнцыя, якая значна абмяжоўвала яе пашырэньне сярод пераважаючай праваслаўнай інтэлігенцыі і, як наступства, пазбаўляла ўплыву на большую частку беларускага люду. Падобную ролю адыгрываў таксама ўжываны ў гэтай літаратуры польскі альфабэт. Усё гэта палягчала расейскае процідзеяньне і паўплывала на зьяўленьне ў другой палове XIX ст. іншага ідэйнага кірунку пад назвай "западноруссизм", які пры падтрымцы ўладаў спрабаваў падаваць Беларусь як спрадвечна расейскі край і абгрунтаваць расейскае панаваньне. Гэтая плынь зацягвала прадстаўнікоў беларускай праваслаўнай інтэлігенцыі, якія, нягледзячы на такую палітычную арыентацыю, шмат зрабілі ў галіне этнаграфіі, мовазнаўства, краязнаўства і гісторыі Беларусі. Усё гэта значна паўплывала на разьвіцьцё палітычнай думкі, праявай чаго ёсьць дзейнасьць беларускіх народавольцаў. У 1884 г. у выдадзеным на гектографе часопісе "Гомон" яны ўпершыню кінулі заклік аўтаноміі Беларусі ў складзе Расейскай імпэрыі.

Такім чынам, беларуская палітычная думка зь цяжкасьцю церабіла сабе дарогу сярод польска-расейскай ідэйнай барацьбы і да канца XIX ст. разьвівалася ў дзьвюх паралельных прасторах, не знаходзячы пунктаў судакрананьня. Нават родная мова доўгі час не была плятформай для супольнай дзейнасьці. Праўда, прадстаўнікі каталіцка-шляхецкага кірунку больш зрабілі для яе папулярызацыі, аднак цяжка адназначна меркаваць, у якой ступені гэта адлюстроўвала іх імкненьне стварыць мадэрную беларускую нацыю, а ў якой была толькі спробай процідзеяньня расейскай экспансіі. Нават Францішак Багушэвіч, якога часам лічаць бацькам беларускага нацыянальнага адраджэньня, у 1891 г. у прадмове да зборніка сваіх вершаў "Дудка беларуская" заклікаў: "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі", — і таго ж году ў Вільні пачаў закладаць нелегальныя польскія школкі[27]. Нарэшце, аніводзін з абуджальнікаў XIX ст. ня ўзяўся за стварэньне беларускага лемантара, гэтага найпрасьцейшага сродку разьвіцьця нацыянальнай культуры.

Дзеля гэтага ў выбары Вацлава Іваноўскага быў адмысловы аспэкт. Беларускі нацыянальны рух ня мог уцягнуць яго, бо яго яшчэ не было тады, калі Вацлаў вучыўся ў гімназіі. Якраз наадварот — яго нацыянальнае самавызначэньне было зьвязанае з усьведамленьнем неабходнасьці стварыць гэты рух шляхам абуджэньня гістарычнай памяці, стымуляваньня і памнажэньня разнастайных творчых ініцыятываў. Малады

[27] Krzywicki L. Na marginesie starej fotografii // Niepodległość. T. III, zesz. 1/5. Warszawa, 1933. S. 74.

гімназіст, безумоўна, ня ведаў усіх драбніцаў гістарычнага працэсу, што абумовілі генэзу руху, і ня быў глыбока абазнаны ў бягучай сытуацыі, аднак адчуваў у народзе патэнцыйныя сілы для Беларусі, якія дагэтуль гінулі ў польскай ці расейскай арбіце. Каб скіраваць гэтыя сілы на беларускі шлях, трэба было ў першую чаргу стварыць адпаведную ідэйную і арганізацыйную канцэпцыю.

У пошуках канцэпцыі

Пасьля заканчэньня гімназіі маладыя Іваноўскія адзін за адным накіроўваліся ў сталічны Пецярбург. У 1895 г. туды прыбыў Юры, а ў 1899 г. — Вацлаў. Абодва яны сталі студэнтамі Тэхналягічнага інстытуту, дзе некалі вучыўся іх бацька. Юры вучыўся на факультэце мэханікі, а Вацлаў — на хімічным. У 1901 г. да іх далучыўся Тадэвуш, які скончыў у Пецярбургу гімназію і паступіў ва ўнівэрсытэт. Сыны жылі разам з бацькам у адным з найлепшых кварталаў гораду ля Ізмайлаўскага праспэкту (6-я рота, д. 10), як і належала сям'і правадзейнага дзяржаўнага радніка пры міністэрстве сельскай гаспадаркі. Тым часам маці заставалася ў Варшаве з двума меншымі дзецьмі — Галенай і Станіславам. Паводле традыцыі, усе яны зьбіраліся ў Лябёдцы на сьвята Вялікадня і Божага Нараджэньня. Гэтаксама праходзілі і летнія вакацыі.

У адрозьненьне ад бацькі, які галоўную ўвагу надаваў прафэсійнай кар'еры, маладыя Іваноўскія ў Пецярбургу захапіліся палітычнай дзейнасьцю, якая паглынала іх ня менш за вучобу. Усе трое — Юры, Вацлаў і Тадэвуш — знайшлі сабе тут спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі свайго нацыянальнага выбару. Гэтак, Юры стаў дзеячом польскага Кола народнай асьветы і Польскай Сацыялістычнай Партыі, між іншым, узяў удзел у вызваленьні Юзафа Пілсудзкага зь Пецярбурскага турэмнага шпіталю[1]. Тадэвуш навязаў кантакт зь літоўскімі дзеячамі і, як належала сьвядомаму літоўцу, пачаў вучыць літоўскую мову[2]. Толькі Вацлаў ня мог далучыцца да беларускай арганізацыі, бо на той час ані ў Пецярбургу, ані дзе-кольвек яшчэ такой арганізацыі пакуль не існавала[3]. Стварэньне Беларускай Рэвалюцыйнай Партыі (БРП), дзейнасьць якой паклала пачатак разьвіцьцю беларускага нацыянальнага руху, акурат і стала яго заслугай.

Акалічнасьці ўзьнікненьня і дзейнасьці БРП заслугоўваюць павышанай увагі перадусім з прычыны пазьнейшай супярэчлівай ацэнкі паходжаньня маладога беларускага нацыянальнага руху. Так, расейскія праціўнікі гэтага руху сьцьвярджалі, што ён паўстаў у выніку польскай інтрыгі, разьлічанай на падзяленьне "адзінай і непадзельнай" расейскай нацыі[4], а значыць — нацэленай супраць інтарэсаў расейскай дзяржавы. У сваю чаргу, яго польскія праціўнікі бачылі ў ім, асабліва ў міжваенны пэрыяд, расейскі падкоп, а калі-нікалі і нямецкі, пакліканы аслабіць польскія пазыцыі ў Беларусі[5]. Такім чынам, абодва бакі адмаўляліся прызнаць аўтэнтычны характар гэтага руху.

Патрэбу пільней прыгледзецца да генэзы БРП дыктуе таксама валюнтарызм бела-

[1] Słownik biograficzny działaczy polskiego ruchu robotniczego. T. II. Warszawa, 1987. S. 583.

[2] Ivanauskas T. Gyvenimas... P. 16.

[3] У той час у Менску меўся гімназічны гурток пад кіраўніцтвам І. Луцкевіча. — *А.С.*

[4] Цьвікевіч А. "Западно-руссизм". Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. Менск, 1929. С. 310—313. — *Ю.Т.*

Гэтая праца А. Цьвікевіча была перавыдадзеная ў 1993 г. у Менску. — *А.С.*

[5] Як паведамляе прафэсар Ежы Тамашэўскі, яшчэ ў 1981 г. яго карэспандэнт трактаваў беларускую нацыю і беларускую культуру як выдумку на згубу Польшчы і дадаваў: "<...> у Беларусі — як ва ўсіх правінцыях Польшчы — квітнела багатая народная культура з уласьцівай ёй гаворкай, таму на яе аснове царскія шавіністы ў апошнія гады XIX стагодзьдзя стварылі асобную беларускую культуру і беларускую нацыю, узяўшы за ўзор свой досьвед з Украінай, дзе адвечна польскіх сялян ператваралі ў ворагаў польскасьці з асобнай літаратурай". // Rzeczpospolita wielu narodów. Warszawa, 1985. S. 133—134.

рускіх гісторыкаў і публіцыстаў у выяўленьні пачаткаў нацыянальнага руху. Гэта тлумачылася іх палітычнымі, клясавымі, рэлігійнымі пазыцыямі і нават асабістымі сымпатыямі альбо антыпатыямі. Дзейнасьць Вацлава Іваноўскага заціралася або ўвогуле ігнаравалася, бо ён паводле свайго паходжаньня "не падыходзіў" на ролю стваральніка радыкальнага народнага руху. Замоўчвалася нават само існаваньне БРП, да чаго ў найбольшай ступені спрычыніўся Антон Луцкевіч[6].

Закіды расейскіх праціўнікаў гэтага руху гучалі досыць пераканаўча ў сьвятле палітыкі ППС, якая ў канцы XIX ст. імкнулася спалучыць узьнікаючае сярод беларусаў, літоўцаў і ўкраінцаў пачуцьцё нацыянальнай адметнасьці з вызваленчымі імкненьнямі польскай нацыі. Гэтая мэта была сфармуляваная ў праграме ППС, прынятай на арганізацыйным зьезьдзе ў Парыжы (лістапад 1892 г.), якая прадугледжвала пашырэньне партыйнай дзейнасьці "ў правінцыях, зьвязаных даўней з Рэччу Паспалітай Польскай", а таксама — супрацоўніцтва зь іншымі тады літоўскай і ўкраінскай сацыялістычнымі арганізацыямі ў барацьбе з царызмам[7]. Гэтыя пастуляты знайшлі далейшае разьвіцьцё на III зьезьдзе ППС у Вільні (чэрвень 1895 г.), дзе была прынятая наступная рэзалюцыя што да іншых народаў Расейскай імпэрыі:

> Зважаючы, што ў склад расейскай дзяржавы ўваходзіць шмат іншых нацыянальнасьцяў і што сярод іх абуджаецца супраціў барбарскаму прыгнёту царызму, які сілай абставінаў павінен нарастаць;
> зважаючы, што гэтыя народы, дзякуючы сваёй шматлікасьці, уяўляюць сабой сілу, якая пры адпаведных умовах вызначыць лёс царызму;
> зважаючы, што ў інтарэсах польскай рабочай клясы, гэтак сама, як і міжнароднага рабочага руху, палягае зрыненьне акупацыйнага царскага рэжыму, самым надзейным сродкам для чаго ёсьць адасабленьне ад цяперашняй расейскай дзяржавы заняволеных царызмам нацыянальнасьцяў;
> зважаючы нарэшце, што сярод некаторых з гэтых нацыяў існуюць пачаткі сацыялістычнага руху, Зьезд пастанаўляе, што ППС у сваіх узаемадачыненьнях з апазыцыйнымі групамі іншых нацыянальнасьцяў павінна дбаць пра абуджэньне ў іх сэпаратысцкіх настрояў і падкрэсьліваць пастаянную неабходнасьць зрынуць царызм шляхам узаемадзеяньня нацыяў, якія апынуліся пад яго прыгнётам. Зьезд адначасова даручае ЦРК (Цэнтральнаму рабочаму камітэту. — *заўв. перакл.*) у меру магчымасьці аказваць дапамогу ўзьнікаючым сацыялістычным рухам сярод гэтых нацыянальнасьцяў[8].

Згодна з гэтымі ўстаноўкамі, польскія незалежніцкія дзеячы ўжо на пачатку 1890-х гг. заняліся перавозам выдадзеных за мяжой беларускіх кніжак і іх распаўсюдам на тэрыторыі Расейскай імпэрыі. Сярод гэтай літаратуры былі кніжкі Ф. Багушэвіча, асабліва — "Дудка беларуская", якая выйшла ў Кракаве ў 1891 г., а таксама — агітацыйная брашура "Дзядзька Антон, альбо гутарка аб усім чыста, што баліць, а чаму баліць — не ведаем", якую выдалі ў Тыльзыце на пачатку 1892 г. сябры маскоўскага Польскага кола — Напалеон Чарноцкі і Мар'ян Абрамовіч. Важную ролю ў перавозе гэтай брашуры з Тыльзыту адыграў сябра Пілсудзкага, пазьней чалец ЦРК, Аляксандар Сулькевіч, які з 1890 г. некалькі гадоў працаваў у мытні на мяжы з Прусіяй і арганізоўваў перавоз нелегаль-

[6] На жаль, да гэтага часу ня выяўленая значная частка працы А. Луцкевіча "Да гісторыі Беларускае Рэвалюцыйнае (пасьля Сацыялістычнае) Грамады" (гл.: Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху: Выбраныя творы. Мінск: Беларускі кнігазбор, 2003). У ёй аўтар адказваў на аналягічныя закіды кс. А. Станкевіча і — ня выключана — выказваўся наконт БРП. Што ж датычыць аўтара гэтае манаграфіі, дык ён далей сам піша, што "БРП не была партыяй у поўным сэнсе гэтага слова" і што "вясною 1903 г. Іван Луцкевіч распачаў стварэньне БРГ". — *А.С.*

[7] Materiały do historii PPS i ruchu rewolucyjnego w zaborze rosyjskim od 1893 r. do 1904 r. Rok 1893—1897. Warszawa, 1907. S. 19.

[8] Тамсама. С. 149.

ных сацыялістычных выданьняў у Расею[9]. Паводле справаздачы ППС, толькі за 1895 г. каля Таўругу на прускай мяжы было перакінута 332 асобнікі беларускіх выданьняў[10]. Пра вялікае значэньне, надаванае папулярызацыі гэтых кніжак, можа сьведчыць хаця б такі факт: у 1896 г. Зыгмунт Нагродзкі, прыяцель Юзафа Пілсудзкага, прафінансаваў другое выданьне "Дудкі", выпушчанае ў Кракаве[11]. Гэтая кніжка стала свайго роду катэхізісам для дзеячоў беларускага адраджэньня.

Распаўсюд беларускай літаратуры сябрамі ППС спрыяў пашырэньню рэвалюцыйных настрояў у Беларусі і абуджэньню нацыянальнай сьвядомасьці. У гэтым сэнсе яна аказала пазытыўны ўплыў на ўзьнікненьне беларускага нацыянальнага руху. Таму, відаць, некаторыя аўтары, малюючы гэты ўплыў зь немалым перабольшаньнем, сьцьвярджаюць, што ППС адыграла вырашальную ролю ў зараджэньні беларускага руху[12]. Па сутнасьці, гэтая партыя ў першае дзесяцігодзьдзе свайго існаваньня не выходзіла па–за межы распаўсюду выдадзеных за мяжой кніжак, яна не займалася выпускам агітацыйнай літаратуры ад уласнага імя і не рабіла спэцыяльных захадаў, каб стварыць пад сваім крылом беларускую рэвалюцыйную арганізацыю.

Дзякуючы знаёмствам брата Юр'я, Вацлаў Іваноўскі апынуўся ў асяродзьдзі пецярбурскіх дзеячоў ППС адразу ж па прыезьдзе на вучэньне ў 1899 г. Ён асабіста пазнаёміўся зь лідэрамі партыі, пасябраваў зь яе пецярбурскімі дзеячамі — студэнтамі Мечыславам Міхаловічам, Рамуальдам Мілерам, Канстанцінам Дэмідэцкім–Дэміdовічам ды многімі іншымі. Такім чынам, ён добра арыентаваўся ў справах ППС, яе праграме і палітычных мэтах у Беларусі, карыстаўся сымпатыяй яе сяброў, якія імкнуліся заахвоціць яго да працы на беларускай ніве. Натуральна, зыходным пунктам такой працы была канцэпцыя і людзі, гатовыя ўвасобіць яе ў жыцьцё. Аднак пакуль што не было ані таго, ані другога.

Паўстае пытаньне, ці мог Вацлаў прызнаць праграму ППС за ідэйную аснову беларускай арганізацыі. Шмат гадоў пазьней ён пісаў, што думка аб сувэрэннай незалежнасьці Беларусі паўстала ў 1899—1900 гг. сярод сяброў Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады[13]. Нават калі спамянуць той факт, што Грамада паўстала пазьней, толькі праз некалькі гадоў, гэтае выказваньне ня дужа праясьняе пытаньня, бо ідэю беларускай незалежнасьці на той час прызнавала і ППС. Большае праграмнае значэньне мела б ажыцьцяўленьне гэтай ідэі. Але ў такім разе колькасьць пытаньняў і сумненьняў памнажалася б да бясконцасьці. Таму лёгіка падказвала, што падзеньне царскага абсалютызму можа адбыцца ў выніку агульнарасейскай рэвалюцыі, а ня дзейнасьці ППС. У сваю чаргу, рэвалюцыя павінна была зьнішчыць польскую зямельную ўласнасьць у Беларусі, што не ўваходзіла ў пляны ППС. Нарэшце, паўставала пытаньне, ці пастуляванае аднаўленьне Рэчы Паспалітай як фэдэрацыі нацыяў ставарыла б для беларусаў на тагачасным этапе іх нацыянальнай сьвядомасьці лепшую альтэрнатыву.

Гэта былі ключавыя пытаньні, якія доўга яшчэ непакоілі дзеячоў беларускага руху. Напэўна, не разьвязаў іх на пачатку XX ст. і малады студэнт В. Іваноўскі. Уваходзячы ў сьвет палітыкі, яму даводзілася здаваць сабе справу з таго, што нічога не даецца раз і назаўжды, а зьмены сытуацыі прымусяць не аднойчы перагледзець каштоўнасьці і ары-

---

9 Вакол абставінаў публікацыі "Дзядзькі Антона". [С. 22—30 у гэтым выд. — *Рэд.*]

10 Materiały do historii PPS... S. 173.

11 Луцкевіч А. Жыцьцё і творчасьць Фр. Багушэвіча ва ўспамінах яго сучасьнікаў // Запісы Беларускага Навуковага Таварыства. Сш. 1. Вільня, 1938. С. 29—30. — *Ю.Т.*

Гэты артыкул апублікаваны таксама ў: Крыніца. 1995. № 11—12; Спадчына. 2001. № 1—2. Гл. таксама тэкст А. Луцкевіча "Зыгмунт Нагродзкі і яго адносіны да беларусаў: Пасьмертны ўспамін" // Куфэрак Віленшчыны. 2004. № 1(9). — *А.С.*

12 Станкевіч А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня. Вільня, 1934. С. 71—72; Pobóg-Malinowski W. Najnowsza historia polityczna Polski. T. II. Londyn, 1967. S. 355; Wajner M. Do historii PPS na Litwie // Niepodległość. T. XV. 1937. S. 329.

13 Станкевіч А. Да гісторыі... С. 73.

енціры і нават мяняць саюзьнікаў. У той самы час успадкаваны, мабыць, ад бацькі, рацыяналізм дыктаваў яму перакананьне аб патрэбе пачаць арганізаваную нацыятворчую арганічную працу, вынікі якой застануцца трывалай вартасьцю пры любой палітычнай сытуацыі; больш за тое спрычыняцца да фармаваньня такіх сытуацыяў. Ён бачыў, што гэта доўгі, але самы эфэктыўны шлях да вызваленьня беларускага народу з-пад чужых культурных і палітычных уплываў.

Усе гэтыя праблемы часта абмяркоўваліся сярод сяброў створанага Вацлавам Іваноўскім студэнцкага гуртка, які, паводле яго прызнаньня ў лісьце да ксяндза Адама Станкевіча, існаваў яшчэ да 1902 г., ня маючы строгай арганізацыйнай формы[14]. Таму можна меркаваць, што ён меў характар дыскусійнага клюбу, бо нічога іншага пра яго дзейнасьць невядома. Людзей у ім было напачатку, напэўна, няшмат. Праўда, у той пэрыяд у Пецярбургу вучылася багата студэнтаў зь Беларусі, але сярод іх не было вясковай моладзі, якая адно праз некалькі гадоў атрымала права навучацца ў вышэйшых навучальных установах Расеі. Таму свае заклікі і аргумэнты В. Іваноўскі адрасаваў галоўным чынам да шляхецкай моладзі з спальшчэлых памешчыцкіх сем'яў. Многія з гэтых маладых людзей гатовыя былі працаваць сярод беларускага люду на яго роднай мове, але ў інтарэсах польскай справы, а ня новай ды малазразумелай — беларускай, якую прапагандаваў Іваноўскі.

Такую пазыцыю ў вялікай ступені абумоўлівала амаль поўная адсутнасьць традыцыяў арганізаванага беларускага руху. Студэнцкія зямляцтвы, што існавалі ў акадэмічных асяродках Расеі, мелі пераважна расейскі культурны характар і, за адным вынятkам, не пакінулі па сабе сьледу на ніве беларускага адраджэньня[15]. Дзейнасьць А. Гурыновіча і народавольцаў — выдаўцоў гектаграфічнага часопісу "Гомон" на пачатку 80-х гг. XIX ст. — была хутка зьліквідаваная, а памяць па ёй, надоўга пахаваная ў паліцэйскіх архівах, амаль зацерлася ў асяродзьдзі беларускіх студэнтаў. Зь іншага боку, на фармаваньне іх сьвядомасьці пазытыўна ўплывалі працы расейскіх вучоных, зацікаўленых беларускай гісторыяй і народнай культурай — расла колькасьць публікацыяў, прысьвечаных гэтым пытаньням. Нарэшце, істотную ролю адыгрывалі ідэі паўстаньня 1863 г. і ініцыятараў беларускага адраджэньня з XIX ст. — Канстанціна Каліноўскага, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Уладзіслава Сыракомлі і асабліва Францішка Багушэвіча.

Значыць, існавалі ня толькі адмоўныя, але і дадатныя перадумовы для ўзьнікненьня такога руху. Таму намаганьні Вацлава Іваноўскага далі плён. У 1901/1902 навучальным годзе беларускі студэнцкі гурток, напэўна, стаў ужо даволі шматлікім, калі ўлічыць, што на яго аснове было вырашана стварыць нелегальную арганізацыю — Беларускую Рэвалюцыйную Партыю. Мы ня ведаем даты яе ўтварэньня, аднак можна меркаваць, што гэта адбылося на пачатку 1902 г. Пра гэта сьведчыць ужо прыгаданае паведамленьне Вацлава Іваноўскага аб тым, што да самага 1902 г. існаваў толькі нефармальны гурток, а таксама — яшчэ адзін цікавы факт: вясной 1902 г. дзеячы БРП мерыліся неўзабаве склікаць свой партыйны зьезд[16].

Вестка аб стварэньні БРП выклікала характэрную рэакцыю з боку кіраўніцтва ППС у абсягу тактыкі дзеяньня ў Беларусі: у чэрвені 1902 г. на VI зьезьдзе ў Любліне была прынятая таемная "беларуская рэзалюцыя", у якой гаварылася:

> Беларуская рэзалюцыя. Даручыць Выканаўчаму Камітэту выслаць дэлегатаў на зьезд, каб выявіць ім сымпатыі і пажаданьні імкнуцца да незалежнасьці і фэдэрацыйных адносінаў з намі. — ППС лічыць, што яна мае права ўзьдзейнічаць на беларускае насельніцтва даступнымі ёй сродкамі, якія не супярэчылі б прынцыпам і інтарэсам беларускай сацыялістычнай арганізацыі[17].

[14] Тамсама. С. 69.

[15] Туронак Ю. Вакол абставінаў публікацыі "Дзядзькі Антона". С. 22—30 у гэтым выданьні. — *Рэд.*

[16] Uchwały IV zjazdu PPS. Цэнтральны Архіў ЦК ПАРП, 305/III/1, pt. 2, k. 46 і далей.

[17] Тамсама.

Але дэлегаты ППС не змаглі прэзэнтаваць гэтых пастановаў на зьезьдзе, бо зьезд той так і не адбыўся. Тым ня менш, згаданая рэзалюцыя, прынятая польскімі сацыялістамі, сталася важным дакумэнтам, які сьведчыў пра ідэйную і арганізацыйную незалежнасьць БРП ад ППС. У адваротным выпадку інструкцыі для пэпэсаўскіх дэлегатаў, чыёй задачай было намовіць беларусаў да фэдэрацыі з Польшчай, гучалі б цалкам іначай, калі б БРП зьявілася на сьвет дзякуючы арганізацыйным намаганьням ППС.

Большае значэньне для пацьверджаньня гэтай тэзы мае другая частка памянёнай рэзалюцыі, якая сьведчыць, што кіраўніцтва ППС баялася канкурэнцыі з боку беларускай арганізацыі. Яно, напэўна, добра ўсьведамляла яе слабасьць, аднак не магло прадбачыць, як складзецца яе далейшая дзейнасьць. Таму, нягледзячы на абяцаньне з павагаю ставіцца да яе прынцыпаў і інтарэсаў БРП, рашэньне VI зьезду ППС пра беспасярэдняе ўзьдзеяньне на беларускае насельніцтва гаварыла аб тым, што гэтая партыя не зьбіраецца адмаўляцца ад уласных уплываў на карысьць беларускіх саюзьнікаў.

Гэтая пазыцыя выразілася ў тым, што ППС пачала выданьне агітацыйнай літаратуры на беларускай мове, распрацоўкай якой заняліся дзеячы спэцыяльнай, створанай у 1902 г., партыйнай акругі для беларуска–літоўскіх земляў, г.зв. ППС у Літве. У выніку напрыканцы 1902 і ў студзені 1903 г., у лёнданскай друкарні ППС выйшлі тры беларускія брашуры: "Гуторка аб тым, куды мужыцкіе грошы ідуць", "Як зрабіць, каб людзям стало добрэ на сьвеці" і "Хто праўдзівы прыяцель бедного народу". Апрача таго, у траўні 1903 г. ППС у Літве выдала па–беларуску адозву да земляробаў з–пад Скідзеля, што на Гарадзеншчыне, якая мела назву "Do braci mużykou". Натуральна, гэтыя публікацыі адлюстроўвалі ідэалёгію ППС. Яны выкрывалі самадзяржаўе як галоўную прычыну сялянскай нядолі, затое, дбаючы пра інтарэсы польскага панства, абыходзілі вострыя клясавыя супярэчнасьці ў Беларусі. Пытаньне беларускага нацыянальнага адраджэньня ў іх таксама ігнаравалася. Гэтак, выдаўцы гэтых брашураў не цікавіліся фактам, што беларускія дзеці ня могуць атрымаць асьветы на роднай мове, затое абураліся супраць царскіх уладаў за тое, што ім забараняюць вучыцца па–польску[18].

У 1902 г. БРП таксама распачала выдавецкую дзейнасьць. Багатых мэцэнатаў у яе не было, таму выдаваць друкаваныя публікацыі яна не магла. Бракавала ня толькі дасьведчаных публіцыстаў — не было нават элемэнтарных граматычных і правапісных правілаў беларускай мовы. Апрача таго, ніводзін з маладых пачынальнікаў гэтага руху ня быў знаёмы з тэхнікай нелегальнай працы. Але гэтыя цяжкасьці не палохалі В. Іваноўскага, які, напэўна, з досьведу вывучэньня хіміі верыў у магчымасьць — як ён сам казаў — "зь нічога стварыць нешта". Ён пачаў з самай неабходнай рэчы — купіў гектограф. На гэта пайшоў увесь яго заробак са студэнцкай практыкі. Яму дапамог Мечыслаў Міхаловіч, дзяяч ППС, які з сымпатыяй ставіўся да беларускага адраджэньня[19]. З Іваноўскім яго зьвязвала ня толькі грамадзкая дзейнасьць — у Пецярбургу абодва яны заляцаліся да сясьцёр Ячыноўскіх — Станіславы і Сабіны — і неўзабаве сталі швагрamі.

Першай публікацыяй БРП, надрукаванай на гэтым гектографе, стала адозва "Да інтэлігенцыі", якая выйшла ўвосень 1902 г. Яна была выдадзеная на польскай мове, каб знайсьці як мага шырэйшы водгук сярод апалячанай інтэлігенцыі Белай Русі — свайго апрасата. Адозву імгненна перадалі ў рэдакцыю пэпэсаўскага "Przedświtu" ў Лёндане, які апублікаваў яе ў лютым 1903 г. Перадаў яе, без сумневу, Юры Іваноўскі, які ў 1901 г. ужо скончыў вучобу і працаваў спачатку ў Чанстахове, а са жніўня 1902 г. — на фабрыцы Б. Гандке ў Варшаве і дзейнічаў адначасова ў замежным камітэце ППС[20]. Існуе шмат падставаў, каб прывесьці поўны тэкст гэтай адозвы:

---

[18] Як зробіць, каб людзям стало добрэ на свеці. Лёндан, 1903. С. 8.

[19] Станкевіч А. Да гісторыі... С. 74.

[20] Akta Warszawskiego Gubernialnego Zarządu Żandarmerii. Архіў сталічнага гораду Варшавы, syg. 597, k. 12, 76.

Да інтэлігенцыі

Хто з вас пазайздросьціць долі ламавой клячы? Блага накормленая, вечна бітая, прадаваная, як толькі выб'ецца зь сіл, скуралупам — гаруе ўсё сваё жыцьцё, амаль ніколі ня ведаючы адпачынку... Прыемны і харошы малюнак, ці ня так? — і аднак жа, аднак жа вы дазваляеце, не пратэстуеце, ня робіце анічога, каб народ, зь якога вы выйшлі, ня ведаў гэткага ж лёсу. Цёмны — дапатопнымі прыладамі нішчыць зямлю–карміцельку; бедны — за гэта нясе на сабе цяжар падаткаў; аглуждажаны, бо не гаспадарыць над сабой, зь цярплівасьцю слана церпіць дзяржаўны прыгнёт. Усё гэта на руку тым, чыё існаваньне трымаецца на дурноце, цямрэчы і эксплёатацыі народу. Ці хочаце вы браць удзел у гэтым сыстэматычным абкраданьні лепшай долі народу свайго? Вы адмаўляецеся, гледзячы проста ў вочы? Але гэта так, калі самі вы, маючы сьвятло, ня дзеліцеся з тымі, у каго яго няма. І гэтае бязьдзеяньне помсьціцца на вас. Адцятыя ад народу выхаваньнем у чужой мове, вы ня здолелі стварыць уласнай самастойнай культуры для свайго асяродзьдзя і пайшлі служыць суседзям. І слушна — бо не адважыліся на тое, на што адважыліся стакроць меншыя лікам літоўцы, баўгары, сэрбы, харваты і г. д.

Дайце народу асьвету, але дайце яе на роднай мове. Інакш яна ніколі не праточыцца ў нізы. Розум дзіцяці, які зь цяжкасьцю засвойвае агульныя паняцьці, робіць падвойную працу, засвойваючы іх на чужой мове. Адсюль недакладнасьць, хаос, зьнеахвочанасьць да вучэньня. Родная мова — гэта ж выраз душы, яе пачуцьцяў, думак. Урад ведае, што робіць, калі кідае жабрачыя аб'едкі асьветы па-расейску: ён ці ўвогуле адбівае ахвоту да навукі, ці стварае блытаніну паняцьцяў, разрывае непасрэдную еднасьць з народам у самых здольных, робіць зь іх слугаў, што мысьляць па–расейску, у зародку нішчыць нацыянальную адметнасьць, затрымлівае разьвіцьцё беларускай культуры. З усіх яго злачынстваў гэтае, бадай, найвялікшае: катаваньне дзяцінага розуму, скрыўленьне інтэлектуальнага разьвіцьця, маральнае разбэшчваньне — а ў пэрспэктыве —ператварэньне ў маскаля мовай і розумам, а калі ты яшчэ і праваслаўны — перад беларусам адкрываецца шлях да ганаровых пасадаў і дабрабыту — цаной здрады народу. І сярод вас ёсьць шмат гэткіх прадажнікаў.

Дайце народу спазнаць сваё мінулае. Чалавек, які ня памятае таго, што рабіў, адчуваў, думаў, які не распараджаецца нават уласным досьведам — ня ведае, як распараджацца сабой, робіцца лялькай, людзкім пасьмешышчам. Ён можа толькі весьці вэгетатыўнае існаваньне. Гэта амаль быдла. І гэта — доля народу, які ня памятае гісторыі продкаў. Дык вы сталі нявольнікамі ня толькі таму, што вас зламалі паразы — вы сталі нявольнікамі праз свае душы — вы вернападданыя маскоўскага цара. Дзе вашыя законы? У пыле, забытыя, гніюць у бібліятэках, затое ўсемагутны бізун вісіць над вамі. Цалуйце яго, рабы! Можа, калі ў імгле замаячыць мінуўшчына ваша, пахмурая, але ўзьнёслая — вы і пачняце згадваць пра свае правы; можа быць, але безь яе — ніколі. Тым, чым для кожнай душы ёсьць сьвядомасьць, якая нанізвае на адну ніць пражытыя імгненьні, тое для нацыяў — злучэньне мінулых стагодзьдзяў зь цяперашчынай; авалодваньне ёй, рахункам сумленьня, крыніцай, зь якой струменіць жаданьне новай працы для будучыні.

Даць народу асьвету, пазнаёміць яго з роднай гісторыяй — але як? Народнай літаратуры амаль няма, няма гісторыі: яе належыць стварыць! Ці ж трэба спасылацца на прыклады народаў, якія гэта зрабілі, даводзіць, што гэта — мажлівая справа? Чэхі, літоўцы зрабілі гэта, а вы ня здолееце? — вось вам накід праграмы:

1) Арганізоўваць гурткі для працы над роднай мовай (граматыка!), краязнаўствам, гісторыяй, літаратурай. Зьвярнуцца да высокакваліфікаваных спэцыялістаў у адпаведных галінах з просьбай прачытаць лекцыі і напісаць адпаведныя творы. Палегчыць ім гэтую працу, даўшы матэрыяльную дапамогу.

2) Пазнаёміцца з польскай і расейскай народнай літаратурай, перакладаць і самім пісаць адпаведныя творы.

3) Арганізаваць збор сродкаў на памянёныя выданьні.

4) Арганізаваць продаж альбо распаўсюд выданьняў.

5) Выказваць пагарду тым, хто гэтага рабіць ня будзе.

На заканчэньне — маленькі абразок з Канапніцкай (польскай паэткі):
Багаты рымлянін праводзіў сваіх гасьцей па будынку, у якім трымаў купленых рабоў. Германец, скіф, нумідыец, грэк — усе патаналі ў тузе за родным краем, упадалі то ў шаленства гневу, то ў халодную роспач, выпраменьвалі нянавісьць. І толькі адзін славянін граў на жалейцы і танцаваў. Умеў ён суцешыцца ў няволі, забыць аб страчаным краі, аб нядаўняй свабодзе.

Будзем і надалей падобныя да яго?

Б. П. Р.[21]

Хто быў аўтарам гэтай адозвы? На думку Аляксандра Бурбіса, тагачаснага віленскага гімназіста, яе напісаў Лявон Малецкі, студэнт Пецярбурскага тэхналягічнага інстытуту. Напісаў яе ў Вільні, гэта значыць — падчас летніх вакацыяў 1902 г., якія Малецкі правёў у родным доме[22]. Аднак, здаецца, вэрсія А. Бурбіса не здымае праблемы аўтарства. Сэнс і пастуляты гэтай адозвы мала хвалявалі Малецкага — пра гэта сьведчыць яго адыход ад беларускага руху пасьля заканчэньня інстытуту ў 1904 г. Такім чынам, можна меркаваць, што гэтая адозва была апрацаваная пры непасрэдным удзеле Вацлава Іваноўскага, бо закладзеныя ў ёй ідэі засталіся галоўным арыенцірам яго далейшай шматгадовай дзейнасьці.

Наступнай ініцыятывай Вацлава Іваноўскага стала спроба нелегальна выдаць часопіс "Свабода", задуманы як орган Беларускай Рэвалюцыйнай Партыі. Павелічэньне кола беларускай моладзі ў Пецярбургу спрыяла ажыцьцяўленьню гэтай задумы. Восеньню 1902 г. сюды прыехалі вучыцца браты Іван і Антон Луцкевічы зь Менску і Алёйзія Пашкевічанка з ваколіц Ліды. Алёйзія пасялілася ў незнаёмай ёй дагэтуль асобы — Сабіны Ячыноўскай, нявесты Вацлава Іваноўскага, і гэты факт, безумоўна, сьведчыць аб тым, што арганізатарам яе прыбыцьця ў Пецярбург быў акурат ён[23]. Тут Пашкевічанка скончыла гімназію Александроўскай і разам з Сабінай наведвала курсы Лесгафта. Алёйзія стала неўзабаве вядомай паэткай і дзяячкай, найчасьцей яна выступала пад псэўданімам Цётка[24]. Да ліку самых блізкіх і надзейных паплечнікаў В. Іваноўскага належаў таксама пецярбурскі гімназіст Вінцэнт Валейка родам з фальварку Галавічполь, што межаваў зь Лябёдкай. Таму ён быў змалку знаёмым суседам.

Гэтыя маладыя людзі заняліся выданьнем першага нумару "Свабоды". Зь імі супрацоўнічаў пэпэсавец Рамуальд Мілер і ўжо згаданы Лявон Малецкі. Зробленую ўручную матрыцу "Свабоды" на восем старонак падрыхтавалі Мілер (першая бачына) і Валейка (астатнія). Гэтыя матэрыялы перавезьлі ў Лябёдку, дзе падчас калядных вакацыяў 1902 г. яго аддрукавалі на гектарафе накладам 200 асобнікаў Вацлаў і Тадэвуш Іваноўскія, а таксама — Валейка з братамі Антонам і Станіславам. На тытульным аркушы выданьня значылася: "Свабода, № 1, 1903 г."[25].

[21] Przedświt. 1903. № 2. S. 53—54.

[22] Бурбіс А. Беларуская Соцыялістычная Грамада ў першым пэрыядзе яе працы // Беларусь. Нарысы гісторыі, культуры і рэвалюцыйнага руху. Менск, 1924. С. 178. — *Ю.Т.*

Гэтая публікацыя ёсьць скарочанай вэрсіяй працы А. Бурбіса "Кароткі агляд беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху", упершыню надрукаванай пад псэўданімам Стары Піліп у: Вестник Народного Комиссариата Просвещения. 1921. № 1—2. — *А.С.*

[23] Арабей Л. Стану песней. Москва, 1982. С. 23.

[24] Як паведаміў муж Алёйзіі, літоўскі сацыял–дэмакратычны дзяяч Стэпонас Кайрыс, Цёткай яе празвалі суседзі Іваноўскія. Зь цягам часу гэтая мянушка стала яе літаратурным псэўданімам. Гл.: Кайрыс С. З маіх успамінаў пра Цётку // Конадні. Сш. 2. Нью–Ёрк, 1954. С. 68. — *Ю.Т.*

Гэтыя ўспаміны зьмешчаныя ў кнігах: На суд гісторыі: Успаміны, Дыялогі. Мінск: Мастацкая літаратура, 1994; Цётка. Выбраныя творы. Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. Друкаваліся яны і ў газэце "Літаратура і мастацтва". — *А.С.*

[25] Больш падрабязна пра "Свабоду" гл.: Туронак Ю. Па сьлядох "Свабоды". С. 17—19 у гэтым выданьні. — *Рэд.*

Але фінал гэтай ініцыятывы быў правальны: "Свабода" была зьнішчаная і не дайшла да чытача. Пазьней Вацлаў Івановскі блытаўся ў асьвятленьні гэтай падзеі: ён сьцьвярджаў, што ўвесь наклад пераправіў Юр'ю ў Варшаву і там яго канфіскавала паліцыя, іншым разам — што яго зьнішчылі ў Лябёдцы, калі паліцыя нечакана зьявілася ў доме, дзе друкавалася выданьне. Аднак ні першая, ні другая вэрсія не адпавядае сапраўднасьці[26]. У студзені 1903 г., падчас ператрусу ў варшаўскай кватэры Юр'я, "Свабода" сапраўды была знойдзеная і канфіскаваная, але толькі адзін асобнік. Не адпавядае сапраўднасьці і другая вэрсія: ня так проста было зьнішчыць 200 надрукаваных асобнікаў у выпадку паліцэйскага налёту, апроч таго, быў бы сканфіскаваны і гектограф. Тым часам, пасьля няўдалай апэрацыі Тадэвуш спакойна завёз гэты апарат у Пецярбург. Хутчэй за ўсё, сапраўдная прычына была больш празаічная, а "Свабоду" мусіў зьнішчыць сам яе выдавец пасьля суровага ўмяшальніцтва бацькі, які прыехаў у Лябёдку на сьвята Божага Нараджэньня і ўтаймаваў рэвалюцыйныя памкненьні сына.

Злы кон перасьледаваў "Свабоду" і пасьля інцыдэнту ў Лябёдцы. Адзіны ці адзін зь нямногіх засталых асобнікаў канфіскавала ў старэйшага з братоў Івановскіх варшаўская паліцыя, а сам Юры быў арыштаваны і на чатыры гады сасланы ў Ноўгарадзкую губэрню. Пры такім стане рэчаў гэтае выданьне мае пэўнае значэньне толькі для вывучэньня сьветапогляду яго стваральнікаў. Пакуль што, аднак, не было знойдзена ніводнага асобніка, таму гэтай справе цяжка даць нейкую вычарпальную ацэнку.

Як пісаў ксёндз Адам Станкевіч, спасылаючыся на паведамленьне Вацлава Івановскага, у "Свабодзе" былі зьмешчаныя два артыкулы, адзін зь якіх — на палітычную тэму, а другі — аб адметнасьці беларускага народу ад іншых народаў. Зьмест гэтых артыкулаў невядомы. Затое вядомы паэтычны дэбют Алёйзіі Пашкевічанкі — верш "Мужыцкая доля" — у якім, аднак, не было ніякіх рэвалюцыйных ці антыўрадавых акцэнтаў. Затое верш Сыракомлі "Добрыя весьці", зьмешчаны ў "Свабодзе", мае істотнае значэньне для характарыстыкі ідэйнага кірунку часопіса, а значыць — БРП. БРП хадайнічала перад ППС у справе выданьня гэтага вершу асобнай лістоўкай накладам 2000 асобнікаў. Дзеля гэтага верш быў высланы ў Лёндан, але там яго не надрукавалі, і пазьней, у міжваенныя часы, ён разам зь лёнданскім архівам ППС вярнуўся ў Польшчу. Гэты верш захоўваўся ў Цэнтральным Архіве ЦК ПАРП, а цяпер — у Архіве Новых Актаў у Варшаве як адзіны аўтэнтычны фрагмэнт "Свабоды".

Значэньне напісанага ў пару "Вясны Народаў" верша Сыракомлі "Добрыя весьці" палягае ў яго характэрнай пераробцы рэдактарамі "Свабоды", у выніку чаго ён атрымаў цалкам іншы сэнс, прыстасаваны да новых умоваў рэвалюцыйнай барацьбы. Па–першае, антырасейскія акцэнты арыгінальнага тэксту Сыракомлі замянілі на антыцарскія. Напрыклад, такія фармулёўкі Сыракомлі, як "лягчэй будзе сэрцу, як згінець маскаль" альбо "ня прыйдзе вораг з маскоўскага краю", у "Свабодзе" атрымалі наступнае гучаньне: "лягчэй будзе сэрцу, як згіне наш цар" і "ня прыйдзе вораг з чужога краю". Па–другое, клясавая згода і ўзаемадзеяньне паміж сялянствам і шляхтай, прапагандаваныя Сыракомлем, саступілі месца работніцка–сялянскай салідарнасьці. Вось характэрны прыклад перапрацоўкі:

Сыракомля:	**"Свабода":**
Мужык з панамі стаіць за–пан–браце	Мужык з рабочым стаіць за панбраце
Рука за руку, а грудзь за грудзь.	Рука за руку, грудзь за грудзь.
Пяром па карце, ды сахой па ніве,	Рукой у фабрыцы, сахой па ніве,
Адзін другому роўнасьць засьцярог.	Адзін другому вольнасьць засьцярог".

Абедзьве публікацыі БРП дастаткова ясна выяўлялі пазыцыю гэтай партыі і асабліва — яе стваральніка, Вацлава Івановскага, шмат у якіх праблемах, што паўставалі перад маладым беларускім рухам. Калі ў адозьве "Да інтэлігенцыі" была сфармуляваная тыпо-

[26] Ёсьць і трэцяя вэрсія. Гл. заўвагу 3 да артыкула "Па сьлядох «Свабоды»" ў гэтай кнізе. — *А.С.*

вая культурна–асьветніцкая праграма: стварэньне агульнанацыянальнай мовы, літаратуры, краязнаўства ды айчыннай гісторыі — дык на гэты раз на сьвет зьявілася ўжо нешта большае за мары паэтаў і публіцыстаў XIX ст. — канкрэтны плян стварэньня элемэнтарных арганізацыйных і матэрыяльных умоваў, якія далі б магчымасьць дзейнічаць калектыўнымі намаганьнямі. Гэта былі пастуляты нацыянальнай рэвалюцыі, якая павінна была ператварыць беларускія народныя масы ў нацыю. Першай фазай гэтага працэсу павінна было стаць стварэньне сьвядомай сваіх мэтаў інтэлігенцыі як шляхам прыцягненьня дэнацыяналізаванай эліты, так і ўзгадаваньня новай, інтэлігенцыі, якая паходзіла б з народу.

Характэрная перапрацоўка зьмешчанага ў "Свабодзе" вершу Сыракомлі "Добрыя весьці" і асабліва сьціраньне яго антырасейскіх акцэнтаў дае падставы меркаваць, што дзеячы БРП не падтрымлівалі сэпаратысцкіх тэндэнцыяў, якія праклямавала ППС. Больш блізкія і зразумелыя былі для іх пастуляты расейскіх рэвалюцыйных колаў, якія стаялі ня толькі на пазыцыях зрыненьня царызму, але і грунтоўнай перабудовы ўсяго грамадзкага ладу, у прыватнасьці, вырашэньня аграрнага пытаньня. Гэта магло значыць, што магчымасьць для ажыцьцяўленьня сваіх плянаў БРП бачыла не ў адрыве ад Расеі, але шляхам рэвалюцыі і дэмакратызацыі грамадзкага жыцьця гэтае дзяржавы.

ППС адразу ж адрэагавала на пазыцыю БРП. У камэнтары да апублікаванай на старонках "Przedświtu" адозвы "Да інтэлігенцыі" адзін зь вядомых дзеячоў ППС Вітальд Ёдка–Наркевіч (псэўд. А. Вронскі) пасьля запэўніваньняў аб гатоўнасьці польскіх сацыялістаў "усімі сродкамі, якія толькі ёсьць у нас ", падтрымліваць працэс ператварэньня беларускага народу ў нацыю, пісаў наступнае:

> Аднак калі мы поўнасьцю прызнаём права кожнай нацыі на разьвіцьцё і самастойнасьць, то з гэтага зусім не вынікае, што мы павінны некрытычна разглядаць шанцы падобнага разьвіцьця. Дык што датычыць беларусаў, то трэба прызнаць, што пэрспэктывы ператварэньня гэтага народу ў нацыю прынамсі ў сёньняшніх палітычных варунках вельмі малыя. <...> Таму той, хто спрыяе разьвіцьцю беларускай нацыянальнасьці, найперш павінен стварыць у Літве сілу, якая б магла дапамагчы разьвеяць цяжкую хмару дэспатызму, што вісіць над гэтым няшчасным краем. <...> Дзеля гэтага сапраўдны беларускі патрыёт ня можа абмежавацца зьбіраньнем народных казак, сьпеваў і замоваў, дасьледаваньнем граматыкі, але павінен займацца разьвіцьцём сьвядомасьці гэтага народу, тлумачыць яму, што яго эксплёатуюць і ўціскаюць, і ствараць зь яго адну вялікую палітычную сілу, якая б здолела заваяваць сабе лепшую будучыню. Мы зусім не пярэчым, што нацыі, якая мае ўласную інтэлігенцыю, жывецца лепей, чым народу, які стаіць на ўзроўні беларускага народу, але пачатак грамадзкай дзейнасьці з стварэньня гэтай інтэлігенцыі сярод народу, які ня мае самых асноўных людзкіх правоў і стаіць на гэтак нізкім узроўні культуры, як беларускі народ, было б будаваньнем замку на пяску. А калі цяпер зьвярнуць увагу на тое, што пашырэньне грамадзкай сьвядомасьці сярод карэннага беларускага насельніцтва павінна адбывацца на беларускай мове, што вымагае як дасканалых ведаў самой мовы, так і стварэньня ўсёй літаратуры — брашур, кніжак, часопісаў, — то мы прыйдзем да перакананьня, што такая дзейнасьць, якую рэкамэндуем мы (г.зн. выданьне агітацыйнай літаратуры на беларускай мове — *Ю.Т.*), будзе больш плённай з *нацыянальнага* пункту гледжаньня, чымся праца, прапанаваная аўтарамі адозвы. Сацыялістычную брашуру, умела напісаную, чытаюць тысячы, часам дзясяткі і сотні тысяч людзей, адначасова ўпэўніваючыся ў веданьні роднай мовы, тады як збор этнаграфічных дасьледаваньняў нават у культурных краінах разыходзіцца часам толькі ў дзясятках асобнікаў. Таму рэвалюцыянэр, які працуе для народу, тым самым спрычыняецца да стварэньня матэрыялу для будучай нацыі[27].

Такім чынам, элемэнтарная праграма Беларускае Рэвалюцыйнае Партыі выразна занепакоіла Ёдку–Наркевіча. Безумоўна, ён усьведамляў, што беларускі рух знаходзіцца

[27] Przedświt. 1903. № 2. S. 54—57.

яшчэ толькі ў зародковай фазе, аднак, маючы перад вачыма прыклады Украіны і Літвы, мог лёгка прадбачыць, у якім кірунку гэты рух пойдзе далей. Таму і намагаўся скіраваць яго ў самую бясьпечную, з гледзішча ППС, каляіну: залучыць пад штандары сваёй партыі несьвядомыя сваіх нацыянальных мэтаў беларускія масы для барацьбы з царызмам. Ёдка-Наркевіч ня зьвязваў гэтае асновасяжнае мэты з адначасовым вырашэньнем беларускага нацыянальнага пытаньня, калі лічыў, што пэпээсаўскіх агітацыйных брашураў, а не граматыкі, будзе досыць для паляпшэньня веданьня народам сваёй роднай мовы. За гэтым крылася боязь перад культурнай і палітычнай эмансыпацыяй Беларусі.

Крытыка намераў БРП, зьмешчаная ў "Przedświcie", не прайшла па-за ўвагай кіраўніцтва ППС — яно добра было інфармавана аб тэндэнцыях, якія зараджаліся ў беларускай арганізацыі, і зрабіла з гэтага практычныя высновы. У чэрвені 1903 г. канфэрэнцыя ЦРК у Вільні аднагалосна пастанавіла спыніць выданьне агітацыйнай пэпээсаўскай літаратуры на беларускай мове. Як сьведчыць пратакол канфэрэнцыі, гэтае знамянальнае рашэньне было прынята на прапанову Пілсудзкага на падставе адной толькі фразы наконт таго, "ці здолеюць беларусы, нават умеючы чытаць па-польску або па-расейску, даць сабе рады зь беларускімі выданьнямі, друкаванымі польскімі ці расейскімі літарамі"[28]. Быў гэта, аднак, несумнеўны камуфляж сапраўднае прычыны. "Гутарка..." ды іншыя агітацыйныя беларускія брашуры, выдадзеныя ў Лёндане, карысталіся вялікай папулярнасьцю ў Беларусі і, напэўна, выконвалі падвойную, не заплянаваную іх выдаўцамі, ролю: пашыралі рэвалюцыйную думку, а разам з тым папулярызавалі беларускую мову і ўздымалі яе аўтарытэт, тым самым прычыняючыся да разьвіцьця нацыянальнай сьвядомасьці беларусаў. З гэтага гледзішча Ёдка-Наркевіч правільна ацаніў значэньне такіх брашур.

Пасьля прыняцьця віленскае рэзалюцыі ЦРК ППС заблякавала выдавецкую дапамогу беларускім дзеячом. У 1903 г. яны падрыхтавалі да друку некалькі чарговых агітацыйных брашур на беларускай мове (між іншым, пра паншчыну, а таксама — пераклад расейскае брашуры "Бойкот и стачка") і пачалі зьбіраць сродкі для таго, каб пакрыць кошт друку. Гэтыя брашуры адаслалі ў ЦРК, але надрукаваныя яны не былі[29]. Гэтак жа, як не пабачыла сьвету ўлётка зь вершам Сыракомлі "Добрыя весьці".

БРП стала пачаткам арганізаванага беларускага нацыянальнага руху. З тае пары ён зьведаў падзеньні і ўзьлёты, але — у адрозьненьне ад першых няўдалых спробаў XIX ст. — на гэты раз стаў на шлях трывалага разьвіцьця. БРП не была партыяй у поўным сэнсе гэтага слова. Яна была, бадай, толькі выпрацаванай Вацлавам Іваноўскім канцэпцыяй самастойнага руху, якая выстаўляла канкрэтныя задачы беларускага нацыянальнага адраджэньня. Гэтая канцэпцыя азначала разрыў з традыцыяй польскага культурнага патэрналізму ў Беларусі і таму ў польскіх палітычных колах выклікала недавер; гэты недавер заставаўся нязьменнай дамінантай у іх стаўленьні да беларускага пытаньня.

Крытыка Ёдкі-Наркевіча пакінула свой сьлед і ў беларускім асяродзьдзі ў Пецярбургу. Пры гэтым важную ролю адыгралі беларускія агітацыйныя брашуры, якія неўзабаве пачалі зь Лёндану трапляць у Беларусь і ў Пецярбург патаемнымі сьцежкамі, дзе іх успрымалі за праяву інтэрнацыяналісцкіх намераў ППС і рэальны доказ яе павагі да пагарджанай і забароненай у царскай Расеі беларускай мовы. Рамуальд Зямкевіч, пазьнейшы дасьледчык беларускай літаратуры, сьцьвярджаў, што гэтыя брашуры ў вялікай ступені паспрыялі зараджэньню яго асабістай зацікаўленасьці беларушчынай[30]. Напэўна, іх меў на ўвазе і Янка Купала, калі гаварыў пра рэвалюцыйныя адозвы, выдаваныя на беларускай мове, якія істотна паўплывалі на яго рашэньне пісаць па-беларуску[31]. Такім чынам, гэтыя

[28] Sprawozdanie z konferencji CKR PPS z czerwca 1903 r. // Niepodległość. T. XX. 1939. S. 111.

[29] Protokół z konferencji CKR z 16—17.12.1903 r. w Mińsku. Цэнтральны Архіў ЦК ПАРП, 305/III/3, pt. 3.

[30] Шлюбскі А. Новыя матэрыялы да гісторыі "Нашае Долі" // Полымя. 1927. № 3. С. 204.

[31] Пуцявінамі Янкі Купалы. Дакументы і матэрыялы. Мінск, 1981. С. 7. — *Ю.Т.*

Я. Купала паведамляў у лісьце да Л. Клейнбарта, што яго пісаньне па-польску "пошло насмарку" пасьля

брашуры пацьвярджалі слушнасьць аргумэнтаў Ёдкі–Наркевіча і, дзякуючы няведаньню намераў ЦРК, сфармуляваных у пастанове Віленскай канфэрэнцыі, спрыялі росту аўтарытэту ППС сярод беларускіх дзеячоў у Пецярбургу. Разам з тым у некаторых з гэтых дзеячоў абудзіўся крытыцызм у дачыненьні да культурна–асьветніцкай арыентацыі БРП. На пачатку 1903 г. гэта прывяло да падзелу ў беларускім асяродзьдзі і заняпаду БРП.

Так склалася, што калі не лічыць колькіх драбніцаў, пададзеных Іваноўскім, то адзіным аўтарам, які на падставе сваіх успамінаў шмат разоў асьвятляў зараджэньне беларускага руху ў Пецярбургу, быў Антон Луцкевіч[32]. Беларускія дакумэнты не захаваліся[33], і для дасьледчыкаў, не знаёмых з архіўнымі матэрыяламі ППС, яго ўспаміны сталі адзінай крыніцай зьвестак пра гэты рух. Аднак Антон Луцкевіч быў непасьлядоўным. У першых сваіх публікацыях 1909—1910 г. ён пісаў пра раскол руху на два ідэалягічныя напрамкі: культурна–асьветніцкі і рэвалюцыйны, і нават акрэсьліваў дзеячоў першага кірунку зьдзеклівым эпітэтам "культуртрэгеры"[34].

Затое пазьней ён зьмяніў сваю думку і падкрэсьліваў адзінадушнасьць "сьпетай тройкі", г.зн. — Вацлава Іваноўскага ды Івана і Антона Луцкевічаў, чые пазыцыі радыкалізаваліся, што прывяло да стварэньня Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады (БРГ)[35].

Паўстае вельмі прынцыповае пытаньне: ці быў раскол, ці не, а калі не было, дык чаму перастала існаваць БРП і дзеля чаго была створаная новая палітычная арганізацыя — БРГ? На шчасьце, мы можам не абмяжоўвацца інфармацыяй А. Луцкевіча і ня біцца над тым, каторая зь яго вэрсіяў адпавядае сапраўднасьці. У сьнежні 1903 г. адбылася чарговая канфэрэнцыя ЦРК ППС, на якой было пацьверджанае існаваньне дзьвюх беларускіх груп у Пецярбургу, адну зь іх акрэсьлілі як "радыкальна–сацыялістычную", другую — як "радыкальна–нацыянальную"[36]. Гэта былі дзьве арганізацыі, якія паўсталі

знаёмства зь беларускай рэвалюцыйнай літаратурай, а таксама з кнігамі Ф. Багушэвіча і В. Дуніна–Марцінкевіча "в 1904 или в начале 1905 г." (Купала Я. Поўны збор твораў. Т. 9. Кн. 1. С. 271), а трохі раней ў тым самым лісьце паэт пісаў, што "в 1904—1905 гг." праз У. Самойлу, які быў ягоным рэпэтытарам, ён пазнаёміўся з А. Бурбісам, С. Скандраковым і братамі Луцкевічамі і што яны давалі яму нелегальную літаратуру. Больш падрабязна пра гэта: Сідарэвіч А. Антон Луцкевіч і Янка Купала // Тэрмапілы. 2003. № 7; яго ж. Сто гадоў з Купалам // Наша Ніва. 2005. 20 траўня. — *А.С.*

32 Гэта не зусім так. Свае ўспаміны пакінулі А. Бурбіс (гл. заўвагу 12), Ф. Стацкевіч (гл.: Аганёк. Успаміны і думкі // Беларускі Звон. 1921. 17 красавіка; яго ж. Зь мінуўшчыны беларускага руху: Успаміны // Беларускі Летапіс. 1937. № 6—9; Стацкевіч Ф. З маіх успамінаў // Літаратура і мастацтва. 1990. 7 жніўня. Акрамя таго, у БДАМЛМ (ф. 55/4, воп. 1, адз. захав. 1) захоўваюцца "Ўспаміны" Ф. Стацкевіча) і Яўген Хлябцэвіч (Хлябцэвіч Я. Цётка // Полымя. 1924. № 3). Каштоўнымі крыніцамі ёсьць таксама ўспаміны Дзядзькі Пранука (Ф. Умястоўскага) "Аб «Нашай Долі»" (Гл.: Беларусь. 1919. 17 сьнежня; Беларускія Ведамасьці. 1921. 26(13) верасьня), Зьм. Жылуновіча "Дваццаць гадоў назад" (Полымя. 1999. № 5) ды іншыя публікацыі. Акрамя таго, трэба мець на ўвазе і ў значнай меры страчаную працу А. Луцкевіча "Да гісторыі Беларускае Рэвалюцыйнае (пасьля Сацыялістычнае) Грамады" — *А.С.*

33 Гэта не зусім так. Частка гэтых дакумэнтаў апублікаваная ў: Arche. 2006. № 4. — *А.С.*

34 Новина А. (Луцкевіч А.) Белоруссы // Формы национального движения в современных государствах. СПб, 1910. С. 391; Odrodzenie narodowe Białorusinów // Litwa. 15.03.1909, № 4. — *Ю.Т.*

У тэксьце артыкула "Белорусы", які выйшаў асобнай адбіткай (СПб, 1909) і перадрукаваны ў кнізе А. Луцкевіча "Да гісторыі беларускага руху", слова "культуртрэгер" няма. Акрамя таго, дасюль ня высьветлена, ці ёсьць публікацыя ў "Litwie" перакладам артыкулу А. Луцкевіча "Национальное возрождение белорусов", рукапіс якога захоўваецца ЦБ Літ. АН (ф. 21, спр. 336, арк. 1—19) і падпісаны псэўданімам Антон Новина. Рукою аўтара наверсе першае старонкі рукапісу пазначана, што артыкул друкаваўся ў: Slovansky Přehled. Čislo 4, Leden, Ročnik XI, 1909. Пра гэтую публікацыю Я. Журба паведамляў у артыкуле "Лісты з Украйны" (Наша Ніва. 1909. 7(20) траўня). Артыкул А. Луцкевіча пад загалоўкам "Национальное возрождение белорусов" друкаваўся таксама ў "Московском еженедельнике" (1909. № 9). — *А.С.*

35 Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху: Выбраныя творы. Мінск: Беларускі кнігазбор, 2003. С. 143.

36 Protokół z konferencji CKR PPS z 16—17.12.1903.

на месцы ранейшай БРП і на самай справе называліся Круг Беларускай Народнай Прасьветы і Беларуская Рэвалюцыйная Грамада. Але варта прывесьці цікавае выказваньне аднаго з удзельнікаў Менскай канфэрэнцыі ЦРК, які сьцьвярджаў, што гэтыя беларускія сацыялісты "мяшаюцца" зь беларускімі нацыяналістамі і "аб'ядноўваюцца зь імі"[37].

Такім чынам, раскол і сапраўды адбыўся, інакш што б магло значыць гэтае "зьмяшаньне" і "аб'яднаньне" адасобленых плыняў? Безумоўна, на гэтую сытуацыю ў беларускім асяродзьдзі ўзьдзейнічала ня толькі пэпэсаўская крытыка БРП, але таксама — і ў найвялікшай ступені — асабістыя стасункі паміж чальцамі кіраўнічай тройкі, зусім не такой ужо і "сьпетай", як падаваў Антон Луцкевіч у 1928 г.[38]

Сапраўды, пасьля прыезду братоў Луцкевічаў у Пецярбург усё напачатку складалася ўдала. Старэйшы брат Іван адразу ж далучыўся да дзейнасьці БРП і разам з Вацлавам Іваноўскім удзельнічаў у падрыхтоўцы да друку "Свабоды". Але, маючы за сабой пэўны досьвед працы ў вучнёўскім гуртку ў менскай гімназіі, ён пачаў прэтэндаваць на ролю лідэра беларускага руху ў Пецярбургу[39].

Гэта, відаць, прывяло да канфлікту з Іваноўскім, у выніку шляхі двух дзеячоў у першых месяцах 1903 г. на пэўны час разышліся. Гэта, аднак, не аказала істотнага ўплыву на ідэйныя пазыцыі сяброў абедзьвюх арганізацыяў, для якіх і сацыялістычны, і нацыянальны кірункі былі блізкія. Зрэшты, гэтых сяброў было няшмат.

Вясною 1903 г. Іван Луцкевіч распачаў стварэньне БРГ і, між іншым, зьбіраў грошы на куплю беларускіх пэпэсаўскіх брашур, але ў траўні яго арыштавалі[40] за кантакты з расейскімі эсэрамі, што на некалькі месяцаў зацягнула арганізацыйную падрыхтоўку. БРГ была ўтвораная, напэўна, увосені 1903 г., бо ўжо ў лістападзе і сьнежні пэпэсаўскія крыніцы зноў паведамлялі пра існаваньне беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі. Пад канец сьнежня 1903 г. у Вільні адбылася першая канфэрэнцыя БРГ, на якой была зацьверджана яе праграма. Акрамя праграмы, БРГ ня выдала ніводнай самастойнай адозвы або публікацыі, якая пацьвердзіла б факт яе існаваньня. Не сустракаецца ў літаратуры і якіх-кольвек іншых згадак пра дзейнасьць БРГ. Нягледзячы на запрашэньне, яна не даслала сваіх дэлегатаў на канфэрэнцыю апазыцыйных і рэвалюцыйных партыяў Расейскай імпэрыі, што адбылася ў Парыжы ў верасьні 1904 г.[41]

Выглядае на тое, што БРГ нагадвала хутчэй інтэлігенцкі клюб, чым палітычную партыю. Па сутнасьці, яна мала чым адрозьнівалася ад сваёй папярэдніцы — БРП, якая, тым ня менш, пакінула заўважныя сьляды сваёй дзейнасьці. Шмат гадоў пазьней Вацлаў Іваноўскі палічыў за лепшае забыцца пра гэтыя падзеі, затое Антон Луцкевіч часта зьвяртаўся да іх, спадзеючыся пераканаць новыя пакаленьні ў тым, што творцам беларускага руху, а дзеля гэтага і нацыянальнага адраджэньня, быў яго брат, Іван Луцкевіч. Гэтаму пярэчылі факты, асабліва — БРП, таму Антон проста ігнараваў яе, а выдадзеныя гэтай партыяй публікацыі прыпісваў альбо Кругу Беларускай Народнай Прасьветы (адозва "Да інтэлігенцыі"), альбо Беларускай Рэвалюцыйнай Грамадзе ("Свабода")[42].

Гэта было парушэньне правілаў добрага тону, якое магло зьнеахвоціць людзей слабых або эгацэнтрычных працягваць дзейнасьць. Мы, аднак, паўстрымаемся ад высноваў наконт рысаў характару студэнта Іваноўскага: акрылены вялікай ідэяй, ён толькі

[37] Тамсама.

[38] Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. С. 143.

[39] Г.Б. (Луцкевіч А.) Дваццатыя ўгодкі БРГ // Змаганьне. 1923. 23 сьнежня. № 21; Памяці Яна Луцкевіча. Вільня, 1920. С. 7—8.

[40] А. Луцкевіч паведамляе, што яго брата арыштавалі перад 1 траўня 1903 г. Гл.: Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. С. 89, 145. — *А.С.*

[41] Туронак Ю. Узаемадачыненьні ППС зь беларускім рэвалюцыйным рухам у 1902—1906 гадох. С. 55—65 у гэтым выданьні. — *Рэд.*

[42] Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. С. 143, 147; Народная Справа. 1926. 21 верасьня.

толькі ступіў на цяжкі і небясьпечны шлях да яе рэалізацыі. Зрэшты, ён мусіў здаваць сабе справу, што на гэтым шляху яго чакаюць нашмат горшыя сытуацыі. Дый не было чаго асабліва ламаць дзіды. У Расейскай імпэрыі пакуль што — у 1903 г. — панаваў спакой, і ня толькі беларускія, але й іншыя рэвалюцыйныя арганізацыі не мелі надта многа працы. Затое справа нацыянальнай сьвядомасьці не цярпела адкладу: яе трэба было абуджаць і дзеля гэтага — яднаць і разьвіваць творчыя сілы, выдавецкую і асьветніцкую дзейнасьць, адным словам — рухаць у жыцьцё пастуляты, вызначаныя ў адозьве "Да інтэлігенцыі". Таму пасьля сутыкненьня з Луцкевічам Іваноўскі распачаў рэалізацыю сваёй праграмы і стварыў у Пецярбургу — на ўзор польскага — Круг Беларускай Народнай Прасьветы.

Круг быў прыватным пагадненьнем людзей добрай волі, натхнёных супольным імкненьнем выдаваць і папулярызоўваць беларускую кнігу. Тым ня менш, нягледзячы на такую памяркоўную праграму, ён ня мог існаваць легальна, бо такая дзейнасьць супярэчыла русіфікатарскай палітыцы царызму. Для таго, каб прадухіліць рост непажаданых сэпаратысцкіх тэндэнцыяў, расейскія ўлады тармазілі разьвіцьцё беларускай мовы і літаратуры, перадусім шляхам ужываньня ўсёабсяжных абмежаваньняў і забаронаў на друк. У 1899 г., забараняючы кнігу Ф. Багушэвіча "Беларускія апавяданьні", цэнзура выказала асьцярогу, "ці ня крыецца ў такіх творах тэндэнцыя стварэньня, апрача "маларускай", яшчэ і беларускай літаратуры, а тым самым падрыву і аслабленьня адзінства літаратуры і нацыянальнасьці, а ў выніку — таксама палітычнай магутнасьці расейскага народу"[43]. Крыху раней кіеўскі цэнзар Рафальскі, пішучы пра беларускі нацыянальны друк, заклікаў: "Трэба яго задушыць у пачатках, у зародку, бо пазьней у нас будзе такі ж самы клопат, як з украінафільствам"[44]. У выніку гэтых тэндэнцыяў на тэрыторыі Расейскай імпэрыі з часоў паўстаньня 1863 г. да 1900 г., г.зн. амаль за сорак гадоў, выйшла ўсяго толькі 9 кніжачак маралізатарскага ці фальклярыстычнага зьместу, іх агульны аб'ём не перавышаў 160 старонак невялікага фармату[45]. Да таго ж, частка зь іх мела расейскамоўныя тытульныя старонкі, і таму гэтыя кнігі афіцыйна лічыліся расейскімі выданьнямі (да прыкладу, ананімная паэма "Тарас на Парнасе", якую прымалі за народны твор). Практычна можна гаварыць пра забарону на друк беларускіх кніжак, хоць фармальна яна датычыла толькі выданьняў з лацінскім альфабэтам.

У такіх умовах Іваноўскі пачаў прабіваць дарогу беларускай кнізе. У 1903 г. ён распачаў у Пецярбургу легальную і нелегальную выдавецкую дзейнасьць, апрача таго, арганізаваў друк беларускіх кніжак за мяжой ды іх нелегальны перавоз у Расейскую імпэрыю. Пры гэтым яму даводзілася здабываць грашовыя сродкі, знаходзіць надзейных памочнікаў — аўтараў, перакладнікаў і распаўсюднікаў нелегальных і замежных выданьняў. Яму даводзілася, нарэшце, выпрацоўваць мэтады паводзінаў, якія гарантавалі б максымальную бясьпеку пры нелегальнай працы — натуральна, ён не хацеў падзяліць лёсу брата Юр'я ці падстаўляць сваіх супрацоўнікаў пад такія непрыемнасьці. Каб даваць рады такім шматбаковым задачам, трэба было мець ня толькі рашучасьць, але і магутны інтэлект і вынаходлівасьць, якія кампэнсавалі б недастатковую яшчэ жыцьцёвую дасьведчанасьць 23–гадовага Вацлава. Прыгледзьмася, як вырашаў ён гэтыя праблемы.

Пад эгідай Кругу Беларускай Народнай Прасьветы ў Пецярбургу былі выдадзеныя дзьве нелегальныя публікацыі — "Калядная пісанка" і "Велікодная пісанка". Першая зь іх выйшла перад сьвятам Божага Нараджэньня 1903 г., другая — перад Вялікаднем 1904 г. Распаўсюджваць іх меліся студэнты, што разьяжджаліся ў той час на вакацыі ў свае родныя старонкі. Абедзьве "Пісанкі" былі надрукаваныя на ўжо згаданым гектографе на некалькі дзясяткаў асобнікаў кожная. У "Пісанках" былі зьмешчаныя вершы Алёйзіі

[43] Александровіч С. Гісторыя і сучаснасць. Мінск, 1968. С. 166.
[44] Тамсама.
[45] Гл. арт. "З гісторыі беларускага выдавецкага руху ў 1902—1905 гадох". С.41—54 у гэтым выданьні. — *Рэд.*

Пашкевіч, Казімера Кастравіцкага, Францішка Ўмястоўскага ды іншых паэтаў, а таксама апавяданьне Стэфана Жаромскага "Да свайго Бога" аб перасьледзе ўніятаў на Падляшшы ў перакладзе Антося Дурнога. Гэта быў, мабыць, псэўданім Іваноўскага, на што паказваюць моўныя асаблівасьці і канструкцыя яго іншых псэўданімаў (Антось Асіна і Антось Хатні). Цікавай пазыцыяй, зьмешчанай у "Велікоднай пісанцы", была бібліяграфія дагэтулешняй беларускай мастацкай і навуковай літаратуры. Такім чынам, апрача аднаго раней апублікаванага верша Яна Неслухоўскага (псэўданім Янка Лучына) — "Роднай староны", — у абедзьвюх "Пісанках" быў зьмешчаны хоць і сьціплы, але арыгінальны творчы даробак, і гэта значыла, што на шляху да ажыцьцяўленьня праграмы, вызначанай у адозьве "Да інтэлігенцыі", быў зроблены першы крок[46].

Большае значэньне для папулярызацыі беларускай літаратуры мела выданьне ў Пецярбургу дзьвюх невялічкіх кніжачак: зборніка вершаў Яна Неслухоўскага (Янкі Лучыны), памерлага ў 1897 г., — "Вязанка" (1903) і народных "Казак" (1904 г.). Абедзьве кніжкі былі выдадзеныя легальна, са згоды цэнзуры. Выйшлі яны ў мясцовай польскай друкарні К. Пянткоўскага накладам 5000 асобнікаў кожная. Зразумела, што іх нельга было выдаць пад эгідай нелегальнага Кругу, таму яны выйшлі ў сьвет стараньнямі прыватных асобаў, якія, аднак, пажадалі захаваць ананімнасьць. З гэтай прычыны на тытульным аркушы "Вязанкі" ўвогуле не было выдаўца, а ў зборніку "Казкі" значыліся толькі яго ініцыялы — "А.К.".

Выхад "Вязанкі", у тэксьце якой гучалі выразныя патрыятычныя акцэнты, у тагачасных палітычных умовах быў зьявішчам надзвычайным. Няма дзіва, што акалічнасьці гэтага выданьня здаўна інтрыгавалі дасьледчыкаў беларускай літаратуры. Бадай, першым выказаўся на гэты конт у 1914 г. Лявон Гмырак, які ў самых агульных рысах сьцьвярджаў, што кніжка была выдадзеная беларускім студэнцкім гуртком і прэзэнтаваная цэнзуры як зборнік паэзіі на баўгарскай мове[47]. Пазьней, у міжваенны пэрыяд, сьцьвярджалася, што яе выдаўцом быў Іван Луцкевіч, нягледзячы на той факт, што ў часе яе выданьня ён сядзеў у турме[48].

Пад сумнеў ставілася і "баўгарская" вэрсія. Сам В. Іваноўскі доўга маўчаў у гэтай справе і толькі падчас апошняй вайны (01.10.1943) паведаміў свайго супрацоўніка, Аўгена Калубовіча, пра акалічнасьці выхаду ў сьвет "Вязанкі". Ён пацьвердзіў свой удзел у выданьні[49], а таксама і той факт, што цэнзуры яе прэзэнтавалі як кнігу на баўгарскай мове, да чаго схіліў супрацоўнік унівэрсытэцкай бібліятэкі Браніслаў Эпімах-Шыпіла[50]. Гэта была не адзіная дэзынфармацыя Іваноўскага, каб зьбіць з панталыку царскія ўлады.

У адрозьненьне ад "Вязанкі", зборнік "Казкі" не прыцягваў дагэтуль увагі дасьледчыкаў, бо, па сутнасьці, быў звычайным перадрукам некаторых тэкстаў, сабраных расейскім этнографам П.В. Шэйнам. Тым ня меней паходжаньне гэтага зборніка мае для нас істотнае значэньне. Параўнальны аналіз тэкстаў паказаў, што чалавек, які рыхтаваў "Казкі" да друку, выкарыстаў у сваім выданьні дагэтуль не ўжываныя ў беларускім правапісе памякчальныя знакі ў выглядзе апострафаў. Адзіным прыхільнікам такога правапісу ў той час быў Казімер Кастравіцкі, значыцца, толькі яму мог даверыць В. Іваноўскі падрыхтоўку да друку гэтай кніжкі. Іваноўскі пазнаёміўся з Казімерам у яго бра-

[46] Александровіч С. Тамсама. С. 73.
[47] Гмырак Л. Беларускае нацыональнае адраджэньне // Велікодная Пісанка. Вільня, 1914. С. 17.
[48] Зямкевіч Р. Ян Неслухоўскі (Янка Лучына) і яго неведамыя вершы // Нёман. 1932. № 2. С. 59.
[49] Як піша ў газэце "Ніва" за 16 сьнежня 2001 г. гісторык А. Глагоўская, "кніжачку беларускіх вершаў" Я. Лучыны дапамог паэту — "хаця пасьля сьмерці" — выпусьціць ягоны пляменьнік (сын ягонай сястры) А. Неканда-Трэпка, які вучыўся ў Пецярбургу адначасова з В. Іваноўскім і ўваходзіў у Круг Беларускае Народнае Прасьветы і Культуры. Гэта значыць, што А. Неканда-Трэпка мог перадаць выдаўцам рукапісы твораў, уключаных у "Вязанку". — *А.С.*
[50] Ліст А. Калубовіча да аўтара ад 14.03.1979.

та, лекара Амброжага Кастравіцкага, які ў 1901 г. жыў у Лідзе. Вацлаў пасябраваў з абодвума і неўзабаве намовіў іх заняцца беларускай выдавецкай дзейнасьцю, першага — як аўтара, другога — як фінансавага спонсара. Не падлягае сумневу, што выданьне зборніка "Казкі", падрыхтаванае да друку Казімерам, фінансаваў яго брат, Амброжы Кастравіцкі, чые ініцыялы "А.К." апынуліся на тытульным аркушы кніжкі.

Супрацоўніцтва В. Іваноўскага з Кастравіцкімі мела цікавыя і важныя наступствы. Жонка Амброжага, Марыя з Багушэўскіх, памешчыца зь Меншчыны, мела малодшага брата, Сьцяпана Багушэўскага, які з 1901 г. вучыўся ў Ягелонскім унівэрсытэце і гасьцяваў у сястры і швагра ў Лідзе. Тут летам 1903 г. зь ім пазнаёміўся Іваноўскі і схіліў да удзелу ў новай выдавецкай ініцыятыве: друку беларускіх кніжак у Кракаве, які ў той час належаў Аўстра–Вугоршчыне. Відаць, Багушэўскі прыняў гэты праект ахвотна, бо пазьней ажыцьцявіў яго вельмі ўдала. Перш за ўсё, ён прыцягнуў да супрацоўніцтва свайго сябра з часоў вучэньня ў Менскай гімназіі, Мар'яна Фальскага, студэнта Варшаўскай палітэхнікі.

Так тры студэнты прыйшлі да таемнага пагадненьня і распачалі сваю дзейнасьць. Пад псэўданімам Янка Сваяк М. Фальскі да канца 1903 г. пасьпеў перакласьці на беларускую мову тры апавяданьні: "Янку–Музыканта" Генрыка Сянкевіча, "Да свайго Бога" Стэфана Жаромскага і "Ведзьму" невядомага аўтара. Апрача таго, ён апрацаваў тэкст адозвы "Царская гаспадарка", дзеля якой выкарыстаў пэпээсаўскія беларускія брашуры, галоўным чынам — "Гутарку аб тым, куды мужыцкіе грошы ідуць". Нарэшце, быў падрыхтаваны томік беларускіх вершаў Багушэвіча, Пашкевічанкі і Кастравіцкага, называўся ён "Песьні". Гэтак жа, як і "Царская гаспадарка", зборнік быў прызначаны для рэвалюцыйнай агітацыі і таму выйшаў ананімна. Пра грошы падбаў Іваноўскі. Не дачакаўшы падтрымкі ад ППС, ён зьвярнуўся да сястры сваёй нявесты, славутай піяністкі Катажыны Ячыноўскай, якая ахвяравала неабходную суму на пакрыцьцё друкарскіх выдаткаў.

На пачатку 1904 г. Багушэўскі перавёз рукапіс і грошы ў Кракаў. Ён адразу пачаў ствараць пры Ягелонскім унівэрсытэце суполку пад назвай Акадэмічны Краязнаўчы Беларускі Гурток, які быў неабходны як юрыдычная інстытуцыя для самастойнай выдавецкай дзейнасьці. Багушэўскі распрацаваў праект статуту Гуртка, які 9 сакавіка быў ухвалены ўнівэрсытэцкім сэнатам[51], і пераслаў яго на зацьвярджэньне імпэратарскаму намесьніку графу Анджэю Патоцкаму ў Львоў. Аднак Патоцкі адхіліў праект статуту, паводле якога сябрамі Гуртка маглі стаць ня толькі студэнты Ягелонскага ўнівэрсытэту, але "кожны, каго агульны сход прызнае да гэтага годным". Пра гэтую пастанову 2 красавіка 1904 г. была паведамлена дырэкцыя кракаўскай паліцыі і сэнат Ягелонскага ўнівэрсытэту з пажаданьнем азнаёміць зь ёй студэнта Багушэўскага не пазьней як 12 красавіка[52]. Пасьля гэтага тэрміну Гуртку заставалася толькі выканаць фармальнасьці, неабходныя для самаліквідацыі.

Багушэўскі выкарыстаў паўнамоцтвы, адведзеныя правам для таварыстваў падчас рэгістрацыі, замовіў пячатку Гуртка і зрабіў фармальную замову на друкаваньне прыведзеных рукапісаў у кракаўскай друкарні Ўладзіслава Тэадарчука. Тэадарчук, дасьведчаны сацыялістычны дзяяч, добра разьбіраўся ў гэткіх справах і пастараўся выканаць замову імгненна, так што ў першай палове красавіка 1904 г. Багушэўскі ўжо мог забраць з друкарні "Песьні", "Янку–Музыканта", "Ведзьму" і адозву "Царская гаспадарка". Засталося ненадрукаваным толькі апавяданьне Стэфана Жаромскага "Да свайго Бога" — хутчэй за ўсё, з прычынаў чыста тэхнічных: яно было занадта кароткае, каб скласьці асобную брашуру, бо налічвала толькі дзьве старонкі. Праз колькі месяцаў яго выдалі ў Вільні літаграфічным спосабам. Такім чынам, і году не прайшло, як Багушэўскі пасьпеў

[51] Пратаколы паседжаньняў акадэмічнага сэнату, Архіў Ягелонскага ўнівэрсытэту ў Кракаве. S. II, 84.
[52] Акты Беларускага Акадэмічнага Гуртка пры Ягелонскім унівэрсытэце ў Кракаве. Тамсама. S. II, 797.

выканаць праект, выкарыстаўшы часавы ліміт, адведзены на легалізацыю Беларускага Гуртка пры Ягелонскім унівэрсытэце[53]. Аднак і пасьля адмовы легалізаваць Гурток В. Іваноўскі ня страціў надзеі на выданьне беларускіх кніжак у Кракаве нейкім іншым спосабам. Пра гэта сьведчаць два апытальнікі, выдадзеныя Багушэўскім, з падрабязнымі пытаньнямі пра грамадзка–эканамічнае і культурна–асьветніцкае становішча жыхароў беларускіх вёсак і мястэчак. Яны датычылі, між іншым, рэлігійных і моўных стасункаў, стану школаў, бібліятэк, характарыстыкі іх кнігазбораў, навыкаў чытаньня і пісьма, попыту на кнігі і г.д. Асабліва красамоўна выглядае наступнае пытаньне апытальніка: "Які прыём можа сустрэць у гэтай ваколіцы народная літаратура на беларускай мове, друкаваная лацінскімі літарамі і не абмежаваная расейскай цэнзурай?"[54]

Такім чынам, апытальнікі сьведчылі ня толькі пра далейшыя выдавецкія пляны, але, перш за ўсё, пра намер гэтых маладых людзей арганізаваць плянамернае пашырэньне беларускіх кніжак на падставе выяўленьня патэнцыйнага попыту насельніцтва. Варта заўважыць, што абодва апытальнікі выходзілі не пад шапкай кракаўскага гуртка — на знойдзеных асобніках стаяў адно толькі яго штэмпэль. Значыцца, рабіліся яны для шырокага ўжытку — для Пецярбурскага Кругу Беларускай Народнай Прасьветы, а таксама — для будучых арганізацыяў і паасобных дзеячоў.

Тым часам надрукаваныя Тэадарчуком кніжкі апынуліся на складзе выдавецкай суполкі "Książka", якая разьмяшчалася ў Кракаве на вуліцы Гродзкай, 50. Гэтая суполка была галоўным складам беларускіх выданьняў, адкуль іх паступова перапраўлялі ў Расейскую імпэрыю[55]. Таму трэба спыніцца на яе работніках. Вось жа, кіраўнікамі "Książki" былі польскія сацыялісты — адвакат Зыгмунт Марак, Леан Васілеўскі і Баляслаў Енджэёўскі, а сябрамі — між іншым, друкарня Тэадарчука і Вітальд Ёдка–Наркевіч, які разам з рэдакцыяй "Przedświtu" пераехаў зь Лёндану ў Кракаў[56]. Гэта не выпадковае ўдакладненьне: менавіта Енджэёўскі атрымаў рукапісы "Гутаркі" ды іншых беларускіх агітацыйных брашур, дасланых з Гарадзеншчыны, у 1902 г., перапраівіў іх Ёдку–Наркевічу ў Лёндан, а гэты апошні наладзіў там іх друк[57]. Цяпер гэтыя людзі сутыкнуліся з ініцыятывай Іваноўскага і дапамаглі яе ажыцьцявіць, нягледзячы на нядаўнія крытычныя заўвагі ў "Przedświcie". Такім чынам, стаўленьне польскіх сацыялістаў у Кракаве да беларускай кніжкі было значна лепшае, чым стаўленьне ЦРК ППС і асабліва Пілсудзкага.

Тэксты, выдадзеныя ў Кракаве, друкаваліся часткова лацінкай ("Янка–Музыкант", "Ведзьма"), а часткова — кірыліцай ("Песьні" і адозва). Для большай бясьпекі падчас перавозу, распаўсюду і выкарыстаньня на тэрыторыі Расейскай імпэрыі на іх не пазначылі месца выданьня, а пад адозвай "Царская гаспадарка" не было подпісу ніякай арганізацыі. У той жа час на вокладцы "Песень" надрукавалі цалкам фікцыйныя подпісы, "Дозволено цензурою СПб (Санкт–Пецярбургу. — *Ю.Т.*) 17 декабря 1903 г." і "Синодальная типографія". Невядома, ці зьбіла гэта з панталыку расейскую паліцыю, затое вядома, што цэлых восемдзесят год беларускія дасьледчыкі не маглі разабрацца з акалічнасьцямі выданьня гэтай адозвы і "Песень". Гэтак, Я. Карскі лічыў, што адозву выдала Беларуская Сацыялістычная Грамада, а А. Луцкевіч — што Сацыялістычная Партыя Белай Русі[58]. Памыляліся і наконт паходжаньня зборніка "Песьні": яго лічылі

[53] Туронак. Ю. З гісторыі беларускага выдавецкага руху у 1902—1905 гадох. С. 41—54 гэтага выд. — *Рэд.*
[54] Абодва апытальнікі знаходзяцца ў папцы з адозвамі з падаўстрыйскай Польшчы (1892—1918) у ЦА ЦК ПАРП, 305/VI/4, pt. 12.
[55] Ліст Вацлава Іваноўскага да Аляксандра Ельскага ад 31.05.1905 г. AGAD, zesp. Prozorów i Jelskich, 1402.
[56] Дакумэнты выдавецкай суполкі "Książka", Дзяржаўны Ваяводзкі Архіў у Кракаве, IT 1603.
[57] Лісты Вітальда Ёдкі–Наркевіча да Баляслава Енджэёўскага ад 21.09.1902 і 20.10.1902 г., ЦА ЦК ПАРП, 305/VII/49, pt. 1.
[58] Карский Е.Ф. Белоруссы. Т. III. Ч. 3. Петроград, 1922. С. 155; Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. С. 151.

або справай БСГ (Я. Карскі), або БРП, або вынікам супрацы БРГ і ППС (М. Багдановіч)[59]. Яшчэ ня так даўно лічылася, што гэтая кніжка выйшла ў Лёндане, гэтак жа, як і ранейшыя агітацыйныя брашуры[60]. Даволі агульнае ўяўленьне меў пра гэтыя выданьні і Леан Васілеўскі[61]. Тым часам пасьля зрыненьня царызму справа перастала быць таямніцай. Ужо пад канец 1918 г. Фрыц Куршман паведамляў, што кракаўскія публікацыі былі зроблены з даручэньня Пецярбурскага Кругу Беларускай Народнай Прасьветы[62]. Аднак ніводзін з пазьнейшых дасьледчыкаў не зьвярнуў на гэта ўвагі.

У суме з ініцыятывы Вацлава Іваноўскага ў 1903—1904 гг. у Пецярбургу і Кракаве выйшла друкам восем невялікіх кніжак. Гэтага, натуральна, было мала, але не нашмат менш, чым было выдадзена ў Расеі за ўвесь час пасьля паўстаньня 1863 г. У такім аспэкце гэта выглядала як сур'ёзнае дасягненьне. Разам з тым такі досьвед дазволіў хутка усьвядоміць вялікія цяжкасьці ў разьвіцьці выдавецкай дзейнасьці, зьвязаныя з адсутнасьцю адзіных лексычных і правапісных нормаў. Па сутнасьці, кожны аўтар або перакладчык кіраваўся ў гэтай галіне ўласнымі меркаваньнямі. Прывесьці іх у адзіную сыстэму стала надзвычай важнай і пільнай задачай. Невыпадкова сярод задачаў адозвы "Да інтэлігенцыі" на першым месцы стаяла напісаньне мовазнаўчых працаў і выданьне граматыкі беларускай мовы, для стварэньня якой меркавалася прыцягнуць спэцыялістаў. Невядома, ці зьвяртаўся да каго Іваноўскі ў гэтай справе, аднак застаецца фактам, што за яе ня ўзяўся ніводзін спэцыяліст, у тым ліку — і Яўхім Карскі, якога ўважаюць за стваральніка беларускага мовазнаўства.

З гэтай прычыны, а таксама дзеля ўзрастаючых асьветных патрэбаў В. Іваноўскі вырашыў сам заняцца распрацоўкай беларускага лемантара, які ў пэўнай ступені мог бы згладзіць адсутнасьць граматыкі і стаць практычным моўным даведнікам таксама для аўтараў і выдаўцоў. Няма сумневу, гэтую задуму ён меў ужо даўно, самае позьняе — з 1902 г., але ажыцьцяўляць яе пачаў толькі ў другой палове 1904 г.

Летам таго году ён скончыў Тэхналягічны інстытут у Пецярбургу[63], пасьля чаго выехаў на колькімесяцовую практыку ў Баравічкі пад Плоцкам. Выбар быў невыпадковым: у Плоцку жыла сям'я Люцыяна Альтбэрга, зь якім Іваноўскага зьвязвала сяброўства ў пару студэнцтва, а таксама — пэўны сямейны скандал. Справа ў тым, што брат Вацлава, Тадэвуш, ажаніўся з Марыяй Вольскай — дзяўчынай жыдоўскага паходжаньня, якая неўзабаве яго кінула і выйшла замуж за Люцыяна, які таксама паходзіў з даўно спольшчанай жыдоўскай сям'і. Так узьнік квазісямейны хаўрус. Вацлаў стаў частым госьцем у Альтбэргаў, балазе нагоды для гэтага здараліся часта, бо адначасна тады ён выкладаў хімію ў Плоцкай гімназіі.

Дзякуючы гэтым кантактам ад сястры Люцыяна, Марыі Альтбэрг (у замужжы — Арнольдзіхі), удалося атрымаць цікавую інфармацыю пра жыцьцё В. Іваноўскага ў Баравічках і Плоцку:

> Іваноўскі ўмеў выкладаць хімію ясна і займальна. Мая сястра Ганна вучылася тады ў гімназіі і памятае, як захапляліся яго лекцыямі. Яны паўплывалі на выбар яе будучай унівэрсытэцкай спэцыяльнасьці (цыталёгія). Тады ішло змаганьне за ўвядзеньне польскай мовы ў школах. Іваноўскі намовіў дачку дырэктара гімназіі, расейку, прачытаць заяву бацькоў аб выкладаньні навукі на польскай мове. Дапамагаў ён і маёй маці, Паўліне, у арганізацыі пазашкольных курсаў, здабыцьці падручнікаў ды іншых навучальных клопатах. Акурат тады прыяжджала яго нявеста,

[59] Карский Е.Ф. Тамсама; Бурбіс А. Тамсама. С. 179; Багдановіч М. Збор твораў. Т. ІІ. Мінск, 1968. С. 230.
[60] Александровіч С. Пуцявіны роднага слова. Мінск, 1971. С. 118—119.
[61] Wasilewski L. Litwa i Białoruś. Kraków, 1912. S. 278.
[62] Kurschmann F. Die Weißruthenen. Ein erwachendes slavisches Bauernvolk // Deutsche Rundschau. Bd. I, 1918. S. 286.
[63] Łoza S. (red.) Czy wiesz kto to jest? Warszawa, 1938. S. 273.

Сабіна Ячыноўская, якая разам зь іншымі езьдзіла ў Баравічкі, вазіла нелегальную сацыялістычную літаратуру. За гэта яе арыштавалі, вызвалілі пад заклад, які выдаў мой бацька, Мар'ян. Люцыян часта бываў у Іваноўскага ў Баравічках і бачыў, як ён карпеў над складаньнем беларускага лемантара. Брат гаварыў пра гэта часта і з пэўнай іроніяй, маўляў, гэта дзяцінства, фантазіі: "Такі паважаны чалавек займаўся беларускім лемантаром! Ды гэта ж дыялект, а ня мова..." Ах, калі б брат быў разумнейшым, ён бы ведаў, што нават адзін чалавек у гэтай галіне мог зрабіць пераварот. Бо з гэтага лемантара вырасла цяпер уся беларуская літаратура. Акурат тады прыяжджаў у Плоцк Мар'ян Фальскі, сустракаўся з Іваноўскім, і разам яны раіліся наконт лемантара[64].

І сапраўды, дзіўная сытуацыя: двое маладых інжынэраў безь філялягічнай ці пэдагагічнай адукацыі абмяркоўваюць праблему напісаньня лемантара! Але ж, як вядома, "не сьвятыя гаршкі лепяць", паколькі Фальскі стаў пазьней аўтарам аднаго з найлепшых польскіх лемантароў. І ўсё–такі Іваноўскі быў у больш складаным становішчы: ён ня мог абаперціся ні на якія ўзоры ці досьвед. Распачатыя ў канцы XIX ст. дасьледаваньні расейскіх лінгвістаў беларускай мовы былі важныя з навуковага гледзішча, але ня мелі ўжытковага значэньня. Выдадзены ў Варшаве "Лемантар для добрых дзетак–каталікоў" (1862) таксама не зьмяніў сытуацыі, бо, па сутнасьці, гэта была катэхізмоўка, якая, апрача назвы, мела мала супольнага з падручнікам, прызначаным вучыцца мове. Справа, за якую ўзяўся Іваноўскі, ня мела прэцэдэнту.

Важным пытаньнем, якое неабходна было вырашыць, быў выбар альфабэту. У гэтай галіне таксама не існавала вартых пераймання ўзораў. У XIX ст. беларускія выданьні друкаваліся лацінкай або кірыліцай, што, з аднаго боку, тлумачылася розным веравызнаньнем беларусаў, а з другога — залежала ад культурнай і палітычнай накіраванасьці паасобных аўтараў. Існаваньне двайстага альфабэту для адной мовы было зьявішчам ненармальным, але на пачатку XX ст. гэтая праблема адступала перад іншай: неабходна было нэўтралізаваць нэгатыўныя вынікі рэлігійнага падзелу шляхам абуджэньня агульнанацыянальнай сьвядомасьці. У прадмове да лемантара Іваноўскі прывёў свае аргумэнты стасоўна гэтай складанай справы:

Ведаем мы ўсе, што меж намі палешукамі, беларусамі, ці як мы сябе яшчэ называем — тутэйшымі, ёсьць каталікі і праваслаўные, каталікі больш да лацінскіх літэр — што іх несправядліва "польскімі" называюць, прывыклі, праваслаўныя — да славянскіх — ці як кажуць да "рускіх" прывыклі. Гэтыя рускія гэтаж нашыя спрадвечныя беларускія, а лацінскімі цяпер увесь сьвет пішэ.
Ці раз у нас сварка бывае; зыдуцца каталік з праваслаўным і сварацца "ах ты кажэ паляк", — "а ты маскаль". І абодва няведама што кажуць: ані той паляк, ані гэты маскаль, абоя хоць ружнай веры, а народу аднаго, бо абодва вырасьлі на зямельцы тутэйшай нашай палескай — беларускай і першае слово ў мові нашай бацькаўскай ад бацькоў пачулі, а сварацца толькі сабе на крыўду і на сорам, людзям на сьмех. Вось і знарок выдаем лемантар дваякімі знакамі, выбірай, што спанараўна, каб усякі пазнаў, што ці таке, ці сяке знакі, склады і словы тыеж, мова таяж і людзі, што мовай адной гавораць — браты родные[65].

Такім чынам, распрацоўка двайстага альфабэту для лемантара адпавядала канкрэтным сацыяльна–культурным умовам разьвіцьця Беларусі і, у адрозьненьне ад практыкі XIX ст., не надавала перавагі і не перабольшвала значэньне аднаго з двух традыцыйных альфабэтаў.

Працуючы над лацінскім варыянтам лемантара, Іваноўскі ў вялікай ступені абапі-

[64] Паведамленьне Марыі Арнольдзіхі ад 17.05.1979.
[65] Беларускі лемэнтар або першая навука чытаньня. СПб, 1906. С. 4.

раўся на польскі лемантар Казімежа Промыка, адтуль ён пераняў мэтодыку навучаньня, канцэпцыю ўкладаньня матэрыялу і нават частку ілюстрацыяў. Затое арыгінальны быў дыдактычны матэрыял, узяты пераважна з жыцьця беларускай вёскі, каб вучням было лягчэй засвойваць сэнс прачытанага. Пры гэтым Іваноўскаму давялося распрацаваць беларускую мовазнаўчую тэрміналёгію ў неабходным для лемантара аб'ёме. Гэта былі базавыя тэрміны, якія зь цягам часу ўдасканаліліся, але большасьць засталася трывалым здабыткам беларускага мовазнаўства і была прынятая або ў тым самым гучаньні, або зь невялікімі фанэтычнымі і марфалягічнымі зьменамі. Замест ранейшых cz, sz, ż у лемантары ўводзіліся новыя знакі č, š, ž, напэўна, дзеля таго, каб відавочна адрозьніць беларускую лацінку ад польскага альфабэту. Гэтую працу Іваноўскі завяршыў увесну 1905 г. і пасьля вяртаньня ў Пецярбург перадаў яе Казімеру Кастравіцкаму, каб той апрацаваў кірылічны варыянт[66].

У пачатку 1905 г. у асабістым жыцьці Вацлава Іваноўскага адбыліся важныя зьмены. Пасьля заканчэньня практыкі ў Баравічках у студзені ён атрымаў працу ў лябараторыі харчовых прадуктаў Пецярбурскага тэхналягічнага інстытуту і пачаў досьледы над вырошчваньнем цукровых буракоў у Віленскай губэрні. Гэта была тэма яго будучай доктарскай працы. Тады ж узяў шлюб з Сабінай Ячыноўскай. Яго справілі 10.01.1905. у рымска-каталіцкім касьцёле ў Шаўлях, дзе нарадзілася нявеста. Яна была на два гады старэйшая за мужа, а гэта ня дужа адпавядала тагачасным звычаям. Таму Вацлаў "састарыў" сябе да 27 гадоў, а Сабіна "памаладзела" да 25, што і было зафіксавана ў шлюбным пасьведчаньні[67].

Сабіна была перадапошняй сярод дзевяцёх дзяцей банкаўскага службоўца Яна Ячыноўскага і Стэфаніі з роду Стравінскіх. Бацькі паходзілі зь Беларусі, але аселі ў Шаўлях, у Жамойці. Бацькі рана памерлі, і Сабіна выхоўвалася пад апекай старэйшага брата Цэзар'я — шавельскага ксяндза, пазьней вучылася ў гімназіі і на курсах Лесгафта ў Пецярбургу, жыла ў пансіёне сьв. Кацярыны, дзе выхавацелькай была яе сястра Станіслава, у замужжы Міхаловічыха. Паводле ўспамінаў дачкі Вацлава і Сабіны, Ганны Іваноўскай-Карнэцкай, "матка была ў захапленьні ад беларускай дзейнасьці бацькі, высока цаніла яго ідэйныя пазыцыі і працавала зь ім разам. Дзецям сьпявала беларускія песьні, вучыла беларускіх малітваў і вершаў"[68].

У 1981 г., прыгадваючы гісторыю сям'і, Ганна цытавала адзін з гэтых вершаў:

Хацела б быць зярном пшаніцы,
Упасьць на ніўкі вёскі,
Зазалаціцца, безь мятліцы,
На хлеб смачнейшы трошкі.
Хацела б быць я рэчкай быстрай,
Абегчы родны край!..

Ганна ня ведала аўтра гэтага вершу, але знайсьці яго было няцяжка. Гэта быў верш "Мае думкі" Алёйзіі Пашкевічанкі-Цёткі, якая разам з Сабінай жыла ў Пецярбургу. Верш гэты быў упершыню апублікаваны ў Львове ў 1906 г., так што Сабіна магла ведаць яго са зборніка паэзіі сваёй сяброўкі, але яшчэ больш падобна на тое, што яна чула яго жыўцом з вуснаў паэткі, а можа, і сама ўдзельнічала ў напісаньні, бо ў сямейнай памяці ён застаўся надоўга.

[66] Туронак Ю. Генэза і аўтарства першага беларускага лемантара. С. 31—40 гэтага выданьня. — *Рэд.*

[67] Сямейны архіў Ганны Іваноўскай-Карнэцкай, дачкі Вацлава і Сабіны.

[68] Паведамленьне Ганны Іваноўскай-Карнэцкай ад 22.10.1978 г. Ад шлюбу Вацлава і Сабіны нарадзілася трое дзяцей: Стэфан (1907—1944), Вацлаў (1910—1944) і Ганна (нар. у 1915).

Зьмянілася і стаўленьне Вацлава Іваноўскага да палітычнай дзейнасьці: у грамадзтве насьпела незадавальненьне з прычыны непапулярнай расейска–японскай вайны, якое ў студзені 1905 г. прывяло да першай расейскай рэвалюцыі. Як пісаў у 1910 г. А. Луцкевіч, беларускі рух, які разьвіваўся да гэтай рэвалюцыі ў двух кірунках, "у вырашальны момант палітычнага ўздыму" зьліўся ў адно рэчышча"[69]. І хаця ў гэтым кароткім выказваньні не падавалася глыбейшых дэталяў, асабліва — прозьвішчаў, яно, без сумневу, азначала пачатак новага супрацоўніцтва паміж Луцкевічамі і В. Іваноўскім. Аднак гэта не было ўключэньнем Іваноўскага ў працу Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады, бо ў момант "зьліцьця" дзьвюх плыняў такая арганізацыя ўжо перастала існаваць, а на яе месцы паўстала новае палітычнае згуртаваньне пад назвай Беларуская Сацыялістычная Грамада[70].

У сувязі з гэтым належыць даць пэўныя тлумачэньні. Ува ўсёй беларускай гістарыяграфіі пануе думка, быццам БРГ папросту прыняла новую назву — БСГ. Затое даты гэтага пераўтварэньня называюць розныя. А. Луцкевіч спачатку сьцьвярджаў, што гэта адбылося на першым зьезьдзе БРГ у канцы 1903 г., пазьней — нібыта на другім, у Менску, пад канец 1905 г.[71] Большасьць сучасных гісторыкаў лічыць сапраўднай датай ператварэньня БРГ у БСГ канец 1903 г. Аднак заўважым, што на супольных антываенных адозвах, выдадзеных ППС, адна зь якіх выйшла ў траўні, а другая — у чэрвені або ліпені 1904 г., яшчэ значацца подпісы дзеячоў БРГ, а не БСГ[72]. Запрашэньне на верасьнёўскую канфэрэнцыю ў Парыжы таксама было адрасаванае БРГ[73]. Назва БСГ упершыню зьявілася на дэкларацыях Парыскай канфэрэнцыі, прычым БСГ далучылася да іх толькі пасьля, *post factum*[74]. Гэта адбылося, напэўна, у кастрычніку 1904 г., пра што сьведчыць ліст Ёдкі–Наркевіча ад 10.11.1904 г., дзе гаварылася аб тым, што беларуская партыя зьмяніла сваю назву на БСГ[75].

Ня станем закранаць пытаньня, наколькі зьмена назвы была зьвязаная з праграмай, вядома адно: В. Іваноўскі толькі пасьля гэтай падзеі далучыўся да БСГ. Для партыі гэта мела вялікае значэньне. Бо, выкарыстоўваючы свой выдавецкі досьвед, ён у вялікай ступені спрычыніўся да самастойнай прапагандысцкай дзейнасьці, якую БСГ распачала ў студзені 1905 г. У выніку, за адзін толькі 1905 г. партыя выдала больш за 20 адозваў на беларускай мове, а ў пачатку 1906 г. запусьціла ў Менску ўласную друкарню, а ў Пецярбургу — сваё выдавецтва "Грамада"[76]. Агульны наклад выдавецка–прапагандысцкай прадукцыі БСГ даходзіў да сотняў тысячаў асобнікаў брашур і адозваў, якія распаўсюджваліся на Беларусі[77]. Гэта, між іншым, уплывала на актывізацыю страйкавага руху, асабліва сярод сельскагаспадарчых рабочых.

Рэвалюцыя 1905 г., якая перадвызначыла вялікія зьмены ў расейскай дзяржаве, пабудзіла кіраўніцтва ППС зьвярнуцца да свайго даўняга намеру стварыць на тэрыторыі

[69] Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. С. 38.

[70] Як далей паказвае аўтар, БСГ не была новым палітычным згуртаваньнем. Пра тое, што БРГ памяняла сваю назву да пачатку 1905 г., сьведчаць партыйныя ўлёткі 1905 г.: усе яны падпісаныя Беларускай Сацыялістычнай Грамадою. — *А.С.*

[71] Луцкевіч А. Тамсама. С. 37, 153.

[72] Гл. адозвы "Товарышы!" і "Браця Мужыкі" ў ЦА ЦК ПАРП, 305/III/36 pt. 8.

[73] Przedświt. 1904. № 10—12. S. 1.

[74] Тамсама. С. 408, зноска.

[75] Ліст В. Ёдкі–Наркевіча ад 10.11.1904. ЦА ЦК ПАРП, 305/VII/49, pt. 2 (арк. № 688).

[76] Больш падрабязна пра брашуры гл.: Туронак Ю. З гісторыі беларускага выдавецкага руху... С. 41—54 гэтага выданьня. — *Рэд.*

Гл. таксама: Сідарэвіч А. Да гісторыі Беларускае Сацыялістычнае Грамады: агляд крыніцаў // Arche. 2006. № 5. — *А.С.*

[77] Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. С. 48.

Беларусі і Літвы аб'яднаную палітычную сілу. Дзеля гэтага польскія сацыялісты пад канец 1904 г. распачалі перамовы з БСГ. Паводле Мэнахіма Вайнэра, дзеяча ППС у Літве, у перамовах удзельнічалі два прадстаўнікі БСГ — В. Іваноўскі і А. Уласаў, якія дзеля гэтага прыяжджалі ў Вільню[78]. Такім чынам, Іваноўскі меў багата магчымасьцяў, каб ацаніць пазыцыю ППС да беларускага пытаньня і яе разыходжаньні з пазыцыяй БСГ, сузаснавальнікам і прадстаўніком якой быў ён сам. Зь яго боку, гэта была першая спроба фармуляваньня базавых палітычных прынцыпаў маладога беларускага руху ня толькі ў партыйнай плашчыні, але ў больш шырокім кантэксьце польска–беларускіх узаемадачыненьняў.

Першым крокам на шляху да вызначэньня плятформы паразуменьня было прыняцьце Беларускай Сацыялістычнай Грамадой рэзалюцыяў Парыскай канфэрэнцыі, дзе прадугледжвалася стварэньне кааліцыяў паміж рэвалюцыйнымі партыямі, якія дзейнічалі на тэрыторыі Расейскай імпэрыі. Наступны крок быў зроблены напярэдадні Жэнэўскай канфэрэнцыі, што адбылася ў сакавіку 1905 г.: была ўзгоднена пазыцыя ў справе вылучэньня гістарычнай Літвы (г.зн. — Літвы і Беларусі) у аўтаномны абшар расейскай дзяржавы з уласным рэгіянальным соймам у Вільні. Неўзабаве абедзьве партыі перайшлі да супрацоўніцтва ў арганізацыі страйкаў, між іншым, страйку работнікаў больніцы ў Новай Вялейцы (жнівень 1905 г.) або ўсеагульнага палітычнага страйку ў Вільні (сьнежань 1905 г.). ППС падтрымлівала таксама і прапагандысцкую дзейнасьць БСГ — даючы магчымасьць выпускаць некаторыя зь яе адозваў у сваіх друкарнях[79].

Пэўная частка кіраўніцтва ППС у гэты час з павагай ставілася да беларускіх нацыянальных інтарэсаў. Але вырашальную ролю ў гэтай справе адыгралі тыя дзеячы (Пілсудзкі, Пэрль), для якіх супрацоўніцтва з БСГ было толькі тактычным ходам. І хаця афіцыйныя дакумэнты ППС па–ранейшаму абвяшчалі лёзунг раўнапраўя ўсіх нацыянальнасьцяў Беларусі і Літвы, на самай справе, як сьцьвярджае Анна Жарноўская, Пілсудзкі не прызнаваў роўнасьці палякаў і гэтых іншых нацыянальнасьцяў у справе самавызначэньня[80]. Гэтыя тэндэнцыі ўзмацніліся падчас першай расейскай рэвалюцыі, калі ў надзеі на аднаўленьне незалежнасьці Польшчы падыход да нацыянальнага пытаньня (як беларускага, гэтак і літоўскага), стаў больш канкрэтны, што выразілася ў жаданьні далучыць да складу будучай польскай дзяржавы Ковенскую, Віленскую, Гарадзенскую і Менскую губэрні[81]. Другім пунктам нязгоды, які перашкаджаў задуманаму ППС яднаньню сацыялістычных арганізацыяў, былі разыходжаньні ў аграрным пытаньні. Тут імкненьні БСГ і Літоўскай сацыял–дэмакратычнай партыі былі непрымальнымі для ППС, бо пагражалі інтарэсам польскіх земляўласьнікаў у Беларусі і Літве.

Пры такой сытуацыі зьвяз БСГ і ППС быў магчымы толькі на грунце барацьбы з царызмам. Але ў іншых галінах іх пляны на пэрспэктыву разыходзіліся, тут супрацоўнічаць было немагчыма, што і перадвызначыла лёс аб'яднаньня. ППС улічвала такую альтэрнатыву і не адмаўлялася ад задумы падпарадкаваць сабе БСГ іншым спосабам, ня самым добрасумленным, аднак нярэдка ўжываным у палітыцы. Дзеля гэтага ўвосень 1904 г. распачала сваю дзейнасьць створаная ППС арганізацыя пад назвай Сацыялістычная Партыя Белай Русі (СПБР), якая для вонкавых суб'ектаў мелася выступаць нібыта паралельная БСГ беларуская партыя. У яе ўвайшлі маладыя пэпэсаўцы, у тым ліку Мар'ян Фальскі, Францішак Завадзкі, браты Станіслаў і Казімер Трускоўскія, Браніслаў Шушкевіч, Адам Жаба. Паходзілі яны зь Беларусі, галоўным чынам — зь Меншчыны і Гарадзеншчыны, ведалі беларускую мову і мелі за сабою пэўны досьвед нелегальнай працы.

Апрача Варшавы, Горадні і Менску, дзе пэпэсаўцы гуртаваліся пад шыльдай СПБР,

---

[78] Wajner M. Do historii PPS na Litwie // Niepodległość. T. XV. 1937. S. 340.
[79] Туронак Ю. Узаемадачыненьні ППС... С. 55—65 гэтага выданьня. — *Рэд.*
[80] Żarnowska A. Geneza rozłamu w Polskiej Partii Socjalistycznej 1904—1906. Warszawa, 1965. S. 122—123.
[81] Тамсама.

гэтая "партыя" ня мела ніякіх іншых рэгіянальных арганізацыяў, а адзіным рэальным вынікам яе дзейнасьці было некалькі адозваў, выдадзеных у Варшаве па–беларуску, распаўсюдам якіх займаліся пераважна сябры БСГ[82]. Дзеля гэтага ў Горадні з удзелам Аляксандра Прыстара і Валер'я Славэка была закладзеная беларуская друкарня, але напрыканцы 1904 г. яе выкрыла і зьліквідавала паліцыя[83]. Такім чынам, галоўнай мэтай СПБР была не канкурэнтная праца на месцах, але супрацоўніцтва з БСГ, якое мусіла прывесьці да аб'яднаньня дзьвюх партыяў, каб замацаваць гэткім чынам уплыў ППС на дзейнасьць Грамады. Дзеля гэтага ў канцы 1904 г. М. Фальскі распачаў перамовы з прадстаўнікамі БСГ, у т.л. з Іваноўскім, але спадзяваных вынікаў яны не прынесьлі. На думку Фальскага, прычына няўдачы заключалася ў немагчымасьці знайсьці супольную ідэалягічную плятформу: СПБР павінна была адстойваць сацыялістычную ідэалёгію, а БСГ не наважвалася зьмяніць сваю нацыяналістычную пазыцыю[84]. А. Луцкевіч, у сваю чаргу, ня бачыў супярэчнасьцяў у галіне сацыяльнай ідэалёгіі, а закіды ў нацыяналізьме на адрас Грамады тлумачыў "страхам перад будзіўшымся тады нацыянальным пачуцьцём у беларускіх масах"[85].

Аднак і гэтым разам А. Луцкевіч перабольшваў, калі наўмысна атаесамляў нацыянальную сьвядомасьць з рэвалюцыйнымі настроямі беларускіх народных мас. На самай справе, цяжка было гаварыць пра масавае абуджэньне нацыянальнага пачуцьця ў 1905 г., калі выдавецкая дзейнасьць рабіла толькі першыя крокі і не выходзіла яшчэ ніводная беларуская газэта. Апалягеты БСГ часта ўказваюць на масавы характар гэтай партыі, але маўчаць пра тое, што яе рэальны палітычны ўплыў быў роўны нулю, паколькі ў 1906 г. яна не наважылася ўдзельнічаць у перадвыбарнай барацьбе за мандаты ў расейскай Дзяржаўнай Думе[86], пасьля чаго ўлетку 1907 г. спыніла сваю дзейнасьць[87]. Таму захады ППС вакол БСГ рабіліся хутчэй з разьлікам на пэрспэктыву, найперш дзеля таго, каб скіраваць беларускі рух у рэчышча польскіх інтарэсаў.

У гэтай сытуацыі ў колах ППС асабліва разьлічвалі на В. Іваноўскага, бо яго ўважалі за свайго чалавека, які толькі гуляецца ў беларускія справы. Яго паходжаньне, сытуацыя брата Юр'я, які ў 1905 г. вярнуўся з высылкі ў Вільню і аднавіў сваю партыйную дзейнасьць, кантакты зь дзеячамі ППС, якія, праўда, выкарыстоўваліся для беларускага кнігавыданьня, — усё схіляла да такіх высноваў. Апрача гэтага, В. Іваноўскі быў выдатным дзеячом БСГ, пра што сьведчыў, між іншым, завочны выбар яго кандыдатуры ў Цэнтральны Камітэт (які складаўся зь пяцёх чалавек), зроблены ў канцы сьнежня 1905 г. на партыйным зьезьдзе ў Менску[88]. Таму адной з мэтаў прыезду М. Фальскага ў Плоцк пад канец 1904 г. было намовіць В. Іваноўскага да паяднаньня БСГ з СПБР[89]. Але Іва-

---

[82] Беларускія адозвы СПБР выдаваліся з кастрычніка 1904 да кастрычніка 1905 г. Гл.: ЦА ЦК ПАРП, 305 II/42, Druki ulotne niepolskie. Пра іх распаўсюд пры дапамозе БСГ гл.: Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. С. 151.

[83] Szuszkiewicz B. Organizacja grodzieńska PPS w latach 1898—1910 // Niepodległość. T. XVI. 1937. S. 529.

[84] Falski M. Okruchy wspomnień (fragmenty) // Studia pedagogiczne. T. XXXI. 1974. S. 23. Гэтыя ўспаміны М. Фальскі напісаў у сярэдзіне 60–х гг., г.зн. — праз 60 год пасьля падзеяў, што ў іх апісваюцца, таму ня ўсе яго выказваньні гучаць у поўнай ступені пераканаўча.

[85] Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. С. 151.

[86] Агульнавядома, што з ініцыятвы бальшавікоў выбары ў I Дзяржаўную Думу сацыялістычныя партыі (БСГ, Бунд і эсэры) байкатавалі. Пазьней гэта было прызнана памылкаю. — *А.С.*

[87] Луцкевіч А. Тамсама.

Гэтак ня так. Пра тое, што БСГ працягвала сваю дзейнасьць і ў гады рэакцыі, А. Луцкевіч пісаў у артыкуле "Национальное возрождение белорусов" (гл. заўвагу 18). Вядома, што кожны год у Вільні пад прэтэкстам Купальля зьбіраўся беларускі актыў. Нашаніўцаў вінавацілі ў палітычнай дзейнасьці ў чарнасоценным друку (гл., напрыклад, артыкул А. Луцкевіча "Данос" у "Нашай Ніве" за 16 жніўня 1913 г.). — *А.С.*

[88] Хлябцэвіч Я. Цётка // Полымя. 1924. № 3. С. 142.

[89] Falski M. Okruchy wspomnień... S. 23.

ноўскі не гуляў у падвойную гульню і гэтак жа, як і ў 1902 г., стаяў на пазыцыі незалежнасьці беларускага руху. Слабасьць гэтага руху падчас рэвалюцыі ўзмацніла яго перакананьне ў тым, што незалежнасьць гэтая будзе толькі ўяўнай, калі ў беларускіх масах спачатку не пашырыцца нацыянальная сьвядомасьць, а для гэтага, у сваю чаргу, неабходнае было разьвіцьцё беларускай асьветы. Аднак гэта патрабавала далейшых вялікіх і працяглых намаганьняў.

За нацыянальную сьвядомасьць

12 сьнежня 1904 г. цар Мікалай II падпісаў указ, які скасоўваў дагэтулешнія абмежаваньні на выкарыстаньне мясцовых моваў у дзевяцёх заходніх губэрнях Расейскай імпэрыі — Валынскай, Віленскай, Віцебскай, Гарадзенскай, Кіеўскай, Ковенскай, Магілёўскай, Менскай і Падольскай. Гэтае рашэньне, прынятае напярэдадні першай расейскай рэвалюцыі, было для ўраду вельмі важным ходам, яно мела на мэце ўлагодзіць палітычную напружанасьць, што нарастала на фоне расейска–японскай вайны. Рэвалюцыйныя настроі сапраўды апаноўвалі тады вялікія абшары расейскай дзяржавы, але ў заходніх губэрнях яны мелі спэцыфічны характар — бо тут сацыяльныя перадумовы спляталіся з нацыянальным прыгнётам.

Палажэньні ўказу датычылі ня толькі польскай і літоўскай моваў, самастойнасьць якіх — нягледзячы на абмежаваньні — ня ставілася пад сумнеў, але таксама беларускай і ўкраінскай, афіцыйна трактаваных як дыялекты расейскай. Такім чынам, адбылася істотная перамена ў дачыненьні да беларусаў і ўкраінцаў. Што было прычынай гэтага важнага і беспрэцэдэнтнага рашэньня? Распаўсюджаная думка, нібыта рэвалюцыя 1905 г. прымусіла цара выдаць такі ўказ, не вытлумачвае да канца ўсяе справы, асабліва матываў гэтага рашэньня. Па–першае, указ выйшаў яшчэ да рэвалюцыі, а па–другое, ніводная з палітычных партыяў, якія дзейнічалі тады на тэрыторыі Беларусі, не выстаўляла такога патрабаваньня ў дачыненьні да беларускай мовы. Ніякага ўзьдзеяньня на рашэньне цара ня мог мець і грамадзкі попыт на беларускую кнігу, якая на зломе XIX і XX ст. была яшчэ зьявішчам надзвычай рэдкім.

Такім чынам, рашэньне пра скасаваньне абмежаваньняў на беларускамоўны друк, без сумневу, было вынікам палітычнай сытуацыі, якая склалася на заходніх ускраінах імпэрыі. Непрызнаньне нацыянальнай самастойнасьці беларусаў і стрымліваньне разьвіцьця іх мовы і літаратуры спрыяла пашырэньню сярод інтэлігенцыі апазыцыйных настрояў, якія прыводзілі да супрацоўніцтва з польскім незалежніцкім рухам, што палягчала традыцыйныя ўплывы польскай культуры ў Беларусі. З гледзішча расейскіх інтарэсаў, асабліва небясьпечнай была актывізацыя дзейнасьці ППС, якая імкнулася да пашырэньня сваіх уплываў сярод беларусаў, украінцаў, літоўцаў і выкарыстоўвала агітацыйную літаратуру на іх родных мовах. Таму, ідучы ў галіне моўнай палітыкі насустрач культурным спадзевам інтэлігенцыі гэтых нацыяў, урад разьлічваў выклікаць іх сымпатыю да Расеі, а тым самым — стварыць сур'ёзную процівагу польскім палітычным уплывам.

Затое цяжка адназначна вырашыць, ці адлюстроўвала гэтае рашэньне ўраду сапраўднае прызнаньне беларускага народу на свабоднае разьвіцьцё сваёй мовы і літаратуры, ці яно было ўсяго толькі пытаньнем тактыкі. Аб прапагандысцкай накіраванасьці ўказу сьведчыць досыць абмежаваная сфэра ўжываньня беларускай мовы. У прыватнасьці, яе самастойнасьць так і не была афіцыйна прызнанай[1]. Не дапускалася ўжываць яе і ў публічных

[1] Прызнаваць мову самастойнай ці не прызнаваць — гэта вырашала спачатку Расейская акадэмія. Самастойнасьць украінскае мовы была прызнаная. Беларусам яшчэ належала давесьці, што іх мова самастойная. Пра тое, што гэта атрымалася, ускосна сьведчыць прызнаньне ў 1915 г. міністрам асьветы права беларусаў "вучыцца рэлігіі па-свойму". Гл.: а–н–а [Луцкевіч А.]. Першы крок // Наша Ніва. 1915. 19 сакавіка. — *А.С.*

школах, нават у такіх сьціплых прапорцыях, як польскую і літоўскую. Але варта заўважыць, што толькі ўвосень 1904 г. пачалася распрацоўка першага лемантара на гэтай мове, а да выхаду першай граматыкі заставалася яшчэ чатырнаццаць гадоў. Такім чынам, адсутнічалі найпрасьцейшыя перадумовы для імгненнай зьмены статусу беларускай мовы. Але, калі не ўдавацца глыбей у гэтую справу, можна з упэўненасьцю сьцьвярджаць, што ўказ Мікалая II стварыў легальныя падставы для дзейнасьці, накіраванай на зьмену статусу гэтай мовы ў будучыні. Папраўдзе, урад ня быў зацікаўлены ў тым, каб гэты працэс паскараць, але, у прынцыпе, і ня стрымліваў яго, пакідаючы яго ажыцьцяўленьне грамадзкім дзеячам.

Указ і рэвалюцыя прывялі да значнага росту цікавасьці да беларускай кнігі. Пра гэта сьведчаць захаваныя ў Галоўным архіве старажытных актаў лісты да Аляксандра Ельскага — пана з Замосьця Менскай губэрні, аўтара шматлікіх артыкулаў пра Беларусь, яе мінулае, мову і літаратуру, друкаваных у пецярбурскім "Kraju" ды іншых часопісах, аўтара і выдаўца некалькіх папулярных беларускіх брашур, нарэшце, перакладніка на беларускую мову першай кнігі "Пана Тадэвуша" Адама Міцкевіча, выдадзенай у 1893 г. у Львове. Цікава ахарактарызаваныя тагачасныя настроі ў лістох настаўніцы Ядзьвігі Ціхінскай з маёнтку Прусан з–пад Крычава Магілёўскай губэрні, напісаных А. Ельскаму ўлетку 1905 г. У першым зь іх ад 03.06.1905 г. Я. Ціхінская піша:

> Шаноўны пане! Пара было б сёньня ўзяцца за складаньне беларускага лемантара, калі б вы падумалі аб тым. З той пары, калі можна стала адчыняць прыватныя школы (мы ўжо таксама пачынаем будаваць і зьбіраць на гэта грошы), трэба даць падручнікі–лемантары і беларускія кніжкі. Ведаю, што вы пішаце па–беларуску. Мой бацька складае беларуска–польска–расейскі слоўнік, і гэта даказвае, што ён беларускі патрыёт... Прашу даслаць мне каталёг альбо сьпіс беларускіх кніжак і падаць адрас, дзе можна дастаць для сялян сёньня хоць пару асобнікаў...[2]

Ельскі адаслаў ёй некалькі кніжак і ўсьлед за гэтым атрымаў яшчэ адзін ліст ад 07.08.1905 г. наступнага зьместу:

> Я надзвычай удзячная Вам за прысланыя мне кніжкі, якія чытала з маімі хлапчукамі, каб яны маглі пазьней прачытаць на вёсцы сваім старым. Я беларуска з нараджэньня, бо з паходжаньня (напэўна, зь перакананьня — *Ю.Т.*) я полька і дзеля гэтага чую сябе абавязанай падтрымліваць іх родную мову, таму што ў іх мала сумленных апекуноў, асабліва — у нашай губэрні. Узімку дзякуючы маім намаганьням тут паўстае школа... Беларусь у мінулым была нашай малодшай сястрой, можа, будзе роўная з намі ў інтэлекце і самаадчуваньні — сёньня, хоць і адарваная ад нас, яшчэ чакае нашай дапамогі[3].

Аднак надзеі на адкрыцьцё публічных беларускіх школаў ня зьдзейсьніліся, таму ў розных мясцовасьцях краю арганізоўваліся нелегальныя. Як паведамляла Зоф'я Дабрынская, такую школку адкрыла яе маці, Леантына Корсак, у маёнтку Бардзіловічы Дрысенскага павету на Віцебшчыне[4]. Падобную школку арганізаваў Канстанцін Гардзялкоўскі ў Папоўцы Сеньненскага павету, таксама на Віцебшчыне[5], у якой настаўнічаў пазьней выдатны беларускі паэт і празаік Якуб Колас. Гэта былі не адзінкавыя зьявішчы, пра што сьведчыць стварэньне ў 1907 г. Беларускага Настаўніцкага Саюзу, які, зрэшты, неўзабаве ліквідавалі ўлады[6].

[2] AGAD, zesp. Prozorów i Jelskich, 1401, k. 151—152.
[3] Тамсама. К. 147.
[4] Паведамленьне З. Дабрынскай ад 12.05.1984.
[5] Да красавіка 1919 г. Сеньненскі павет уваходзіў у склад Магілёўскай губэрні. — *А.С.*
[6] Не называючы крыніцы, аўтар спасылаецца на артыкул А. Луцкевіча "Белорусы", але пазьней Луцкевіч удакладніў, што Беларускі настаўніцкі саюз быў створаны ў 1906 г. Гл.: Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. С. 39, 127, 176—177. — *А.С.*

Скасаваньне забаронаў на друк і грамадзкая цікавасьць да беларускай кніжкі стварылі магчымасьць для таго, каб распачаць выдавецкую дзейнасьць. В. Івано́ўскі адразу ж ацаніў гэтыя магчымасьці, але, нягледзячы на пэўны досьвед, іх выкарыстаньне выклікала вялікія цяжкасьці. Бо для таго, каб распачаць сталую і шырокамаштабную выдавецкую дзейнасьць, патрэбныя былі адносна значныя сродкі ды кваліфікаваныя супрацоўнікі, якіх пакуль што не было. У гэтым сэнсе беларускія выдаўцы былі ў найцяжэйшай сытуацыі. Пра гэта сьведчаць факты: калі ў 1905 г., г.зн. неўзабаве пасьля абвяшчэньня царскага ўказу, у Вільні пачалі выходзіць у сьвет польскія і літоўскія кніжкі і часопісы, дык беларускай кнігі ня выйшла аніводнай[7].

У пошуках энтузіястаў беларускай выдавецкай справы, якія мелі б адпаведныя творчыя зацікаўленьні і фінансавыя магчымасьці, Івано́ўскі асабліва спадзяваўся на падтрымку з боку Ельскага. 24 лютага 1905 г. ён даслаў яму свой першы ліст, прычым напісаны па–беларуску:

Пане Шанаваны,

Чуў я ня раз ад усялякіх людзей і ад панаваго братанца, што вельмі Вы любіце нашу мову і пішэце самы іншы раз у нашай мове. То я хацеў пазнаёміцца з Вамі хаця праз пісулькі, бо што ж, Вы жывецё ў Міншчыні, а я ў Пецербурху.

А такіх людцоў, што нашу мову дый нашага мужыка любяць, мала на сьвеце, то трэба каб хаця кампаніі пілнавалі. А Вы, Пане, самы шмат рабілі, мо і цяпер тае працы не кінулі. Здаецца, мелі Вы выдаць "Марыю" Мальчэўскага, праўда?

Тутака таксама ёсьць людцоў колькі, то пералажылі ксёнжачак крыху, толькі з грашмі кепска... (далей нечытальны выраз. — *Ю.Т.*)

Але таксама, ушоў не апушчаючы, прыгатавалі "Сыгнал" Гаршына, "Міхалка" Пруса, "Крыста" Канапніцкае, "Гутаркі аб небе і зямлі". Лемантарчык (паводлуг Промыка) будзе гатоў да друку за месяц. І так мне здаецца, што Вы ня менш маеце чаго, от каб усё зараз і выдрукаваць — от былобы дабро. Адпішыце, Паночку, калі часу знойдзеце крыху.

Асаблівай увагі заслугоўвае другі абзац ліста, дзе В. Івано́ўскі паведамляе пра падрыхтаваныя "некалькімі людцамі" пераклады. Вядома, што брашура Гаршына ў беларускім перакладзе выйшла ў Маскве ў 1891 г., а другое нязьмененае выданьне зьявілася ў Вільні толькі ў 1914 г., таму інфармацыя аб яе перакладзе ў Пецярбургу не адпавядае сапраўднасьці. Ніколі не выдаў Івано́ўскі згаданых апавяданьняў Пруса і Канапніцкай, і гэта можна расцаніць як фікцыйную інфармацыю альбо як згадку адно пра намер такога перакладу. Відаць, гэтая містыфікацыя была разьлічаная на тое, каб выклікаць у Ельскага ўражаньне, быццам у Пецярбургу пачынае разьвівацца выдавецкая дзейнасьць, што ў ёй ужо ўдзельнічае "людцоў колькі", і ў выніку дабіцца ад яго дадатнага адказу.

На самай справе сытуацыя была горшая, чым апісаў Івано́ўскі. Пераклад прыгаданай у лісьце "Гутаркі аб небе і зямлі", як зазначана на тытульным аркушы гэтай кніжкі, выдадзенай у 1907 г., павінны былі зрабіць К. Кастравіцкі і С. Шаўлоўскі. Аднак у беларускай літаратуры асоба Шаўлоўскага засталася зусім невядомай, і праз гэта можна сьмела дапускаць, што тое быў псэўданім Івано́ўскага, які альбо пераклаў "Гутаркі..." разам з Кастравіцкім, альбо — што яшчэ больш імаверна — грунтоўна выправіў пераклад Кастравіцкага. Кніга налічвала 68 старонак, таму можна меркаваць, што пераклад быў падрыхтаваны не пасьля абвяшчэньня царскага ўказу, але крыху раней. Тое самае датычыць лемантара, апрацаванага Івано́ўскім. Нарэшце, Кастравіцкі ня жыў у Пецярбургу, гэтак жа, як і Алёйзія Пашкевічанка, якая ў сярэдзіне 1904 г. вярнулася ў Беларусь і рыхтавала першую беларускую чытанку. Такім чынам, у гэтай галіне дзейнічаў пакуль

[7] Александровіч С. Пуцявіны роднага слова. Мінск, 1971. С. 163.
[8] AGAD, zesp. Prozorów i Jelskich, 1402.

толькі сам Іваноўскі, так што яго інфармацыя пра некалькіх супольнікаў болей адпавядала намерам, чым сапраўднасьці.

З далейшага ліставаньня вынікае, што Ельскі даў альбо адмоўны, альбо невыразны адказ. Сапраўднай прычынай тут быў удзел Іваноўскага ў БСГ: у Ельскага, прыхільніка сацыяльнага кансэрватызму, гэта магло абудзіць асьцярогі, што выдавецкая дзейнасьць у Пецярбургу стане адлюстроўваць радыкальныя праграмныя пастуляты гэтай партыі. Нельга выключыць і таго, што Ельскі прытрымліваўся пазыцыі "gente Rutheni, natione Poloni" і не салідарызаваўся з мэтамі маладога беларускага руху. Пра гэта, магчыма, сьведчыць шматзначная зацемка Ельскага на капэрце атрыманага ліста: "Białorusin Iwanowski".

Аднак у тагачасных варунках практычна толькі панскае асяродзьдзе было ў стане забясьпечыць выдавецкую дзейнасьць значнымі фінансавымі сродкамі. Духавенства ж, якое было важным натхняльнікам нацыянальнага руху ў Літве, у тагачасных беларускіх варунках яшчэ не ўваходзіла ў разьлік. У такой сытуацыі Іваноўскі, нягледзячы на першую няўдачу, 31.04.1905 г. зьвярнуўся да Ельскага яшчэ раз:

Ці не маеце знаёмых якіх, што захацелібы ксёнжак выдаць па нашаму. Тож ёсьць напісаные. Кажуць, што Войніловіч — той мог бы выдаць, мо знаеце яго?[9]

Дабіцца сымпатыі Вайніловіча — гэта была сьмелая і далёкасяжная ідэя. У Беларусі ён ня толькі валодаў маёнткамі, але і ўзначальваў Сельскагаспадарчае таварыства ў Менску, таму яго прыхільнасьць магла б істотна паўплываць на пазыцыю і падтрымку з боку беларускага панства. Гэтая задума, па сутнасьці, была не такая ўжо і беспадстаўная, пра што Іваноўскі, напэўна, ведаў. Аднак Вайніловіч таксама ня выказаў сваёй падтрымкі — прычынай былі рэвалюцыйныя падзеі 1905 г. Пра тое, што гэта было зроблена з клясавых пазыцыяў, ён напісаў у сваіх "Успамінах" цалкам недвузначна:

Ад беларускіх суполак заўсёды, беручы ў іх сякі-такі матэрыяльны ўдзел, я ўрэшце адышоў, бо праца, пачатая ў іх у кірунку самапазнаньня і нацыянальнага адраджэньня ("Лучынка", "Саха", "Загляне сонца і ў наша аконца" і г.д.), у канцы набыла сацыялістычныя лёзунгі і кірунак, якому я ня мог пакланяцца насуперак маім перакананьням[10].

Увесну 1905 г. Іваноўскі абдумваў таксама іншую канцэпцыю, што прадугледжвала стварэньне выдавецкага таварыства, якое б дзеяла паводле прынцыпу каапэратыву ці акцыйнай суполкі. Ён выклаў гэтую задуму ў лісьце да Ельскага ад 15 траўня 1905 г. гэтак:

Пане Сваячэ, а каб зрабіць таварыства для друкаваньня беларускіх ксёнжак, так, як украінцы маюць, то добра былоб. Здаецца мне, што можна былоб найсьці людзёў, што плацілі бы ў год — ну рублёў дзесяць — тож знайсьці можно людзёў з 20 на пачатак — от і дзьве ксёнжкі што году аддрукавалібы[11].

Цяжка сьцьвярджаць, ці задума аб стварэньні суполкі паўстала з адной толькі немагчымасьці знайсьці багатага мэцэната. Дата працытаванага ліста (15.05.1905) сьведчыць аб тым, што напісаны ён быў даволі рана, значыць, Іваноўскі ўлічваў разнастайныя варыянты. Аднак ужо найбліжэйшая будучыня паказала, што толькі шляхам калектыўных высілкаў можна было стварыць неабходныя падставы для дзейнасьці, хаця з прычыны малалікасьці, незаможнасьці і ў вялікай ступені абыякавасьці беларускай інтэлі-

[9] Тамсама.
[10] Wojniłowicz E. Wspomnienia 1847—1928. Cz. I. Wilno, 1931. S. 210—211.
[11] AGAD, zesp. Prozorów i Jelskich, 1402.

генцыі і такі шлях з пачатку не даваў надзеі сабраць сур'ёзныя фінансавыя сродкі. Пра гэта вымоўна сьведчыў разьлік выдаваць толькі дзьве кніжкі ў год.

Аднак вынік арганізацыйных стараньняў Іваноўскага канца 1905 — пачатку 1906 г. аказаўся больш аптымістычным. У гэтую пару завяршылася падрыхтоўка колькіх запляналаных выданьняў, было ўкладзенае пагадненьне зь пецярбурскай друкарняй К. Пянткоўскага і сабраны часовы капітал суполкі, які на пачатку траўня 1905 г. складаў 220 рублёў. Адначасна была сфармаваная і ўправа суполкі, якая складася зь сямёх яе сяброў–закладчыкаў. Яе старшынём стаў Вацлаў Іваноўскі, а сакратаром — пецярбурскі чыноўнік Уладзіслаў Сталыгва. Сябрамі праўленьня былі: Браніслаў Эпімах–Шыпіла, пэдагог і супрацоўнік бібліятэкі Пецярбурскага ўнівэрсытэту, Сабіна Іваноўская, жонка Вацлава, інжынэр–тэхноляг Юры Іваноўскі, Вінцэнт Валейка, студэнт Горнага інстытуту, і Уладзіслаў Калашэўскі, настаўнік школы пры лютэранскай царкве сьв. Пятра ў Пецярбургу[12].

5 траўня 1906 г. памянёныя сябры–заснавальнікі ўклалалі дзейную да канца 1908 г. натарыяльную дамову, паводле якой несьлі калектыўную адказнасьць за дзейнасьць і абавязаньні суполкі. Але ў беспасярэднай дзейнасьці выдавецтва яны выконвалі розную ролю. На першым яе этапе (да канца 1908 г) практычна ўсю рэдакцыйную працу рабілі два чалавекі — Вацлаў Іваноўскі і Браніслаў Эпімах–Шыпіла. Яны абодва адзначаліся вялікай працавітасьцю, прычым энэргія і прадпрымальнасьць першага ўдала спалучалася з эрудыцыяй і скрупулёзнасьцю другога. Яны былі знаёмыя колькі гадоў, але Шыпіла, нягледзячы на зацікаўленьне беларускаю літаратурай, у 1902—1904 гг. ня браў удзелу ў выдавецкай дзейнасьці нелегальных беларускіх арганізацыяў у Пецярбургу[13]. Ён далучыўся да гэтай дзейнасьці толькі ў 1905 г., ужо ў легальных умовах, перадаўшы ў распараджэньне суполкі частку свае кватэры на Васільеўскім востраве (4 лінія, кв. 45). Астатнія сябры ўправы выконвалі адміністрацыйныя абавязкі (Сталыгва), альбо абмяжоўваліся фінансавым удзелам[14].

Спрэчным застаецца пытаньне, калі суполка "Загляне сонца..." пачала выдавецкую дзейнасьць. На думку Александровіча, гэта адбылося толькі пасьля яе фармальнага заснаваньня ў траўні 1906 г., і тады ж — пісаў ён — "досыць апэратыўна ... пачынаецца праца над рукапісамі беларускіх падручнікаў, якія неўзабаве былі здадзеныя ў друк і вышлі ў кастрычніку—лістападзе 1906 г."[15].

У сапраўднасьці, як я заўважыў вышэй, рукапісы гэтых падручнікаў, г.зн. лемантара, чытанкі Цёткі і "Гутарак аб небе і зямлі", былі падрыхтаваныя ўжо ў 1904—1905 гг. Іваноўскі ў чарговым лісьце да Ельскага ад 17 красавіка 1906 г. паведаміў важныя зьвесткі наконт таго, калі быў распачаты іх друк:

> Некалькі людцоў "тутэйшых", што ў Пецярбурху жывуць, залажылі выдаўніцкую суполку. Цяпер адбіваецца ўжо элемэнтар, будзе дваякімі знакамі, гэта значыць, папросту кажучы, будуць

[12] ЦДАЛіМ (Цяпер гэта Беларускі дзяржаўны архіў–музэй літаратуры і мастацтва — БДАМЛМ. — А.С.), Менск, ф. 3, спр. 37, арк. 3. Дамова чальцоў–заснавальнікаў.

[13] Паколькі ў літаратуры часам выказваюцца на гэты конт іншыя меркаваньні, варта адзначыць, што Цётка — актыўная ўдзельніца ўсіх гэтых арганізацыяў — падчас свайго жыцьця ў Пецярбургу (1902—1904) увогуле ня ведала Б. Шыпілы. Пра гэта, безумоўна, сьведчыць яе ліст да Б. Эпімаха-Шыпілы ад 28.06.1906 г., які ў поўным выглядзе апублікавала Ю. Бібіла. Гл. яе. Матар'ялы да біографіі Цёткі // Запіскі аддзелу гуманітарных навук ІБК, кн. 2. Праца клясы філёлёгіі. Т. І. Менск, 1928. С. 296. — *Ю.Т.*

Гл. таксама: Цётка. Выбраныя творы. Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. С. 215. — *А.С.*

[14] Такой, у прыватнасьці, была роля, якую адыгрываў Ю. Іваноўскі, які лічыў сябе палякам, што ніяк не перашкаджала яму падтрымліваць беларускія ініцыятывы Вацлава. Верагодна, Іваноўскія поўнасьцю альбо часткова прафінансавалі складку Валейкі — небагатага студэнта і суседа. Такім чынам, Вацлаў распараджаўся бальшынёй галасоў ува ўправе суполкі, якую часам называлі "фірмай Іваноўскіх" (Вацлаў+Сабіна+Юры+Валейка).

[15] Александровіч С. Гісторыя і сучаснасць. Мінск, 1968. С. 170—172.

два элемэнтары. Ці не прыступілібы і Вы да тае суполкі? Удзялы, з правам карыстаньня з зыску, будуць па 10 рублёў кожны.

Не гуляючы будзе адбіты ўстаў суполкі, то Вам яго прышлю поштаю[16].

Зацытаваная інфармацыя Іваноўскага сьведчыць, што дату ўкладаньня натарыяльнай дамовы сяброў–заснавальнікаў суполкі (5 траўня 1906 г.) нельга атаясамліваць з датаю яе заснаваньня. Суполка ўзьнікла раней і сама позна ў пачатку красавіка 1906 г. здала ў друк першыя кнігі.

Ранейшае, чым меркавалася, узьнікненьне суполкі "Загляне сонца...", а не яе асаблівая апэратыўнасьць (хаця і з гэтага гледзішча яна была бездакорная), тлумачыць хуткае ажыцьцяўленьне праграмы выданьня падручнікаў. Ужо ў ліпені быў надрукаваны "Biełaruski lemantar abo pierszaja nawuka czytańnia" (лацінкай) і сэрыя паштовак, а на працягу бліжэйшых тыдняў яго варыянт кірыліцай і "Першае чытаньне для дзетак беларусаў" Цёткі (таксама ў абодвух графічных варыянтах). Трэці падручнік "Гутаркі аб небі і зямлі" выйшаў на пачатку 1907 г.[17].

Выхад першага лемантара сучаснай беларускай мовы ў зацікаўленых польскіх і расейскіх колах быў успрыняты як беспрэцэдэнтны заклік беларускага народу да адраджэньня сваёй культуры, як спроба павярнуць кола гісторыі. Таму першыя водгукі ў друку адлюстроўвалі як зьдзіўленьне, так і занепакаеньне гэтых колаў ад нечаканага зьяўленьня беларускага нацыянальнага фактару на арэне, дзе дагэтуль дамінавалі і сутыкаліся польскія і расейскія культурныя і палітычныя ўплывы.

Адразу ж па выхадзе лемантара віленскі "Kurjer Litewski" зьмясьціў на першай паласе абсяжны камэнтар, падпісаны крыптонімам "J", пад якім выступіў, відаць, сам рэдактар гэтае газэты Чэслаў Янкоўскі. Зьяўленьне лемантара "Kurjer Litewski" ацаніў яўна дадатна:

Чаму ж беларусам нельга хаця б на пачатку XX стагодзьдзя засьпяваць сваю "Багародзіцу" або не дачакацца сваіх Чалякоўскіх, Колараў і Шафарыкаў, сваіх Даўконтаў і Валанчэўскіх? Лепей позна, як ніколі. Уласны, родны, нацыянальны лемантар! Гэта, калі казаць коратка, праменьчык уласнае культуры. Дык, значыць, існуе і беларуская культура? Натуральна, і пагатоў, калі пад культурай мы будзем разумець непаўторнасьць нацыянальнай сутнасьці... Навучыцца чытаць і пісаць пабеларуску — гэта ж першы, найсьвяцейшы нацыянальны абавязак кожнага беларуса[18].

Тым ня менш, журналіста, які напісаў гэтыя словы, не пакідалі асьцярогі, што абуджаў малады беларускі рух сярод палякаў ад самага пачатку свайго існаваньня: куды будзе скіравана яго пазьнейшае разьвіцьцё? Далейшыя характэрныя разважаньні аўтара над гэтым пытаньнем заслугоўваюць увагі:

Ці адчуе сам беларускі народ, якое вялікае дабрадзейства аказала яму дабрачынная выдавецкая суполка, абдарыўшы яго беларускім лемантром? <...> Бо не падлягае сумневу, што ўсьлед за дзейнасьцю выдавецкай суполкі разгорнецца палымяная дзейнасьць г.зв. "прышчапленьня нацыянальнай сьвядомасьці" <...> Суполка, пра якую шмат разоў ужо вялася гаворка, абрала сваім

[16] Ліст бяз даты. Штэмпэль Пецярбурскай пошты на капэрце сьведчыць, што адпраўлены ён быў 17.04.1906. Гл. у AGAD, zesp. Prozorów i Jelskich, 1402.

[17] Сярод гэтых падручнікаў толькі лемантар быў выдадзены ананімна, паколькі часткова быў перакладам польскага лемантара Промыка, а часткова — арыгінальнай распрацоўкай В. Іваноўскага. Другі яго варыянт (кірыліцай) падрыхтаваў К. Кастравіцкі, аднак безь яго згоды быў грунтоўна перапраўлены В. Іваноўскім. У такой сытуацыі выдавецтва не магло пазначыць імя Кастравіцкага, таму дзеля раўнавагі лацінічны варыянт застаўся таксама ананімны.

[18] Elementarz białoruski // Kurjer Litewski. 1906. 25 lipca.

дэвізам і зрабіла сваімназовам: "Загляне сонца і ў наша аконца". Як нам бачыцца, разам з гэтым сонейкам роднага пісьменства загляне ў вокны беларускіх хат тое, што так часта труціць нават найкаштоўнейшую культуру і зацьмявае часам найдабрачыньнейшае сьвятло ведаў, а менавіта — шавінізм.

Бяз гэтай прыгатовы не адбудзецца выхаду на арэну нацыянальнага самаадчуваньня беларусаў. Калі б пытаньне прыналежнасьці да той або іншай нацыі залежала толькі і выключна *ад добраахвотнага і сьвядомага выбару* (падкрэсьлена ў арыгінале — *Ю.Т.*), дык гэтае ўзыходзячае сонца не выклікала б ніякіх заўваг... Але мы ведаем, на жаль, якое насеньне засяваюць усе гэтыя прапаганды, заклікі, прысьпешваньні, буджэньні, распальваньні і ўздыманьні на барацьбу... Сардэчна зычым беларускаму лемантару, каб не прынёс разам з сабою карагоду ўсіх гэтых "радасьцяў"[19]...

Выданьне першых кніжак суполкай "Загляне сонца..." і выхад у верасьні 1906 г. у Вільні першай беларускай газэты "Наша Доля" (пазьней — "Наша Ніва") — усё гэта напаткала неадназначную рэакцыю ў расейскім друку. Орган чарнасоценцаў "Окраины России" пісаў, што яны служаць палітычнай агітацыі ў польскім духу, а лемантар — распаўсюджаньню польскага альфабэту, і тым самым бароняць польскія інтарэсы ды абуджаюць антыўрадавыя настроі[20]. Аб пагромным характары гэтай заявы сьведчыць ігнараваньне "Окраинами России" фактаў выданьня лемантара і чытанкі, а таксама віленскай газэты як лацінкай, так і кірыліцай, што паказвае, што ня справа альфабэту раздражняла рэдакцыю. Зусім іншую пазыцыю ў гэтай справе займала пецярбурская газэта "Русь", якая дала свае старонкі для прапаганды беларускай суполкі і заклікала аб падтрымцы чытачамі яе дзейнасьці[21].

Іваноўскі ня дужа пераймаўся гэтымі ацэнкамі і працягваў ажыцьцяўленьне сваёй выдавецкай праграмы. Да сакавіка 1908 г. суполка выдала наступныя чатыры кніжкі пісьменьнікаў XIX ст. — "Дудку беларускую" і "Смык беларускі" Францішка Багушэвіча, "Гапон" Вінцэнта Дуніна–Марцінкевіча і пераклад першых дзьвюх кніг "Пана Тадэвуша" Адама Міцкевіча на беларускую мову. Апрача таго, у сакавіку 1908 г. быў выдадзены першы зборнік вершаў Янкі Купалы "Жалейка".

Акалічнасьцям, у якіх пабачыла сьвет першая кніга будучага вялікага паэта, гісторыкі беларускай літаратуры прысьвяцілі ўжо нямала ўвагі, галоўным чынам, у кантэксьце ацэнак крыніцаў натхненьня і разьвіцьця яго творчасьці. Вялікія заслугі ў гэтым А. Луцкевіч прыпісваў кіраўніцтву "Нашай Нівы", указваючы, што "моцным імпульсам для яго (Я. Купалы. — *Ю.Т.*) быў выхад у Вільні ў канцы 1906 г. першых легальных беларускіх газэт — "Нашай Долі" і "Нашай Нівы". "Рэдакцыя, — пісаў А. Луцкевіч, — адразу ж ацаніла здольнасьці паэта і пачала зьмяшчаць на пачэсным месцы яго творы"[22]. У сапраўднасьці на старонках "Нашай Долі" не было зьмешчана ніводнага верша Я. Купалы, а першы яго верш ("Касцу") у "Нашай Ніве" быў апублікаваны толькі 11.05.1907 г. Тым часам рукапіс "Жалейкі" ўжо ўвосень 1906 г. знаходзіўся ў выдавецтве "Загляне сонца...", куды яго пераслаў апякун маладога паэта, менскі публіцыст Уладзімер Самойла[23]. Пецярбурская суполка высока ацаніла творчасьць Купалы: найлепш пра гэта сьведчыць той факт, што ўжо ў лістападзе 1906 г. яна паведаміла пра хуткае выданьне "Жалейкі" і прасіла адначасова прысылаць грошы[24].

Робячы стаўку на Пецярбург, а не на Вільню, Купала, безумоўна, разьлічваў, што такім чынам ён барджджэй дачакае асобнага кніжнага выданьня сваіх вершаў, што, віда-

[19] Тамсама.
[20] Окраины России. 24—31.12.1906. С. 741.
[21] Русь. 1907. 5 ноября. Приложение.
[22] Навіна А. Адбітае жыцьцё. Вільня, 1929. С. 43.
[23] Пуцявінамі Янкі Купалы. Дакументы і матэрыялы. Мінск, 1981. С. 55.
[24] Наша Ніва. 1906. 24 лістапада.

вочна, цаніў вышэй, чым іх публікацыю ў расьцярушаным газэтным выглядзе. І сапраўды, выданьне "Жалейкі" доўжылася каля 16 месяцаў, лічачы ад згаданай аб'явы, што і на сёньняшнія меркі ня надта доўга. Пры гэтым выдавецтва выконвала сваю ўласную праграму — выпуск беларускай клясыкі, да якой Купала пакуль што не належаў. Відавочна, аднак, ён не адзначаўся асаблівай сьціпласьцю і цярплівасьцю, пра што сьведчыць наступная вершаваная эпіграма, напісаная ў чаканьні "Жалейкі":

Горы абяцаці —
Ня споўніць крыхі —
Не сьвятыя лепяць
Гэтыя гаршкі.

Ёсьць у нас "суполка" —
Цешся, беларус,
Тваёй мовай кніжак
Надрукуе стус.

Ой, сьпяшыць суполка
Кніжкі выдаваць,
Хіба на тым сьвеце
Будзем іх чытаць[25].

Да вясны 1908 г. суполка "Загляне сонца..." выдала дзесяць кніг і паўтара дзясяткі паштовак. Імкнучыся пашыраць сваю прапанову, суполка ўзяла на склад колькі ранейшых беларускіх пецярбурскіх выданьняў ("Вязанка" Я. Лучыны, "Казкі", "Кароткі катэхізм" Філяхоўскага), а таксама пару пазыцыяў, выдадзеных "Нашай Нівай", і розныя беларусазнаўчыя працы на расейскай і польскай мовах, у тым ліку "Словарь белорусского наречия" І. Насовіча, "Piosnki wieśniacze znad Niemna i Dźwiny" Я. Чачота, працы М. Доўнар-Запольскага, Я. Карскага і іншыя. Адначасова суполка арганізавала дыстрыбуцыйную сетку, уклаўшы дамовы з кнігарнямі. Увесну 1908 г. беларуская кніга была даступная ня толькі ў Пецярбургу, але ў колькіх віленскіх кнігарнях, у Менску, Віцебску, Горадні, Магілёве, Гомелі, Слоніме, а таксама ў варшаўскай кнігарні Габрыэля Цэнтэршвэра на Маршалкоўскай, 143[26].

Першы этап дзейнасьці суполкі вызначыла дамова, укладзеная паміж яе заснавальнікамі, якая дзеяла да канца 1908 г. Аднак фактычна гэты этап закончыўся ўжо ўвесну, што вынікае з факту, што з таго часу аж да восені 1909 г. суполка ня выдала ніводнай кнігі. На гэта паўплывалі дзьве акалічнасьці. Адной зь іх быў выезд Іваноўскага ў Мюнхэн, дзе ў тамтэйшай палітэхніцы ён рыхтаваўся да абароны сваёй доктарскай працы. Безь яго, як высьветлілася, астатнія сябры ўправы няшмат маглі зрабіць. Другою ж прычынай была пастанова Пецярбурскай судовай палаты, прынятая ўвосень 1908 г. пасьля звароту Віленскага камітэту па справах друку (цэнзуры), аб затрыманьні пераважнай часткі непрададзенага накладу зборнікаў Багушэвіча "Дудка беларуская" і "Смык беларускі" і пачатку сьледзтва для высьвятленьня вінаватых у выданьні гэтых "нядобранадзейных" твораў. На кароткі час пагроза канфіскацыі навісла таксама над "Жалейкай" Купалы[27].

Гэтыя здарэньні гнятліва паўплывалі на Шыпілу, які, зважаючы на сваё службовае становішча, стараўся ўнікаць сутыкненьняў з уладай. Істотную ролю пры гэтым адыгрывала тая акалічнасьць, што сядзіба суполкі знаходзілася ў ягонай кватэры, і ён пачуваўся асабліва адказным за яе дзейнасьць, хоць і ня быў яе кіраўніком. Ня выключана, што

[25] Купала Я. Поўны збор твораў. Т. 1. С. 164.
[26] Наша Ніва. 1908. 11 сакавіка.
[27] Александровіч С. Тамсама. С. 177; Пуцявінамі Янкі Купалы... С. 59—69.

Шыпіла здагадваўся пра сувязі Іваноўскага зь нелегальным выдавецтвам “Грамада”, што павялічвала пачуцьцё небясьпекі. Таму пасьля сканчэньня 31 сьнежня 1908 г. дзеяньня дагэтулешняй дамовы заснавальнікаў, ён выйшаў з управы суполкі, параіўшы ёй пашукаць іншае памяшканьне. Падчас адсутнасьці Іваноўскага справамі суполкі займаўся яе бухгальтар Антон Грыневіч, які ў другой палове 1908 г. жыў у яе памяшканьні, г.зн. у Шыпілы[28]. Канец крызіснай сытуацыі паклала новая дамова сяброў–заснавальнікаў, укладзеная ў Пецярбургу 30 кастрычніка 1909 г., згодна зь якой аднаўлялася дзейнасьць выдавецкага таварыства “Загляне сонца...”. З ранейшага складу ўправы выбылі Шыпіла і Калашэўскі, засталіся Вацлаў і Юры Іваноўскія, Сталыгва і Валейка. Акрамя таго, далучыліся новыя сябры: Сабіна Іваноўская (жонка Вацлава), адзін з старэйшых беларускіх дзеячоў у Пецярбургу інжынэр–тэхноляг Антон Неканда–Трэпка разам з жонкай Юліяй, Антон Грыневіч і Генрык Ражноўскі. Паводле палажэньняў новай дамовы, кіраўніком выдавецтва надалей застаўся Вацлаў Іваноўскі, а ягоны брат Юры стаў адказным рэдактарам. Адначасна быў заяўлены новы адрас суполкі, якая цяпер разьмяшчалася ў зьнятай кватэры на Васільеўскім востраве, 6–я лінія, 1, кв. 20[29].

Шмат сьведчыць пра тое, што гэты другі склад сяброў суполкі быў падабраны з увагі на фінансавыя патрэбы. Новыя сябры зрабілі значна большыя ўнёскі. Мабыць, павялічылі свае ўнёскі і дагэтулешнія сябры. Сукупны аб’ём унёскаў сяброў–заснавальнікаў, які ў 1906—1908 гг. павялічыўся толькі з 220 да 315 рублёў, 1 красавіка 1910 г. склаў 800 руб., доля акцыянэраў склала 750 руб., а усе актывы суполкі сягнулі 4070 руб.[30]. Паляпшэньне эканамічнай сытуацыі стварала магчымасьць пашырэньня выдавецкай дзейнасьці, аднак яе выкарыстаньне залежала ад вырашэньня кадравых цяжкасьцяў. Функцыя Юр’я Іваноўскага як адказнага рэдактара ад пачатку была фікцыйная, да таго ж, у 1910 г. ён зьехаў на некалькі гадоў з Пецярбургу ў Маскву і Кітай. Увосень таго ж году, скончыўшы Горны інстытут, зь Пецярбургу зьехаў Валейка, а ўсьлед за ім Сталыгва[31]. Аднак абнадзейваў Грыневіч, які праяўляў як творчыя зацікаўленьні, гэтак і выдавецкія амбіцыі[32]. Таму Іваноўскі ў 1909 г. пасяліў яго ў новым памяшканьні выдавецтва і даверыў яму на летні час выконваць абавязкі яго кіраўніка[33]. У канцы 1909 г. В. Іваноўскі запрасіў у Пецярбург Купалу, які з восені 1908 г. жыў у Вільні і супрацоўнічаў з рэдакцыяй “Нашай Нівы”. Запрашэньне гэтае было як у інтарэсах выдавецтва “Загляне сонца...”, так і ў інтарэсах паэта, які атрымліваў магчымасьць для паглыбленьня сваёй адукацыі, творчага разьвіцьця і — самае галоўнае — беспасярэдняга ўдзелу ў выданьні сваіх чарговых твораў. 4 сьнежня 1909 г. Купала ўжо быў прапісаны ў памяшканьні суполкі на 6–й лініі, дом 1, дзе на працягу некалькіх месяцаў жыў разам з Грыневічам і толькі ў чэрвені 1910 г. стаў кутнікам Шыпілы[34]. У асобе Купалы суполка здабыла каштоўнага супрацоў-

[28] Весь Петербург на 1909 г.

[29] Наша Ніва. 1909. 22 кастрычніка.

[30] Маладая Беларусь. 1912. Сш. 1. С. 153; Александровіч С. Гісторыя і сучаснасць. С. 178.

[31] Як сьведчаць асабістыя дакумэнты В. Валейкі, якія знаходзяцца ў распараджэньні сям’і ў Варшаве, 15.11.1910 г. ён распачаў працу ў Шчарбінаўскай шахце ў Данбасе як горны інжынэр. Паводле інфармацыі Людвікі Войцік (Зоські Верас) зь Вільні, Сталыгва ўжо ў 1912 г. жыў у Варшаве і ўваходзіў у мясцовы Беларускі Гурток.

[32] Гэта былі досыць незвычайныя амбіцыі. Пра тое сьведчыць выдадзеная ў 1909 г. у Вільні кніжка А. Грыневіча “Як бараніцца ад халеры”, якая налічвала ўсяго… 2 старонкі.

[33] Александровіч С. Тамсама. С. 179; Весь Петербург на 1910 г.

[34] Пра тое, што пасьля прыезду ў Пецярбург Я. Купала пасяліўся ў памяшканьні суполкі, сьведчаць даты рэгістрацыі ў яго пашпарце, апублікаваныя ў кн. “Пуцявінамі Янкі Купалы…” (Мінск, 1981. С. 48—49). Аднак гэты факт ігнаруюць многія беларускія аўтары. Пра запрашэньне Купалы В. Іваноўскім гл.: ліст У. Самойлы да Б. Шыпілы ад 02.12.1909 г. Тамсама. С. 53; а таксама паведамленьне Ф. Умястоўскага // Беларускі Дзень. 1928. № 6 (46). С. 7.

ніка, прычым карысьць ад гэтага супрацоўніцтва была абапольная — тут, у Пецярбургу, выйшлі шэсьць першых кніг Купалы: "Жалейка", "Адвечная песьня", "Гусьляр", "Сон на кургане", "Паўлінка" і "Шляхам жыцьця". Гэтае дасягненьне далёка выходзіла за асабістыя матывацыі, бо мела неперахаджалае значэньне для беларускай літаратуры.

Значэньне Купалы як рэдакцыйнага супрацоўніка зьвязана і зь нечаканаю адмоваю Грыневіча ўдзельнічаць у суполцы і пачаткам ягонай самастойнай выдавецкай дзейнасьці ў Пецярбургу. С. Александровіч сьцьвярджаў, што "разрыў" адбыўся ўвесну 1910 г., але не правёў аналізу яго прычынаў. Між тым гэтая падзея выглядае ня толькі нелягічнай, але і інтрыгоўнай — з аднаго боку, удзел у "Загляне сонца..." ня толькі не перашкаджаў Грыневічу рэалізаваць свае выдавецкія задумы, але значна іх палягчаў, а з другога — цяжка дапусьціць, каб адасабленьне Грыневіча было наступствам асабістых канфліктаў з Іваноўскім.

Думаецца, прычына гэтага дзіўнага адыходу Грыневіча вынікала з тагачаснай пазыцыі суполкі. Нягледзячы на спазьненьні ў ажыцьцяўленьні выдавецкай праграмы, ужо ў 1909—1910 г. суполка набыла вялікую папулярнасьць і ўзбуджала спадзяваньні аўтараў на выданьні сваіх твораў. Праўда, былі спробы заснаваць іншыя выдавецкія таварыствы, аднак яны былі або безвыніковыя (таварыствы "Мінчук" у Менску і "Палачанін" у Вільні), або апыналіся ў цяжкіх матэрыяльных умовах і дзеля гэтага мелі невялікія магчымасьці ("Наша Ніва" ці віленская суполка "Наша Хата"). На гэтым фоне пецярбурская суполка выглядала салідна і спадзеўна, у сувязі з чым да яе сьцякаліся адносна шматлікія выдавецкія прапановы. На яе разьлічвалі ня толькі Купала і Грыневіч, але таксама Якуб Колас, Напалеон Чарноцкі, Вацлаў Ластоўскі ды іншыя. Рамуальду Зямкевічу паабяцалі выдаць ягоныя гісторыю беларускай літаратуры і слоўнік[35], а іншаму (невядомаму) аўтару — працы пра лубін і сэрадэлю[36]. У такой сытуацыі выданьне за кароткі час шасьці Купалавых кніг аўтары, што стаялі ў чарзе, маглі расцэньваць як выкарыстаньне магчымасьцяў суполкі дзеля асабістых мэтаў ейных супрацоўнікаў. Такіх абмоваў Іваноўскі спрабаваў унікаць, у сувязі з чым нават уласныя творы імкнуўся выдаваць не ў Пецярбургу, а ў Вільні і пад рознымі псэўданімамі[37].

Таму асобнае выдавецтва Грыневіча не было канкурэнтным прадпрыемствам, але асаблівую формай супрацоўніцтва, разьлічанай на павелічэньне публікацыяў, каб пры гэтым ня мець непажаданых закідаў. Пра гэта, у прыватнасьці, сьведчыць гісторыя выданьня зборніка вершаў Купалы "Гусьляр". Выдаць яго спачатку плянавала суполка "Загляне сонца...", на што паказвае інфармацыя, зьмешчаная на вокладцы выдадзенай ёй у 1910 г. кніжкі Дуніна–Марцінкевіча "Шчароўскія дажынкі", якая абвяшчала, што "Гусьляр" выйдзе неўзабаве. Аднак, абдумаўшы справу, заканчэньне рэалізацыі гэтага праекту перадалі Грыневічу, у выдавецтве якога ў канцы 1910 г. урэшце і выйшла кніга. Раней ён выдаў "Адвечную песьню" Купалы і "Беларускія песьні з нотамі", т. 1, ува ўласнай апрацоўцы. Пра добрыя дачыненьні і супрацоўніцтва паміж абодвума выдавецтвамі сьведчыць таксама факт, што выдадзеныя Грыневічам кнігі суполка "Загляне сонца..." прымала на свой склад і прапаноўвала разам з уласнымі выданьнямі. Ня выключана, што яна "пацiху" пакрывала частку выдаткаў на іх.

Другі этап дзейнасьці суполкі "Загляне сонца..." пачаўся з выданьня ў жніўні ці верасьні 1909 г. чарговай кнігі Дуніна–Марцінкевіча "Вечарніцы". Амаль аднычасова ў Вільні пад маркаю "Загляне сонца..." выйшла кніга Дулебы "Як ратаваць уздутую жы-

[35] Ліст Р. Зямкевіча да А. Ельскага ад 21.03.1909. AGAD, zesp. Prozorów i Jelskich, 140_2.

[36] Ажэшка Э. Хам (Мужык). Пецярбург, 1912. Інфармацыя суполкі на вокладцы.

[37] Гэта былі: арыгінальная кніжка В. Іваноўскага, выдадзеная пад яго псэўданімам Вацюк Тройца, "Cukier. Z hutarak z Dziadźkam Symonam". Wilnia, 1908; а таксама яго пераклады папулярных брашур А. Семпалоўскага "Hutarki ab haspadarcy" і К. Дулебы "Jak ratawać uzdutuju żywiołu", абедзьве выйшлі ў Вільні ў 1909 г. пад псэўданімамі Антось Асіна і Антось Хатні. Усе тры працы раней друкаваліся ў "Нашай Ніве".

вёлу" (кірыліцай і лацінкай) у перакладзе Іваноўскага, а ў студзені 1910 г. — падручнік Якуба Коласа "Другое чытаньне для дзяцей беларусаў", выдадзены разам зь віленскім таварыствам "Наша Хата". У сярэдзіне гэтага году выйшлі з друку адным томам два наступныя творы Дуніна–Марцінкевіча "Шчароўскія дажынкі" і "Купала" з прадмоваю — вялікім артыкулам Іваноўскага "Вінцук Дунін–Марцінкевіч і яго жыцьцё". Гэта была адна зь першых спробаў паказу складанай фігуры гэтага пісьменьніка XIX ст. і ацэнкі ягонага значэньня для беларускай літаратуры. Урэшце, у лістападзе 1910 г. пасьля працяглых захадаў суполкі, якія пацягнулі значныя выдаткі, пецярбурская Судовая палата скасавала рашэньне пра канфіскацыю кніг Багушэвіча.

У 1910—1912 гг. пецярбурская суполка літаграфічным спосабам і накладам 200 або 400 асобнікаў выдала рэпэртуарную сэрыю са сцэнічных твораў. Гэта было як крокам насустрач патрэбам узьнікаючых беларускіх аматарскіх тэатральных трупаў, так і інсьпірацыяй і дапамогай для гэтага руху. У сэрыі выйшлі наступныя камэдыі: "Модны шляхцюк" Каруся Каганца (1910), "Сватаньне" Антона Чэхава ў перакладзе Напалеона Чарноцкага (1910), "Пашыліся ў дурні" (1910) і "Па рэвізіі" (1911) Марка Крапіўніцкага, абедзьве ў апрацоўцы Чарноцкага, і "Міхалка", нібыта перапрацоўка польскай камэдыі, выкананая, як пададзена на тытульнай старонцы, Далецкімі (1911)[38]. Акрамя таго, суполка выдала два драматычныя творы Элізы Ажэшкі — "У зімовы вечар" (1910, пераклад Вацлава Ластоўскага) і "Хам" (1912), а таксама камэдыю Купалы "Паўлінка".

У 1911 г. выйшлі ў сьвет яшчэ два выданьні: невялічкае апавяданьне Новіча "Ў дому лепей" і даволі ёмісты дапаможнік для пчаляроў Генрыка Бярозкі "Пчаліна — жывёлка малая, а карысьці дае многа". Пад псэўданімам "Бярозка" выступаў ксёндз Бэта — прафэсар духоўнай сэмінарыі ў Сейнах[39].

Такім чынам, пасьля шматмесячнага застою зь вясны 1909 г. дзейнасьць суполкі разьвівалася вельмі пасьпяхова. Разам з узрастаючай колькасьцю выдаваных кніжак павялічыўся іх продаж, які нарэшце пачаў прыносіць прыбытак. Гэта ўмагчыміла рост актываў суполкі. Калі 1 красавіка 1910 г. яны складалі 4070 рублёў, то на працягу наступных 15 з паловай месяцаў яны ўзрасьлі на 50% і 15 верасьня 1911 г. дасягнулі 6000 руб. Асабліва моцна ўзрос у той час аб'ём унёскаў сяброў–заснавальнікаў, якія дасягнуў 1500 руб.[40] Здаровае фінансавае становішча дазволіла суполцы ня толькі пакрываць уласныя выдаткі (на друк, памяшканьне, склад, рэкляму і інш.), але і дафінансаваць выданьне календара "Нашае Нівы" на 1911 г.[41]. З гэтага гледзішча суполка "Загляне сонца..." ня мела аналёгіі сярод іншых тагачасных беларускіх выдавецтваў. Дзеля гэтага цяжка пагадзіцца з ацэнкай Рыгора Семашкевіча, што яна была вельмі беднай арганізацыяй[42].

Рацыянальная і пасьлядоўная дзейнасьць суполкі давала таксама менш адчувальную, але надзвычай важную для беларускай літаратуры карысьць — уплывала на яе папулярызацыю, пабуджала да творчай актыўнасьці маладых празаікаў і паэтаў. У 1911 г. у выдавецкім партфэлі чакалі свайго часу ня толькі чарговыя творы Цёткі, Купалы і Коласа, але і новых аўтараў — Зьмітрака Бядулі, Канстанцыі Буйло, Тодара Чарнышэвіча, Цішкі Гартнага, Алеся Гурла, Янкі Журбы ды іншых. Усё гэта паўплывала на пазыцыю Шыпілы, які аднавіў супрацоўніцтва з суполкаю, хаця гэтым разам у неафіцыйнай форме. Гэтым не бяз гонару за ўласныя дасягненьні суполка скончыла фінансавую справаздачу на 15 лістапада 1911 г. словамі:

[38] Далецкія — гэта быў псэўданім В. Іваноўскага. Гл.: Seduro V. The Byelorussian Theater and Drama. New York. 1955. P. 153.

[39] Станкевіч Я. З гісторыі Беларусі. Мюнхэн, 1958. С. 71.

[40] Маладая Беларусь. 1912. Сш. 1. С. 153.

[41] Тамсама. С. 155.

[42] Семашкевіч Р. Беларускі літаратурна–грамадскі рух у Пецярбурзе. Мінск, 1971. С. 118.

> Пасылаючы гэты наш атчот вельміпаважаным нашым Сябруком, Супольнікам і Дабрадзеём — урад Суполкі ад усяго сэрца дзякуе за прыхільные рады, працу і помач Суполцэ і зь ясным вокам паглядае на прышласьць, веруючы, што і далей не будзець недастатку ў чыстых, шчырых і прыязных беларускіх сэрцах[43].

Гэтую сьвятлейшую прышласьць кіраўніцтва суполкі бачыла ня толькі ў пашырэньні кнігавыданьня, але і ў стварэньні першага беларускага часопіса. Сапраўды, да вясны 1912 г., калі ў Вільні пачаў выходзіць сельскагаспадарчы месячнік "Саха", адзіным беларускім пэрыядычным выданьнем была "Наша Ніва", якая з гэтай прычыны займалася ўсімі галінамі жыцьця — ад вялікай палітыкі да гаспадарчых парадаў, бо мусіла ўлічваць інтарэсы разнародных катэгорыяў чытачоў. Пецярбурская суполка сапраўды ўважала мэтазгодным выдаваць спэцыяльны месячнік для інтэлігенцыі, аднак рэальна ацэньвала ўсё яшчэ недастатковыя магчымасьці публіцыстаў і таму не наважвалася на выдаваньне месячніка. Замест яго ў канцы 1911 г. распачалася падрыхтоўка да выданьня сталага альманаху пад назвай "Маладая Беларусь". Ён ня меў пэўнай пэрыядычнасьці, аднак выходзіў прыблізна штопаўгоду. Нягледзячы на гэта, "Маладая Беларусь" мела рысы часопісу, на што паказвае нумарацыя, разьмяшчэньне матэрыялаў, рэцэнзіі, абвесткі, бягучая інфармацыя. Усяго выйшлі тры сшыткі: першы — у траўні 1912 г., наступныя — у канцы 1912 г. і ў сярэдзіне 1913 г. Кожны налічваў каля 160 старонак вялікага фармату.

Тэматычны профіль альманаху меўся ахопліваць тры наступныя аддзелы: актуальныя пытаньні грамадзкага жыцьця на Беларусі, навуковыя працы, прысьвечаныя Беларусі, а таксама аддзел літаратуры і мастацтва. На практыцы, аднак, пераважалі літаратурныя творы Купалы, Коласа, Цёткі, Бядулі, Гартнага, Гурла, Чарнышэвіча, Буйлы, Новіча, Журбы і Петрашкевіча. Навукова–папулярную тэматыку прадстаўлялі пераважна артыкулы А. Навіны (Антона Луцкевіча), адзін зь якіх — "На дарозе да новага жыцьця" — суполка выдала асобнаю брашурай. На старонках "Маладой Беларусі" выступіў таксама прафэсар А. Пагодзін з артыкулам, прысьвечаным беларускай моладзі, а А. Янулайціс апублікаваў матэрыял пра паэта Паўлюка Багрыма, які жыў у Крошыне ў XIX ст.

Апрача выдавецкай дзейнасьці, Іваноўскі надаваў вялікую ўвагу працы зь беларускай студэнцкай моладзьдзю, якая пасьля рэвалюцыі 1905 г. усё часьцей трапляла ў вышэйшыя навучальныя ўстановы Пецярбургу. Спачатку маладыя беларусы гуртаваліся вакол суполкі "Загляне сонца...", якая была для іх першай школай нацыянальнай грамадзкай і культурнай працы. На частых сустрэчах–"суботніках" у кватэрах Іваноўскага і Шыпілы моладзь заахвочвалася да вывучэньня айчыннай гісторыі, мовазнаўства, літаратуры ды іншых галінаў беларусазнаўства. На гэтых суботніках нараджаліся праекты культурна–асьветніцкіх імпрэзаў і сяброўскай грашовай самапомачы, якія ажыцьцяўляліся пад непасрэдным кіраўніцтвам вядомага моладзевага дзеяча, студэнта ўнівэрсытэту, Яўгена Хлябцэвіча[44]. Гэтак пад апекай Іваноўскага і Шыпілы ў Пецярбургу вырастала першае пакаленьне народнай інтэлігенцыі — Маладая Беларусь, якая дала сваё імя ўжо згаданаму альманаху.

Кульмінацыяй гэтай выхаваўчай працы стаў Беларускі Навукова–Літаратурны Гурток, створаны ў студзені 1912 г. пры Пецярбурскім унівэрсытэце. Ён прынцыпова адрозьніваўся ад папярэдніх арганізацыяў, якія паўставалі на працягу ранейшага дзесяцігодзьдзя, бо ўпершыню атрымаў легальны статус, а сябрамі яго была пераважна мо-

---

[43] Маладая Беларусь... С. 155.

[44] Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. С 139; яго ж. Адбітае жыцьцё. Вільня, 1929. С. 44. Пра суботнікі ў В. Іваноўскага і Б. Шыпілы пісаў таксама Б. Тарашкевіч у сваёй аўтабіяграфіі ў 1933 г., якая знаходзіцца ў Архіве Гісторыі Партыі пры ЦК КПСС у Маскве. Дзякую сп–ні Аляксандры Бэргман за магчымасьць азнаёміцца з адпаведным фрагмэнтам аўтабіяграфіі.

ладзь сялянскага паходжаньня. І хаця гэта быў унівэрсытэцкі гурток, удзельнічалі ў ім студэнты зь іншых ВНУ Пецярбургу. На ўрачыстым інаўгурацыйным сходзе Іваноўскі ў сваёй прамове вітаў стварэньне гуртка як нараджэньне Маладой Беларусі, указваючы адначасна на яго важныя задачы, якія стаялі перад ім у галіне навуковага дасьледаваньня духоўнай і матэрыяльнай культуры беларускага народу[45]. І хаця галоўнай мэтай гуртка была найперш падрыхтоўка моладзі да вялікіх задачаў у справе беларускага нацыянальнага адраджэньня, унівэрсытэцкія ўлады з гэтым мірыліся. Вось што пісаў пра гэта прафэсар А. Пагодзін у лісьце да гурткоўцаў:

> Вашыя стараньні па ўзьняцьці нацыянальнай сьвядомасьці беларусаў абуджаюць самую гарачую маю сымпатыю... Над гэтым трэба працаваць, бо разьвіцьцё культуры народу немагчыма без усьведамленьня сваёй нацыянальнай тоеснасьці... Вітаю працу беларускай моладзі, скіраваную да нацыянальнай прасьветы беларускага народу... Дзеля гэтае ідэі варта жыць![46]

У афіцыйнай справаздачы пра дзейнасьць гуртка значылася, што яго ініцыятарам быў студэнт Хлябцэвіч. Да беларускага руху ён далучыўся ўжо даўно, каля 1905 г., калі вучыўся ў Віленскай праваслаўнай духоўнай сэмінарыі, прычым прыцягнуў за сабой яшчэ некалькі калегаў–сэмінарыстаў. Да такога рашэньня ён прыйшоў пад уплывам Іваноўскага, які разьлічваў на нацыянальную актывізацыю маладога праваслаўнага духавенства[47]. Аднак Хлябцэвіч адмовіўся ад духоўнай кар'еры і на пачатку 1907 г. паступіў у Пецярбурскі ўнівэрсытэт, дзе на працягу шасьці гадоў быў блізкім супрацоўнікам Іваноўскага. Таму ён дакладна ведаў пра вызначальную ролю Іваноўскага ў стварэньні Беларускага Навукова–Літаратурнага Гуртка і яго сталы клопат пра матэрыяльныя патрэбы студэнтаў, для якіх ён арганізоўваў дабрачынныя акцыі ды іншыя мерапрыемствы, прыбытак зь якіх ішоў на іх карысьць[48].

Такім чынам, за сваю больш як дзесяцігадовую грамадзкую дзейнасьць у Пецярбургу Іваноўскі паклаў нямала сілаў на карысьць беларускага нацыянальнага адраджэньня. У прыватнасьці, ён узьняў на нечуваны ўзровень кнігавыданьне і, такім чынам, стымуляваў разьвіцьцё новай беларускай літаратуры, заўважыў і падтрымаў талент найвялікшага паэта Беларусі, прарока нацыянальнага адраджэньня, Янкі Купалы, нарэшце, паклаў пачатак гадаваньню нацыянальных кадраў — вучоных, палітычных і культурных дзеячоў, скіроўваў іх зацікаўленьні ў рэчышча інтарэсаў нацыянальнага адраджэньня. Таму невыпадкова Язэп Хлябцэвіч і Браніслаў Тарашкевіч вызначылі В. Іваноўскага як цэнтральную фігуру беларускага жыцьця ў Пецярбургу, а Максім Гарэцкі — як правадыра нацыянальнага адраджэнскага руху напярэдадні першай сусьветнай вайны[49]. Адзначым у гэтым месцы наступную падзею: увосені 1908 г. у Пецярбурскі ўнівэрсытэт паступіў выпускнік Слуцкай гімназіі Радаслаў Астроўскі. У будучыні ён адыграе адметную ролю на

---

45 Отчет о состоянии и деятельности императорскаго С–Петербургского университета за 1912 г. СПб, 1913. Приложение. С. 11.

46 Наша Ніва. 1913. 2 жніўня.

47 Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў... С. 11. — *Ю.Т.*

У творах А. Луцкевіча нямала ёсьць згадак аб працы сярод сэмінарыстаў — як праваслаўных, так і каталіцкіх (гл.: Да гісторыі беларускага руху. С. 48, 52, 91, 92, 126, 18, 139, 145, 159—161). Карціна выглядае так: працу сярод сэмінарыстаў у Вільні распачала Цётка; І. Луцкевіч, калі пераехаў на пачатку 1906 г. у Вільню, карыстаўся напрацаванымі сувязямі і гэтую працу працягваў. Аб працы В. Іваноўскага сярод сэмінарыстаў А. Луцкевіч не пісаў. — *А.С.*

48 Отчет о состоянии и деятельности императорскаго С–Петербургского университета за 1913 г. СПб, 1914. С. 569.

49 Тамсама; Тарашкевіч Б. Аўтабіяграфія за 1933 г...; Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Вільня, 1921. С. 205.

беларускай палітычнай сцэне і стане галоўным прычынцам трагедыі Іваноўскага. Між тым, навучаючыся да лютага 1911 г. у Пецярбургу, трымаўся ў баку ад беларускага руху і намагаўся крочыць сваёй уласнай дарогай, прымаючы ўдзел у зямляцтве слуцкіх студэнтаў[50].

Добрых вынікаў дасягнуў Іваноўскі і ў навуцы. Пасьля таго, як у 1909 г. ён атрымаў у Мюнхэнскім політэхнічным інстытуце ступень доктара тэхнічных навук, Іваноўскі стаў дацэнтам у Пецярбурскім тэхналягічным інстытуце, спэцыялізуючыся ў фэрмэнтацыі харчовых прадуктаў. Яго запрасілі выкладаць фэрмэнталёгію на Вышэйшых жаночых політэхнічных курсах (г.зв. жаночай політэхніцы) у Пецярбургу; апрача таго, Іваноўскі працаваў яшчэ ў Міністэрстве земляробства старэйшым кансультантам па перапрацоўцы садавіны і гародніны. Вынікі сваіх досьледаў ён зьмяшчаў звычайна ў "Известиях Технологического института" (1908—1913) і "Известиях Российского общества винокуренных заводов" (1909). У 1914 г. выйшла яго першая кніжка "Испытание овощных и плодовых сушилок", выдадзеная на сродкі Міністэрства Земляробства.

У параўнаньні з посьпехамі ў арганізацыйнай і навуковай галіне, літаратурная і публіцыстычная дзейнасьць Іваноўскага выглядае досыць сьціпла, але варта і на ёй засяродзіць увагу. Ён быў сталым супрацоўнікам віленскіх беларускіх газэт "Наша Доля" і "Наша Ніва", тут пад псэўданімамі Вацюк Тройца, Антось Асіна, Антось Хатні ды інш. публікаваліся яго разнастайныя допісы і агратэхнічныя парады. Супрацоўнічаў ён і з папулярным земляробчым часопісам "Саха", які выдаваў Аляксандар Уласаў. Іваноўскі намовіў да публікацыяў сваю сястру Галену, спэцыялістку ў конегадоўлі.

Толькі аднойчы В. Іваноўскі адважыўся выступіць на паэтычнай арэне — у "Нашай Ніве" быў зьмешчаны яго пераклад верша Казімера Тэтмаера "Вада" зь яскрава рэвалюцыйным гучаньнем[51]. Вялікім посьпехам карысталася яго камэдыя са шляхецкага жыцьця "Міхалка", пасьля першай публікацыі 1911 г. у Пецярбургу яна вытрымала некалькі перавыданьняў, апошняе выйшла ў 1957 г. у Беластоку[52]. Іваноўскі ўвёў у яе матыў з асабістага жыцьця — старэйшай на 2—3 гады жонкі (у камэдыі — Адэля, дзеўка на выданьне). Камічныя эпізоды, падгледжаныя ва ўласным асяродзьдзі, ён пераказаў іншым аўтарам. Адным з такіх стаў шляхціц Быкоўскі з Купалаўскай "Паўлінкі" — яго прататыпам быў продак Іваноўскага, валадар Лябёдкі Рыла–Быкоўскі. Меў літаратуразнаўчую вартасьць і апублікаваны ў 1910 г. артыкул пра жыцьцё і творчасьць Вінцэнта Дуніна–Марцінкевіча, яго дадатна ацэньваюць і сучасныя дасьледчыкі[53].

Дзякуючы волі і мэтанакіраванай дзейнасьці Іваноўскага, пецярбурскі асяродак, бясспрэчна, утрымліваў першынства сярод усяго беларускага руху. Але гэта было непажаданае і ненармальнае становішча, таму што будучыня руху залежала ад яго актыўнасьці ў Беларусі, а не ў далёкай расейскай сталіцы. І хаця справы суполкі ішлі штораз лепей, выхаваўчая праца сярод моладзі падавалася спадзеўнай, а навуковая кар'ера складалася ўдала, Іваноўскі ў чэрвені 1913 г. разьвітаўся зь Пецярбургам і пераехаў у Вільню. Разам зь ім перабраўся і яго найбліжэйшы супрацоўнік Купала[54]. Такое рашэньне дыктавалі інтарэсы руху: неабходна было сканцэнтраваць творчыя сілы ў Вільні і разьвіваць дзейнасьць непасрэдна ў краі. Але, перш чым адбыўся іх выезд, суполка выдала ў Пецярбургу найлепшы зборнік Купалы — "Шляхам жыцьця"[55].

[50] Kalush V. In the service of the people for a free Byelorussia. London, 1964. P. 15—17.

[51] Наша Ніва. 1907. 23 сакавіка.

[52] Зборнік сцэнічных твораў. Беласток, 1957. С. 34.

[53] Семашкевіч Р. Тамсама. С. 114.

[54] Купала выехаў зь Пецярбургу ў Акопы і жыў там да восені 1913 г. У Вільню ён пераехаў толькі на пачатку кастрычніка. — *А.С.*

[55] Пецярбурская суполка па–ранейшаму існавала, але была няздольная да эфэктыўнай працы і займалася завяршэньнем ранейшай выдавецкай праграмы. У 1913/1914 г. яна выдала колькі пазыцыяў, бальшыню зь якіх склалі выпушчаныя асобнымі кніжкамі творы, што раней публікаваліся ў альманаху "Маладая Беларусь".

Іваноўскі плянаваў разьвязаць у Вільні дзьве асноўныя задачы: павялічыць кнігавыдавецкую дзейнасьць і распачаць земляробчую асьвету на беларускай вёсцы. Дзьве гэтыя задачы былі ў вялікай ступені ўзаемадапаўняльныя: асьветніцкая дзейнасьць адкрыла б шырэйшы доступ вясковаму чытачу да беларускай кніжкі. Таму невыпадкова па прыезьдзе ў Вільню Іваноўскі ўладкаваўся ў Сельскагаспадарчым таварыстве на пасаду кіраўніка яго складу, што разьмяшчаўся па вуліцы Завальнай, 9[56]. Тут цяпер мясьціўся цэнтар яго новай дзейнасьці.

Дагэтуль беларускім кнігавыданьнем у Вільні займалася перадусім рэдакцыя "Нашай Нівы". З 1907 па 1912 г. яна выдала 31 кніжку, прычым 12 зь іх у дубль–варыянце — кірыліцай і лацінкай. Калі не лічыць арыгінальных кніжных календароў, гэта былі пераважна збрашураваныя адбіткі твораў, уперад выдрукаваных у газэце. Для рэдакцыі гэта была пабочная справа, якая давала шмат клопату, таму зь яе ініцыятывы ў 1909 г. была заснаваная асобная выдавецкая суполка "Наша Хата". Аднак, выдаўшы некалькі кніжак, у 1911 г. яна спыніла сваю дзейнасьць. Няўдачай скончылася і спроба стварыць у 1910 г. суполку "Палачанін" — ужо ў наступным годзе яна была ліквідаваная. Таму патрэба стварэньня спэцыялізаванага выдавецтва адчувалася востра і пільна, і дзеячы "Нашай Нівы" ахвотна адгукнуліся на прапанову абазнанага ў гэтай справе Іваноўскага, каб засяродзіць выдавецкую дзейнасьць пад яго кіраўніцтва.

Гэткім парадкам 01.07.1913 г. у Вільні было закладзенае Беларускае Выдавецкае Таварыства (БВТ). Старшынём яго стаў Іваноўскі, а сакратаром — Купала. У ліпені–жніўні яно зьмяшчалася пры Жандарскім завулку, 1 (пазьнейшая вуліца Ягелонская), дзе Вацлаў часова затрымаўся пасьля прыезду зь Пецярбургу[57]. У верасьні БВТ пераехала на новую кватэру Вацлава па вуліцы Каштанавай, 5, дзе некалькі месяцаў пражыў таксама і Янка Купала[58]. Апрача памяшканьня, Іваноўскі пераказаў у распараджэньне суполкі і значныя грашовыя сродкі, якія забраў зь пецярбурскай суполкі. Гэта дапамагло стварыць добры матэрыяльны грунт, — ужо праз месяц пасьля заснаваньня БВТ было ў стане выдаткаваць 3000 рублёў на куплю ўсіх выдадзеных "Нашай Нівай" кніжак і календароў, якія заставаліся на складзе, а таксама — і матэрыялы да календара на 1914 г.[59] Істотнае значэньне мелі для выдавецтва і грашовыя субсыдыі ад княгіні Магдалены Радзівіліхі.

Пры такім стане Беларускае Выдавецкае Таварыства магло дазволіць добра прадуманую дзейнасьць. Першым важным крокам было стварэньне спэцыяльнага цэнтру распаўсюду кніжак, што дазваляла выдавецтву абмежавацца толькі ўласьцівымі яму функцыямі. Гэтым цэнтрам стала заснаваная ў жніўні 1913 г. пры ўдзеле БВТ беларуская кнігарня Вацлава Ластоўскага ў Вільні. Адзначым, што зьмяшчалася яна па вуліцы Завальнай, 7, г.зн. па суседзтву зь Сельскагаспадарчым Таварыствам, дзе працаваў Вацлаў Іваноўскі і зь якім супрацоўнічаў Вацлаў Ластоўскі[60]. Гэта спрыяла прапагандзе беларускай кніжкі сярод кліентаў, што наведвалі склад Сельскагаспадарчага Таварыства. Як паведамляў Ластоўскі, у кастрычніку і лістападзе 1913 г. продаж кніжак прынёс амаль 500 рублёў, прычым з 215 замоваў на адсылку кніжак поштай 212 было зроблена сялянамі. "Нас гэта дужа цешыць, — адзначаў Ластоўскі, — бо гэта азначае, што рух пайшоў у патрэбным кірунку"[61].

Ужо ў сярэдзіне жніўня 1913 г. у "Нашай Ніве" зьявілася характэрная аб'ява БВТ, якая пасьля ня раз будзе сустракацца на вокладках выдадзеных ім кніжак, з заклікам пісаць кнігі ў такой пасьлядоўнасьці: пераклад усяго Сьвятога Пісаньня, гісторыі Ста-

[56] Вся Вильна на 1915 год. Вильно, 1915. Гл. VI. С. 57.
[57] Наша Ніва. 1913. 16 жніўня.
[58] Пуцявінамі Янкі Купалы... С. 81.
[59] Александровіч С. Гісторыя і сучаснасць... С. 199.
[60] Наша Ніва. 1913. 12 верасьня ; Вся Вильна на 1915 год... Гл. IV. С. 57.
[61] Ліст Вацлава Ластоўскага да Людвікі Сівіцкай ад 01.12.1913 г. Асабісты архіў Людвікі Войцік у Вільні.

рога і Новага Запавету для школаў, кніжкі для набажэнства, Эвангельлі на нядзелі і сьвяты, гісторыя Царквы для школаў, беларуская граматыка, геаграфія, слоўнікі, арытмэтыка ды іншыя школьныя падручнікі, а таксама папулярныя кніжкі зь земляробства. Несумненна, такое значнае месца для рэлігійнай літаратуры адводзілася згодна з патрабаваньнямі княгіні Радзівіл, якая шчодра падтрымлівала беларускі каталіцкі рух і, між іншым, ахвяравала дыямэнтавае калье на пабудову беларускай духоўнай сэмінарыі[62]. БВТ, напэўна, было ня супраць выданьня рэлігійнай літаратуры, аднак надавала першынство прыгожаму пісьменству, календаром і школьным падручнікам. Таму яму даводзілася лявіяваць паміж жаданьнямі княгіні і грамадзкімі патрэбамі. За кароткі пэрыяд да выбуху першай сусьветнай вайны яно пасьпела выдаць пад сваёй эгідай 14 кніжак досыць значнага аб'ёму і, апрача таго, спрычынілася да выхаду колькіх кніжак, дзе назва выдавецтва не пазначалася. Сярод іх да рэлігійнай літаратуры належала толькі адна "Kantyčka". Каб задобрыць Радзівіліху, на пяці з выпушчаных кніжак быў зьмешчаны яе радавы герб: лебедзь на хвалях[63]. Гэты герб стаяў і на зборніку Максіма Багдановіча "Вянок", які выдалі ў канцы 1913 г. Вацлаў Іваноўскі і Іван Луцкевіч[64]. Трэба адзначыць, што БВТ было адзіным да першай сусьветнай вайны беларускім выдавецтвам, якое выплачвала аўтарскія ганарары[65]. Гэта надавала яму прэстыж і прываблівала супрацоўнікаў. Да таго ж пачалася распрацоўка школьных падручнікаў, што дазволіла іх выдаць неўзабаве — падчас нямецкай акупацыі.

Створаная і ўзначаленая Іваноўскім суполка "Загляне сонца і ў наша аконца" ў Пецярбургу і Беларускае Выдавецкае Таварыства ў Вільні за 1906—1915 гг. выпусьцілі агульным лікам 52 кніжкі тыражом каля 150 тыс. асобнікаў[66]. Аднак фактычны плён яго ініцыятываў быў большы: сюды неабходна прыплюсаваць вынікі працы фармальна незалежных выдавецтваў "Грамада" і А. Грыневіча ў Пецярбургу. Апроч гэтага, ён намовіў варшаўскую фірму Альфа Нобэль і Агранамічнае Бюро ў Вільні да выданьня некалькіх кніжак на беларускай мове, наапошку, выдаў колькі ўласных кніжак пад эгідай "Нашай Нівы". Таму поўны вынік выдавецкай дзейнасьці Іваноўскага за 1906—1915 гг. налічваў каля 80 кніжак, наклад якіх сягаў 220 тыс. асобнікаў. Гэта складала амаль палову ад усіх выдадзеных на той час беларускіх кніжак і больш як 60% ад іх накладу.

Выдатная роля Іваноўскага як піянэра беларускага выдавецкага руху абумоўліваe таксама і якасныя паказьнікі яго дзейнасьці. Ён вярнуў з забыцьця найлепшыя творы беларускай літаратуры XIX ст., даў беларускаму чытачу шэраг перакладаў з польскай, украінскай і расейскай літаратуры, падтрымліваў творчасьць сучасных паэтаў і празаікаў, спрыяючы ўзьнікненьню і разьвіцьцю новай беларускай літаратуры. Выдадзеныя ім падручнікі на цэлае дзесяцігодзьдзе апярэдзілі зьяўленьне публічных беларускіх школаў, а сэрыя драматургічных твораў дапамагла станаўленьню аматарскіх тэатральных труп. Дзякуючы яго стараньням, беларускі земляроб упершыню атрымаў сельскагаспадарчую літаратуру на роднай мове. Шмат зрабіў Іваноўскі і для распаўсюду кнігі: нарэшце яна пачала зьяўляцца ў кнігарнях як беларуская кніжка, а ня як мясцовы фальклёр у расейскай упакоўцы.

На шляху да ажыцьцяўленьня пастаўленых мэтаў Іваноўскі пазьбягаў таннай рыторыкі і эфэктных пастулятаў, якія замяніў вялікімі і рацыянальнымі ўласнымі высілкамі.

[62] Як піша а. Аляксандар Надсан, княгіня М.М. Радзівіл ахвяравала калье на заснаваньне беларускай грэка-каталіцкай калегіі ў Рыме. Гл.: Надсан А. Pro patria aliena: Кляштар беларускіх айцоў марыянаў у Друі (1924—1938). Менск, 2006. С. 87.

[63] Гэта былі выдадзеныя ў 1914 г. кнігі "Родныя Зьявы" Я. Коласа, "Рунь" М. Гарэцкага, "Курганная Кветка" К. Буйлы, "Якім Бяздольны" Беларуса і "Васількі" Ядвігіна Ш.

[64] Ластоўскі В. Мае ўспаміны аб М. Багдановічы // Крывіч. 1926. № 1/11. С. 66.

[65] Александровіч С. Пуцявіны... С. 147.

[66] Тамсама.

Такім чынам, ён станавіўся прыкладам для іншых і прыцягваў да сябе прыхільнікаў, вучыў іх калектыўнай працы, хоць і не вымагаў ад іх болей, чым яны маглі даць. Імкнучыся памножыць канкрэтныя вынікі сваёй дзейнасьці, так важнай для адраджэньня Беларусі, ён ня дбаў пра самарэкляму і асабістую папулярнасьць, нярэдка замест сябе вылучаючы на першы плян сваіх паплечнікаў. Гэта дазваляла пазьбегнуць канфліктных сытуацыяў, але акурат таму сёньня мы ведаем значна больш пра вынікі яго працы, чым пра самога яе творцу.

Іваноўскі здолеў стварыць спрыяльную атмасфэру для сваёй дзейнасьці і ў сваёй сям'і. Яму дапамагалі жонка і браты Юры і Станіслаў. Іх польскае самавызначэньне пры гэтым не чыніла перашкоды. Сястра Галена ня толькі пісала гаспадарчыя парады для земляробаў па–беларуску, але ў 1914 г., карыстаючыся са сваіх знаёмстваў, завязаных падчас навучаньня ў Кембрыджы, зьмясьціла ў лёнданскім часопісе "Folk–Lore" тэксты пятнаццаці беларускіх песень з нотамі, запісаных у ваколіцы Лябёдкі. Публікацыя суправаджалася вялікім уступам, дзе брытанскіх чытачоў знаёмілі зь Беларусьсю і яе праблемамі. Упершыню ў ангельскай тэрміналёгіі пры гэтым быў выкарыстаны тэрмін "White Ruthenia" замест "White Russia". Новы назоў дапаўняўся знамянальным тлумачэньнем: "No White Ruthenian would ever allow him self to be called by a name that would imply that he was Russian"[67] ("Ніводзін беларус ніколі не дазволіць сябе называць імем, якое значыць, што ён — расеец" — *анг.*). Можна дапусьціць, што ў гэтай справе не абышлося без удзелу Вацлава, асабліва пры напісаньні інфармацыйнай прадмовы. Яшчэ адным прыхільнікам беларускай справы ў іх сямейным стане стала швагерка Марыя, музыказнаўца, жонка літоўскага дзеяча Яна Кіманта (Кімантаса), якая ў 1914—1918 гг. кіравала беларускім хорам у Вільні[68].

Дзейнасьць Іваноўскага пасьля рэвалюцыі 1905 г. праходзіла пад лёзунгам, які быў алюзіяй на дэвіз пецярбурскай выдавецкай суполкі і які выражаў перакананьне, што сонца загляне нарэшце і ў вокны беларускіх хат. Гэта быў абстрактны лёзунг, і кожны з чытачоў выдаваных кніжак мог разумець яго па–свойму. У тагачасных публікацыях Іваноўскага мы ня знойдзем спробаў сфармуляваць спэцыфічныя лёзунгі або палітычныя праграмы. Іх Іваноўскі замяніў канкрэтнай стваральнай працай, якая сама па сабе несла выразны палітычны сэнс, бо спараджала ўвесь час новыя каштоўнасьці, якія стымулявалі працэс нацыянальнага адраджэньня. І таму вынікі гэтай яго працы віталі ўсе прыхільнікі беларускага рэнэсансу незалежна ад іх палітычных поглядаў. Ня ставілі іх пад сумнеў і пазьнейшыя крытыкі беларускага нацыянальнага руху.

Прагрэс руху, які да першай сусьветнай вайны разьвіваўся амаль выключна ў культурнай сфэры (кніжкі, часопісы, культурна–асьветніцкія і рэлігійныя каталіцкія арганізацыі), уплываў на пашырэньне нацыянальнай сьвядомасьці, а гэта штораз больш непакоіла ідэолягаў "адзінай і непадзельнай" Расеі, якія бачылі ў ім пагрозу ўзьнікненьня і пашырэньня сэпаратысцкіх настрояў. У прыватнасьці, актывізавалі свае высілкі прыхільнікі гэтак званага "западноруссизма", але ім не ўдалося стварыць суцэльнай ідэалёгіі, якую можна было б проціпаставіць ідэям беларускага нацыянальнага адраджэньня. Затое расейскі ўрад трымаўся ліберальнай палітыкі і не мяшаўся ў барацьбу дзьвюх варожых плыняў — беларускай і "западнорусской". Гэта стварала адпаведныя ўмовы для сумленнай ідэалягічнай канкурэнцыі, пры якой нацыянальны бок, які мог разьлічваць адно на ўласныя сілы, яўна пераходзіў да контратакі, спадзеючыся разьбіць "западноруссизм" і дабіцца ад ураду афіцыйнага прызнаньня беларускай нацыі і мовы[69].

У барацьбе з "западноруссизмом" беларускі бок заваёўваў сымпатыю і падтрымку польскай грамадзкай думкі. Пра гэта сьведчылі шматлікія публікацыі апошніх даваен-

[67] Iwanowska H., Onslow H. Some White Ruthenian Folk–Songs // Folk–Lore. 1914. P. 92.
[68] Янушкевіч Я. Марыя Ячыноўская–Кімонт // ЛіМ. 1986. 27 чэрвеня.
[69] Цьвікевіч А. "Западно–руссизм"... С. 328–330.

ных гадоў, прысьвечаныя разнастайным аспэктам беларускага руху, які трактаваўся як натуральны саюзьнік на шляху да незалежнасьці[70]. У 1910 г. Чэслаў Янкоўскі, хаця і бачыў слабасьць беларускай інтэлігенцыі ды абыякавасьць народных мас, але лічыў, што, нягледзячы на русіфікацыю і апалячваньне, найбольшы шанец на здабыцьцё сымпатыі гэтых мас — за беларускай нацыянальнай справай. "Шмат людзей вымкнецца зь яе рук на ўсход і на захад, — пісаў Янкоўскі, — але і тое, што застанецца, можа зь цягам часу скласьці даволі значную нацыю"[71]. Зьяўленьне такіх ацэнак колькі год пасьля выданьня лемантара адлюстроўвала імклівы прагрэс нацыянальнай сьвядомасьці сярод беларусаў за той нядоўгі час, што папярэднічаў першай сусьветнай вайне. Урэшце "зь нічога" пачало нараджацца "нешта".

З Расеяй ці з Польшчай?

Першая сусьветная вайна разбурыла даўні, усталяваны ў XIX ст. геапалітычны расклад у Цэнтральна–Ўсходняй Эўропе і стварыла для нацыяў гэтай часткі кантынэнту надзею на аднаўленьне дзяржаўнасьці. Палітыкі паняволеных царызмам нацыяў разумелі, што дабіцца незалежнасьці адно толькі ўласнымі сіламі немагчыма. Таму яны арыентаваліся на падтрымку вялікіх дзяржаваў, у залежнасьці ад іх ваеннай магутнасьці ды здольнасьці ўплываць на фармаваньне пасьляваеннага парадку ў Эўропе.

У палітычнай стратэгіі маладога беларускага нацыянальнага руху пераважала прарасейская арыентацыя. Прычынай тут былі як эканамічныя сувязі з Расеяй, так і супольнае веравызнаньне — нагадаем, што на рубяжы XX ст. праваслаўныя складалі 70% насельніцтва Беларусі (у цяперашніх яе межах). Свой уплыў на такую арыентацыю зрабіла і досыць лібэральная палітыка царскіх уладаў пасьля рэвалюцыі 1905 г., якая дазволіла дасягнуць рэальных здабыткаў на ніве культуры і пашырэньня нацыянальнай сьвядомасьці. Праўда, у гэтых колах разумелі, што прагрэс тут усё яшчэ недастатковы, але меркавалі, што за дзясятак–другі гадоў такая арганічная праца прывядзе да масавага пашырэньня нацыянальнай сьвядомасьці. Асаблівыя спадзяваньні зьвязваліся з дэмакратызацыяй грамадзкага жыцьця, якая дала б магчымасьць завяршыць працэс адраджэньня. Выразам гэтага былі дамінуючыя сярод палітычных дзеячоў спадзевы на здабыцьцё тэрытарыяльнай аўтаноміі Беларусі ў расейскай дзяржаве.

Параза расейскіх войскаў ва Ўсходняй Прусіі ў жніўні 1914 г. насамрэч да канца не перадвызначыла канчатковых вынікаў расейска–нямецкай вайны, але паказала, што ў далейшым для Расеі яна можа скончыцца няўдала. Гэта падштурхнула расейскія ўлады да пэўнай мадыфікацыі нацыянальнай палітыкі на заходніх ускраінах імпэрыі. Таму напярэдадні нямецкага наступу на ўсходнім фронце ўлады былі ўжо гатовыя прадэманстраваць "новы курс" у беларускім пытаньні. Пра гэта сьведчылі, у прыватнасьці, намінкі на ўвядзеньне беларускай мовы ў школах[1] і дазвол на стварэньне, апрача Літоўскага і Польскага, Беларускага таварыства па аказаньні помачы пацярпелым ад вайны (БТАПВ). Гэтыя захады павінны былі пераканаць беларусаў, што стаўленьне да іх гэткае самае роўнае, як і да іншых нацыянальнасьцяў заходніх губэрняў.

9 сакавіка 1915 г. віленская губэрнская ўправа па справах аб'яднаньняў зацьвердзіла статут Беларускага таварыства па аказаньні помачы пацярпелым ад вайны, якое пасьля таго, як 29 красавіка яго ўхваліў губэрнатар, магло прыступіць да працы. Старшынёй праўленьня Таварыства стаў Вацлаў Іваноўскі, а яго намесьнікамі — Антон Луцкевіч і Вацлаў Ластоўскі. Сябрамі праўленьня былі Павал Аляксюк, Ігнат Біндзюк, Уладзіслаў

[70] Гэтай праблематыкай займаліся асабліва "Przegląd Wileński", "Litwa", "Kurjer Litewski", "Kraj", "Tygodnik Ilustrowany" (1912. № 37—38), "Świat Słowiański" (1912. T. I), "Litwa i Ruś" (1913. № 6).

[71] Jankowski C. Kwestia Białoruska // Kurjer Warszawski. 1910. 24—25 lipca.

[1] Наша Ніва. 1915. 19 сакавіка.

Сталыгва, ксёндз Савіцкі, Ігнат Буйніцкі ды Н. Клім. Управа Таварыства зьмяшчалася ў Вільні, на Георгіеўскім праспэкце, 11, яно мела права дзеяць на тэрыторыі Менскай, Магілёўскай, Гарадзенскай, Віленскай і Віцебскай губэрняў. У сакавіку 1915 г. управа БТАПВ выдала адозву "Да грамадзян Беларусі", у якой заклікала насельніцтва да супольнай ахвярнай працы дзеля ажыцьцяўленьня сваіх галоўных задач: сацыяльнага забесьпячэньня (харчаваньне, раскватэраваньне, мэдычная дапамога) і помачы вяскоўцам у аднаўленьні маёмасьці, зьнішчанай вайной[2].

Такім чынам, Вацлаў Іваноўскі ўзначаліў арганізацыю, дзейнасьць якой у пэрспэктыве распасьціралася на ўсю Беларусь. Нягледзячы на дабрачынны характар (зрэшты, вызначаны ня так ужо і строга), БТАПВ было адзінай афіцыйнай грамадзкай беларускай арганізацыяй, якую падтрымлівалі ўлады[3]. Дзеля гэтага ў яе ўзьнікалі вялікія магчымасьці для канцэнтрацыі нацыянальных сілаў і каардынацыі пазастатутнай дзейнасьці. Пра гэта сьведчыць, між іншым, перадача Таварыствам грашовых сродкаў на патрэбы віленскіх выдавецтваў[4]. Паводле інфармацыі Людвікі Войцік (тады — Сівіцкай), дзячкі Таварыства, улетку 1915 г. паўсталі яго аддзяленьні ў Менску і Петраградзе[5]. Гэта магло значыць, што ўправа Таварыства імкнулася да стварэньня неабходных для актыву апорных пунктаў у гарадох, якія мелі ключавое значэньне для палітычнай дзейнасьці.

Хада ваенных падзеяў выклікала істотныя зьмены ў працы Таварыства. Улетку 1915 г. нямецкія войскі распачалі ўдалы наступ на ўсходзе і ў сярэдзіне верасьня ўвайшлі ў Вільню. Пад канец месяца яны дасягнулі лініі Дзьвінск—Браслаўе—Баранавічы—Пінск, пасьля чаго ваенныя дзеяньні перапыніліся аж да лютага 1918 г. Лінія фронту расьсекла Беларусь: каля 25% яе абшару займалі немцы, астанюю ж частку — расейскія войскі. Перш як гэта зьдзеялася, расейскія ўлады арганізавалі шырокую эвакуацыйную кампанію, яна ахапіла шматлікія ўстановы і ўправы, прадпрыемствы, большую частку праваслаўнага духавенства[6] і вялікія масы насельніцтва. У выніку, на ўсход было эвакуавана пад прымусам альбо добраахвотна больш за 1,1 млн жыхароў Беларусі, сярод іх больш за 80% складалі выхадцы з Гарадзенскай і Віленскай губэрняў[7].

У гэтай сытуацыі праўленьне БТАПВ прызнала, што варта было б распасьцерці сваю дзейнасьць на абодва бакі нямецка–расейскага фронту, разьлічваючы, відаць, атрымаць ад нямецкіх уладаў дазвол на яго функцыянаваньне ў зоне акупацыі. Таму ў Вільні засталіся два намесьнікі старшыні — А. Луцкевіч і В. Ластоўскі, — а Вацлаў Іваноўскі выехаў у Расею. Асабіста для яго гэта было нялёгкае рашэньне — у Вільні ён пакідаў сям'ю: жонку Сабіну з трыма дзецьмі — Сьцяпанам, Вацлавам і колькімесячнай Ганнай. Неўзабаве яны пераехалі ў радавы маёнтак Лябёдку.

Фармальна пераезд Іваноўскага ў Расею быў абумоўлены яго функцыяй старшыні БТАПВ. Яму падпарадкоўваліся Менскае і Петраградзкае аддзяленьні Таварыства, ап-

[2] Тамсама. 1915. 16 красавіка і 25 траўня.

[3] А. Луцкевіч, які быў намесьнікам старшыні Таварыства да верасьня 1915 г. паказвае, што царскія ўлады хутчэй не падтрымлівалі таварыства, а цярпелі яго. У сваім артыкуле "Ўнутраная работа" ён пісаў:

> На вялікі жаль, Т–ва магло выяўляць сваю чыннасьць толькі ў надта малой меры: яно ня мела патрэбных грошы, бо расейскае правіцельства, каторае памагала ўсім нацыянальным таварыствам дзеля помачы пацярпеўшаму ад вайны насяленьню цераз Тацьцянаўскі Камітэт, аб'явіла беларусам байкот і не давала ім ні аднэй капейкі, сыплючы іншым сотні тысяч рублёў. Уся "падмога", якую Беларускае Т-ва атрымала з расейскіх рук, гэта былі... 360 рублёў!

Крыніца: Луцкевіч А. Унутраная работа // Беларускі каляндар на 1917 год. Вільня, 1916. — *А.С.*

[4] Александровіч С. Кнігі і людзі. Мінск, 1976. С. 89.

[5] Ліст Л. Войцік да аўтара ад 28.11.1986 г. Аднак арганізацыя петраградзкага аддзяленьня сутыкнулася з пэўнымі цяжкасьцямі. Паводле інфармацыі, пададзенай у часопісе "Сьветач" (1916. 9 лістапада), яно было канчаткова створана 31 студзеня 1916 г.

[6] Паводле А. Луцкевіча, на акупанавай тэрыторыі засталося 3—4 праваслаўныя сьвятары, паводле У. Ляхоўскага — іх было дзесяць. — *А.С.*

рача таго, ён разьлічваў на магчымасьць заснаваць новыя аддзелы БТАПВ на неакупаваных абшарах Беларусі ды ў месцах канцэнтрацыі эвакуаванага ў глыб Расеі насельніцтва. Можна, аднак, меркаваць, што гэта быў не адзіны матыў: чыньнікам, які найболей спрычыніўся да такога рашэньня, было яго перакананьне, што ў тагачасных умовах толькі супрацоўніцтва з Расеяй зможа гарантаваць Беларусі пасьпяховае гаспадарчае і культурнае разьвіцьцё. Да такой пазыцыі яго схінаў ня толькі дагэтулешні досьвед дзейнасьці ў Пецярбургу і Вільні, але і нявера ў падтрымку ідэі беларускай дзяржаўнасьці з боку Нямеччыны, у чым засталыя ў Вільні беларускія дзеячы неўзабаве змаглі пераканацца.

У верасьні 1915 г. Іваноўскі пераехаў у Арол, куды эвакуавалася Віленскае Земляробчае Таварыства. Дзякуючы яго захадам, да гэтай групы ўцекачоў далучылася колькі віленскіх беларусаў, між іншым, калега па выдавецкай справе Янка Купала і архітэктар Лявон Дубейкаўскі. Аднак у Арле не было ўмоваў для разьвіцьця грамадзкай дзейнасьці, і таму кола эвакуаваных беларускіх дзеячоў пачало памяншацца. Неўзабаве Я. Купала выехаў у Маскву, а В. Іваноўскі з Л. Дубейкаўскім пачалі дамагацца пераводу ў Петраград[8]. Адзіны цямкі сьлед, які пакінуў па сабе Іваноўскі ў Арле, была заснаваная ім фабрыка гранатаў для расейскай арміі[9].

Улетку 1916 г. В. Іваноўскі перабраўся ў Петрагарад, дзе стаў упаўнаважаным міністэрства земляробства па забесьпячэньні фабрык сельскагаспадарчых прыладаў палівам і сыравінай[10]. Тут ён засьпеў сваіх нядаўніх супрацоўнікаў, кола якіх значна пашырылася за кошт прыплыву дзеячоў, эвакуаваных зь Беларусі. Гэта былі Зьмітро Жылуновіч, Эдвард Будзька, Клаўдый Душэўскі, Браніслаў Эпімах-Шыпіла, Аляксандар Ярэміч, Браніслаў Тарашкевіч, Аляксандар Чарвякоў, Тамаш Грыб, Палута Бадунова, ксяндзы Адам Станкевіч і Вінцэнт Гадлеўскі ды інш. Неўзабаве яны пяройдуць да актыўнай палітычнай дзейнасьці, якая, хоць і пад рознымі партыйнымі сьцягамі, скіроўвалася да адзінай мэты — стварэньня незалежнай Беларусі. Пакуль што ўсе гуртаваліся вакол петраградзкага аддзяленьня БТАПВ, разьмешчанага па адрасе: вул. Знаменская, 36.

Галоўным кірункам дзейнасьці Таварыства было матэрыяльнае, мэдычнае і юрыдычнае забесьпячэньне ўцекачоў ды іх працаўладкаваньне. Апрача таго, ладзіліся спэктаклі ды іншыя імпрэзы, прыбытак зь якіх дапаўняў сьціплыя ўрадавыя датацыі на дабрачынныя патрэбы. У лістападзе 1916 г. у Петраградзе адчынілася беларуская асноўная школа і пачалося выданьне тыднёвікаў "Сьветач" і "Дзяньніца", якія, аднак, выходзілі толькі да канца сьнежня 1916 г. На гэта паўплывалі як фінансавыя прычыны, так і незычлівае стаўленьне ўладаў: да апошніх дзён царскага рэжыму ўрад супраціўляўся разьвіцьцю палітычнай дзейнасьці сярод "нерасійскіх" народаў імпэрыі[11]. Толькі пасьля Лютаўскай рэвалюцыі ў Расеі беларускі палітычны рух ажывіўся. Адразу ж пасьля зрыненьня царызму пасьля дзесяцігадовага перапынку аднавілася дзейнасьць Беларускай Сацыялістычнай Грамады, паўстала партыя Беларускіх Народных Сацыялістаў (магчыма, маецца на ўвазе Беларуская Народная Партыя Сацыялістаў. — ***Рэд.***), арганізаваліся хрысьціянскія дэмакраты ды іншыя групоўкі. Аднак кіруючая роля на беларускай палітычнай арэне належала БСГ. Галоўныя асяродкі яе дзейнасьці разьмяшчаліся ў Петраградзе і Менску на базе аддзелаў БТАПВ. 25 сакавіка 1917 г. БСГ склікае ў Менску партыйную канфэрэнцыю, якая падтрымала Часовы Ўрад, выказалася за аўтаномію Беларусі ў рам-

---

[7] Сташкевич Н. Приговор революции. Крушение антисоветского движения в Белоруссии 1917—1925. Мінск., 1985. С. 57.

[8] Вітан К. Лявон Вітан-Дубейкаўскі. Да 85 угодкаў нараджэньня. Нью-Ёрк, 1954. С. 9; Янка Купала. Спадчына. Мюнхэн, 1955. С. XLI.

[9] Станкевіч Я. З гісторыі Беларусі. Мюнхэн, 1958. С. 77.

[10] Joza S. (red.) Czy wiesz, kto to jest? Warszawa, 1938. S. 273.

[11] Войцік Л. Успаміны. Аўтарскі машынапіс. Вільня, бяз даты. С. 8.

ках рэспубліканскай фэдэрацыйнай Расеі, а таксама — за перадачу зямлі сялянам. У гэтым апошнім пункце канфэрэнцыя асудзіла стыхійныя выступленьні сялянства і запатрабавала, каб аграрнае пытаньне вырашалася на краёвым сойме Беларусі[12].

Даўнейшых дзеячоў БСГ парасьцярушыла па сьвеце вайна, і адзіным прадстаўніком не традыцыяў у петраградзкім асяродзьдзі быў Іваноўскі як сузаснавальнік і чалец абранага ў сьнежні 1905 г. кіраўніцтва. Відаць, гэтая акалічнасьць падштурхнула пазьнейшых публіцыстаў да высновы, нібыта ён быў вядучым дзеячом БСГ у Петраградзе і пасьля падзеньня царскага рэжыму[13]. Таму невыпадкова яго абралі за прадстаўніка БСГ у Беларускім Нацыянальным Камітэце (БНК), устаноўчы зьезд якога адбываўся ў Менску з 25 па 27 сакавіка 1917 г.[14].

Але В. Іваноўскі не паехаў у Менск і ня ўдзельнічаў у канфэрэнцыі БСГ і зьезьдзе палітычных партыяў, а ў БНК яго абралі завочна. На гэта ўказвае пратакол зьезду, які пастанавіў зьвярнуцца да В. Іваноўскага, гэтаксама, як і да некалькіх іншых адсутных асобаў, з просьбай прыняць удзел у арганізацыі асьветніцкага таварыства "Прасьвета". Не фігуравала яго імя і ў складзе абранай зьездам дэлегацыі БНК да прэм'ера Часовага Ураду князя Юр'я Львова. Іваноўскага далучылі да гэтай дэлегацыі ўжо ў красавіку, пасьля таго, як ён прыехаў у Петрагарад[15].

Спатканьне з князем Львовым пераканала Іваноўскага ў тым, што Часовы Урад, гэтак жа, як некалі царскі, не прызнаваў самастойнасьці беларускага народу і ў сувязі з гэтым адмовіўся прызнаць БНК як палітычнае прадстаўніцтва Беларусі. На гэта, безумоўна, паўплывала слабасьць беларускага руху, які пасьля Лютаўскай рэвалюцыі вызначаўся яшчэ вялікай інфантыльнасьцю, спадзеючыся перадусім на падтрымку Часовага Ураду. Множыліся загрузлыя ў грызьні паміжсобку партыі і групоўкі, кожная зь якіх прэтэндавала на ролю выразьніка адзіна слушнай канцэпцыі нацыянальнага вызваленьня, перабольшваючы сваю падтрымку ў грамадзтве і заліваючы Петраград плынямі дэкларацыяў і патрабаваньняў. Ніводная з гэтых партыяў да траўня 1917 г. ня мела нават свайго друкаванага органа.

Для праціўнікаў нацыянальнага беларускага руху і абаронцаў непадзельнай Расеі гэта адкрывала шырокае поле для маніпуляцыяў гэтым рухам. Так, выкарыстоўваючы акалічнасьць, што прынамсі палову чальцоў БНК складалі каталікі, яны распачалі на сялянскіх зьездах і рабочых сходах энэргічную кампанію кампрамэтацыі Камітэту як польска–каталіцка–памешчыцкай інтрыгі, пакліканай адарваць Беларусь ад Расеі і загнаць беларускае сялянства ў ярмо польскіх паноў[16]. У выніку гэтай кампаніі, а таксама ўзрастаючай радыкалізацыі грамадзкіх настрояў, большасьць беларускіх сацыялістычных дзеячоў прызнала стварэньне БНК на чале з Р. Скірмунтам палітычнай памылкай і дзеля "рэабілітацыі" ідэі нацыянальнага адраджэньня 10 ліпеня 1917 г. стварыла асобную Цэнтральную Раду Беларускіх Арганізацыяў і Партыяў, якая мелася прэзэнтаваць адно "прагрэсіўныя і дэмакратычныя" згуртаваньні[17].

У гэтай сытуацыі Беларускаму Нацыянальнаму Камітэту давялося сысьці з палітычнай сцэны. Рэвалюцыя адштурхоўвала Р. Скірмунта, які быў ня толькі буйным землеўласьнікам, але і найперш — як дэпутат Дзяржаўнай Думы — кампэтэнтным і дасьведчаным паліты-

---

11 Dziennik Pietrogradzki. 14.04.1917. — *Ю.Т.*

12 Камунікат аб канфэрэнцыі БСГ надрукаваны ў: Arche. 2006. № 4. С. 160—161. — *А.С.*

13 Езавітаў К. У 25-я ўгодкі Ўсебеларускага Кангрэсу // Раніца. 1943. 8 жніўня.

14 25—25.03(7—9.04).1917 г. у Менску адбыўся зьезд беларускіх нацыянальных арганізацыяў. Пратакол зьезду гл. у: Літаратура і мастацтва. 1990. 14 снежня. — *А.С.*

15 ЛіМ. 1990. 14 снежня. Dziennik Pietrogradzki. 14.04.1917.

16 Турук Ф. Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белорусов. М., 1921. С. 27—28.

17 Тамсама.

кам. За "рэакцыянэраў" прызналі таксама хадэкаў і прадстаўнікоў сялянскіх рухаў (ludowców), хаця сярод іх толькі нямногія маглі пахваліцца шляхецкім паходжаньнем. У нармальных умовах гэты ўчынак быў бы раўназначны самагубству, але пры нігілістычнай нацыянальнай палітыцы ўраду і яго хісткай пазыцыі ён ня меў вялікага значэньня.

В. Іваноўскі ня выпаў з гэтай гульні толькі таму, што ня браў у ёй удзелу. Ён чакаў, пакуль настане пара для канструкцыйнай працы. Праўда, ён не парываў з БСГ, але не адыгрываў значнай ролі ў яе дзейнасьці. Таму мы ня бачым яго сярод сяброў часовага Цэнтральнага Камітэту БСГ, абранага ў чэрвені ў Петраградзе, ані ў складзе беларускай дэлегацыі на жнівеньскай агульнарасейскай палітычнай канфэрэнцыі ў Маскве[18]. Ня ўдзельнічаў ён у кастрычніцкім зьезьдзе БСГ у Менску. Паводле інфармацыі Людвікі Войцік, былой сакратаркі БНК і Цэнтральнай Рады, у гэты час В. Іваноўскі ўвогуле не паказваўся ў Менску[19]. Ён бязвыезна жыў у Петраградзе, назіраючы за агоніяй Часовага Ўраду і зьвязваючы свае надзеі на вырашэньне беларускага пытаньня з праграмай бальшавіцкай партыі.

Як сьцьвярджае беларускі гісторык Васіль Раманоўскі, В. Іваноўскі сустрэў Кастрычніцкай рэвалюцыю "зь нянавісьцю"[20]. Гэта адна з тыповых выдумак нядаўняй гістарыяграфіі, якая, згодна з партыйнай замовай, павіна была маляваць палітычны партрэт гэтага чалавека як ворага народу і савецкай улады ад самага яе нараджэньня. Між тым, акурат пасьля кастрычніцкага перавароту В. Іваноўскі пабачыў, што дзейнічаць мае сэнс, і адразу ж прыступіў да палітычнай дзейнасьці, разьлічваючы, што беларусам удасца выкарыстаць заклікі Леніна да стварэньня новага грамадзкага і нацыянальнага ладу.

Таму Іваноўскі ўзяў удзел у падрыхтоўцы найважнейшай для Беларусі падзеі тых дзён — Усебеларускага зьезду, які, з ухвалы і пры фінансавай падтрымцы ўзначаленага Сталіным Народнага Камісарыяту ў справах нацыянальнасьцяў, зьбіраўся ў Менску 5 сьнежня 1917 г.[21]. Ад імя беларускага народу зьезд павінен быў вырашыць долю Бацькаўшчыны і вызначыць галоўныя кірункі яе разьвіцьця. Іваноўскі быў на зьезьдзе дэлегатам ад Петраградзкай арганізацыі БСГ і працаваў там, між іншым, як экспэрт яго фінансава–эканамічнай камісіі. Ён павінен быў выступіць з рэфэратам пра эканамічную сытуацыю ў Беларусі і адбудову яе ваенных разбурэньняў[22].

Аднак рэфэрат В. Іваноўскага так і не прагучаў, бо ў ноч з 17 на 18 сьнежня, паводле загаду старшыні Савету Народных Камісараў Заходняй акругі ў Смаленску К. Ландэра, салдаты менскага гарнізону разагналі зьезд, а яго прэзыдыюм арыштавалі. Гэтая акалічнасьць спарадзіла чарговы "тэзіс" партыйнай гістарыяграфіі: калі зьезд разагналі бальшавікі — значыць ён быў антыбальшавіцкі, антысавецкі, а таму — буржуазны і сэпаратысцкі, г.зн. у найвышэйшай ступені шкодны. Такую ацэнку замацоўвалі публікацыі беларускіх нацыянальных гісторыкаў, якія коштам фальсыфікацыі дакумэнтаў спрабавалі давесьці антыбальшавіцкі і незалежніцкі характар зьезду[23].

Таму варта прывесьці поўны тэкст першага і адзінага пункту рэзалюцыі зьезду, які быў прыняты перад тым, як дэпутатаў разагналі салдаты К. Ландэра. Ён гучаў так (вылучэньні аўтара. — *Ю.Т.*):

> Замацоўваючы сваё права на самавызначэньне, абвешчанае расейскай рэвалюцыяй і зацьвярджаючы дэмакратычны рэспубліканскі лад у межах Беларускай зямлі, для ўратаваньня роднага

[18] На ўвазе маецца скліканая Часовым урадам Дзяржаўная нарада, якая праходзіла 12—15(25—28).08.1917 г. у Маскве і ў якой бралі ўдзел прадстаўнікі грамадзка–палітычных арганізацыяў і дзяржаўных установаў Расеі. — *А.С.*

[19] Ліст Л. Войцік да аўтара ад 28.01.1979 г.

[20] Раманоўскі В. Саўдзельнікі ў злачынствах. Мінск, 1964. С. 77.

[21] Другі Ўсебеларускі Кангрэс. Мюнхэн, 1954. С. 12.

[22] Беларуская Рада. 1917. № 6.

[23] Туронак Ю. Нежаданая рэспубліка. С. 66—80 у гэтым выданьні. — *Рэд.*

краю і *захаваньня яго ад падзелу і адарваньня ад Расейскай Дэмакратычнай Фэдэрацыйнай Рэспублікі* I Усебеларускі Зьезд пастанаўляе: безадкладна ўтварыць із свайго складу орган краёвае улады ў выглядзе *Ўсебеларускай Рады Сялянскіх, Салдацкіх і Рабочых Дэпутатаў*, які часова стаецца на чале кіраўніцтва краем, уваходзячы ў зносіны з Цэнтральнай уладай, адказнай перад Радай Рабочых, Салдацкіх і Сялянскіх Дэпутатаў[24].

Такім чынам, зьезд быў ні антысавецкі, бо склікаў савецкі орган улады ў Беларусі[25], і ні сэпаратысцкі, бо выказаўся супраць адрыву ад Расеі. Згодна з праграмай бальшавікоў, былі і іншыя праекты рэзалюцыі, да прыкладу, патрабаваньне неадкладнай перадачы зямлі сялянам бяз выкупу, увядзеньне народнага кантролю над прамысловасьцю і гандлем ды інш. Іх не паставілі на галасаваньне таму, што зьезд быў разагнаны. Аб характары гэтага зьезду сьведчаць таксама і тэлефонныя перамовы яго старшыні са Сталіным падчас паседжаньняў ды, нарэшце, тэлеграмы самога К. Ландэра ў Петраград, дзе ён сьцьвярджаў, што зьезд "у прынцыпе выказаўся за прызнаньне савецкай улады"[26]. Сапраўднай прычынай разгону зьезду было яго імкненьне стварыць на Беларусі уласны *беларускі орган савецкай улады* замест саветаў прышлых чужынцаў–камісараў, якія гэтак жа, як Мураўёў і Керанскі, не прызнавалі беларускага народу і яго права на самавызначэньне.

Гэтак у сьнежні 1917 г. сярод беларускіх дзеячоў, зарыентаваных на Савецкую Расею, упершыню здарыўся сур'ёзны крызіс даверу. Ленінскім дэкларацыям не адпавядалі паводзіны мясцовых уладаў, стаўленьне якіх да беларускай дзяржаўнасьці, нават савецкай, мала чым адрозьніваліся ад ранейшай імпэрскай палітыкі. Пра гэта сьведчылі і мірныя савецка–нямецкія перамовы ў Берасьці канца 1917 — пачатку 1918 г., падчас каторых беларускае пытаньне было праігнараванае. Усё гэта спрыяла пашырэньню незалежніцкіх настрояў сярод гэтых дзеячоў, хаця большасьць зь іх усё яшчэ азіралася на Расею, мяркуючы, што ў рэшце рэшт толькі яна вырашыць лёс Беларусі.

У гэтым сэнсе Іваноўскі таксама не зьмяніў сваёй прарасейскай арыентацыі, хаця брутальны разгон зьезду ўспрыняў зь вялікім засмучэньнем. Але неўзабаве пасьля вяртаньня Іваноўскага ў Петраград адбылася падзея, якая нібыта пацьвердзіла, што пастанова К. Ландэра разагнаць менскі зьезд супярэчыла пазыцыі цэнтральных уладаў. 31 студзеня 1918 г. быў выдадзены дэкрэт Леніна аб стварэньні Беларускага Нацыянальнага Камісарыяту (Белнацкаму) як аддзелу Народнага Камісарыяту па справах нацыянальнасьцяў. Гэты крок павінен быў засьведчыць, што Ленін і Сталін зацікаўленыя ў тым, каб вырашыць беларускае пытаньне і ў выніку распружыць напяцьце сярод беларускіх палітычных дзеячоў. Таму гэта выглядала як спроба выправіць сытуацыю, створаную смаленскімі інтэрнацыяналістамі.

Дэкрэт Леніна меў вялікае прапагандысцкае значэньне, але ня выклікаў у кароткатолмінавай пэрспэктыве істотных зьменаў у палітычным становішчы ў Беларусі. У лютым 1918 г. Белнацкам пераняў на сябе паўнамоцтвы ранейшага Беларускага таварыства па аказаньні помачы пацярпелым ад вайны і заняў яго памяшканьне на вуліцы Знаменскай, 36. У сакавіку ён распачаў выданьне газэты пад колішняй назвай "Дзяньніца". Не зьмяніўся нават яе рэдактар, Зьмітро Жылуновіч, адно што цяпер ён уступіў у бальшавіцкую партыю і стаў сакратаром Белнацкаму[27]. Гэтаксама, як і раней, распрацо-

[24] Беларуская Рада. 1917. № 12.

[25] У машынапіснай копіі пратаколу паседжаньня дэлегатаў Усебеларускага зьезду, якое пасьля яго разгону адбылося раніцай 18 сьнежня 1917 г. у дэпо Лібава–Роменскай чыгункі, запісана, што будучая часовая ўлада Беларусі будзе мець назву "Ўрад Народных Камісараў" (НАРБ, ф. 325, воп. 1, адз. захав. 6, арк. 21). — *А.С.*

[26] Турук Ф. Тамсама. С. 108.

[27] З. Жылуновіч уступіў у бальшавіцкую партыю толькі ў кастрычніку 1918 г., застаючыся да гэтага левым грамадаўцам. — *А.С.*

ўваліся амбітныя праекты культурнай дзейнасьці, якія заставаліся пераважна на паперы. І хаця яго паўнамоцтвы і сродкі былі абмежаваныя, усё ж гэта быў орган, упаўнаважаны пераказваць уладам беларускія палітычныя патрабаваньні. Але пакуль што, у лютым — сакавіку 1918 г., ані ўлады, ані Белнацкам ня мелі на гэта часу — усе сядзелі на валізах і чакалі пераезду ў новую сталіцу — Маскву.

Перш як гэта зьдзеялася, палітычная сытуацыя зноў радыкальна зьмянілася. Імкнучыся прымусіць Савецкую Расею прыняць умовы міру, нямецкія войскі 18 лютага рушылі на ўсход і, не сустрэўшы адпору, за колькі дзён дайшлі да Дняпра і Дзьвіны, г.зн. занялі амаль усю Беларусь. Толькі ў гэтай сытуацыі ў Берасьці 3 сакавіка была падпісаная дамова пра мір, якую неўзабаве ратыфікавалі абодва бакі. Сярод іншых пытаньняў дамова прызнавала акупацыю беларускіх земляў кароткачасовай — яны меліся быць вернутыя Расеі пасьля выплаты ёй ваенных кантрыбуцыяў. Апрача гэтага, яна стварала магчымасьць уцекачом вярнуцца дадому.

Такім чынам, беларускія дзеячы ў Петраградзе нечакана былі адцятыя ад краіны новай расейска-нямецкай дэмаркацыйнай лініяй і апынуліся ў становішчы ледзь не эмігрантаў. Гэтая група камуністаў, згуртаваных вакол Белнацкаму, магла тэарэтычна фармуляваць палітычныя патрабаваньні, але рэальная праца чакала ў краіне. Таму неўзабаве яны пачалі разьяжджацца ў розных кірунках. У красавіку большасьць дзеячоў Белнацкаму выехала ў Маскву, а В. Іваноўскі падаўся на радзіму.

Пад канец красавіка Вацлаў дабраўся да Лябёдкі. Тут ён ня быў амаль тры гады і гэты час нічога ня ведаў пра лёс сваёй сям'і і маёмасьці. Тым часам вайна і акупацыя зруйнавалі гаспадарку. У верасьні 1915 г. у садох Лябёдкі спыніўся расейскі 40-вы корпус разам з артылерыяй і абозам. Пасьля яго адступленьня ад расаднікаў засталося гумно, ад дрэваў — голыя шкілеты[28]... Пазьней пачаліся бязьлітасныя нямецкія рэквізыцыі. Леанарду было ўжо тады за семдзесят, і ён цяжка перажываў разбурэньне справы цэлага жыцьця. Спрабаваў пратэставаць, бараніць, але немцы за гэта замкнулі яго ва ўласным склепе, праўда, ненадоўга. Усё гэта падтачыла сілы Леанарда, так што Вацлаў пабачыў зламанага, хворага бацьку, зусім не падобнага да нядаўняга гордага сапраўднага дзяржаўнага радніка і гаспадара Лябёдкі. Доўгае расстаньне дало сябе знаць і ва ўзаемаадносінах з Сабінай — неўзабаве разлад паміж ёю і Вацлавам перарасьце ў поўны распад сям'і...

За лінію фронту не траплялі таксама і весткі пра стан беларускіх земляў, якія апынуліся пад нямецкай акупацыяй, таму толькі пасьля вяртаньня з Расеі Вацлаў Іваноўскі змог атрымаць дакладную інфармацыю, прычым зь першых рук. Неўзабаве пасьля пераезду на радзіму ён аднавіў супрацоўніцтва з Антонам Луцкевічам і Вацлавам Ластоўскім, якія кіравалі беларускай дзейнасьцю ў Вільні ад пачатку нямецкай акупацыі.

Для арыентаванага на Расею В. Іваноўскага гэта былі нечаканыя і, напэўна, ашаламляльныя зьвесткі. Аказваецца, Нямеччына як першая вялікая сусьветная дзяржава ўжо ў 1915 г. прызнала нацыянальную адметнасьць беларусаў і забясьпечыла роўнасьць іх нацыянальных правоў зь іншымі нацыянальнасьцямі акупаванага ўсходняга абшару. Таму акупацыйная адміністрацыя падтрымлівала разьвіцьцё беларускага школьніцтва, культурнага жыцьця, выдавецкай дзейнасьці і г.д., аднак не выяўляла зацікаўленьня ў справе беларускай дзяржаўнасьці і ў сувязі з гэтым супраціўлялася арганізацыі палітычнага жыцьця. Гэта тлумачылася ваеннымі плянамі Нямецкага Райху, які ў першай фазе вайны імкнуўся да анэксіі Літвы, Курляндыі і Беластоцка-Гарадзенскай акругі, але ня ставіў такіх самых прэтэнзіяў да большай часткі акупаваных беларускіх абшараў. Гэтыя землі пасьля меркаванага ўкладаньня мірнай дамовы плянавалася вярнуць да Расеі. Нямецкі ўрад, з увагі на свае эканамічныя інтарэсы ў Расеі, не імкнуўся да такога глыбокага падзелу гэтай дзяржавы.

Нямецкая палітыка прынцыпова не зьмянілася і ў 1918 г. Цяпер яе вызначала Бе-

[28] Cennik szczepów owocowych Wacława Iwanowskiego w Bojarach... S. 4.

расьцейская мірная дамова, у якой не было ніякіх палажэньняў што да беларускага пытаньня. Таму, займаючы Беларусь аж да Дзьвіны і Дняпра, немцы па–ранейшаму трактавалі яе як расейскую тэрыторыю і пэўны заклад пад ваенныя кантрыбуцыі, выплачваць якія абавязалася Савецкая Расея. Паколькі ўсьлед за выплатай кантрыбуцыі гэтыя землі мелiся адысьці да Расеі, нямецкі ўрад не цікавіўся праблемай беларускай дзяржаўнасьці. Аднак, з другога боку, нямецкія вайсковыя акупацыйныя мясцовыя ўлады ня толькі не супраціўляліся дзейнасьці беларускіх палітычных груповак, але і выразна іх падтрымлівалі.

Пры такім стане рэчаў пасьля таго, як Менск пакінулі бальшавіцкія ўлады, 19 лютага з падпольля выйшаў склiканы Радай Усебеларускага зьезду краёвы выканаўчы камітэт на чале зь Язэпам Варонкам і абвясьціў сябе часовым урадам (Народным Сакратарыятам) на Беларусі. 9 сакавіка камітэт выдае ўстаўную грамату, у якой абвяшчаецца стварэньне Беларускай Народнай Рэспублікі, усё яшчэ зразуметай як частка агульнарасейскай фэдэрацыі, і акрэсьлівае асноўныя прынцыпы яе канстытуцыі, сярод якіх — скасаваньне прыватнай уласнасьці на зямлю і перадача яе тым, хто на ёй працуе. 18 сакавіка Рада Ўсебеларускага зьезду абвясьціла сябе Радай Беларускай Народнай Рэспублікі, у яе склад уваходзілі прадстаўнікі нацыянальных меншасьцяў. Нарэшце, 25 сакавіка Рада БНР выдае чарговую ўстаўную грамату, якая абвяшчае Беларусь незалежнай і вольнай дзяржавай і скідае "апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасьці, якое гвалтам накінулі расейскія цары".

Акт незалежнасьці ад 25 сакавіка адлюстроўваў надзеі на прызнаньне Беларускай Народнай Рэспублікі ўрадамі Нямеччыны і іншых краін. Але і гэты крок не зьмяніў афіцыйнай пазыцыі Райху. У адказ на ноту Народнага Сакратарыяту канцлер Георг Гертлінг заявіў, што Бэрлін трактуе Беларусь як частку Савецкай Расеі і, у адпаведнасьці зь Берасьцейскай дамовай, ня можа прызнаць беларускую дзяржаву бяз згоды ленінскага ўраду. Рада БНР 25 красавіка даслала кайзэру Вільгельму II тэлеграму з падзякай за вызваленьне Беларусі ад чужога прыгнёту і просьбай падтрымаць імкненьні Рады да дзяржаўнай незалежнасьці і непадзельнасьці краю ў саюзе зь нямецкім Райхам. Адказу не было. Не далі вынікаў і наступныя захады ўраду БНР у гэтай справе[29].

Спробы будаўніцтва незалежнай Беларусі з апорай на Нямеччыну ўзбудзілі востры канфлікт у Радзе БНР і Народным Сакратарыяце і паказалі, наколькі глыбокай была псыхалягічная залежнасьць многіх дзеячоў ад Расеі. 25 сакавіка рэзалюцыя аб незалежнасьці прайшла толькі дзякуючы перавазе ў некалькі галасоў, што сьведчыла аб моцнай прарасейскай апазыцыі. Цікава, што нават цытаванае вышэй "ярмо" было царскага паходжаньня і таму не выражала стаўленьня да рэвалюцыйнай Расеі. Аднак асаблівы ўплыў на ўнутраны расклад мела ўзгаданая тэлеграма да Вільгельма II. Яна прывяла да распаду БСГ на некалькі драбнейшых, варожа настроеных адна супраць адной груповак (эсэраў, сацыялістаў–дэмакратаў і сацыялістаў–фэдэралістаў), а таксама — да адстаўкі часткі сяброў Рады БНР і Народнага Сакратарыяту разам зь яго прэм'ерам Я. Варонкам[30].

Такую палітычную сытуацыю засьпеў В. Іваноўскі па вяртаньні на Бацькаўшчыну. Увязвацца ў яе ня надта хацелася, асабліва пасьля таго, як Я. Варонка падаў у адстаўку, а на яго месца прыйшоў кансэрватар Раман Скірмунт, зь якім В. Іваноўскі не хацеў супрацоўнічаць. Апрача таго, усё выразьней вымаўлёўвалася ваенная катастрофа Нямеччыны, а ставіць на пройгрышную карту, ён лічыў, няма сэнсу і шкодна для будучай працы. Таму В. Іваноўскі часта наяжджаў у Вільню, дзе разам з Антонам Луцкевічам яны абмяркоўвалі пэрспэктывы дзейнасьці пасьля блізкага прыходу бальшавікоў.

Неўзабаве жыцьцё пацьвердзіла гэтыя прадбачаньні, ды нават хутчэй, чым нехта мог бы меркаваць. Ужо 27 жніўня пад уплывам пагаршэньня ваеннай і эканамічнай сытуа-

[29] Туронак. Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. С. 510—677 гэтага выданьня. — *Рэд.*

[30] Зьмянілася канфігурацыя Народнага Сакратарыяту, але сам кабінэт Я. Варонкі пратрываў да 9 ліпеня 1918 г. — *А.С.*

цыі нямецкі ўрад уклаў з Расеяй дадатковую дамову да Берасьцейскага трактату, якая прадугледжвала вывад нямецкіх войскаў зь Беларусі да лініі Бярэзіны, а 16 верасьня ў Вільні было падпісанае двухбаковае выканаўчае пагадненьне. У органах Беларускай Народнай Рэспублікі гэта выклікала занепакоенасьць, бо нямецкая акупацыя, не было сумневу, канчалася, а разам зь ёю і існаваньне гэтай дзяржавы. Таму ў верасьні пайшоў у адстаўку ўрад Р. Скірмунта[31], а празь некалькі тыдняў — таксама і наступны кабінэт Івана Серады.

Увосені 1918 г. В. Іваноўскі выехаў у Менск, дзе заняўся арганізацыяй пэдагагічнага інстытуту і далучыўся да дзейнасьці Беларускай сацыял–дэмакратычнай партыі. Неўзабаве ён быў прызначаны міністрам асьветы ў кабінэце міністраў БНР, сфармаваным у кастрычніку Антонам Луцкевічам[32]. Гэты кабінэт складаўся з прадстаўнікоў левых партыяў — сацыял–дэмакратаў і эсэраў, а яго стварэньне ва ўмовах распачатай эвакуацыі нямецкіх войскаў магло значыць толькі адно: імкненьне сфармаваць разам з камуністамі зь Белнацкаму кааліцыйны ўрад Беларускай Савецкай Рэспублікі. Гэта была вельмі своечасовая ініцыятыва, бо ўсе ранейшыя спробы З. Жылуновіча стварыць гэтую рэспубліку пасьлядоўна ігнараваліся ня толькі савецкімі цэнтральнымі, але і мясцовымі ўладамі. Прычыну гэтага вытлумачыў Вільгельм Кнорын, сакратар партыі бальшавікоў у Смаленску: “Мы лічым, што беларусы — не народ, а тыя этнаграфічныя асаблівасьці, якія адрозьніваюць іх ад астатніх расейцаў, павінны быць выкараненыя”[33].

Ідэя, да якой В. Іваноўскі з А. Луцкевічам прыйшлі ў Вільні, а якую, магчыма, яшчэ абмяркоўвалі з З. Жылуновічам у Петрагардзе, была надзвычай сьмелай і рызыкоўнай, але ў тагачасных умовах магла адыграць пэўную ролю для выратаваньня беларускай дзяржаўнасьці. Яна павінна была, па–першае, паўплываць на пазыцыю Масквы ў справе стварэньня Беларускай Савецкай Рэспублікі як законнай пераемніцы Беларускай Народнай Рэспублікі, а па–другое, уратаваць здабыткі БНР у галіне асьветы і культуры ад разбуральнага юру смаленскіх дзеячоў накшталт В. Кнорына.

У сярэдзіне лістапада 1918 г. А. Луцкевіч выехаў у Маскву. Паводле беларускага гісторыка І. Ігнаценкі, выезд адбыўся на запрашэньне савецкага ўраду, але перамовы засталіся незавершанымі — было толькі пастаноўлена, што яны працягнуцца ў Менску пасьля выхаду нямецкіх войскаў. Была дасягнутая дамоўленасьць, што ў Менску застануцца сацыял–дэмакратычныя чальцы прэзыдыюму Рады і ўраду БНР, зь якімі будуць завершаныя распачатыя ў Маскве перамовы. Інфармацыя пра гэта была зьмешчаная 8 сьнежня ў часопісе “Жизнь Национальностей” — органе сталінскага Народнага камісарыяту ў справах нацыянальнасьцяў разам з пазытыўнай ацэнкай А. Луцкевіча[34]. Ці то была пастка, падрыхтаваная савецкімі ўладамі для арышту буйных прадстаўнікоў Рады і ўраду БНР, ці то сапраўднае прызнаньне гэтых органаў партнэрамі для вырашэньня лёсу Беларусі?

Неўзабаве ўсё высьветлілася. 10 сьнежня 1918 г. немцы перадалі Менск савецкім уладам, якія, аднак, ані перад гэтым, ані ў найбліжэйшыя дні не абвесьцілі Беларускай ССР і не ўтварылі яе ўраду. Затое 8 сьнежня была абвешчаная Літоўская ССР, хаця Чырвоная Армія была яшчэ далёка ад Вільні. Што хавалася за гэтымі рашэньнямі? Ужо назаўтра пасьля ўваходу ў Менск савецкія ўлады пачалі арганізоўваць шматлікія сходы, на якіх жыхары беларускіх земляў “выказваліся” за далучэньне іх да Літвы[35]. Уся гэтая акцыя была інсьпіраваная Масквой і сьведчыла пра тое, што яе болей здавальняе ідэя Савецкай

[31] Кабінэт Р. Скірмунта пратрываў да 22 ліпеня 1918 г. На зьмену яму прыйшоў урад І. Серады. — *А.С.*

[32] Сидоревич А. Антон Луцкевич // Нёман. 1990. № 7.

[33] Кнорин В.Г. Избранные статьи и речи. Минск, 1990. С. 33.

[34] Чырвоная Змена. 1989. 22 чэрвеня; Запісы Беларускага Інстытуту Навукі і Мастацтва. Т. І. Мюнхэн. 1962. С. 160—165.

[35] Круталевич В.А. Рождение Белорусской Советской Республики. Минск, 1979. С. 121—122.

Літвы, якая ахапіла б заходнія абшары Беларусі, чым беларуская рэспубліка. У такім інтэрнацыянальным катле небясьпечнае беларускае пытаньне губляла б усялякае значэньне. Апрача таго, усходнія беларускія землі маглі б застацца ў межах Расеі.

Пры такіх абставінах прынятае ў канцы сьнежня рашэньне кіраўніцтва бальшавіцкай партыі аб стварэньні Беларускай Савецкай Рэспублікі патыхала сэнсацыяй. Чаму так раптоўна і крута яно зьмяніла свае пазыцыі? Справа ў тым, што пасьля нямецкага адступленьня ў Менску засталіся толькі некаторыя прадстаўнікі ўладаў БНР, а сам урад на чале з А. Луцкевічам перабраўся ў Горадню. Тут кіраўніцтва БНР распачало дыпляматычную кампанію пратэсту супраць бальшавіцкай акупацыі Беларусі, а паколькі БССР не была абвешчана і ня быў створаны яе ўрад, дык пратэсты гэтыя з гледзішча крытэраў міжнароднага права былі абгрунтаваныя.

Такой сытуацыі Ленін не хацеў і, мабыць, не прадбачыў. Таму памылку пачалі выпраўляць, і Сталін выканаў гэта ўласьцівымі яму мэтадамі. Літаральна за колькі дзён зрабілі неабходную падрыхтоўку: арганізавалі "волевыяўленьне народу", пераканалі кіраўнікоў Заходняй вобласьці, апрацавалі маніфэст і вызначылі склад ураду на чале з З. Жылуновічам. Цырымонія адбылася ў Смаленску, пасьля чаго 1 студзеня 1919 г. быў апублікаваны маніфэст[36], у якім абвяшчалася стварэньне незалежнай Савецкай Беларусі. Была прынятая і рэзалюцыя аб тэрыторыі рэспублікі, якая распасьціралася на Менскую, Гарадзенскую, Магілёўскую, Віцебскую і Смаленскую губэрні. Цяпер нястрашныя былі пратэсты БНР — сьвет мог пераканацца, што бальшавіцкая акупацыя Беларусі — ня больш як "выдумка нацыяналістычнай контрарэвалюцыі".

Прапагандысцкі характар гэтых захадаў выявіўся неўзабаве пасьля прыбыцьця З. Жылуновіча зь яго ўрадам з Смаленску ў Менск. Ужо 16 студзеня Цэнтральны Камітэт Расейскай Камуністычнай Партыі (бальшавікоў) з удзелам Леніна прыняў рэзалюцыю наконт адлучэньня ад БССР Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губэрняў і ўлучэньня іх у Расею. Дзьве засталыя губэрні — Менская і Гарадзенская — павінны былі злучыцца зь Літвой і ўтварыць новую адміністрацыйную структуру — Літоўска-Беларускую Савецкую Рэспубліку. Гэта азначала ліквідацыю самастойнай БССР.

Паўстае пытаньне, што вымусіла Леніна спачатку стварыць гэтую рэспубліку ды амаль адначасна яе зьліквідаваць? Справа ў тым, што, апрача вырашэньня замежнапалітычных задачаў, гэтыя захады давалі савецкім уладам і іншую выгаду. Цяпер, калі БССР ужо "існавала", можна было ажыцьцявіць ленінскі плян яе ліквідацыі рукамі "сувэрэнных" рэспубліканскіх органаў, ад імя вольнага беларускага народу. Ад імя гэтага народу зачыняліся беларускія школы, ліквідаваліся ўсе беларускія газэты і часопісы, выцясьнялася з грамадзкага ўжытку беларуская мова[37].

У такой атмасфэры засталыя ў Менску прадстаўнікі ўраду (Вацлаў Іваноўскі) і Рады БНР (Язэп Лёсік, Аляксандар Уласаў ды іншыя) у студзені 1919 г. распачалі перамовы зь Зьмітром Жылуновічам, тагачасным прэм'ерам ураду савецкай Беларусі. Пра гэтыя перамовы мала што вядома, але можна меркаваць, што ніводзін бок не разьлічваў на іх дадатны вынік. І адны, і другія, напэўна, пачуваліся падманутымі і расчараванымі палітыкай Леніна і смаленскіх інтэрнацыяналістаў, якія адно пад націскам Сталіна гатовыя былі прызнаць неабходнасьць стварэньня БССР, а цяпер зацята яе ліквідавалі[38]. З. Жы-

[36] Насамрэч Маніфэст Часовага работніча-сялянскага савецкага ўраду Беларусі быў падпісаны 2 студзеня 1919 г. і толькі пяцьцю сябрамі гэтага ўраду (гл.: 1 января 1919 года: Временное рабоче-крестьянское советское правительство Белоруссии: Документы и материалы. Минск: Лимариус. 2005. С. 114). — *А.С.*

[37] Варшавское Слово. 1920. 2 мая.

[38] "Смаленскія інтэрнацыяналісты" нечакана для Масквы выявіліся абаронцамі савецкай Беларусі і яе тэрытарыяльнай цэласнасьці. Разыходжаньне паміж імі і беларускімі бальшавікамі ляжала амаль выключна ў плашчыні нацыянальна-культурнай палітыкі. Спатрэбіўся прыезд у Менск Я. Сьвярдлова, каб прымусіць А. Мясьнікова і кампанію згадзіцца з рашэньнямі ЦК РКП(б). — *А.С.*

луновіч, са свайго боку, разам з групай беларускіх камуністаў супрацiўляўся гэтай палітыцы, імкнуўся захаваць самастойнасьць і тэрытарыяльную суцэльнасьць рэспублікі і дамагаўся, каб прадстаўнікоў найвышэйшых органаў БНР далучылі да ўраду Савецкай Беларусі, бо набліжаўся Першы Ўсебеларускі зьезд Саветаў (2—3 лютага 1919 г.), які павінен быў зацьвердзіць пэрсанальныя рашэньні.

Гэта прывяло да разгрому З. Жылуновіча і яго групы. Пазьней, у трыццатыя гады, гэтыя яго памкненьні трактавалі як змову з нацыяналістамі ды спробу правесьці іх у бальшавіцкае асяродзьдзе, апроч таго, З. Жылуновіча вінавацілі ў тым, што ён быў шпіёнам польскай выведкі і дзеяў, каб далучыць Беларусь да Польшчы[39].

Іваноўскі пакуль заставаўся ў Менску. Умовы для працы тут былі цяжкія, але не безнадзейныя. Новаўтвораны ўрад Беларуска–Літоўскай Савецкай Рэспублікі, у якім не было ніводнага беларуса[40], хоць, праўда, і змагаўся зь незалежніцкімі памкненьнямі, але прадугледжваў разьвіцьцё школьніцтва і кнігавыданьня на ўсіх мовах краю, у тым ліку — і на беларускай, плянаваў адкрыць у Менску ўнівэрсытэт. Пакуль жа гэтую ролю выконваў Пэдагагічны інстытут, перайменаваны цяпер у Пэдагагічны Інстытут Народнай Асьветы, які дзейнічаў да восені 1918 г.[41].

Такім чынам, пасьля кароткага перапынку В. Іваноўскі вярнуўся да працы ў інстытуце, апрача таго, як некалі ў Пецярбургу і Вільні, заняўся выданьнем школьных падручнікаў і мастацкай літаратуры. На гэты раз ён працаваў у выдавецкім аддзеле менскага Губэрнскага Камісарыяту Асьветы як сябра рэдакцыйнай калегіі[42]. Незадоўга да ўваходу ў Вільню польскіх войскаў (21 красавіка 1919 г.) былі выдадзеныя два падручнікі і чатыры драматычныя творы[43]. Іваноўскі ў тую пару часта выяжджаў у Вільню, дзе друкаваліся падрыхтаваныя ў Менску кнігі. 31 сакавіка ён стаў сябрам віленскага Беларускага Навуковага Таварыства, а таксама завяршыў працу над першым унівэрсытэцкім падручнікам неарганічнай хіміі на беларускай мове[44].

Аднак пэдагагічная і выдавецкая дзейнасьць Вацлава Іваноўскага ўва ўмовах Літбелу доўжылася вельмі нядоўга. 15 траўня 1919 г. ён быў арыштаваны і перавезены ў смаленскую турму. З адседкі Іваноўскага ў турме ў памяці яго сям'і захавалася паняцьце "главхвост". Яно азначала рыбу, якой кармілі вязьняў, і складалася з галавы і хваста — рэшту зьядала начальства.

У верасьні 1919 г. Вацлава Іваноўскага вызвалілі з турмы ў рамках дамовы з польскім урадам аб абмене арыштаваных палітычных дзеячоў і накіравалі ў Варшаву, дзе яго брат Юры быў міністрам працы і сацыяльнага забесьпячэньня ўва ўрадзе Падэрэўскага[45]. Тут ён мог лёгка атайбавацца і далей дзеяць у беларускім руху — бо ў Варшаве тады існавала ўзначаленае Лявонам Дубейкаўскім прадстаўніцтва Беларускай Народнай Рэспублікі, субсыдыяванае міністэрствам Юр'я[46]. Вацлаў, аднак, не скарыстаў з гэтай магчымасьці і

---

[39] Цанава Л. Всенародная партизанская борьба в Белоруссии против фашистских захватчиков. Т. II. Минск, 1951. С. 780—784.

[40] У склад ураду ССРЛіБ уваходзіў беларус І. Савіцкі; акрамя таго, невядомая нацыянальная прыналежнасьць І. Пузырова. — *А.С.*

[41] Ігнатоўскі У. Вялікі Кастрычнік на Беларусі // Беларусь. Нарысы гісторыі, экономікі, культурнага і рэволюцыйнага руху. Менск, 1924. С. 207.

[42] Звезда. 1919. 16 мая.

[43] Гэта былі кн.: "Родны край" Л. Чарняўскай, "Наша крыніца" Я. Лёсіка, "Раскіданае гняздо" Я. Купалы, "Апошняе спатканьне" У. Галубка, а таксама "Страхі жыцьця" і "Калісь" Ф. Аляхновіча.

[44] Гадавік Беларускага Навуковага Таварыства. Т. I. Вільня, 1933; Гарэцкі М. Гісторыя беларускай літаратуры... С. 205.

[45] Звон. 1919. 25 жніўня; Politechnika Warszawska 1915—1925. Księga pamiątkowa pod red. prof. Leona Staniewicza. Warszawa, 1925. S. 430—432.

[46] Вітан К. Тамсама. С. 10.

ў канцы 1919 г. вярнуўся ў Менск, верачы, што зробіць канкрэтны ўнёсак у пабудову Беларусі.

Тут ён засьпеў новую палітычную сытуацыю. 8 верасьня 1919 г., калі яшчэ Іваноўскі сядзеў у смаленскай турме, польскія войскі занялі Менск. Зноў загучэлі абяцанкі аб свабодзе, роўнасьці і братэрстве. Шырока распаўсюджвалася віленская адозва Пілсудзкага "Да насельніцтва былога Вялікага Княства Літоўскага", якая абяцала свабоднае вырашэньне ім нацыянальных і рэлігійных пытаньняў. Ён запэўніваў, што Польшча і Беларусь будуць будаваць стасункі, "як роўны з роўным". Неўзабаве пасьля ўваходу ў Менск польскія вайсковыя ўлады выдалі дазвол на стварэньне Часовага Беларускага Нацыянальнага Камітэту пад кіраўніцтвам правага эсэра Кузьмы Цярэшчанкі ды на выданьне газэты "Звон". Газэта друкавалася на польскія грошы[47], няма дзіва, што "адлюстроўвала" яна такія настроі насельніцтва, якія хацела бачыць новая ўлада[48].

18 верасьня ў Менск прыбыў Ю. Пілсудзкі, які падчас сустрэчы з прадстаўнікамі насельніцтва Меншчыны запэўніў, "што зямлі гэтай нічога не навяжуць сілком, што зямля гэтая вольны і свабодны свой голас сярод іншых земляў падыме, што зямля гэтая сама вырашыць, як ёй жыць, якім правам кіравацца "... "Вас, мае панове, — казаў Пілсудзкі, — найбліжэйшым часам паклічуць да таго, каб перш за ўсё вы самі пачалі кіраваць у органах самакіраваньня. Потым настане тая часіна, калі вы зможаце свабодна сказаць, як будаваць *вашу дзяржаву* (вылучана аўтарам. — *Ю.Т.*)"[49].

Гэтыя і ранейшыя запэўніваньні Пілсудзкага выклікалі сярод многіх беларускіх дзеячоў сапраўдную эўфарыю. Яна пасьля сумнага досьведу з бальшавікамі цешылі сябе ілюзіяй, што незалежнасьць сваёй краіны можна атрымаць з рук Польшчы. У склад дэлегацыі ад камітэту К. Цярэшчанкі на спатканьне зь Ю. Пілсудзкім у будынку Шляхецкага Сходу згадзіліся ўвайсьці нават эсэры, найменш прыхільныя да палітычнага супрацоўніцтва з Польшчай. Ад імя гэтай дэлегацыі выступіў Аляксандар Прушынскі, зьвяртаючыся да Пілсудзкага:

> Вітаю вас ад імя нашых беларускіх дэлегацыяў, прадстаўляючых тутака беларускае насяленьне, выслаўляю гарачую падзяку за звальненьне Менску й Меншчыны ад новага цяжкага нападу маскоўскага імпэрыялізму, які на гэты раз прыбраўся ў бальшавіцкую вопратку. Але плачуць яшчэ маткі ў Віцебску, стогнуць людзі ў Магілёве, маўчыць, бо забаронены, хаўтурны голас зьмшэлых званіцаў Смаленску.
>
> Мы верым і спадзяемся, што, разам з вольнымі Менскам, Вільняй і сівой Гародняй, вольнымі й шчасьлівымі будуць у вольнай і незалежнай Беларускай рэспубліцы нашыя адвечныя астрогі на рубяжох Масквы — Віцебск, Магілёў і стары Смаленск. Гэтага мы спадзяемся, у гэта мы верым, а гэтымі верай і надзеяй абдараваў нас братні народ, якога слаўнаму прадстаўніку гатовы мы сказаць на Меншчыне ня толькі наша сягоньняшняе "дзякуй", але й заўсёды: "Здароў будзь, прыходзь да нас, наш госьцю мілы, суседзе дарагі!"[50].

Аднак Пілсудзкі не сьпяшаўся рэалізоўваць сваіх намераў, а Вацлаў, кіруючыся прышчэпленым у сям'і рацыяналізмам, ня верыў, што незалежнасьць можна атрымаць задарма. Таму ён ня цешыў сябе ілюзіяй, асабліва назіраючы выдаленьне зь мясцовай адміністрацыі беларусаў як бальшавікоў і абсаджваньне яе палякамі, а таксама ўстанаўленьне

[47] Відаць, польскія ўлады кепска фінансавалі газэту, бо рэдакцыя зьвярталася з просьбаю пра грашовую субсыдыю да ўраду БНР. Гл.: Архівы БНР. Т. I. Кн. 1. С. 481; Купала Я. Поўны збор твораў. Т. 9. Кн. 1. С. 523. — *А.С.*

[48] Krótki zarys zagadnienia białoruskiego, opr. Sztab Generalny — Oddział II. Warszawa, 1928. S. 84; Ігнатоўскі У. Тамсама. С. 207—209.

[49] Piłsudski J. Pisma–Mowy–Rozkazy. T. IV. Warszawa, 1933. S. 94—96.

[50] Krótki zarys... S. 85.

над усім акупаваным прасьцягам Цывільнай управы ўсходніх земляў. Перш за ўсё ён імкнуўся выратаваць Пэдагагічны інстытут, будынак якога, мэблю і лябараторыю забрала армія, і чакаў разьвіцьця падзеяў[51].

Затое гэтага не чакала Масква. Наступ польскіх войскаў — гэта, канечне, пагроза, але яшчэ горшая пагроза — фэдэралісцкія намінкі Пілсудзкага, якія знайшлі дадатны водгук сярод пераважнай часткі беларускіх дзеячоў, расчараваных палітыкай савецкіх уладаў. Гэтыя ўлады разумелі, што ўдалае ажыцьцяўленьне польскай канцэпцыі аднаўленьня гістарычнай фэдэрацыі зь Літвою і Беларусьсю паспрыяла б далучэньню да яе Украіны і прывяло б да ўтварэньня пад эгідай Польшчы вялікай канфэдэрацыі народаў Цэнтральна–Ўсходняй Эўропы, здольнай процістаяць расейскаму і нямецкаму імпэрыялізму. Такая пэрспэктыва супярэчыла інтарэсам Расеі, таму яна адразу ж перайшла да контрагульні.

З гэтай мэтай 17 ліпеня 1919 г. лінію польска–савецкага фронту перайшоў Юліян Мархлеўскі, якога Ленін упаўнаважыў весьці мірныя перамовы. Ня могучы спыніць польскі наступ сілай, Масква загадзя рыхтавалася купіць мір цаною тэрыторыі Літоўска–Беларускай Рэспублікі. Яе зьліквідавалі акурат таму, што адыход у нябыт гэтай "сувэрэннай дзяржавы" дазваляў савецкім уладам гандляваць яе землямі як абшарамі зь неакрэсьленым дзяржаўна–юрыдычным статусам. Ужо пад канец ліпеня, падчас перамоваў у Белавежы, Ю. Мархлеўскі заявіў: "Ленін выразна сказаў: калі палякі хочуць правесьці ў Літве і Беларусі плебісцыт, мы ня будзем мяшацца ў тое, як ён будзе праведзены, мы ня будзем таксама мяшацца ў долю Беларусі"[52]. Гэта была ня нейкая адзінкавая тактычная ініцыятыва. Паводле сьведчаньняў удзельнікаў гэтых перамоваў, увосень 1919 г. Ю. Мархлеўскі надалей паведамляў польскі бок пра незацікаўленасьць Леніна Беларусяй, пра тое, што Польшча атрымае такія тэрыторыі, якія сама пажадае, і, нарэшце, прапанаваў ленінскае мірнае пагадненьне зь вечнай мяжой на Дзьвіне, Уле і Бярэзіне[53]. Для Іваноўскага гэта быў страшэнны ўдар, які нявечыў усю яго дагэтулешнюю палітычную філязофію. Пазыцыя Леніна азначала падзел Беларусі, а гэта перакрэсьлівала пэрспэктыву пабудовы дзяржавы на ўсім этнічным абшары. Для Беларусі гэта быў сьмяротны прысуд, якога ў вачах Іваноўскага не апраўдвала ленінская тактыка абароны Расеі і рэвалюцыі. Бо ніводная з разьдзертых частак краіны з эканамічнага, дэмаграфічнага і нацыянальнага гледзішча не магла стаць суб'ектам фэдэрацыі з Расеяй ці з Польшчай, нават калі б гэтая апошняя была "за". Кожнай зь іх у пэрспэктыве давялося б асыміляваццa і расплыцца ў абдымках мацнейшых суседзяў. Таму захаваньне суцэльнасьці і непадзельнасьці краіны было найважнейшым пытаньнем, зыходным пунктам усёй беларускай палітыкі.

Тым часам Пілсудзкі затрымаў свае войскі на Бярэзіне і не сьпяшаўся ўкласьці мірнае пагадненьне на ўмовах, што прапаноўваў Ленін. Тэарэтычна магчымасьць авалодаць усёй Беларусяй да межаў Рэчы Паспалітай 1772 г. не была яшчэ цалкам выключана, і тады магчымая фэдэрацыя выглядала б больш рэалістычна. Таму Масква, праводзячы мірныя перамовы з Польшчай, якія давалі магчымасьць расправіцца з айчыннай контрарэвалюцыяй, адначасова рабіла ўсё, каб перакрэсьліць польска–беларускае паразуменьне.

Гэтаму асабліва спрыялі кантрыбуцыі і рабункі, што чыніліся польскімі войскамі над мясцовым насельніцтвам, вяртаньне памешчыкам сканфіскаваных маёнткаў і эгаістычная дзейнасьць польскай адміністрацыі ў галіне нацыянальнай палітыкі[54]. Гэта дыскрэдытавала афіцыйныя дэклярацыі і выклікала незадаволенасьць і супраціў насельніцтва. Важную ролю адыгралі ў гэтым беларускія эсэры, якія ўвосені 1919 г. уклалі з савецкімі ўладамі ў Смаленску дамову аб супрацоўніцтве, на падставе якой атрымлівалі

[51] Мэмарыял В. Іваноўскага ад 16 сакавіка 1920. Архіў Новых актаў (АНА). Акты Л. Васілеўскага. Справа 45. С. 125.

[52] Kowalski M. A. (oprac) Rok 1919 // Przegląd Tygodniowy. 26.04.1987.

[53] Тамсама. 03.05.1987.

[54] Мэмарыял В. Іваноўскага ад 16 сакавіка 1920.

матэрыяльную падтрымку і разгарнулі антыпольскую агітацыю і партызанскую барацьбу[55]. У адказ гэта выклікала рэпрэсіі з польскага боку. Паводле ацэнкі II аддзелу Генэральнага штабу Войска Польскага, "... першапачатковы энтузіязм [насельніцтва] згасаў, пераходзіў у незадаволенасьць, якая нарэшце перарадзілася ў нянавісьць да ўсяго польскага"[56]. Запушчанае кола прычынаў і наступстваў круцілася ўсё барджэй, і нішто не паказвала на магчымасьць яго спыніць.

На падставе стаўленьня да Польшчы 13 сьнежня 1919 г. здарыўся раскол у Радзе БНР. Адна яе частка, дзе пераважалі эсэры, прызнала немагчымым супрацоўніцтва з Польшчай і пасьля кароткатэрміновага арышту перабралася ў Коўну[57]. Другая ж частка Рады не пераставала верыць у магчымасьць паразуменьня з Польшчай[58] і ўтварыла г.зв. Найвышэйшую Раду[59], якая, хоць і не прызнаная польскімі ўладамі, засталася ў Менску. Такім чынам, сярод беларускіх дзеячоў паўстала канфліктная сытуацыя, расьлі ўзаемныя абвінавачаньні і нараканьні ў згодніцтве перад Польшчай ці Літвой, што ўрэшце канчаткова спаралізавала і без таго невялікія сілы і дэвальвавала іх вагу ў вачох польскага ўраду.

В. Іваноўскі ня быў сябрам Рады БНР, а пасьля расколу не ўваходзіў у склад Найвышэйшай Рады, за што часам яго асуджалі. Таму яму не давялося ўдзельнічаць у палітычных спрэчках, засяроджваючы пакуль што ўсю ўвагу на разьвіцьці арганічнай працы, якая прыносіла адчувальную карысьць беларускай справе незалежна ад яе партыйнай афарбоўкі і прымалася ўсімі дзеячамі. Асноўным абсягам яго дзейнасьці быў Пэдагагічны інстытут і Часовы Беларускі Нацыянальны Камітэт, вакол якога гуртаваліся прадстаўнікі ўсіх палітычных партыяў, настаўнікі, літаратары, артысты, гаспадарчыя дзеячы ды іншыя.

Асаблівую ўвагу ён зьвяртаў на арганізацыю школьніцтва. У першую чаргу, пераадольваючы вялікія фінансавыя, кадравыя цяжкасьці, а таксама праблемы з памяшканьнямі, ён паставіў на ногі Беларускі пэдагагічны інстытут у Менску, рэктарам якога ён быў. Ён пашырыў склад выкладчыкаў, прыцягваючы да супрацы выдатных мовазнаўцаў — Я. Карскага і Б. Тарашкевіча, гісторыка Ігнатоўскага і іншых.

Інстытут заклаў падмурак для арганізацыі пачатковага і сярэдняга школьніцтва, настаўніцкіх курсаў, а таксама для створанай у жніўні 1919 г. Беларускай Цэнтральнай Школьнай Рады, якая праз сваіх інструктараў ажыцьцяўляла нагляд за разьвіцьцём школьнай справы ў правінцыі. У рамках Рады быў арганізаваны выдавецкі аддзел, які адразу ж распачаў выданьне школьных падручнікаў і мастацкай літаратуры. Пра вынікі гэтай працы сьведчаць факты: калі на пачатку 1919/1920 навучальнага году ў Менскай акрузе было ўсяго толькі 8 беларускіх пачатковых школаў, дык пад канец таго году іх колькасьць павялічылася да 233, апрача таго былі створаныя дзьве гімназіі — у Менску і Слуцку[60]. Агульная колькасьць вучняў гэтых школаў дасягнула 12947[61]. У Менску паў-

[55] Krótki zarys... S. 89.

[56] Тамсама. С. 89.

[57] Гісторыя ўзьнікненьня дзьвюх Радаў БНР значна складанейшая. Тут жа трэба зацеміць, што: 1) арыштаваная была ня ўся Народная Рада (старшыня П. Крачэўскі), а некаторыя яе дзеячы; 2) першапачаткова Народная Рада знайшла прытулак у Рызе, а ў лістападзе 1920 г. пераехала ў Коўну. — *А.С.*

[58] Гэтага нельга сказаць пра ўсю Раду БНР (так называлася тая яе частка, якая засталася без эсэраў і сацыялістаў–фэдэралістаў). Відавочна было адно: калі Польшча прызнае незалежнасьць БНР, яе прызнае і Антанта. Што ж датычыць дзеячоў Народнай Рады, дык яны пайшлі па сьцежцы, пратаптанай А. Луцкевічам увосень 1918 г. Тады ён вёў перамовы з бальшавіцкім дзеячом Х. Ракоўскім і пераканаўся, што бальшавікі не прызнаюць незалежнасьці Беларусі. Што і пацьвердзілі падзеі 1920 г. — *А.С.*

[59] У сувязі з тым, што Рада БНР на чале зь Я. Лёсікам не магла ва ўмовах савецка–польскай вайны апэратыўна зьбірацца на свае паседжаньні, яна вылучыла са свайго складу пяціасабовую Найвышэйшую Раду на чале з І. Серадой, якой перадала большую частку сваіх паўнамоцтваў. — *А.С.*

[60] Слуцкая беларуская гімназія была заснаваная ў ліпені 1917 г., а Менская — 15 верасьня 1919 г. — *А.С.*

[61] Публічная Бібліятэка ў Варшаве, рукапісны аддз., Akta ZCZW, akc. 1686. Агульная справаздача камісарыяту м. Менску.

стаў сталы беларускі тэатар пад кіраўніцтвам выдатнага драматурга Францішка Аляховіча[62] і хор пад кіраўніцтвам Уладзімера Тэраўскага, а ў правінцыі — шматлікія мастацкія калектывы і культурна–асьветніцкія гурткі[63].

В. Іваноўскі выяўляў нязьменны клопат і вынаходлівасьць у выбіваньні субсыдыяў ад польскіх уладаў на школьніцтва, выдавецкую і культурную дзейнасьць. Дзеля гэтага ён выкарыстоўваў асабістае знаёмства з начальнікам Менскай акругі Уладзіславам Рачкевічам. У траўні 1920 г. Івяноўскі распачаў выданьне літаратурнага тыднёвіка "Рунь", запрасіўшы на пасаду рэдактара свайго даўняга супрацоўніка — Івана Луцэвіча (Я. Купалу). Супольна з К. Цярэшчанкам — шэфам Часовага БНК — ён працаваў над арганізацыяй Беларускага Цэнтральнага Каапэратыўнага Саюзу, які ў сярэдзіне 1920 г. валодаў ужо сеткай з 350 каапэратываў на Меншчыне і ў суседніх раёнах Віленшчыны[64].

Гэта былі значныя дасягненьні, якія ў галіне асьветы і культуры перавышалі беларускія заваёвы на Меншчыне падчас нямецкай акупацыі. На перасвараных міжсобку дзеячоў, здольных часьцей за ўсё толькі выстаўляць палітычныя лёзунгі, гэта рабіла вялікае ўражаньне, і В. Іваноўскі як іх *spiritus movens* вырастаў да ролі вядучага дзеяча. Таму, як паведамляў 5 лютага 1920 г. шэф палітычнага аддзелу камандаваньня літоўска–беларускага фронту Мар'ян Касьцялкоўскі, усе беларускія палітычныя партыі, з Найвышэйшай Радай улучна, "канчаткова" перадалі В. Іваноўскаму мандат на перамовы з польскімі ўладамі і такім чынам узалежнілі свае стасункі з Польшчай ад яго палітыкі[65]. Гэта быў ня проста выраз усеагульнага прызнаньня, але і неабмежаваны палітычны крэдыт, выдадзены Іваноўскаму. Напэўна, гэтая акалічнасьць прывяла ў канцы лютага да адстаўкі А. Луцкевіча і яго вяртаньня ў Вільню[66]. Ува ўзаемадачыненьнях паміж імі зноў запанавала непрыязнасьць[67].

З гэтага часу В. Іваноўскі выступае як афіцыйны прадстаўнік Беларусі. У першыя дні лютага 1920 г. ён спаткаўся зь Ю. Пілсудзкім у Вільні, там, паводле лякацічнага паведамленьня ў друку, абмяркоўваў шмат якія важныя для Беларусі справы, між іншым, праблемы арганізацыі войска[68]. Але пра што гаварылі два спадары ня "між іншым", што было асноўнай мэтай іх сустрэчы? Вось жа, Ю. Пілсудзкі, які яшчэ 1 лютага дазволіў сабе сказаць, што ён праціўнік саступкам беларускай фікцыі, цягам сустрэчы з В. Іва-

[62] Першы свой тэатар Ф. Аляхновіч стварыў у Менску ў 1918 г. Не спрацаваўшыся з бальшавікамі, увесну 1919 г. ён вярнуўся ў Вільню. Увосень 1919 г. ён зноў прыехаў у Менск і заснаваў Беларускі народны тэатар. Адначасова зь ім у 1918 і 1919—1920 гг. у Менску працаваў тэатар Першага таварыства беларускай драмы і камэдыі пад кіраўніцтвам Ф. Ждановіча, якому быў нададзены статус Беларускага дзяржаўнага тэатру і ў склад якога ўваходзіў хор У. Тэраўскага. Гл.: Архівы БНР. Т. І. Кн. 1. С. 189; Аляхновіч Ф. Выбраныя творы. Менск: Беларускі кнігазбор, 2005. С. 11—12. — *А.С.*

[63] Турук Ф. Тамсама. С. 62.

[64] Тамсама.

[65] Публічная Бібліятэка ў Варшаве, рукапісны аддз., Akta ZCZW, akc. 1687. Raport polityczny Kościałkowskiego z 05.02.1920.

[66] Сидоревич А. Тамсама. С. 132. — *Ю.Т.*

А. Луцкевіч падаў у адстаўку ў сувязі з тым, што ён быў практычна інтэрнаваны польскаю ўладаю ў Варшаве і ня мог выконваць функцыі кіраўніка ўраду БНР. Гл.: Архівы БНР. Т. І. Кн. 1. С. 688, 693, 694. — *А.С.*

[67] А. Луцкевіча найбольш турбавала пытаньне, цаною якіх саступак В. Іваноўскаму, А. Смолічу ды іншым дзеячам Найвышэйшай Рады ўдалося пасьля ягонай адстаўкі дамагчыся ад палякаў субсыдыяў на беларускую адукацыю, культуру і г.д. (гл.: Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. С. 209). А тое, што Ю. Пілсудзкі прыняў В. Іваноўскага праз месяц пасьля студзеньскай (1920) сустрэчы з А. Луцкевічам, можа сьведчыць, што польскі ўрад прадумваў замену А. Луцкевічу, які неўзабаве быў інтэрнаваны і мусіў прасіць пра адстаўку. Вартае ўвагі і тое, што міністар замежных справаў Польшчы С. Патэк прызначыў Л. Васілеўскага старшынём камісіі для распрацоўкі праекту ўрэгуляваньня польска–беларускіх дачыненьняў і правядзеньня перамоваў з прадстаўнікамі Беларусі назаўтра пасьля адстаўкі А. Луцкевіча. — *А.С.*

[68] Беларусь. 1920. 12 лютага.

ноўскім пагадзіўся на правядзеньне афіцыйнай польска–беларускай канфэрэнцыі для абмеркаваня палітычных ды іншых праблемаў. Аднак падрыхтоўку канфэрэнцыі ён даручыў не начальніку Цэнтральнай управы Усходніх Земляў Ежаму Асмалоўскаму, а міністру замежных справаў Станіславу Патэку, што мела асаблівае значэньне. 1 сакавіка Патэк прызначыў Леана Васілеўскага старшынём камісіі для распрацоўкі праекту ўрэгуляваньня польска–беларускіх дачыненьняў і правядзеньня перамоваў з прадстаўнікамі Беларусі[69].

Да перамоваў рыхтаваўся і Вацлаў Іваноўскі. Ён разьлічваў атрымаць ад польскага ўраду субсыдыі для разьвіцьця школьніцтва, прэсы, выдавецкай дзейнасьці, дабіцца раўнапраўя беларускай і польскай моваў, абмежаваньня свавольстваў польскай арміі і адміністрацыі і г.д. Усе вымогі ў гэтых сфэрах ён выклаў у "Мэмарыяле ў беларускай справе" і 16 сакавіка ўручыў яго Л. Васілеўскаму ў Варшаве. Але найважнейшай мэтай, пададзенай у першым пункце мэмарыялу, было прадухіленьне прапанаванага Леніным падзелу Беларусі. Зважаючы на стабілізацыю фронту на Бярэзіне, В. Іваноўскі бачыў такую магчымасьць у тым, каб падчас мірных перамоваў прымусіць Расею адмовіцца ад земляў, што ляжалі на захад ад мяжы Рэчы Паспалітай 1772 г. Такім чынам, уся Беларусь апынулася б у палітычнай арбіце Польшчы. Адсюль вынікаў наступны яго пастулят, які прадугледжваў забавязаць Польшчу вырашыць долю Беларусі згодна з воляй яе народу.

Праз два дні, 18 сакавіка, Л. Васілеўскі выехаў у Менск. Выехаў, як пісаў пазьней у справаздачы для ўраду, "з усьведамленьнем усёй цяжкасьці задачы. Бо гаворка ішла аб тым, каб знайсьці з боку беларусаў падтрымку для пазыцыі Польшчы ў перамовах з бальшавікамі пры адначасовым адхіленьні вымогаў, прызнаных імі мінімальнымі"[70].

Відаць, Л. Васілеўскі імкнуўся такім чынам адцягнуць увагу ўраду ад таго, што праект гэтай дэкларацыі ўжо быў прыведзены В. Іваноўскім, і таму не было патрэбы дабівацца яе. У польскіх урадовых колах часта адмоўна ставіліся да рызыкоўных фэдэралістычных праектаў і аддавалі перавагу такім набыткам на ўсходзе, якія былі прыдатныя для нацыянальнай асыміляцыі. З гэтага гледзішча нават прапанова Леніна была для Польшчы недарэчная. А дамаганьне аднаўленьня мяжы 1772 г. недвухзначна паказвала на пэрспэктыву фэдэралісцкага рашэньня, у якім беларусы былі зацікаўленыя больш за палякаў. Таму ня выключана, што гэтая канцэпцыя абмяркоўвалася зь Ю. Пілсудзкім у Вільні і знайшла ў яго падтрымку.

На канфэрэнцыі, якая адбылася 20—24 сакавіка 1920 г. у Менску, В. Іваноўскі і Л. Васілеўскі сядзелі насупраць адзін аднаго. Шаснаццаць год таму абодва супрацоўнічалі пры выданьні першых беларускіх кніжак у Кракаве, а цяпер як кіраўнікі дэлегацыяў Беларусі і Польшчы вызначалі шляхі суіснаваньня двух суседніх народаў[71]. Магчыма, гэтая акалічнасьць і мела пэўнае значэньне для выніку перамоваў. Праўда, беларускі бок атрымаў меней грошай, чым хацелася, але здабытыя тады субсыдыі дазвалялі разгарнуць беларускую справу на Меншчыне зь небывалым дасюль размахам. Але праўда і тое, што польскі бок фармальна не прыняў ніякіх абавязкаў адносна беларускай дзяржаўнасьці, аднак выказаў гатоўнасьць да злучэньня беларускіх земляў у адну цэласьць, што ў выпадку пасьпяховых мірных перамоваў стварала рэальную пэрспэктыву для польска–беларускай фэдэрацыі.

Але ў ідэі польска–беларускага супрацоўніцтва з абодвух бакоў было шмат праціўнікаў. Яна была новай, а таму малазразумелай зьявай. Пераважная большасьць памешчыкаў на

---

[69] Sprawozdanie L. Wasilewskiego z rokowań z przedstawicielami Białorusi w marcu 1920 r. // Dokumenty i materiały do historii stosunków polsko–radzieckich. T. II. Warszawa, 1961. S. 687.

[70] Тамсама.

[71] Поўны склад польскай дэлегацыі: Л. Васілеўскі, У. Рачкевіч, С. Ваявудзкі, ртм. Стаміроўскі; беларускай дэлегацыі: В. Іваноўскі, Я. Лёсік, кс. Ф. Абрантовіч, А. Смоліч, А. Уласаў, С. Рак–Міхайлоўскі, К. Цярэшчанка, І. Серада. Гл. тамсама.

Беларусі жадала не фэдэрацыі, а інкарпарацыі ў Польшчу, часам пагаджалася з магчымасьцю пайсьці на пэўныя саступкі беларусам у галіне культуры, аднак абуралася спробам трактаваць іх як палітычных партнэраў. Гучэла меркаваньне, што польскія ўлады за польскія грошы мацуюць беларускі нацыянальны патэнцыял на Меншчыне, які часта абарочваўся супраць Польшчы[72]. Супраць гэтай ідэі паўставала і прапаганда беларускіх эсэраў, якія, ня раз выкарыстоўваючы скандальныя і нягодныя паводзіны польскай арміі і адміністрацыі і кідаючыся лёзунгамі краёвай незалежнасьці, абвінавачвалі прыхільнікаў такога супрацоўніцтва ў згодніцтве перад Польшчай і здрадзе нацыянальным інтарэсам.

Аднак да мірных перамоваў і дыскусіяў над désintéressement (ступені незацікаўленасьці) Расеі ў землях, якія распасьціраліся на захад ад даўняй мяжы Рэчы Паспалітай, не дайшло. Улетку 1920 г. Чырвоная Армія перайшла ў наступ і выціснула польскія войскі зь Беларусі. 12 ліпеня было ўкладзенае савецка–літоўскае пагадненьне, паводле якога Вільня і беларуская частка Віленшчыны адышлі да Літвы, а 30 ліпеня зноў была абвешчаная Беларуская ССР у складзе толькі 18 паветаў[73]. Калі ў сярэдзіне жніўня Чырвоная Армія была разьбітая пад Варшавай, польскія войскі зноў рушылі на ўсход і неўзабаве занялі 12 паветаў новаўтворанай БССР. Пасунуцца далей яны не захацелі. Такім чынам, на савецкім баку засталася мікраскапічная рэспубліка, якая складалася з 6 паветаў Меншчыны[74]. Нарэшце пачаліся мірныя перамовы.

У гэтай сытуацыі адбылася падзея, якая вымоўна адлюстравала стаўленьне Леніна да беларускага пытаньня. Ужо ва ўступнай фазе перамоваў у Рызе кіраўнік савецкай дэлегацыі Адольф Іофэ быў схільны аддаць Беларусь пад уплыў Польшчы наўзамен за прызнаньне ёю Савецкай Украіны[75]. Пазыцыя Іофэ фактычна азначала адмову ад засталых на савецкім баку рэштак БССР (Меншчыны) і жаданьне пазбыцца такім чынам беларускага пытаньня.

Такая пэрспэктыва абуджала надзеі сярод польскіх і беларускіх фэдэралістаў. Яны разумелі, што ў новай сытуацыі канцэпцыя здабыцьця прыдняпроўскіх абшараў і стварэньня шырокамаштабнай польска–беларускай фэдэрацыі ўжо нерэальная. Затое яны разьлічвалі на адраджэньне Вялікага Княства Літоўскага ў выглядзе г.зв. Сярэдняй Літвы, падзеленай у адпаведнасьці з нацыянальнай структурай насельніцтва на тры кантоны: Віленскі (польскі), Менскі (беларускі) і Ковенскі (літоўскі) з супольным краёвым соймам у Вільні. У аддаленай пэрспэктыве прадугледжвалася аб'яднаньне гэтай дзяржавы з Польшчай на прынцыпах фэдэрацыі альбо аднаўленьне колішняй Рэчы Паспалітай[76].

Ажыцьцяўленьнем гэтай канцэпцыі заняўся, зь ціхага даручэньня Ю. Пілсудзкага, генэрал Люцыян Жалігоўскі. 8 кастрычніка 1920 г. ён рушыў на чале літоўска–беларускай дывізіі на Вільню і ўжо назаўтра заняў гэты горад. 12 кастрычніка ён абвясьціў стварэньне новай дзяржавы — Сярэдняй Літвы — і стварыў яе ўрад — г.зв. Часовую Кіруючую Камісію. У той самы дзень Л. Жалігоўскі даручыў вядомаму віленскаму дзеячу Вітальду Абрамовічу выкананьне абавязкаў старшыні гэтай камісіі, дырэктарам дэпартамэнту замежных справаў прызначыў Юр'я Іваноўскага, а дырэктарам дэпартамэнту забесьпячэньня — Вацлава Іваноўскага. На працягу некалькіх першых тыдняў Вацлаў кіраваў яшчэ і дэпартамэнтам сельскай і лясной гаспадаркі, а таксама — асьветы, і таму пастараўся, каб прызначыць Браніслава Тарашкевіча кіраўніком аддзелу беларус-

[72] Raport Tupalskiego A. Ruch narodowy białoruski w dobie przedwojennej i podczas wojny. AAN, TSK, syg. 99. S. 9—10.

[73] Круталевич. В.А. Административно–территориальное устройство БССР. Минск, 1966. С. 38.

[74] Пасьля падпісаньня Рыскага трактату ў складзе БССР засталіся толькі Бабруйскі павет Менскае губэрні, часткі Вялейскага павету Віленскае губэрні, а таксама Барысаўскага, Ігуменскага, Мазырскага, Менскага і Слуцкага паветаў Менскай губэрні. — *А.С.*

[75] Dąbski J. Pokój Ryski. Warszawa, 1931. S. 78.

[76] Pobóg–Malinowski W. Najnowsza historia polityczna Polski. T. II. Londyn, 1967. S. 572.

кага школьніцтва ў гэтым дэпартамэнце. Трэці брат, Станіслаў Іваноўскі, стаў начальнікам аддзелу вайсковай мабілізацыі ў дэпартамэнце ўнутраных справаў Камісіі.

Удзел трох братоў Іваноўскіх ва ўрадзе Сярэдняй Літвы стаў у віленскім асяродзьдзі тэмай для разнастайных камэнтароў. Гэтак жа, як некалі пра пецярбурскую выдавецкую суполку "Загляне сонца і ў наша аконца", пра гэты ўрад гаварылі, як пра асабісты "бізнэс-інтарэс братоў Іваноўскіх", а ў сям'і сьцьвярджалі, што так сталася на зычэньне Ю. Пілсудзкага, якому вельмі падабалася польска–беларуская арыентацыя адной сям'і, якая сымбалізавала нацыянальны расклад гістарычнай Літвы. Для поўнага збору не хапала толькі чацьвёртага брата — Тадэвуша, але той быў у Коўне.

Можна дапусьціць, што, ідучы на супрацоўніцтва з Л. Жалігоўскім, Вацлаў разьлічваў перш за ўсё на далучэньне Меншчыны да Сярэдняй Літвы як аднаго з трох заплянаваных кантонаў. Разьлічваў ён і на разьвіцьцё эканамічнай ды культурнай дзейнасьці на беларускіх землях Віленскага кантону. Незалежна ад асабістых перакананьняў, ён атрымаў новы грамадзкі мандат: 10 кастрычніка ў віленскім Беларускім Нацыянальным Камітэце адбылася нарада вядучых дзеячоў, якая ўпаўнаважыла В. Іваноўскага на ўдзел ва ўрадзе Сярэдняй Літвы[77].

Аднак за колькі дзён віленская "Gazeta Krajowa" апублікавала наступную ананімную інфармацыю:

> Для Камітэту было неспадзяванкай, што яны (В. Іваноўскі і Б. Тарашкевіч. — *Ю.Т.*) зоймуць урадавыя пасады, паколькі камітэт на гэта іх не ўпаўнаважыў. Сп. Іваноўскі і Тарашкевіч займаюць вышэй названыя пасады з сваёй волі, і Нацыянальны Камітэт не нясе адказнасьці за іх дзейнасьць у якасьці чальцоў новага ўраду. А сваё стаўленьне да іх Камітэт акрэсьліць у залежнасьці ад таго, які плён дасьць іх дзейнасьць у складзе новага ўраду і наколькі гэтая дзейнасьць будзе адпавядаць асноўным патрабаваньням Камітэту[78].

Цяжка сказаць, ці то была спроба дзеячоў Камітэту перастрахавацца ад такой палітычна рызыкоўнай ініцыятывы, якой было супрацоўніцтва з Л. Жалігоўскім, ці жаданьне адмежавацца ад В. Іваноўскага і скампрамэтаваць яго ў вачох беларускай супольнасьці. Так ці інакш, гэта быў выпад, ня годны сумленнай гульні. Мы ня ведаем, хто быў аўтарам ананімнай публікацыі ў "Gazecie Krajowej", але не падлягае сумневу, што ён належаў да блізкіх супрацоўнікаў Іваноўскага і Тарашкевіча, пра што сьведчаць зьмешчаныя ў працытаванай публікацыі іх пэрсанальныя характарыстыкі. Можна меркаваць, што гэтая падзея перакрэсьліла пэрспэктывы супрацоўніцтва В. Іваноўскага зь дзеячамі віленскага Камітэту. Ён адчуваў сябе непажаданай асобай.

Так пачалася чорная паласа. Неўзабаве з Рыгі надышлі найгоршыя навіны. Аказалася, што Л. Васілеўскаму ды іншым прыхільнікам фэдэралізму, якія ўдзельнічалі ў перамовах, давялося пагадзіцца з пазыцыяй пераважнай бальшыні польскай дэлегацыі, якая заблякавала адмысловы разгляд пытаньня Меншчыны. Так была пахаваная ідэя беларускага кантону і перакрэсьленая фэдэрацыйная праграма[79].

Засталая Сярэдняя Літва — мікраскапічная дзяржава плошчай 15 тыс. кв. км ды паўмільённым насельніцтвам — ужо не магла адыграць ролі эмбрыёну Вялікага Княства Літоўскага і была няздольная да самастойнага існаваньня. Інкарпарацыя гэтай дзяржавы ў Польшчу станавілася пытаньнем часу. У такіх абставінах Вацлаў Іваноўскі палічыў сваю ролю ў Часовай Кіруючай Камісіі закончанай і напрыканцы сьнежня 1920 г. падаў у адстаўку[80]. Вынік

[77] Сидоревич А. Тамсама. С. 138; Сташкевич Н. Тамсама. С. 249.
[78] Gazeta Krajowa. 16.10.1920.
[79] Dąbski J. Тамсама. С. 78.
[80] Апошняе распараджэньне В. Іваноўскага ў якасьці дырэктара дэпартамэнту забесьпячэньня датуецца 28.12.1920 г. Гл.: Dziennik Urzędowy Tymczasowej Komisji Rządzącej z Litwy Środkowej... 09.01.1921.

яго дзейнасьці ў ваенныя гады аказаўся адмоўным. Рэальна ацэньваючы нацыянальны патэнцыял, ён ня цешыўся ілюзіяй наконт магчымасьці ўтварэньня самастойнай беларускай дзяржавы, але разьлічваў, што яе можна стварыць у фэдэрацыйным саюзе з Расеяй ці з Польшчай. Гэтыя надзеі разьвеяў ажыцьцёўлены ў Рызе падзел беларускіх земляў. Абумоўленая нэгатыўнай палітыкай Леніна стаўка на Пілсудзкага аказалася для В. Іваноўскага тройчы фатальнай:

— ён страціў палітычны крэдыт у Менску, дзе яго лічылі палянафілам;

— гэтага крэдыту ён не здабыў і ў Варшаве, дзе яго абвінавачвалі ў сацыяльным радыкалізьме ды беларускім сэпаратызьме;

— ён стаў палітычна небясьпечнай фігурай для віленскіх беларускіх дзеячоў, якія імкнуліся прыстасавацца да дзейнасьці ўва ўмовах Польскай Рэспублікі.

Альтэрнатывы не было

Пасьля выхаду з Часовай Кіруючай Камісіі Сярэдняй Літвы Вацлаў Іваноўскі вырашыў адысьці ад палітычнага жыцьця і вярнуцца да навуковай працы. Ён думаў пра Варшаўскую палітэхніку. На гэты плян уплывала адсутнасьць вышэйшай тэхнічнай школы ў Вільні, а можа быць, і новая сямейная сытуацыя. У 1920 г. ён разлучыўся з Сабінай і ўзяў шлюб з жыхаркай Вільні Лігіяй Федаровіч. Шлюб адбыўся ў мясцовай эвангелічнай царкве. Аднак Сабіна зь дзецьмі засталася ў Вільні і працавала настаўніцай гімнастыкі ў жаночай гімназіі імя Э. Арэшчыхі. Ня выключана, для разьведзеных мужа і жонкі гэты невялікі горад стаўся зацесным.

Праца ў Варшаўскай палітэхніцы сьпярша прычыняла пэўныя цяжкасьці. Тут не было катэдры тэхналёгіі фэрмэнтацыі харчовых прадуктаў, у галіне якой спэцыялізаваўся В. Іваноўскі яшчэ ў Пецярбурскім тэхналягічным інстытуце. Таму ён выступіў з ініцыятывай стварэньня такой катэдры. Гэтай ідэяй зацікавіўся прафэсар Казімеж Смаленскі, калега Вацлава па Пецярбурскім інстытуце, які з 1919 г. працаваў у Варшаўскай палітэхніцы і падтрымліваў арганізацыю новага кірунку навучаньня.

Першае паведамленьне аб заснаваньні катэдры тэхналёгіі фэрмэнтацыі харчовых прадуктаў і запрашэньні Вацлава Іваноўскага да працы ў гэтай галіне было пададзена ў “Праграме Варшаўскай палітэхнікі на 1921/1922 г.”[1]. Друкаваць гэтую “Праграму” скончылі 29 жніўня 1921 г., з чаго вынікае, што рашэньне інстытуцкага сэнату ў гэтай справе было прынятае перад летнімі вакацыямі 1921 г. Такому рашэньню, безумоўна, папярэднічала арганізацыйная і пэрсанальная падрыхтоўка, якая таксама вымагала часу. Таму выглядае, што захады ў гэтым кірунку Вацлаў распачаў адразу ж пасьля адстаўкі з ураду Сярэдняй Літвы, г.зн. — у студзені 1921 г.

Гэта вельмі істотнае ўдакладненьне, бо яно сьведчыць, што адыход В. Іваноўскага ад палітычнай дзейнасьці быў выкліканы перамогай канцэпцыі інкарпарацыі, а ня стаўленьнем да беларускага пытаньня, ні пазьнейшай камандай Л. Жалігоўскага, ні тым больш — варшаўскіх уладаў пасьля далучэньня Сярэдняй Літвы да Польшчы. Гэта было самастойнае і незалежнае рашэньне, палітычныя матывы якога мы разгледзім крыху пазьней.

Аднак выезд В. Іваноўскага ў Варшаву зацягваўся. Фармальна загадваць новай катэдрай ён пачаў толькі ўвосень 1922 г., г.зн. з пачаткам новага акадэмічнага году, хаця ўжо ў другім сэмэстры 1921/22 г. ён пачаў лекцыі для студэнтаў чацьвёртага курсу хімічнага факультэту[2]. Такім чынам, прынамсі да канца 1921 г. ён заставаўся ў Вільні, не беручы ўдзелу ў дзейнасьці палітычных арганізацыяў. У чаканьні заплянаванага пераезду ў Варшаву ён выйшаў са складу Беларускага Навуковага Таварыства, якое 10 чэрвеня

[1] Program Politechniki Warszawskiej na 1921/1922 r. Warszawa, 1921. S. 49, 94.

[2] Politechnika Warszawska. Plan wykładów i skład osobowy w roku naukowym 1922/1923. Warszawa, 1922. S. 33.

1920 г. абрала яго старшынём[3].

Адзінай сфэрай грамадзкай дзейнасьці В. Іваноўскага заставаўся ў той час Віленскі Саюз Каапэратываў. Ён быў створаны на пачатку 1920 г., але летні наступ савецкіх войскаў, а пазьней — польскіх, на пэўны час прыпынілі яго дзейнасьць. Сапраўднае яго разьвіцьцё пачалося толькі ў кастрычніку 1920 г., пасьля таго, як В. Іваноўскі атрымаў пасаду дырэктара дэпартамэнту грамадзкага забесьпячэньня Сярэдняй Літвы[4]. Гэты дэпартамэнт стаў кіраўнічым штабам каапэратыўнага руху на Віленшчыне і яго дзейсным арганізатарам. Таму, карыстаючыся з ініцыятывы і падтрымкі В. Іваноўскага, Віленскі Саюз Каапэратываў неўзабаве стварыў густую сетку сваіх аддзелаў у вёсках і мястэчках Віленшчыны.

Фармальна дзейнасьць Саюзу адпавядала асноўным прынцыпам каапэратыўнага руху. У першую чаргу ён разьвіваў уласную сетку закупу сельскагаспадарчых прадуктаў: мясцовым земляробам плацілі больш, чым гэта рабілі прыватнікі. Нягледзячы на гэта, пры продажы гэтых вырабаў па рынкавых цэнах Саюз атрымліваў высокі прыбытак і ўжо ў сярэдзіне 1921 г. змог выдзеліць значныя сумы на далейшае разьвіцьцё сваёй дзейнасьці. Ён плянаваў рэарганізаваць сетку продажу прамысловых тавараў, папулярызаваць каапэратыўны рух шляхам чытаньня рэфэратаў, правядзеньня лекторыяў, выданьня каапэратыўнага часопіса, календароў і спэцыяльнай літаратуры, падрыхтоўкі інструктараў[5]. Усё гэта павінна было ўзьняць узровень агратэхнічных ведаў, дапамагаць адбудове зруйнаваных падчас вайны гаспадарак і выправіць матэрыяльны стан вясковага насельніцтва. Гэта адпавядала інтарэсам сялян, пра што сьведчыла іх падтрымка каапэратыўнага руху.

Насельніцтва Віленшчыны з нацыянальнага гледзішча было неаднастайным, і сябрамі Саюзу маглі быць польскія, беларускія і літоўскія каапэратывы. Але фактычна яго дзейнасьць была скіраваная на разьвіцьцё беларускіх каапэратываў, бо яны стваралі важную матэрыяльную і арганізацыйную базу для актывізацыі беларускага нацыянальнага жыцьця, асабліва — школаў, разьмяшчэньне якіх часта супадала зь сеткай каапэратываў. Паводле зьвестак II аддзелу Генэральнага Штабу Войска Польскага, гэтыя каапэратывы (безумоўна, неафіцыйна) утваралі рэгіянальную арганізацыйную сетку віленскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту[6].

Беларускі характар Віленскага Саюзу Каапэратываў выклікаў занепакоенасьць сярод афіцыйных дзеячаў Сярэдняй Літвы і нападкі польскіх публіцыстаў. У сярэдзіне 1921 г. Вацлава Іваноўскага абвінавацілі ў тым, што падтрыманы ім беларускі каапэратыўны рух стаўся ў правінцыі інструмэнтам беларускай палітыкі антыпольскага кірунку. Адзіным доказам гэтай "злачыннай дзейнасьці" была інфармацыя пра распаўсюджваньне ў Ашмянскім павеце тыднёвіка "Наша Думка"[7]. Скоса пазіралі ўлады і на пашырэньне беларускага школьніцтва на Віленшчыне, бачачы ў ім тормаз для польскай культурнай экспансіі.

В. Іваноўскі, хаця і ня быў насамрэч сябрам управы Саюзу, але істотна ўплываў на яго дзейнасьць нават і пасьля адстаўкі з ураду Сярэдняй Літвы. Ён прыцягнуў да супрацоўніцтва сваіх надзейных сяброў, якія адыгрывалі асноўную ролю ўва ўправе Саюзу: Антона Трэпку, Уладзіслава Сталыгву, Юстына Ластоўскага, Аркадзя Смоліча ды іншых[8]. Адначасова ён плянаваў стварыць банк і ўдасканаліць сыстэму транспартаваньня і захоўваньня тавараў. З гэтай мэтай у верасьні 1921 г. ён удзельнічаў у заснаваньні акцыянэрнага таварыства "Віленскія таварныя склады PACIFIC", прапускная здольнасьць якіх

[3] ЦДА ЛіМ, Менск, ф. 3, справа 1, арк. 4.

[4] Gazeta Wileńska. 31.05.1921.

[5] Тамсама. 02.06.1921.

[6] Krótki zarys... S. 126.

[7] Raport Tupalskiego A. Ruch narodowy białoruski w dobie przedwojennej i podczas wojny. AAN, TSK, syg. 99, k. 13.

[8] Gazeta Wileńska. 02.06.1921.

пад канец таго году дасягнула 700 вагонаў[9].

Як экспэрт у галіне харчовай прамысловасьці ён імкнуўся, каб Саюз заняўся сушэньнем садавіны і гародніны. У канцы траўня 1921 г. ён выступіў на зьезьдзе прадстаўнікоў Саюзу і так абгрунтаваў сваю прапанову:

> Краіна наша мае сукрытыя скарбы ў выглядзе ягад, грыбоў, садавіны і іншых пладоў лясоў і садоў. Аднак гэтыя сукрытыя скарбы трэба ператварыць у яўныя, засноўваючы ў розных, найбольш адпаведных для гэтага пунктах краіны сушыльні садавіны, якія, выпрабляючы штодзень у сярэднім 16 пудоў (1 пуд — каля 16 кг. — *Ю.Т.*) тавару, прызначанага пасьля для продажу на мясцовых рынках, дадуць агромністыя прыбыткі.

Зьезд прыняў гэтую прапанову і пастанавіў прызначыць 2% ад агульнага абароту Саюзу на абсталяваньне колькіх сушыльняў[10]. Такім чынам, насуперак абвінавачаньням і ўзрастаючай непрыязнасьці В. Іваноўскі ня страчваў надзеі на магчымасьць разьвіцьця беларускай кааперацыі. У канцы 1921 г., калі набліжалася інкарпарацыя Сярэдняй Літвы ў Польшчу, улады разгарнулі нападкі на Віленскі Каапэратыўны Саюз: яго абвінавацілі ня толькі ў беларускім сэпаратызьме, але і ў імкненьні кантраляваць усё эканамічнае жыцьцё Віленшчыны[11]. Усьлед за гэтым былі зробленыя такія адміністрацыйныя захады, якія пазбавілі Саюз магчымасьці функцыянаваць на дагэтулешніх прынцыпах. Сваю ролю адыграла пры гэтым і імкненьне польскіх прыватных фірмаў пазбыцца беларускай канкурэнцыі.

Стаўка В. Іваноўскага на калектыўную эканамічную дзейнасьць нагадвала яго даваенныя ініцыятывы ў Пецярбургу і Вільні, вынікам якіх было разьвіцьцё выдавецкай дзейнасьці. Гэтая стаўка была свайго роду тэстам на стаўленьне польскіх уладаў да эканамічных і культурных патрэбаў беларускай нацыянальнай меншасьці. Яго вынік аказаўся адназначна адмоўны. Тое, што было магчыма пры царызьме, адроджаная польская дзяржава не дазваляла.

Увосені 1922 г. Вацлаў Іваноўскі распачаў рэгулярную працу ў Варшаўскай палітэхніцы як загадчык катэдры і аддзяленьня тэхналёгіі фэрмэнтацыі харчовых прадуктаў. На гэтай пасадзе ён працаваў да верасьня 1939 г., г.зн. — 16 год. Спачатку — выкладчык-кантрактнік, 4 ліпеня 1924 г. ён атрымаў годнасьць экстраардынарнага прафэсара, а 1 верасьня 1935 г. — ардынарнага прафэсара. Апрача таго, у 1930/1931 — 1932/1933 гг. ён выконваў абавязкі дэкана хімічнага факультэту, а ў 1935/1936 — 1936/1937 гг. — кіраўніка Вайсковай вучэльні гэтага інстытуту[12]. Паколькі В. Іваноўскі займаў гэтыя пасады, ён уваходзіў і ў сэнат Палітэхнікі.

За гэты час прафэсар В. Іваноўскі выгадаваў многіх інжынэраў–тэхнолягаў для польскай прамысловасьці, апроч таго, ён кіраваў дасьледчай працай сваёй катэдры і ўдзельнічаў у рэалізацыі супольных міжынстытуцкіх навуковых праграмаў сярод польскіх ВНУ. Праблематыка навуковых дасьледаваньняў, якія ён праводзіў і якімі кіраваў, супадала з найважнейшымі патрэбамі тагачаснай польскай эканомікі, сярод іх на першым месцы стаялі разнастайныя тэхналягічныя аспэкты харчовай прамысловасьці. Зрэшты, у гэтай галіне ён меў найбольшы досьвед: тэарэтычны, набыты ў Пецярбурскім тэханалягічным інстытуце, і практычны — у Лябёдцы.

Праблемны аспэкт *тэхналёгіі харчовай прамысловасьці* адлюстроўваюць наступныя

[9] Dziennik Urzędowy Tymczasowej Komisji Rządzącej Litwy Środkowej. 30.09.1921; Gazeta Wileńska. 15.12.1921.

[10] Gazeta Wileńska. 02.06.1921.

[11] Krótki zarys... S. 126.

[12] Politechnika Warszawska. Księga pamiątkowa wydana pod red. L. Staniewicza. Warszawa, 1925. S. 360, 383; Politechnika Warszawska. Plan wykładów i skład osobowy na rok akademicki 1935/1936 i 1936/1937. Warszawa. 1935 i 1936.

працы В. Іваноўскага, выкананыя часткова супольна зь іншымі навуковымі супрацоўнікамі Палітэхнікі:

Перапрацоўка садавіны і гародніны: "Падручнік перапрацоўкі садавіны і гародніны" (1–е выд. 1923 г., 2–е выд. 1924 г.), "Асновы сушэньня" (1924), "Перапрацоўка садавіны для цукровай вытворчасьці" (1925), "Стан і пэрспэктывы разьвіцьця перапрацоўкі садавіны і гародніны" (1925), "Справаздача з выстаўкі він і вырабаў з пладовых сокаў у Варшаве" (1925), "Матэрыялы да характарыстыкі польскіх пладовых він" (1927), "Міжнародная канфэрэнцыя па праблеме садавіны як харчовага прадукта" (1933).

Дрожджы: "Дрожджы і іх значэньне ў харчаваньні чалавека" (1929), "Пякарныя дрожджы фабрык Польскай Рэспублікі" (колькі выданьняў 1928—1930), "Зьмены ў спрасаваных дрожджах падчас іх захоўваньня" (1934).

Хлебапякарства: "Дасьледаваньні над устанаўленьнем тыпу ўзорнай мукі для вызначэньня часу прыгатаваньня пякарных дрожджаў" (1931), "Вывучэньне мукі з млыну «Гураган»" (1933), "Рацыянальны мэтад аналізу мукі і цеста" (колькі выданьняў 1935—1937), "Рацыянальны мэтад вызначэньня цукру ў зерні, муцэ і цесьце" (1937).

Іншыя праблемы харчовай прамысловасьці: "Вывучэньне кармавой каштоўнасьці брагі" (1925), "Канфэрэнцыя па праблеме стандартызацыі падачы вынікаў аналізаў харчовых прадуктаў" (1929), "Сучасны стан тэхнікі малочнай вытворчасьці ў Даніі" (1931), "Дзяржаўны кантроль за экспартам прадуктаў земляробства ў Даніі" (1931).

На пачатку 20–х гадоў прафэсары Вацлаў Іваноўскі і Юзаф Турскі распачалі досьледы ў галіне паліўных сумесяў на аснове сьпірту як заменьніка традыцыйнага аўтамабільнага паліва. У 1926—1929 гг. яны апублікавалі колькі сваіх працаў ("Паліўныя сумесі на аснове сьпірту. Вынікі ўжываньня правільна прыгатаваных паліўных сумесяў на аснове сьпірту" і "Вытворчасьць сьпірту для паліўных сумесяў"), але пазьней перапынілі дасьледаваньні. Справа ў тым, што гэтыя сумесі не маглі канкураваць з больш танным палівам, якое выраблялася на нафтавай аснове. Спроба ўвесьці ва ўжытак новы гатунак паліва тлумачылася імкненьнем павялічыць сфэру выкарыстаньня бульбы ды іншай сельскагаспадарчай прадукцыі, бо яе вытворчасьць значна перавышала попыт на мясцовым і замежным рынку. Няўдача ў ажыцьцяўленьні задумы не зьмяншае значэньня гэтых прац, пра што сьведчаць сучасныя распрацоўкі ў аналягічным кірунку, якія працягваюцца ў краінах зь вялікімі запасамі сельскагаспадарчых рэсурсаў.

Нямала ўвагі прысьвяціў прафэсар В. Іваноўскі праблеме *імпрэгнацыі драўніны*, што ў вялікай ступені было зьвязана зь яго працай на чыгунцы ў якасьці экспэрта ў галіне імпрэгнацыі чыгуначных шпалаў. Вынікі сваіх досьледаў ён падаў у публікацыях: "Догляд за шпаламі на галяндзкай чыгунцы" (1929), "Разбурэньне будынкаў грыбком і барацьба зь ім" (1933), "Двухлёрнітрафэнолы як антысэптыкі для прапітваньня драўніны" (1938), "Трыхлёрфэнолы і іх выкарыстаньне ў тэхніцы " (1932). Апрача таго, ён апублікаваў працу "Карчаваньне пры дапамозе выбуховых матэрыялаў" (1932).

Нарэшце, незадоўга да другой сусьветнай вайны В. Іваноўскі заняўся праблемамі ачышчэньня і выкарыстаньня фабрычных сьцёкаў пасьля вытворчасьці цэлюлёзы. Ён удзельнічаў у правядзеньні экспэртызы па праблеме забруджаньня вады Віслы цэлюлёзнай фабрыкай Урацлавэка і апублікаваў працу "Шляхі абясшкоджаньня і выкарыстаньня шчолачных адыходаў пры вытворчасьці сульфітнай цэлюлёзы" (1939). Гэта была піянэрская дзейнасьць у галіне аховы навакольнага асяродзьдзя.

Вынікі дасьледчых прац прафэсара В. Іваноўскага публікаваліся галоўным чынам у польскай хімічнай пэрыёдыцы ("Przemysł Chemiczny", "Rocznik Chemiczny", "Gazeta Rolnicza", "Przegląd Mięsny", "Przemysł Rolny", "Rolnik Ekonomista", "Technika Gorzelnicza" ды інш.) і замежных выданьнях "Zeitschrift für Spiritisindustrie" і "Cereal Chemistry". Як вядучы экспэрт у галіне тэхналёгіі ён прадстаўляў Польшчу на міжнароднай канфэрэнцыі па праблемах стандартызацыі аналізаў харчовых прадуктаў у Пары-

жы (1929), на міжнародным кангрэсе тэхнікі для малочнай вытворчасьці ў Капэнгагене (1931) і міжнародным хімічным кангрэсе ў Будапэшце (1939).

Значэньне дасьледчых прац прафэсара Іваноўскага палягала ў пасьлядоўным імкненьні ўкараніць іх вынікі ў практычнай прамысловай дзейнасьці. Ён быў аўтарам сямі патэнтаў, зацьверджаных Патэнтным бюро Польшчы, у пяцёх выпадках распрацаваных разам з прафэсарам Ю. Турскім. Акрамя таго, ён меў вынаходы, запатэнтаваныя нямецкім канцэрнам "IG Farbenindustrie". Ніжэй падаецца сьпіс запатэнтаваных у Польшчы вынаходаў (у той пасьлядоўнасьці, як іх зарэгістравала Патэнтнае бюро)[13]:

1. Спосаб імпрэгнацыі драўніны рошчынамі хлёрфэнолу і яго солямі (24.03.1927)*.
2. Спосаб забесьпячэньня антысэптыкаў у прапітанай драўніне ад вылугаваньня (23.03.1927)*.
3. Спосаб атрыманьня канцэнтраванай воцатнай кісьлі з этылавага алькаголю шляхам акісьленьня ў паветры каталізатарамі (10.01.1928)*.
4. Азотны спажыўны росчын для вырабу прасаваных дрожджаў (31.01.1928)*.
5. Спосаб атрыманьня хлёрагваяколю і солі гваякаласульфонавай кісьлі з парадыхлёрбэнзолу (17.08.1928)*.
6. Сушыльная калёна зь ніжнім душнікам (07.05.1930).
7. Спосаб пераліваньня малака (31.01.1935).

* Патэнт выдадзены В. Іваноўскаму разам зь Ю. Турскім.

Тарнаваны характар дасьледчых прац прафэсара В. Іваноўскага ад часу да часу выклікаў нараканьні з боку прыхільнікаў чыста тэарэтычнай веды, але для польскай прамысловасьці, гэтаксама, як і для Палітэхнікі, яны прыносілі адчувальную карысьць. В. Іваноўскі як экспэрт у галіне тэхналёгіі займаў разнастайныя пасады ў прамысловасьці, што, між іншым, давала магчымасьць шукаць сродкі на пашырэньне гэтага інстытуту. Таму, калі ў 1928 г. паўстаў праект пабудовы двух новых карпусоў Палітэхнікі (Хімічнай тэхналёгіі і Электратэхнікі), В. Іваноўскі адыграў вялікую ролю ў яго ажыцьцяўленьні: стаў сталым сакратаром тэхналягічнай камісіі, старшынём будаўнічага камітэту і кіраўніком яго фінансавай сэкцыі, апрача таго, кіраваў праектнымі работамі новых лябараторыяў у корпусе Хімічнай тэхналёгіі[14].

На ацэнку дзейнасьці Вацлава Іваноўскага ў Варшаўскай палітэхніцы ўплывалі яго тагачасная пасьлядоўная беларуская нацыянальная пазыцыя ды ранейшая і пазьнейшая палітычная дзейнасьць. У Беларусі яшчэ ня так даўно дапускаліся нават "сыцьверджаньні", быццам ён быў "невукам"[15], а ў Польшчы на гэты конт пераважна маўчалі. Адно пасьля таго, як у 1984 г. Сэнацкая Камісія Гісторыі і Традыцыі Варшаўскай палітэхнікі разгледзела "справу прафэсара В. Іваноўскага", зьявілася магчымасьць падрыхтаваць элемэнтарную бібліяграфію яго працаў. Аднак дагэтуль, г.зн. да 1992 г., зроблена было няшмат.

У сутнасьці, за апошнія 50 гадоў зьявілася толькі адна ацэнка яго дзейнасьці, зробленая Эўгеніюшам Квяткоўскім, палітыкам, эканамічным дзеячом, аўтарам прац з гісторыі хімічнай прамысловасьці і хімічнай тэхналёгіі ў Польшчы, а значыцца, асобай кампэтэнтнай. Вацлава Іваноўскага ён згадаў у шэрагу найвыдатнейшых прадстаўнікоў польскай тэхналягічнай навукі, такіх, як Ігнацы Масьціцкі, Юзаф Турскі, Вацлаў Лясьнянскі ды інш., прычым падкрэсьліў іх высокую навуковую падрыхтаванасьць, тонкую выхаваўчую інтуіцыю і надзвычайныя арганізацыйныя здольнасьці[16].

Шмат сэрца і ўвагі аддаваў Вацлаў Іваноўскі студэнцкай моладзі. Ян Карыткоўскі, у 20–я гг. — вучань прафэсара, а пазьней, пасьля вайны — і сам прафэсар Палітэхнікі,

[13] Wykaz patentów udzielonych przez Urząd Patentowy RP w latach 1927—1935. Warszawa.
[14] Przemysł Chemiczny. 1934. № 10—12.
[15] Новікаў І. Выбраныя творы. Т. III. Мінск, 1988. С. 16.
[16] Kwiatkowski E. Dzieje chemii i przemysłu chemicznego. Warszawa, 1962. S. 309—310.

гаварыў пра гэта так:

> Прафэсар Іваноўскі быў вельмі зычлівы для студэнтаў–дыплёмнікаў. Ён меў вялікія сувязі ў фэрмэнтацыйна–харчовай прамысловасьці і дзякуючы гэтаму ўладкоўваў выпускнікоў у гэтай прамысловасьці, а на той час атрымаць працу было вельмі важна. Для студэнтаў, што спэцыялізаваліся ў гэтай галіне, ён арганізоўваў экскурсіі, між іншым, у 1925 г. — у Крушвіцу. Знаходзіў для студэнтаў субсыдыі ў сьпіртовай, малочнай, хлебапякарскай прамысловасьці. Як гуманіст і дэмакрат, быў цалкам талерантны да палітычных перакананьняў студэнтаў. Працуючы ў галіне фэрмэнтацыі, мы часта самі выраблялі алькагольныя напоі, якія ўжывалі на разьвітальных выпускных вечарынах. Прафэсар Іваноўскі лічыў сябе беларусам. Аднойчы арганізавалі экскурсію, і калега, які зьбіраў пашпарты, паказаў мне пашпарт Іваноўскага, дзе было запісана: "нацыянальнасьць — беларус"[17].

З ініцыятывы таго ж самага прафэсара Я. Карыткоўскага 11 кастрычніка 1979 г. у залі Галоўнай Тэхнічнай Арганізацыі ў Варшаве адбылася сустрэча, прысьвечаная памяці прафэсара В. Іваноўскага, на якую быў запрошаны і аўтар гэтай кнігі. У ёй узялі ўдзел каля 30 вучняў прафэсара, а іх успаміны пацьвердзілі працытаванае паведамленьне і, засьведчыўшы павагу да прафэсара, выявілі шэраг цікавых біяграфічных момантаў. Сярод іншых, у сустрэчы ўдзельнічала і спадарыня Гражына Ліпінская, аўтарка выдадзеных у Парыжы ўспамінаў, дзе аб прафэсару В. Іваноўскім гаварылася наступнае:

> У міжваенныя гады акадэмічная моладзь вельмі любіла яго за прастату, зычлівасьць і арганічную патрэбу прыходзіць кожнаму на дапамогу. Я сутыкнулася зь ім яшчэ раз два гады перад вайной, калі прыехала ў Горадню з Варшавы для арганізацыі перасоўных грыбных сушыльняў, якія тамтэйшая Школа садаводзтва і агародніцтва плянавала эксплёатаваць у Беларусі. Прафэсар быў вынаходнікам гэткай перасоўнай сушыльні. У размове зь ім я заўважыла, што яго цікавіла ня столькі сушыльня, колькі дабро беларускага народу. Я страшэнна выйграла ў яго вачах, калі ў імя працы ў Горадні пакінула Варшаву. Ён растлумачыў, як павінны мы берагчы векавую беларускую культуру, як любіць, вучыць і арганізоўваць тамтэйшы люд, каб узбагаціць яго духоўна і матэрыяльна[18].

У 30–я гг. Вацлаў Іваноўскі быў куратарам дзьвюх студэнцкіх арганізацыяў, якія дзейнічалі ў Варшаўскай палітэхніцы: Гуртка віленчукоў і Гуртка Навагрудчыны[19]. Здаецца, гэта быў невыпадковы выбар. Праўда, абодва гурткі ня мелі нацыянальнага характару, былі рэгіянальнымі арганізацыямі накшталт зямляцтваў у расейскіх дарэвалюцыйных ВНУ, аднак гуртавалі беларускіх студэнтаў зь Віленшчыны і Навагрудчыны. Сярод іх найцясьнейшы кантакт з прафэсарам падтрымлівалі кіраўнікі гэтых гурткоў, якімі пэўны час былі Міхал Вітушка і Мечыслаў Контаўт. Празь некалькі гадоў яны стануць супрацоўнікамі беларускай адміністрацыі ў Менску, але пакуль што працавалі над арганізацыяй Беларускага Асьветніцкага Таварыства ў Варшаве. Відаць, на іх просьбу ў 1937 г. прафэсар В. Іваноўскі паставіў свой подпіс пад статутам гэтага Таварыства як адзін зь яго заснавальнікаў[20].

17 Паведамленьне праф. Яна Карыткоўскага ад 27.09.1979.

18 Lipińska G. Jeśli zapomnię o nich… Paryż, 1988. S. 201.

19 Politechnika Warszawska. Skład osobowy i plan studiów na lata 1932/1933—1938/1939. Warszawa, wydanie ciągłe.

20 Як пісаў Пятро Ластаўка, адзін з арганізатараў і сакратар управы Таварыства, яго заснавальнікамі, якія паставілі свае подпісы пад статутам, былі: прафэсары Музычнай Кансэрваторыі ў Варшаве Станіслаў Казура і Браніслаў Руткоўскі, прафэсар Вацлаў Іваноўскі і саліст Міхал Забэйда–Суміцкі (машынапіс у распараджэньні аўтара); гл. таксама: Wiem wszystko. 28.02.1937.

Аб прыватным жыцьці прафэсара В. Іваноўскага ў Варшаве вядома няшмат. Ён здымаў кватэру на вуліцы Кашыковай, 75, побач з Палітэхнікай, дзе жыў разам з жонкай да верасьня 1939 г. 26 верасьня 1923 г. нарадзілася адзінае ў гэтым яго другім шлюбе дзіця — сын Пётар–Леанард, ахрышчаны ў рыма–каталіцкім касьцёле Збаўцы ў Варшаве[21]. Наведвалі Вацлава дзеці зь першага шлюбу — Стэфан, Вацлаў і Ганна, якія вучыліся ў Варшаве. На думку знаёмых, яго другі шлюб быў няўдалы. Ён атрымліваў, відаць, немалыя даходы, але ўласнага дому або кватэры ў Варшаве не прыдбаў. Сваё жыцьцё ў гэтым горадзе лічыў часовым, марачы пра сапраўднае жыцьцё ў Беларусі.

Пасьля сьмерці бацькі Леанарда (15 кастрычніка 1919 г.) юрыдычны статус Лябёдкі пэўны час заставаўся нявырашаным. Адно ў меру пасьляваеннай стабілізацыі распачалася працэдура ўваходу ў спадчыну, у выніку якой Вацлаў атрымаў частку фальварку — Рагачоўшчыну і Баяры. Першую зь іх ён аддаў Сабіне, а сабе пакінуў Баяры. Гэта быў у вялікай меры пакрыты лесам абшар плошчай каля 30 га.

У Баярах Вацлаў Іваноўскі наважыўся зрабіць сваю вясковую сядзібу. Выкарчаваў лес і пабудаваў невялікі драўляны дом. Асабліва прываблівала яго ідэя аднаўленьня бацькоўскай садовай гаспадаркі, што ён уважаў за свой сыноўні і грамадзкі абавязак. У прадмове да свайго "Цэньніка" ён пісаў: "Мне ўдалося адшукаць матачныя дрэвы, прынамсі ў межах гандлёвага набору, 50–гадовы досьвед дапоўніць досьведам забойчай зімы 1928/1929, году і плён гэтага досьведу ў выглядзе набору пладовых дрэваў я аддаю на суд усіх аматараў і ўладальнікаў «паўночных садоў»"[22].

Такім чынам, на пачатку 30–х гг. пачала функцыянаваць садовая гаспадарка Вацлава, якая прапаноўвала больш за 60 гатункаў прышчэпаў яблыняў, ігрушаў, сьліваў, чарэшняў і вішань. У ваколіцах Баяраў ён арганізаваў яшчэ і каапэратыў, які скупаў малако ў мясцовых земляробаў. Але і гэтым разам Вацлаву не пашчасьціла. У 1934 г. памерла яго маці Ядвіга. Яе пахавалі побач зь Леанардам у сямейным склепе, які знаходзіўся мэтраў за 800 ад Лябёдкі. Пасьля яе сьмерці ўзмацніліся сямейныя праблемы, якія прымусілі Вацлава ў 1938 г. перадаць гаспадарку ў Баярах свайму сыну і выехаць зь Лябёдкі.

Але намер пераехаць на вёску не пакідаў яго. Неўзабаве Вацлаў купіў у ваколіцы Солтанаў Ваўкавыскага павету колькі дзясяткаў гектараў зямлі, плянуючы стварыць новую гаспадарку. Але пасьпеў толькі перавезьці з Баяраў свой драўляны дом. Далейшыя пляны перакрэсьліла другая сусьветная вайна.

Вацлаў са сваёй жыцьцёвай філязофіяй ня ўпісваўся ў рэчаіснасьць міжваеннай Польшчы. Ён дасягнуў сапраўды значных посьпехаў у прафэсійнай кар'еры, але глыбока перажываў сваю нерэалізаванасьць на беларускай ніве, што ўважаў за сваю найважнейшую задачу. У гэтым сэнсе ён ужо не знаходзіў паразуменьня ані ў сям'і, ані ў асяродзьдзі, ані нават сярод часткі сваіх ранейшых сяброў і супрацоўнікаў. У вялікай ступені на гэта паўплывалі новыя палітычныя абставіны.

Сабіна, якая некалі захаплялася і маральна падтрымлівала дзейнасьць Вацлава на ніве беларускага нацыянальнага адраджэньня, ужо падчас першай сусьветнай вайны, у меру распаду сям'і, пачала адыходзіць ад ідэалаў маладосьці і выхавала дзяцей у тыповым для яе асяродзьдзя польскім духу. Цяпер бацькавы погляды яны расцэньвалі як дзівацтва і фактычна іх не прымалі. Як піша Іван Касяк, дачка Вацлава, Ганна, сьцьвярджала ў апошнюю вайну ў Менску, што яе бацька — паляк, і толькі цяпер прыдумаў сабе, быццам ён — беларус[23]. Мабыць, ня лепшы з гэтага гледзішча быў і яго другі шлюб.

Больш разуменьня для ідэйнай пазыцыі Вацлава ў міжваенную пару знаходзілася ў яго братоў, Юр'я і Станіслава. У мінулым іх аб'ядноўвала канкрэтная фэдэралісцкая дзейнасьць, цяпер жа — толькі яе ідэя, якая, аднак, пасьля Рыскага трактату падавалася

[21] Dane Urzędu Stanu Czwilnego Warszawa–Śródmieście. 1/6/5/23.

[22] Cennik szczepów owocowych... (бяз даты, пачатак 30–х гг.). S. 4.

[23] Касяк I. Заўвагі да артыкулу аб Іваноўскім // Беларуская думка. 1984. № 29. С. 34.

нязбытнай. Вацлаў падтрымліваў цесныя кантакты зь Юр'ем, які пэўны час быў сэнатарам Рэчы Паспалітай. У 30–я гг. абодва яны прымалі ўдзел у працы Польскага Інстытуту Нацыянальных Справаў у Варшаве. Калі ў Вацлава здараліся цяжкасьці з атрыманьнем замежнага пашпарту, Юры, дзякуючы сваёй пасадзе, яму эфэктыўна дапамагаў. Найбліжэйшым ідэалягічна Вацлаву быў яго брат Тадэвуш — прафэсар Ковенскага ўнівэрсытэту, але бачыліся яны рэдка з прычыны тагачасных польска–літоўскіх стасункаў.

Калі ў сваёй сям'і да Вацлава было рознае стаўленьне, дык "на крэсах", сярод памешчыкаў і палітычных дзеячоў, яно было адназначна адмоўнае. У выніку рэвалюцыі гэтыя людзі страцілі свае маёнткі ва Ўсходняй Беларусі, знайшлі прытулак у Польшчы і зрабіліся заклятымі праціўнікамі беларускага руху, які з прычыны свайго сацыяльнага радыкалізму для іх, як правіла, атаесамляўся з бальшавізмам. Таму Вацлава Іваноўскага абвінавачвалі ў тым, што ён быў галоўным інсьпіратарам гэтага руху, прычым сьцьвярджалася, што рабіў ён гэта ў інтарэсах Расеі[24]. Яго вінавацілі за рэнэгацтва і здраду клясавым інтарэсам свайго асяродзьдзя[25].

Атакам на В. Іваноўскага з боку польскага боку патурала і беларуская прэса, натуральна, з супрацьлеглых пазыцыяў. У 1928 г. віленская газэта "Думка Працы" зьмясьціла артыкул, падпісаны псэўданімам "Саўка Барывой", дзе, між іншым, можна было прачытаць наступнае:

> А што датычыць <...> пана прафэсара Вацлава Іваноўскага <...>, гэта нягодны здраднік Беларусі і беларускае справы! Належыць ён да гэтых "маскарадных кірмашовых беларусаў", якія калісьці былі ў беларускім руху ня дзеля запраўднае ад душы і сэрца, а толькі дзеля забавы і сьмеху, а магчыма — і дзеля скрытае шкоды беларусам[26].

Абразы, кінутыя "Думкай Працы" — газэтай, якую падтрымлівалі камуністы, — маглі быць водгукам распачатай у Менску кампаніі адхрышчваньня ад "клясава чужародных" дзеячоў беларускага нацыянальнага руху, да якіх належаў В. Іваноўскі. У 20–я гг. у Савецкай Беларусі яго яшчэ ня клялі публічна, але стараліся выкрасьліць з гісторыі руху, асудзіць на забыцьцё. З гэтай мэтай ужо ў 1924 г. усе яго выдавецкія заслугі, якія мелі безумоўнае значэньне для разьвіцьця маладой нацыянальнай літаратуры, пачалі прыпісваць Браніславу Эпімаху–Шыпілу[27].

І хаця Шыпіла, як і ўсе сябры ўправы выдавецкай суполкі "Загляне сонца і ў наша аконца", быў сапраўды шляхецкага паходжаньня, але падчас вайны і рэвалюцыі ён, прынамсі, не займаўся "нядобранадзейнай" палітычнай дзейнасьцю ды, апрача таго, застаўся ў Ленінградзе. Таму менскія ўлады ставіліся пакуль да яго з большай цярплівасьцю.

Выкрэсьліваньню В. Іваноўскага з гістарычнай памяці ў вялікай ступені паспрыяў Жылуновіч, які пасьля няўдалай спробы ўвесьці ў студзені 1919 г. прадстаўнікоў улады Беларускай Народнай Рэспублікі ва ўрад Савецкай Беларусі меў асаблівыя прычыны, каб адмежавацца ад Іваноўскага. У 1925 г. ён абвясьціў, што не В. Іваноўскі, а Б. Шыпіла быў старшынём выдавецкай суполкі, і, апрача гэтага, прыпісаў яму ролю галоўнага дзеяча Кругу Беларускай Народнай Прасьветы, утворанага ў 1902 г.[28]. Гэтая фальсыфікацыя, магчыма, была б і ня вартая ўвагі, калі б пасьля дзесяцігодзьдзямі яна не была "навуковым" грунтам для высьвятленьня вытокаў беларускага нацыянальнага руху, у якім для В. Іваноўскага ўжо не было месца.

---

[24] Gazeta Krajowa. 20.11.1921 і 22.12.1921.
[25] Przegląd Wileński. 13.05.1928. S. 6—7.
[26] Думка Працы. 1928. 28 студзеня.
[27] Скарыніч. Літаратурна–Навуковы гадавік. Мінск. 1991. С. 145—146.
[28] Тамсама. С. 149.

Ва ўспамінах З. Жылуновіча, апублікаваных у 1929 г. у Менску, таксама прасочваецца імкненьне адхрысьціца ад Іваноўскага. У іх апісана, як у 1909 г. у пошуках працы ён накіраваўся ў маёнтак Іваноўскіх у Лябёдцы. Жылуновіч намагаўся паказаць глыбокую сацыяльную прорву паміж ім, бедным беспрацоўным гарбаром з Капыля, і Вацлавам Іваноўскім, чальцом памешчыцкай сям'і, і пагарду і прыніжэньне, якіх ён нацярпеўся ад паганых эксплёататараў. Гэта павінна было дыскрэдытаваць В. Іваноўскага, які ва ўспамінах фігуруе пад сваім літаратурным псэўданімам "Тройца", але атрымалася вось што:

> У Лідзе я пачакаў Тройцу. Ён ехаў дамоў са сваёй жонкаю і спаткаў мяне ветла. Тут жа мы прыселі за стол і перакусілі. <...>
> Да прыходу цягніка з маёнтку прыехалі дзьве падводы — адна панская каламажка на спружынах, запрэжаная ў пару добрых стаенных коняй, а другая — просты аднаконны дваровы нарадзік. Тройца з жонкаю ўсеўся ў першы, мяне–ж, зразумела, даручыў фурману другое. <...>
> Заехаўшы на дзядзінец, зусім скромны, і спыніўшыся перад звычайным будынкам, які адыгрываў ролю "палацу", Тройца накіраваў мяне ў парабкаўскую кватэрку, а сам, спатканы роднымі, пайшоў у пакоі. "Вы пачакайце крыху, зараз прыдуць і дадуць вам есьці", суцешыў ён мяне з ганку пакояў. <...>
> Мінула гадзіна часу — мінула больш — я ўсё чакаў, маючы справу з мухамі. Раптам у пакоях Іваноўскіх зайграла музыка. Пачуліся тэнаровыя засьпевы. Музыка і песьні стройнаю мэлёдыяй выліваліся ў адчыненыя вокны пакояў. Ад іх нясло панскім задавальненьнем, бясьпекаю і асалодаю жыцьця. Ну, на мяне–ж раптам музыка нагнала злосьць і роспач. Я ня мог яе слухаць спакойна, тут–жа ўзмоцнена пачаўшы думаць, як быць. Было ясна, што дзядзька Тройца пра мяне забыў. <...> Што аставалася рабіць? Чакаць? Чаго? У момант перада мною вызначылася выразная рашучасьць — кінуць Лябёдку і дзядзьку Тройцу. <...> З карзінкаю за плячыма я выйшаў з двара фальварку і пад зыкі музыкі пайшоў на станцыю[29].

Калі нават пераказ Жылуновіча адпавядаў сапраўднасьці, дык яго "прэтэнзіі" выклікаюць зьдзіўленьне. Чаго яшчэ мог чакаць кандыдат на парабка ў маёнтку? Вацлаў спаткаў яго ў Лідзе, запрасіў на вячэру, прыслаў яму нават нейкую асобную павозку, а значыць, абыходзіўся зь ім выключна гасьцінна. Абурыўся ж З. Жылуновіч толькі на тое, што аканом не зьявіўся да яго адразу... Затое не адпавядаюць сапраўднасьці "дэкарацыі" — Лябёдка не была "звычайным будынкам", але адной з найпрыгажэйшых сядзібаў на Гарадзеншчыне. Можна засумнявацца і ў тым, што зраньня там арганізоўвалі канцэрты; як пісаў Жылуновіч са Скрыбава, куды яны прыехалі яшчэ раніцай, дабірацца конна да Лябёдкі трэба было гадзіну... Жылуновіч яўна перабольшыў.

Нападкі з польскага і беларускага боку былі непрыемныя, але В. Іваноўскі зносіў іх цярпліва і не адгукаўся публічна. Ён рэдка ўдзельнічаў у віленскіх імпрэзах беларусаў, час ад часу фінансава дапамагаў рэдакцыі газэты "Biełaruskaja Krynica " і "Шлях Моладзі"[30]. Ён адышоў ад беларускага руху і нёс за гэта адпаведную кару: забыцьцё і непрыязь. Калі пасьля доўгіх стараньняў пад канец 1937 г. было зарэгістраванае варшаўскае Беларускае Асьветніцкае Таварыства, ніводзін беларускі часопіс не назваў яго імя ў ліку заснавальнікаў гэтай арганізацыі[31]. Часам яго абвінавачвалі ў тым, што ён выкаўзнуўся ад рэпрэсіяў польскай адміністрацыі, ад якіх пацярпелі дзеячы заходнебеларускага руху, і вёў у Варшаве раскошнае жыцьцё[32].

Разгледзім, наколькі абгрунтаваныя былі гэтыя абвінавачаньні ў сьвятле яснага на

[29] Цішка Гартны (Жылуновіч З.). Дваццаць гадоў назад // Полымя. 1929. Травень. С. 164.
[30] Ліст супрацоўніка гэтых часопісаў Мар'яна Пецюкевіча да аўтара ад 16.08.1978 г.
[31] Гл.: Беларускі Фронт. 1937. 5 сьнежня; Шлях Моладзі. 1938. 25 сакавіка; Беларускі Летапіс. 1938. № 1; Калосьсе. 1938. № 1.
[32] Касяк І. Тамсама. С. 34, 36.

першы погляд пытаньня: ці існавала ў той час альтэрнатыва для нацыянальнай апатыі В. Іваноўскага — словам, ці мог ён і якім чынам ажыцьцявіць галоўную мэту свайго жыцьця, якой была беларуская дзяржава?

Пачнём ад Рыскага трактату, які для В. Іваноўскага азначаў канец яго палітычнай кар'еры. Усталяваны ім падзел Беларусі стварыў сытуацыю, якая не абяцала стабілізацыі. Тэарэтычна як Польшча, так і Савецкая Расея маглі выкарыстаць свае часткі Беларусі для стварэньня П'емонту для будучага аб'яднаньня, але на практыцы толькі Расея мела да гэтага свой інтарэс і магчымасьці.

Беларускі П'емонт на ўсходзе мусіў быць, натуральна, прыцягальным як для беларусаў, што апынуліся ў Польшчы, так і для палітычных эмігрантаў у Нямеччыне, Чэхаславаччыне, краінах Балтыі і г.д. Таму ў першыя гады існаваньня БССР Масква пайшла на значныя саступкі, якія павінны былі сьведчыць аб тым, што савецкія ўлады ўзяліся за ажыцьцяўленьне беларускіх палітычных пастулятаў.

Толькі цяпер Беларусі была вернутая пераважная частка яе ўсходніх абшараў, якія ў студзені 1919 г. "прысабечыла" сабе Расея, так што пад канец 1926 г. тэрыторыя рэспублікі дасягала ўжо 126 тыс. кв.км, а насельніцтва — 5 мільёнаў чалавек. Гэта была невялікая "дзяржава", хаця ў тагачаснай Эўропе няцяжка было знайсьці і драбнейшыя. Хуткімі тэмпамі ішла адбудова эканомікі, асабліва — сельскай гаспадаркі, прадукцыя якой у 1928 г. дасягнула рэкорднага ўзроўню. Гэтаму спрыяла паляпшэньне матэрыяльнага становішча сялянства, якое складала больш за 80% ад насельніцтва краю.

Але асабліва істотнае значэньне мелі саступкі ў моўнай і культурнай галінах, якія павінны былі перадвызначыць нацыянальны характар будаванага Беларускага Дому. Таму была абвешчана шырокая праграма беларусізацыі краю, яна прадугледжвала ўвядзеньне беларускай мовы ў дзяржаўную адміністрацыю, адукацыю, культурную, навуковую, выдавецкую дзейнасьць і г.д. Кожны грамадзянін Савецкай Беларусі абавязаны быў авалодаць і ўжываць літаратурную беларускую мову. Ажыцьцяўленьнем гэтай праграмы апекаваўся ўрад БССР.

І сапраўды, ва ўсіх гэтых галінах за кароткі час быў дасягнуты значны посьпех. У 1923—1931 гг. выданьне кніжак на беларускай мове павялічылася з 28 да 1301 найменьняў, а іх наклад — з 96 тыс. да 10,2 млн асобнікаў. За той самы пэрыяд доля беларускамоўных кніг у агульнай прадукцыі БССР паднялася з 15 да 88%, а іх накладаў — ад 21 да 95%[33]. Паўстала сыстэма нацыянальнай адукацыі, у т.л. і вышэйшай. Такім чынам, Савецкая Беларусь паступова ператваралася з ідэалягічнай канцэпцыі ў палітычную рэальнасьць. Так прынамсі здавалася.

Палітыка беларусізацыі ў БССР зрабіла глыбокае ўражаньне на нацыянальных дзеячоў за мяжой, бо сьведчыла пра ажыцьцяўленьне іх асноўных эканамічных і культурных патрабаваньняў савецкімі ўладамі. Гэта ў пэўнай ступені прывяло да зьмены стаўленьня эміграцыі да камунізму. У канцы 1925 г. на Бэрлінскай канфэрэнцыі эміграцыйны ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі прызнаў БССР адзінай нацыянальнай беларускай дзяржавай[34], пасьля чаго большая частка яго сяброў вярнулася ў Менск. Нямала дзеячоў вярнулася на радзіму зь Літвы, Латвіі, Нямеччыны і Чэхаславаччыны. Беларуская сталіца ніколі дагэтуль ня бачыла такой канцэнтрацыі нацыянальнай эліты, як напрыканцы 20-х гг.

Усходні П'емонт значна ўплываў на пазыцыю інтэлігенцыі і настроі народных мас,

[33] Друк БССР. Мінск. Пастаяннае выданне.

[34] Перад Бэрлінскай канфэрэнцыяй урад БНР прызнаў Менск адзіным цэнтрам нацыянальна-дзяржаўнага адраджэньня Беларусі і самараспусьціўся. Але ён не перадаў, як таго патрабаваў ЦК КП(б)Б, паўнамоцтваў ураду БНР да ўраду БССР. Да таго ж ён ня меў права рабіць крокі падобнага кшталту бяз згоды Прэзыдыюму Рады БНР. Што датычыць Бэрлінскай канфэрэнцыі, дык яна прызнала Менск цэнтрам беларускага адраджэньня. — *А.С.*

якія сілай Рыскага трактату апынуліся ў польскай дзяржаве. Варшава ня здолела супрацьпаставіць Маскве пазытыўнай палітыкі стасоўна беларускай нацыянальнай меншасьці. У Рызе перамагла канцэпцыя інкарпарацыі, асноўным прынцыпам якой было ўзмацненьне польскага элемэнту на крэсах шляхам іх каляніізацыі ды палянізацыі мясцовага беларускага насельніцтва.

Паводле разьлікаў беларускага дэмографа А. Ракава, за ўсю міжваенную пару ў Заходнюю Беларусь перасялілася каля 300 тыс. польскіх асаднікаў, паліцыянтаў, чыноўнікаў, настаўнікаў і г.д.[35].

Асабліва важным элемэнтам гэтай палітыкі была зямельная рэформа, якой падлягалі ў большасьці сваёй былыя маёнткі расейскага скарбу і Праваслаўнай Царквы, тады як польскіх памешчыкаў яна закранула толькі ў невялікай ступені. Прытым большасьць распарцэляваных земляў пераплыла ў гэтым перадзеле не мясцовым беларускім сялянам, а польскім вайсковым і цывільным асаднікам.

Гэта прывяло да зямельнага голаду і паўпэрызацыі заходнебеларускай вёскі, што і без спэцыяльнай інсьпірацыі з–за ўсходняга кардону ўплывала на радыкалізацыю настрояў насельніцтва і ўзмацненьне клясавых і нацыянальных антаганізмаў. У Менску спрытна выкарысталі гэтую сытуацыю для актывізацыі рэвалюцыйнага руху на заходнебеларускіх абшарах. Таму ўжо ў першыя пасьляваенныя гады распачаліся партызанскія дзеяньні і карныя акцыі паліцыі ў адказ, палалі маёнткі і вёскі, гінулі паліцыянты і сяляне. Клясавую напружанасьць падагравала палянізацыйная палітыка ўладаў, асабліва — у асьветнай і рэлігійнай галіне.

Так пачаў раскручвацца калаўрот падзеяў, спыніць які было ўжо немагчыма. Як пісаў Казімеж Падляскі, польскія ўлады ўблыталіся ў сытуацыю, зь якой ужо не было добрых выхадаў[36]. У 20–х гг. беларускі рух на далучаных да польскай дзяржавы абшарах разьвіваўся яўна пад уплывам усходняга П'емонту. Гэта датычыла ня толькі Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі і яе легальных прыбудоваў накшталт Грамады або Змаганьня, але ў вялікай ступені таксама і некамуністычных згуртаваньняў, у т.л. і беларускай Хадэцыі, якую віленскі біскуп Рамуальд Ялбжыкоўскі абвінавачваў у тым, што яна ўпала ў "аблужу рэлігійнага індэфэрэнтызму і бальшавізму"[37].

І таму не перабольшваў Людвік Абрамовіч, калі пад канец 20–х гг. так ацэньваў тагачасную сытуацыю:

> ...Увесь беларускі рух мае выключна сялянскі характар, і таму — аднабаковы, скрайне радыкальнага адценьня. Калі ён знаходзіцца пад уплывам Менску, дык гэта ў значнай ступені таму, што толькі адтуль мае падтрымку, з польскага ж боку ён сустракаецца або толькі зь непрыязьзю і перасьледам, або з пагардай і зьнявагай, а ў найлепшым выпадку — з абыякавасьцю[38].

У гэты самы час у Крамлі высьпявала новая палітычная стратэгія. Па меры стабілізацыі ў Эўропе надзеі на сусьветную рэвалюцыю згасалі, перамагала канцэпцыя "пабудовы сацыялізму ў адной краіне", ажыцьцяўленьне якой вымагала ўнутранай маналітнасьці і вонкавай бясьпекі СССР. Была сфармулявана праграма паскоранай індустрыялізацыі, матэрыяльную базу якой павінна была ўтварыць акумуляцыя ўнутраных рэсурсаў. Гэта абумовіла прымусовую калектывізацыю сельскай гаспадаркі і патрэбу ў працоўнай сіле на новых шахтарска–прамысловых цэнтрах. Разам з тым расла патрэба ў нармалізацыі вонкавых дачыненьняў, у тым ліку — і з Польшчай, у якой задачы рэва-

[35] Раков А. Население БССР. Минск, 1969. С. 130.
[36] Podlaski K. Białorusini, Litwini, Ukraińcy. Londyn, 1985. S. 38.
[37] Tomaszewski J. Rzeczpospolita wielu narodów... S. 129.
[38] L.A. (Ludwik Abramowicz). Literatura i polityka // Przegląd Wileński. 13.05.1928.

люцыйнага руху адышлі цяпер на задні плян[39]. У гэтай сытуацыі ранейшая стаўка на прыцягальнасьць беларускага П'емонту страціла сваё прапагандысцкае значэньне. Больш за тое, канцэпцыю беларусізацыі прызналі фактарам сацыяльнай і палітычнай дэзынтэграцыі, а таму — у найвышэйшай ступені шкодным.

Такім чынам, з 1929 г. пачалося плянамернае вынішчэньне жыцьцёвых сілаў Беларусі, якое праводзілася пад лёзунгам барацьбы з нацыянал–дэмакратызмам, г.зв. "нацдэмаўшчынай", і працягвалася практычна да пачатку нямецка–савецкай вайны. У выніку, ва Ўсходняй Беларусі амаль цалкам былі зьнішчаныя нацыянальныя кіраўнічыя кадры, уключна з тымі беларускімі камуністамі, якія ўдзельнічалі ў стварэньні БССР. Гэтую кампанію па вынішчэньні сучасны беларускі пісьменьнік Васіль Быкаў ахарактарызаваў наступным чынам (цытуецца зь невялікімі скарачэньнямі. — *Ю.Т.*):

> Ужо ў канцы дваццатых гадоў былі разгромленыя Акадэмія Навук БССР (першы прэзыдэнт якой У. Ігнатоўскі скончыў жыцьцё самагубствам), на рубяжы трыццатых гадоў пачаўся пагром сярод пісьменікаў Беларусі, у творчых аб'яднаньнях. Ужо ў тыя гады была прычыненая непапраўная шкода нацыянальнай культуры, цалкам спыненая палітыка беларусізацыі... Беларускае слова ў гарадах рэспублікі зноў, як і пры царызьме, рабілася ўвасабленьнем "ніжэйшасьці", правінцыйнасьці і неадукаванасьці. Традыцыйная пагарда да нацыянальнай мовы ўзмацнялася пачуцьцём страху і небясьпекі быць абвінавачаным у "нацдэмаўшчыне". Сотні тысяч дзеячоў нацыянальнай культуры — пісьменьнікаў, вучоных, журналістаў, настаўнікаў, а таксама служачых, рабочых і сялян апынуліся ў турмах НКУС, на Калыме, Салаўках, Варкуце, каб ніколі адтуль не вярнуцца...
> Застрэліліся кіраўнікі рэспублікі А. Чарвякоў і М. Галадзед — усё ад страху перад нічым не абгрунтаваным, але пагубным абвінавачаньнем у "нацдэмаўшчыне", да якой аўтаматычна далучаліся абвінавачаньні ў шпіянажы і шкодніцтве. Рэпрэсіі, пабудаваныя на "нацдэмаўшчыне" і іншых фальсыфікаваных злачынствах (шпіянаж на карысьць панскай Польшчы, шкодніцтва, намер адарваць Беларусь ад СССР), ахапілі ўсю нацыю — ад верхніх эшалёнаў да самых дэмакратычных нізоў. Мноства людзей тады было пазбаўленае жыцьця і волі, але былі прафэсійныя групы, якія пацярпелі болей за іншых, і сярод іх — настаўнікі беларускай мовы і літаратуры. Для карных органаў гэта былі нібы "гатовыя нацыяналісты", віна якіх ляжала на паверхні, яе ня трэба было нават інсьпіраваць. Мабыць, з той пары ў нацыянальнай сьвядомасьці беларусаў паняцьце "нацыяналізм" трывала злучылася з пачуцьцём найвялікшай небясьпекі, якая можа пагражаць чалавеку. На ўласным драматычным досьведзе людзі пераканаліся, што абвінаваціць у гэтым жахлівым злачынстве могуць кожнага, хто нарадзіўся ў тутэйшых мясьцінах і мае няшчасьце размаўляць па–беларуску. Беларуская мова, якая нядаўна яшчэ бурна квітнела ў гарадах, пачала вянуць навідавоку, жалезным памялом яе вымяталі з установаў, ВНУ, Акадэміі навук, арганізацыяў і органаў улады. Права карыстацца ёй засталося за некалькімі газэтамі, двума тэатрамі ды Саюзам Пісьменьнікаў, які перад вайной скараціўся да двух дзясяткаў членаў. Астатнія былі зьнішчаныя або знаходзіліся ў лягерох на ўсходзе краіны[40].

Магло б здацца, што на пачатку 30–х гг., у меру таго, як савецкія ўлады крышылі ўсходні П'емонт, нарэшце надышоў час для Польшчы, каб разыграць беларускую карту.

[39] Самыя новыя дасьледаваньні паказваюць, што Сталін ня верыў у магчымасьць рэвалюцыі на Захадзе, аднак ён ня верыў і ў магчымасьць пабудаваць сацыялізм у адной асобна ўзятай краіне. Паскораная індустрыялізацыя служыла перш–наперш стварэньню магутнага ваенна–прамысловага комплексу. Калі гэтая задача была ў асноўным рэалізаваная, на XVIII зьезьдзе КП(б) (сакавік 1939 г.) у якасьці галоўнае задачы савецкае замежнае палітыкі было пастаўленае "павелічэньне ліку савецкіх рэспублік". Адразу па зьезьдзе пачаўся пошук шляхоў да савецка–нямецкага збліжэньня, вынікам чаго стаў пакт Рыбэнтропа–Молатава. — *А.С.*

[40] ЛіМ. 1988. 25 чэрвеня.

Відаць, Масква так і павяла б сябе, калі б апынулася на месцы Варшавы. Але выйшла іначай: антыбеларускі паход савецкіх уладаў з ахвотай падтрымала і Польшча. Калі ў 20–я гг. польскія ўлады змагаліся зь беларускім палітычным нацыяналізмам, дык у 30–я гг. яны імкнуліся задушыць нават культурную актыўнасьць. Неўзабаве былі зьліквідаваныя рэшткі беларускага школьніцтва, аматарскі тэатральны рух у правінцыі, беларускую мову выціснулі з касьцёлаў, а ксяндзоў перавялі ў польскія парафіі. У 1936—1937 гг. былі зачыненыя апошнія грамадзкія арганізацыі ў Вільні: Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры, Таварыства Беларускай Школы і Беларускі Нацыянальны Камітэт, а іх найбуйнейшых дзеячоў выселілі або дэпартавалі ў канцэнтрацыйны лягер у Бярозе Картускай.

Казімеж Падляскі — сучасны польскі прапагандыст адраджэньня даверу і супрацоўніцтва паміж Польшчай і яе ўсходнімі суседзямі — Беларусьсю, Літвой і Украінай — так падсумаваў вынікі палітыкі міжваеннага польскага ўраду ў дачыненьні да беларускай нацыянальнай меншасьці:

> Як нацыя мы былі гаспадарамі становішча на заходніх беларускіх землях, як ніколі дагэтуль — і як ніколі пазьней. І нічога для іншых мы не зрабілі там добрага. Ані чарговыя ўрады, ані моцныя апазыцыйныя згуртаваньні. Нацыя таксама не прысьпешвала польскіх палітыкаў, каб яны ня йшлі па лініі найменшага супраціву. І тое, што яна не разумела сытуацыі, і тое, што апошняя была нялёгкай — не апраўданьне. Існаваў шанец на тое, каб пад супольным дахам II Рэчы Паспалітай паўстаў беларускі П'емонт — цэнтар сапраўднай і незалежнай культуры, вялікая школа нацыянальных дзеячоў у асьвеце, эканоміцы, самакіраваньні і ... палітыцы. Простая супрацьвага фікцыі БССР, выклік сталінскай нацыянальнай палітыцы. Мы гэты шанец змарнавалі[41].

Драматычная доля беларускага нацыянальнага руху ў абедзьвюх частках падзеленай краіны ў міжваенную пару выключала магчымасьць пасьпяховай адбудовы беларускай дзяржаўнасьці. Ані Масква, ані Варшава не былі ў тую пару зацікаўленыя ў вырашэньні гэтай праблемы, а прыцягальны ўсходні П'емонт аказаўся звычайным ашуканствам.

У гэтай сытуацыі, пры ўсім справядлівым расчараваньні польскай палітыкай, арыентацыя заходнебеларускіх дзеячоў на Менск і Маскву была трагічнай наіўнасьцю. У нармальных умовах яны заплацілі б за гэта вечнай палітычнай кампрамэтацыяй, але ў тагачасных варунках кошт іх наіўнасьці быў яшчэ большы. Сябры КПЗБ і Грамады, якія прамянялі польскі астрог на прытулак у СССР, былі замучаныя ў лягерох і казематах НКУС, а іх кіраўнік Браніслаў Тарашкевіч даведзены да асаблівага прыніжэньня — ён абвінавачваў сваіх нядаўніх таварышаў як нацдэмаў, правакатараў і ворагаў народу, аднак і гэта ня выратавала яго ад расстрэлу[42].

Але В. Іваноўскі ня быў наіўны. Праўда, можна спрачацца, ці была яго палітычная апатыя наступствам таго, што ён прадбачыў акурат гэткую ходу падзеяў, затое не падлягае сумневу, што ён ня бачыў ніводнай прымальнай альтэрнатывы. Хаця ён і мог заняцца абмежаванай культурна–асьветніцкай дзейнасьцю, але з прычыны нэгатыўнай польскай палітыкі яна не абяцала сур'ёзных посьпехаў. Ён мог таксама павялічыць кола пакутнікаў у барацьбе бяз шанцаў на выйгранку, а таму бессэнсоўнай з нацыянальнага гледзішча. І таму ён чакаў вялікага ўзрушэньня, якое б разбурыла створаны ў Вэрсалі і Рызе палітычны ўклад у Эўропе. Толькі яно магло б наблізіць мару пра беларускую дзяржаўнасьць.

І гэтае ўзрушэньне зьдзеялася 1 верасьня 1939 г.

[41] Podlaski K. Тамсама. С. 35.

[42] Sprawy narodowościowe. 1935. № 1—2. S. 70; Аўтабіяграфія Б. Тарашкевіча за 1933 г. // Саковіч А. У пошуках праўды. Ньюёрк—Клівлэнд, 1988. С. 134.

Новы шанец

Вацлаў і Юры Іваноўскія выехалі з Варшавы не пазьней 11 верасьня 1939 году, бо на наступны дзень усе дарогі, што вялі з сталіцы на ўсход і на поўдзень, былі перарэзаныя войскамі Вэрмахту. Яны разьвіталіся ў Любліне, гэтым разам назаўсёды. Юры падаўся да Румыніі, а адтуль — да Францыі і Вялікай Брытаніі, падзяліўшы лёс новай польскай эміграцыі. Вацлаў жа, ачуняўшы пасьля кантузіі, якую ён атрымаў падчас бамбардаваньня Любліну, накіраваўся ў Вільню.

Мы ня ведаем, перад ці пасьля 17 верасьня рушыў ён зь Любліну да Вільні і ці разумеў ён, што апынецца на тэрыторыі, захопленай Чырвонай Арміяй. Безумоўна, гэта высьветлілася падчас падарожжа, якому давялося зацягнуцца на некалькі дзён. Аднак наступ савецкіх войскаў не паўплываў на зьмену яго кірунку: Вацлаў не павярнуў з дарогі назад і каля 20 верасьня дабраўся да Вільні. Не скарыстаў ён і пазьнейшыя легальныя магчымасьці, каб вярнуцца ў Варшаву. Ён хацеў быць у Вільні.

Як і шмат разоў раней, гэтае рашэньне Вацлава зрабілася прадметам шматлікіх і разнастайных камэнтароў — бо накіраваўся ён усё ж такі "да бальшавікоў". У яго сям'і сьцьвярджалі, што да выезду з Варшавы Вацлава схілілі не палітычныя матывы, а заклік палкоўніка Ўмястоўскага[1]. Затое Іван Касяк пісаў, што прычынай выезду было закрыцьцё варшаўскай Палітэхнікі, у выніку чаго Вацлаў мусіў шукаць працы. Пры гэтым аўтар забывае, што ў верасьні 1939-га лёс Палітэхнікі яшчэ ня быў вырашаны[2]. І ўжо зусім фантастычна гучалі "цьверджаньні" савецкіх аўтараў, паводле якіх Вацлаў застаўся пад нямецкай акупацыяй, заснаваў Беларускі камітэт у Варшаве і зрабіўся намесьнікам старшыні Галоўнай рады Беларускага камітэту самапомачы ў Бэрліне[3].

Адзінае прымальнае вытлумачэньне гэтага рашэньня Вацлава можна знайсьці ў сьведчаньні інжынэра Віктара Чарвінскага, які вучыўся ў Іваноўскага ў Палітэхніцы. Перад самай вайной Чарвінскі кіраваў будаўніцтвам фабрыкі штучнага валакна на Віленшчыне і ўвосень 1939 г. выпадкова сустрэў свайго былога прафэсара ў Вільні. "Што Вы тут робіце, пане прафэсар?" — зьдзіўлена запытаўся Чарвінскі. На што Іваноўскі адказаў: "Чакаю выезду ў Менск, каб будаваць Беларусь, бо я ж беларус, як Вам вядома. Хачу быць у цэнтры падзеяў"[4].

Імавернасьць такога дыялёгу не выклікае сумневу, бо не магло існаваць важнейшых прычын, якія б змусілі ўжо 59-гадовага Вацлава пакінуць сваякоў ды працу, каб туляцца па ваенных дарогах. Наіўна таксама было б меркаваць, што тут адыгрывалі нейкую ролю заклікі палкоўнікаў ці спадзяваньні на сытнейшае жыцьцё ў Вільні. Усё гэта ня мела аніякага значэньня ў параўнаньні з новым шанцам папрацаваць дзеля беларускай дзяржаўнасьці, які зьявіўся ў выніку распаду міжваенных палітычных структураў у Эўропе. Іваноўскі чакаў такога шанцу амаль дваццаць год, а досьвед гэтай пары, у прыватнасьці, разбурэньне Беларускага Дому на ўсходзе, узмацняў ягоную ідэю адбудаваць Беларусь, абапіраючыся на Польшчу. У думках ён ізноў вяртаўся да канцэпцыі фэдэрацыі.

Між тым і надалей не існавала аніякіх рэальных перадумоваў для ажыцьцяўленьня ягонае ідэі. Па-першае, яна супярэчыла інтарэсам Масквы і Бэрліну, па-другое — не знаходзіла разуменьня ў Парыжы, Лёндане і Вашынгтоне, і, урэшце, па-трэцяе — большасьць польскіх і беларускіх дзеячоў, грунтуючыся на міжваенным досьведзе, лічыла

[1] Życie i działalność polityczna prof. Wacława Iwanowskiego. Dyskusja na posiedzeniu Senackiej Komisji Historii i Tradycji Uczelni PW w dniu 14.02.1984 r. S. 42. Archiwum Pracowni II wojny światowej Instytutu Historii PAN, A 772/85.

[2] Касяк І. Заўвагі да артыкулу аб Іваноўскім // Беларуская Думка. 1984. № 29. С. 34.

[3] Цанава Л. Всенародная партизанская война в Белоруссии против фашистских захватчиков. Т. II. Минск, 1951. С. 645, 682.

[4] Паведамленьне праф. Яна Карыткоўскага ад 27.09.1978.

гэтую канцэпцыю амаль што нацыянальнай здрадай. Такія настроі падмацоўвала верасьнёўская параза Польшчы. У той час, калі ў польскім асяродзьдзі пераважала жаданьне змагацца, каб аднавіць перадваеннае *status quo*, абсалютная большасьць беларускіх дзеячоў ухваляла вынікі скасаваньня Рыскага трактату і вітала аб'яднаньне ўсіх беларускіх земляў у адной савецкай рэспубліцы. Тым больш што першыя крокі новай улады сьведчылі, што яна нібыта рэалізоўвае найважнейшыя сацыяльна–эканамічныя, моўныя ды культурна–асьветніцкія патрабаваньні беларусаў, праігнараваныя ў міжваенную пару польскімі ўладамі.

Аднак неўзабаве зьявіліся першыя расчараваньні. Савецкая ўлада, праўда, надзяляла сялян зямлёй, давала магчымасьць вылучыцца людзям з сацыяльных нізоў, абвясьціла беларускую мову афіцыйнай, уводзіла яе ў школьнае выкладаньне і выдавала на ёй газэты, але адначасова распачала фізычную ліквідацыю вядомых дзеячоў беларускага нацыянальнага руху. У кастрычніку 1939 г. у Вільні былі арыштаваныя Антон Луцкевіч[5], Аляксандар Уласаў, Ян Пазьняк, Вячаслаў Багдановіч і іншыя прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі. Дэпартацыі закранулі таксама чальцоў КПЗБ ды пракамуністычных арганізацыяў. Гэтыя рэпрэсіі спараджалі сярод беларускіх дзеячоў боязь за ўласны лёс, але ў прынцыпе не аслабілі сымпатыі да СССР.

Дадатна паставіліся да новай рэчаіснасьці нават беларускія хрысьціянскія дэмакраты, якія здаўна былі прадметам нападак з боку камуністаў, а таму — як магло б падацца — мелі найменш падставаў, каб ухваляць савецкую ўладу. У студзені 1940 г., гэта значыць, ужо пасьля далучэньня Вільні да Літвы, хадэцкая "Krynica" пісала:

> Верасьнёвы разгром Польшчы даў магчымасьць Савецкаму Саюзу выступіць у ролі абаронцы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ад панскага над імі панаваньня і гэткім чынам направіць несправядлівасьць падзелу Беларусі і Ўкраіны з прад 20–цёх гадоў... Беларусы і ўкраінцы, вялікарусы і казацтва розных тэрыторыяў з запраўдным захапленьнем спаткалі гэты паход і бралі ў ім удзел, бо мэта яго была добра зразумелай: злучэньне беларускіх і ўкраінскіх земель успрыймалася як гістарычная справядлівасьць і даўно чаканая неабходнасьць.
>
> Шмат–хто з раней незадаволеных, як у межах СССР, гэтак і на эміграцыі, шмат чаго даравау і зноў перагледзеў на лепшае свае адносіны да СССР, адчуўшы свае патрыятычныя імкненьні задаволенымі[6].

Магло б падацца, што вядомы сваім рацыяналізмам Іваноўскі на гэты раз пачаў разьлічваць на цуд. Сапраўды, калі ўсе навокал адхіналі саму ідэю польска–беларускай фэдэрацыі, толькі ягонае цьвёрдае перакананьне дапамагала яму верыць у будучыню гэтай ідэі, а таксама спадзявацца, што разьвіцьцё ваенных падзеяў зьменіць погляды палітычных дзеячоў абедзьвюх краінаў. Ня выключана, што ён разьлічваў і на падтрымку Юр'я ў прапагандзе сваёй ідэі сярод эмігрантаў, а таксама на большае паразуменьне ў Менску, дзе зь вялікім скептыцызмам назіралі за заходнебеларускай эўфарыяй.

Кастрычніцкія арышты абмінулі Вацлава Іваноўскага, на што, відаць, паўплывала яго шматгадовая адсутнасьць на беларускай палітычнай сцэне. У канцы таго месяца ў Вільні прыйшла да ўлады літоўская адміністрацыя, а выезду ў Менск яму давялося чакаць яшчэ два гады. Таму яму давялося ўладкавацца ў Вільні. Спачатку ён жыў у свайго старога сябра, інжынэра–архітэктара Лявона Дубейкаўскага, на вуліцы Падгорнай і пачаў выкладаць у Прамысловым ліцэі на Антокалі, дзе да канца 1939 г. навучаньне вялося па–польску. Дарэчы, тут у Іваноўскага вучыўся сын Антона Луцкевіча, Лявон. Адначасова Іваноўскі інтэнсіўна дасканаліў сваю літоўскую мову. Калі

[5] А. Луцкевіч арыштаваны 30 верасьня 1939 г. — *А.С.*

[6] Савецкі Саюз і славянства // Krynica. 1940. 13 studzienia.

адзін зь літоўскіх прафэсараў пахваліў яго, заўважыўшы ў аваладаньні літоўскай мовай вялікі "прагрэс", Вацлаў паправіў: "Ne progresas, o pažanga" (Не прагрэс, але поступ).

У лістападзе 1939 г. Вацлаў сустрэўся з сваім малодшым братам Тадэвушам, прафэсарам заалёгіі Ковенскага ўнівэрсытэту. Іх аб'ядноўвала адзінства поглядаў на найважнейшыя палітычныя праблемы Беларусі і Літвы. У студзені 1940 г. Тадэвуш узначаліў катэдру заалёгіі Віленскага ўнівэрсытэту і паспрыяў таму, каб Вацлаву даручылі катэдру хімічнай тэхналёгіі ў гэтым жа ўнівэрсытэце. На той пасадзе Вацлаў Іваноўскі працаваў да чэрвеня 1941 г., г.зн. да нямецка–савецкай вайны, выкладаючы па–літоўску. Апроч таго, ён працаваў кансультантам у віленскім Тарфяным трэсьце[7].

На той час у Вільні сабралася амаль уся сям'я Іваноўскіх. Апроч Вацлава, Тадэвуша і Станіслава, што ўжо жылі тут, прыехала зь Лябёдкі Сабіна з сынамі Сьцяпанам і Вацлавам і дачкой Ганнай, а таксама сястра Галена Скіндэрыха, мужа якой дэпартавалі на ўсход. Як "эксплёататары" яны баяліся рэпрэсіяў з боку савецкіх уладаў і хаваліся ў Вільні, якая цяпер была на літоўскай тэрыторыі. Апусьцелы фамільны фальварак быў разбураны і вынішчаны. Мясцовыя шукальнікі скарбаў у сваім вандалізьме не пашкадавалі нават памерлых: фамільную труньніцу разьбілі, а парэшткі павыкідалі з трунаў. Потым дзеці "гуляліся" чарапамі Леанарда і Ядзьвігі. Ніхто ім не забараняў...[8]

Увесну 1940 г. сытуацыя ў Эўропе яшчэ больш абвастрылася. Пад націскам пераможнага Вэрмахту палі Данія, Бэльгія, Галяндыя, Нарвэгія і Францыя, пачалася вайна за Вялікую Брытанію. Вырасьлі да таго ж і тэрытарыяльныя апэтыты СССР, пра што сьведчыў напад на Фінляндыю, а таксама акупацыя румынскай Букавіны ды Бэсарабіі. У Літве пакуль панаваў адносны спакой, але мала хто верыў у ягоную трываласьць. Самую вялікую няпэўнасьць спараджалі савецка–нямецкія стасункі. Нічога ў гэты момант ня сьведчыла пра іх пагаршэньне, аднак з разьвіцьцём падзеяў расло агульнае перакананьне, што канфлікт паміж дзьвюма таталітарнымі дзяржавамі непазьбежны.

Палітычная сытуацыя ў Эўропе была няўстойлівая, няясная, шмат яе элемэнтаў магло яшчэ зьмяніцца, але ўвесну 1940 г. прыйшла пара акрэсьліць стратэгічны сцэнар дзеяньня і распачаць адпаведныя прыгатаваньні. Гэтаю справаю Вацлаў Іваноўскі заняўся разам зь Янам Станкевічам — вядомым з даваеннага часу палітыкам, мовазнаўцам і гісторыкам, прыхільнікам польска–беларускага збліжэньня, за што яго шматкроць крытыкавалі беларускія партыі — ад камуністычных да хадэцкіх. У акадэмічным 1939/1940 годзе Станкевіч таксама працаваў у Віленскім унівэрсытэце выкладчыкам беларускай мовы, што спрыяла кантактам паміж ім і Вацлавам Іваноўскім. Ян Станкевіч быў адным зь нешматлікіх дзеячоў, каму Іваноўскі сапраўды давяраў. Зрэшты, яны ведалі адзін аднаго з часоў першай сусьветнай вайны, калі разам працавалі ў Менску і Вільні, а потым — у Польскім інстытуце нацыянальных справаў у Варшаве.

Іваноўскі і Станкевіч выходзілі з таго, што Нямеччына наўрад ці пераможа Савецкі Саюз — зь ягонымі бяскрайнімі абшарамі, зь вялікім людзкім ды матэрыяльным патэнцыялам. І, значыць, акупацыя Беларусі будзе толькі часовай. Як і дзеячы польскага падпольля, яны разьлічвалі, што з гэтай вайны абедзьве вялікія дзяржавы выйдуць вельмі аслабелымі, а арганізатарамі паваеннага ладу ў Эўропе будуць заходнія саюзьнікі. Сумняваючыся, аднак, што гэтыя краіны будуць зацікаўленыя ў стварэньні беларускай дзяржавы, і ня маючы аніякіх магчымасьцяў для дзейнасьці на міжнароднай арэне,

[7] Паведамленьне Ежага Кеўліча, б. дырэктара Тарфянога Трэсту, ад 08.11.1978.

[8] Вацлаў Іваноўскі. Да 110–годдзя 1880—1943. Мінск, 1990. С. 32; Ivanauskas T. Memuarai. Машынапіс у сямейным архіве.

Івваноўскі і Станкевіч спадзяваліся, што беларускае пытаньне можа быць вырашана толькі разам з аднаўленьнем польскай дзяржавы. Фармальнай праўнай падставай гэтага працэсу мелася быць фэдэрацыя Польшчы і Беларусі як дзьвюх незалежных дзяржаваў.

Для ажыцьцяўленьня гэтай канцэпцыі неабходна было заахвоціць польскі эміграцыйны ўрад, які стаў бы яе адвакатам перад заходнімі дзяржавамі. В. Іваноўскі і Я. Станкевіч верылі ў эфэктыўнасьць сваёй ініцыятывы, якая, на іх думку, несла карысьць і адной, і другой краіне. Інтарэс Польшчы меўся палягаць у стварэньні беларускага буфэру, які аддзяляў бы яе ад Расеі, што пасьля далучэньня Ўкраіны стварыла б цалкам новую палітычную сыстэму ўва Ўсходняй Эўропе, здольную да супрацьстаяньня расейскай і польскай экспансіі.

Гэтая далёкасяжная ідэя, што ў асноўных рысах выглядала, як вяртаньне да фэдэрацыйных праектаў 1919—1920 гадоў, павінна была перш за ўсё знайсьці прыхільнікаў сярод кіраўніцтва польскага падпольля ў Варшаве — бо ад яго залежаў зьмест высыланых ураду справаздачаў і прапановаў. Для Іваноўскага і Станкевіча паўстала неабходнасьць навязаць кантакты з кіраўніцтвам падпольля, хаця пакуль не было падставаў асабліва сьпяшацца.

Гэтая задача была нялёгкай зь некалькіх прычынаў: па-першае, трэба было пераадолець прынцыповыя разыходжаньні пазыцыяў у пытаньні тэрыторыі і, па-другое, абодва дзеячы не зьбіраліся выступаць у ролі бедных сваякоў, разьлічваючы на ўзмацненьне беларускага нацыяналізму ўва ўмовах імавернай нямецкай акупацыі, у тым ліку асабліва што ўдасца атрымаць кантроль над адміністрацыяй і стварыць уласныя збройныя сілы. Супрацоўніцтва зь немцамі, безумоўна, было несумяшчальнае з пазыцыяй польскага падпольля і перакрэсьлівала б усе шанцы польска-беларускага дыялёгу. Таму была прыдумана адмысловая тактыка паводзінаў у гэтай складанай справе, якая прадугледжвала двайную гульню з наступным падзелам галоўных роляў: Іваноўскі меўся заняцца афіцыйнай дзейнасьцю, а Станкевіч — стварыць канспірацыйную групу, якую польскія падпольшчыкі не змаглі б абвінаваціць у супрацоўніцтве зь немцамі.

Згодна з гэтым плянам, за колькі дзён да ўваходу Чырвонай Арміі ў Літву, Латвію і Эстонію, які адбыўся 15 чэрвеня 1940 г., Станкевіч выехаў у Варшаву. Іваноўскі ж застаўся ў Вільні і працягваў працаваць ува ўнівэрсытэце. Неўзабаве голым вокам стала бачна, што каля нямецкай мяжы канцэнтруюцца вялікія злучэньні савецкіх войскаў. Гэта паказвала на тое, што СССР рыхтуецца да вайны, а разам з тым сьведчыла і пра слушнасьць яго прадбачаньняў. У чэрвені 1941 г. ён перажыў масавую дэпартацыю насельніцтва Літвы на ўсход, якая і гэтым разам шчасьліва яго абмінула. У той час Іваноўскі часта мяняў месца жыхарства і не выяўляў палітычнай актыўнасьці. Ён чакаў пачатку вайны і вынікаў місіі свайго сябра ў Варшаве.

Прыехаўшы ў Варшаву, Ян Станкевіч пасяліўся на вуліцы Бэднарскай у доме нумар 17 і далучыўся да дзейнасьці Беларускага камітэту, які тады разьмяшчаўся па адрасе: вул. Ксёнжэнца, 4. Станкевіч вёў курсы беларускай мовы, чытаў лекцыі з гісторыі Беларусі. Адначасова ён распачаў стварэньне канспірацыйнай групоўкі пад назвай Партыя беларускіх нацыяналістаў (ПБН), ад імя якой плянаваў выступаць перад польскім падпольлем. Напрыканцы 1940 г. ён пазнаёміўся з Зосяй Дабрынскай, якая адыграла ў гэтай гульні важную ролю. Зося Дабрынская (у дзявоцтве Корсак), родам з Бардзіловічаў на Віцебшчыне, у 30-я гады настаўнічала ў Варшаве. Вынесенае з дому веданьне і польскай, і беларускай мовы і культуры і павага да абедзьвюх нацыяў (у 1905 г. яе маці арганізавала нелегальную беларускую школу. — *гл. разьдзел III*) паспрыялі таму, што яна паразумелася з Станкевічам ува ўсіх асноўных пытаньнях.

Станкевіч намовіў Дабрынскую ўступіць у ПБН, дзе яна атрымала псэўданім "Ціна

Арген", а разам з тым і ў ZWZ—AK[9].

Увесну 1941 г. па рэкамэндацыі графіка Гайкоўскага яе ўзялі ў Бюро інфармацыі і прапаганды Галоўнага ўпраўленьня ZWZ—AK. У БІПе Дабрынская працавала ўва ўсходнім нацыянальным сэктары пад кіраўніцтвам дацэнта Ўладзіслава Тамкевіча ("Кшыштафа"), дзе ёй даручылі беларускія справы. Там яна мела псэўданім "Эва". Адначасова яна ўдзельнічала ў канспірацыйных сходах на кватэры Станкевіча на вуліцы Бэднарскай[10].

На гэтых сходах Дабрынская пазнаёмілася з Самуэлем Кастравіцкім і Вітальдам Буткевічам, якія таксама круціліся па двайной арбіце. Абодва яны паходзілі зь Беларусі і былі стрыечнымі братамі: маці Вітальда, Марыя, была роднай сястрой бацькі Самуэля, Амброжага Кастравіцкага, якога з Вацлавам Іваноўскім яднала сяброўства, фэдэралісцкія перакананьні і дзейнасьць на беларускай ніве напярэдадні і падчас першай сусьветнай вайны. У 1920 г. бацькі абодвух братоў выехалі зь Меншчыны і атрымалі невялікія гаспадаркі ў Лідзкім павеце, аднак Амброжы шмат гадоў жыў у Варшаве, дзе працаваў лекарам. Таму Іваноўскі ведаў Самуэля здаўна, што дазволіла ім лёгка знайсьці супольную мову ў пытаньні канспірацыйнай дзейнасьці. Шмат што гаворыць, што гэта адбылося ў канцы верасьня альбо ў кастрычніку 1939 г. у Вільні, дзе Самуэль хаваўся пасьля верасьнёўскай паразы.

Увосень 1939 г. Самуэль выехаў у Варшаву і працаваў там у вайсковых канспірацыйных арганізацыях. У канцы 1940 г. зь ім увайшоў у кантакт Станкевіч — безумоўна, на прапанову Іваноўскага. Самуэль стаў чальцом ПБН, куды прывёў таксама свайго стрыечнага брата Вітальда. Такім чынам, уся тройца, г.зн. Дабрынская, Кастравіцкі і Буткевіч, распачала дзейнасьць на два бакі, што, на іх думку, мелася служыць адной вялікай справе: аднаўленьню з дапамогай Польшчы беларускай дзяржаўнасьці.

Пры гэтым ім даводзілася быць вельмі асьцярожнымі і захоўваць пільнасьць, каб пазьбегчы магчымых абвінавачаньняў як з боку дзеячоў польскага падпольля, так і з боку беларускіх прыхільнікаў супрацоўніцтва з Райхам, што ў абодвух выпадках пагражала б трагічнымі вынікамі. Бо на ўлучаных у склад СССР заходнебеларускіх тэрыторыях ані на крохі не аслабелі міжнацыянальныя антаганізмы, якія гэтым разам востра адчулі на сабе палякі. Невыпадкова Юзаф Мацкевіч, уважлівы назіральнік тагачасных падзеяў, так ахарактарызаваў двайную гульню Кастравіцкага і Буткевіча ў акупаваным немцамі Менску:

> — Так. Але вернемся да нашых справаў. Што, калі з нашымі навязаць кантакт? — спытаў Генрык.
> — З нашымі? З кім? Зь Пекарчуком? Ці з Буткевічам, ці з тым новым Кастравіцкім? Я нічога пэўнага сказаць не магу. Я магу толькі сказаць, што ня ведаю, хто чыёй рукой гуляе...[11]

Увесну 1941 г., калі ўжо было ясна, што немцы нападуць на СССР, да дзеяньняў у Беларусі рыхтавалася таксама выведка Галоўнага камандаваньня ZWZ—AK. Палкоўнік Тамаш Зан апавядае, што ў тым часе ён быў прызначаны кіраўніком выведкі на паўночна-ўсходняй тэрыторыі, якая ахоплівала Беларусь, Літву, Латвію і Эстонію, і атрымаў загад рыхтаваць кадры для выведніцкіх групаў. Тады да яго зьвярнуліся Кастравіцкі і Буткевіч: яны прасілі залічыць іх у выведніцкую службу ў Беларусі, матывуючы гэта паходжаньнем зь Меншчыны і веданьнем беларускай ды расейскай моваў. Пасьля адпаведнага інструктаваньня Зан прызначыў Кастравіцкага кіраўніком філіі Другога аддзе-

---

[9] ZWZ — *Związek Walki Zbrojnej* —канспірацыйная вайсковая арганізацыя, створаная польскім эміграцыйным урадам (фактычна, на пачатку 1940 г.). Асноўны кірунак дзейнасьці — дывэрсійна-сабатажная работа; камэнданты — ген. К. Сасноўскі (з чэрвеня 1940); у 1942 годзе перайменавана ў Армію Краёвую. — *Рэд.*

[10] Паведамленьне З. Дабрынскай ад 1979 г.

[11] Mackiewicz J. Nie trzeba głośno mówić. Londyn, 1985. S. 125.

лу Галоўнага камандаваньня ў Менску, а Буткевічу даручыў працу на месцах.

Буткевіч пісаў:

> Каб палегчыць сабе выезд і потым абгрунтаваць сваё перабываньне на ўсходзе, мы яшчэ ў Варшаве — па дамоўленасьці з Занам — запісаліся ў Беларускі камітэт, які мясьціўся на вуліцы Ксёнжэнцай, які разглядаў сваіх чальцоў як будучых кандыдатаў на розныя пасады ў цывільнай адміністрацыі ў Беларусі. Нас Камітэт накіраваў у Менск, паабяцаўшы, што па дамоўленасьці з обэрбурмістрам мы зоймем якіясьці пасады ў цывільнай беларускай адміністрацыі на тамтэйшых абшарах[12].

Тамаш Зан у прынцыпе пацьвердзіў гэтае данясеньне Буткевіча, дапоўніўшы яго, зрэшты, істотнымі драбніцамі. Па–першае, візыт у Камітэт адбыўся ўлетку 1941 г., калі ўжо ішла нямецка–савецкая вайна, па–другое, размова вялася зь Янам Станкевічам, які аформіў дакумэнты на выезд, і, урэшце, па–трэцяе — не было патрэбы загадваць Буткевічу і Кастравіцкаму, каб яны ўвайшлі ў Беларускі камітэт, бо яны ўжо да таго былі ягонымі чальцамі. Хутчэй наадварот — якраз Буткевіч прывёў Зана ў Камітэт і адрэкамэндаваў яго Станкевічу, а дакумэнты Зан атрымаў разам зь імі (на прозьвішча “Воўк”), бо ён таксама выяжджаў на ўсход[13].

Падаецца, што на момант пачатку нямецка–савецкай вайны Станкевіч быў ня надта задаволены вынікамі сваёй місіі. Ён сапраўды ўладкаваў Дабрынскую ў БІП, што было нямала, але ж яе дагэтулешнія намаганьні былі безвыніковымі і не прывялі да перамоваў з кіраўніцтвам падпольля. На гэта паўплывалі як недавер да Станкевіча і перакананьне ў невялікім значэньні групоўкі, якую ён прадстаўляў, так і нежаданьне ZWZ весьці дыскусіі наконт будучыні заходнебеларускіх земляў, якія дагэтуль лічыліся неад'емнай часткай Рэчы Паспалітай. Яшчэ Станкевіч прыцягнуў да супрацоўніцтва Кастравіцкага і Буткевіча, але ён недаацэньваў значэньня іхнае дзейнасьці ў сфэры вайсковай выведкі. Гэта ён пакідаў Іваноўскаму.

Тым часам фронт борзда пасоўваўся на ўсход. 24 чэрвеня нямецкія войскі ўвайшлі ў Вільню, 28 чэрвеня — у Менск, а 16 ліпеня занялі Смаленск. Ужо ў ліпені сьледам за нямецкімі войскамі на беларускія і літоўскія землі накіраваліся дзеячы ZWZ—AK, якія, згодна з інструкцыямі Зана, пачалі арганізоўваць выведніцкія сеткі і падпольныя вайсковыя структуры. Аднак Кастравіцкі і Буткевіч чакалі з ад'ездам у Менск і да канца лістапада заставаліся ў Варшаве. Толькі аднойчы — у жніўні — Кастравіцкі ненадоўга выехаў у Баранавічы і Вільню і, спаткаўшыся з Іваноўскім, вярнуўся ў Варшаву. Чаго яны чакалі? Тут прасочвалася сувязь з паводзінамі Іваноўскага, які ўсё яшчэ знаходзіўся ў Вільні. Відаць, Кастравіцкі і Буткевіч ня бачылі магчымасьці абсталявацца ў Менску безь ягонай дапамогі. Ня выключана, што на затрымку з ад'ездам паўплывала жнівеньскае спатканьне Кастравіцкага з Іваноўскім, падчас якога яны пра нешта дамовіліся.

Іваноўскі таксама не сьпяшаўся ў Менск. У ліпені, за нямецкімі войскамі, туды прыехалі Радаслаў Астроўскі, Мікола Шчорс, Вітаўт Тумаш, Адам Дэмідэцкі–Дэмідовіч, Усевалад Родзька, былыя студэнты Іваноўскага — Міхал Вітушка і Мечыслаў Контаўт. Былі і іншыя дзеячы, якія спадзяваліся заняць пасады ў адміністрацыі і стварыць часовы беларускі ўрад, — а ён усё сядзеў у Вільні.

Цяжка з пэўнасьцю сказаць, якія былі на тое прычыны. Магчыма, Іваноўскі чакаў палітычнай дэкларацыі Гітлера наконт захопленых тэрыторыяў альбо хацеў стварыць сабе ў Вільні выгадную стартавую пазыцыю для далейшай дзейнасьці ў Менску — бо, у адрозьненьне ад іншых дзеячоў, ён дагэтуль ня меў кантактаў зь нямецкімі ўладамі і мог быць успрыняты як “чалавек з вуліцы”. Наапошку — што найбольш верагодна — ён

[12] Ліст В. Буткевіча да Б. Закшэўскага (“Оскара”) ад 29.05.1971.

[13] Паведамленьне Т. Зана з 1979 г.

чакаў правалу бліцкрыгу, бо толькі ў гэтым выпадку ён мог разьлічваць на ажыцьцяўленьне сваіх плянаў.

На пачатку ліпеня 1941 г., дзякуючы намаганьням Уладзіслава Казлоўскага, дзеяча беларускага нацыянал–сацыялістычнага руху, нямецкія вайсковыя ўлады дазволілі аднавіць працу Беларускага нацыянальнага камітэту, зачыненага ў 1938 г. віленскім ваяводам. Паводле рапарту нямецкай службы бясьпекі, Камітэт павінен быў утварыць процівагу для "надта актыўнага літоўскага руху"[14]. Неўзабаве адбыўся ўстаноўчы сход з удзелам больш чым 60 мясцовых дзеячоў, на якім было абранае кіраўніцтва БНК. Старшынём быў абраны Вацлаў Іваноўскі, яго намесьнікамі — Язэп Малецкі і Баляслаў Грабінскі, сакратаром — Язэп Найдзюк, скарбнікам — Уладзіслаў Казлоўскі[15].

Камітэт прадстаўляў перад нямецкімі ўладамі інтарэсы беларускага насельніцтва Літвы і плянаваў арганізоўваць беларускае школьніцтва, а таксама нават і вайсковыя адзінкі, кіруючыся інструкцыямі свайго старшыні, Іваноўскага: "<...> няма іншага для нас, як абароньнікаў нацыі, выхаду, як толькі пераймаць усюды ўладу, браць зброю ў свае рукі, паралізаваць усю дзейнасьць нашых нацыянальных ворагаў"[16]. Неўзабаве, аднак, нямецкі давер да Камітэту пачаў памяншацца, бо, паводле данясеньняў паліцыі, вядучыя дзеячы гэтага Камітэту дапускалі "цалкам няясныя і неадпаведныя выказваньні наконт сваіх нацыянальных задач", — у першую чаргу гэта датычыла В. Іваноўскага[17]. Таму немцы адмовіліся ад палітыкі "супрацьвагі" ў дачыненьні да літоўцаў і кінулі падтрымліваць беларусаў у гарадзкіх органах улады.

У верасьні 1941 г. Іваноўскі наведаў Менск з кароткім азнаямляльным візытам. Дабіраўся туды на спадарожных грузавіках у кампаніі доктара Станіслава Грынкевіча ды Язэпа Найдзюка. Менск пасьля ваенных дзеяньняў быў у страшным стане, адусюль вызірала галеча. Усю тройцу прыняў бурмістар, д–р Вітаўт Тумаш. Ён хацеў як найхутчэй зьехаць зь Менску і прапанаваў Іваноўскаму сваю пасаду, абяцаў нават узяць на сябе неабходныя фармальнасьці перад нямецкімі ўладамі[18]. Іваноўскі ў прынцыпе даў згоду, але хацеў яшчэ крыху счакаць з гэтым і вярнуўся ў Вільню.

Вестка пра тое, што Іваноўскаму прапануюць пасаду бурмістра Менску, хутка даляцела да Кастравіцкага ў Варшаве. Той паведаміў навіну Зану, і апошні, спадзеючыся на магчымае супрацоўніцтва, вырашыў асабіста паразмаўляць з Іваноўскім. Але дамо цяпер слова самому Зану[19]:

> Шаноўны спадар Туронак!
>
> У сувязі з Вашым пытаньнем паведамляю абставіны маёй сустрэчы з прафэсарам Вацлавам Іваноўскім.
>
> Увесну 1941 г. я быў прызначаны кіраўніком выведкі ZWZ на паўночна–ўсходнім абшары, які Нямеччына магла заняць у ходзе будучай вайны. Пасьля таго, як яна выбухнула, улетку 1941 г. я прыступіў да арганізацыі ячэек 2–га аддзелу на гэтай тэрыторыі. Кіраўніцтва Менскай ячэйкай (прадстаўніцтвам II) я даручыў Самуэлю Кастравіцкаму.
>
> Перад маім выездам з Варшавы ў Вільню ў верасьні 1941 г. Кастравіцкі параіў мне скантактавацца з праф. Вацлавам Іваноўскім, які на той час жыў у Вільні. У мяне быў адрас праф. Януша Івашкевіча, і той зьвёў мяне з праф. В. Іваноўскім.
>
> Нашая размова адбылася пасьля 25 верасьня 1941 г. у кватэры праф. Івашкевіча на вуліцы

[14] Ereignismeldung UdSSR, 09/07/1941, AAN. Александрыйскі мікрафільм, p. 233/2721449.

[15] Малецкі Я. Пад знакам Пагоні. Таронта, 1976. С. 45; Найдзюк–Александровіч Я. Ліст да аўтара ад 13.11.1978.

[16] Малецкі Я. Тамсама. С. 53.

[17] Ereignismeldung UdSSR, 13.07.1941, AAN. Александрыйскі мікрафільм, p. 233/2721486.

[18] Ліст Я. Найдзюка–Александровіча да аўтара ад 13.11.1978.

[19] Ліст Т. Зана да аўтара ад 24.12.1979.

Зыгмунтоўскай. Мы ведалі, што праф. Іваноўскі неўзабаве павінен заняць нейкую высокую пасаду ў Менску, у сувязі з чым ён мог быць карысны для нашай працы. Тады ж я выклаў Іваноўскаму фэдэрацыйную канцэпцыю паваеннага дзяржаўнага ўладкаваньня Польшчы, Літвы ды Беларусі. Падчас гэтае размовы праф. В. Іваноўскі не пагадзіўся на ніводную з маіх прапановаў аб супрацоўніцтве, адказаўшы мне так: "Я вам дапамагаць ня буду і перашкаджаць ня буду". Наогул, быў ён тады вельмі асьцярожны.

Мы разьвіталіся, не дасягнуўшы ніякіх дамоўленасьцяў. У выведцы ZWZ я працаваў да лютага 1942 г. Ведаю, што да гэтага часу супрацоўніцтва з праф. В. Іваноўскім не было. Потым я перайшоў на дывэрсійную дзейнасьць і ніякіх кантактаў з праф. Іваноўскім ня меў.

Тамаш Зан, пс. "Олесь"

Паўстае пытаньне, чаму Іваноўскі адхінуў прапанову Зана, калі сам жа разьлічваў на супрацоўніцтва з польскім падпольлем. Па–першае, Іваноўскі ведаў, што пададзеная канцэпцыя паваеннай фэдэрацыі адлюстроўвае асабісты погляд Зана, а не пазыцыю польскага ўраду ў Лёндане і ягоных падпольных мясцовых структураў. Па–другое, Іваноўскі хацеў не падпарадкоўвацца, а быць палітычным партнэрам Польшчы ў барацьбе за беларускую дзяржаўнасьць, і прымаць рашэньні ў гэтай справе не ўваходзіла ў кампэтэнцыю Зана. Аднак Зан атрымаў абяцаньне, што польскай выведцы ў Менску ня будуць перашкаджаць, а гэта ў тагачасных умовах было нямала.

Іваноўскі выехаў у Менск толькі ў сярэдзіне лістапада 1941 г., калі нямецкі наступ заграз у падмаскоўных сьнягох. Гэта стварала пэрспэктывы зацяжной вайны, а значыць, паўставалі розныя варыянты яе працягу і заканчэньня. Іваноўскі, вядома, ня мог здагадвацца, што Сталін тады быў гатовы аддаць Нямеччыне Беларусь, прыбалтыйскія рэспублікі і некаторыя іншыя тэрыторыі СССР, каб толькі ўкласьці з Гітлерам мір[20]. Перад ад'ездам Вацлаў даручыў сваёй дачцэ Ганьне вывезьці зь Вільні ў Лябёдку дзьвюх жанчын–габрэек: Эму Альтбэрг і яе сястру Марыю Арнольдзіху, зь якой Іваноўскі пазнаёміўся ў 1904 г. у Плоцку. У 1979 г. Марыя з удзячнасьцю прыгадвала клопат Іваноўскага, які ўратаваў яе і сястру ад гета і ад сьмерці.

Насьцярожанасьць віленскай паліцыі не ўзбуджала даверу да Іваноўскага і ў Менску, таму ён атрымаў пасаду не бурмістра, а яго намесьніка. Відавочна, акупацыйныя ўлады спадзяваліся знайсьці на пасаду бурмістра больш адпаведнага кандыдата. 17 лістапада Тумаш перадаў Іваноўскаму свае абавязкі і ад'ехаў у Бэрлін[21]. Такім чынам, да чэрвеня 1942 г. дзейнасьцю менскай гарадзкой управы кіравалі два намесьнікі бурмістра: Вацлаў Іваноўскі (пытаньні асьветы і культуры) і Адам Дэмідэцкі–Дэмідовіч (гаспадарчыя пытаньні).

Амаль цэлы год — зь лістапада 1941 г. да восені 1942 г. — Іваноўскі жыў на адной кватэры з сваім сакратаром зь віленскага БНК Язэпам Найдзюком, які выехаў у Менск крыху раней і працаваў у Выдавецтве школьных падручнікаў і літаратуры для моладзі. Іхныя тагачасныя бытавыя ўмовы Найдзюк апісваў так:

Я жыў разам з прафэсарам Іваноўскім на агульнай кватэры па вуліцы Ленінградзкай. Была ў нас агульная домработніца, цётка Галена, якая гатавала нам ежу. Мы займалі тры пакоі і кухню. У кожнага з нас быў свой пакой, а адзін быў супольны, у якім затрымліваліся прыежджыя госьці. У гэты час я бліжэй пазнаў прафэсара Іваноўскага як добрага, інтэлігентнага і вучонага чалавека. Ён не захапляўся ідэямі і праграмай Гітлера, ня быў германафілам. Яго найвялікшым імкненьнем была арганізацыя якога–колечы жыцьця ў горадзе, каб людзі не галадалі. А таксама — адкрыцьцё беларускага ўнівэрсытэту ў Менску. <...> У Менску мы жылі вельмі сьціпла. Часта

[20] Хрущев Н.С. Воспоминания // Огонёк. 1989, август; Павленко Н. Трагедия Красной Армии // Московские Новости. 1989. 7 мая.

[21] Раніца. 1941. 10 сьнежня.

елі чэрствы, не найлепшай якасьці чорны хлеб, час ад часу траплялася каніна. Вясною найчасьцей мы елі зялёную салату з цыбуляй, а пазьней — вараную і сьвежую капусту з сольлю і моркву. Замест цукру ўжывалі патаку. Салату і капусту мы елі часта безь сьмятаны і скварак. Аднак часам знаёмыя з правінцыі прывозілі трохі сыру, саланіны і яец. Тады ў нас была вялікая ўрачыстасьць, вялікае сьвята[22].

А вось што ўспамінае Лявон Галяк, які таксама жыў у доме на вуліцы Ленінградзкай:

Прыпамінаю спатканьне Новага 1942 году ў В. Іваноўскага. Калі заціхла страляніна вітаньня Новага Году немцамі, прыйшоў павіншаваць з Новым годам немец, адміністратар дому. Іваноўскі вынес яму ў калідор на талерачцы кілішак і сэндвіч, падзякаваў і выправіў. Мне было вельмі прыемна гэта бачыць, бо, на жаль, часта наглядалася ў адносінах да немцаў нізкапаклоньніцтва, але Іваноўскі патрапіў захавацца адпаведна[23].

Тым часам у Беларусі панавалі хаатычныя палітычныя дачыненьні, нарасталі сацыяльныя канфлікты. Гітлер, які перад нападам на СССР шмат разоў абяцаў утварыць пад пратэктаратам Нямеччыны асобную беларускую дзяржаву, у часе вайны аніяк не выказваўся на гэты конт. 17 ліпеня 1941 г. ён выдаў дэкрэт, паводле якога быў створаны вялікі абшар акупацыйнай цывільнай адміністрацыі — Райхскамісарыят Остлянд, у які ўваходзілі Беларусь, Літва, Латвія і Эстонія[24].

А пакуль дэкрэт рыхтаваўся, уладу ў Беларусі ажыцьцяўляў Вэрмахт. Паколькі не было дырэктываў Гітлера наконт яе палітычнага статусу, вайсковыя ўлады, адказныя за арганізацыю мясцовай адміністрацыі, кіраваліся не нацыянальнымі крытэрамі, а прагматызмам. На заходнебеларускіх землях, якія ў міжваенную пару належалі да Польшчы, вайсковыя ўлады ахвотна даручалі кіраўнічыя пасады ў адміністрацыі і паліцыі палякам, якія сюды вярталіся, дзякуючы найперш іх прафэсійнаму досьведу і антыкамуністычным пераканальням.

Кантроль над мясцовым апаратам улады абуджаў надзеі польскіх дзеячоў на стварэньне ва ўмовах акупацыі такога фактычнага стану, які б спрыяў аднаўленьню польскай дзяржаўнасьці на заходнебеларускіх землях. Стратэгічна яны імкнуліся выключыць з палітычнай гульні беларусаў, якіх яны незалежна ад іх арыентацыі — незалежніцкай ці савецкай — разглядалі як перашкоду ў дасягненьні гэтай мэты. Гэтыя імкненьні ўзмацняліся яшчэ прагай помсты за вядомыя падзеі 1939—1941 гадоў, што выклікала шматлікія асабістыя рахункі. Пасыпаліся даносы на беларусаў як на камуністаў, што ў першыя тыдні акупацыі выклікала шмат ахвяраў, асабліва сярод беларускай інтэлігенцыі.

Эскаляцыя польска-беларускага канфлікту рабілася непазьбежнай, хаця пакуль што нешматлікая і разьяднаная беларуская інтэлігенцыя, над часткай якой вісела суровае абвінавачаньне ў падтрымцы савецкай улады, не магла супрацьстаяць актыўнасьці палякаў. Мала памагло і тое, што немцы прывезьлі з эміграцыі групу беларускіх адміністрацыйных работнікаў — іх было ўсяго некалькі дзясяткаў, і большасьць зь іх асела ў Менску. Тут іх чакала вялікае расчараваньне. Неўзабаве пасьля прыезду ў Менск іх пачалі "вучыць і пераконваць", што весьці палітычную дзейнасьць, прынамсі пакуль, — бессэнсоўна. Іх таксама паінфармавалі, што гэта не перадвызначае стаўленьня Нямеччыны да беларускага пытаньня, бо ў гэтай справе ўсё яшчэ чакалі рашэньня Гітлера.

Новая сытуацыя ўзьнікла ў верасьні 1941 г., калі быў усталяваны акупацыйны цыв-

[22] Ліст Я. Найдзюка-Александровіча да аўтара ад 13.11.1978.

[23] Галяк Л. Успаміны. ЗША, 1982. С. 163.

[24] Палітычную сытуацыю на Беларусі ў 1941—1944 гг. я падрабязна прадставіў у кн. "Беларусь пад нямецкай акупацыяй. (С. 510—677 гэтага выданьня. — *Рэд.*) да якой адсылаю чытачоў, зацікаўленых, у прыватнасьці, дакумэнталізацыяй тагачасных падзеяў.

ільны рэжым, які ўзначаліў генэральны камісар Беларусі Вільгельм Кубэ. Нягледзячы на шматгадовы досьвед палітычнай дзейнасьці, у Беларусі ён сутыкнуўся з праблемай, якую назваў беспрэцэдэнтнай. Краіна, у якую накіраваў яго Гітлер, ня мела традыцыі дзяржаўнай самастойнасьці, вынікам чаго стаў слабы ўзровень нацыянальнай сьвядомасьці беларускага насельніцтва і моцныя расейскія і польскія палітычна–культурныя ўплывы. Пра гэта асабліва сьведчыла нанятая цывільным рэжымам мясцовая адміністрацыя, нацыянальны склад якой у вельмі малой ступені супадаў з назвай краіны. Таму невыпадкова Кубэ занатаваў: "Беларусь перадусім была ня больш чым цьмяным геаграфічным паняткам у самым непасрэдным значэньні гэтага слова"[25].

У адрозьненьне ад афіцыйнай бэрлінскай палітыкі, якая зводзілася найперш да эканамічнай эксплёатацыі акупаваных абшараў, Кубэ ад пачатку сваёй дзейнасьці ў Менску імкнуўся прышчапіць Беларусі нацыянальную ідэнтычнасьць. Магчымасьць для гэтага яму давала моцная асабістая пазыцыя, якую ён займаў дзякуючы падтрымцы Гітлера. У сваіх артыкулах і інтэрвію Кубэ часта прапагандаваў прынцыпы гэтай палітыкі, даводзячы, што ўва ўмовах, вольных ад расейскага ды польскага палітычнага дамінаваньня, якія стварыла нямецкая акупацыя, беларускі народ атрымаў шанец за кароткі час нагнаць гістарычнае спазьненьне ў разьвіцьці сваёй нацыянальнай сьвядомасьці. Дзейнасьць акупацыйных уладаў у палітычным пляне павінна быць скіравана на паскарэньне гэтага працэсу, на пераадоленьне чужога ідэйнага ўплыву і ўзмацненьне беларускіх нацыянальных элемэнтаў перш за ўсё: праз разьвіцьцё школьніцтва, культуры і працы сярод моладзі. Гэтая новая дарога разьвіцьця павінна была прывесьці Беларусь да эўрапейскай супольнасьці нацыяў і дзяржаваў. Генэральная Акруга Беларусь, — сьцьвярджаў Кубэ, — такім чынам, павінна выконваць ня толькі адміністрацыйныя функцыі, прадыктаваныя ўмовамі вайны, яе прызначэньне — стварыць бацькаўшчыну для беларускай нацыі[26].

Заняўшы сваю пасаду ў Менску, Кубэ адразу пачаў увасабляць гэтыя прынцыпы ў жыцьцё. Пад лёзунгам "Беларусь для беларусаў" ён прапагандаваў ідэю нямецка–беларускага адзінства інтарэсаў і супрацоўніцтва, клапаціўся пра аднаўленьне школьніцтва і культурных установаў, абараняў менскія музэі і бібліятэкі ад іх зьнішчэньня і разрабаваньня войскам, ажыцьцявіў поўную парцэляцыю калгасаў, зьвяртаўся ў Галоўную ўправу бясьпекі Райху з патрабаваньнем спыніць генацыд жыдоў. Напасьледак ён прызнаў неабходнасьць паступовай беларусізацыі адміністрацыі, Праваслаўнай і Каталіцкай Царквы ды іншых галінаў грамадзкага жыцьця.

Палітыка Кубэ сапраўды аддавала перавагу беларусам, але не магла вокамгненна зьмяніць кадравую сытуацыю, асабліва ў адміністрацыі і паліцыі, створаных у пару вайсковай адміністрацыі. Нягледзячы на адкрыцьцё падрыхтоўчых курсаў, беларускіх спэцыялістаў, здольных альбо ахвочых да працы, па–ранейшаму катастрафічна не хапала. Беларускія дзеячы, прыгнечаныя тым, што ня могуць напоўніцу выкарыстаць перавагі, якія ім давала палітыка Кубэ, прычыну сваіх няўдач бачылі ў занадта лібэральным стаўленьні функцыянэраў цывільнай адміністрацыі да палякаў. Усё гэта выклікала далейшыя канфлікты. У верасьні 1941 г. данясеньні паліцыі сьведчылі, што працягваюцца спробы выстаўляць беларускіх чыноўнікаў як камуністаў, але цяпер такія заявы правяраліся больш уважліва, і калі не знаходзілі належных падставаў для абвінавачаньня, прыцягвалі іх аўтараў да адказнасьці. Дзеля гэтага іх колькасьць зьменшылася. Затое ўзрос лік антыпольскіх даносаў з боку беларускіх дзеячаў, якія намагліся такім чынам перамагчы польскае засільле.

Вось жа, Кубэ мусіў лявіяваць паміж дэклярацыямі ды існуючымі рэаліямі. Хаця ён і пагадзіўся з фактычным станам мясцовай адміністрацыі, але ж з прычыны яе нацыянальнага складу ня мог на ёй будаваць сваю беларускую палітыку. Таму ён пачаў ства-

[25] Kube W. Ein Jahr Zivilverwaltung // Deutsche Zeitung im Ostland. 30.08.1942.

[26] Тамсама; Bengtsson H. Das unbekannteste Volk Europas // Preussische Zeitung. № 237. 1942.

раць беларускую надбудову ў выглядзе цэнтральнай адміністрацыйнай інстанцыі, якая павінна была дзейнічаць у кірунку паступовай беларусізацыі мясцовых структур. Катэгарычнай забароны на тое ад бэрлінскіх уладаў не было, і стварэньне такой інстанцыі ў верасьні 1941 г. падавалася магчымым — вядома ж, не як ураду, але як дапаможнага органу генэральнага камісарыяту ў Менску.

У першых днёх верасьня Кубэ вылучыў на гэтую кіраўнічую пасаду Радаслава Астроўскага — на той час адзінага вядомага беларускага дзеяча на менскай палітычнай сцэне. З гэтай мэтай Кубэ прызначыў Астроўскага кіраўніком адміністрацыі менскай акругі як свайго роду *Nebenbureau* — мясцовага адпаведніка генэральнага камісарыяту. Так Астроўскі заняў важную пазыцыю ў надзеі стварыць зь цягам часу на базе адміністрацыі сталічнай акругі цэнтральную беларускую адміністрацыйную інстанцыю.

Але ў канцы кастрычніка ўсе ягоныя пляны неспадзявана рухнулі ў сувязі з прыездам у Менск Івана Ермачэнкі, якога Альфрэд Розэнбэрг, міністар акупаваных усходніх земляў, прызначыў кіраўніком Беларускай народнай самапомачы (БНС). У прынцыпе, абедзьве гэтыя інстанцыі маглі функцыянаваць паралельна, хаця было відавочна, што пасьля спадзяванай легалізацыі цэнтральнай адміністрацыі Астроўскага БНС будзе падпарадкаваная яму. З такой пэрспэктывай не хацеў пагадзіцца Ермачэнка, які таксама імкнуўся да ролі беларускага правадыра. У канфлікце, які адбыўся паміж імі, Ермачэнка займаў мацнейшую пазыцыю — ня толькі таму, што быў прызначаны Розэнбэргам, але і таму, што меў доказы супрацоўніцтва Астроўскага з камуністамі і польскімі ўладамі, якія ён выкарыстаў супраць свайго суперніка. У выніку Астроўскі страціў давер Кубэ і, каб уратавацца ад магчымых рэпрэсіяў, выехаў у Смаленск, губляючы тым самым магчымасьць непасрэдна ўплываць на сытуацыю ў Менску.

Інцыдэнт з Астроўскім не ўзмацніў даверу Кубэ да беларускіх дзеячаў. Аднак у яго не было выбару. Ён прызнаў Ермачэнку, які аказаўся салідным супрацоўнікам і доўгі час адыгрываў галоўную ролю на менскай палітычнай сцэне як старшыня БНС — адзінай санкцыяванай Бэрлінам беларускай грамадзкай арганізацыі. Пасьля гэтага інцыдэнту Кубэ быў больш асьцярожны і стрымана паставіўся да невядомага яму раней Іваноўскага, прызначыўшы яго намесьнікам бурмістра. Відавочна, ён не хацеў новага скандалу.

Іваноўскі, аднак, бясспрэчна выйграваў у вачох Кубэ і плаціў яму ўзаемнай сымпатыяй. Абодва цалкам сыходзіліся ў поглядах на адраджэньне беларускай культуры і нацыянальнай сьвядомасьці. Абодвух яднала любоў да мастацкай літаратуры і тэатру. Напасьледак, Іваноўскі аказаўся адным зь нешматлікіх беларускіх дзеячоў, хто дасканала валодаў нямецкай мовай. Гэта спрыяла іх бліжэйшаму знаёмству і ўзбагачала веды Кубэ пра Беларусь — паводле ягоных словаў, “найменш вядомую краіну Эўропы”, пра яе мінуўшчыну і надзённыя праблемы. Такое паразуменьне двух дзеячаў істотна паўплывала на рост прабеларускіх сымпатыяў Кубэ, а таксама — як мы неўзабаве пераканаемся — на долю Іваноўскага.

Затое дзеячы некаторых беларускіх груповак прынялі Іваноўскага непрыязна. Што праўда, яны прызнавалі заслугі Іваноўскага перад беларускім рухам, бачылі ў ім апошняга з жывых пачынальнікаў таго руху, але разам з тым (якраз з прычыны памянёных абставінаў) у ім бачылі патэнцыйнага канкурэнта ў барацьбе за ўладу. Гэтых засьцярогаў не прымяншаў факт, што Іваноўскі заставаўся ўбаку ад дзейнасьці мясцовых груповак. Зь недаверам ставіліся да яго Ермачэнка, а таксама ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі — ідэйны лідэр радыкальнага нацыянальнага згуртаваньня, які выконваў у Менску функцыю галоўнага школьнага інспэктара.

Вельмі варожа выступілі супраць Іваноўскага некаторыя праваслаўныя дзеячы, прыхільнікі Астроўскага. Ужо ў сьнежні 1941 г. менская служба бясьпекі (SD) атрымала ад іх данос, дзе Іваноўскі называўся залежным ад віленскай курыі каталікам, які дзейнічае ў інтарэсах пальшчызны ды каталіцызму і маскуе свае сапраўдныя памкненьні кло-

патам пра беларусізацыю Каталіцкага Касьцёлу. Даносчыкі абвінавачвалі Іваноўскага, што такім чынам ён намагаецца адцягнуць увагу нямецкага кіраўніцтва ад польска-каталіцкай экспансіі[27]. Непасрэднай зачэпкай для даносу было выданьне пры падтрымцы Іваноўскага напрыканцы 1941 г. у Менску беларускага катэхізісу ксяндза Язэпа Рэшаця, што, відаць, было ўспрынята як пагроза для праваслаўя. Гэта была апошняя беларуская кніга, выдадзеная яго намаганьнямі[28].

У канцы лістапада ў Менск прыехаў Самуэль Кастравіцкі — з мэтай арганізаваць мясцовую выведніцкую ячэйку ZWZ. Разам зь ім прыехаў Вітальд Буткевіч, які меўся ўзначаліць выведку на месцы. Абодва яны зьявіліся да Іваноўскага, але пасьля размовы зь ім адбыліся істотныя зьмены ў вызначанай ім Занам ролі. Так, Буткевіч ня выехаў у рэгіёны, а быў прызначаны Іваноўскім на працу ў менскую гарадзкую ўправу, затое Кастравіцкі ня стаў менскім рэзыдэнтам выведкі, але праз колькі дзён вярнуўся ў Варшаву[29]. Буткевіч пісаў у справаздачы, што Кастравіцкага адклікалі назад з Варшавы, але гэта не адпавядала сапраўднасьці. Гэта пацьвердзіў і Зан у размове з аўтарам, дадаючы, што пры тагачасных умовах сувязі не магло быць і гаворкі, каб за такі кароткі час з Варшавы прыйшлі нейкія загады.

Здаецца, што да прапановы В. Іваноўскага пра ўладкаваньне абодва афіцэры выведкі паставіліся з большай увагай, чым да загадаў свайго кіраўніцтва. Але Іваноўскі не перакрэсьліў плянаў Другога аддзелу, бо менская рэзыдэнтура ўсё ж была ўтворана, толькі пакуль ёю кіраваў Буткевіч. Іваноўскі забясьпечыў яго кватэрай у доме, дзе жылі работнікі гарадзкой управы, на вуліцы Ленінградзкай, і даў яму пасаду кантралёра, а потым начальніка аддзелу кантролю. Як пісаў Буткевіч:

> Пасада гэтая потым вельмі дапамагала мне ў маёй выведніцкай дзейнасьці. Я меў магчымасьць часта выяжджаць на пэрыфэрыю, уздоўж і ўпоперак зьмераў стратэгічныя шляхі Менск—Слуцак, Слуцак—Баранавічы і чыгуначныя лініі Менск—Бабруйск і Менск—Берасьце. Дзякуючы сваёй пасадзе я меў вольны ўваход на ўсе гарадзкія прадпрыемствы і на многія заводы, якія пераважна працавалі на немцаў. На нарадах у бурмістра я часта сустракаўся з прадстаўнікамі акупацыйных нямецкіх уладаў і нярэдка браў удзел у паседжаньнях, на якіх абмяркоўваліся і пляналіся розныя цікавыя для нашай выведкі распараджэньні[30].

У канцы студзеня 1942 г. у Менск прыехала Гражына Ліпінская (псэўд. "Данута"), якая неўзабаве ўзначаліла аддзяленьне ZWZ—AK і кіравала ім да канца нямецкай акупацыі. Яна таксама разьлічвала на дапамогу Іваноўскага, якога ведала з часоў навучаньня ў Варшаўскай палітэхніцы. Аднак у новых умовах старое знаёмства магло не спрацаваць, і таму "Данута" папярэдне скантактавалася з Буткевічам.

Вось што ўспамінае Ліпінская:

> Буткевіч быў расчараваны, што Галоўнае Камандаваньне прыслала жанчыну. Ён гаварыў, што тут небясьпечна, што пагражаюць немцы і бальшавікі, што лепей адсюль зьехаць. Але я засталася і папрасіла ягоных парадаў наконт арганізацыі ячэйкі. Буткевіч, відавочна, не хацеў гэтым займацца і сказаў: "Арганізуйце сваю ячэйку самі, бо я прыехаў з Варшавы зь іншымі заданьнямі". Напачатку я зразумела яго так, што ён адмаўляецца ад працы, але Буткевіч растлумачыў

[27] Ereignismeldung UdSSR, 12.01.1942, AAN. Александрыйскі мікрафільм, T-175, p. 233/2721486.

[28] Катэхізіс падрыхтаваў да друку кс. д-р Станіслаў Глякоўскі, а надрукавала ў канцы 1941 г. друкарня менскай гарадзкой управы. Папярэднік на пасадзе бургамістра, д-р. Вітаўт Тумаш, паведаміў, што выданьне адбылося пасьля яго выезду зь Менску (ліст В. Тумаша да аўтара ад 28.06.1979), г.зн. пасьля ўступленьня на пасаду В. Іваноўскага. Кніжка выйшла безь нямецкай цэнзуры.

[29] Ліст В. Буткевіча да Б. Закшэўскага ад 29.05.1971.

[30] Тамсама.

што ягоныя заданьні датычаць беларускіх справаў, аднак паабяцаў працаваць таксама і для вайсковай выведкі. Толькі праз колькі дзён я накіравалася да прафэсара Іваноўскага. Думаю, што Буткевіч ужо пасьпеў зь ім паразмаўляць і параіць маю кандыдатуру. Ува ўсякім выпадку, пры першай сустрэчы прафэсар Іваноўскі абяцаў мне сваю дапамогу, заўважыўшы, што яго не цікавіць, навошта я прыехала ў Менск. Ён даў мне працу ў гарадзкой управе — спачатку даручыў зьбіраць каляровыя мэталы, а потым прызначыў інструктаркай па прамысловасьці. Такая праца давала мне магчымасьць езьдзіць па раёнах, што было вельмі істотна для выведніцкай дзейнасьці[31].

Вось такім парадкам пад адным крылом Іваноўскага пачала дзейнічаць ячэйка акоўскай вайсковай выведкі, а пад другім хаваўся Баляслаў Берут, у будучыні прэзыдэнт Польскай Народнай Рэспублікі. Як вынікае з справаздачы ўдзельнікаў польскага падпольля ў Менску, дапамога Іваноўскага была бясспрэчна вялікай[32]. У выніку ён значна перавыканаў абяцаньне не перашкаджаць дзейнасьці ZWZ—AK, дадзенае Зану ў верасьні 1941 г.

Стаўленьне Іваноўскага да польскага падпольля заслугоўвае ўвагі зь некалькіх прычынаў. Па-першае, тут адлюстравалася ягоная абыякавасьць да баявых дзеяньняў, якія тады вяліся. Па-другое, Іваноўскі ўсьведамляў, што дзейнасьць ячэйкі малавыніковая: назапашаная ёй ваенная інфармацыя магла б цікавіць толькі камандаваньне Чырвонай Арміі, у той час як гэтая інфармацыя перадавалася, звычайна раз на месяц, з дапамогай кур'ераў у Варшаву, дзе яе апрацоўвалі і высылалі ў штаб Галоўнакамандуючага пры польскім урадзе ў Лёндане. Усё гэта займала, як правіла, колькі месяцаў, у выніку чаго інфармацыя безнадзейна старэла і рабілася бескарыснай для апэратыўных рашэньняў, таму можна сумнявацца, ці перадавалі яе ў Маскву. Урэшце, па-трэцяе — акоўская ячэйка у Менску не была патрэбная Іваноўскаму і не пасярэднічала ў ягоных кантактах з кіраўніцтвам польскага падпольля. У гэтай галіне дзеялі Кастравіцкі з Буткевічам, трымаючы асобную і незалежную сыстэму сувязі.

Дзейнасьць менскай ячэйкі дадатна ацэньвалася ў Варшаве, затое ў Менску спараджала падазрэньні і даносы ў SD — галоўным чынам на Іваноўскага, якога называлі польскім агентам, што дзейнічае на шкоду Беларусі[33]. Асаблівую актыўнасьць тут выяўляў Іван Касяк, які з даваеннага камуністычнага дзеяча ператварыўся ў супрацоўніка гестапа. Як піша Раіса Галяк, падобныя даносы пісаў і ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі. Гэта стварала вакол Іваноўскага пагрозьлівую атмасфэру, а ягоны сусед па кватэры Язэп Найдзюк, які быў сьведкам прыезду незнаёмых людзей з Варшавы, гаварыў, што "ў Іваноўскага зямля гарыць пад нагамі", і баяўся зь ім жыць[34].

Іваноўскі тады пазьбегнуў арышту перш за ўсё дзякуючы генэральнаму камісару Кубэ. Іх дачыненьні паляпшаліся ўсё больш. Кубэ абараніў Іваноўскага ад беспадстаўных нападак, а ў чэрвені 1942 г. адмовіўся ад сваіх першапачатковых засьцярогаў і пагадзіўся прызначыць яго бурмістрам Менску. Гэтае рашэньне прынесла Іваноўскаму асаблівае задавальненьне — ён заняў урэшце пасаду, якую калісьці займалі ў гэтым горадзе ягоныя продкі.

Тагачасны Менск быў невялікім горадам — ён налічваў трохі больш як 100 тыс. жыхароў, напалову менш, чым перад вайной. Налёты нямецкай авіяцыі ды зьнішчальныя акцыі савецкіх войскаў пры адступленьні пакінулі ў ім значныя разбурэньні. Адносна менш пацярпелі прамысловыя прадпрыемствы, якія разьмяшчаліся на ўскраінах гораду,

[31] Паведамленьне Г. Ліпінскай ад 12.08.1979; гл. таксама яе: Jeśli zapomnię o nich... S. 192 і наст.

[32] Życie i działalność polityczna prof. Wacława Iwanowskiego... (паведамленьні В. Буткевіча, Г. Ліпінскай і М. Мойжук).

[33] Касяк І. Заўвагі да артыкулу аб Іваноўскім...; Галяк Л. Успаміны. Ч. II. ЗША, 1983. С. 62.

[34] Галяк Л. Успаміны. Ч. I. ЗША, 1982. С. 159.

але нармальна працаваць яны не маглі ў тым ліку і праз вялікі недахоп рабочай сілы — гарадзкія кварталы ляжалі ў руінах, а людзі часьцяком пераяжджалі на вёску ў пошуках даху над галавой. Цяжкасьці павялічвала нястача паліва, харчоў, адзеньня ды іншых прадметаў першай неабходнасьці.

Таму асноўнай задачай гарадзкой управы быў клопат пра элемэнтарныя патрэбы людзей. Івано́ўскі надаваў таксама шмат увагі духоўным патрэбам. Кіраваны ім аддзел асьветы і культуры ўтрымліваў у горадзе каля дваццаці пачатковых беларускіх школаў, этнаграфічны музэй, арганізоўваў выставы жывапісу і народнага мастацтва. Вось толькі не атрымалася адчыніць пэдагагічны інстытут. Затое Івано́ўскі арганізаваў у прадмесьці Менску досьледную станцыю (так званая "Балотная станцыя"), дзе вывучаліся мэтады разьвядзеньня цукровых буракоў на беларускіх глебах[35]. З гэтай тэмы ён у свой час абараніў доктарскую дысэртацыю.

Важнай сфэрай культурніцкіх зацікаўленьняў Вацлава Івано́ўскага была дзейнасьць гарадзкога тэатру. Дырэктарам яго спачатку быў Ян Краўчонак, потым Пётра Булгак. Паколькі опэрны тэатар заняло нямецкае войска, спэктаклі ішлі ў будынку цяперашняга тэатру імя Янкі Купалы. У адным тэатры працавалі тры акторскія ансамблі — драматычны, опэрны і балетны. Зь цяжкасьцю ўдалося сабраць актораў, знайсьці рэквізыт і дэкарацыі. Івано́ўскі часта запрашаў актораў, рэжысэраў і драматургаў у гарадзкую ўправу на сустрэчы, падчас якіх абмяркоўваўся рэпэртуар і вырашаліся праблемы, зьвязаныя з матэрыяльнымі цяжкасьцямі. Ён ахвотна праводзіў час сярод артыстаў, падтрымліваў зь імі таварыскія кантакты. Артыстка тэатру Яўгенія Седліц была ягоным апошнім каханьнем.

А вось як выглядаў рэпэртуар Менскага Гарадзкога Тэатру ў сэзонах 1941/1942 і 1942/1943:

Беларуская клясыка: "На Антокалі", "Пан Міністар", "Шчасьлівы муж" Ф. Аляхновіча; "Міхалка" Далецкіх (В. Івано́ўскага); "Пінская шляхта" В. Дуніна–Марцінкевіча.

Замежная клясыка: "Кармэн" Бізэ; "Вольны стралец" Вэбэра; "La Locandiera" Гальдоні; "Затонуты звон" Гаўптмана; "Разьбіты збан " Кляйста; "Лялечны дом" Ібсэна, "Лекар паняволі" Мальера; "Чароўная флейта" Моцарта; "Яўгені Анегін" Чайкоўскага; "Каварства і любоў" Шылера; "Цыганскі барон" Штраўса[36].

Як трапна сказаў гісторык беларускага тэатру Ўладзімер Сядура, "у тыя змрочныя гады менскі гарадзкі тэатар нёс гараджанам сьвятло мастацтва"[37]. Сапраўды, калі ўзяць пад увагу цяжкасьці ваеннага часу ды беларускую спэцыфіку, колькасьць і якасьць названых рэпэртуарных пазыцыяў уражваюць. Пасьля вайны дырэктар тэатру Булгак заплаціў за гэта шматгадовай адседкай у савецкіх лягерох.

Пад заўсёднай апекай Івано́ўскага былі дзевяць менскіх дамоў дзіцяці, якія ён перш за ўсё стараўся забясьпечваць харчамі. У гэтым прымаў удзел і яго супрацоўнік, загадчык аддзелу забесьпячэньня ў гарадзкой управе, Баляслаў Берут.

Увесну 1942 году сытуацыя ў Беларусі яшчэ болей абвастрылася. З аднаго боку, узмацнілася актыўнасьць савецкіх партызанаў, з другога — Галоўная ўправа бясьпекі Райху распачала ліквідацыю польскага падпольля. Гэтая акцыя прывяла да значных спусташэньняў у мясцовай адміністрацыі — многія службоўцы–палякі былі арыштаваныя і закатаваныя, іншыя ратаваліся ўцёкамі. У гэтай сытуацыі Кубэ, раздражнёны нігілістычнай палітыкай Бэрліну, вырашыў зрабіць стаўку на актывізацыю беларускага нацыяналізму. У прыватнасьці, ён палічыў неабходным сфармуляваць такую палітычную канцэпцыю, якая павялічыла б зацікаўленасьць беларусаў да супрацы.

У канцы чэрвеня Кубэ ўтварыў інстытут Мужоў Даверу, зрабіў Ермачэнку сваім дарадцам, дазволіў стварыць Галоўную раду Беларускай народнай самапомачы і значна

[35] Раніца. 1943. 13 чэрвеня.

[36] Seduro V. The Byelorussian Theater and Drama. New York, 1955. P. 168—173.

[37] Тамсама.

пашырыць кампэтэнцыю гэтай арганізацыі, у рамках якой узьнік шэраг аддзелаў, як, напрыклад, палітыкі, вайсковых справаў, школьніцтва, культуры, прапаганды і аховы здароўя. Такім чынам, ствараўся апарат, які ў адпаведны момант быў бы гатовы ўзяць уладу ў Беларусі. Асаблівае значэньне меў дазвол Кубэ на арганізацыю Корпусу Беларускай Самапомачы пад кіраўніцтвам Ермачэнкі.

Далей былі зробленыя новыя саступкі — утворана Беларускае навуковае таварыства, прафсаюзы, суды, Ліга Жанчын, легалізаваная беларуская нацыянальная сымболіка — штандар і герб Пагоня, арганізаваны Цэнтральны Каапэратыўны Саюз. Неўзабаве Кубэ выдаў распараджэньне, згодна зь якім ранейшыя раёны былі перайменаваныя ў паветы, а бургамістры — у кіраўнікоў гораду, павету і воласьці. Пачаліся размовы наконт адкрыцьця ўнівэрсытэту ў Менску.

У атмасфэры эўфарыі, выкліканай саступкамі з боку Кубэ, у канцы ліпеня 1942 г. у Менску адбыўся зьезд БНС. Зьезд адзначыў, што за кароткі час БНС зьмяніла свой характар і ператварылася з дабрачыннай арганізацыі ў агульнакраёвы цэнтар кіраўніцтва школьніцтвам, культурнай дзейнасьцю, палітыкай, прапагандай, а цяпер пераходзіць да арганізацыі войска, аднаўленьня эканамічнага жыцьця і г.д. "З гэтага вынікае, — гаварылася ў справаздачы зьезду, — што БНС зрабілася цэнтрам ініцыятываў усяго беларускага жыцьця, ягоным кіраўнічым штабам". Зьезд запатрабаваў зьмяніць статут БНС і прызнаць яе фармальнае права на самакіраваньне[38].

Ермачэнка дасягнуў вяршыні сваёй кар'еры, здавалася, яму ўжо сьвеціць крэсла прэм'ера беларускага ўраду, да якога падводзіў яго Кубэ. Генэральны камісар глыбока верыў у жыцьцёвасьць сваіх плянаў — якраз у гэты час на Эльбрусе залунаў сьцяг Райху, а нямецкія войскі дайшлі да Волгі. Ермачэнка пачуваўся дастаткова моцным, хаця усё ж асьцерагаўся магчымай канкурэнцыі з боку Іваноўскага: ён не ўключыў апошняга ў склад Галоўнай рады БНС. Іваноўскаму гэта патлумачылі так: маўляў, культурна-асьветніцкая праца ў Менску была так добра арганізаваная гарадзкой управай, што Галоўная рада ўжо ня мела падставы дбаць пра яе. Толькі пасьля таго, як умяшаўся Кубэ, Іваноўскі быў кааптаваны ў Раду і як яе сябра падпісаў у ліпені заклік уступаць у атрады самапомачы[39].

Пэрспэктыва займець уласныя ўзброеныя сілы здавалася ў той час цалкам рэальнай — асабліва пра гэта сьведчыла адкрыцьцё ў Менску і іншых мясьцінах Беларусі курсаў падрыхтоўкі афіцэраў і сяржантаў. Гэта натхняла ўсе беларускія палітычныя групоўкі да актывізацыі сваёй дзейнасьці. У ліпені 1942 г., падчас зьезду БНС, пад кіраўніцтвам Усевалада Родзькі была створана Беларуская незалежніцкая партыя (БНП). Яна выдавала свой бюлетэнь і заклікала бескампрамісна змагацца за незалежнасьць Беларусі зь немцамі, палякамі і савецкімі партызанамі.

Разгортвала сваю дзейнасьць таксама і Партыя беларускіх нацыяналістаў (ПБН), лідэр якой, Ян Станкевіч, з восені 1941 г. знаходзіўся ў Менску, шчыльна супрацоўнічаючы з Іваноўскім. У акоўскім рапарце за ліпень 1942 г. пісалася:

> ПБН, якая робіць стаўку на Ангельшчыну і Польшчу, налічвае каля 500 чалавек. Яе ўзначальвае Цэнтральны Камітэт на чале з Станкевічам. ЦК у цяперашні момант месьціцца ў Менску, складаецца з 8 заходнікаў і 4 усходнікаў (нацдэмаў). Партыя пабудаваная па сыстэме пяцёрак. У большасьці раёнаў ёсьць свае партыйныя асяродкі. Паколькі сувязь падтрымліваць цяжка, партыя прымае толькі тых людзей — сярод здольных да работы і ідэйна блізкіх, — хто неабходны партыі з увагі на сваё становішча. Абавязак кожнага чальца партыі — ствараць вакол сябе як мага шырэйшае "магнэтычнае поле" з мэтай фармаваньня сапраўдных беларусаў[40].

[38] Раніца. 1942. 16 жніўня.
[39] Раніца. 1942. 26 ліпеня.
[40] Справаздача "Эвы" з падарожжа ў Менск. ЦА ЦК ПАРП 203/VII–45, k. 19.

Тактыку ПБН рапарт апісваў наступным чынам:

> Хаця беларусы хочуць дзейнічаць у паразуменьні з Польшчай, у гэты момант яны вымушаны манэўраваць так, каб не адштурхнуць ад сябе немцаў, прынамсі пакуль ня будзе ўтворана беларускае войска (яно мае налічваць 150 000 чалавек), таму цяпер галоўная задача — укараняць сваіх людзей у вайсковыя аддзелы з тым, каб яны ўтваралі партыйныя ячэйкі, аж да дасягненьня поўнага кантролю над войскам і паліцыяй. <...> Беларусы імкнуцца мірным шляхам атрымаць ад немцаў як мага больш, а рэшту забраць у іх, калі іх зусім разаб'юць[41].

Рэалізацыя палітычнай стратэгіі ПБН, г.зн. здабыцьцё падтрымкі ад Ангельшчыны і Польшчы, залежала, аднак, у вялікай ступені не ад актыўнасьці на мясцовым узроўні, але ад вынікаў місіі Кастравіцкага, які пасьля візыту да Іваноўскага ў канцы лістапада 1941 г., ігнаруючы дырэктывы Зана, раптоўна вярнуўся ў Варшаву. Фармальна кажучы, гэта была несубардынацыя, невыкананьне загаду, што магло б кепска скончыцца для Кастравіцкага. Такі быў кошт падвойнай гульні, у якой Кастравіцкі мусіў таксама ўлічваць інтарэсы беларускага боку. Зрэшты, нічога благога тады ня здарылася.

У студзені 1980 г. Бэрнард Закшэўскі, былы начальнік контравыведкі Галоўнага Камандаваньня ZWZ—AK (псэўданім "Оскар") растлумачыў аўтару прычыну паводзінаў Кастравіцкага. Калі Кастравіцкі вярнуўся ў Варшаву, то накіраваўся не да Зана, а да начальніка штабу Галоўнага камандаваньня, генэрала Тадэвуша Пялчынскага ("Гжэгажа"), якому перадаў прывезеную ад Іваноўскага важную інфармацыю. Пасьля гэтага Пялчынскі адрэкамэндаваў Кастравіцкага Закшэўскаму і загадаў уладкаваць яго ў аддзел контравыведкі на пасаду кіраўніка ячэйкі "996", у кампэтэнцыі якой знаходзіліся ў тым ліку беларускія пытаньні.

Працуючы на гэтай пасадзе, Кастравіцкі намагаўся стварыць у Галоўным камандаваньні спрыяльны клімат для перамоваў з прадстаўнікамі ПБН, якіх Станкевіч безвынікова дабіваўся ўвесну 1941 г. Нам невядомыя падрабязнасьці, але вядома, што ў выніку Галоўнае камандаваньне зьмяніла сваё стаўленьне да кантактаў з ПБН. Так, калі раней у рапартах агульна гаварылася пра супрацоўніцтва беларусаў зь немцамі, на пачатку 1942 г. у данясеньнях камандзіра ZWZ—AK Стэфана Равэцкага зьяўляюцца новыя адценьні: ён піша, што сярод беларусаў у Менску расьце антынямецкая апазыцыя, якая шукае кантактаў з палякамі, і нават што беларусы гатовыя падтрымаць польскае паўстаньне, заплянаванае на апошнюю фазу вайны[42].

Пазыцыю Галоўнага камандаваньня выразна акрэсьліў адмысловы рапарт наконт беларускага пытаньня, адасланы Сікорскаму ўвесну 1942 г. У рапарце адзначалася, што сярод беларускіх кіраўнічых колаў і народных масаў расьце вера ў паразу гітлераўскай Нямеччыны, у сувязі з чым:

> Некаторыя дзеячы, якія стаяць у апазыцыі да палітыкі Шчорса, шукаюць кантактаў з польскімі групоўкамі, жадаючы паразумецца на грунце супольнай абароны ад Расеі. Гэтыя людзі прагнуць вызваліць усю Беларусь з дапамогай Польшчы і ўтварыць з намі шчыльную фэдэрацыю, аднак высоўваюць максымальныя тэрытарыяльныя прэтэнзіі і вызначаюць будучыя межы Беларусі ад Рослава да Белай Падляскай улучна. Праграма нацыяналістаў, якія дзеяць на месцах, зважаючы на імаверную паразу Нямеччыны, зводзіцца да дасягненьня як мага паўнейшага кантролю над краінай у адміністрацыйным, эканамічным і культурным пляне, каб потым паставіць перад адбытымі фактамі будучых заваёўнікаў гэтай тэрыторыі[43].

---

[41] Тамсама.

[42] Armia Krajowa w dokumentach. T. II. Londyn, 1973. S. 193, 331.

[43] Матэрыялы ўсходняй Сэкцыі Дэлегатуры, "Спэцыяльны рапарт — Беларускае пытаньне". Дакумэнт бяз даты. Як вынікае з фактаў, пададзеных у тэксьце, ён быў складзены ў сакавіку або красавіку 1942 г. ЦА ЦК ПАРП, 20/III-201, k. 105—106a.

Рапарт падкрэсьліў, што, "калі мы пакінем бяз водгуку спробы беларусаў знайсьці кантакт з польскім бокам, новыя саступкі немцаў могуць іх перакрэсьліць", і прапанаваў заваяваць сымпатыі беларускіх масаў шляхам:

— выданьня адозвы польскага ўраду да беларусаў пра жыцьцё абедзьвюх нацыяў пасьля вайны, у якой асабліва падкрэсьліваліся б эканамічныя (зямельная рэформа) і культурныя пытаньні;

— запрашэньня прадстаўнікоў беларускага грамадзтва ў лёнданскую Нацыянальную Раду;

— неадкладнага разгортваньня на месцах прапаганды, якая б нэўтралізавала антыпольскія аргумэнты;

— звароту ад імя польскага ўраду да Ватыкану з прапановай прызначыць для этнічна беларускіх рэгіёнаў біскупа беларускай нацыянальнасьці.

Асаблівую ўвагу заслугоўвае пададзеная ў рапарце прапанова "тэрмінова скантактавацца з тымі беларускімі дзеячамі, якія шукаюць падтрымкі ў Польшчы", а таксама скіраваная да Сікорскага просьба даць інструкцыі па беларускім пытаньні, "цесна зьвязаным з плянаваным паўстаньнем і заняцьцем нашых усходніх земляў, дзе жыве беларускае насельніцтва"[44]. Гэта азначала, што Галоўнае камандаваньне прыняло прапанову Партыі беларускіх нацыяналістаў аб перамовах, але толькі пры захаваньні *status quo* у тэрытарыяльным пытаньні.

Гэты рапарт трапіў у Лёндан адносна хутка, а вынікам яго было перададзенае тэлеграфам 25 чэрвеня 1942 г. распараджэньне пашырыць дыяпазон узятых з друку і непасрэдна на месцах зьвестак зь Беларусі, а таксама даць падрабязныя зьвесткі аб беларускіх дзеячох. Эміграцыйны ўрад, аднак, устрымаўся ад якой–кольвечы ацэнкі рапарту і ад выданьня інструкцыяў, пра якія прасіла Галоўнае Камандаваньне[45]. У гэтай сытуацыі кіраўніцтва АК вырашыла самастойна ажыцьцявіць некаторыя з прапановаў, пра якія ішла гаворка ў вышэйзгаданым рапарце. Адным з такіх крокаў была распачатая ў сярэдзіне 1942 г. прапаганда сярод палякаў і беларусаў з мэтай стварыць настрой узаемнай зычлівасьці, гатоўнасьці да яднаньня і супольных абарончых дзеяньняў. Але гэтая акцыя, якой асабіста цікавіўся Равэцкі, не дасягнула плянаваных вынікаў, а ўлёткі, выданыя ў тым ліку і на беларускай мове, траплялі на неўрадлівую глебу[46]. Відаць, гэтая акалічнасьць паскорыла прыняцьце рашэньня аб перамовах з ПБН.

Першая сустрэча адбылася ў канцы ліпеня 1942 г. у Менску, куды накіравалася прадстаўніца Галоўнага камандаваньня Дабрынская ("Эва"). Як вынікае зь яе падрабязнай справаздачы, пасьля яе прыезду і ўсталяваньня кантактаў з Станкевічам ён склікаў паседжаньне Цэнтральнага камітэту Партыі беларускіх нацыяналістаў, які пацьвердзіў імкненьне да супрацоўніцтва з Польшчай, так акрэсьліваючы сваю пазыцыю і патрабаваньні:

— прызнаньне немэтазгодным узброенай барацьбы зь немцамі; да часу стварэньня беларускага войска да іх захоўваецца ўяўная лаяльнасьць;

— стварэньне беларускай дзяржавы з заходняй мяжой уздоўж лініі Керзона;

— стварэньне пасьля вайны польска–беларускага дзяржаўнага саюзу з супольным міністэрствам замежных справаў;

— рэпрэзэнтацыя польскім урадам беларускага пытаньня перад урадам Вялікай Брытаніі;

— адмова палякаў ад імкненьня апанаваць адміністрацыю ў Заходняй Беларусі пры адначасовым спыненьні беларусамі антыпольскага руху[47].

[44] Тамсама.

[45] Тэлеграма ад ураду. ЦА ПАРП 202/1–2, k. 23.

[46] Polskie Siły Zbrojne w drugiej wojnie światowej. T. III. Londyn, 1950. S. 287.

[47] Справаздача "Эвы" з падарожжа ў Менск... К. 17—23.

Вызначаючы сваё стаўленьне да часткі высунутых патрабаваньняў, Дабрынская заявіла, што хаця польскія ўлады маюць жаданьне супрацоўнічаць з ПБН, але па прынцыповых меркаваньнях яны не адступяцца ад Рыскай мяжы. Станкевіч, відаць, прадбачыў такі адказ польскага боку і прапанаваў лічыць спрэчныя тэрытарыяльныя праблемы адкрытым пытаньнем, што магло б паспрыяць прагрэсу ў абмеркаваньні ўсёй сукупнасьці ўзаемадачыненьняў. Дамоўленасьці з палякамі Цэнтральны Камітэт ПБН хацеў захаваць у таямніцы ня толькі ад немцаў, але і ад большасьці чальцоў сваёй партыі, матывуючы гэта тым, што ў беларускім грамадзтве існуе падазронасьць і нядобразычлівасьць да Польшчы. Канстатацыя цяжкасьцяў і разыходжаньняў па пэўных праблемах не разбурыла, аднак, двухбаковых надзеяў на паразуменьне, вынікам чаго стала запрашэньне Станкевіча ў Варшаву для працягу перамоваў[48].

Перамовы, распачатыя паміж Галоўным Камандаваньнем АК і Партыяй беларускіх нацыяналістаў, выклікалі незадавальненьне Дэлегатуры эміграцыйнага ўраду. Як сьведчаць зацемкі, зробленыя на палёх справаздачы "Эвы", пазыцыя БНП ацэньвалася там як дваручніцкая палітыка гульні на каньюнктуры, а прапанова аб супрацоўніцтве, дадзеная ў Менску прадстаўніцай Галоўнага Камандаваньня, прызнавалася незаконнай. Пры гэтым Дэлегатура ўраду ніяк не акрэсьліла свайго стаўленьня да патрабаваньняў беларускага боку, заўважыўшы, што спачатку ПБН павінна падтрымаць супольную ўзброеную барацьбу супраць Нямеччыны, а ўжо потым весьці гаворку пра нейкія магчымыя дамоўленасьці. Аднак у чарговай справаздачы Дэлегатуры ўраду пра гэтае жаданьне ўжо не было ні слова, затое ПБН паддавалася рэзкім нападкам, маўляў, яе арыентацыя на заходніх саюзьнікаў — гэта "толькі тэорыя", што хаця партыя сапраўды антынямецкая, але яе чальцы супрацоўнічаюць зь немцамі, а яе дзейнасьць "абмяжоўваецца цяпер вынішчэньнем польскасьці рукамі акупанта"[49]. Як бачым, Дэлегатура была катэгарычна супраць стасункаў зь беларускім падпольлем і, відаць, намагалася такім чынам паўплываць на пазыцыю Сікорскага, які абяцаў у найбліжэйшым часе выслаць інструкцыі наконт беларускага пытаньня[50].

Неўзабаве ў Варшаве стаўленьне да ПБН троху палепшылася. У значнай ступені гэта было выклікана зьменай на пасадзе дэлегата ўраду, якую пасьля сьмерці Ратайскага ў верасьні 1942 г. заняў прадстаўнік Сялянскай партыі Пекалкевіч, які быў больш прыхільны да паразуменьня зь беларусамі, чымся ягоны папярэднік. Таму старшыня ЦК ПБН Станкевіч ("Гжацкі"), які прыехаў у Варшаву ў канцы сьнежня, безь вялікіх цяжкасьцяў дамовіўся з Тамкевічам ("Кшыштафам") правесьці 26—28 студзеня 1943 г. канфэрэнцыю па пытаньнях супрацоўніцтва, у тым ліку з удзелам сяброў Дэлегатуры ўраду. У міжчасьсі ён выехаў у Прагу і Кракаў. Інфармуючы пра сваю сустрэчу з Станкевічам, Тамкевіч зьвяртаў увагу кіраўніцтва, што ПБН праз сваё віленскае аддзяленьне здолела дамовіцца зь літоўцамі, мае шчыльныя кантакты з чэхамі і вельмі разьлічвае на іхную дыпляматычную дапамогу, а таксама намагаецца паразумецца з украінцамі[51].

Цяжка сказаць, у якой ступені гэтая інфармацыя адпавядала сапраўднасьці, а ў якой была разьлічаная на ўмацаваньне стартавай пазыцыі ПБН на будучай канфэрэнцыі. Але факт, што гэтай інфармацыі быў нададзены афіцыйны характар. Паводле справаздачы Дабрынскай — адной з арганізатараў і ўдзельнікаў канфэрэнцыі, — у ёй бралі ўдзел Макавецкі і Тамкевіч з Галоўнага камандаваньня АК, а таксама сябры Дэлегатуры ўраду і палітычных партыяў — сацыялісты і дзеячы Сялянскай партыі[52]. Як можна ба-

---

[48] Тамсама. К. 21.

[49] Урадавая пошта: нацыянальныя справы за пэрыяд 15.07.1942—15.09.1942. ЦА ПАРП 202/І-31, k. 94—95.

[50] Тэлеграма Сікорскага ад 05/06.08.1942. ЦА ПАРП 202/І-9, k. 4.

[51] Рапарт "Кшыштафа" пра размову з "Гжацкім" ад 21.12.1942. ЦА ПАРП, 203/VII–, k. 6.

[52] Паведамленьні З. Дабрынскай 1979—1980 гг. Паводле іх, размовы адбываліся на канспірацыйнай кватэры БІПу па вул. Ракавецкай.

чыць з ужо згаданага рапарту Тамкевіча ("Кшыштафа") ад 21 сьнежня, Станкевіч хацеў абмеркаваць пытаньне аб незалежнасьці беларускай дзяржавы, якая б "у той ці іншай ступені абапіралася на Польшчу", а таксама аб выданьні польскім урадам дэклярацыі пра неабходнасьць стварэньня такой дзяржавы. Ён і надалей ня бачыў патрэбы рыхтаваць антынямецкае збройнае паўстаньне, затое пагаджаўся распачаць прапагандысцкую кампанію на карысьць збліжэньня з Польшчай.

Згодна зь сьведчаньнем Дабрынскай, у бурлівай дыскусіі дамінавала, аднак, тэрытарыяльная праблема, прычым ніводзін з бакоў не схінаўся да рэвізіі сваёй дагэтулешняй пазыцыі. Можна здагадвацца, што ў такой сытуацыі не прайшла і прапанова пакінуць праблему мяжы ў якасьці адкрытага пытаньня, у выніку чаго дыскусія над асноўнымі патрабаваньнямі ПБН рабілася беспрадметнай. Адначасова польскі бок настойваў, каб беларусы абавязкова далучыліся да супольнай антынямецкай вайсковай кампаніі, на што Станкевіч у рэшце рэшт пагадзіўся. Удзел ПБН у гэтай акцыі пакуль меўся выражацца ў арганізацыі на Беларусі сеткі базаў для Арміі Краёвай. Такім чынам, абмежаванае вайсковае супрацоўніцтва было адзіным пытаньнем, якое ўдалося ўзгадніць на Варшаўскай канфэрэнцыі. Аднак абодва бакі зьвязвалі з гэтым розныя пляны. Станкевіч бачыў тут магчымасьць падтрымліваць кантакт з польскім падпольлем — спадзеючыся, што польскі ўрад прызнае незалежніцкія памкненьні беларусаў. Польскі бок, у сваю чаргу, спадзяваўся, што ПБН падтрымае пазыцыі польскага ўраду ў пытаньні ўсходняй мяжы. На думку палякаў, пасьля разгрому немцаў пад Сталінградам пазыцыя польскага боку была больш рэальнай, чым канцэпцыя беларускіх нацыяналістаў.

Пра гэта сьведчыць наступная дэпэша Пекалкевіча аб канфэрэнцыі з Станкевічам, накіраваная ўраду 12 лютага 1943 г.:

> Адбылася размова з старшынём беларускай незалежніцкай арганізацыі, які вяртаўся з Прагі. Ён хоча супрацоўнічаць з намі, але жадае, каб былі фармальна замацаваныя правы, якія беларусы атрымаюць у Польшчы. Мы вылучылі прапанову аб роўных правах беларускай і польскай моваў у судах першай інстанцыі, у староствах і мясцовым самакіраваньні, а таксама аб пачатковых і сярэдніх беларускіх школах. <...> Прашу вашых інструкцыяў наконт беларускага пытаньня[53].

Такім чынам, Паўнамоцны прадстаўнік ураду нават не назваў праблемы, якія цікавілі кіраўніцтва ПБН, а замест таго сфармуляваў пытаньні чыста ўнутрыдзяржаўнага характару.

Падобным чынам паводзіла сябе і Галоўнае камандаваньне АК.

Вось што пісаў Равэцкі ў Лёндан:

> Для польскай палітыкі было б вельмі карысна аб'яднаць беларусаў і ўкраінцаў. Гэта магло б <...> забясьпечыць нам падтрымку англасаксаў у памянёным пытаньні (аб усходніх тэрыторыях. — *Ю.Т.*) і ўскладніць гульню расейцам. Каб дасягнуць такой мэты, неабходна мець выразную дэклярацыю пра зраўнаваньне ў правох гэтых меншасьцяў і пра забесьпячэньне ім магчымасьці культурнага разьвіцьця. Але абмежавацца аднымі абяцаньнямі будзе мала, трэба будзе выдаць адпаведныя дэкрэты і распараджэньні. Калі мы ўтрымаем усходнія землі, то гэтыя акты і так будуць неабходныя, а калі не — дык ня змогуць зашкодзіць[54].

Вызначыць правы беларусаў і ўкраінцаў патрабавала ад ураду таксама рэзалюцыя Палітычнага Пагаджальнага Камітэту, прынятая 14 лютага 1943 г. галасамі прадстаўнікоў сялянскай партыі, сацыялістаў і старшыні насуперак галасом Нацыянальнай партыі і Партыі працы[55]. Аднак урад не зьмяняў сваёй ранейшай пазыцыі ў гэтым пытаньні. Яе

[53] Тэлеграмы ва ўрад. ЦА ПАРП, 202/I–7, k. 11.

[54] Тэлеграма Равэцкага да Сікорскага ад 12.01.1943 // Armia Krajowa w dokumentach. T. II... S. 403.

[55] Тэлеграма Дэлегата ва ўрад ад 18.02.1943. ЦА ПАРП, 202/i–34, k.12.

выразіў прэзыдэнт Польшчы Рачкевіч у сваёй навагодняй прамове:

> Адзіным рэальным і найтрывалейшым апірышчам польскай дзяржавы на ўсходніх землях ёсьць перш за ўсё карэнны польскі нацыянальны элемэнт. <...> Першай і галоўнай задачай нашай палітыкі на ўсходніх землях мусіць быць узмацненьне польскага элемэнту, на які павінна абаперціся ўся палітычная лінія ў дачыненьні да тамтэйшых нацыянальных меншасьцяў[56].

Тэндэнцыі да паразуменьня знязіраліся ў Дэлегатуры толькі ў пару пяцімесячнага старшынёўства Пекалкевіча. Пасьля ягонага арышту 19 лютага 1943 г. і прызначэньня чарговым Паўнамоцным прадстаўніком ураду сябра Партыі працы Янкоўскага адбыўся паварот да ранейшага курсу, абумоўленага поглядамі Нацыянальнай партыі і Партыі працы. Істотна паўплывала на радыкалізацыю пазыцыі Дэлегатуры скасаваньне ў красавіку 1943 г. дыпляматычных стасункаў СССР з польскім урадам, у выніку чаго перасталі дзейнічаць ранейшыя тактычныя рэзоны ў фармуляваньні канцэпцыі ўсходняй палітыкі. Так, у дасланых у ліпені ў Лёндан "Заўвагах аб нашай міжнароднай палітыцы" Дэлегатура намаўляла затрымаць Чырвоную Армію на мяжы паводле Рыскага трактату і нават адсунуць гэтую мяжу далей на ўсход, далучыўшы да Польшчы Менск і Камянец–Падольскі ў якасьці ваеннай кампэнсацыі[57].

Пры такім раскладзе плянаў беларускае пытаньне чыста зьнікала з поля зроку Дэлегатуры. "Беларускі народ, — сьцьвярджала яна сьледам за Нацыянальнай партыяй, — ажно да цяперашняй вайны не стварыў ані на нашай, ані на савецкай тэрыторыі нічога накшталт уласнае культуры, традыцый, літаратуры, ані эліты, здольнай кіраваць дзяржавай і вызначаць лёс сваёй нацыі", у сувязі з чым Дэлегатура ня бачыла падставаў для стварэньня буфэрнай дзяржавы і выказвалася за поўную палянізацыю беларускіх крэсаў зь Меншчынай улучна[58].

На пачатку 1943 г. Іваноўскі апынуўся ў тупіку. Нарэшце ён мог усьвядоміць: разьлік на тое, што Польшча падтрымае беларускую дзяржаўнасьць, быў абсалютна памылковы. Пра гэта сьведчыла інфармацыя, атрыманая ад Станкевіча і Кастравіцкага, у гэтым пераконвала навагодняя прамова прэзыдэнта Рачкевіча. Польшча не хацела Беларусі. Усе яго неверагодныя намаганьні, якія схілілі кіраўніцтва польскага падпольля да перамоваў, пайшлі марна: яны не далі нічога, хіба што засьведчылі намеры беларусаў. Непатрэбная аказалася і сыстэма сувязі з Варшавай, якая распальвала фантазію пільных даносчыкаў[59].

Можна, аднак, думаць, што, нягледзячы на непрыхільнае стаўленьне Варшавы і Лёндану, Іваноўскі і на гэты раз не адмовіўся ад канцэпцыі беларуска–польскай фэдэрацыі, да якой яго падштурхнула ў 1919 г. пазыцыя Леніна. І хаця ён сапраўды ня бачыў аніякай магчымасьці рэалізаваць сваю ідэю падчас гэтай вайны, але таксама ня бачыў аніякай альтэрнатывы ёй у будучыні. Гэтыя ягоныя перакананьні замацоўваліся вынікамі савецкай нацыянальнай палітыкі, зь якімі ён штодня сутыкаўся ў Менску. Акурат з гэтай прычыны Іваноўскі не лічыў магчымым вырашыць праблему беларускай дзяржаўнасьці ў межах СССР і адхіляў неаднаразовыя прапановы супрацоўнічаць з савецкім падпольлем[60].

[56] Mowa prezydenta Rzeczypospolitej // Wschód. 25.01.1943.
[57] Uwagi o naszej polityce międzynarodowej. ЦА ПАРП, 202/1–34, k. 57—60.
[58] Тамсама.
[59] У гэты час быў арыштаваны В. Буткевіч. У даносе ён быў абвінавачаны ў тым, што ён не беларус, а паляк і вядзе ў Менску дывэрсійную працу. В. Іваноўскі выкарыстаў свае магчымасьці, каб вызваліць яго з турмы — прывёз зь Ліды дакумэнты, якія пацьвярджалі, што Буткевіч — сапраўдны беларус, і асабіста за яго паручыўся. Іваноўскі адчуваў сваю маральную адказнасьць за Буткевіча, якога прыняў на працу ў гарадзкую ўправу.
[60] Новікаў І. Выбраныя творы. Т. III. Мінск, 1988. С. 12.

Верагодна, яго ня дужа ўзрушыла параза нямецкіх войскаў пад Сталінградам — Іваноўскі даўно ня верыў у перамогу над Расеяй і таму не разьлічваў на аднаўленьне беларускай дзяржавы з дапамогай Нямеччыны. Тым больш ня мог ён разьлічваць на гэта напачатку 1943 г., калі пачалося масавае адступленьне войскаў Вэрмахту на Ўсходнім фронце. Такім чынам, сытуацыя была безнадзейная. У гэты момант Іваноўскі мог толькі ці адмовіцца ад палітычнага жыцьця і зьехаць зь Менску, ці аддацца на волю лёсу. Ён выбраў апошняе, спадзеючыся на ўзмацненьне нацыянальных сіл у выніку палітыкі Кубэ.

Разьвіцьцё падзей у Беларусі ставіла, аднак, гэтыя спадзяваньні пад вялікі пытальнік. Пашыралася дзейнасьць савецкіх партызанаў, якімі кіравалі і якіх падтрымлівалі з–за лініі фронту. Партызанка правакавала ўзмацненьне карных паліцыйных акцыяў, якія суправаджаліся спальваньнем вёсак, вынішчэньнем альбо дэпартацыяй жыхароў, падазраваных у дапамозе партызанам, і іншымі злачынствамі. Падчас такіх акцыяў загінула каля 100 тыс. жыхароў беларускіх вёсак, збольшага старых, жанчын і дзяцей.

Кубэ разумеў, што злачынствы супраць мірных жыхароў з боку SS і паліцыі падчас карных апэрацыяў перакрэсьліваюць усю ягоную палітыку, разьлічаную на заваёву сымпатыяў насельніцтва. З гэтай прычыны, а таксама з гуманістычных пабуджэньняў ён распачаў барацьбу з SS, абараняючы нявінных людзей. Ня маючы права аддаваць загады паліцыйным уладам, Кубэ выкрываў злачынствы карных аддзелаў, інфармаваў пра іх вышэйшае кіраўніцтва ў Бэрліне і разьлічваў, што ягонае заступніцтва прынясе плён. На гэтай глебе разгарэўся востры канфлікт, і кіраўніцтва SS паспрабавала выжыць Кубэ зь Менску.

У сьнежні 1942 г. паліцыйныя ўлады ў Бэрліне і Менску распачалі кампанію, накіраваную на палітычную дыскрэдытацыю Кубэ як ініцыятара "супярэчных" інтарэсам Нямеччыны беларускіх нацыянальных тэндэнцыяў. У першую чаргу пачалі распрацоўваць кіраўніцтва БНС і зьбіраць довады яго "злачыннай дзейнасьці". Галоўны ўдар прыйшоўся па Ермачэнку, супраць якога высунулі найцяжэйшае абвінавачаньне ў дзяржаўнай здрадзе. Кубэ, аднак, абараняў Ермачэнку, а разам зь ім і прынцыпы сваёй палітыкі, якая пакрывалася рашэньнямі нямецкіх вышэйшых цывільных уладаў. Таму сьледзтва было вымушана заняцца гаспадарчай дзейнасьцю БНС, дзе яно выкрыла злоўжываньні. Ермачэнка быў вымушаны сысьці з пасады і 27 красавіка 1943 г. пакінуў Менск.

Ратуючы Ермачэнку, Кубэ абараніў сваю асабістую пазыцыю, але заплаціў за гэта разбурэньнем усяго мэханізму палітычнай дзейнасьці, які ён пасьлядоўна ствараў зь верасьня 1941 г. Пад націскам паліцыйных уладаў увесну 1943 г. былі зьліквідаваныя ўсе не прадугледжаныя статутам БНС структуры, у тым ліку і Галоўная рада. Была дазволена толькі дзейнасьць у галіне сацыяльнага забесьпячэньня і аховы здароўя. Спыніў сваё існаваньне таксама інстытут Мужоў Даверу БНС, а ў красавіку 1943 г. была распушчана Беларуская самаахова. У гэтай атмасфэры быў арыштаваны і закатаваны ксёндз В. Гадлеўскі. У сваю чаргу В. Іваноўскага зноў абвінавацілі ў патураньні прапольскім элемэнтам і меркавалі сьпіхнуць яго з пасады бургамістра. Яго ўратавала толькі тое, што SD не знайшло довадаў яго сувязі зь Ермачэнкам[61]. Пэўна, і на гэты раз не абышлося без дапамогі Кубэ.

Атакі паліцыйнай апазыцыі, якія каардынаваў прызначаны Гімлерам кіраўнік SS і паліцыі ў Беларусі брыгадэнфюрэр Курт фон Готбэрг, не ўстрымалі Кубэ адмовіцца ад працягу пазытыўнай беларускай палітыкі, якую натхняў і падтрымліваў Іваноўскі. Але на гэты раз Кубэ дзейнічаў больш асьцярожна і ўсе важнейшыя ініцыятывы ўзгадняў з бэрлінскім міністэрствам акупаваных усходніх абшараў.

Так, у сакавіку 1943 г. Кубэ выдаў распараджэньне аб ліквідацыі зямельнай цераспалосіцы з мэтай стварэньня рацыянальных, з эканамічнага гледзішча, гаспадарак. Рэ-

[61] Ліст д–ра Крафта з Бэрліна ад 12.12.1942. AAN. Александрыйскі мікрафільм, T–454, p. 21/1283.

форма пачала ажыцьцяўляцца. Посьпехам скончыліся ягоныя намаганьні адчыніць мэдыцынскі інстытут — першую вышэйшую навучальную ўстанову ў Беларусі, створаную пад нямецкай акупацыяй. У чэрвені быў арганізаваны Саюз беларускай моладзі, а таксама Беларускае навуковае таварыства з Іваноўскім на чале. Разам з мэдыцынскім інстытутам яно стварала кадравую аснову і фармальны прэцэдэнт для адкрыцьця ўнівэрсытэту і тэхналягічнага інстытуту ў Менску, чаго ўвесь час дабіваўся Іваноўскі.

Выдаленьне Ермачэнкі і абмежаваньне кампэтэнцыі БНС перакрэсьлілі надзеі Кубэ стварыць на базе гэтай арганізацыі цэнтральны орган беларускага самакіраваньня. Ён не адмовіўся ад гэтай задумы, але дзеля супраціву Гітлера яго рэалізацыя стала амаль безнадзейнай. Таму, атрымаўшы згоду Розэнбэрга, 27 чэрвеня 1943 г. Кубэ ўтварыў Камітэт даверу ў якасьці інтэгральнай часткі апарату генэральнага камісара, што ахоўвала яго ад лёсу кіраўніцтва БНС. Камітэт Даверу разглядаўся як сымбалічнае пакуль беларускае нацыянальнае прадстаўніцтва, якое ў спрыяльных умовах магло з санкцыі Бэрліна пераўтварыцца ў самастойны орган.

Камітэт даверу (больш вядомы пад назвай Рада даверу) складаўся з 16 чалавек, ніводзін зь якіх не ўваходзіў у ранейшую каманду Ермачэнкі. Гэта, безумоўна, таксама было зроблена з мэтай абараніць яго ад нападак SSаўскай апазыцыі. Старшынём Камітэту Кубэ прызначыў Вацлава Іваноўскага, але, паколькі за ім цягнуўся цень даносаў яго палітычных праціўнікаў і недаверу паліцыі, функцыю старшыні даручыў яму часова: тэрмінам на адзін год. Такім парадкам Кубэ, відаць, падстрахоўваўся ад магчымых неспадзяванак.

Выступаючы з нагоды склікaньня Камітэту даверу, Кубэ паўтарыў сваю тэзу, што “мы прыйшлі сюды як пераможцы, але пераможцы бальшавізму, а не беларусаў, для якіх мы вызваліцелі”, і заклікаў Камітэт так арганізаваць беларускую нацыю, “каб яна была на ўзроўні эўрапейскіх нацыяў”. Прадметам асаблівай увагі Камітэту ён назваў тры задачы: разьвіцьцё школьніцтва і выхаваньне моладзі; аднаўленьне эканомікі і забесьпячэньне насельніцтва харчаваньнем; і, урэшце, дапамогу ў барацьбе з партызанамі[62]. У гэтых справах Камітэт абавязаны быў выпрацаваць прапановы, якія падлягалі абмяркаваньню на супольным паседжаньні зь нямецкімі ўладамі.

Гэтае паседжаньне — першае і апошняе — адбылося 23 жніўня 1943 г. з удзелам чальцоў Камітэту, Кубэ і іншых вышэйшых функцыянэраў генэральнага камісарыяту, а таксама афіцэраў SS і паліцыі на чале з Готбэргам. Як пісаў Аўген Калубовіч, былы сябра Камітэту даверу і ўдзельнік паседжаньня, разглядаліся тры пытаньні: рэпрыватызацыя нерухомасьці, пытаньне школьніцтва і мэтады барацьбы з партызанамі.

Па першым пытаньні выступаў Іваноўскі. Ён запатрабаваў у інтарэсах аднаўленьня беларускай эканомікі вярнуць былым уладальнікам нерухомасьць, нацыяналізаваную савецкай уладай. Калубовіч быў дакладчыкам у пытаньні аб школьніцтве, просячы дазволіць адкрыцьцё ўнівэрсытэту, не чыніць перашкодаў у стварэньні сярэдніх школаў і паскорыць выданьне школьных падручнікаў. Абодва гэтыя пытаньні ня выклікалі асаблівых пярэчаньняў і былі прынятыя да выкананьня.

Па трэцім пытаньні выступаў Аляксандар Русак. Ён падаў сабраныя Камітэтам даверу довады злачынстваў паліцыйных аддзелаў у часе антыпартызанскіх карных акцыяў. Выражаючы пратэст Камітэту супраць такіх мэтадаў, ён выклаў наступныя прапановы: а) спыніць спальваньне вёсак і рэпрэсіі супраць нявіннага насельніцтва; б) стварыць умовы і рэальныя гарантыі бясьпекі для людзей, якія б вярнуліся зь лясоў дадому; в) стварыць нямецка–беларускую камісію, якой даручыць распрацаваць адпаведныя рэкамэндацыі па гэтых пытаньнях і ажыцьцявіць кантроль іх выкананьня.

Паводле Калубовіча, выкладзеная Русаком пазыцыя Рады даверу выклікала абурэньне прысутных афіцэраў SS і паліцыі.

[62] Беларуская Газэта. 1943. 3 ліпеня.

Аўген Калубовіч пісаў:

> Аднак мы былі зьдзіўленыя, калі Кубэ … пачаў перад Радай Даверу апраўдвацца, заявіўшы, што ён у гэтым не вінаваты, што гэта робяць незалежныя ад яго SD і вайсковыя групы і што ён сам быццам бы скардзіўся на іх у Бэрлін. Нашыя пабойваньні арышту Рады Даверу ня спраўдзіліся. Іваноўскаму не прыйшлося чытаць Дэклярацыі Незалежнасьці, якая ляжала ў нутраной кішэні ягонага пінжака (яна была падрыхтаваная на выпадак арышту Камітэту. — *Ю.Т.*). Але даўжэйшы час нас не пакідала думка, што немцы яшчэ могуць з намі расправіцца… Мы не выключалі таксама мажлівасьці, што органы SD і SS не даруюць таксама і В. Кубэ[63].

Страхі чальцоў Камітэту не былі беспадстаўныя. Пасьля безвыніковых спробаў выдаліць Кубэ зь Менску, у якіх бралі ўдзел найвышэйшыя, аж да самога Гімлера, прадстаўнікі SS, 22 чэрвеня ў менскім тэатры на яго быў арганізаваны замах. Міна пад сцэнай павінна была выбухнуць, калі Кубэ выступаў з урачыстай прамовай з нагоды ўтварэньня Саюзу беларускай моладзі. Але выбух адбыўся пазьней, у часе спэктаклю, на якім Кубэ ўжо не прысутнічаў. Загінула 13 чалавек і некалькі дзясяткаў было паранена. Прамаўляючы над брацкай магілай, Іваноўскі не паўтараў газэтных "сэнсацыяў" пра бальшавіцкіх агентаў, а пасьля паховінаў у вузейшым коле сказаў: "Дзякуем і за вызваленьне, і за гэтыя вось ахвяры"[64].

Затое наступны замах на Кубэ, у ноч з 21 на 22 верасьня, быў удалы і які гэтым разам пацьвердзіў прадбачаньні чальцоў Камітэту. Для Іваноўскага гэта быў шок. Надыходзіў канец эпохі, якая, нягледзячы на цяжкасьці ваеннага часу, стварала сэнс дзеяньня ва ўмовах акупацыі. Кубэ быў адзіным уплывовым нямецкім палітыкам, які паважаў і падтрымліваў беларускую нацыянальную справу, бачачы ў пэрспэктыве яе вырашэньне ў выглядзе беларускай дзяржавы пад пратэктаратам нямецкага Райху. І хаця ваенная сытуацыя перакрэсьлівала гэтую пэрспэктыву, пазыцыя Кубэ ішла насустрач спадзяваньням беларускіх нацыянальных колаў і рабіла магчымым дасягненьне вынікаў, якія ў будучыні маглі б выступаць у якасьці гістарычных аргумэнтаў. Асаблівае значэньне мела маштабнае разьвіцьцё нацыянальнай сьвядомасьці, да нядаўняга часу блякаванай і нішчанай савецкімі ды польскімі ўладамі.

Такая ацэнка Іваноўскім дзейнасьці Кубэ ўтрымлівалася ў заяве Камітэту даверу, зробленай пасьля сьмерці генэральнага камісара. Заява заслугоўвае ўвагі яшчэ й таму, што чальцы Камітэту паўстрымаліся назваць выканаўцаў замаху "маскоўскімі агентамі". Вось яе зьмест:

> 22 верасьня загінуў ад рукі трусьлівага злачынцы генэральны камісар Беларусі, гаўляйтэр Вільгельм Кубэ. Вестку пра гэтую трагічную сьмерць беларусы сустрэлі з глыбокім абурэньнем. У асобе памерлага беларускі народ страціў свайго найлепшага сябра і супрацоўніка ў барацьбе за інтарэсы Беларусі. Беларусы верылі і адчувалі, што іх жаданьні будуць спраўджаныя з дапамогай генэральнага камісара Кубэ. Жыцьцё і дзейнасьць гэтага дзяржаўнага дзеяча былі перашкодай для нашых ворагаў. Таму яны намагаліся зьнішчыць яго. У сувязі з трагічнай сьмерцю гэтага чалавека беларускі Камітэт даверу выказвае ад імя свайго народу глыбокае спачуваньне нямецкаму народу і ўраду нямецкага Райху[65].

Адразу пасьля забойства Кубэ, раніцай 22 верасьня, чальцы Камітэту даверу Вацлаў

[63] Нарыс А. Калубовіча для аўтара ад 14.03.1979, часткова апублікаваны ў "Беларускай Думцы" (1983. № 27—28).
[64] Беларуская Газета. 1943. 30 красавіка. (прамова); інфармацыя Антона Адамовіча для аўтара ад 18.04.1985. "Вызваленьне" — у дадзеным выпадку — угодкі пачатку нямецка–савецкай вайны.
[65] Deutsche Zeitung im Ostland. 23.09.1943.

Іваноўскі, Юры Сабалеўскі, Аўген Калубовіч і Міхал Ганько накіраваліся да начальніка палітычнага аддзелу генэральнага камісарыяту, д–ра Маркуса з просьбай не ўчыняць рэпрэсіяў супраць жыхароў Менску за сьмерць Кубэ. Як пісаў Калубовіч, просьба была выканана і ніхто не пацярпеў[66].

У сувязі з пахаваньнем Кубэ 24 верасьня ў Бэрлін выехала дэлегацыя Камітэту (Іваноўскі, Сабалеўскі, Калубовіч). Назаўтра дэлегацыя нанесла візыт пастаяннаму намесьніку міністра акупаваных усходніх абшараў, Альфрэду Маеру, і выклала яму свае патрабаваньні, што датычылі эканомікі, школьніцтва, самакіраваньня і аб'яднаньня ўсіх беларускіх земляў. Маер паставіўся да гэтага прыхільна, абяцаў разгледзець патрабаваньні Камітэту і прыслаць адказ у Менск. Неўзабаве, пасьля кароткага перабываньня ў Вене, дэлегацыя вярнулася ў Менск[67].

У той дзень, калі Іваноўскі размаўляў з Маерам, Чырвоная Армія заняла Смаленск, а назаўтра — Хоцімск, першы раённы цэнтар на тэрыторыі Беларусі. Такім чынам, гэта была апошняя спроба Іваноўскага стварыць "гістарычныя аргумэнты". Ён ня мог болей разьлічваць на што–небудзь і не разьлічваў. Пасьля сьмерці Кубэ Іваноўскі меў дачыненьне зь ягоным пераемнікам — начальнікам SS і паліцыі фон Готбэргам, які глядзеў на беларускае пытаньне як на выдумку салённых палітыкаў і не цікавіўся нічым, апроч бясьпекі ў тылавых рэгіёнах ды іхнай эканамічнай эксплёатацыяй. Быў ён, зрэшты, рэалістам і, рыхтуючыся да хуткай эвакуацыі зь Менску, пачаў мінаваць найважнейшыя аб'екты.

У гэтай сытуацыі Камітэт даверу не выяўляў ужо ніякай актыўнасьці, і Готбэрг зьбіраўся яго распусьціць. Нежаданьне Готбэрга рабіць стаўкі на беларускую карту паглыблялася ягоным стаўленьнем да Іваноўскага: Готбэрг не забыў жнівеньскага паседжаньня і пратэст Камітэту супраць барбарскіх карных мэтадаў SS. Затое ніхто больш не абвінавачваў Іваноўскага ў патураньні польскім элемэнтам: увосень 1943 г. сам Готбэрг пачаў заігрываць з акоўскімі аддзеламі на Беларусі, спадзеючыся, што тыя дапамогуць яму адолець савецкіх партызанаў. Таму ён неяк выносіў Іваноўскага — бо ён мог яго лёгка адхіліць з пасады старшыні Камітэту даверу ці бурмістра Менску ды нават і арыштаваць зь якой–небудзь надуманай зачэпкі.

Сьмерць Кубэ мела яшчэ адно наступства: яна дазволіла Астроўскаму вярнуцца ў Менск. Пасьля канфлікту зь Ермачэнкам ён два гады правёў у Смаленску, працаваў там у мясцовай адміністрацыі, супрацоўнічаючы з штабам фэльдмаршала Клюге, камандзіра цэнтральнага ўчастку фронту і смаленскай службы бясьпекі (SD). Шукаючы магчымасьці адыграць галоўную ролю ў Беларусі, Астроўскі таксама зьвяртаўся па дапамогу да кіраўніцтва польскага падпольля. У кастрычніку 1942 г. ён прыехаў у Варшаву і скантактаваўся з Тамкевічам ("Кшыштафам") зь БІПу, прапануючы яму арганізаваць перамовы аб польска–беларускім супрацоўніцтве. Аднак прапанову Астроўскага ў Варшаве праігнаравалі.

Пасьля эвакуацыі з Смаленску ён кароткі час знаходзіўся ў Магілёве і толькі пасьля замаху на Кубэ, у канцы верасьня ці на пачатку кастрычніка 1943 г., вярнуўся пакуль у Баранавічы, куды эвакуаваўся штаб Клюге. А ў Менску разьмясьцілася смаленская SD. Падтрымліваючы кантакты з вайсковымі і паліцыйнымі ўладамі, Астроўскі разьлічваў на іх рэкамэндацыі і падтрымку з боку Готбэрга.

Намаганьні Астроўскага, якому пасярэднічала смаленская SD, пераканалі Готбэрга ў мэтазгоднасьці стварыць беларускі прадстаўнічы орган, які ў бягучай партызанскай вайне можна было б выкарыстаць у якасьці эфэктыўнага сродку прапаганды. Камітэт даверу не надаваўся да гэтай мэты як з прычыны ягонага фармальнага статусу (Камітэт дзейнічаў на прынцыпах камісіі генэральнага камісарыяту, г.зн. нямецкай інстытуцыі), так і дзеля нежаданьня Іваноўскага адыгрываць такую ролю. Аднак бяз згоды Гітлера склікаць

[66] Нарыс А. Калубовіча для аўтара ад 14.03.1979.

[67] Тамсама.

фармальны прадстаўнічы орган было немагчыма. І, каб абысьці гэтую перашкоду, Готбэрг пагадзіўся "актывізаваць" існуючы Камітэт даверу, што не вымагала адмысловых юрыдычных актаў.

Аднак кадравае пытаньне зацягвала ўсю справу. Разьлічваць на прызначэньне Р. Астроўскага старшынём "актывізаванага" Камітэту было нельга, пакуль гэтую пасаду займаў В. Іваноўскі. У гэтай сытуацыі агенты Астроўскага пачалі рыхтаваць замах, магчыма, без актыўнага ўдзелу паліцыі, але зь яе ведама і згоды. Пра гэта сьведчыць выступ Готбэрга на канфэрэнцыі ў міністэрстве акупаваных усходніх абшараў 22 лістапада 1943 г., падчас якога ён асабліва падкрэсьліў, што замах будзе выкананы рукамі самых беларусаў[68].

Падкідаючы сьпярша ананімныя цыдулкі з пагрозамі ў дом Іваноўскага на вуліцы Ратамскай, дзе ён разам з дачкой Ганнай жыў з восені 1942 г., арганізатары замаху плянавалі прымусіць яго выехаць зь Менску[69]. Пра магчымы замах папярэджвалі яго таксама супрацоўнікі беларускай паліцыі. Аднак Іваноўскі не пакінуў Менску, хаця небясьпекі ігнараваць ня мог: ён зрабіўся нэрвовы, падазроны, шукаў міны ў падмурку дому. Урэшце 6 сьнежня, калі ён у пралётцы вяртаўся дадому з гарадзкой управы, на яго напалі два чалавекі і колькі разоў стрэлілі зь пісталета. Іваноўскага адразу ж прывезьлі ў больніцу, дзе ён і памёр на наступны дзень, 7 сьнежня 1943 г.

Факт, што Готбэрг ужо ў канцы лістапада ведаў пра падрыхтоўку замаху, дапамагае разгадаць пытаньне аб яго ініцыятарах, у параўнаньні зь якім дэталі самой апэрацыі падаюцца менш важнымі. Але пра яе вынікі сказаць варта. Як і ў выпадку з Кубэ, у Менску без папярэдняга сьледзтва была абвешчаная афіцыйная вэрсія, згодна зь якой Іваноўскага забілі савецкія партызаны. Нават сьмерць гэтага пачынальніка беларускага адраджэньня была выкарыстана ў прапагандысцкіх мэтах дзеля барацьбы з партызанамі.

Пасьля вайны нямецкую вэрсію падхапілі савецкія публіцысты. Галоўную ролю ў яе папулярызацыі адыграў раман Івана Новікава "Дарогі скрыжаваліся ў Мінску", шмат разоў выдадзены вялікімі накладамі. Аднак І. Новікаў абмыліўся — ён ня ведаў, што інфармацыя Готбэрга пра замах трапіла ў пратакол і захавалася.

* * *

Сьмерць Вацлава Іваноўскага, "бацькі гораду", як яго звычайна называлі, ахінула смуткам жыхароў Менску, а ягонае пахаваньне 11 сьнежня вылілася ў сапраўдную масавую дэманстрацыю жалю, пашаны і ўдзячнасьці. Са сваякоў за труной ішлі толькі ягоная дачка Ганна і першая жонка Сабіна.

Але і пасьля сьмерці не абышлося без складанасьцяў. Адзіны ў Менску каталіцкі сьвятар, літоўскі вайсковы капэлян, ксёндз Зянон Ігнатавічус, адмовіўся адпяваць Іваноўскага як разьведзенага. Затое не такім прынцыповым аказаўся намесьнік мітрапаліта Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы архіяпіскап Філафей, і такім чынам Іваноўскі пасьля рыма–каталіцкага хросту, эвангелісцкага (другога) шлюбу атрымаў яшчэ і праваслаўнае пахаваньне з удзелам шматлікіх прадстаўнікоў духавенства. Пахаваны ён, аднак, на каталіцкіх могілках — менскай Кальварыі.

Перад пахаваньнем адбылася афіцыйная жалобная цырымонія ў гарадзкім тэатры. Як можна бачыць з газэтных рэпартажаў, цырымонія была лягічным працягам правакацыйнага замаху на жыцьцё Вацлава Іваноўскага і выкарыстоўвалася як "пераканаўчы" аргумэнт у антыбальшавіцкай прапагандзе. Яго надзялілі тым, чаго ён найбольш сабе не зычыў.

[68] Справаздача з канфэрэнцыі з Готбэргам 22—23.11.1943. AAN. Александрыйскі мікрафільм. T–454, p. 23/484.
[69] Życie i działalność polityczna prof. Wacława Iwanowskiego... (паведамленьне Ганны Іваноўскай–Карнэцкай)

Біяграфічныя нататкі

АСТРОЎСКІ Радаслаў, нар. 25.10.1887 у фальварку Запольле Слуцкага пав., скончыў гімназію ў Слуцку (1903), вучыўся ў Пецярбурскім і Дэрпцкім унівэрсытэтах (1908—1913). Палітычны дзяяч у Слуцку і Менску (1917—1918), у 1920 г. — у арміі ген. Дзяніціна, пазьней — дырэктар Віленскай беларускай гімназіі (1924—1936), у службовым парадку пераведзены ў Лодзь (восень 1936 г.). У лютым 1924 г. стаў адным з заснавальнікаў праўрадавага Польска–Беларускага Таварыства, а пасьля яго распаду — супрацоўнік КП(б)Б і КПЗБ, куратар падпольнага камсамолу ў гімназіі; сябра кіраўніцтва Беларускай Сялянска–Работніцкай Грамады і дырэктар Беларускага Каапэратыўнага Банку ў Вільні, цераз які праходзілі з СССР грошы, прызначаныя на падтрымку дзейнасьці БСРГ (1925—1926); сябра КПЗБ (1926). У студзені 1927 г. арыштаваны і абвінавачаны па працэсе Грамады, у турме зьмяніў свае палітычныя погляды і стаўся арганізатарам і прапагандыстам супрацоўніцтва з санацыяй (1928—1936). Пасьля вайны — палітычны дзяяч на эміграцыі. Памёр 17.10.1976 у Злучаных Штатах.

БАГУШЭЎСКІ Сьцяпан, нар. 07.01.1877 у Ізабелаве Менскай губ. Пасьля заканчэньня навучаньня ў кракаўскім Ягелонскім унівэрсытэце (1905 г.) далучыўся да палітычнага жыцьця і грамадзкай працы. У 1905—1906 гг. — дзяяч Беларускага Сялянскага Саюзу ў Менску, а ў міжваенную пару — Цэнтральнага Саюзу Земляробчых суполак (Kółek Rolniczych) у Варшаве, выкладчык Польскага Вольнага ўнівэрсытэту, быў сябрам Міжнароднай Сельскагаспадарчай Камісіі, створанай пры Лізе Нацыяў. У 1928 і 1930 г. выбіраўся ў сэнатары Польшчы ад Беспартыйнага блёку супрацоўніцтва з урадам (ББСУ). У 1931 г. завязаў супрацоўніцтва з ПКП, у 1932 г. абвясьціў аб сваім выхадзе з ББСУ. Адзін з арганізатараў і старшыня Польскага Антыфашысцкага і Антываеннага Камітэту. Памёр 18.04.1938 у Варшаве.

БУТКЕВІЧ Вітальд, сын Адольфа і Марыі з Кастравіцкіх, нар. 21.03.1902 у Навасадах Менскага пав. У 1920 г. сям'я пераехала ў Сувоўшчыну (Suwowszczyzna) Лідзкага пав. У міжваенную пару працаваў мытнікам на ўсходняй польскай мяжы і ў Гдыні, адкуль у кастрычніку 1939 г. яго выселілі немцы. Жыў у Варшаве, быў сябрам Беларускага Камітэту, увесну 1941 г. уступіў у ZWZ—AK. Зь лістапада 1941 г. да чэрвеня 1944 г. жыў у Менску, пазьней вярнуўся ў Варшаву. Пасьля Варшаўскага паўстаньня трапіў у канцлягер у Нямеччыне, адкуль у 1945 г. вярнуўся ў Польшчу. У сакавіку 1953 г. арыштаваны ў Эльблонгу і перададзены савецкім уладам у Менску. Дзякуючы хадайніцтву дачкі Барбары перад Баляславам Берутам, супрацоўнікам Буткевіча ў Менскай гарадзкой управе, неўзабаве выйшаў на волю і ў студзені 1954 г. вярнуўся ў Польшчу. Да 1970 г. працаваў у Торуньскім гарвыканкаме. Памёр 11.10.1975 у Надажыне пад Варшавай.

ВАЛЕЙКА Вінцэнт, нар. 23.01.1883 у фальварку Галавічполь Лідзкага пав. Скончыў III Рэальную Гімназію ў Пецярбургу (1903), Горны інстытут (1911). З 1910 г. працаваў інжынэрам у Данбасе, на Украіне, а з 1921 г. — у Дамброве–Гурнічай у Польшчы, спачатку ў шахтах, а пазьней — у Дзяржаўнай горна–мэталюргічнай школе. У траўні 1940 г. арыштаваны гестапа. 18.10.1940 памёр у канцлягеры Заксэнгаўзэн.

ВАСІЛЕЎСКІ Леан, нар. 24.08.1870 у Пецярбургу, палітычны дзяяч, публіцыст, гісторык. З 1896 г. — сябра ППС, рэдактар часопіса "Przedświt" (1897—1905), пасьля расколу 1906 г. — лідэр ППС–Рэвалюцыйнай Фракцыі, у 1907 і 1914 г. — сябра яе Цэнтральнага Рабочага Камітэту, рэдактар партыйнай прэсы. У часе першай сусьветнай вайны — дзяяч польскіх незалежніцкіх арганізацыяў, у 1918—1919 гг. — міністар замежных справаў, з 1928 г. — сябра Галоўнай Рады ППС і з 1931 г. — яе віцэ–старшыня, з 1924 г. —

прэзыдэнт Інстытуту Вывучэньня Найноўшай Гісторыі Польшчы і рэдактар (з 1929 г.) часопісу "Niepodległość", з 1931 г. — дырэктар Інстытуту дасьледаваньня нацыянальных пытаньняў. Аўтар шматлікіх прац, у т.л. "Літва і Беларусь" (1912 і 1925). Памёр 10.12.1936 у Варшаве.

ВІТАН–ДУБЕЙКАЎСКІ Лявон, нар. 07.07.1869 у маёнтку Дубейкава Магілёўскай губ. Вывучаў архітэктуру ў Пецярбургу і Парыжы, інжынэр–архітэктар, палітычны дзяяч. У сакавіку 1917 г. — сябра Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Менску (сьнежань 1917), прадстаўнік БНР у Варшаве (1919—1921). З 1922 г. жыў у Вільні, быў кіраўніком беларускай каталіцкай парафіі імя сьв. Міколы, дзеячом Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, сябрам рэдкалегіі газэты "Беларускі фронт". Памёр у Вільні 06.11.1940.

ГРЫНЕВІЧ Антон, нар. 03.05.1877 у фальварку Іваноўшчына Лепельскага пав. Віцебскай губ., зьбіральнік і папулярызатар беларускіх народных песень, выдавец, пэдагог, кампазытар. У 1896—1914 гг. жыў у Пецярбургу, супрацоўнічаў з выдавецтвам "Загляне сонца і ў наша аконца", у 1910 г. заснаваў уласнае выдавецтва. У 1920—1925 гг. працаваў у Вільні, між іншым, як настаўнік музыкі ў беларускай гімназіі. З 1925 г. жыў у Менску і Віцебску. Памёр 08.12.1937.

ГРЫНКЕВІЧ Станіслаў, нар. 02.11.1902 у Новым Двары Сакольскага пав. Скончыў мэдычны факультэт Познанскага ўнівэрсытэту (1930), працаваў у тамтэйшай клініцы, а з 1934 г. — у псыхіятрычнай больніцы ў Харошчы пад Беластокам. Каля 1938 г. асеў у Вільні. Дзяяч Беларускай хадэцыі, аўтар шматлікіх артыкулаў і папулярных брашур па мэдыцыне на польскай і беларускай мовах. У часе нямецкай акупацыі — дзяяч канспірацыйнага падпольнага Народнага Аб'яднаньня, куратар супрацоўніцтва з польскім падпольлем. У 1944 г. арыштаваны савецкімі ўладамі, памёр у менскай турме ў 1945 або 1946 г.

ДАБРЫНСКАЯ Соф'я (дзяв. Корсак), нар. 14.04.1904 у Рызе. Скончыла ў Вільні гімназію імя А. Міцкевіча (1927) і настаўніцкую сэмінарыю, працавала школьнай настаўніцай на Віленшчыне, а пазьней у Варшаве. Падчас акупацыі ў Бюро Інфармацыі і прапаганды ГК АК, працавала ў беларускай школе ў Варшаве (1942—1943), аўтарка падручнікаў для беларускіх школаў. Пасьля вайны некалькі год пражыла ў Ольштыне, у 1950 г. вярнулася ў Варшаву, працавала ў галіне адукацыі. З 1961 г. — сябра Беларускага грамадзка–культурнага таварыства. Памерла 15.06.1992 г. у Варшаве.

ЕРМАЧЭНКА Іван, нар. 01.05.1894 у Капачоўцы Барысаўскага пав., скончыў гімназію ў Маскве, а падчас першай сусьветнай — афіцэрскую школу, служыў у расейскай арміі, пад канец вайны быў ад'ютантам ген. Урангеля, меў ранг палкоўніка. У 1920 г. эвакуаваўся ў Канстантынопаль, дзе з даручэньня ўраду БНР выконваў абавязкі генэральнага консула на Балканах. У 1922 г. пераехаў у Прагу. Тут атрымаў мэдыцынскую адукацыю (1929), займаўся лекарскай практыкай і палітычнай дзейнасьцю сярод беларускай эміграцыі. З 1938 г. — ініцыятар беларуска–нямецкага супрацоўніцтва. Пасьля другой сусьветнай вайны — на эміграцыі. Памёр 25.02.1970 у Злучаных Штатах.

ЖАЛІГОЎСКІ Люцыян, нар. 17.10.1865 у Ашмянах, генэрал. З 1885 г. — кадравы афіцэр расейскай арміі, падчас першай сусьветнай вайны — камандзір палка, затым служыў у Польскім корпусе ў Расеі. У 1918—1919 г. — камандзір сфармаванай на Кубані г.зв. Дывізіі Жалігоўскага і галоўнакамандуючы польскіх атрадаў на Ўсходзе. У красав-

іку 1919 г. разам з дывізіяй вярнуўся ў Польшчу. У 1919 г. — камандзір апэратыўнай групы ў раёне Менску. Затым — камандзір 10–й дывізіі і 1–й беларуска–літоўскай дывізіі, якую падняў на славуты бунт, 09.10.1920 заняў Вільню і склікаў Часовую Кіраўнічую Камісію Сярэдняй Літвы. У 1925—1926 гг. — міністар вайсковых справаў, у 1927—1930 гг. — пасол сойму, падчас другой сусьветнай вайны — на эміграцыі, сябра Лёнданскай Нацыянальнай Рады. Памёр 09.07.1947 у Лёндане.

ЖЫЛУНОВІЧ Зьмітро, нар. 23.10.1887 у Капылі Менскай губ., рабочы, грамадзкі дзяяч, пісьменьнік. Пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі — у партыі бальшавікоў, прэм'-ер–міністар абвешчанага 01.01.1919 ураду БССР. З 1920 г. кіруе Беларускім Дзяржаўным Выдавецтвам, рэдагуе газэту "Савецкая Беларусь" і часопіс "Полымя", выконвае розныя функцыі ўва ўрадзе рэспублікі. У 1931 г. выключаны з камуністычнай партыі, у 1936 г. арыштаваны, закатаваны ў засьценках НКУС. Памёр 11.04.1937 у шпіталі для псыхічна хворых у Магілёве.

ЗАН Тамаш, нар. у 1902 г. у Дукштах Ковенскай губ. Падчас першай сусьветнай вайны эвакуаваны ў Расею, пасьля служыў у польскіх вайсковых фармаваньнях. У 1922—1939 гг. жыў у сваім маёнтку ў Дукштах. У 1939 г. мабілізаваны, удзельнічаў у верасьнёўскай кампаніі, у 1940 г. — быў рэзыдэнтам польскай выведкі ў Коўне, арыштаваны літоўскімі ўладамі, уцёк у Варшаву, прызначаны шэфам выведкі ZWZ—AK на паўночна–ўсходнім абшары (Беларусь і Прыбалтыка). Зь лютага 1942 г. у Кедыве, пазьней — начальнік штабу Палескай дывізіі АК. Быў інтэрнаваны савецкімі ўладамі (1944—1946). Вярнуўся ў Польшчу, у 1951—1954 гг. быў зьняволены. Памёр 11.05.1989 у Варшаве.

ІВАНОЎСКІ Тадэвуш, нар. 16.12.1882 у Лябёдцы. Скончыў X гімназію ў Пецярбургу (1903), вывучаў прыродазнаўчыя навукі ў Пецярбурскім унівэрсытэце (1903—1905) і Парыскай Сарбоне (1905—1909). У 1910—1918 гг. жыў у Пецярбургу, займаўся навукай, працаваў у Міністэрстве Сельскай гаспадаркі. З 1919 г. пераехаў у Коўну, працаваў у дэпартамэнце Сельскай гаспадаркі, быў адным з арганізатараў Ковенскага ўнівэрсытэту і прафэсарам факультэту матэматычна–прыродазнаўчых навук. У 1940—1941 гг. — кіраўнік катэдры заалёгіі Віленскага ўнівэрсытэту, чалец АН Літоўскай ССР. Пасьля вайны — прафэсар Ковенскага і Віленскага ўнівэрсытэтаў, арганізатар і дырэктар Інстытуту Біялёгіі Акадэміі Навук. Быў выдатным арнітолягам, аўтарам шматлікіх навуковых прац. Памёр 01.04.1970 у Коўне.

ІВАНОЎСКІ Юры, нар. 29.01.1876 у Красным Варонескай губ. Скончыў гімназію ў Варшаве (1895) і Тэхналягічны інстытут у Пецярбургу (1901). Падчас навучаньня — дзяяч Польскага Кола Народнай Асьветы і ППС. У траўні 1901 г. удзельнічаў у падрыхтоўцы ўцёкаў Ю. Пілсудзкага з псыхіятрычнай больніцы ў Пецярбургу. У 1901—1903 гг. — функцыянэр ППС у Чанстахове, Заглэмбі Дамброўскім і Варшаве. У студзені 1903 г. арыштаваны, сядзеў у Варшаўскай Цытадэлі, адкуль звольнены пад заставу, а ў студзені 1904 г. сасланы на 4 гады ў Ноўгарадзкую губ. Вызвалены падчас амністыі 1905 г., працаваў у ППС у Вільні, зноў быў арыштаваны. Пасьля вызваленьня ў 1907 г. працаваў у Маскве і Пецярбургу. Сябра ўправы выдавецтва "Загляне сонца і ў наша аконца". У 1909 г. выехаў у Кітай, у 1918 г. вярнуўся на радзіму. У 1918—1919 гг. — міністар прамысловасьці і гандлю ва ўрадзе Ю. Марачэўскага і міністар працы і сацыяльнага забесьпячэньня ва ўрадзе І. Падэрэўскага. З кастрычніка 1920 г. да студзеня 1921 г. — дырэктар дэпартамэнту замежных справаў у Часовай Кіраўнічай Камісіі Сярэдняй Літвы. У 1920—1930 гг. — дзяяч Таварыства польскіх мэханікаў. У 1930—1935 гг. — сэнатар Рэчы Паспалітай ад ББСУ. Падчас другой сусьветнай вайны служыў падпалкоўнікам

Войска Польскага на Захадзе. Пасьля вайны дзеяў на эміграцыі ў Вялікай Брытаніі, між іншым, як старшыня Лігі Незалежнасьці Польшчы (1950—1955). Памёр 28.03.1965 у Пэнлі.

ІГНАТОЎСКІ Ўсевалад, нар. 19.04.1881 у в. Такары Берасьцейскага пав., гісторык і палітычны дзяяч. Скончыў унівэрсытэт у Юр'еве (Тарту) (1911). У 1914—1920 гг. — выкладнік Пэдагагічнага інстытуту ў Вільні і Менску. З 1926 г. — старшыня Інстытуту Беларускай Культуры, са студзеня 1929 г. — прэзыдэнт Беларускай Акадэміі Навук. З 1920 г. — сябра КП(б)Б, займаў высокія партыйныя і дзяржаўныя пасады. Аўтар шматлікіх прац з гісторыі Беларусі. У кастрычніку 1930 г. абвінавачаны ў нацыянальным апартунізьме, а ў студзені 1931 г. выключаны з партыі і звольнены з пасады прэзыдэнта БАН. 04 02.1931 скончыў жыцьцё самагубствам.

КАСТРАВІЦКІ Амброжы Самуэль, нар. у 1871 г. у Цывінску, што ў Сібіры, падчас вяртаньня сям'і з засланьня. Скончыў V гімназію ў Пецярбургу і мэдычны факультэт Маскоўскага ўнівэрсытэту (1897). У 1901—1920 гг. працаваў лекарам у Лідзе, Сьвянцянах і Менску, удзельнічаў у беларускім руху, між іншым, у менскім аддзяленьні Беларускага таварыства па аказаньні помачы пацярпелым ад вайны (1916—1917). У сакавіку 1917 г. быў старшынём зьезду, на якім быў створаны Беларускі Нацыянальны камітэт у Менску. Зь лета 1920 г. жыў у Варшаве, у 1925 г. атрымаў гаспадарку ў Белагрудзе пад Лідай. Памёр у 1937 г. у Белагрудзе.

КАСТРАВІЦКІ Казімер, псэўданім Карусь Каганец, нар. 29.01.1868 у Табольску, у Сібіры. У 1872 г. вярнуўся на Беларусь, вучыўся ў гарадзкой школе ў Менску і мастацкай школе ў Маскве. Дзяяч Беларускай Сацыялістычнай Грамады (1903—1907), двойчы сядзеў у менскай турме. Беларускі пісьменьнік, паэт, драматург. Памёр 20.05.1918 у Навасёлках на Меншчыне.

КАСТРАВІЦКІ Самуэль Анджэй, сын Амброжага і Марыі з Багушэўскіх, нар. 04.12.1902 у Лідзе. У 1915—1918 гг. вучыўся ў Менскай гімназіі. Пазьней служыў у Войску Польскім, скончыў школу падхаружых у Варшаве, у сьнежні 1921 г. звольнены ў запас. У 1923 г. вывучаў права ва ўнівэрсытэце Сьцяпана Батуры ў Вільні. У 30–х гг. працаваў у Варшаўскай зямельнай Палаце. Перад самай вайной пасяліўся ў Вільні. Пасьля верасьнёўскай кампаніі нядоўгі час хаваўся ў Вільні, пад канец 1939 г. прыбыў у Варшаву, супрацоўнічаў зь беларускім падпольлем і ZWZ—AK. У ліпені 1944 г. атрымаў званьне маёра запасу. Пасьля Варшаўскага паўстаньня апынуўся ў лягеры палонных Лямсдорф і Вольдэнбэрг. Са жніўня 1945 г. служыў у ахоўных ротах у Нямеччыне. Дэмабілізаваны ў 1948 г., эміграваў у Аргентыну. Памёр 12.07.1953 у Буэнас-Айрэсе.

КАСЯК Іван, нар. у 1909 г. у Віленскай губ. Скончыў беларускую гімназію ў Вільні, дзе падчас навучаньня ўступіў у камуністычны рух. Быў студэнтам Віленскага ўнівэрсытэту, дзеячом Беларускага Студэнцкага Саюзу і Таварыства Беларускай Школы. У 1932 г. за камуністычную дзейнасьць асуджаны на два гады турмы і выключаны з унівэрсытэту. Пасьля вызваленьня ў 30–х гг. паступіў у Політэхнічны інстытут у Львове, з 1939 г. — камсамольскі актывіст сярод студэнцтва. З пачаткам нямецкай акупацыі зьмяніў свае палітычныя погляды, працаваў у генэральным камісарыяце ў Менску (1941—1943), у сакавіку—чэрвені 1944 г. выконваў абавязкі паўнамоцнага прадстаўніка Беларускай Цэнтральнай Рады ў Глыбоцкай акрузе. Пасьля вайны — на эміграцыі ў Злучаных Штатах. Памёр у 1990 г.

КУБЭ Вільгельм, нар. 13.11.1887 у Глогаве на Одэры, палітычны дзяяч, паэт і драматург. У 1908 —1912 гг. вывучаў гісторыю і дзяржавазнаўства ў Бэрлінскім унівэрсытэце. У 1911—1923 гг. быў дзеячом Нямецкай Сацыяльнай партыі, Кансэрватыўнай партыі, Нацыянальнай народнай партыі, рэдактарам іх друкаваных органаў. У 1923 г. стварае Нацыянал–сацыялістычную партыю Свабоды, у 1924 г. атрымлівае мандат дэпутата Райхстагу. У сьнежні 1927 г. уступае ў легалізаваную Нацыянал–сацыялістычную рабочую партыю Нямеччыны (NSDAP) і становіцца гаўляйтэрам усходняй акругі. У 1933—1936 гг. быў віцэ–прэзыдэнтам Бэрліна і Брандэнбургу, дэпутатам Райхстагу, чальцом Акадэміі Нямецкага Права, экспэртам па пытаньнях старавечнай гісторыі. У 1936 г. выступіў супраць перасьледу жыдоў, за што быў пазбаўлены занятых дзяржаўных і партыйных пасадаў. У ліпені 1941 г. прызначаны Гітлерам на пасаду генэральнага камісара Беларусі. У вострай барацьбе з SS намагаўся ажыцьцяўляць палітыку нацыянальнага адраджэньня Беларусі. 22.09.1943 загінуў у выніку замаху, арганізаванага, верагодна, кіраўніцтвам SS.

ЛАСТОЎСКІ Вацлаў, нар. 20.10.1883 у фальварку Калесьнікі Дзісенскага пав. Віцебскае губ., гісторык, палітычны дзяяч. Супрацоўнік "Нашай Нівы", рэдактар газэты "Гоман" у Вільні (1916—1917) і часопіса "Крывіч" у Коўне (1923—1927). У 1906—1917 гг. дзяяч Беларускай Сацыялістычнай грамады, з 1919 г. лідэр Партыі Беларускіх Сацыялістаў–Рэвалюцыянэраў. Са сьнежня 1919 г. — старшыня Рады міністраў Беларускай Народнай Рэспублікі на эміграцыі. У 1927 г. вярнуўся ў Менск, стаў сталым сакратаром Беларускай Акадэміі Навук. Арыштаваны падчас хвалі антыбеларускіх рэпрэсіяў, загінуў у 1938 г.

ЛУЦКЕВІЧ Антон, нар. 30.01.1884 у Шаўлях Ковенскай губ., выдатны дзяяч беларускага нацыянальнага руху, публіцыст, літаратурны крытык. Скончыў унівэрсытэт у Пецярбургу і Дэрпце. Адзін з заснавальнікаў і стваральнікаў Беларускай Сацыялістычнай Грамады (1903—1907), супрацоўнік "Нашай Долі" і "Нашай Нівы" (1906—1915). У лістападзе 1918 г. — прэм'ер–міністар ураду Беларускай Народнай Рэспублікі, са сьнежня 1919 г. — старшыня Найвышэйшай Рады БНР. У міжваенную пару жыў у Вільні, працаваў у Беларускім Навуковым Таварыстве, кіраваў музэем імя Івана Луцкевіча, быў настаўнікам беларускай гімназіі, у 1925—1926 гг. супрацоўнічаў зь Беларускай Сялянска–Работніцкай Грамадой, пазьней — з праўрадавым "Цэнтрасаюзам". У кастрычніку 1939 г. арыштаваны савецкімі ўладамі. Паводле афіцыйнай вэрсіі, памёр у высылцы ў 1946 г.

ЛУЦЭВІЧ Іван, пс. Янка Купала, нар. 25.06.1882 у фальварку Вязынка Менскай губ., выдатны беларускі паэт, драматург і публіцыст, прарок нацыянальнага адраджэньня. У 1908—1909 гг. — супрацоўнік віленскай "Нашай Нівы", у 1909—1913 гг. — выдавецтва "Загляне сонца і ў наша аконца" ў Пецярбургу, дзе выйшлі яго найлепшыя творы. У 1913 г. вяртаецца ў Вільню, становіцца рэдактарам "Нашай Нівы" і сакратаром Віленскага Беларускага Выдавецтва. Увосень 1915 г. эвакуаваны ў Арол, мабілізаваны ў войска. З 1919 г. у Менску. Памёр 28.06.1942 у Маскве пры нявысьветленых абставінах.

НАЙДЗЮК–АЛЕКСАНДРОВІЧ Язэп, нар. 12.05.1909 у в. Байдакі Ваўкавыскага пав. Кіраўнік беларускай друкарні імя Ф. Скарыны ў Вільні (1926—1939), рэдактар віленскага месячніка "Шлях Моладзі" (1932—1939). Улетку 1939 г. арыштаваны, сасланы ў канцлягер Бяроза Картуская, у верасьні вярнуўся ў Вільню. З восені 1941 г. да чэрвеня 1944 г. працуе ў Менску, у выдавецтве школьных падручнікаў. У чэрвені 1945 г. пасяліўся ў Інаўроцлаве пад новым прозьвішчам Александровіч. Да 1978 г. працаваў у Інаўроцлаўскай друкарні, быў сябрам гарадзкой нацыянальнай рады, адным з заснавальн-

ікаў Таварыства любіцеляў гораду Інаўроцлава і сябрам мясцовага аддзяленьня Польскага гістарычнага таварыства. Аўтар падручніка гісторыі "Беларусь учора і сяньня" (1944), шматлікіх артыкулаў і кніг, прысьвечаных як беларускай тэматыцы, так і гісторыі гарадоў Інаўроцлаў і Куявы. Памёр 14.02.1984.

ПАШКЕВІЧ Алёйзія, пс. Цётка ды інш., нар. 03.07.1876 у фальварку Пешчын каля Ліды. Вучылася ў Вільні і Пецярбургу, дзе ў чэрвені 1904 г. скончыла жаночую гімназію. У 1904—1905 гг. — дзяячка Беларускай Сацыялістычнай Грамады. У 1905—1911 гг. вучылася ў Львоўскім і Кракаўскім унівэрсытэтах, у 1911 г. вяртаецца на радзіму, выходзіць замуж за літоўскага палітычнага дзеяча Стэпонаса Кайрыса. Паэтка, публіцыстка, рэдактарка моладзевага часопіса "Лучынка" ў Менску. Памерла 05.02.1916, пахаваная ў Старым Двары, што пад Лідай.

СІВІЦКАЯ (па мужу — Войцік) Людвіка, нар. 30.09.1892 на Украіне. Скончыла жаночую гімназію ў Горадні (1912), садаводча-пчалярскія курсы ў Варшаве (1914). Удзельніца Гарадзенскага Гуртка Беларускай Моладзі (1909—1913), Менскага Аддзяленьня Беларускага Таварыства па аказаньні помачы пацярпелым ад вайны (1915—1917), сакратар Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Менску (1917). З 1923 г. жыла ў Вільні, удзельнічала ў беларускім руху, рэдагавала дзіцячыя часопісы "Заранка" і "Пралескі". Аўтарка вершаў і апавяданьняў пад пс. "Зоська Верас". Памерла 08.10.1991 у Вільні.

СКІРМУНТ Раман, нар. у 1868 г. у маёнтку Парэчча Пінскага пав., буйны землеўласьнік, палітычны дзяяч. З 1906 г. — чалец першай Дзяржаўнай Думы, з кастрычніка 1910 г. — чалец Дзяржаўнай Рады Расеі, з сакавіка 1917 г. — старшыня Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Менску, увесну 1918 г. стаў чальцом Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, а зь ліпеня 1918 г. — прэм'ерам ураду БНР. Пасьля першай сусьветнай вайны адышоў ад палітычнага жыцьця, жыў у сваім маёнтку. Загінуў, верагодна, у верасьні 1939 г.

СТАНКЕВІЧ Ян, нар. 26.11.1891 у в. Арляняты Ашмянскага пав., скончыў беларускую гімназію ў Вільні (1921), Праскі ўнівэрсытэт у Чэхаславаччыне, доктар філязофіі (1926), выкладнік беларускай мовы ў Варшаўскім (1928—1932) і Віленскім (1927—1940) унівэрсытэтах, дэпутат сойму (1928—1930), публіцыст, палітычны дзяяч, аўтар шматлікіх моваэнаўчых і гістарычных прац, пасьля вайны — на эміграцыі, памёр 16.07.1976 у Злучаных Штатах.

ТАРАШКЕВІЧ Браніслаў, нар. 20.01.1892 у Мацюлішках на Віленшчыне. Скончыў гімназію ў Вільні (1911) і ўнівэрсытэт у Петраградзе (1916). Навуковы супрацоўнік Петраградзкага ўнівэрсытэту (1916—1918), выкладчык Менскага Пэдагагічнага інстытуту (1918—1920), кіраўнік аддзелу беларускіх школаў у Часовай Кіраўнічай Камісіі Сярэдняй Літвы ў Вільні (1920—1922), дырэктар Віленскай Беларускай Гімназіі (1921—1922). Дэпутат сойму (1922—15.01.1927), з 1925 г. — сябра КПЗБ, заснавальнік і кіраўнік Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады. У траўні 1928 г. асуджаны на 12 год турмы, у 1930 г. вызвалены. У лютым 1931 г. зноў арыштаваны за камуністычную дзейнасьць, у верасьні 1933 г. выехаў у СССР у выніку абмену палітвязьнямі. Працаваў у Міжнародным Сельскагаспадарчым Інстытуце ў Маскве. Расстраляны 29.11.1938. Аўтар беларускай граматыкі, перакладу "Пана Тадэвуша" Адама Міцкевіча, "Іліяды" Гамэра ды інш.

ТУМАШ Вітаўт, нар. у 1910 г., лекар, гісторык, публіцыст. Скончыў мэдыцынскі факультэт Віленскага ўнівэрсытэту Сьцяпана Батуры (1937), дзяяч Беларускага Студэн-

цкага Саюзу ў Вільні. У 1940—1941 гг. у Лодзі быў старшынём мясцовага аддзяленьня беларускага камітэту Самапомачы ў Нямеччыне, сябра створанага 19.06.1941 г. у Бэрліне Беларускага Нацыянальнага Цэнтру, зь ліпеня да сярэдзіны лістапада 1941 г. — бурмістар г. Менску, у 1943 г. — рэдактар бэрлінскага тыднёвіка "Раніца". Пасьля вайны на эміграцыі ў Нямеччыне і Злучаных Штатах, шматгадовы сябра ўправы Беларускага Інстытуту Навукі і Мастацтва ў Нью-Ёрку. Аўтар шматлікіх гістарычных дасьледаваньняў, асабліва — у галіне скарыназнаўства. Памёр 30.04.1998 у ЗША.

ФАЛЬСКІ Мар'ян, нар. 07.12.1881 у Начы каля Наваградку. Скончыў Політэхнічны інстытут у Варшаве, у 1903—1906 гг. — дзяяч ППС, у 1907 г. сядзеў у Варшаўскай Цытадэлі. У 1910 г. выдаў лемантар "Nauka czytania i pisania", які пазьней шмат разоў удасканальваўся. У 1919—1939 гг. працаваў у польскім міністэрстве рэлігійных канфэсіяў і народнай асьветы, пасьля вайны — у міністэрстве асьветы. З 1953 г. — у Польскай Акадэміі Навук, з 1954 г. — ардынарны прафэсар, а з 1958 г. — кіраўнік Лябараторыі структуры і арганізацыі асьветы ПАН. Аўтар шматлікіх прац у галіне школьнай асьветы. Памёр у 1974 г. у Варшаве.

ЦЯРЭШЧАНКА Кузьма, нар. на Смаленшчыне, дзяяч партыі эсэраў, арганізатар і ўдзельнік першага Ўсебеларускага Зьезду ў Менску (сьнежань 1917 г.), старшыня Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Менску (1919/20), адзін з заснавальнікаў дыпляматычных службаў БНР у краінах Прыбалтыкі. Пасьля Рыскага трактату выехаў у БССР. Памёр увесну 1923 г. у Менску.

ЭПІМАХ-ШЫПІЛА Браніслаў, нар. 04.09.1859 у фальварку Будзькаўшчына Лепельскага пав. Віцебскай губ. Скончыў гімназію ў Рызе (1880) і ўнівэрсытэт у Пецярбургу (1885). У 1891—1925 гг. — супрацоўнік унівэрсытэцкай бібліятэкі ў Пецярбургу, выкладчык Пецярбурскай Рымска-Каталіцкай Духоўнай Акадэміі ды іншых навучальных установаў. З 1925 г. — навуковы супрацоўнік Інстытуту Беларускай Культуры ў Менску, адкуль быў высланы ў 1930 г. у атмасфэры антыбеларускіх рэпрэсіяў савецкіх уладаў. Вярнуўся ў Ленінград, дзе памёр 06.06.1934.

Пераклад зроблены паводле: Turonek Jerzy. Wacław Iwanowski i odrodzenie Białorusi. Warszawska Oficyna Wydawnicza "Gryf", Instytut Historii PAN, 1992

“Іваноўскі быў нацыянальным дзеячом...”

Мая работа доўгі час ня мела нічога агульнага з гісторыяй, але гэтым я цікавіўся заўсёды. Пачаў, бадай, з вывучэньня гісторыі народнай асьветы на Беласточчыне. Асабліва мяне цікавіў пэрыяд савецкай улады (1939—1941 гады) ды час нямецкай акупацыі. Тады мясцовая людзі самі вызначалі мову навучаньня сваіх дзяцей у школах. Таму, напрыклад, у Бельскім павеце існавалі і беларускія, і польскія школы — усё залежала ад пажаданьняў насельніцтва, немцы ў гэтую справу ня ўмешваліся.

Школы, школы... Менавіта гісторыя школьніцтва ў 30—40-я гады выклікала маю цікавасьць да вывучэньня іншых аспэктаў найноўшай гісторыі Беларусі. Я сабраў аграмадны матэрыял, але доўгі час яго не выкарыстоўваў, таму што не было ніякай надзеі на выданьне.

Недзе ў палове сямідзясятых гадоў я пачаў цікавіцца постацьцю Вацлава Іваноўскага. Я ведаў, што кнігі, выдадзеныя зь ягоным удзелам яшчэ да першай сусьветнай вайны, шырока выкарыстоўваліся ў беларускіх школах. Але рэч у тым, што савецкія публіцысты ў сваіх выказваньнях ацэньвалі яго вельмі адназначна і вельмі адмоўна. Калі я пабачыў, што адмоўна яго ацэньваюць ня толькі савецкія, але і іншыя беларускія дасьледчыкі (напрыклад, стаўленьне да яго хадэцыі было вельмі стрыманым, таксама і левых, КПЗБоўскіх прыбудовак), дык гэта мяне яшчэ больш штурхала да новых досьледаў.

Пачалося з таго, што я знайшоў архіўную дакумэнтацыю аб удзеле Іваноўскага ў беларускай канспірацыйнай арганізацыі часоў другой сусьветнай вайны. Тая арганізацыя вяла перамовы з Галоўным камандаваньнем Арміі Краёвай. І я адразу падумаў: добра, які ж ён фашыст, калі ён вядзе перамовы зь яўнымі ворагамі фашызму? У выніку зьявілася апрацоўка, якую я назваў “Беларускае пытаньне ў палітыцы лёнданскага лягеру” (у час вайны лёнданскім лягерам называўся эміграцкі ўрад Польшчы ў Лёндане, ягоныя падпольныя прадстаўніцтвы. Галоўнае камандаваньне АК, падпольны парлямэнт). Атрымалася, на мой погляд, цікава. Тую распрацоўку я перадаў у Інстытут гісторыі Польскай Акадэміі Навук прафэсару Лясоўскаму. Ён гэтым вельмі зацікавіўся, прапанаваў апублікаваць матэрыялы ў друку. Ад яго ж я пачуў: інстытут цікавіцца польска-літоўскімі, польска-ўкраінскімі ды польска-беларускімі ўзаемаадносінамі ў час апошняй вайны. Украінская і літоўская тэмы былі даволі грунтоўна распрацаваныя, затое беларуская заставалася амаль недасьледаванай. Быў адзін дактарант, які сядзеў над гэтай тэмай два гады і ўрэшце адмовіўся — сказаў, што ніякіх адносін не было.

Тэкст, які я прынёс, у інстытуце палічылі вельмі цікавым і спыталі: гэта толькі малы кавалак цэлай праблемы, і таму ці не захачу я распрацаваць цэлую дысэртацыю, цалкам прысьвечаную пытаньню нямецкай акупацыі Беларусі? Але ж распрацоўка гэтай тэмы — работа на некалькі год для цэлага інстытуту, і таму я прапанаваў сваю: “Акупацыйная палітыка на Беларусі”. Мяне аспрэчылі, заявіўшы: ці можна весьці размову пра нейкую асобную палітыку ў адным рэгіёне, калі яна была аднолькавай паўсюль на Усходзе? У найлепшым выпадку гэта матэрыял для артыкула. Я быў вельмі зацікаўлены праблематыкай акупацыі, не хацеў губляць магчымасьць працаваць у архівах і таму згадзіўся з прапанаванай фармулёўкай, але папярэдзіў: калі мяне будуць крытыкаваць за тое, што ў працы няма згадак пра агародніцтва, ці тэатральнае мастацтва, ці жыдоўскае пытаньне, ці партызанскі рух, дык хай мяне бароняць, бо згадаць аб нечым я магу толькі пры ўмове, што яно патрэбна для раскрыцьця галоўнай тэмы.

Гэтая праца пачалася ў 1982 годзе. Я шмат працаваў у архівах, праўда, не карыстаўся менскімі архівамі — у той час такой магчымасьці проста не існавала. Але я знайшоў шмат

нямецкіх архіваў. Іх захапілі амэрыканцы ў 1945 годзе. Зьмікрафільмавалі і прадалі копіі ўсім, хто меў даляры і быў зацікаўлены справай. Паколькі Польшча была зацікаўлена, яна купіла даволі багатыя калекцыі, напрыклад, увесь зьмікрафільмаваны архіў міністэрства Розэнбэрга[1] — гэта 106 ролікаў, у кожным каля тысячы кадраў — 106 000 старонак. А архіў райхсфюрэра СС і паліцыі налічвае тысячу ролікаў, з чаго Польшча купіла 500 — паўмільёна старонак. Гэта быў вельмі багаты матэрыял. Акрамя таго, я меў часопісы, кнігі, савецкія публікацыі дакумэнтаў. Матэрыялу было дастаткова, і ў выніку атрымалася кніга, прысьвечаная выключна акупацыйнай палітыцы Нямеччыны на Беларусі. Да выкананьня гэтае працы я меў ступень магістра эканамічных навук. У 1986 годзе я абараніўся, атрымаўшы навуковую ступень гісторыка. Трохі пазьней на падставе дысэртацыі польскім выдавецтвам ВЭРС была надрукавана кніга "Беларусь пад нямецкай акупацыяй". Выдалі яе бяз аўтарскай карэктуры, з тэхнічнымі хібамі, але бяда невялікая, бо неўзабаве зьявіцца другое польскае выданьне, больш дасканалае і добра ілюстраванае. Магчыма, выйдзе і беларускае выданьне — пераклад ужо зроблены[2].

Усё гэта заняло шмат часу, і таму з пачатку 80-х гадоў я "замарозіў" працу над манаграфіяй пра Іваноўскага. Усё спынілася на этапе, калі я ўжо меў сабраны матэрыял: унікальны матэрыял, меў праведзеныя размовы зь людзьмі, якія цяпер ужо адышлі, але ўсё гэта было ўжо зафіксавана, усё ляжала і чакала лепшых часоў. Пасьля таго, як была скончана манаграфія па праблемах акупацыі, я пачаў рыхтаваць новую — пра Вацлава Іваноўскага. Але яшчэ раней было падрыхтавана колькі матэрыялу аб пачатку беларускай выдавецкай дзейнасьці — яшчэ да "Нашай Нівы", да рэвалюцыі 1905 году[3]. У вас гэтым займаўся Сьцяпан Александровіч. Але ўсё патрабавала праверкі, пашырэньня.

Гэта быў час, калі Іваноўскі стварыў у Пецярбургу Беларускую Рэвалюцыйную Партыю, потым — Круг Народнай Прасьветы. Гэта была цікавая справа: ён любіў дзейнічаць у вузкім коле давераных асоб, безь вялікай рэклямы. Яны — Вацлаў Іваноўскі, студэнт Тэхналягічнага інстытуту ў Пецярбургу, Мар'ян Фальскі, студэнт Політэхнічнага ўнівэрсытэту ў Варшаве, Сьцяпан Багушэўскі — студэнт Ягелонскага ўнівэрсытэту ў Кракаве — стварылі таемную выдавецкую суполку. Іваноўскі дастаў грошы, арганізаваў тэксты, Фальскі пераклаў іх з польскай мовы на беларускую, а Багушэўскі вывез тэксты і грошы ў Кракаў і там, у Аўстра-Вугорскай манархіі, надрукаваў. І потым праз "зялёную граніцу" — нелегальна — яны шмуглявалі ўсе гэтыя кніжкі ў Беларусь.

Потым узьнікла пытаньне беларускага лемантара — гэта ўжо 1906 год. Яго выканала суполка "Загляне сонца і ў наша аконца", арганізатарам і старшынём якой быў Іваноўскі, а не Шыпіла, як аб гэтым вельмі часта ў вас пісалася. Пісалася таму, што Іваноўскі быў "вораг народу", страшны чалавек. Але вынікі ягонай дзейнасьці былі, і яны ўхвальваліся. Існавала няпраўдзівая вэрсія, што кіраўніком суполкі быў Шыпіла. Некаторыя пісалі, што фактычным кіраўніком суполкі быў Шыпіла, значыць, фармальна быў нехта іншы... Тым часам Шыпіла быў вельмі заняты. Ён меў вялікую пэдагагічную работу, акрамя бібліятэкі, у якой працаваў. У дадатак, калі ўзьнікла справа канфіскацыі Багушэвічавых "Смыка" і "Дудкі" і пагроза завісла над "Жалейкай" Купалы, дык ён уцёк з гэтай суполкі. Ён выкінуў яе са свайго памяшканьня і вярнуўся пазьней, калі ўсё ўжо супакоілася.

І тут узьнікла справа буквара. Буквар... Усе кніжкі, якія выпусьціла суполка, мелі або аўтара, або былі падпісаны псэўданімам, тым часам лемантар быў увогуле ананім-

[1] Мова пра міністэрства акупаваных усходніх абшараў. — *А.С.*

[2] Кніга "Беларусь пад нямецкай акупацыяй" выйшла ў 1993 г. у Менску. — *А.С.*

[3] Перш чым пачаць працу над дысэртацыяй пра нямецкую акупацыю Беларусі, Ю. Туронак апублікаваў артыкулы "Па сьлядох «Свабоды»" і "Ўдзел М. Фальскага ў беларускім выдавецкім руху". Завяршаючы дысэртацыю, ён апублікаваў ў 1985 г. артыкул "З гісторыі беларускага выдавецкага руху ў 1902—1905 гадох". — *А.С.*

ны. Я высьветліў: распрацоўкай і апрацоўкай яго заняўся сам Іваноўскі. Ён зрабіў лацінічную вэрсію. Кастравіцкі зрабіў кірылічны варыянт, але гэта было толькі перапісваньне. Вельмі цікава, што ў канцы буквара ёсьць сказы для чытаньня, ніяк не зьвязаныя паміж сабой, накшталт "Котка грэецца на сонцы". І сярод іх уплецены адзін — але вельмі цікавы: "Яны бяруцца за гэта дзела і думаюць, што яно ім удасца". Хто "яны"? Гэта — Іваноўскі і Кастравіцкі (Карусь Каганец), якія рыхтавалі той буквар. Выдавецкая дзейнасьць — другі пэрыяд жыцьця Вацлава Іваноўскага.

Потым — палітычная дзейнасьць. Адразу ўзьніклі нейкія непаладкі з Луцкевічамі. Я гэтым мала займаўся, але само пытаньне вельмі цікавае. Чаму, напрыклад, БСГ ня мела аднаго Цэнтральнага Камітэту, а толькі два краёвыя — Віленскі і Менскі? Адзіны Цэнтральны Камітэт узьнік толькі на Каляды 1905 году[4].

У 1908 годзе Іваноўскі выехаў у Мюнхэн і там, у Політэхнічным, зрабіў доктарскую дысэртацыю аб вырошчваньні цукровых буракоў на беларускіх глебах. Вярнуўся ў 1909 годзе і быў дацэнтам у Тэхналягічным інстытуце, выкладаў у Пецярбурскім жаночым Політэхнічным інстытуце. Выкладчыцкай работай і выдавецкай дзейнасьцю ён займаўся да сярэдзіны 1913 году, пакуль не пераехаў у Вільню. Суполка, якой на той час кіраваў Шыпіла, памалу занепадала, выдавала толькі раней апрацаваныя тэксты. Затое Іваноўскі разам з Купалам прыехалі ў Вільню і адкрылі там Беларускае Выдавецкае Таварыства[5]. За няцэлыя два гады яны зрабілі вялікую работу. Усё спынілася з пачаткам першай сусьветнай вайны[6].

У кнізе, якая неўзабаве мае выйсьці[7], разьдзел пра падзеі часоў вайны называецца "З Расеяй ці з Польшчай?". Звычайна Іваноўскага ўяўляюць страшным ворагам Расеі. Тым часам ён прытрымліваўся поглядаў зусім адваротнага напрамку. Ён арыентаваўся менавіта на Расею, ён лічыў, што расейскі рынак — неабходная ўмова эканамічнага разьвіцьця Беларусі, што свае прамысловыя вырабы Беларусь будзе прадаваць не на Захад, але якраз туды — на Ўсход. Доўгі час ён арыентаваўся на Расею, нават на Леніна, на бальшавікоў. Цікава, што ў 1917 годзе, пасьля Лютаўскай рэвалюцыі, ён вельмі хутка страціў надзею на магчымасьць супрацоўніцтва з урадам Керанскага. Уявіце сабе: ужо пад канец нямецкай акупацыі, калі ўрад БНР і Рада БНР эвакуаваліся ў Горадню, ён, міністар асьветы БНР, застаўся ў Менску на тое, каб з камуністамі Жылуновіча стварыць кааліцыйны беларускі савецкі ўрад — кааліцыю камуністаў і сацыял-дэмакратаў. Прыйшлі бальшавікі, і па нядоўгім часе і Жылуновіча, і Іваноўскага арыштавалі. Лёс Жылуновіча вядомы. У адрозьненьне ад яго, Іваноўскі быў толькі інтэрнаваны. Яго трымалі ў Смаленску. У гэты час ягоны брат Юры быў міністрам ва ўрадзе Польшчы — спачатку прамысловасьці і гандлю, а потым — працы і грамадзкай апекі. Так ці інакш, ён мог забраць Вацлава ў Варшаву, неяк уладкаваць, каб той мог свабодна працаваць і нават дзейнічаць на беларускай ніве. Але пасьля вызваленьня Іваноўскі замест таго, каб ехаць у свабодную Варшаву, вяртаецца ў бальшавіцкі Менск. Нядаўна ваш "ЛіМ" апублікаваў цікавы здымак да артыкула пра Язэпа Гладкага. На здымку — першыя беларускія курсы Пэдагагічнага інстытуту ў Менску. Вясна, 1919 год, і на гэтым здымку — Іваноўскі. Калі вясной 1919-га польскія легіёны пайшлі на ўсход, іх віталі розныя беларускія арганізацыі, у тым ліку і Тарашкевіч. Арыентацыя беларускіх дзеячоў на Польшчу была выразнай. Але сярод іх не было Іваноўскага. Для мяне гэта было надзвычай цікава: дзе прапаў Іваноўскі? Я яго шукаў і ў Вільні, і ў Варшаве, і ў

---

[4] Хоць аўтары ня згадваюць ЦК БРГ у сваіх успамінах, яго існаваньне нельга выключаць. — *А.С.*

[5] Спачатку (1 ліпеня 1913 г.) было заснавана Беларускае Выдавецкае Таварыства, а 7 кастрычніка з Акопаў у Вільню прыехаў Я. Купала, каб заняць пасаду адказнага сакратара БТВ. Ёсьць усе падставы меркаваць, што прызначэньне Я. Купалы адбылося з ініцыятывы В. Іваноўскага. — *А.С.*

[6] БВТ спыніла сваю дзейнасьць у часе вайны — у 1915 г. — *А.С.*

[7] Гаворка пра манаграфію "Wacław Iwanowski i odrodzenie Białorusi" (1992). — *А.С.*

Горадні — няма нідзе. Толькі потым аказалася, што ён сядзеў па другі бок фронту — у бальшавікоў.

Ягоныя погляды карэнным чынам зьмяніліся пасьля таго, як Ленін падчас перамоваў паміж Савецкай Расеяй і Польшчай у канцы 1919 — пачатку 1920 году некалькі разоў інструктаваў Мархлеўскага, што з-за Беларусі разыходжаньняў быць ня можа. Калі палякі хочуць — яны могуць мець усю Беларусь. Ленін прапанаваў вечную граніцу на Бярэзіне. Для Іваноўскага гэта быў вялікі шок. Ён зразумеў, што той, на каго ён арыентаваўся, абсалютна не цікавіцца беларускім пытаньнем, гатовы падзяліць Беларусь, пакідаючы за сабой яе ўсходнюю частку і аддаючы Польшчы заходнюю. Развалілася ўся палітычная канцэпцыя Іваноўскага. Ён быў гатовы супрацоўнічаць з кожным, хто мог дапамагчы стварыць беларускую дзяржаўнасьць і захаваць тэрытарыяльную цэласнасьць.

Яго арыентацыя на Пілсудзкага? Так, але яна была даволі своеасаблівай. Найбольшыя закіды яму робяць, зважаючы на перамовы, якія ён вёў у сакавіку 1920 году у Менску. Калі дакладна, дык перамовы пачаліся не ў сакавіку, а на пачатку лютага. Пілсудзкі прыехаў у Вільню, і нехта там у яго запытаў: што ён думае пра Беларусь? Той адказаў, што ня хоча нават думаць пра гэтую беларускую фікцыю — так ён назваў беларускае пытаньне. Потым да яго прыехаў Іваноўскі.

Думаю, Пілсудзкі і Іваноўскі былі знаёмыя асабіста. Брат Вацлава Юры быў ППСаўцам і блізкім супрацоўнікам Пілсудзкага.

Прыблізна ў сярэдзіне лютага ў Вільні ўзьнікла справа, якую гісторыкі ня любяць узгадваць. Польскія гісторыкі любяць падкрэсьліваць фэдэрацыйную канцэпцыю Пілсудзкага. Гаворыцца, што Пілсудзкі імкнуўся стварыць такі блёк дзяржаваў, які ўключаў бы Польшчу, Літву, Беларусь ды Украіну, хай нават пад польскім патранатам, які мог бы супрацьпаставіцца і Расеі, і Нямеччыне. Але ў творах Пілсудзкага гэтай канцэпцыі няма, аб гэтым ён ні разу не выказваўся. Я ня ведаю, на якой падставе польскія гісторыкі так мяркуюць. Затое ведаю: да сустрэчы з Іваноўскім, да паловы лютага 1920 году, у Польшчы была моцная апазыцыя фэдэрацыйнай палітыцы. Палякі не хацелі фэдэрацыі, яны хацелі анэксаваць тое, што ўдасца. А Іваноўскі схіліў Пілсудзкага да перамоваў з Масквой. Быў прыняты пастулят, паводле якога польскі ўрад дамагаўся аднаўленьня з Расеяй граніцы 1772 году — да падзелу Рэчы Паспалітай. Іваноўскі зыходзіў з таго, што ўся тэрыторыя Беларусі можа апынуцца ў палітычнай арбіце Польшчы і тады, незалежна ад становішча тых ці іншых польскіх груповак, партыяў ці ўрадавых колаў, справа фэдэралізацыі мусіла рушыць. Пілсудскаму гэта спадабалася, ён ухваліў гэтую ідэю і даручыў міністру замежных справаў Польшчы стварыць спэцыяльную камісію, якая б рыхтавалася да перамоваў зь беларускім бокам. Старшынём камісіі быў Леан Васілеўскі. Дэлегацыя прыехала ў Менск. І яны сядзелі за адным сталом — Іваноўскі і Васілеўскі як прадстаўнікі дзьвюх дзяржаў — людзі, якія ў 1904 годзе супрацоўнічалі ў выданьні беларускіх кніг у Кракаве[8].

Гэта выклікала страшнае незадавальненьне сярод дзяржаўных колаў, чыноўнікаў, прэсы і гэтак далей. Чуліся галасы: "Чаму зь беларусамі гаворыць дэлегацыя міністэрства замежных справаў? Справа пастаўлена на дыпляматычны ўзровень, тады як зь імі павінен гаварыць Асмалоўскі — шэф цэнтральнага ўпраўленьня ўсходніх земляў" — акупацыйнай установы. Абурэньне было вялікім.

Усю справу вырашыў Тухачэўскі, армія якога прарвала фронт і хутка пайшла на захад, да Варшавы. Потым, вядома, Рыскі мірны трактат і адмаўленьне ад актыўнай палітычнай дзейнасьці ва ўмовах Заходняй Беларусі. Гэта вельмі цікава: Іваноўскі, ча-

[8] У артыкуле "З гісторыі беларускага выдавецкага руху ў 1902—1905 гадох" Ю. Туронак піша, што Л. Васілеўскі, які ў 1904 г. жыў у Кракаве, меў "вельмі павярхоўнае ўяўленьне пра кракаўскія беларускія публікацыі", падрыхтаваныя В. Іваноўскім і С. Багушэўскім (гл. с. 41—54 гэтага выданьня). — *А.С.*

лавек, які дагэтуль адыгрываў вельмі значную ролю ў беларускім палітычным жыцьці, раптам, пасьля Рыскага трактату, адышоў ад палітычнай дзейнасьці. Былі людзі, якія папракалі яго: у той час, як яны сядзелі ў польскіх турмах, ён жыў у Варшаве, быў прафэсарам Політэхнічнага інстытуту.

Калі б гэта было так, дык і ў верасьні 1939 году ён сядзеў бы ў Варшаве ці недзе ў іншым месцы і не імкнуўся б у Беларусь. Але як толькі развалілася пасьлявэрсальская Эўропа і ўзьнікла магчымасьць дзейнасьці на карысьць беларускай дзяржаўнасьці, гэты чалавек, калі немцы падыходзілі пад Варшаву, выехаў спачатку ў Люблін (там ён быў кантужаны), потым накіраваўся ў Вільню. Накіраваўся на тэрыторыю, якую займала Чырвоная Армія. Разумееце, у 1939 годзе пачаўся рух беларускіх дзеячоў у іншым напрамку: большасьць уцякала з тэрыторый, занятых Чырвонай Арміяй, на тэрыторыю нямецкай акупацыі. Іваноўскі быў, можа, адзіны, хто з–пад акупацыі ўцякаў на ўсход. Гэта цікавая справа: некалькі чалавек было ў кастрычніку арыштавана, сярод іх Антон Луцкевіч[9]. Іваноўскага ніхто не арыштоўваў ні тады, ні ў 1940, ні ў 1941 гадах, калі ў Вільні была ўжо савецкая ўлада. Ён быў савецкім прафэсарам, працаваў у Віленскім унівэрсытэце, вашы публіцысты і гісторыкі пісалі, што ў той час ён сядзеў у Бэрліне і быў старшынём ці намесьнікам старшыні Беларускага камітэту, а пазьней быў прывезены немцамі ў Беларусь...

Яшчэ ў верасьні 1941 году Іваноўскаму прапанавалі заняць пасаду бургамістра Менску. Але ён чакаў. Чакаў, як будуць разьвівацца падзеі. У яго была канцэпцыя — пра гэта я пісаў у кнізе "Беларусь пад нямецкай акупацыяй": ён спадзяваўся, што акупацыя будзе часовай, што абодва бакі — і нямецкі, і савецкі — дастаткова вынішчацца ў гэтай вайне і што мір ва Ўсходняй Эўропе будуць ладзіць заходнія саюзьнікі. На добры лад, ён памыліўся на 50 гадоў. Калі я гляджу на тое, што адбываецца сёньня, дык думаю, што Іваноўскі памыліўся толькі на 50 гадоў. Але сам я лічу, што, калі б немцы захапілі тады Маскву, калі б Чырвоная Армія капітулявала, Іваноўскі не паехаў бы ў Менск. Тады не было б магчымасьці палітычнай гульні...

Ну што ж, падчас акупацыі ў яго былі вельмі добрыя стасункі з Кубэ. Абодва яны былі інтэлігентнымі людзьмі, і я ўпэўнены, што Іваноўскі меў вялікі ўплыў на прабеларускія сымпатыі самога Кубэ. Мае словы могуць гучаць дзіўна, але калі мы ацэньваем акупацыйную палітыку ў Беларусі, дык перш за ўсё я бачу розьніцу паміж бэрлінскай палітыкай і палітыкай Кубэ. Бэрлін амаль не заўважаў Беларусі. Для яго гэта было нешта неакрэсьленае, нешта вельмі слабое. І Розэнбэрг, міністар акупаваных абшараў, ня ведаў, што з гэтай Беларусьсю рабіць. Ён лічыўся з тым, што будзе створана фэдэрацыя балтыйскіх дзяржаў, Украінская дзяржава; ну а Беларусь, якая ня мае ніякага нацыянальнага руху, дзе сьвядомасьць мізэрная? У лепшым выпадку там можа быць нейкая аўтаномія. Была нават думка арганізаваць там запаведнік... Ніякай канцэпцыі не было, і зь цягам часу гэтае яго нігілістычнае стаўленьне паглыблялася, да чаго прыкладалася, дарэчы, і партызаншчына. Як Бэрлін мог ставіцца да краіны, у якой амаль увесь мясцовы адміністрацыйны ўрад апынуўся ў руках небеларускіх? Гэта значыць — у Заходняй Беларусі — у польскіх, а на ўсходзе, можна сказаць, — у савецкіх. На ўсходзе не было ўвогуле ніякіх нацыянальных намаганьняў, кажучы агулам. І тут адзін Кубэ разумеў гэтую справу. Ён імкнуўся (гэта пацьверджана дакумэнтальна), дакладней, яму рабілі закіды, што ён імкнецца да стварэньня беларускай дзяржавы зь Ермачэнкам як прэм'ер–міністрам. Кубэ пад уплывам Іваноўскага зрабіў шмат дзеля ажыўленьня гэтага прыгнечанага, падаўленага пачуцьця нацыянальнай самасьвядомасьці. Так, Розэнбэрг лічыўся з тым, што арганізацыі моладзі могуць быць створаныя ў Эстоніі, Латвіі і Літве. А ў Беларусі і на Ўкраіне — не. Кох на Ўкраіне з гэтым пагаджаўся, як і генэральны камісар Літвы Рэнтэльн, які сказаў, што літоўская арганізацыя моладзі судзейнічала б умацаваньню літоўскага нацы-

[9] Арышты беларускіх дзеячоў у Вільні пачаліся ў канцы верасьня 1939 г. Луцкевіча схапілі 30 верасьня. — *А.С.*

яналізму, і таму яе не дазволіў. Затое Кубэ рабіў на Беларусі ўсё, каб такая арганізацыя паўстала. Ішло гэта цяжка, але нарэшце Бэрлін даў дазвол, і Саюз беларускай моладзі быў створаны. Гэта было неспадзяванкай нават для саміх немцаў, таму што ані латыская, ані эстонская арганізацыі моладзі не праяўлялі такой актыўнасьці, не дасягнулі такіх памераў, як СБМ. Нямецкі дасьледчык Гэрцаг у сваёй працы пра моладзевыя арганізацыі на акупаваных тэрыторыях былога СССР разглядае арганізацыі Літвы, Беларусі і Эстоніі, прычым СБМ займае прыблізна 70 працэнтаў аб'ёму ўсяе кнігі.

Іваноўскі меў значны ўплыў на Кубэ, але ягоныя адносіны з большасьцю прадстаўнікоў беларускай адміністрацыі былі вельмі складаныя. Тыя людзі баяліся канкурэнцыі, асабліва Ермачэнка, бо Астроўскі ўжо ўцёк з Генэральнага Камісарыяту ў ваенную зону, у Смаленск. Затое засталіся "астроўшчыкі". Я магу паказаць данос — нямецкі паліцэйскі рапарт, зроблены на падставе даносу аднаго з тых людзей, у якім гаворыцца, што Іваноўскі — вораг, польскі агент, што ён падпарадкоўваецца віленскаму архібіскапу Ялбжыкоўскаму, што ўсе ягоныя намаганьні беларусізацыі Каталіцкай Царквы ўдаваныя... Адносіны Іваноўскага з тымі коламі былі няпростыя. Нават Вінцэнт Гадлеўскі яго не хацеў. Яго не прымалі ў Галоўную Раду БНС — гэтага не хацеў Ермачэнка. Яго дакааптавалі да Рады толькі пасьля ўмяшальніцтва Кубэ. Іваноўскі кіраваў толькі гарадзкой управай. Гэта была важная пасада, але толькі ў Менску, а па-за межамі гораду ён ня мог ні на што ўплываць...

Іваноўскі быў сьмяротна паранены Аляксандрам Камінскім, былым паліцаем, перабегшым да партызан, 6 сьнежня 1943 г. Але аб падрыхтоўцы гэтай акцыі Готбэрг — генэральны камісар Беларусі, прызначаны пасьля забойства Кубэ, — ведаў за два тыдні. Немцы ведалі ўсё. Аб гэтым можна гаварыць шмат...

Камінскі ўцёк у лес разам са сваёй дзеўкай — Алай Навумавай. Пасьля вайны Навумава сядзела ў тайшэцкім "курорце" і тамсама сядзела асуджаная на 25 гадоў Гражына Ліпінская — шэф выведкі АК у Менску падчас акупацыі. Ад Ліпінскай я чуў: Навумава тады, у 1949 годзе, расказвала ёй усе акалічнасьці: як Камінскі вярнуўся з апэрацыі і расказваў у партызанскім лягеры, як ён усё зрабіў. У 1969 годзе ў вас выйшла праца аб менскім падпольлі, і там, між іншым, апісвалася, як партызаны забілі ворага народу Іваноўскага, але выканаўца пакуль што невядомы. Іван Новікаў, аўтар кнігі "Дарогі скрыжаваліся ў Мінску", напісаў, што Камінскі загінуў абсалютна выпадкова перад самым вызваленьнем. Але ж Навумава гаварыла Ліпінскай: іх разьядналілі пасьля вайны, яе арыштавалі, судзілі і саслалі, але яна ведала, што пасьля прыходу Чырвонай Арміі Камінскі быў жывы. Гэта сьведчыць аб тым, што загінуў ён ня "пяць хвілін да дванаццаці", а, верагодна, пяць хвілін пасьля дванаццаці. Я не выключаю, што яго як сьведку маглі проста расстраляць перад атрадам, як расстрэльвалі многіх былых паліцаяў.

Гавораць, што гісторыя Беларусі — гэта гісторыя нявыкарыстаных магчымасьцяў. Але забойства Іваноўскага, як і незадоўга перад тым забойства Кубэ, ніяк не магло паўплываць на разьвіцьцё падзей. Чырвоная Армія імкнулася наперад, заняўшы ўжо 20 працэнтаў тэрыторыі Беларусі. Готбэрг у Менску мінаваў аб'екты. Але рэч тут хутчэй у іншым. Успомнім Астроўскага. Ён быў вельмі здольным палітыкам. Дэмагогія, прапаганда ў палітыцы — зьявы нармальныя. Карыстаючыся імі, ён здолеў выкарыстаць усё тое, што было зроблена да тае пары, і пакінуць міт — міт аб створанай ім беларускай дзяржаўнасьці. А тое, што часам гінулі людзі, якія знаходзіліся на яго дарозе (а было такіх некалькі і сярод іх ня выключана, што і Іваноўскі), дык мараль і палітыка — гэта розныя рэчы.

Я не апраўдваю Астроўскага. Але ён зрабіў тое, што выклікае зьдзіўленьне дагэтуль. Людзі фармуюць свае ўяўленьні пад узьдзеяньнем таго, што бачаць. А стварэньне БЦР выглядала вельмі эфэктна: поўная незалежнасьць Беларусі, дасягнутая ва ўмовах варожай акупацыі. Украіна ці балтыйскія рэспублікі не маглі нават марыць аб гэтым! Канечне, дасьледчык, паглядзеўшы дакумэнты, зразумее, што гэта была фікцыя...

Я згодны з трактоўкай вашымі гісторыкамі падзеяў часоў Астроўскага. Але гісторык

патрэбны міты. Гэта ня мае нічога агульнага з навукай, так. Але трэба ўважаць: менавіта міты маюць найбольшы ўплыў на сьвядомасьць грамадзтва — міт аб дзяржаве, створанай Беларускай Цэнтральнай Радай, міт пра армію, якой так і ня стала Беларуская Краёвая Абарона...

Увогуле, міты як частка гісторыі Беларусі працягваюць існаваць. Адзін зь іх — Беларуская Сялянска–Работніцкая Грамада, яе дзейнасьць у 1925—1927 гадах у Заходняй Беларусі. Колькі ўжо напісана пра ўздым, пра масавасьць Грамады, пра суды над актывістамі... Яна дзейнічала няпоўныя два гады, але гэта было эфэктыўна! І ў сувязі з тым пачаў ствараецца міт. Цяпер гавораць, што гэта была нацыянальная беларуская партыя, да якой хацелі прымкнуць камуністы, каб пераняць кіраваньне. І людзі ўвогуле адкідаюць думку пра тое, што была Данцыская канфэрэнцыя[10], на якой былі вырашаны ўсе справы кіраваньня і фінансаваньня гэтай Грамады Камінтэрнам. Не дапускалася нават думка, што гэта была прыбудоўка да кампартыі, не, бо гэта непрыгожа. Бо значыць, што быў рух, які накіроўвала і фінансавала кампартыя. Калі на гэта ёсьць доказы, яны як невыгодныя адкідаюцца. Менавіта ў такім напрамку прадстаўлялася справа Грамады на эміграцыі. Дзеля ўмацаваньня гэтага міту шмат папрацаваў і Астроўскі. А цяпер я бачу, як гэты міт распаўсюджваецца і ў Беларусі. У вас нядаўна быў выдадзены першы том выданьня "Идеологическая деятельность компартии"[11] — другі зьявіцца наўрад. Дык вось, там дакладна напісана, як усё вырашалася ў партыйных кабінэтах у Менску, менавіта там.

Але вернемся да міту пра Вацлава Іваноўскага. Кім у сапраўднасьці быў гэты чалавек?

Перш за ўсё, ён адыграў вялікую ролю ў абуджэньні нацыянальнай сьвядомасьці. Ад пачатку стагодзьдзя да першай сусьветнай вайны нешта каля паловы кніжак, выдадзеных на беларускай мове, выйшлі ў сьвет праз яго намаганьні. Палітычныя лёзунгі? Не, ён гэтым не займаўся. Толькі праца — эканамічная і культурная — кнігі як сродак пашырэньня сьвядомасьці. Далей — палітычная дзейнасьць у гады першай сусьветнай вайны. Наўрад ці хто іншы мог зрабіць больш. Іваноўскі быў прыхільнікам непапулярнай сёньня ідэі адзінай эканамічнай прасторы. Ён разьлічваў на эканамічнае супрацоўніцтва з Расеяй, на партнэрскае супрацоўніцтва. Разам з тым ён разьлічваў, што беларускай дзяржавай будуць кіраваць беларусы, а ня людзі, прызначаныя з Масквы.

А што датычыць акупацыі... Нядаўна былі апублікаваныя ўспаміны Хрушчова аб тым, што ў канцы 1941 году Сталін быў гатовы заключыць зь Нямеччынай новы Берасьцейскі мір і, між іншым, перадаць у нямецкую сфэру ўплыву Беларусь. У сваю чаргу Гітлер першапачаткова гаварыў аб стварэньні на Ўсходзе новых дзяржаваў, дзяржаваў сацыялістычных, бо, паводле ягоных слоў, рэвалюцыя выклікае такія зьмены ў сьвядомасьці людзей, не зважаць на якія немагчыма. Вайна толькі пачыналася, яе жудасныя вынікі былі наперадзе, а тады размова магла пайсьці аб зьмене цэнтру з Масквы на Бэрлін. І былі людзі (і сярод іх — Іваноўскі), якія лічылі: праз супрацоўніцтва з такімі, як Кубэ, яны могуць атрымаць нейкі шанец — хай нават невялікі. Паводле іх меркаваньняў, быў бы прынамсі спынены працэс зьнішчэньня мовы і сьвядомасьці народу, ягонай русіфікацыі. Так не адбылося. Гісторыя пайшла сваім шляхам, але мы мусім ведаць, чым кіраваліся тыя людзі.

Калі Беларусь мае быць ператворана ў калёнію, тады ўсё ў парадку: Іваноўскі быў ворагам. Кубэ быў ворагам, усе акупанты былі злачынцамі. Але калі вы думаеце пра інтарэсы дзяржавы, нацыі, мовы, культуры, дык трэба памятаць тых, хто гэтыя інтарэсы абараняў. На мой погляд, Іваноўскі ня быў палітыкам. Ён быў нацыянальным дзеячом у лепшым сэнсе гэтага слова і менавіта таму ня здолеў паразумецца з палітыкамі. Ён прайграў.

Друкуецца паводле публікацыі ў: ЛіМ. 1992. 16 кастрычніка.

[10] Канфэрэнцыя праходзіла ў Сопаце пад Данцыгам (Гданьскам), таму яе называюць яшчэ Сопацкай. — *А.С.*

[11] Поўная назва кнігі, якая выйшла ў сьвет у 1990 г., такая: Идеологическая деятельность Компартии Белоруссии, 1918—1945. В двух частях. Часть 1. 1918—1928. Другая частка выдадзена не была. — *А.С.*

Вацлаў Іваноўскі ў Пецярбургу (1899—1913 гг.)

У XIX ст. працэс беларускага нацыянальнага адраджэньня цягнуўся марудна і заставаўся зьявішчам эфэмэрным і амаль незаўважным. Звычайна гэта тлумачыцца спасылкамі на царскія рэпрэсіі, асабліва забаронаю выдавецкай дзейнасьці, а таксама адсутнасьцю нацыянальнага "П'емонту" за мяжой, якім для літоўцаў была Ўсходняя Прусія, а для ўкраінцаў — Галіччына. Напэўна, гэта былі важныя акалічнасьці, аднак найгалоўнейшай перашкодаю на шляху беларускага нацыянальнага руху была парадаксальная ідэалягічная сытуацыя: у краіне, дзе пасьля ліквідацыі царкоўнай уніі пераважала новаправаслаўнае насельніцтва, праваднікамі гэтага руху сталі галоўным чынам прадстаўнікі каталіцкай шляхты. Яны, хаця і ўсьведамлялі сваю этнічную самастойнасьць, усё ж не змаглі ўзьняцца па–над рэлігійным бар'ерам, рэальна ацаніць існае становішча і сфармуляваць агульнанацыянальную праграму культурнай і палітычнай дзейнасьці, прымальную як для адной, так і для другой часткі грамадзтва, асабліва для праваслаўнай большасьці.

Беларуская паэзія XIX ст., апрача абмежаванай папулярызацыі мовы, не адыграла ў гэтым працэсе вялікай ролі, звычайна не выходзіла па–за рамкі этнаграфізму і сацыяльна–бытавой праблематыкі, якая асьвятлялася з пазыцыяў клясавай згоды паміж памешчыцтвам і сялянствам. Падчас паўстаньня 1863 г. зьявілася беларускамоўная агітацыйная публіцыстыка, накіраваная на тое, каб далучыць сялян да ўзброенай барацьбы з царызмам. Аднак пры ўсім тым не заўважалася якіх–колечы істотных з нацыянальнага гледзішча ідэйных адрозьненьняў паміж прыхільнікамі кансэрватыўнага і радыкальнага крыла паўстаньня на Беларусі і Літве. Узаемныя супярэчнасьці ўзьнікалі сярод іх у аграрным пытаньні, што ж датычыць астатняга, дык літаратура абедзьвюх плыняў ідэалізавала былую Рэч Паспалітую, была скіравана на абарону Каталіцкай Царквы і прапагандавала супольнасьць палітычных інтарэсаў Польшчы і Беларусі ў якасьці польскай правінцыі. Палымяны заклік Каліноўскага да беларускага народу змагацца за свае правы — "бо тагды толькі жыць будзеш шчасьліва, калі ўжэ маскаля над табой ня будзе" — гэта яшчэ не дэклярацыя незалежнасьці, бо абмінае ня менш важнае пытаньне польскай гегемоніі. Нават крытыка грамадзкай несправядлівасьці ў адозвах радыкалаў ("Мужыцкая праўда" ды інш.) мае выразны антырасейскі характар, аднак ашчаджае мясцовых памешчыкаў.

Беларускае пісьменства XIX ст. разьвіваецца, галоўным чынам, у рэчышчы польскай палітычнай думкі і польскай барацьбы за незалежнасьць. Таму ў ім прасочваецца вострая антыправаслаўная тэндэнцыя, якая, зразумела, значна абмяжоўвала ягоны ўплыў на праваслаўную інтэлігенцыю і, у выніку, ня мела пашырэньня сярод пераважнай часткі беларускага люду. Усё гэта аблегчыла задачы расейскага супрацьдзеяньня і паўплывала на зьяўленьне ў другой палове XIX ст. іншага ідэйнага накірунку пад назваю "западнорусизма", які пры падтрымцы ўладаў спрабаваў прадставіць Беларусь як спрадвечна расейскі край і абгрунтаваць законнасьць расейскага панаваньня. Гэтая плынь аб'яднала прадстаўнікоў беларускай праваслаўнай інтэлігенцыі, якія, нягледзячы на палітычную арыентацыю, шмат зрабілі ў галіне этнаграфіі, мовазнаўства, краязнаўства і гісторыі Беларусі. Усё гэта паўплывала на разьвіцьцё палітычнай думкі і вылілася ў дзейнасьць беларускіх народавольцаў. Так беларуская палітычная думка зь цяжкасьцю прабівала сабе дарогу сярод польска–расейскай ідэйнай барацьбы і да канца XIX ст. рухалася ў двух паралельных напрамках, не знаходзячы пунктаў сутыкненьня. Нават родная мова доўгі час не магла стаць агульнай плятформай для супольных дзеяньняў. Праўда, прадстаўнікі каталіцка–шляхецкага кірунку больш зрабілі дзеля яе пашырэнь-

ня, аднак цяжка адназначна акрэсьліць, у якой ступені гэтая іх дзейнасьць была толькі спробаю супрацiўленьня расейскай экспансіі. Нарэшце, аніводзін з будзіцеляў XIX ст. ня ўзяўся за стварэньне беларускага лемантара (буквара), гэтага найпрасьцейшага зыходнага пункту разьвіцьця нацыянальнай культуры. Усё гэта неабходна ўлічыць, ацэньваючы дзейнасьць Вацлава Іваноўскага, які не абмежаваўся фармуляваньнем прыгожых ідэяў аб стварэньні беларускай нацыі і будаўніцтве маладой Беларусі, але першы пачаў гэтыя ідэі ператвараць у рэчаіснасьць.

Вацлаў Іваноўскі нарадзіўся ў 1880 г. у фальварку Лябёдка, што на Лідчыне, у дваранскай сям'і. На яго нацыянальнае ўсьведамленьне ўплывала хатняе выхаваньне ў духу традыцыяў Вялікага Княства Літоўскага, пражываньне ў Лябёдцы, у Красным Варонескай губэрні і ў Варшаве, г.зн. сярод беларускага, расейскага і польскага этнасу, і, урэшце, прыклад разьвіцьця нацыянальнага руху бліжэйшых суседзяў — палякаў і літоўцаў.

Пасьля заканчэньня гімназіі ў Варшаве Іваноўскі ў 1899 г. скіраваўся ў Пецярбург, дзе жыў (па адрасе 6-я рота, дом 10) разам з бацькам, высокім ураднікам сельскагаспадарчага ведамства. У Пецярбургу паступіў на хімічны факультэт Тэхналягічнага інстытуту, які закончыў у 1904 г., пасьля чаго да лета 1913 г. быў навуковым супрацоўнікам гэтага інстытуту і іншых пецярбурскіх вышэйшых навучальных установ. Званьне доктара тэхнічных навук атрымаў у 1909 г. на Палітэхніцы ў Мюнхэне.

Ужо ў першыя гады вучобы Іваноўскі арганізаваў у Пецярбургу беларускі гурток, на аснове якога на пачатку 1902 г. была створана нелегальная сацыялістычная арганізацыя — Беларуская Рэвалюцыйная Партыя (БРП), якая распачала выдавецкую дзейнасьць. Багатых мэцэнатаў не было, таму выдаваць друкаваныя публікацыі яна не магла. Не ставала ня толькі дасьведчаных публіцыстаў — не было нават элемэнтарных граматычных і правапісных правілаў беларускай мовы. Апрача таго, ніводзін з маладых пачынальнікаў руху ня быў знаёмы з тэхнікай нелегальнай працы. Але гэтыя цяжкасьці не палохалі маладога Іваноўскага. Ён пачаў з самай неабходнай рэчы — купіў гектограф. На гэта пайшоў увесь ягоны заробак са студэнцкай практыкі.

Першай публікацыяй БРП стала адозва "Да інтэлігенцыі", якая заклікала выхаваную ў польскай культуры маладую інтэлігенцыю Беларусі да ўдзелу ў адраджэнскай працы і пастулявала арганізацыю гурткоў дзеля вывучэньня роднай мовы, краязнаўства, гісторыі, аказаньне матэрыяльнай падтрымкі для літаратараў, прадугледжвала збор сродкаў на выдавецкую дзейнасьць і стварэньне сеткі кальпартажу.

Наступнай ініцыятывай Іваноўскага была спроба нелегальна выдаць часопіс "Свабода", які быў задуманы як орган БРП. Ажыцьцяўленьню гэтай задумы спрыяла павелічэньне кола беларускай моладзі ў Пецярбургу. У 1902 г. сюды прыбылі браты Іван і Антон Луцкевічы, Алёйзія Пашкевічанка. Адным з самых блізкіх супрацоўнікаў Іваноўскага быў таксама пецярбурскі гімназіст Вінцэнт Валейка родам з фальварку Галавічполь, што знаходзіўся побач зь Лябёдкаю. У сьнежні 1902 г. "Свабода" была адбіта на гектографе (200 асобнікаў), але канец задумы быў няўдалы: яна не дайшла да чытача. Так што гэты часопіс мае пэўнае значэньне толькі для вывучэньня поглядаў яго стваральнікаў. Аб іх можам меркаваць на падставе адзінага захаванага фрагмэнту "Свабоды" — верша Сыракомлі "Добрыя весьці", які пасьля пераробкі выдаўцамі атрымаў цалкам новы сэнс, прыстасаваны да новых варункаў рэвалюцыйнай барацьбы. Па-першае, антырасейскія акцэнты арыгінальнага тэксту Сыракомлі замянілі на антыцарскія. Радкі арыгіналу "лягчэй будзе сэрцу, як згіне маскаль" або "ня прыйдзе вораг з маскоўскага краю" ў "Свабодзе" атрымалі новае гучаньне: "лягчэй будзе сэрцу, як згіне наш цар" і "ня прыйдзе вораг з чужога краю". Па-другое: ідэя клясавай згоды паміж сялянствам і шляхтай, якую прапагандаваў Сыракомля, саступіла месца рабоча-сялянскай салідарнасьці.

Характэрная перапрацоўка верша "Добрыя весьці" дае падставу меркаваць, што дзе-

ячы БРП, у прыватнасьці, яе стваральнік Іваноўскі, не падтрымлівалі сэпаратыстычных тэндэнцый Польскай Сацыялістычнай Партыі (ППС). Больш блізкія і зразумелыя былі для іх пастуляты расейскіх рэвалюцыйных колаў, якія падтрымлівалі ідэі ня толькі разбурэньня царызму, але і грунтоўнай перабудовы ўсяго грамадзкага ладу. Гэта магло значыць, што БРП бачыла магчымасьць ажыцьцяўленьня сваіх плянаў не ў адрыве ад Расеі, але ў працэсе рэвалюцыі і дэмакратызацыі грамадзкага жыцьця гэтай дзяржавы.

Такая пазыцыя БРП выклікала вострую рэакцыю ППС і яе публічную крытыку культурна–асьветніцкай арыентацыі беларускай партыі. У выніку, у некаторых яе дзеячоў абуджаліся крытычныя настроі да арыентацыі БРП, што на пачатку 1903 г. давяло да яе расколу. У пэўнай меры паўплывалі на тое таксама асабістыя амбіцыі пецярбурскіх дзеячоў. Вясною 1903 г. Іван Луцкевіч распачаў стварэньне нібыта больш радыкальнай Беларускай Рэвалюцыйнай Грамады, якая аформілася ў канцы 1903 г.

Пасьля сустрэчы з Луцкевічам Іваноўскі распачаў ажыцьцяўленьне сваёй праграмы пад новай фірмай Кругу Беларускай Народнай Прасьветы. Круг выдаў дзьве нелегальныя публікацыі — "Калядную пісанку" і "Велікодную пісанку". Першая зь іх выйшла перад сьвятам Божага Нараджэньня 1903 г., другая — перад Вялікаднем 1904 г. Распаўсюджваць іх меліся студэнты, якія разьяжджаліся на вакацыі да сябе на радзіму.

Большае значэньне для папулярызацыі беларускай літаратуры мела выданьне ў Пецярбургу дзьвюх кніжак: зборніка вершаў Янкі Лучыны "Вязанка" і народных "Казак" накладам па 5000 асобнікаў кожная. Абедзьве кнігі выйшлі легальна, хаця не абыйшлося без маны: "Вязанку" падалі ў цэнзуру як кнігу на баўгарскай мове, а з "Казкамі" як выданьнем фальклёрным клопату не было.

Летам 1903 г. Іваноўскі схіліў Мар'яна Фальскага, студэнта варшаўскай Палітэхнікі, і Сьцяпана Багушэўскага, студэнта Ягелонскага ўнівэрсытэту, да новай выдавецкай задумы: выпуску беларускай літаратуры ў Кракаве, па–за мяжой Расеі. Іх намаганьнямі былі апрацаваны і вясной 1904 г. надрукаваны чатыры публікацыі: "Янка–музыкант" Сянкевіча, "Ведзьма" невядомага аўтара, аб'ёмістая адозва "Царская гаспадарка" і зборнік вершаў Багушэвіча, Пашкевічанкі і Казімера Кастравіцкага пад загалоўкам "Песьні". Патаемнымі сьцёжкамі іх перавозілі ў Расею.

Такім чынам, з ініцыятывы Іваноўскага ў 1903—1904 гг. у Пецярбургу і Кракаве выйшла ў сьвет восем кніжак. Гэта, натуральна, было мала, але ня менш, чым было выдадзена ў Расеі за ўсю эпоху пасьля паўстаньня 1863 г., і ў такой пэрспэктыве выглядала як сур'ёзнае дасягненьне. Разам з тым выявіліся цяжкасьці з увагі на адсутнасьць адзіных лексычных і правапісных нормаў. І сапраўды, кожны аўтар або перакладчык кіраваўся ў гэтай галіне ўласнай думкай. Прывесьці іх у аднастайную сыстэму стала надзвычай важнай і пільнай справай. Невыпадкова сярод пастулятаў адозвы "Да інтэлігенцыі" на першым месцы стаяла распрацоўка мовазнаўчых пытаньняў і выданьне граматыкі беларускай мовы, для стварэньня якой меркавалася прыцягнуць спэцыялістаў. Мы ня ведаем, ці зьвяртаўся да каго Іваноўскі ў гэтай справе, аднак фактам застаецца, што за гэта ня ўзяўся аніводзін спэцыяліст, у тым ліку Яўхім Карскі, якога сёньня прызнаюць за стваральніка беларускага мовазнаўства.

З гэтай прычыны, а таксама дзеля патрэб асьветы Іваноўскі вырашыў заняцца распрацоўкай беларускага лемантара, які ў нейкай ступені мог бы прылагодзіць адсутнасьць граматыкі і стаць своеасаблівым лінгвістычным даведнікам для аўтараў і выдаўцоў. Гэтую задуму плянаваў ён даўно, але ажыцьцяўляць яе пачаў толькі ў другой палове 1904 г. падчас пасьлядыплёмнай практыкі на цукроўні ў Баравічках пад Плоцкам. Аб гэтым наступную цікавую інфармацыю пакінула Марыя Альтбэрг–Арнольдава, сястра калегі Іваноўскага, Люцыяна Альтбэрга:

Люцыян часта бываў у Іваноўскага ў Баравічках і бачыў, як ён карпеў над складаньнем беларускага лемантара. Брат гаварыў пра гэта часта і з пэўнай іроніяй, маўляў, гэта дзяцінства, фантазіі: "Такі сур'ёзны чалавек займаўся беларускім лемантаром! Ды гэта ж дыялект, ня мова!.." Ах, калі б брат быў разумнейшы, ён бы ведаў, што нават адзін чалавек у гэтай справе мог зрабіць пераварот. Бяз гэтага лемантара вырасла цяпер уся беларуская літаратура.

Працуючы над лемантаром, Іваноўскі мусіў заняцца распрацоўкай беларускай мовазнаўчай тэрміналёгіі ў неабходным для лемантара аб'ёме. Зь цягам часу гэтыя базавыя тэрміны ўдасканальваліся, але большасьць засталася трывалым здабыткам беларускага мовазнаўства і была прынята або ў тым самым гучаньні, або зь невялікімі фанэтычнымі і марфалягічнымі зьменамі. Замест ранейшых cz, sz, ż у лацінскім варыянце лемантара ўводзіліся новыя знакі č, š, ž, напэўна, дзеля таго, каб адрозьніць беларускую лацінку ад польскай абэцэды. Гэтую працу Іваноўскі завяршыў у 1905 г. і перадаў яе Кастравіцкаму, каб той падрыхтаваў варыянт грамадзянкай. Цікава заўважыць, што выданьне "Беларускага лемантара" таксама плянавалася нелегальна, хутчэй за ўсё, па-за межамі Расеі.

Аднак неўзабаве такой неабходнасьці ўжо не было: у сьнежні 1904 г. цар Мікалай II падпісаў указ, згодна зь якім здымаліся ранейшыя абмежаваньні на выкарыстаньне беларускай мовы, што дазволіла распачаць легальную выдавецкую дзейнасьць. Гэтую магчымасьць Іваноўскі выкарастаў хутка і пасьпяхова, на што ў вялікай меры паўплываў вопыт яго выдавецкай дзейнасьці ў нелегальных умовах. Яго заслугай было стварэньне ў Пецярбургу выдавецкай суполкі "Загляне сонца і ў наша аконца", якой ён кіраваў да ліпеня 1913 г., да выезду ў Вільню, дзе ён яшчэ з большай інтэнсіўнасьцю працягваў выдавецкую дзейнасьць.

Была гэта цэлая эпоха ў разьвіцьці беларускага адраджэнскага руху, паралельная дзейнасьці "Нашай Нівы". Вацлаў Іваноўскі як піянэр гэтага руху адыграў выдатную ролю. Ён вярнуў з забыцьця лепшыя творы беларускай літаратуры XIX ст., даў беларускаму чытачу шэраг перакладаў з польскай, расейскай і ўкраінскай літаратуры, узьвёў на радзімы Парнас прарока нацыянальнага адраджэньня Янку Купалу, Цётку, падтрымліваў творчасьць маладых паэтаў і празаікаў і такім чынам судзейнічаў нараджэньню і разьвіцьцю новай беларускай літаратуры. Выдадзеныя ім падручнікі на цэлае дзесяцігодзьдзе апярэдзілі зьяўленьне публічных беларускіх школаў, а сэрыя выдадзеных драматычных твораў дапамагла станаўленьню аматарскіх тэатральных труп. Дзякуючы ягоным стараньням, беларускі земляроб упершыню атрымаў сельскагаспадарчую літаратуру на роднай мове.

Гэты рух уплываў на пашырэньне нацыянальнай сьвядомасьці. У 1910 г. віленскі публіцыст Часлаў Янкоўскі лічыў, што, нягледзячы на русіфікацыю і апалячваньне, ёсьць вялікі шанец на здабыцьцё сымпатыяў народных мас — за беларускай нацыянальнай справай. "Шмат людзей уплыве зь яе рук на ўсход і захад, — пісаў ён, — але і тое, што застанецца, можа зь цягам часу скласьці цалкам значны народ". Зьяўленьне такіх ацэнак напярэдадні першай сусьветнай вайны адлюстроўвала імклівы поступ нацыянальнай сьвядомасьці сярод беларусаў, да чаго ў вялікай меры прычыніўся Вацлаў Іваноўскі сваёй выдавецкай і выхаваўчай працай.

Друкуецца паводле: Белорусский Сборник. Статьи и материалы по истории и культуре Белоруссии. Вып. 1. Российская Национальная Библиотека. Санкт–Петербургская Ассоциация Белорусистов. Санкт–Петербург, 1998.

Прарасейскі выбар Беларусі

Вясной 1991 г. амаль 80% насельніцтва Беларусі на рэфэрэндуме выказалася за тое, каб гэтая рэспубліка засталася ў складзе СССР. Тады можна было падазраваць, што гэта было наступствам статыстычнай маніпуляцыі ўладаў, зацікаўленых акурат у такім выніку рэфэрэндуму. Аднак такіх сумневаў не было ў наступныя гады, калі ў варунках палітычнага лібэралізму і пры ўдзеле замежных назіральнікаў беларуская нацыя, а дакладней, пераважная яе бальшыня, маніфэставала прарасейскі выбар ці выбіраючы на прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнку, прыхільніка інтэграцыі з Расеяй, ці адмаўляючыся ад нацыянальнай сымболікі і наноў уводзячы ў якасьці дзяржаўнай расейскую мову, толькі тэарэтычна раўнапраўную зь беларускай.

Такая пазыцыя пераважнай бальшыні беларусаў наконт ключавых аспэктаў дзяржаўнага і культурнага жыцьця выклікала фрустрацыю сярод нацыянальных дзеячаў у краіне і на эміграцыі. Прычыну сытуацыі, якая склалася, бачылі галоўным чынам у ініцыятывах і дзеяньнях прэзыдэнта Лукашэнкі, мінімізуючы ці замоўчваючы ролю сьвядомасьці нацыі, якая сфармавалася на працягу 200 гадоў жыцьця беларусаў у Расейскай імпэрыі і СССР.

Нацыянальная сьвядомасьць, якая ёсьць адным з найважнейшых чыньнікаў змаганьня за ўласную дзяржаўнасьць, пачала ўкараняцца сярод беларусаў толькі на пачатку XX стагодзьдзя. Усё папярэдняе стагодзьдзе працэс беларускага нацыянальнага адраджэньня разьвіваўся надзвычай павольна і, нягледзячы на патэнцыйную грамадзкую базу ў выглядзе беларускамоўнай шляхты і духавенства, заставаўся эфэмэрнай і амаль незаўважнай зьявай.

Звычайна гэта тлумачыцца рэпрэсіўнай палітыкай царызму і адсутнасьцю нацыянальнага "П'емонту"[1] за мяжой, якім для літоўцаў была Усходняя Прусія, а для ўкраінцаў — Галіччына. Безумоўна, гэта былі важныя акалічнасьці, аднак найбольшым тормазам беларускага руху была парадаксальная ідэалягічная сытуацыя: у краіне, дзе пераважная частка насельніцтва праваслаўная, абуджальнікамі нацыянальнай сьвядомасьці былі пераважна прадстаўнікі каталіцкай шляхты. Таму беларуская літаратура XIX стагодзьдзя разьвіваецца пераважна ў рэчышчы польскай палітычнай думкі і польскай незалежніцкай барацьбы з Расеяй. У сілу гэтых абставінаў у ёй выяўляліся выразныя антыправаслаўныя тэндэнцыі, што ў выніку абмяжоўвала яго ўспрыняцьце праваслаўнай інтэлігенцыяй і такім чынам пазбаўляла ўплыву на пераважную частку беларускага народу. Гэта палягчала расейцам процідзеяньне і прывяло ў другой палове XIX стагодзьдзя да ўзьнікненьня другой ідэалягічнай плыні — "заходнерусізму", прадстаўнікі якога разглядалі беларускі рух як польскую інтрыгу, мэтай якой было разбурэньне адзінства праваслаўнай Русі.

Таму на пачатку XX стагодзьдзя новае пакаленьне нацыянальных дзеячаў усьведамляла, што без прыняцьця руху праваслаўнай бальшынёй ня можа быць гаворкі пра яго пашырэньне ў Беларусі. Канцэпцыю адзінай нацыі ў 1904 г. Вацлаў Іваноўскі — творца першага буквара сучаснай беларускай мовы — прапагандаваў так:

Ци раз у нас сварка бывае: зыдуцца каталик з праваслаўным и сваруцца "ах ты, кажэ, паляк,

---

[1] П'емонтам называлі Сардынскае каралеўства, якое ахоплівала выспу Сардынія і мацерыковую вобласьць П'емонт з цэнтрам у Турыне. Незалежная італьянская дзяржава, П'емонт у той ці іншай форме падтрымліваў вызвольны рух у астатніх дзяржавах, якія знаходзіліся пад уладаю Аўстрыі, Папы і гішпанскіх Бурбонаў. У 1859—1860 гг. пад кіраўніцтвам П'емонту пачалося стварэньне адзінага Італьянскага каралеўства (закончылася ў 1870 г.). — *А.С.*

— а ты маскаль". И абодва ня ведама што кажуць: ани той паляк, ани гэты маскаль, абодва яны хоць разнае веры, а народу аднаго, бо абодва вырасли на зямельцы тутэйшай палескай — беларускай і першае слова ў мови нашай бацькаўскай ад бацькоў пачули, а сваруцца тольки сабе на крыўду и на сорам, людзям на сьмех. Вось і знарок выдаем лемэнтар дваякими знаками, выбирай, што спанараўна, каб усяки пазнаў, што ци такие, ци сякие знаки, а зыки, склады и словы тыеж, мова — таяж и людзи што мовай адной гаворуць — браты родные[2].

Гэта была новая канцэпцыя, якая мела на мэце стварэньне агульнабеларускай нацыянальнай сьвядомасьці па–над канфэсійнымі падзеламі. У гады перад першай сусьветнай вайной у гэтай справе было нямала зроблена, і нацыянальная думка стала сур'ёзнай альтэрнатывай заходнерусізму. Аднак за такі кароткі час яна не магла зьдзейсьніць значных зьменаў у масавай сьвядомасьці, збольшага абмяжоўваючыся здабыцьцём прыхільнасьці часткі інтэлігенцыі.

У такой сытуацыі беспасярэдне пасьля падзеньня царызму ў Расеі дзеячы беларускага руху, рэальна ацэньваючы свае магчымасьці, не прэтэндавалі на дзяржаўную незалежнасьць[3]. Створаны ў сакавіку 1917 г. у Менску Беларускі Нацыянальны Камітэт стаяў на пазыцыі аўтаноміі Беларусі ў рамках рэспубліканскай Расеі, аднак нават гэтыя сьціплыя патрабаваньні былі адкінутыя Часовым Урадам, які, як і царызм, не прызнаваў адметнасьці беларускай нацыі.

Дзеялі таксама ўнутраныя супярэчнасьці. Гэтак, выкарыстоўваючы тую акалічнасьць, што кіраўніком Камітэту быў буйны земляўласьнік Раман Скірмунт, а прынамсі палову яго чальцоў складалі каталікі, апазыцыйныя сацыялістычныя дзеячы распачалі на сялянскіх зьездах і рабочых сходах энэргічную кампанію дэскрэдытацыі БНК як польска–каталіцка–памешчыцкай інтрыгі, якая мела на мэце адарваць Беларусь ад Расеі і паняволіць беларускіх сялян польскімі панамі. У выніку гэтай кампаніі і растучай радыкалізацыі грамадзкіх настрояў у ліпені 1917 г. быў створаны іншы прадстаўнічы орган — Цэнтральная Рада Беларускіх Арганізацыяў, якая мела рэпрэзэнтаваць толькі "прагрэсіўныя" групоўкі з выключэньнем такіх "рэакцыянэраў", як хадэцкія дзеячы і народнікі.

Выразам прарасейскага, нават прасавецкага выбару бальшыні тагачасных дзеячаў быў скліканы ў сьнежні 1917 г. Усебеларускі Зьезд, вакол якога зь цягам часу сабралася нямала мітаў. Гэты зьезд неўзабаве быў разагнаны бальшавікамі, што абумовіла "тэзу" савецкай гістарыяграфіі, быццам ён меў антыбальшавіцкі, антысавецкі, а таму буржуазны і сэпаратысцкі характар, што ахвотна прынялі нацыянальныя гісторыкі, прычым і тыя, і іншыя фальшавалі рэзалюцыю зьезду, якую ён пасьпеў ухваліць перад разгонам. Яна гучала наступным чынам:

Узмацняючы сваё права на самавызначэньне, абвешчанае расейскай рэвалюцыяй, і замацоўваючы рэспубліканскі лад на зямлі беларускай, дзеля ператаваньня роднага краю і засьцярежэньня яго ад падзелу і адрыву ад Расейскае Дэмакратычнае Фэдэратыўнае Рэспублікі, 1–шы Ўсебеларускі зьезд пастанаўляе: неадкладна вылучыць са свайго складу орган краёвае ўлады ў выглядзе Ўсебеларускай Рады Сялянскіх, Салдацкіх і Работніцкіх Дэпутатаў, які становіцца часовым вярхоўным краёвым органам улады і дзейнічае ў непарыўным саюзе з цэнтральным урадам, які нясе адказнасьць перад Радай Работніцкіх, Салдацкіх і Сялянскіх дэпутатаў[4].

---

[2] Беларуски лемэнтар або Першая навука чытаньня. Пецярбург, 1906. С. 4—5 (лацінка) і с. 6—7 (кірыліца).

[3] Гаворка ідзе пра дзеячаў ува Ўсходняй Беларусі. На тэрыторыі, акупаванай немцамі, ідэя незалежнасьці ўжо высьпела, але гэта была ідэя незалежнасьці Беларусі і Літвы. Гл.: Луцкевіч А. Да гісторыі беларускага руху. Мінск, 2003. С. 12—17; Сідарэвіч А. Антон Луцкевіч: ад краёўства да незалежніцтва (1916—1918). Агляд крыніцаў // ARCHE. 2006. № 1—2. — *А.С.*

[4] Беларуская Рада. 1917. № 12.

Такім чынам, зьезд ня быў ні антысавецкім, бо ён стварыў савецкі орган улады ў Беларусі, ні сэпаратысцкім, бо ён выказаўся супраць адарваньня Беларусі ад Расеі. Апроч гэтага, аб характары зьезду сьведчыць тое, што падчас паседжаньняў яго старшыня падтрымліваў тэлефонны кантакт з народным камісарам у справах нацыянальнасьцяў Сталіным, са згоды якога зьезд быў скліканы. Таксама і Ландэр, старшыня Рады Народных Камісараў Заходняй Вобласьці ў Смаленску[5], сьцьвярджаў, што зьезд "у прынцыпе выказаўся за прызнаньне савецкай улады". Сапраўднай прычынай разгону была спроба зьезду стварыць у Беларусі беларускі орган савецкай улады заміж прэтэндуючых на ролю носьбітаў улады прызначаных Леніным чужых камісараў[6], якія не прызнавалі права беларускай нацыі на самавызначэньне.

Пасьля разгону зьезду сярод беларускіх дзеячоў, якія арыентаваліся на Савецкую Расею, выявілася сур'ёзная крыза даверу. Гэта спрыяла пашырэньню сярод гэтых дзеячоў незалежніцкіх тэндэнцыяў, хоць вялікая іх частка надалей спадзявалася на Расею, выходзячы з прыпушчэньня, што ў канцавым выніку толькі яна будзе вырашаць долю Беларусі.

У лютым 1918 г. пасьля заняцьця Менску нямецкімі войскамі выйшаў з падпольля створаны Радай Усебеларускага Зьезду краёвы выканаўчы камітэт[7], які абвясьціў сябе народным сакратарыятам (урадам) Беларусі[8]. 9 сакавіка ён выдаў устаўную грамату, якая абвяшчала стварэньне Беларускай Народнай Рэспублікі, якая разумелася як складовая частка Расейскай Фэдэрацыі. Урэшце, 25 сакавіка Рада БНР выдала наступную ўстаўную грамату, якая абвяшчала:

> Цяпер мы, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, скідаем з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасьці, якое гвалтам накінулі расейскія цары на наш вольны і незалежны край. Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца Незалежнаю і Вольнаю Дзяржавай. Самі народы Беларусі ў асобе Ўстаноўчага Сойму пастановяць аб будучых дзяржаўных зьвязях Беларусі[9].

Дэклярацыя Рады БНР ад 25 сакавіка 1918 г. у беларускіх нацыянальных колах уважаецца за абвяшчэньне народзінаў уласнай дзяржавы і ў меру магчымасьці ўрачыста сьвяткуецца. Крытыкі ж заўважаюць, што дэклярацыя была актам кампрамісу з

[5] На момант разгону Ўсебеларускага Зьезду Савет Народных Камісараў Заходняй вобласьці і фронту знаходзіўся ў Менску. У Смаленск ён уцёк 18—19 лютага 1918 г. — *А.С.*

[6] У створаны бальшавікамі ў лістападзе 1917 г. Выканаўчы камітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласьці і фронту (Аблвыканкамзах) ня быў уключаны аніводзін прадстаўнік беларускага нацыянальнага руху. — *А.П.*

[7] Гаворка пра Выканаўчы Камітэт Рады Ўсебеларускага зьезду. Аднак з падпольля ён выйшаў не пасьля прыходу немцаў у Менск, а адразу пасьля ўцёкаў бальшавіцкай улады — 19 лютага — і ў той самы дзень выдаў загад № 1, якім абвясьціў, што "ўзяў уладу ў свае рукі", а "для наладжаньня парадку ў горадзе Менску" прызначыў камэнданта — Канстанціна Езавітава. Нямецкія войскі, уступіўшы ў Менск 25 лютага, ужо мелі справу з Народным Сакратарыятам Беларусі. Яны сарвалі беларускі сьцяг з будынку, дзе месьціўся беларускі ўрад, і захапілі касу Народнага Сакратарыяту. Гл.: Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Укладаньне, уступны артыкул, камэнтары, пераклады Сяргея Шупы. Т. 1. Кн. 1. Вільня—Нью-Ёрк—Менск—Прага, 1998. С. 49—50. — *А.С.*

[8] 20 лютага 1918 г. Выканаўчы Камітэт Рады Ўсебеларускага зьезду выдаў Устаўную грамату да беларускага народу. Да скліканьня Ўстаноўчага Сойму ён абвясьціў сябе часоваю ўладаю ў Беларусі і стварыў урад — Народны Сакратарыят. У літаратуры Грамата, і стварэньне Народнага Сакратарыяту датуюцца 21.02.1918. Гэтая недакладнасьць выкліканая тым, што Грамата была апублікаваная 21 лютага. Насамрэч, 21 лютага ўрад "ужо прыступіў да спаўненьня сваіх абавязкаў", пра што была выпушчаная адмысловая абвестка на дзьвюх мовах. Аб стварэньні Народнага Сакратарыяту А. Смоліч 21 лютага інфармаваў Менскую гарадзкую думу. Гл.: Тамсама. С. 46—49, 852. — *А.С.*

[9] Пераклад спраўджаны з тэкстам у: Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1. Кн. 1. С. 62. — *А.С.*

моцнай прарасейскай апазыцыяй унутры Рады. Па–першае, яна была прынятая большыней усяго ў колькі галасоў, і, па–другое, накінутае расейскімі царамі ярмо не існавала ўжо больш за год, а яго "скіданьне" было беспрадметным і не выражала стаўленьня Рады да фэдэрацыйнага саюзу з рэвалюцыйнай Расеяй.

Пра тое, наколькі глыбокай была псыхалягічная залежнасьць беларускіх дзеячаў ад Расеі, сьведчаць спробы пошуку падтрымкі ў Нямецкім Райху. 25 красавіка 1918 г. кайзэру Вільгельму была дасланая падпісаная вядучымі чальцамі Рады тэлеграма з падзякай за вызваленьне краіны ад чужога ўціску і просьбай аб дапамозе ўмацаваць дзяржаўную незалежнасьць Беларусі. Гэтая тэлеграма, якая засталася без адказу, выклікала вялікі крызіс ува ўладах БНР: адстаўка часткі чальцоў Рады і ўраду разам зь яго прэм'ерам Язэпам Варонкам, а таксама распад асноўнай палітычнай сілы Рады — Беларускай Сацыялістычнай Грамады.

Пра Дэклярацыі Рады БНР не было згадкі ў прынятай ў 1991 г. Вярхоўным Саветам БССР дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце Рэспублікі Беларусі[10]. Тады, у 1918 г., за прыняцьце дэклярацыі незалежнасьці нацыянальныя дзеячы вялі цяжкую барацьбу з прарасейскай апазыцыяй, цяпер жа, у 1991 г., дэклярацыя была прынятая галасамі камуністычнай намэнклятуры, якая, з іроніі лёсу, яшчэ нядаўна змагалася з нацыянальнымі тэндэнцыямі як сэпаратысцкімі. Раптоўная зьмена пазыцыі гэтай намэнклятуры адлюстроўвала перадусім яе імкненьне захаваць дагэтулешнія палітычныя і эканамічныя пазыцыі, якія апынуліся пад пытальнікам пасьля няўдалай спробы пучу, учыненай летам 1991 г. у Маскве групай Янаева[11].

Можна меркаваць, што ўва ўзьнікненьні Рэспублікі Беларусі не адыгрываў ніякай ролі такі істотны дзяржаватворчы чыньнік, як нацыянальная сьвядомасьць грамадзтва, зразуметы як падстава імкненьня да самастойнага дзяржаўнага існаваньня. Больш за тое, можна рызыкнуць выказаць меркаваньне, што дэклярацыя Вярхоўнай Рады БССР была прынятая насуперак выказанай на рэфэрэндуме 1991 г. волі гэтага грамадзтва, якое аддавала рашучую перавагу СССР, а ня ўласнай асобнай дзяржаве[12].

У першыя гады функцыяваньня гэтай дзяржавы паступова ўзмацнялася актыўнасьць нацыянальна арыентаваных колаў, якія, не зважаючы на спэцыфіку яе ўтварэньня, разглядалі яе як падараваную гісторыяй рэдкую магчымасьць пабудовы рэальнай самастойнасьці. Луналі розныя лёзунгі: адраджэньне мовы і культуры, стварэньне сучаснай нацыянальнай сьвядомасьці, дэмакратызацыя палітычнага жыцьця, перабудова гаспадарчай сыстэмы, далучэньне да эўрапейскіх структураў, нэўтралітэт у вайсковай сфэры і г.д.

Пры гэтым спадзяваньні на падтрымку гэтых імкненьняў ускладаліся на заходнія краіны, у тым ліку асабліва на рэальную фінансавую дапамогу, якая спрыяла б умацаваньню

[10] Дэклярацыя аб дзяржаўным сувэрэнітэце Беларусі была прынятая Вярхоўным Саветам БССР яшчэ 27 ліпеня 1990 г. 25 жніўня 1991 г. Надзвычайная сэсія Вярхоўнага Савету толькі надала ёй сілу канстытуцыйнага закону. — *А.П.*

[11] Маецца на ўвазе Дзяржаўны камітэт па надзвычайным становішчы (ГКЧП), які 19 жніўня 1991 г. заявіў пра адхіленьне ад улады прэзыдэнта СССР Міхаіла Гарбачова і пераняцьці ўлады ў краіне ў свае рукі. На чале ГКЧП знаходзіўся віцэ–прэзыдэнт СССР Генадзь Янаеў (нар. 1936). — *А.П.*

Спроба дзяржаўнага перавароту, узначаленая віцэ-прэзыдэнтам Савецкага Саюзу Генадзем Янаевым і накіраваная супраць рэфармаваньня дзяржаўнага ладу СССР, была ўчынена 19—21 жніўня 1991 г. Путч стаў непасрэдным штуршком да распаду СССР. У гэтыя дні кіраўніцтва Расейскай Фэдэрацыі ўзяло пад свой кантроль сілавыя структуры і міністэрства замежных справаў СССР, прызнала незалежнасць Эстоніі. 24 жніўня акт аб незалежнасці прыняла Вярхоўная Рада Ўкраіны, а 25 жніўня Вярхоўны Савет БССР надаў канстытуцыйны статус Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце Беларускай ССР і прыняў пастанову аб забесьпячэнні палітычнай і эканамічнай незалежнасьці Рэспублікі. 19 верасьня была абвешчана Рэспубліка Беларусь. — *А.С.*

[12] На кансультацыйным рэфэрэндуме пра лёс СССР, які быў праведзены ў сакавіку 1991 г., 82,7% насельніцтва БССР выказаліся за яго захаваньне. — *А.П.*

дзяржаўнасьці Беларусі. Тут чакала вялікае расчараваньне, бо гэтая дапамога, калі не лічыць сродкаў на ліквідацыю наступстваў чарнобыльскай катастрофы, аказалася амаль сымбалічнай у параўнаньні зь дзясяткамі мільярдаў даляраў, якія цяклі ў Расею. Тлумачэньні, што адсутнасьць дапамогі для Беларусі была наступствам яе нежаданьня ці нястдольнасьці рэфармаваць эканоміку, падаюцца памылковымі. Бо прыклад Польшчы і нават Расеі паказвае, што гэтая ўмова не была выключнай, а рэфармаваньне эканомікі гэтых краін без папярэдняй фінансавай дапамогі было б прынамсі сумнеўным.

Таму выглядае на тое, што ў палітыцы Захаду да посткамуністычных краінаў Усходняй Эўропы ўжываліся і ўжываюцца два розныя крытэры. Яны вынікаюць з глябальнай палітыкі, асабліва Злучаных Штатаў, якая не скіраваная на дэкампазыцыю вялікага саюзьніка на Ўсходзе, незалежна ад таго, ці завецца ён СССР, ці Расейскай Фэдэрацыяй. Супраць гэтай дэкампазыцыі ў жніўні 1991 г., то бок беспасярэдне перад распадам СССР, выказаўся амэрыканскі прэзыдэнт Джордж Буш падчас свайго візыту ў Кіеў. На жаль, нішто ня сьведчыць аб тым, каб гэты погляд зьмяніў яго наступнік Біл Клінтан. Таму можна меркаваць, што палітычная воля Захаду — пакінуць Беларусь у сфэры ўплываў Расеі.

Такім парадкам, пасьля неспадзявана падараванай незалежнасьці не адбылося, бо не магло адбыцца, цуду, а ў пакінутай на ўласны лёс Беларусі нарасталі цяжкасьці, найперш эканамічныя. Рост цэнаў прывёў да падзеньня спажываньня, што выклікала спад вытворчасьці і нацыянальнага даходу. Не дапамагло ані стварэньне Садружнасьці Незалежных Дзяржаваў, ані спробы пераарыентацыі эканамічных сувязяў з замежжам, перадусім максымалізацыі абаротаў з краінамі Сярэдняй і Заходняй Эўропы. Беларускія экспартныя прадпрыемствы не атрымалі ніякіх пачатковых прэфэрэнцыяў і мусілі дапасоўвацца да суровых правілаў вольнага рынку. У выніку, галоўным гандлёвым партнэрам надалей заставалася Расея, на якую ў 1992—1997 гадох прыпадала каля 2/3 усяго замежнага абароту Беларусі.

Прарасейскі выбар грамадзтва, бо так можна ацаніць яго падтрымку інтэграцыйных намераў Лукашэнкі, адлюстроўвае надзеі перадусім на паляпшэньне эканамічнай сытуацыі. Гэты выбар, хоць ён і пераважае ў маштабе ўсёй Беларусі, вылучаецца цікавымі рэгіянальнымі адрозьненьнямі, што можа паказваць на ўзьдзеяньне таксама і неэканамічных чыньнікаў. Мяркуючы па падліках Марка Сьлівінскага і Валера Чэкмана (Obóz, 1996, № 30), поўную падтрымку праграмы інтэграцыі з Расеяй выказвае насельніцтва суседніх зь ёй рэгіёнаў усходняй Беларусі, тады як у памежных зь Літвой паўночна-заходніх рэгіёнах наймацней выяўляюцца нацыянальныя тэндэнцыі.

Пададзены гэтымі аўтарамі геаграфічны расклад прарасейскай тэндэнцыі ў прынцыпе супадае з тэрытарыяльнай канфэсійнай дыфэрэнцыяцыяй у Беларусі, якая захоўваецца на працягу стагодзьдзяў. Гэтая дыфэрэнцыяцыя, праўда, за савецкім часам была аслабленая атэізацыяй грамадзтва і высяленьнем зь Беларусі соцень тысяч каталікоў[15], аднак яна надалей застаецца важным чыньнікам, які выяўляецца ў адрознай мэнтальнасьці насельніцтва і яго прывязанасьці да розных культурных каштоўнасьцяў. У дзевяностыя гады гэты чыньнік досыць эфэктыўна выкарыстоўваўся ў прапа-

[13] У 30 нумары часопіса "Obóz" у 1996 г. быў апублікаваны артыкул М. Сьлівінскага і В. Чэкмана "Białoruś: ziemia niczyja?" ("Беларусь: нічыйная зямля?") (с. 19—33). — *А.П.*

[14] Маецца на ўвазе перш за ўсё абмен насельніцтвам паміж СССР і Польскай Народнай Рэспублікай у 1940—1950-х гг. — *А.П.*

[15] Гаворка павінна ісьці пра масавы выезд у Польшчу у 1945—1946 гг. і ў 1958—1959 гг. жыхароў Беларусі каталіцкага вызнаньня. Гэтыя людзі былі ў большасьці г.зв. касьцельнымі палякамі — этнічнымі беларусамі каталіцкага вызнаньня. Многія зь іх пісаліся палякамі, каб уцячы ад калгасаў. Было сярод эмігрантаў і праваслаўныя беларусы. Гл. таксама артыкул "Каталіцызм у Беларусі — маштаб праблемы" ў гэтай кнізе. — *А.С.*

гандаваньні сярод праваслаўнай бальшыні славянафільскіх тэндэнцыяў[16] і распальваньні страхаў перад вэстэрнізацыяй Беларусі і ростам уплыву Каталіцкай Царквы[17]. Пры гэтым не бярэцца пад увагу, што ў дзейнасьці гэтай Царквы штораз большую ролю адыгрывае беларуская мова, тады як Праваслаўная Царква надалей трымаецца расейскай мовы. Апроч таго, немалы ўплыў на посьпех Лукашэнкі ў прэзыдэнцкіх выбарах і пазьнейшых рэфэрэндумах рабіла тая акалічнасьць, што яго вядучыя папярэднікі ўва ўладнай камандзе мелі каталіцкае паходжаньне[18], што ўзбуджала падазронасьць і процідзеяньне дзеячаў прарасейскай арыентацыі.

Таму можна пагадзіцца з высновай Марка Сьлівінскага і Валера Чэкмана, што "паняцьце беларускіх нацыянальных і дзяржаўных інтарэсаў надалей застаецца чужым для велізарнай бальшыні жыхароў краіны, якія пачуцьцёва і эмацыйна ўсё яшчэ прывязаныя да ўжо няіснага Савецкага Саюзу, безвынікова спрабуючы ўгледзець у разьдзіранай канфліктамі Расеі яго новы адпаведнік"[19].

Камэнтар–паслоўе Анатоля Сідарэвіча

У гэтым артыкуле, які не вызначаецца дэталёвасьцю, аўтар не разглядае падзеі 1990—1991 гг. у храналягічнай пасьлядоўнасьці і ўзаемасувязі.

Акцэнтуючы ўвагу на тым, што амаль 80% грамадзян БССР увесну 1991 г. прагаласавала за тое, каб Рэспубліка засталася ў складзе СССР, ён ігнаруе факт, што ў Беларусі, якая перажыла пяць хваляў масавага тэрору (1918—1921, 1929—1930, 1933—1934, 1939—1940, 1944—1945), зь якой у 1944 г. на эміграцыю падаліся тысячы людзей, у якой была вялікая канцэнтрацыя войскаў СССР і засталіся на сталае жыхарства некалькі сотнё тысяч адстаўных вайскоўцаў з розных рэгіёнаў СССР, 20% насельніцтва прагаласавала за незалежнасьць.

Далей аўтар піша: "Можна меркаваць, што ўва ўзьнікненьні Рэспублікі Беларусь не адыгрываў ніякай ролі такі істотны дзяржаватворны чыньнік, як нацыянальная сьвядомасьць грамадзтва, зразуметы як падстава імкненьня да самастойнага дзяржаўнага існаваньня. Больш за тое, можна рызыкнуць выказаць меркаваньне, што дэклярацыя Вярхоўнага Савету БССР была прынятая насуперак выказанай на рэфэрэндуме 1991 г. волі гэтага грамадзтва..."

Па–першае, у Вярхоўным Савеце БССР XII скліканьня, які абіраўся ў 1990 г. пад камуністычным кантролем, пытаньне аб сувэрэнітэце БССР, а потым аб дэнансацыі Саюзнай дамовы 1922 г. гучала зь першых дзён яго існаваньня. Па–другое, на сьвядомасьць насельніцтва вельмі ўплывалі падзеі ў іншых саюзных рэспубліках, асабліва абвяшчэньне дзяржаўнага сувэрэнітэту Расеі і Украіны. Па–трэцяе, прытупленасьць нацыянальнай сьвядомасьці не азначае, што ў насельніцтве не пашыралася думка аб

[16] Славянафільскімі гэтыя настроі можна назваць умоўна, бо "славянафілы" 1990–х гадоў не надзялялі сваёю любоўю каталіцкія славянскія народы, а з праваслаўных вылучалі найперш расейцаў, а потым беларусаў і ўкраінцаў. Таму гэтых "славянафілаў" называлі славянаросамі. — *А.С.*

[17] Антыкаталіцкая прапаганда спалучалалася з антыпратэстанцкай і антыюдэйскай. З праваслаўных Цэркваў перавага аддавалася Рускай Праваслаўнай Царкве. Спробы стварыць незалежныя ад яе праваслаўныя прыходы падаўляліся дзяржаваю. — *А.С.*

[18] Перш за ўсё, відаць, маюцца на ўвазе старшыня Вярхоўнага Савету Станіслаў Шушкевіч, старшыня Савету Міністраў Вячаслаў Кебіч і лідэр Беларускага Народнага Фронту Зянон Пазьняк. Апошні, праўда, ва ўладную каманду не ўваходзіў, але быў уплывовым лідэрам апазыцыі і многія з тых зьменаў, што праводзіліся ў Беларусі ў пачатку 1990–х гг., насельніцтва ўстойліва асацыявала зь ягоным імем, чаму судзейнічала і афіцыйная прапаганда. — *А.П.*

[19] Панаваньне на беларускім інфармацыйным полі расейскіх электронных СМІ з паказам рэгіянальных канфліктаў, "разборак" і г.д. спрыяла стварэньню нэгатыўнага іміджу Расеі. — *А.С.*

неабходнасьці самастойнага дзяржаўнага быту Беларусі. Па–чацьвертае, абвяшчэньне дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі не сустрэла арганізаванага супраціву. Па–пятае, згаджаючыся на самастойны дзяржаўны быт Беларусі, большасьць насельніцтва першапачаткова не ўяўляла Беларусь бязь цеснае сувязі з Расеяй, але штогод гэты адсотак падае, і, наадварот, узрастае працэнт грамадзянаў, якія выступаюць за інтэграцыю Беларусі ў эўрапейскія структуры або выказваюцца за збалянсаванасьць у дачыненьнях з Расеяй і Эўразьвязам.

Пішучы пра палітыку Захаду ў дачыненьні да Беларусі, аўтар мусіў бы адзначыць, што "пакінуць Беларусь у сфэры ўплыву Расеі" жадалі ня гэтак Злучаныя Штаты, як традыцыйныя гульцы на гэтым полі — Нямеччына і Францыя, якія ў немалой ступені вызначалі палітыку Эўразьвязу. У 1990–х гг. яны ў пэўнай ступені паўтаралі палітыку сваіх урадаў 1918—1921 гг., якія не пажадалі прызнаць БНР.

Пераклад зроблены паводле публікацыі ў: Obóz. № 35. Warszawa, 1998.

Цярністы шлях Беларусі

Можна спадзявацца, што кніга Яўгена Мірановіча "Навейшая гісторыя Беларусі" (Беласток, 1999. — 270 с.) зацікавіць многіх чытачоў і спэцыялістаў. Нягледзячы на амбітны загаловак, яе асноўны зьмест — разьвіцьцё беларускага нацыянальнага руху і станаўленьне дзяржаўнасьці, становішча якой сёньня хвалюе ня толькі беларусаў.

Дзевяць разьдзелаў кнігі лягічна адпавядаюць асноўным этапам палітычнай гісторыі Беларусі — ад часу яе ўваходжаньня ў склад Расейскай імпэрыі па сёньняшні дзень. Аўтар пачынае ад апісаньня першых канспірацыйных спробаў фармаваньня беларускай нацыянальнай ідэі ў другой палове XIX ст. і намаганьняў яе пашырэньня сярод насельніцтва ў нашаніўскі пэрыяд (1906—1915), слушна заўважаючы, што гэты пэрыяд быў закароткі для ўкараненьня ў масах нацыянальнай сьвядомасьці і выпрацоўкі да першай сусьветнай вайны агульнанацыянальнай канцэпцыі дзяржаўнага будаўніцтва.

Гэтыя перадумовы пагоршыліся ў выніку мабілізацыі дзеячоў у расейскую армію і эвакуацыі насельніцтва ў глыб Расеі, што паўплывала на мізэрнае выкарыстаньне асьветна–культурных канцэсіяў нямецкіх акупацыйных уладаў у заходняй частцы Беларусі. Палітычная дзейнасьць ажывілася пасьля Лютаўскай рэвалюцыі (1917 г.) і акупацыі нямецкай арміяй усходніх раёнаў Беларусі (1918 г.), а яе завяршэньнем была праклямацыя і кароткачасовае існаваньне Беларускай Народнай Рэспублікі. Ва ўмовах адсутнасьці сваёй рэальнай вайсковай сілы і дзейснай падтрымкі мас, больш зацікаўленых вырашэньнем сацыяльных пытаньняў, сярод палітыкаў БНР пераважалі арыентацыі на сілы звонку, што спараджала ўнутраныя самагубныя канфлікты. Гэта аблягчала Савецкай Расеі і адроджанай Польшчы ігнараваць БНР і трактаваць яе як прадмет сваіх інтарэсаў.

Рыскі трактат (1921 г.) ня толькі выключыў магчымасьць нацыянальнага разьвіцьця савецкай і польскай частках падзеленай Беларусі, але, — як піша Яўген Мірановіч, — "стварыў сытуацыю супярэчнасьці польска–беларускіх інтарэсаў і вялікія магчымасьці ўзьдзеяньня на гэтыя суадносіны з боку Масквы". Гэтыя працэсы аўтар пераканаўча адлюстроўвае ў III і IV разьдзелах кнігі, паказвае, як паступова, хаця рознымі мэтадамі, вынішчаўся нацыянальны патэнцыял у БССР і Заходняй Беларусі. Невыпадкова ўзьяднаньне беларускіх абшараў у верасьні 1939 г. успрымалася беларускімі дзеячамі (нават хадэцкімі) як акт гістарычнай справядлівасьці.

Значную ўвагу аўтар прысьвяціў драматычным падзеям пэрыяду нямецкай акупацыі (1941—1944), калі ва ўмовах непасьлядоўнасьці нямецкай палітыкі і партызанскай вайны асноўным імкненьнем насельніцтва было звычайнае выжываньне. Усё ж стаўка нямецкай цывільнай адміністрацыі на ажыўленьне аслабленага беларускага нацыяналізму (БНС, СБМ, Рада Даверу, БЦР, роспуск калгасаў, вайсковыя фармаваньні ды інш.) не была безвыніковая, а гэта мела важныя наступствы пасьля вяртаньня Чырвонай Арміі ў Беларусь. Пад шырмай выкараненьня фашысцкай ідэалёгіі цэлыя пасьляваенныя дзесяцігодзьдзі працягвалася змаганьне зь беларускімі нацыянальнымі вартасьцямі. "У выніку, — піша Мірановіч, — краіна засталася без нацыянальнай эліты, частка якой загінула ў час акупацыі, частка эвакуавалася зь нямецкай арміяй, а астатнія неўзабаве апынуліся ў савецкіх канцэнтрацыйных лягерох. У Беларусі ня стала сілаў, якія маглі б хаця прыпамінаць аб ідэі незалежнасьці, аб сваіх нацыянальных сымбалях" (с. 166).

Працэсам пасьляваеннай дэнацыяналізацыі спрыяў таксама наплыў грамадзян зь іншых рэспублік СССР, галоўным чынам расейцаў, якія займалі кіруючыя пасты ў грамадзкім жыцьці Беларусі. Істотны ўплыў на русіфікацыю насельніцтва мела, урэшце,

інтэнсіўная індустрыялізацыя і перасяленьне сельскага насельніцтва ў гарады. Новых гараджан задавальняла грамадзкае павышэньне, расейскамоўнае асяродзьдзе і асабліва дасягнуты ў 70-х гадох адносны дабрабыт. Пасьлядоўна да гарбачоўскай перабудовы дысыдэнцтва ў Беларусі было амаль незаўважнай зьявай, значна слабейшай, чым у Расеі ці Прыбалтыцы.

Апошні разьдзел кнігі ("Сувэрэнная Беларусь") прысьвечаны падзеям апошняга дзесяцігодзьдзя — паўставаньню моладзевых суполак, апазыцыйных партыяў і рухаў, разьвіцьцю непадцэнзурнай выдавецкай дзейнасьці і г.д. "Аднак, — сьцьвярджае Міраловіч, — беларускім элітам не ўдалося новыя ідэйныя плыні прышчапіць масам, якія пад уплывам нарастаючага эканамічнага крызісу заставаліся абыякавымі да лёзунгаў аб дэмакратыі і нацыянальным адраджэньні" (с. 212—213). Дэклярацыі Вярхоўнага Савету аб сувэрэнітэце і незалежнасьці былі вымушаны палітычнай сытуацыяй і не адлюстроўвалі жаданьняў пераважнай часткі дэнацыяналізаванага грамадзтва. Настальгія па СССР абумовіла бліскучую перамогу Аляксандра Лукашэнкі ў прэзыдэнцкіх выбарах (1994 г.), а пазьнейшыя рэфэрэндумы далі прэзыдэнту народны мандат для дзяржаўнай інтэграцыі з Расеяй.

Кніга Яўгена Міраловіча наводзіць на невясёлыя роздумы, сярод якіх на першы плян высоўваецца пытаньне нацыянальнай самасьвядомасьці мас, ці дакладней — яе хранічнай адсутнасьці. Аўтар не лякіруе сапраўднасьці, але прычыну гэтай зьявы бачыць у дзеяньнях суседзяў. Гэта не высьвятляе справы да канца, больш істотнай была і ёсьць нязьдольнасьць ці неахвота беларускага люду бараніць і памнажаць свае ідэйныя вартасьці.

Занадта катэгарычна гучыць вывад аўтара аб тым, што беларуска-польскія і беларуска-расейскія палітычныя інтарэсы ўзаемна выключаюцца (с. 3), а таксама што сярод беларусаў не было групавой матывацыі да супрацоўніцтва зь немцамі (с. 136). Заўважым, што міжнародныя стасункі — гэта не эвангельская ісьціна, яны мяняюцца ў залежнасьці ад патрэбаў, магчымасьцяў, умельства, затое суседзтва застаецца нязьменным. Усё ж ня ясна, чым кіраваўся аўтар, крытычна ацэньваючы пазыцыю Іваноўскага (с. 159) і адначасова замоўчваючы стаўленьне Астроўскага да польскага падпольля (матэрыялы захаваліся).

Яўген Міраловіч, як правіла, не дакумэнтуе сваіх выказваньняў, што характэрна для публіцыстычных твораў. Аднак у некаторых выпадках дакумэнтацыя была б пажаданая. Гэта датычыць такіх сэнсацыйных паведамленьняў, як запрашэньне Леніным Луцкевіча на перамовы ў Маскве (с. 36), адсутнасьць у Менску рэакцыі на разгром Грамады (с. 92), пагадненьне Праўдзіца-Шляскага зь немцамі (с. 160), "вялікія сродкі" для БЦР (с. 161), праект перадачы Полацкай вобласьці Расеі (с. 167) ці пра шматтысячныя копіі "Письма Русскому Другу" (с. 206). Пра забойствы духавенства восеньню 1939 г. (с. 122) былі б пажаданыя канкрэтныя весткі, вядома, што зь некаторымі распраўляліся мясцовыя жыхары, а не савецкія ўлады ці салдаты.

Не магу не зьвярнуць увагі на допушчаныя ў тэксьце памылкі і недакладнасьці, якія, на жаль, памяншаюць вартасьць і культуру выданьня. Іх можна было пазьбегнуць шляхам больш грунтоўнага выкарыстаньня крыніц і папярэдняй рэцэнзіі. Вось асноўныя на старонках:

8 — Эліта ВКЛ падвяргалася палянізацыі не ў канцы XVIII ст., яна палянізавалася некалькі стагодзьдзяў.

17 — Не "Наша Хатка", а "Наша Хата".

27 — Ліпеньскі зьезд левых партыяў (1917 г.) не "распусьціў" (ён ня меў такой магчымасьці) БНК Скірмунта, які працягваў дзейнічаць і ў 1918 г.[1].

[1] Спрэчнае пытаньне, якое патрабуе дадатковага вывучэньня. Відавочна, што Ю. Туронак лічыць працягам БНК заснаванае 25 лютага 1918 г. "Менскае Беларускае Народнае Прадстаўніцтва" ("Менскае Беларускае Прадстаўніцтва"). — *А.С.*

34 — У 1918 г. немцы не захапілі ўсёй Беларусі.

42 — Няўжо ў 1919/20 г. у Менску выходзілі "незалежныя" беларускія газэты?

48 — Крэдыт (40 млн. марак) ня быў нямецкі, а ўкраінскі, прызначаны ўраду БНР у канцы 1918 г. і здэпанаваны ў бэрлінскім банку, пазьней, пасьля паручэньня літоўскага ўраду, быў перададзены Ластоўскаму.

93—99 — Сярод віленскіх арганізацый прапушчана ТБШ, якое мела большае значэньне, чым БІГіК.

76, 6 р. зьверху — Не на ўсход, а на захад.

95 — Беларускіх каталіцкіх ксяндзоў перамяшчалі не ў цэнтральныя ваяводзтвы, але ў польскія мясцовасьці іх дыяцэзіі.

97, 98 — У выніку забароны ўладамі арганізацыйнага зьезду (1937) ніколі не паўстала Беларуская нацыянал–сацыялістычная партыя, тым больш не магла быць "адзінай" беларускай партыяй, якая пратрымалася да 1939 г. (Той адзінай было БНА).

127 — Няўжо толькі "некалькі дзясяткаў кулакоў" плянавалася дэпартаваць на ўсход?

142, 259 — Ня Кноўт, а Контаўт.

142 — Ня Шчорс заснаваў "Новую дарогу".

143 — Беластоцкая вобласьць у 1941—1944 гг. не была далучана да Ўсходняй Прусіі. Няпраўда, што ў Прыбалтыцы немцамі дазваляліся толькі 4–кл. пачатковыя школы, там працавалі і сярэднія, і вышэйшыя[2].

147 — У 1943—1944 гг. у Беластоку дзейнічала Беларускае Аб'яднаньне, а не Беларускае Нацыянал–Дэмакратычнае Аб'яднаньне.

163 — У Нямеччыну вывезьлі ня "некалькі тысяч", а некалькі сот тысяч.

254 — Кс. В. Гадлеўскі нарадзіўся ў 1888, а не 1898 г.

Адносна лексыкі: не гаворыцца "духовая" (адасобленасьць), а духоўная (с. 9 ды інш.), войскі не "апанавалі" лінію, а выйшлі на лінію (с. 40), Грабскі не "фарсіраваў", а дамагаўся граніцы (с. 49), не шматкратнае, а шматразовае (с. 86, 197).

Друкуецца паводле публікацыі ў: Ніва. 1999. 7 лістапада.

[2] Пра статус Беласточчыны гл. працу "Акупацыйная школьная палітыка ў Беластоцкай акрузе (1941—1944)". — А.С.

Беларуская кніга ў міжваеннай Польшчы 1921—1939

Уступ

У гэтай працы падаецца гісторыя беларускай кнігі ў Польскай Рэспубліцы ад 1921 да верасьня 1939 г. У гэтую без малога 19-гадовую пару да польскай дзяржавы належалі паўночна-ўсходнія землі (ваяводзтвы: Наваградзкае, Палескае і ўсходнія часткі Віленскага й Беластоцкага), населеныя пераважна беларускім насельніцтвам. Прызначаная для гэтага насельніцтва кніга на роднай мове выконвала ня толькі звычайную культуратворчую ролю, але й была, згодна з задумай выдаўцоў, важным чыньнікам фармаваньня яго нацыянальнай сьвядомасьці, праявай супрацьдзеяньня асыміляцыйнай палітыцы польскіх уладаў.

Далучэньне гэтых земляў да Польшчы было вынікам польска-савецкай вайны, якая зь пераменным посьпехам вялася ў 1919—1920 гг. і скончылася ўкладаньнем мірнай дамовы ў Рызе (18.03.1921). Яна замацавала падзел Беларусі: яе заходняя частка дасталася Польшчы, ува ўсходняй жа была створаная Беларуская Савецкая Рэспубліка[1].

Варта, аднак, заўважыць, што ўвесь 1921 г. — узяты за пачатак разгляданага выдавецкага пэрыяду — Вільня, у якой у той час канцэнтравалася амаль уся беларуская выдавецкая дзейнасьць, фармальна заставалася па-за межамі Польшчы. Згодна зь літоўска-савецкай дамовай 12.07.1920 г., яе перадалі Літве, але ўжо 9.10.1920 г. яна была занятая дывізіяй генэрала Люцыяна Жалігоўскага, які на тэрыторыі Віленскага, Троцкага, Ашмянскага і Сьвянцянскага паветаў стварыў фікцыйную дзяржаву — Сярэднюю Літву са сталіцай у Вільні[2]. Дзяржава гэтая, якая ўсё ж мела шэраг фармальных атрыбутаў асобнага дзяржаўнага ўтварэньня, праіснавала да 20.02.1922 г., калі, згодна з пастановай краёвага сойму ў Вільні, злучылася з Польшчай.

Эпізадычную дзейнасьць уладаў Сярэдняй Літвы бальшыня польскіх і беларускіх дасьледнікаў ацэньвае як этап польскай інкарпарацыйнай палітыкі. Не адмаўляючы прынцыпова гэтай ацэнкі, усё ж выпадае адзначыць пэўную спэцыфіку гэтага пэрыяду. Бо, згодна з намерам Юзафа Пілсудзкага, Сярэдняя Літва мела быць зыходным пунктам для пабудовы шырэйшай польска-беларуска-літоўскай дзяржаўнай фэдэрацыі, у зьвязку з чым стаўленьне яе ўладаў (у якіх удзельнічалі беларусы: Вацлаў Івановскі і Браніслаў Тарашкевіч) да беларускага культурнага жыцьця было больш прыхільнае, чым адміністрацыі Польшчы пасьля праведзенай увесну 1922 г. інкарпарацыі. Затое не выклікае сумневу канцавы пункт гэтага дасьледаваньня — верасень 1939 г., калі ў выніку нямецка-савецкага нападу на Польшчу заходнебеларускія землі былі ўлучаныя ў СССР.

Гісторыя беларускай кнігі ў міжваеннай Польшчы (1921—1939) дагэтуль не дачакалася комплекснага разгляду. Працы ў гэтым абсягу пачыналіся ў дваццатых гадох Бе-

[1] БССР была абвешчана да падпісаньня Рыскага трактату: 30 ліпеня 1920 г. — *А.С.*

[2] Тэрыторыя Сярэдняй Літвы лічылася спрэчнаю. Ліга Нацыяў жадала, каб Літва і Польшча паразумеліся, дзеля чаго пад яе патранатам былі праведзеныя безвыніковыя перамовы ў Брусэлі. Не было адзінства наконт тэрыторыі Сярэдняй Літвы і ў Польшчы. Ю. Пілсудзкі, напрыклад, жадаў, каб выбары ў Віленскі Сойм адбыліся ў Ашмянскім, Браслаўскім, Віленскім, Лідзкім, Сьвянцянскім і Троцкім паветах, а яго апанэнты (эндэкі) лічылі Браслаўскі і Лідзкі паветы бясспрэчна польскаю тэрыторыяй. 16.11.1921 г. Сойм згадзіўся з думкаю Пілсудзкага. — *А.С.*

ларускай дзяржаўнай бібліятэкай у Менску. У 1927 г. накладам гэтай бібліятэкі выйшаў Летапіс беларускага друку (частка III) з каталёгавай індэксацыяй кніг на беларускай мове, выдадзеных у 1917—1924 гг., у тым ліку ў Польшчы. У 1928 г. у Менску было распачатае выданьне пэрыёдыка "Летапіс беларускага друку", дзе падавалася ўсё менш інфармацыі пра беларускія кніжкі, якія выходзілі за мяжой, і, урэшце, з пачатку 1929 г. замежныя выданьні перасталі адзначаць зусім, абмяжоўваючыся толькі кніжкамі, выдадзенымі ў Беларускай ССР.

Дасьледаваньняў у гэтай галіне не рабілася ў Беларусі таксама і ў паваенную пару. Праца С.В. Говіна (Друк Заходняй Беларусі 1921—1939. Мінск, 1974) тычылася пэрыядычных публікацыяў, а кніжка А.А. Ваўка і А.І. Раковіча (Книгоиздательское дело в Белоруссии. Минск, 1977) — толькі выданьня савецкіх кніжак.

Нэгатыўнае стаўленьне беларускіх савецкіх дасьледнікаў да выдавецкай дзейнасьці за межамі краіны было прадыктаванае галоўным чынам ідэалягічнымі меркаваньнямі. Пачынаючы з трыццатых гадоў, выдадзеныя за мяжой кніжкі зьнішчалі, часткова перахоўвалі ў "спэцфондах" навуковых бібліятэк і толькі ў рэдкіх выпадках разглядалі ў навуковых публікацыях. На гэта ўплывалі ня толькі характар зьместу, супярэчны паноўнай у СССР ідэалёгіі, — у "спэцфонды" траплялі таксама працы клясыкаў марксізму ды перадрукі раней выдадзеных у Беларускай ССР твораў клясыкаў беларускай літаратуры: Янкі Купалы, Якуба Коласа і іншых, толькі таму, што гэтыя кніжкі паходзілі з замежжа.

Заняпад камуністычнай ідэалёгіі і распад СССР дазволілі беларускім дасьледнікам аб'ектыўна падысьці да выдавецкай праблематыкі ў міжваеннай Польшчы, аднак, апроч фрагмэнтарных працаў, комплексных дасьледаваньняў дагэтуль не было. Надалей няма поўнага каталёгу кніжак, дасьледаваньняў дзейнасьці выдаўцоў, друкароў, кнігароў, а таксама ацэнкі ўспрыманьня кніжкі чытачамі і яе ўплыву на фармаваньне культурнага жыцця і нацыянальнай сьвядомасьці беларускага насельніцтва ў міжваеннай Польшчы. У вялікай ступені гэта было наступствам ігнараваньня гэтай праблематыкі, якое доўжылася з канца дваццатых гадоў, г.зн. больш за шэсьцьдзесяць гадоў. Пра гэта сьведчыць у тым ліку памылковая інфармацыя аб колькасьці кніжак, выдадзеных віленскай беларускай друкарняй ім. Францішка Скарыны[3].

У Польшчы дагэтуль выйшла колькі працаў аб гісторыі беларускай кнігі ў міжваенную пару. Сярод іх заслугоўваюць увагі працы Хрысьціны Гамулкі[4] і Алены Глагоўскай[5], а таксама напісаныя ў Польшчы, але выдадзеныя ў Лёндане ўспаміны Язэпа Найдзюка–Александровіча (пад псэўданімам Станіслаў Цыпрыяновіч) пра разьвіцьцё і дзейнасьць друкарні ім. Скарыны ў Вільні[6].

Апроч таго, колькі публікацыяў зьявілася ў лёнданскім часопісе "Божым Шляхам", у тым ліку складзены ксяндзом Фэліксам Журнем пералік беларускіх кніжак і рэлігійных пэрыёдыкаў[7], а таксама крыніцазнаўчае дасьледаваньне Гая Пікарды "The heavenly fire", у якім разглядаецца беларускамоўная пратэстанцкая літаратура[8].

Дасьледаваньні над комплексным асьвятленьнем беларускай выдавецкай дзейнасьці

---

[3] Г. Галенчанка і В. Герасімаў сьцьвярджаюць, што друкарня ім. Францішка Скарыны выдала (sic!) больш за 70 кніжак. Гл.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 1997. Т. 4. С. 211. Насамрэч, там было надрукавана больш за 160 выданьняў.

[4] Gomółka K. Białorusini w II Rzeczypospolitej. Gdańsk, 1992.

[5] Głogowska H. Białoruskie wydawnictwa religijne w II Rzeczypospolitej a białoruski ruch narodowy // Naród i religia. Gdańsk, 1994.

[6] Цыпрыяновіч С. (Найдзюк Я). Беларуская друкарня імя Францішка Скарыны ў Вільні (1926—1940). Лёндан, 1991.

[7] Журня Ф. Беларускія рэлігійныя выданьні XIX—XX ст. // Божым шляхам. 1972. № 132.

[8] Picarda G. The heavenly fire // Божым шляхам. 1975. № 143—144.

ў міжваеннай Польшчы былі пачатыя ў васьмідзясятых гадох у Інстытуце славістыкі Польскай Акадэміі Навук. Першую іх частку становіць укладзеная Юр'ем Трачуком бібліяграфія часопісаў[9]. Дадзеная праца спачынае другую частку, прысьвечаную кнігавыданьню.

Зыходным пунктам гэтай працы і заразом асновай для праблемных аналізаў было ўпарадкаваньне як мага поўнага каталёгу кніжак на беларускай мове, выдадзеных у 1921—1939 гг. Для гэтай мэты выкарыстоўваліся выдадзены Беларускай дзяржаўнай бібліятэкай у Менску "Летапіс беларускага друку", які ў ліку іншага ўтрымлівае бібліяграфічнае апісаньне кніжак, выдадзеных у Польшчы ў 1921—1924 гг., і "Urzędowy Wykaz Druków wydanych w Rzeczypospolitej Polskiej", у якім пачынаючы ад 1929 г. фіксаваліся беларускамоўныя публікацыі. Абедзьве гэтыя крыніцы, аднак, не ахопліваюць усіх кніжак, выдадзеных у Польшчы ў міжваенную пару.

У гэтай сытуацыі карыснай дадатковай крыніцай быў рэклямны каталёг віленскай кнігарні "Пагоня", які ахоплівае большасьць беларускіх кніжак, выдадзеных да сярэдзіны 1937 г.[10], а таксама бібліяграфічныя паказьнікі, якія рэгулярна публікаваліся ў віленскіх часопісах "Biełaruskaja Krynica", "Chryścjanskaja Dumka", "Шлях Моладзі" і інш. З прычыны таго, што каталёг кнігарні "Пагоня" і часопісы часта ня бралі пад увагу такіх зьвестак, як назва выдавецтва, друкарні, аб'ём і іншых, атрыманую гэтым шляхам інфармацыю трэба было параўноўваць і дапаўняць дэталямі, якія падаваліся на вокладках паасобных кніжак.

У вялікай меры для гэтых мэтаў выкарыстоўваліся зборы польскіх навуковых бібліятэкаў, а ў некаторых выпадках прыватныя калекцыі. Асабліва багатымі зборамі беларускіх кніжак міжваеннай пары валодае Нацыянальная бібліятэка ў Варшаве, якая атрымлівала абавязковы асобнік з друкарняў альбо ад віленскай гарадзкой адміністрацыі. Нягледзячы на розныя страты, панесеныя ў часе апошняй вайны, у Нацыянальнай бібліятэцы Польшчы захавалася пераважная частка беларускіх кніжак, выдадзеных у гэтую пару.

Распрацаваны каталёг пададзены ў дадатку. Ён не ахоплівае:

— пэрыядычных выданьняў (часопісаў, гадавікоў, календароў);

— улётак (меншых за 4 старонкі) і мапаў;

— унутраных публікацыяў грамадзкіх арганізацыяў (праграмаў, статутаў, інструкцыяў і да т.п.);

— рэклямных каталёгаў беларускіх кнігарняў;

— непранумараваных і незбрашураваных зборнікаў;

— каля 20 агітацыйных брашураў, выдадзеных у 1921—1922 гг. беларускімі эсэрамі ў Літве, на якіх падаюцца фікцыйныя назвы друкарняў у польскіх гарадох; гэта павінна было палегчыць іх нелегальны распаўсюд сярод беларускага насельніцтва.

Публікацыі, выдадзеныя аднačасна кірыліцай і лацінкай, у каталёгу падаюцца як дзьве асобныя кніжкі. Гэта тычыцца дзьвюх ці трох пазыцыяў.

У выпадку кніжак, выдрукаваных часткамі ў розныя гады, а часам і ў розных друкарнях, кожная частка ў каталёгу падаецца як асобная кніжка. Гэта тычыцца наступных пазыцыяў: Бобіч Ільдэфонс. Нядзельшнія эвангеліі і навукі. 1921—1922; Грынкевіч Ядвіга і Станіслаў. Рады хворым і здаровым. 1935—1939; Гаспадарскі зборнік. 1937—1939; Якуб Колас. Новая зямля. 1928—1929; Зборнік "Беларускіх ведамасьцей". 1921.

Кніжкі ў каталёгу падаюцца паводле гадоў выданьня ў альфабэтным парадку. Прозьвішчы псэўданімы і крыптанімы аўтараў і назвы кніжак падаюцца ў арыгінальнай беларускай вэрсіі. Для псэўданімаў і крыптанімаў у асобным сьпісе ў канцы працы

[9] Traczuk J. Prasa białoruska w II Rzeczypospolitej // Studia polono-slavica orientalia. Acta litteraria. T. XIII. Warszawa, 1992. — *Ю.Т.*

Гл. таксама зн. 41 — *А.С.*

[10] Каталёг (кнігасьпіс) беларускіх кніг кнігарні "Пагоня". Вільня, 1937.

зьмешчаныя прозьвішчы аўтараў за выняткам некаторых агульнавядомых, як Янка Купала, Якуб Колас і іншых.

Месца выданьня кніжкі называецца ў каталёгу толькі ў выпадку яе выданьня ў іншым горадзе, чым Вільня, на якую ў разгляданую пару прыпала 98% усяго кнігавыданьня ў Польшчы.

Паводле зьвестак аўтара, у 1921—1939 гг. у Польшчы агулам былі апублікаваныя 466 кніжак і брашур на беларускай мове. Ацэньваючы гэты сьціплы вынік, трэба мець на ўвазе гістарычныя перадумовы. У выніку культурнай палянізацыі пераважнай часткі беларускай шляхты, адзінага, апроч часткі духавенства, грамадзкага пласта, які вызначаў попыт на друкаванае слова, да канца XIX ст. кніжка на сучаснай беларускай мове была надзвычай рэдкаю зьявай. Паводле зьвестак Дзяржаўнай бібліятэкі БССР (цяпер Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі), на працягу XIX ст. на гэтай мове агулам было выдадзена 38 кніжак[11].

Пры гэтым варта заўважыць, што каля паловы гэтай лічбы станавілі кніжкі, якія звонку (паводле назвы) выглядалі як польскія ці расейскія, але іх зьмест часткова, радзей цалкам, быў надрукаваны на беларускай мове[12].

Пэўнае ажыўленьне выдавецкай дзейнасьці наступіла адно на пачатку XX ст., галоўным чынам з ініцыятывы дзеячоў узьнікаючага беларускага нацыянальнага руху[13].

Паводле падлікаў С.Х. Александровіча, у 1901—1917 гг. выйшла 245 выданьняў, у тым ліку 14 календароў[14], а паводле зьвестак Дзяржаўнай бібліятэкі БССР у наступных 1918—1920 гг. было выдадзена 155 кніжак, у тым ліку 6 календароў і 3 мапы[15].

Такім чынам, за дваццацігодзьдзе 1901—1920 агулам, калі не лічыць календароў і мапаў, было выдадзена 377 беларускіх кніжак, г.зн. у сярэднім 19 выданьняў за год. Сярэднегадавы паказьнік выдавецкай дзейнасьці ў 1921—1939 гг. на тэрыторыі Польшчы складаў 24 кніжкі, то бок быў вышэйшы, чымся ў папярэднім дваццацігодзьдзі. Параўноўваючы гэтыя зьвесткі, трэба мець на ўвазе тое, што кніжкі, выдадзеныя да 1920 г., у прынцыпе прызначаліся для чытачоў з усёй Беларусі, тады як у міжваенную пару — толькі для насельніцтва яе заходняй часткі, якая апынулася ў межах II Рэчы Паспалітай, у зьвязку з чым рэальнае адрозьненьне абодвух паказьнікаў было яшчэ большым.

Такім чынам, можна канстатаваць пэўны прагрэс у гэтай галіне, аднак ён быў малазначны. Галоўнай прычынай гэтага былі як сьціплыя фінансавыя магчымасьці выдаўцоў, так і слабая запатрабаванасьць кнігі чытачамі. Зьмяніць гэтую сытуацыю магла спрыяльная культурная палітыка дзяржавы, якая б палягала ў спансаваньні выдаўцоў і ўзьдзеяньні на разьвіцьцё грамадзкага попыту на кніжку. Значэньне гэтага чыньніка ілюструюць вынікі выдавецкай дзейнасьці ў Беларускай ССР, у якой, нягледзячы на зьменлівыя ідэалягічныя ўмовы, а ў трыццатых гадох і русіфікацыйныя тэндэнцыі, у параўнальны пэрыяд 1921—1939 агулам было выдадзена 10 573 назвы на беларускай мове[16].

Такім чынам, паказьнік выдавецкай прадукцыі ў БССР (556 назваў штогод) быў, пры ня надта адрознай колькасьці насельніцтва, у 23 разы вышэйшы, чым у Заходняй Беларусі.

---

[11] Кніга Беларусі 1517—1917. Зводны каталог. Мінск, 1986. С. 196.

[12] Да беларускіх кніжак залічаныя ў ліку іншых: Czeczot Jan. Piosnki wieśniacze znad Niemna i Dźwiny. Wilno, 1844 і 1846, у якіх беларускія песьні ў арыгінале займаюць частку тэксту; альбо опэра Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча "Sielanka", хоць у ёй толькі адна асоба гаворыць па-беларуску, астатнія — па-польску.

[13] Гл. артыкул "З гісторыі беларускага выдавецкага руху ў 1902—1905 гадох"; а таксама "Дзейнасьць беларускага выдавецтва "Загляне сонца і ў наша аконца" ў Пецярбургу".

[14] Александровіч С.Х. Пуцявіны роднага слова. Мінск, 1971. С. 163.

[15] Летапіс беларускага друку. Ч. III. 1917—1924. Менск, 1927. С. VIII, 4—20.

[16] Друк Беларускай ССР 1918—1980. Статыстычны зборнік. Мінск, 1983.

Выдавецкая панарама

Падставай для вызначэньня выдаўца кніжкі, як правіла, служыла адпаведная інфармацыя, разьмешчаная на яе тытульнай старонцы. Аднак цягам пошукаў трапілася каля 50 кніжак, на якіх выдавец не падаваўся. У колькіх дзесятках выпадкаў нястачу гэтай інфармацыі ўдалося запоўніць, выкарыстоўваючы ўскосныя крыніцы, галоўным чынам, інфармацыю з прэсы. Згодна з гэтымі падлікамі, выданьнем беларускіх кніжак у 1921—1939 гг. займаліся 96 выдаўцоў, у тым ліку 44 арганізацыі і ўстановы (выдавецкія, грамадзка–палітычныя, рэлігійныя і іншыя), 21 рэдакцыя пэрыёдыкаў і 31 прыватная асоба (у тым ліку 16 аўтараў). Агулам яны выдалі 428 кніжак, г.зн. 92% усіх выданьняў, пералічаных у далучаным каталёгу.

Як паказана ў табліцы 1, выдавецкая дзейнасьць паасобных выдаўцоў была вельмі адрознай. 47 выдаўцоў за гэты шматгадовы пэрыяд выдалі ўсяго па адной кніжцы і толькі сем выдаўцоў — больш за дзесяць. Да гэтых апошніх належалі: Беларускае Выдавецкае Таварыства, Віленскае Выдавецтва Барыса Клецкіна, Выдавецтва Уладзіслава Знамяроўскага, Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры, а таксама рэдакцыі хадэцкіх пэрыёдыкаў "Chryścjanskaja Dumka" і "Biełaruskaja Krynica"[17]. Ян Станкевіч публікаваў кніжкі пад шыльдай Беларускай Сялянскай Партыі, яе друкаванага органа "Народ" і індывідуальна.

Неаднароднасьць заходнебеларускай выдавецкай панарамы абумоўлівалі ідэалягічныя чыньнікі, якія з рознай сілай праяўлялі сябе ў міжваенную пару. У першыя паваенныя гады беларускі рух у Польскай Рэспубліцы хоць і ня быў аднастайным з ідэйнага гледзішча, аднак не выяўляў такой падзеленасьці, да якой у 1925/26 г. прывяло ўзьнікненьне і дзейнасьць Беларускай Сялянска–Работніцкай Грамады. У Вільні дзейнічаў Беларускі Нацыянальны Камітэт, які да ўзьнікненьня Грамады прызнаваўся ўсімі значнымі грамадзка–палітычнымі групоўкамі агульнанацыянальным прадстаўніцтвам беларусаў у польскай дзяржаве. Увосень 1922 г. — дзякуючы пасьпяховаму выніку выбараў — у сойм і сэнат трапілі 14 прадстаўнікоў беларускага народу[18], якія стварылі супольны парлямэнцкі клюб. Шмат беларускіх дзеячоў разьлічвалі на фармаваньне пазытыўнага modus vivendi ўва ўмовах польскай дзяржаўнасьці, таму жывыя былі палянафільскія тэндэнцыі[19].

У гэты час на выдавецкім полі важнае месца займаў Антон Луцкевіч — здольны публіцыст, шматгадовы палітычны дзяяч, з 1921 г. кіраўнік Беларускага Нацыянальнага Камітэту і выкладчык літаратуры ў Віленскай беларускай гімназіі. Ён кіраваў не толькі Беларускім Выдавецкім Таварыствам, але таксама і заснаванай ім Беларускай Школьнай Радай, масавай грамадзкай арганізацыяй — Таварыствам Беларускай Школы, а з 1923 г. таксама і Беларускім Навуковым Таварыствам[20].

---

[17] "Biełaruskuju Krynicu" ("Biełaruskaja Krynica"; да 1925 г. і з 17.11.1939 г. "Krynica") больш правільна называць тыднёвікам або газэтаю. — *А.С.*

[18] Больш карэктна было б пісаць пра паслоў і сэнатараў, кандыдатуры якіх вылучаў Беларускі Цэнтральны Выбарны Камітэт, бо частка беларускага насельніцтва галасавала і за сьпісы польскіх партый (у прыватнасьці, ад Сялянскай партыі "Вызваленьне" былі абраныя пяць беларусаў). — *А.С.*

[19] Станкевіч А. Беларускі хрысьціянскі рух. Вільня, 1939. С. 169—170; Найдзюк Я. Беларусь учора і сяньня. Менск, 1944. С. 190—195. — *Ю.Т.*

Пасьля перавыданьня ў 1993 г. гэтая кніга мела такі назоў: Найдзюк Язэп, Касяк Іван. Беларусь учора і сяньня. Папулярны нарыс гісторыі Беларусі. Праца Я. Найдзюка "Беларусь учора і сяньня", выдадзеная першы раз у 1943 г. у Менску, уключаная ў яе як першая частка пад назовам "Ад старажытных часоў да другой сусьветнай вайны". — *А.С.*

[20] Сидоревич А. Антон Луцкевич // Нёман. 1990. № 7. — *Ю.Т.*

Як старшыня Беларускага Навуковага Таварыства Антон Луцкевіч фігуруе з 1921 г. (гл.: Гадавік Беларускага Навуковага Таварыства. Кн. І. Вільня 1933. С. 10). — *А.С.*

Табліца 1. Колькасьць кніжак на беларускай мове паводле выдаўцоў (1921—1939)

І. Арганізацыі і ўстановы

Беларускае Выдавецкае Таварыства	51
Віленскае Выдавецтва Б. Клецкіна	32
Выдавецтва У. Знамяроўскага	21
Выданьні Яна Станкевіча	16
Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры	15
Мэтадысты (Місія ў Варшаве і інш.)	10
Беларускае Навуковае Таварыства	10
Тэатральная Бібліятэчка Мікалая Шылы	10
Беларускае Каталіцкае Выдавецтва	8
Выдавецтва "Компас" у Лодзі	7
Рабоча-Сялянскі Пасольскі Клюб "Змаганьне"	6
Таварыства Беларускай Школы	6
Таварыства Беларускай Асьветы	6
Беларуская Народная Бібліятэка	5
Праваслаўная Мітраполія ў Варшаве	4
"Цэнтрасаюз"	4
Кнігарня "Пагоня"	4
Кнігарня Станіслава Станкевіча	4
Беларуская Школьная Рада	3
Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада	3
Камуністычная Партыя Польшчы	3
Рыма-каталіцкая архідыяцэзійная курыя ў Вільні	2
Беларускі Нацыянальны Камітэт	2
Беларуская Гімназія ў Вільні	2
Беларускі Студэнцкі Саюз	2
Таварыства Прыяцеляў Беларусаведы Ўнівэрсытэту Сьцяпана Батуры	2
Каапэратыўны саюз спажыўцоў у Вільні	2
Беларускі Музычна-Драматычны Гурток	2
Аб'яднаньне Беларускіх Жанчын ім. Цёткі	2
Польскія грамадзкія арганізацыі ў Наваградку	2
Беларускае Грамадзянскае Згуртаваньне	2
Беларуская Радыкальна-Сялянская Партыя	1
Беларускі Пасольскі Клюб	1
Беларускі Рэлігійна-Грамадзкі Саюз	1
Брытанскае і Замежнае Біблійнае Таварыства	1
Усходняя місія айцоў езуітаў у Альбярціне	1
Кляштар айцоў марыянаў у Друі	1
Кнігарня "Надзея" ў Вільні	1
Дзяржаўнае Выдавецтва Школьных Кніжак	1
Таварыства "Беларуская Хатка" ў Вільні	1
Таварыства "Асьвета на Віленшчыне"	1
Таварыства "Рунь" у Беластоку	1
Часовая Беларуская Рада	1
Краёвая Сувязь	1
Разам	**261**

II. Рэдакцыі пэрыядычных выданьняў

"Biełaruskaja Krynica"	38
"Chryścjanskaja Dumka"	33
"Белпрэс"	6
"Голас Беларуса"	6
"Калосьсе"	6
"Шлях Моладзі"	5
"Самапомач"	5
"Наша Думка"	3
"Новае Жыцьцё"	2
"Новы Шлях"	2
"Змаганьне"	2
"Беларускі Звон"	1
"Грамадзкі Голас"	1
"Наша Будучына"	1
"Родны Край"	1
"Саха"	1
"Сялянская Ніва"	1
"Студэнцкая Думка"	1
"Сын Беларуса"	1
"Воля Народу"	1
"Заранка"	1
Разам	**117**

III. Прыватныя асобы

Рыгор Шырма	6
кс. Станіслаў Глякоўскі і Язэп Найдзюк	5
Максім Гарэцкі	4
Фабіян Ярэміч	3
Сяргей Паўловіч	3
А. Яцына	2
А. Маркоўскі	2
Ігнат Мятла	2
А. Васіленя	2
Францішак Аляхновіч	1
Адам Більдзюкевіч	1
Янка Багдановіч	1
Харытановіч	1
С. Чыжэўскі	1
Язэп Гапановіч	1
М. Голуб–Бучынская	1
Антон Грыневіч	1
Мікалай Ільляшэвіч	1
Ніна Ільляшэвіч	1
Бутрым Каляда	1
Антон Луцкевіч	1
Язэп Малецкі	1

Пётар Мятла	1
Антон Неканда–Трэпка	1
Баляслаў Пачопка	1
кс. Ян Семашкевіч	1
Сяргей Сіняк	1
В. Труцько	1
Антон Васілеўскі	1
Людвіка Войцік	1
Разам	**50**
Агулам групы I, II, III	**428**

Кожная з гэтых арганізацыяў рыхтавала да друку школьныя падручнікі і іншыя кніжкі і выдавала іх пад сваёй эгідай, рашэньне аб чым прымаў Луцкевіч. Ён таксама вырашаў, выданьне якіх кніжак замаўляць выдавецтву Клецкіна, зь якім падтрымлівалася цесная супраца[21].

Усе названыя арганізацыі і выдавецтвы, а таксама некалькі рэдакцыяў часопісаў складалі свайго роду выдавецкі холдынг Луцкевіча. Пры ягонай арганізацыйнай і фінансавай падтрымцы ў 1921—1925 г. былі выдадзеныя каля 80 кніжак, г.зн. больш за 70% усёй выдавецкай прадукцыі той пяцігодкі. Адпаведна, сьціплай была пазыцыя астатніх выдаўцоў: за гэты час хадэцкая "Krynica" выдала толькі 6 кніжак, субсыдыяваныя адміністрацыйнымі ўладамі палянафільскія арганізацыі — 6 і мэтадысты — 4.

У 1925/26 г. на заходнебеларускай палітычнай сцэне адбыліся істотныя зьмены, якія адбіліся таксама і на выдавецкай дзейнасьці. Беларускія палянафілы страцілі надзею, што польскія ўлады вырашаць неўзабаве найважнейшыя эканамічныя і культурныя праблемы, якія турбавалі сялянства і інтэлігенцыю. Палітыка кожнага новага ўраду мела на мэце ўмацаваньне падзелу Беларусі і палянізацыю яе заходняй часткі, чаму служыла польскае вайсковае і цывільнае асадніцтва, ліквідацыя беларускай каапэрацыі, ператварэньне адносна шматлікіх у часе існаваньня Сярэдняй Літвы беларускіх школаў у польскія, падпарадкаваньне палянізацыйным мэтам Каталіцкай і Праваслаўнай Цэркваў ды іншае. У гэтай сытуацыі сярод беларускага насельніцтва і палітычных дзеячаў нарасталі апазыцыйныя настроі, якія эфэктыўна выкарыстоўвала камуністычная прапаганда.

У канцы чэрвеня 1925 г. колькі дэпутатаў выйшлі зь Беларускага Пасольскага Клюбу і ўтварылі асобны Пасольскі Клюб Беларускай Сялянска–Работніцкай Грамады. Неўзабаве, у жніўні таго ж году, у Гданьску адбылася канфэрэнцыя прадстаўнікоў гэтага клюбу зь дзеячамі камуністычных партыяў Савецкай Беларусі і Польшчы[22], на якой было вырашана стварыць на заходнебеларускіх землях Польшчы масавую радыкальную арганізацыю — Беларускую Сялянска–Работніцкую Грамаду, былі ўзгодненыя яе праграмныя палажэньні і арганізацыйная структура[23]. Арганізатарам Грамады была Камуністычная Партыя Заходняй Беларусі[24].

Радыкальныя лёзунгі БСРГ траплялі на ўдзячную грамадзкую глебу, таму новая арганізацыя лёгка здабыла масавую падтрымку і ў канцы 1926 г. нібыта налічвала больш за 100 тыс. чальцоў. Адначасна пад акампанэмэнт грубых публічных нападак грамадаўцаў на сваіх палітычных праціўнікаў, асабліва на хадэцкіх дзеячоў, якія кіраваліся нацыянальнай ідэалёгіяй, сярод беларускіх дзеячоў адбывалася палітычная дыфэрэнцыяцыя[25]. Гэта прывяло да заняпаду дагэтулешняга Беларускага Нацыянальнага Камітэту і дасягненьня кантролю грамадаўцамі над найбольшай грамадзкай арганізацыяй — Таварыствам Беларускай Школы і яго тэрытарыяльных структураў.

Растучаму ўплыву левых сілаў, якія падтрымліваў Луцкевіч, Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя супрацьпаставіла сваю праграму, якая базавалася на хрысьціянс-

---

[21] Дзейнасьць абодвух выдавецтваў была таксама скаардынаванай: пасьля заняпаду ў 1932 г. Беларускага Выдавецкага Таварыства выдавецтва Клецкіна ўжо не апублікавала ніводнай беларускай кніжкі. — *Ю.Т.*

Д–р. Арсень Ліс падае, што Беларускае Выдавецкае Таварыства спыніла сваю дзейнасьць у 1930 г. (гл.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 1. С. 352). — *А.С.*

[22] У канфэрэнцыі, што адбылася ў жніўні 1925 г. у Сопаце пад Гданьскам, бралі ўдзел прадстаўнікі кампартыі Польшчы, КПЗБ, КП(б)Б, беларускія паслы на сойм і грамадзка–культурныя дзеячы. — *А.С.*

[23] Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921—1939). Минск, 1966. С. 132.

[24] Арэхва М. Да пытання аб гісторыі Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі // Камуніст Беларусі. 1957. № 8.

[25] Хадэцкі бок таксама ня быў асабліва далікатны ў палеміцы; іншы раз выступы ў "Biełaruskaj Krynicy" нагадвалі даносы на сапраўдных і ўяўных камуністаў, мяжавалі з расізмам. — *А.С.*

кай і нацыянальнай ідэалёгіі. Відавочнай праявай насьпяваючага расколу быў выхад у 1926 г. з узначальванага Луцкевічам Беларускага Навуковага Таварыства хадэцкіх дзеячоў на чале зь іх лідэрам, ксяндзом Адамам Станкевічам[26].

Адначасна хадэцыя распачала стварэньне ўласнай грамадзкай і культурнай інфраструктуры. Увесну 1926 г. пры яе вызначальным удзеле была створаная новая палітычная партыя — Беларускі Сялянскі Саюз, а таксама Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры, якія, паводле задумы арганізатараў, меркавалася зрабіць процівагай для Грамады і Таварыства Беларускай Школы.

Важнай ініцыятывай БХД у выдавецкай галіне было заснаваньне ў сярэдзіне 1926 г. уласнай друкарні імя Францішка Скарыны — адзінай беларускай друкарні ў Вільні. Яе стваральнікамі былі ксяндзы Адам Станкевіч і Вінцэнт Гадлеўскі, пробашч кляштара айцоў марыянаў у Друі ксёндз Андрэй Цікота і віцэ–старшыня Беларускага Сялянскага Саюзу Фабіян Ярэміч. Друкарня дзейнічала на камэрцыйнай аснове, рэалізоўвала замовы розных беларускіх, польскіх і расейскіх арганізацыяў, аднак яе галоўнай задачай было абслугоўваньне выдаўцоў, зьвязаных з БХД[27].

Уласная друкарня забясьпечвала хадэцкім дзеячам значна лепшыя магчымасьці разьвіцьця выдавецкай дзейнасьці. Аднак з розных прычынаў яны не стварылі аднаго буйнога выдавецтва, аддаўшы перавагу дзейнасьці пад шыльдамі розных арганізацыяў, часопісаў і прыватных асоб. Такая форма дзейнасьці, напэўна, вынікала з страху перад магчымымі рэпрэсіямі з боку ўладаў, што пры функцыяваньні адной буйной фірмы магло б абцяжваць рэалізацыю выдавецкіх плянаў БХД. Фактычна гэтая дэканцэнтрацыя была ў вялікай ступені ўяўнай, бо дзейнасьць гэтых шматлікіх выдаўцоў пераважна натхнялася духоўным правадыром хадэцыі — ксяндзом Адамам Станкевічам.

У склад гэтай нефармальнай выдавецкай групы БХД уваходзілі наступныя выдаўцы (колькасьць апублікаваных імі кніжак паданая ў табліцы 1): Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры (1926—1936), Беларускае Каталіцкае Выдавецтва (1930—1939), кнігарня "Пагоня" (1927—1937), Беларускі Нацыянальны Камітэт (1930—1933), канвэнт айцоў марыянаў у Друі (1932), рэдакцыі часопісаў "Krynica", ад канца 1925 г. "Biełaruskaja Krynica" (1921—1937), "Chryścjanskaja Dumka" (1928—1939), "Шлях Моладзі" (1929—1939). Апроч таго, да гэтай групы можна залічыць хадэцкіх дзеячоў: ксяндзоў Станіслава Глякоўскага і Яна Семашкевіча, а таксама Язэпа Найдзюка, Язэпа Малецкага і Яна Багдановіча, якія агулам выдалі 8 кніжак.

Пералік беларускіх хадэцкіх выдаўцоў выпадае дапоўніць віленскай рыма–каталіцкай Архідыяцэзіяй, якая, дзякуючы беларускім ініцыятывам, прафінансавала выданьне дзьвюх ці трох пазыцыяў — у 1927 г. катэхізісу кс. Язэпа Рэшаця і ў 1939 г. Эвангельля ў перакладзе на беларускую мову кс. Вінцэнта Гадлеўскага[28].

Вынікам дзейнасьці хадэцкай выдавецкай групы ў міжваенную пару былі 134 кніжкі (ня ўлічваючы нэаўніяцкіх выданьняў), а іх удзел у сукупнай тагачаснай беларускамоўнай выдавецкай прадукцыі ў Польшчы дасягаў 30%. Такім чынам, гэтая група выйшла на вядучае месца на заходнебеларускай выдавецкай ніве. Гэтаму асабліва спрыялі творчы патэнцыял аўтараў і іх ідэйная пазыцыя, фінансавая падтрымка беларускага каталіцкага духавенства, наяўнасьць уласнай друкарні і кнігарні, а таксама сеткі гурткоў Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, якія займаліся распаўсюдам кніжак у рэгіёнах.

У дзейнасьці выдавецкай групы БХД існавала пэўная спэцыялізацыя. Кніжкі на каталіцкую рэлігійную тэматыку выдаваліся рэдакцыяй часопісу "Chryścjanskaja Dumka"

[26] Луцкевіч А. Пятнаццаць гадоў працы Беларускага Навуковага Таварыства // Гадавік Беларускага Навуковага Таварыства. Вільня, 1933. С. 13—14.

[27] Цыпрыяновіч С. Тамсама.

[28] Я не ўстанавіў выдаўца катэхізісу Язэпа Рэшаця "Асновы хрысьціянскай веры для беларускага народу" (Вільня, 1927), аднак не выключаю, што яго магла выдаць Віленская Архідыяцэзія.

і Беларускім Каталіцкім Выдавецтвам. Яны складалі прыблізна адну траціну ўсіх выдадзеных гэтай групай кніжак. Рэшта, якая ахоплівала розныя тэматычныя катэгорыі, прызначалася для ўсіх чытачоў, без увагі на іх рэлігійныя перакананьні. У адрозьненьне ад большасьці беларускіх выдавецтваў, кніжкі хадэцкай групы выходзілі як лацінскім, так і кірылічным альфабэтам, што было зроблена для таго, каб яны больш эфэктыўна траплялі ў рукі чытачоў каталіцкага і праваслаўнага веравызнаньня. Толькі каталіцкая рэлігійная літаратура пасьлядоўна выдавалася лацінскай графікай.

Выдавецкія дасягненьні БХД былі значна лепшымі, чымся яе палітычных праціўнікаў, якія друкавалі больш прэсу і ўлёткі, чымся кніжкі. У 1926 г. Грамада выдала толькі 3 кніжкі, а створаны пасьля яе разгрому ў 1927 г. Пасольскі Клюб "Змаганьне" — 6 кніжак, галоўным чынам працы Маркса, Энгельса, Пляханава і Сталіна. Не праяўляла лішняй актыўнасьці ў гэтай галіне нелегальная камуністычная партыя (КПП і КПЗБ), выдаўшы ў міжваенную пару ўсяго 3 кнігі на беларускай мове.

Разгром Грамады і страх перад зьняволеньнем прымусілі Луцкевіча адмовіцца ад дагэтулешняй супрацы зь левымі сіламі і перайсьці на згодніцкія з польскімі ўладамі пазыцыі[29]. Гэтае рашэньне адбілася на яго выдавецкай дзейнасьці. У траўні 1929 г. ён быў выдалены з Таварыства Беларускай Школы[30] і пазбаўлены сродкаў на кіраваньне дзейнасьцю Беларускага Выдавецкага Таварыства. Таму пасьля добрых вынікаў у 1927—1928 гг. выдавецкая дзейнасьць групы Луцкевіча пачала імкліва занепадаць. Апошняй яе праявай было выданьне ў 1933 г. у форме асобных брашур адбіткаў колькіх артыкулаў, зьмешчаных у спансараваным адукацыйнымі ўладамі Гадавіку Беларускага Навуковага Таварыства.

Наступную паводле колькасьці выданьняў групу выдаўцоў складалі беларускія арганізацыі, субсыдыяваныя адміністрацыйнымі ўладамі, якія з гэтай прычыны называлі палянафільскімі. Гэтае азначэньне часта не супадала з наміраньнямі ўладаў, якія ў дэкляраваных гэтымі арганізацыямі праўрадавых пазыцыях угледжвалі жаданьне атрымаць дзяржаўныя фінансавыя датацыі. Гэтыя меркаваньні найчасьцей не былі беспадстаўныя, і пасьля пачатковага нэгатыўнага досьведу ўлады спынялі фінансаваньне, што з прычыны браку значнай грамадзкай падтрымкі прыводзіла гэтыя арганізацыі да заняпаду. Таму іх жыцьцё найчасьцей было кароткае і абмяжоўвалася выданьнем адной–дзьвюх кніжак.

У дваццатых гадох да гэтай групы выдаўцоў належалі (колькасьць выдадзеных імі кніжак пададзеная ў табліцы 1): Беларуская Радыкальна–Народная Партыя, Беларускі

[29] Bergman A. Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej. Warszawa, 1984. S. 187—188. — *Ю.Т.*

Адзін зь мітаў, створаны апанэнтамі А. Луцкевіча ў 1919 г. і ўваскрошаны бальшавіцкім друкам і заходнебеларускімі правымі ў канцы 1920–х г. У 1931 г. быў нават распаўсюджаны камунікат, падпісаны няіснай прэсавай агенцыяй, быццам Луцкевіч "рашуча выказаўся на карысьць палянафільскага курсу". У адказ ён напісаў: "У сучасных варунках, калі на беларускае школьніцтва ў польскім гаспадарстве сыплюцца балючыя ўдары, калі беларуская праца наагул сустракаецца з чысьленымі перашкодамі з боку адміністрацыйных уладаў, — падобнае [палянафільскае] выступленьне, якое прыпісывае мне таямнічы камунікат, сьведчыла б ня толькі аб адсутнасьці ў мяне пачуцьця асабістае і нацыянальнае годнасьці, але такжа і аб поўным заніку палітычнага змыслу" (Беларускі Звон. 1931. 5 кастрычніка; Przegląd Wileński. 1931. № 17). Луцкевіча звольнілі з працы ў Віленскай беларускай гімназіі, ён мусіў з двума сынамі перабрацца ў аднапакаёвую кватэру. Пазьней Я. Станкевіч сьведчыў: "Прыблізна ад 1933 да 1939 г. А. Луцкевіч проста галадаў, але ня йшоў на ніякія кампрамісы із сваім нацыянальным сумленьнем. Не было б гэтага, калі б ён быў палянафіл" (Бацькаўшчына. 1958. № 19). І ў другім артыкуле: у 1933—1939 гг. А. Луцкевіч "даслоўна галадаваў" (Бацькаўшчына. 1958. № 35). — *А.С.*

[30] Выключэньне А. Луцкевіча з ТБШ было выклікана яго палітычнымі паводзінамі: ён асуджаў палітыку згортваньня "беларусізацыі" і новай эканамічнай палітыкі ў БССР, а таксама выступаў супраць таго, што КПЗБ і беларускія паслы з клюбу "Змаганьне" ператваралі ТБШ з культурніцкай у палітычную арганізацыю. — *А.С.*

Музычна–Драматычны Гурток, Беларускае Грамадзянскае Згуртаваньне, Часовая Беларуская Рада, Таварыства "Беларуская Хатка", Таварыства "Асьвета на Віленшчыне", Краёвая Сувязь ды рэдакцыі газэт "Беларускі Звон" і "Грамадзкі Голас".

У выніку заміраньня яўнай дзейнасьці левых арганізацыяў і самастойнай пазыцыі хадэцыі ў канцы дваццатых гадоў польскія ўлады зрабілі чарговую спробу скіраваць беларускі рух на згодніцкія пазыцыі. Такую надзею абуджала пазыцыя колькіх вядучых дзеячоў Грамады: Радаслава Астроўскага, Антона Луцкевіча[31] і Фабіяна Акінчыца, якія пасьля яе ліквідацыі згадзіліся супрацоўнічаць з польскімі ўладамі. У верасьні 1930 г. яны стварылі Цэнтральны Саюз Беларускіх Культурных і Гаспадарчых Арганізацыяў (т.зв. Цэнтрасаюз), які, паводле задумы яго стваральнікаў, меў быць чарговым "холдынгам", у якім гуртаваліся б створаныя зь цягам часу канкурэнтныя хадэцкім арганізацыі, такія як Таварыства Беларускай Асьветы, Таварыства Беларускіх Жанчын, студэнцкая карпарацыя "Скарынія" і іншыя.

Група Астроўскага дзейнічала ў 1930—1934 гг. пры фінансавай падтрымцы адміністрацыйных уладаў, аднак не разгарнула, апроч часопісаў, спаважнейшай выдавецкай дзейнасьці. У вялікай меры на гэта паўплывалі канфлікты ў кіраўніцтве групы, у тым ліку на фінансавай глебе, у выніку якіх з "Цэнтрасаюзу" выйшлі ці былі выдаленыя Фабіян Акінчыц, Антон Луцкевіч, Ян Станкевіч і іншыя асобы зь вялікім досьведам выдавецкай працы[32].

Таму ў рамках заплянаванай "Сельскагаспадарчай Бібліятэчкі" "Цэнтрасаюзу" выйшла ўсяго адна кніжка (Бусел С. Матыльковыя расьліны. 1932), апроч таго, былі выдадзеныя тры брашуры А. Русаковіча з крытыкай сацыяльнай і эканамічнай палітыкі ў Савецкай Беларусі і пад шыльдай Таварыства Беларускай Асьветы — шэсьць кніжак.

Да выдавецтваў, фінансаваных уладамі, трэба залічыць таксама сэрыю "Беларуская Народная Бібліятэка", у рамках якой у 1932—1934 гг. у перакладзе на беларускую мову выйшлі пяць брашураў польскіх аўтараў (А. Баброўскага, С. Баркоўскага, К. Навіцкага і Я. Альхоўскага), якія прапагандавалі эканамічную палітыку ўраду і крытыкавалі становішча ў БССР. Агулам палянафільскія выдавецтвы ўзбагацілі кніжны рынак 28 назвамі, доля якіх у агульнай выдавецкай прадукцыі міжваеннай пары склала 6%.

У тагачасных варунках беларускага палітычнага жыцьця было нямала выдаўцоў, якія з розных прычынаў адмаўляліся супрацоўнічаць з хадэцыяй, левымі ці палянафільскімі арганізацыямі. Таму яны праводзілі самастойную, незалежную ад варагуючых груповак выдавецкую дзейнасьць, якая, аднак, з прычыны сьціплых фінансавых магчымасьцяў давала слабы эфэкт. Спаміж іх адносна добрыя вынікі паказаў Ян Станкевіч — мовазнаўца, гісторык і незалежны палітык, які пад шыльдай сваёй эфэмэрнай Беларускай Сялянскай Партыі і яе друкаванага органа "Народ", а таксама індывідуальна выдаў 16 назваў, у тым ліку колькі ўласных філялягічных працаў. Заўважную ролю адыграў таксама Мікола Шыла, былы эсэраўскі дзяяч, які ў 1935—1937 гг. падрыхтаваў да друку і выдаў у рамках "Тэатральнай Бібліятэчкі" 10 п'ес для аматарскіх тэатральных калектываў.

У міжваенную пару ў Польшчы існавала колькі ўстановаў, ня зьвязаных беспасярэдне зь беларускім рухам, якія, рэалізуючы ўласныя мэты, займаліся выданьнем літаратуры на беларускай мове. Сярод іх заслугоўваюць увагі: Місія Мэтадыстаў у Варшаве, выдавецтва баптыстаў "Компас" у Лодзі, Праваслаўная Мітраполія ў Варшаве, асяродак айцоў езуітаў у Альбярціне, а таксама ўніяцкі Беларускі Рэлігійна–Грамадзкі Саюз. Варта таксама адзначыць Таварыства Прыяцеляў Беларусаведы, якое дзейнічала пры Унівэрсытэце Сьцяпана Батуры ў Вільні, Дзяржаўнае Выдавецтва Школьных Кніжак у Львове, а таксама польскія грамадзкія арганізацыі ў Наваградку.

[31] А. Луцкевіч ня быў сябрам Грамады, як і пазьней не ўваходзіў у кіраўніцтва Цэнтрасаюзу. — А.С.
[32] Станкевіч А. Тамсама. С. 199—200.

Тэматычная структура

Тэматычную структуру кніжак, выдадзеных у паасобныя гады міжваеннай пары, ілюструе табліца 2. У ёй прыняты падзел на сем тэматычных групаў, пазначаных лічбамі наступным чынам:

I. школьныя падручнікі і пэдагагічная літаратура (без падручнікаў для рэлігійнага навучаньня);
II. рэпэртуарная літаратура і сьпеўнікі;
III. мастацкая літаратура;
IV. рэлігійная літаратура, улучна з падручнікамі для навучаньня рэлігіі;
V. грамадзка-палітычная літаратура;
VI. мовазнаўства, літаратуразнаўства, асьвета і культура;
VII. астатняя літаратура.

Група I: школьныя падручнікі і пэдагагічная літаратура. Як паказана ў табліцы 2, выданьне школьных падручнікаў і пэдагагічнай літаратуры ў паасобных гадох міжваеннай пары істотна адрозьнівалася, што адлюстроўвала зьменлівую сытуацыю беларускага школьніцтва як найбольшага спажыўца гэтай літаратуры.

У 1921 г. на заходнебеларускіх землях улучна зь Сярэдняй Літвой працавала каля 300 беларускіх пачатковых і сярэдніх школаў[33].

Забесьпячэньнем гэтых школаў займаўся створаны ў рамках Часовай Урадавай Камісіі Сярэдняй Літвы аддзел беларускіх школаў на чале з Браніславам Тарашкевічам. У тым

Табліца 2. Кнігавыданьне паводле тэматычных групаў

Гады	Агулам	I	II	III	IV	V	VI	VII
1921	34	11	5	2	2	3	4	7
1922	15	5	5	2	1	2	–	–
1923	25	7	3	9	–	3	1	2
1924	26	7	4	4	–	2	4	5
1925	13	3	2	–	4	2	1	1
1926	30	3	5	5	6	6	1	4
1927	47	5	15	15	7	1	1	3
1928	45	–	8	17	7	4	3	6
1929	40	7	5	11	5	7	3	2
1930	20	2	1	8	5	3	1	–
1931	20	3	1	6	2	6	1	1
1932	22	2	1	3	5	6	1	4
1933	26	–	4	4	4	9	5	–
1934	13	–	1	6	4	2	–	–
1935	21	–	3	6	5	2	1	4
1936	18	2	4	3	3	2	3	1
1937	26	1	9	5	2	2	2	5
1938	13	–	2	1	4	2	1	3
1939	12	–	–	2	3	2	1	4
1921—1939	466	58	78	109	69	66	34	52

[33] Mauersberg S. Szkolnictwo powszechne dla mniejszości narodowych w Polsce w latach 1918—1939. Wrocław—Warszawa—Kraków, 1968. S. 106.

самым годзе была выдадзеная арытмэтычная тэрміналёгія для настаўнікаў, а таксама 10 падручнікаў для вывучэньня беларускай мовы і літаратуры, матэматыкі, агульнай гісторыі ды гісторыі і геаграфіі Беларусі (гл. Дадатак). Рэцэнзаваныя Беларускай Школьнай Радай падручнікі выдаваліся некалькімі выдавецтвамі. Можна дапусьціць, што пэўную частку выдавецкіх выдаткаў пакрывалі ўлады Сярэдняй Літвы.

Аднак ужо ў 1922 г., пасьля інкарпарацыі Сярэдняй Літвы ў Польшчу, адбылася істотная зьмена дзяржаўнай палітыкі да беларускага школьніцтва. Гэтыя школы пераўтвараліся ў польска–беларускія (дзьвюхмоўныя) і школы з польскай мовай выкладаньня, у якіх прадугледжвалася магчымасьць вывучэньня беларускай мовы як аднаго з прадметаў.

Паводле дасьледніка гісторыі школьніцтва нацыянальных меншасьцяў Станіслава Маўэрсбэрга, трыццатыя гады былі апошнім этапам існаваньня беларускага школьніцтва ў міжваеннай Польшчы. У 1937/38 навучальным годзе школаў зь беларускай мовай навучаньня не было ўжо ўвогуле, а дзьвюхмоўных заставалася 5. У 44 пачатковых школах з польскай мовай навучаньня 8,2 тыс. вучняў яшчэ вывучалі беларускую мову як прадмет[34].

Ліквідацыйныя тэндэнцыі ахоплівалі таксама сярэдняе школьніцтва. У 1922 г. была закрытая прыватная беларуская гімназія ў Барунах, у 1928 г. — у Радашкавічах, у 1931 г. — у Клецку, у 1932 г. — дзяржаўная дзьвюхмоўная настаўніцкая сэмінарыя ў Вільні і ў 1934 г. — прыватная гімназія ў Наваградку[35]. У Вільні беларуская гімназія існавала да 1932 г., калі яе ператварылі ў філію польскай дзяржаўнай гімназіі імя Юльюша Славацкага[36].

У выніку палітыкі адукацыйных уладаў патрэба школаў у беларускіх падручніках паступова зьмяншалася і ў трыццатых гадох у пачатковым школьніцтве абмяжоўвалася галоўным чынам вывучэньнем беларускай мовы. У прыватных гімназіях, праўда, на гэтай мове выкладаліся і іншыя прадметы, аднак, як было згадана, іх дзейнасьць была кароткачасовай.

Агулам у 1921—1939 гг. у Польшчы было выдадзена 52 беларускамоўныя школьныя падручнікі, у тым ліку 27 для вывучэньня беларускай мовы і гісторыі літаратуры (21 — гэта перавыданьне выдадзеных да 1921 г. падручнікаў і 6 новых, распрацаваных у міжваенную пару). Гэта былі:

Астроўскі Р. Беларускі правапіс. 1925; перавыданьне ў 1930;
Дварчанін І. Хрэстаматыя новай беларускай літаратуры. 1927;
Гарэцкая Л. Родны край (чытанка). 8 перавыданьняў у 1921—1931 гг.;
Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. Перавыданьні ў 1921 і 1924 гг.;
Гарэцкі М. Хрэстаматыя беларускае літаратуры. 1923;
Любіч–Маеўскі С. Першы прамень (лемантар). 1929;
Паўловіч С. Пішы самадзейна. 1929;
Смоліч А. Зорка (лемантар). 6 перавыданьняў у 1921—1930 гг.;
Станкевіч Я. Беларуская правапісь. 1921;
Станкевіч Я. Новы лемантар. Перавыданьне ў 1931;
Тарашкевіч Б. Беларуская граматыка. Перавыданьні ў 1922, 1929, 1931 гг.

Для навучаньня іншых прадметаў былі выдадзеныя 25 падручнікаў, у тым ліку матэматыкі (арытмэтыкі, альгебры, геамэтрыі) — 9, фізыкі — 4, агульнай гісторыі — 3, гісторыі Беларусі — 2, геаграфіі Беларусі — 2, прыроды — 2, сьпеваў — 2 і псыхалёгіі — 1. У гэтай групе былі выдадзеныя 10 новых падручнікаў, распрацаваных у міжваен-

[34] Тамсама. С. 113.

[35] На рахунку польскіх уладаў было таксама закрыцьцё беларускіх гімназіяў у Будславе, Горадні, Гарадку Вялейскага павету. — *А.С.*

[36] Тамсама. С. 106, 110—112; Gomółka K. Тамсама. С. 107.

ную пару А. Некандам–Трэпкам (геамэтрыя, фізыка), Р. Астроўскім (арытмэтыка, касмаграфія), А. Грыневічам (сьпевы), М. Ільляшэвічам (псыхалёгія) і С. Рак–Міхайлоўскім (арытмэтыка). Рэшту станавілі пераклады (9), галоўным чынам з расейскай мовы, і перавыданьні падручнікаў, выдадзеных да 1921 г. (6). Амаль усе падручнікі гэтай групы былі выдадзеныя ў дваццатых гадох.

Апроч школьных падручнікаў у 1936—1937 гг. выйшлі два лемантары С. Паўловіча, прызначаныя для навучаньня беларускай мовы ўдома. Гэта былі "Першыя зярняткі" (кірыліцай) і "Zasieŭki" (лацінкай). Апошняе выданьне было канфіскаванае віленскімі адміністрацыйнымі ўладамі[37].

Надзвычай сьціпла была прадстаўленая мэтадычная літаратура для настаўнікаў. У разгляданую пару былі выдадзеныя толькі 4 назвы:

Арытмэтычная тэрміналёгія. 1921;

Луцкевіч А. Як вучыць у новай школе. 1923;

Астроўскі Р. Арытмэтычны задачнік. 1929;

Паўловіч С. Мэтадычныя ўвагі да пасобніка Пішы самадзейна. 1929.

У суме ў групе падручнікаў і пэдагагічнай літаратуры было выдадзена 58 назваў, што складала каля 13% усёй беларускамоўнай выдавецкай прадукцыі міжваеннай пары. Найбольшую іх колькасьць выдалі Беларускае Выдавецкае Таварыства (23 назвы), Выдавецтва Б. Клецкіна (13), Беларуская Школьная Рада (3) і Беларускае Навуковае Таварыства (3). Выданьне некалькіх падручнікаў прафінансавалі іх аўтары.

Школьныя падручнікі і мэтадычная літаратура выдаваліся, як правіла, кірылічным альфабэтам. Зь цягам часу, аднак, падручнікі для пачатковых школаў пачалі зьяўляцца таксама і лацінкай. Першым зь іх Дзяржаўным Выдавецтвам Школьных Кніжак у Львове ў 1929 г. быў выдадзены лемантар С. Любіч–Маеўскага "Першы прамень", зьяўленьне якога выклікала вострую крытыку беларускіх пэдагогаў і дзеячоў[38].

Неўзабаве, аднак, да выданьня падручнікаў лацінкай прыступілі таксама беларускія выдаўцы. У 1931 г. Беларускае Выдавецкае Таварыства выдала лацінкай чытанку Л. Гарэцкай "Rodny kraj", граматыку Б. Тарашкевіча і "Nowy lementar" Я. Станкевіча. У 1936 г. лацінкай выйшла чарговае выданьне чытанкі Л. Гарэцкай, а ў 1937 г. буквар С. Паўловіча "Zasieŭki".

Група II: рэпэртуарная літаратура і сьпеўнікі. З прычыны абмежаванай магчымасьці фармаваньня нацыянальнай сьвядомасьці праз школу беларускія арганізацыі імкнуліся да разгортваньня культурна–асьветнай працы сярод моладзі і дарослых у сваіх рэгіянальных суполках. Найбольшую ролю ў гэтым абсягу адыгрывала Таварыства Беларускай Школы (1921—1936), якое дзейнічала пад уплывам левых сілаў, а таксама зьвязаны з хадэцыяй Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры (1926—1936). Кароткачасовую актыўнасьць выявіла таксама Таварыства Беларускай Асьветы (1933—1935) і некаторыя іншыя палянафільскія арганізацыі.

Хоць гэтыя арганізацыі і канкуравалі міжсобку ў ідэалягічнай плашчыні, практычная дзейнасьць іх рэгіянальных суполак была пераважна падобнай. Яна складалася галоўным чынам з прапагандаваньня беларускай школы, барацьбы зь непісьменнасьцю, арганізацыі народных дамоў, бібліятэк, чытаньняў, распаўсюду кніжак і прэсы ды падтрымкі дзейнасьці аматарскіх мастацкіх калектываў.

Паводле Севярына Віславуха, у 1928 г. — найбольш плённым годзе сваёй дзейнасьці — Таварыства Беларускай Школы мела 9 акруговых управаў (Беласток, Глыбокае, Горадня, Косава, Ліда, Мір, Наваградак, Слонім, Вялейка), якім падпарадкоўваліся 385

[37] Шлях Моладзі. 1937. № 6/105.

[38] Гл. рэцэнзію Я. Станкевіча // Народ. 1929. № 4; Sulima. Skandaliczny elementarz // Przegląd Wileński. 1929. № 18—19; Паляшук (Паўловіч С.). Некалькі ўваг аб "беларускім" "Лемантары" Ст. Любіч–Маеўскага. Вільня, 1929.

асяродкаў на тэрыторыі 23 паветаў. У той самы час Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры меў 16 сваіх асяродкаў у 7 паветах[39]. У сваю чаргу, паводле беларускіх аўтараў, у 1928 г. дзейнічала каля 500 асяродкаў ТБШ, а колькасьць асяродкаў БІГіК у 1934—1935 перасягала 80[40].

Не паглыбляючыся ў падрабязныя падлікі, можна прыняць, што ў канцы дваццатых гадоў у паўночна–ўсходніх ваяводзтвах Польшчы дзеяла колькі соцень гэткіх суполак. Аднак яны былі зьліквідаваныя адміністрацыйнымі ўладамі пад рознымі прэтэкстамі.

Імкнучыся задаволіць патрэбы аматарскіх мастацкіх калектываў, якія дзейнічалі ў рамках гэтых суполак, віленскія арганізацыі ў міжваенную пару выдалі 78 назваў рэпэртуарнай літаратуры, у тым ліку 66 п'есаў і т.зв. дэкляматараў (збораў тэкстаў для дэклямацыі) ды 12 сьпеўнікаў. Каля паловы выдадзеных п'есаў (31 пазыцыя) складалі апублікаваныя ўпершыню арыгінальныя творы заходнебеларускіх аўтараў, перадусім Францішка Аляхновіча, Леапольда Родзевіча, Янкі Быліны (кс. Яна Семашкевіча), Язэпа Рушчанца (кс. Язэпа Рэшаця), Казімера Сваяка (кс. Канстанціна Стаповіча), Міхася Машары.

Больш за дзясятак рэпэртуарных пазыцыяў складалі перавыданьні твораў пачатку XX ст., якія ня страцілі актуальнасьці. Сярод іх пераважалі п'есы беларускіх аўтараў — Янкі Купалы, Якуба Коласа, Язэпа Лёсіка ды іншых. Былі выдадзеныя таксама дзьве п'есы Элізы Ажэшкі і дзьве п'есы ўкраінскага аўтара Марка Крапіўніцкага.

Значнае месца ў гэтай тэматычнай групе займалі апублікаваныя ўпершыню пераклады альбо пераробкі п'есаў расейскіх ды ўкраінскіх аўтараў і адной літоўскай п'есы. Каля 10 гэтых п'есаў у 1935—1937 гг. апрацаваў і выдаў Мікола Шыла (пад псэўданімам М. Шчасны ці крыптанімам М.Ш.) у рамках сваёй Тэатральнай Бібліятэчкі. Аднак гэта былі не звычайныя пераклады, але істотныя пераробкі іншамоўных тэкстаў, якія рабіліся для лепшага іх успрыманьня беларускай публікай.

Выдаўцы рэпэртуарнай літаратуры аддавалі перавагу найперш сацыяльнай тэматыцы, блізкай і зразумелай жыхарам заходнебеларускіх вёсак і мястэчак. Значная частка выдадзеных п'ес на сямейную ці вострасюжэтную праблематыку, тады як творы на гістарычную тэматыку, а таксама прысьвечаныя спэцыфічным праблемам беларускай нацыянальнай сьвядомасьці, адыгрывалі маргінальную ролю. У гэтай апошняй групе заслугоўваюць увагі выдадзеныя ў 1931 і 1933 г. п'есы Язэпа Рушчанца "Першыя ластаўкі" і "Зорка–ідэя"[41].

Абмежаваная папулярызацыя нацыянальнай ідэі не вынікала, аднак, з такой пазыцыі выдаўцоў, але галоўным чынам адлюстроўвала нэгатыўнае стаўленьне мясцовай адміністрацыі да гэтай праблематыкі. Пра гэта сьведчыць, напрыклад, лёс п'есы Браславіча з пары дзейнасьці Грамады "І нас разбудзілі" (1927), канфіскаванай віленскім старастрвам.

Спаміж 12 сьпеўнікаў бальшыню складалі невялікія брашуры, якія ўтрымлівалі тэксты папулярных беларускіх песьняў бяз нот; імі карысталіся аматарскія калектывы і індывідуальныя выканаўцы. Тым часам важнае навуковае значэньне мелі прафэсійна апрацаваныя і выдадзеныя ў 1929 і 1938 г. музыколягам Рыгорам Шырмам зборнікі беларускіх народных песьняў, а таксама сьпеўнікі Альбіна Стаповіча (1935) і Антона Грыневіча (1928).

Група III: мастацкая літаратура. У гэтай тэматычнай групе ў міжваенную пару выйшла 109 пазыцыяў, што паказвае, што доля мастацкай літаратуры была найбольшая (23%) ува ўсёй выдавецкай прадукцыі таго часу. Як паказана ў табліцы 2, выданьне гэтай літаратуры ў паасобныя гады значна вагалася: найбольш (ад 11 да 17 пазыцы-

[39] Wysłouch S. Białorusini na Ziemi Wileńskiej // Wilno i Ziemia Wileńska. T. I. Wilno, 1930. S. 250.
[40] Беларусь. Энцыклапедычны Даведнік. Мінск, 1995. С. 100 і 698.
[41] Трачук Ю. "Першыя ластаўкі" Язэпа Рушчанца // Ніва. 1992. 15 і 29 сакавіка.

яў штогод) выдавалася ў 1927—1929 гг., аднак пераважна штогод выходзіла колькі пазыцыяў, часам толькі па 1—2 кніжкі, а ў 1925 не зьявілася ніводнай.

Бальшыню (60 назваў) выдадзеных у гэты час твораў мастацкай літаратуры складалі неапублікаваныя дагэтуль арыгінальныя выданьні. За выняткам дзьвюх пазыцыяў аўтараў з Савецкай Беларусі (Я. Коласа "У палескай глушы" (1923) і У. Дубоўкі "Строма" (1923)), першыя выданьні якіх выйшлі ў Вільні, усе новыя назвы з гэтай групы былі творамі заходнебеларускіх аўтараў. Я падаю іх у альфабэтным парадку прозьвішчаў ці псэўданімаў (крыптанімаў) аўтараў:

А. В., Адважны В., паэзія, проза,
"Як Ганулязьбіралася ў Аргентыну", 1930
"Адам і Анелька", 1931
"Канёк–Гарбунок", 1932
"Беларускія цымбалы", 1933
"Гануліны клопаты", 1935
"Казка аб рыбаку і рыбцы", 1935
"Хлапец", 1935
Арсеньнева Н., паэзія, "Пад сінім небам", 1927
Быліна Я., паэзія, "Na pokuci", 1934
Дзядзька Пранук, проза, "Стася", 1922
Дзяргач, проза, "Тыпы Палесься", 1924
Друцкі–Падбярэскі Б., проза,
"Пернік", 1927
"Байкі, гумар, сатыра", 1928
Васілеўскі Я., паэзія, "Скарб", 1927
Васілёк М., паэзія,
"Шум баравы", 1929
"Зь сялянскіх ніў", 1937
Грынкевіч С., проза,
"Арлянё", 1927
"Царква, Помста, Вязьніца", 1928
Грышкевіч Ф., паэзія, "Веснавыя мэлёдыі", 1927
Жылка У., паэзія,
"Уяўленьне", 1923
"На ростані", 1924
Задума П., проза, "Купальле", 1930
Івэрс А., паэзія, "Песьні на загонах", 1939
Ільляшэвіч Х., паэзія,
"Веснапесьні", 1929
"Зорным шляхам", 1932
"Захварбаваныя вершы", 1936
Ініцкі У., паэзія, проза,
"Сон Гаўрылы і розныя вершы", 1928
"Клім бабаю і іншыя жарты", 1929
"Апавяданьні", 1934
Казлоўшчык У., паэзія,
"Плач беларускай старонкі...", 1930
"Путы каханьня", 1932
"Шляхам змаганьня", 1935
Машара М., паэзія,

"Малюнкі", 1928
"Сьмерць Кастуся Каліноўскага", 1934
"На сонечны бераг", 1934
"Вясельле", 1934
"На прадвесьні", 1935
"Мамчына горка", 1936
"З пад стрэх саламяных", 1937
Нарцызаў Я., проза, "Пабрацімцы і вялікая шышка", 1923
Родзевіч Л., паэзія, "Беларусь", 1922
Сваяк К., паэзія, проза,
"Мая ліра", 1924
"Купальле", 1930
Станкевіч С., паэзія,
"Сьмех ня грэх", 1926
"З майго аконца", 1928
Танк М., паэзія,
"На этапах", 1936
"Журавінавы цьвет", 1937
"Нарач", 1937
"Пад маштай", 1938
Хмара С., паэзія, "Жураўлiным шляхам", 1939

Сьпіс індывідуальных твораў дапаўняе анталёгія заходнебеларускай мастацкай літаратуры "Рунь веснаходу" (1928) і колькі фальклёрыстычных зборнікаў, апрацаваных Янам Пачопкам (1927) і Янам Станкевічам (1937 і 1939).

Віленскія выдаўцы часта выкарыстоўвалі беларускую клясыку пачатку XX ст. на розную праблематыку. Агулам у міжваенную пару былі перавыдадзеныя 27 твораў мастацкай літаратуры, сярод якіх найбольшая перавага аддавалася аповесьцям і апавяданьням Якуба Коласа (Тараса Гушчы). У 1921—1933 гг. зьявілася 11 назваў гэтага аўтара, у тым ліку "Новая зямля" (двойчы ў 1928/1929 і 1931) і "Сымон Музыка" (1928), а таксама аповесьць "У глыбі Палесься" (1931).

Творы Францішка Багушэвіча перавыдаваліся пяць разоў, пры гэтым ягоная "Дудка беларуская" выдавалася чатыры разы (1921, 1927 і два выданьні ў 1930 г.). Двойчы перавыдаваўся "Шляхам жыцьця" Янкі Купалы (1923 і 1935), адзін раз "Вянок" Максіма Багдановіча (1927), а таксама творы Альбэрта Паўловіча (1921 і 1929), Ядвігіна Ш. (1923 і 1927), Андрэя Зязюлі (1931) і ананімная паэма XIX ст. "Тарас на Парнасе" (1923 і 1929).

Найменшую частку беларускіх выданьняў з абсягу мастацкай літаратуры (22 назвы) складалі пераклады іншамоўных твораў. Пераважалі (16 назваў) пераклады з расейскай мовы, сярод іх 3 творы Віталя Біанкі, (1931, 1933), 1 — Аляксандра Блока (1926), 1 — Мікалая Гогаля (1929), 2 — Уладзімера Караленкі (1928), 1 — Аляксандра Купрына (1923), 2 — Міхаіла Лермантава (1924, 1926) і 3 — Лява Талстоя (1928, 1929).

Выключна сьціплым быў перакладны даробак зь іншых літаратураў (6 назваў). З польскай літаратуры ў перакладзе на беларускую мову былі выдадзеныя толькі "Бартэк пераможнік" Генрыка Сянкевіча (1926) і навэля Ўладзіслава Рэйманта пра абарону зямлі (1929). Астатнія чатыры пазыцыі (без пазначэньня, зь якой мовы перакладзеныя) — гэта "Прынц і жабрак" Марка Твэна (1928), "Рабінзон Круза" Даніэля Дэфо (1929), апавяданьні Альфонса Дадэ (1927) і "Ірляндзкія народныя казкі" Макмануса (1923).

Група IV: рэлігійная літаратура. У 1921—1939 гг. усяго выйшла 69 кніжак на рэлігійную тэматыку: пераклады Сьвятога Пісаньня, малітаўнікі і іншыя літургічныя

тэксты, публіцыстычныя творы і падручнікі для навучаньня рэлігіі ў школе і дома. Апроч чыста канфэсійных задачаў, мэтай гэтай літаратуры было павелічэньне ролі беларускай мовы ў рэлігійным жыцьці і процідзеяньне гістарычна абумоўленым паланізацыйным тэндэнцыям — у Рыма–Каталіцкай Царкве і русіфікацыйным — у Праваслаўнай Царкве.

Амаль 2/3 усёй выдадзенай у тую пару рэлігійнай літаратуры складалі кніжкі каталіцкай арыентацыі (44 назвы)[42].

Гэтаму спрыялі як выдавецкія традыцыі беларускіх каталіцкіх дзеячоў пачатку XX ст.[43], пасьлядоўная дзейнасьць хадэцкіх выдаўцоў у міжваенную пару, так і інтэлектуальныя магчымасьці зацікаўленых аўтараў, сярод якіх, апроч некалькіх сьвецкіх асобаў, было 13 каталіцкіх ксяндзоў[44].

15 пазыцыяў складалі тэксты, прызначаныя для выкарыстаньня ў касьцельных набажэнствах, у тым ліку чытаньні і эвангельлі ў перакладзе Ільдэфонса Бобіча (1921, 1922), Адама Станкевіча (1938), Вінцэнта Гадлеўскага (1939), малітаўнікі Канстанціна Стаповіча "Hołas Dušy" (1926, 1934) і Язэпа Германовіча "Božaja Chvała" (1932), катэхізіс Язэпа Рэшаця (1927) і Яна Семашкевіча (часткова пад псэўданімам Янкі Быліны) "Ružaniec" (1928), "Pieśni žalby" (1929), "Daroha Kryža" (1930), а таксама "Officium Najśviaciejšaj Dzievy Maryji" (гадзіны малітваў), перадрукаваныя з малітаўніку "Hołas Dušy" (1935).

Апошняй пазыцыяй з гэтай сэрыі была выдадзеная ў 1926 г. "Biełaruskaj Krynicaj" "Kantyčka"[45]. Яна выйшла без дазволу царкоўных уладаў, у выніку чаго яе нават тэарэтычна не маглі дапусьціць да ўжытку ў касьцельных набажэнствах і, мабыць, адклікалі з продажу, а ксяндзу Баляславу Пачопку, якому прыпісвалі ўдзел у падрыхтоўцы "Kantyčki", давялося публічна гэта аспрэчыць[46].

Найбольшую колькасьць пазыцыяў рэлігійнай літаратуры каталіцкай арыентацыі складалі публіцыстычныя і навукова–папулярныя творы (25 назваў). Тэалягічным пытаньням былі прысьвечаныя працы Язэпа Рэшаця (1928, 1929), Пятра Татарыновіча (1928), Фабіяна Абрантовіча (1928, 1929), а таксама Тамаша Кемпійскага[47] ў перакладзе Станіслава Грынкевіча (1934). Да гэтай групы назваў можна залічыць падрыхтаваныя Вінцэнтам Гадлеўскім падручнікі гісторыі Старога і Новага Запавету (1930, 1933). Апроч таго, у колькіх працах прыводзіліся розныя падзеі з жыцьця Царквы (К. Найловіч, 1931, 1933, П. Татарыновіч, 1934, А. Станкевіч, 1938), а таксама ўспаміны аб беларускай пілігрымцы да віленскай Кальварыі (1935, 1938).

Жыцьцё сям'і і грамадзтва ў сьвятле вучэньня Царквы разглядалі Язэп Германовіч (1928, 1929), Дамінік Аніська (1933, 1935), Ян Тарасэвіч (1928) і Антон Падзява (1939). Прапагандзе ўжываньня беларускай мовы ў царкоўным жыцьці былі прысьвечаныя, у ліку іншых, працы Дамініка Аніські (1934), Яна Тарасэвіча (1935), Адама Станкевіча (1929). Сьпіс каталіцкай літаратуры дапаўняюць пераклады кніжкі "Przypowieści" Я. Ёргенсэна (1926) і Ф. Аманкоўскай "Прадка пад крыжам" (1939).

---

[42] Гэтую лічбу можна разглядаць як мінімальную, бо каталіцкія ідэалягічныя тэндэнцыі чырвонай ніткай праходзілі ў многіх выдадзеных пэрыёдыкамі "Biełaruskaja Krynica" і "Chryścjanskaja Dumka" творах, якія ў гэтай працы былі залічаныя да рэпэртуарнай і мастацкай літаратуры.

[43] Параўн.: Głogowska H. Тамсама.

[44] Фабіян Абрантовіч, Ільдэфонс Бобіч, Вінцэнт Гадлеўскі, Язэп Германовіч, Казімер Найловіч, Баляслаў Пачопка, Антон Падзява, Язэп Рэшаць, Ян Семашкевіч, Адам Станкевіч, Канстанцін Стаповіч, Ян Тарасэвіч і Пётар Татарыновіч.

[45] Журня Ф. Тамсама. Głogowska H. Тамсама.

[46] Przegląd Wileński. 1926. № 15; Biełaruskaja Krynica. 1926. № 30.

[47] Тамаш Кемпійскі нарадзіўся ў г. Кемптэне ў Нідэрляндах. Тут падаецца пераклад лацінізаванага назову гораду. — *А.С.*

Трэба заўважыць, што ўся пералічаная літаратура каталіцкай арыентацыі пасьлядоўна выдавалася лацінскім альфабэтам.

Асобнае месца ў каталіцкай публіцыстыцы займала прапаганда нэауніі. З прычыны крытычнага стаўленьня да яе ксяндза Адама Станкевіча яе галоўным прапагандыстам быў асяродак айцоў езуітаў у Альбярціне каля Слоніму і Беларускі Рэлігійна–Грамадзкі Саюз, які дзейнічаў пад яго апекай. Аднак, апроч часопісаў, календара і ўлётак, нэаўнійныя дзеячы выдалі ўсяго тры брашуры з прапагандай царкоўнай уніі (Язэп Германовіч, 1932, Баляслаў Пачопка, 1932, і калектыўная праца "Рэлігійнае жыцьцё на Беларусі", 1932). Напэўна, з прычыны існуючых рознагалосьсяў наконт нэауніі надрукаваны кірыліцай, а значыць, прызначаны галоўным чынам для праваслаўных, другі катэхізіс ксяндза Язэпа Рэшаця — вялікага прыхільніка царкоўнай уніі — пад назвай "Асновы хрысьціянскай веры для беларускага народу" (1927) быў выдадзены пад крыптанімам І.Р., імаверна, віленскай архібіскупскай курыяй альбо езуітамі з Альбярціна. Беларуская хадэцкая прэса пра яго не пісала.

Рэлігійнай літаратуры праваслаўнай арыентацыі выйшла 6 кніжак, т. б. у параўнаньні з каталіцкай літаратурай яна выглядала вельмі сьціпла. З адным выняткам — яе аўтарам быў Сяргей Паўловіч, які выдаў: "Сьвяшчэнная гісторыя Старога Завету" (1926), "Беларуска–славянскі лемантар (буквар) і першая навука Закону Божага" (1933), "Праваслаўны малітваслоў на царкоўна–славянскай і беларускай мове" (1935)[48], "Першая навука Закону Божага зь беларуска–славянскім букваром"[49] (1936) і "Сьвяшчэнная гісторыя Новага Завету" (1936). Чатыры апошнія пазыцыі былі надрукаваныя ў сынадальнай друкарні ў Варшаве. Шостай пазыцыяй была невялікая ананімная брашура "Сьвятыя віленскія мучанікі Антон, Іван і Астап — патроны Беларусі" — перадрук з праваслаўнага календара на 1927 г.

На думку Алены Глагоўскай, прычына гэткага сьціплага даробку беларускамоўнай праваслаўнай літаратуры "палягала ў мізэрнай зацікаўленасьці царкоўнай герархіі ў Польшчы беларусізацыяй Царквы"[50].

Аднак падаецца, што гэта была не найважнейшая прычына. На тое паказвае факт выданьня малітаўніка і трох падручнікаў С. Паўловіча Праваслаўнай Мітраполіяй у Варшаве з ухвалы мітрапаліта Дзяніса, і гэта ў трыццатых гадох, калі адукацыйныя ўлады ўсё мацней настойвалі на тым, каб навучаньне праваслаўнай рэлігіі ў пачатковых школах вялося на польскай мове. Мабыць, большае значэньне мела няздольнасьць ці нежаданьне пераважнай часткі праваслаўнага духавенства паслугоўвацца беларускай мовай. Невыпадкова аўтарам усіх падручнікаў і нават малітаўніка была сьвецкая асоба — Сяргей Паўловіч.

Большую актыўнасьць у гэтым полі выяўлялі пратэстанцкія выдаўцы (мэтадысты і баптысты), зацікаўленыя ў пашырэньні сваіх ідэяў сярод беларускага насельніцтва паўночна–ўсходніх ваяводзтваў Польшчы[51]. У выніку іх дзейнасьці агулам выйшла 19 кніжак.

У сярэдзіне дваццатых гадоў намаганьнямі Місіі Мэтадыстаў у Варшаве, а ў трыццатых гадах — амэрыканскай фірмы "Southern Trade" былі выдадзеныя "Галоўныя

[48] Малітаўнік "Праваслаўны малітваслоў на царкоўна–славянскай і беларускай мове" (1935) выйшаў ананімна. Пра тое, што яго аўтарам быў С. Паўловіч, сьведчыць інфармацыя, зьмешчаная на вокладцы яго падручніка "Першая навука Закону Божага зь беларуска–славянскім букваром" (1936).

[49] На вокладцы гэтага падручніка падаецца, што гэта было "выданьне другое, папраўленае і дапоўненае". Першым выданьнем быў падручнік Паўловіча з падобнай назвай, які выйшаў у 1933 г.

[50] Głogowska H. Тамсама.

[51] Łatyszonek O. Białoruski ruch narodowy a protestantyzm w II Rzeczypospolitej // Społeczeństwo białoruskie, litewskie i polskie na ziemiach północno–wschodnich II Rzeczypospolitej w latach 1939—1941. Warszawa, 1995. S. 33—40.

асновы мэтадызму" (1925), "Служба Божая" (1925), "Курс нядзельнае школы" (1930) і чатыры сьпеўнікі (1925 кірыліцай і лацінкай, 1929, 1930, 1936). Амаль адначасова Выдавецкае Таварыства баптыстаў "Компас" у Лодзі выдала чатыры Эвангельлі (1926—1928) і брашуры: "Прыпавесьць пра блуднага сына" (1927), "Нэўтральнага месца няма" (1927) і "Загінуў ці спасёны" (1932). Апроч таго, у Вільні выйшлі выбраныя вершы Міхаіла "Хрыстовы золак" (1927) баптысцкай арыентацыі.

Значнай падзеяй у галіне рэлігійнай літаратуры было выданьне ў 1931 г. Брытанскім і Замежным Біблійным Таварыствам першага поўнага перакладу Новага Запавету на беларускую мову "Новы запавет Госпада нашага Ісуса Хрыста і Псальмы". Працы над перакладам пачаліся ў сярэдзіне дваццатых гадоў з удзелам каталіцкіх, праваслаўных і пратэстанцкіх перакладчыкаў, галоўным чынам пастара Лукаша Дзекуць–Малея, Антона Луцкевіча і сьвятара Аляксандра Каўша. Пры гэтым выкарыстоўваўся пераклад чатырох эвангельляў, выдадзены "Компасам" у Лодзі. Новы Запавет быў надрукаваны ў Лодзі, мабыць, у друкарні выдавецтва "Компас", аднак на яго тытульнай старонцы месцам выданьня называюцца Хэльсынкі, дзе мясьціўся аддзел Усходняй Эўропы Брытанскага і Замежнага Біблійнага Таварыства[52].

Па вайне кніжка двойчы перавыдавалася — у 1948 і 1991 гг.

Група V: грамадзка–палітычная літаратура. Гэтая літаратура мела на мэце фармаваньне як нацыянальнай сьвядомасьці, так і ясных палітычных пазыцыяў беларускага народу. З пункту гледжаньня ідэйнай скіраванасьці можна вылучыць тры яе катэгорыі:

1. гісторыя беларускага нацыянальнага руху, яго ідэалягічныя асновы і стаўленьне да сучасных пытаньняў;
2. сацыяльная праблематыка, разгляданая з марксісцкіх пазыцыяў;
3. антыкамуністычная і антысавецкая літаратура.

Агулам грамадзка–палітычнай літаратуры выйшла 66 назваў, што толькі нязначна саступае паводле колькасьці рэлігійнай літаратуры. Найбольшая колькасьць выданьняў належала да першай катэгорыі, прызначанай для нацыянальнай адукацыі грамадзтва (37 назваў). У яе рамках вылучаліся працы Адама Станкевіча, у прыватнасьці, "Кастусь Каліноўскі", "Мужыцкая Праўда і ідэя незалежнасьці Беларусі" (1933), "Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня" (1935), "Беларускі хрысьціянскі рух" (1939) і колькі яго брашур, прысьвечаных постацям пачынальнікаў нацыянальнага адраджэньня. Гэтая праблематыка чырвонай ніткай праходзіла ў сэрыі ўспамінаў нацыянальных дзеячаў: Ядвігіна Ш. (1921), Казімера Сваяка (1932) і Антона Луцкевіча (1928). Наіўнасьць вядучых дзеячаў Грамады, якія эмігравалі ў СССР, трапна ацаніў Фабіян Акінчыц (1931, 1933). Апроч таго, была выдадзеная (1923) ёмістая стэнаграма працэсу 45 беларусаў у Беластоку, неўзабаве сканфіскаваная, і праца А. Канчара (Яўсей) пра грамадзкія, нацыянальныя і канфэсійныя антаганізмы ў Беларусі (1921).

Мэтам адукацыі нацыі служыла таксама сэрыя брашур, у якіх разглядалася старавечная гісторыя Беларусі, у тым ліку Сяргея Сахарава "Полацкі князь Усяслаў — беларускі народны асілак" (1939), Мікалая Ільляшэвіча "Расейская палітыка на землях былога Беларуска–Літоўскага гаспадарства за панаваньня Кацярыны II і Паўлы I" (1933), Міколы Шкялёнка "У 300–я ўгодкі сьмерці Вялікага Канцлера Льва Сапегі" (1933), Адама Станкевіча "Доктар Францішак Скарына першы друкар беларускі" (1925) і гэтага ж аўтара "Вітаўт Вялікі і беларусы" (1930) і "Беларуская мова ў школах Беларусі XVI—XVIII ст." (1928).

У спэцыфічных варунках Беларусі, на абшары якой вякамі сутыкаліся ўплывы Ўсходу і Захаду, якія ўскладнялі гарманічнае ўзаемадзеяньне палітычных колаў, вызначэньне прынцыпаў нацыянальнага руху мела першараднае значэньне. Гэтаму пытаньню, ап-

[52] Picarda G. Тамсама.

роч шматлікіх публікацыяў у прэсе, былі прысьвечаныя працы І. Абдзіраловіча (1921), С. Грынкевіча (1927), А. Стаповіча (1929), В. Гадлеўскага пад псэўданімам Ваг (1931), А. Клімовіча (1931), Ф. Акінчыца (1936), часта яно закраналася ў творах А. Станкевіча.

Стаўленьне беларускіх дзеячоў да сучаснай палітыкі польскай дзяржавы да гэтай нацыянальнай меншасьці было адлюстраванае сярод іншага ў публікацыях У. Самойлы — пад псэўданімам Суліма (1923, 1924), у ананімнай брашуры "З усіх бакоў польскае дзяржаўнасьці" (1926), у брашурах аб праблемах самакіраваньня (1929, 1938), а таксама ў публікаваных выступах у Сойме беларускіх дэпутатаў Б. Тарашкевіча (1923), Ф. Ярэміча (1931) і іншых (1924, 1926).

13 пазыцыяў выдала альбо спансавала камуністычная партыя, аддаючы значна больш увагі іншым формам масавай агітацыі, такім як прэса і ўлёткі. Гэтак, выдавецтва Грамады ў 1926 г. апублікавала тры брашуры — С. Баха "Цар-голад" і Э. Бэлямі "Казка аб вадзе" (кірыліцай і лацінкай). Вынікам выдавецкай дзейнасьці Рабоча-Сялянскага Пасольскага Клюбу "Змаганьне" былі шэсьць кніжак — працы К. Маркса (1929, 1930), Ф. Энгельса (1929), Г. Пляханава (1929), І. Сталіна (1929) і І. Тагабочнага "Змагары за ідэю" (1929). Апроч таго, КПП выдала на беларускай мове "Рэзалюцыі III партыйнай канфэрэнцыі" (1922), а КПЗБ — дзьве публікацыі: А. Віленчука "Супраць расправы акупантаў над Б. Тарашкевічам" (1933) і А. Гарадоцкага "Як Беларуская Хадэцыя гандлюе крывёю рабочых і сялян" (1934).

Адміністрацыйныя ўлады намагаліся супрацьстаяць уплывам камуністычнай партыі, спансуючы выданьне "Цэнтрасаюзам" трох брашураў А. Русаковіча: "У краіне прымусу", "Ад волі да прыгону" і "Што такое «калгасы»" (усё ў 1932 г.). Тым самым мэтам служылі пяць брашур, выдадзеных вялікімі накладамі ў рамках т.зв. Беларускай Народнай Бібліятэкі — С. Баркоўскага "«Камсамол» і ягоныя мэты" (1933), Я. Альхоўскага "Як жывецца сялянству пад камуністычнай уладай" (1932), К. Навіцкага "Што робіць урад у барацьбе з крызісам" (1933) і "Як палепшыць жыцьцё сялянства" (1934). Агляд пісьменства гэтага кірунку завяршаюць кніжкі А. Аера "Босыя на лёдзе" (1938) і Ф. Аляхновіча "Ў капцюрох ГПУ" (1937) — перакладзеная на некалькі моваў справаздача з побыту яе аўтара ў салавецкіх лягерох.

Група VI: мовазнаўства, асьвета і культура. Нешматлікія беларусазнаўчыя працы, апублікаваныя ў міжваенную пару пад эгідай навуковых ўстановаў, выдаваліся на польскай мове[53].

На беларускай жа мове зьяўляліся працы розных аўтараў — навуковых работнікаў, настаўнікаў, сьвятароў і іншых прадстаўнікоў групаў інтэлігенцыі — як навуковага, так і навукова-папулярнага характару, а таксама дапаможнікі (слоўнікі). З прычыны ўзаемнай палітычнай антыпатыі паміж рознымі арганізацыямі толькі частка аўтараў трымалася поглядаў, якія пашырала Беларускае Навуковае Таварыства, выдавецкая дзейнасьць якога ў прынцыпе межавалася выданьнем двух спансаваных уладамі асьветніцкіх выданьняў[54].

У галіне мовазнаўства быў перавыдадзены расейска-беларускі слоўнік М. і Г. Гарэцкіх (1921), апроч таго былі выдадзеныя два новыя: З. Верас. Беларуска-польскалацінскі батанічны слоўнік (1924); Б. Друцкі-Падбярэскі. Падручны беларуска-польскі слоўнік (1929). Выйшлі таксама шэсьць лінгвістычных працаў Я. Станкевіча (1921, 1931, 1935, 1936, 1937, 1939), выдадзеных часткова на кошт аўтара і пры частковай фінансавай падтрымцы Таварыства Прыяцеляў Беларусаведы, якое дзейнічала пры Віленскім

[53] Iljaszewicz T. Drukarnia Domu Mamoniczów w Wilnie. Wilno, 1938; Łuckiewicz A. Narodowolcy Białorusini i ich organ "Homon". Lwów, 1935; Stankiewicz S. Pierwiastki białoruskie w polskiej poezji romantycznej. Wilno, 1936 і іншыя.

[54] Гадавік Беларускага Навуковага Таварыства. Вільня, 1933; Запісы Беларускага Навуковага Таварыства. Вільня, 1938.

унівэрсытэце, і Беларускага Студэнцкага Саюзу. Адна праца, прысьвечаная зьбіраньню тэрміналягічнага матэрыялу на беларускай мове, была перадрукаваная з ранейшага менскага выданьня (1926).

У галіне літаратуразнаўства выйшла некалькі працаў А. Луцкевіча (1921 — дзьве, 1925, 1932, 1933), а таксама яго ж большае дасьледаваньне "Адбітае жыцьцё"[55] (1929). Апроч таго выйшла праца А. Станкевіча пра творчасьць Францішка Багушэвіча (1930), Х. Ільляшэвіча пра літаратурную дзейнасьць Ядвігіна Ш. (1933) і М. Мілючанкі пра паэзію Цёткі (1936). Ян Станкевіч апублікаваў вынікі сваіх дасьледаваньняў літаратуры беларускіх мусульманаў, напісанай арабскай графікай (1933), і сярэднявечных беларускіх хронікаў (1937). Да літаратуразнаўчых прац належыць таксама падрыхтаваная Мар'янам Пецюкевічам інструкцыя па зьбіраньні фальклёру (1933) і пераклад кніжкі М. Гнатышака пра сучасную нямецкую прозу (1928).

Праблемам школьніцтва і арганізацыі пазашкольнай асьветы былі прысьвечаныя брашуры С. Паўловіча (1928, 1929), С. Грынкевіча (1936) і К. Езавітава (1923), а гісторыі беларускага тэатру і дзейнасьці аматарскіх тэатраў — працы Ф. Аляхновіча (1924) і С. Грынкевіча (1927). Тэмай некалькіх невялікіх брашураў былі розныя аспэкты культурнай дзейнасьці (А. Луцкевіч пісаў пра беларускі музэй у Вільні, 1933, А. Станкевіч — пра сьпевака Міхала Забэйду–Суміцкага, 1938, а Суліма — пра беларускую душу, 1924). Выйшла таксама калектыўная праца "Заходняя Беларусь", прысьвечаная літаратуры, мастацтву і беларускай грамадзкай думцы (1924)[56].

Група VII: астатняя літаратура. У гэтай групе, якая ахоплівае 52 пазыцыі, найбольшую долю складаюць кніжкі на эканамічную тэматыку (26 назваў). Гэтая катэгорыя складаецца з брашураў, якія папулярызавалі ідэю каапэрацыі, у прыватнасьці — С. Чыжэўскага (1921, 3 пазыцыі), А. Васілені (1928, 1929), А. Клімовіча (1932) і А. Більдзюкевіча (1926), а таксама з больш за дзясятак брашураў, прысьвечаных папулярызацыі сельскагаспадарчых ведаў.

Праблемы аховы здароўя, гігіены і барацьбы з алькагалізмам разглядаліся ў 9 папулярных дапаможніках, падрыхтаваных лекарамі Ядвігай і Станіславам Грынкевічамі (1935, 1938, 1939), М. Голуб–Бучынскай (1926, 1932), Антонам Красоўскім (1924) і Браніславам Туронкам (1928). Дзьве працы тычыліся праблемаў фізычнага выхаваньня (У. Казлоўшчык, 1927, 1928).

* * *

Сярод аналізаваных 466 беларускамоўных кніжак, выдадзеных у 1921—1939 гг., пераважную колькасьць (300 назваў, ці 64%) складалі арыгінальныя творы мясцовых аўтараў, выдадзеныя ўпершыню. Рэшта становіць перавыданьні кніжак, выдадзеных да 1921 г. (81 назва), і пераклады зь іншых моваў, галоўным чынам з расейскай (85 назваў).

Арыгінальная літаратура пераважала ўва ўсе гады міжваеннай пары, і яе доля нават выяўляла тэндэнцыю да росту: у 1921—1930 гг. яна складала 59%, а ў трыццатых гадох вырасла да 73%. Гэтая доля была рознай у паасобных тэматычных групах — ніжэйшай за сярэднюю яна была ў галіне школьных падручнікаў, рэпэртуарнай і мастацкай літаратуры, вышэйшай за сярэднюю — у групе рэлігійнай і грамадзка–палітычнай літаратуры.

Аб'ём і наклады

З прычыны фінансавых цяжкасьцяў для бальшыні беларускіх выдаўцоў мінімізацыя выдаткаў мела асаблівае значэньне і ў шматлікіх выпадках абумоўлівала рашэнь-

[55] "Адбітае жыцьцё" — зборнік артыкулаў і лекцыяў А. Луцкевіча. — *А.С.*

[56] Насамрэч, зборнік "Заходняя Беларусь" выйшаў у канцы 1923 г. — *А.С.*

не аб выданьні кніжкі. Часта выдаваліся адносна невялікія тэксты, якія папярэдне друкаваліся ў часопісах і дазвалялі паўторна выкарыстоўваць друкарскі набор. Гэта ўмагчымляла выданьне тэксту ў форме кніжкі як адбіткі.

У вялікай меры такія рашэньні ўплывалі на аб'ём. З аналізу пададзенага ў дадатку каталёгу вынікае, што кніжак аб'ёмам ня больш за 64 старонкі ў міжваенную пару было выдадзена 302, што складала 65% усёй тагачаснай выдавецкай прадукцыі. Згодна з польскім паліграфічным стандартам, іх можна было б залічыць да брашур. Адначасна было выдадзена 164 кніжкі аб'ёмам больш за 64 старонкі (35% усёй прадукцыі).

Гэтыя падлікі можна лічыць прыблізнымі і ў пэўнай ступені ўмоўнымі, бо яны ня ўлічваюць фармату. У многіх выпадках ён быў невялікі, а яго пералічэньне на параўнальны фармат (напрыклад, A5) зьмяніла б гэтыя прапорцыі, павялічваючы долю брашур і памяншаючы долю кніжак.

Наклады (колькасьць асобнікаў) выдадзеных кніжак адлюстроўвалі як фінансавыя магчымасьці выдаўцоў, так і іх ацэнку патэнцыйнага чытацкага попыту ці мэтазгоднасьці прапагандаваньня пэўных ідэйных каштоўнасьцяў, асабліва рэлігійных і грамадзка-палітычных. Як было ўстаноўлена падчас дасьледаваньня, пачынаючы ад 1927 г., на абавязковых асобніках, што перадаваліся Нацыянальнай Бібліятэцы ў Варшаве віленскім гарадзкім стараствам як установай, якая кантралявала выдавецкую дзейнасьць, разьмяшчаўся адмысловы штэмпэль (часам запіс ад рукі), на якім у ліку іншага падавалася колькасьць надрукаваных асобнікаў. З прычыны таго, што друкарні, як правіла, не падавалі гэтых зьвестак на вокладках кніжак, згаданыя зьвесткі віленскага гарадзкога стараства і аналягічных установаў у іншых гарадох Польшчы — адзіная крыніца вызначэньня накладу пэўнай пазыцыі. Гэтым спосабам былі вызначаныя наклады 200 кніжак, г.зн. больш як 60% усяго іх выданьня ў 1927—1939 гг.; аднак такія зьвесткі адсутнічаюць для папярэдніх гадоў (1921—1926), за выняткам трох назваў, выдадзеных Грамадой. Атрыманы матэрыял, хоць ён і няпоўны, досыць рэпрэзэнтатыўны для вызначэньня заканамернасьцяў ува ўсёй выдавецкай дзейнасьці.

Як паказана ў табліцы 3, з 200 кніжак накладам да 500 асобнікаў былі выдадзеныя 50 назваў (25%), ад 501 да 1000 — 95 назваў (47,5%), а больш за 1000 асобнікаў — 55 кніжак (27,5%). Дзеля таго, што колькасьць кніжак, выдадзеных найменшым накладам (да 500 асобнікаў), нязначна адрозьнівалася ад колькасьці кніжак, выдадзеных найбольшым накладам (больш за 1000 асобнікаў), можна прыняць за вельмі праўдападобны і тыповы ў заходнебеларускіх варунках наклад кніжкі трохі менш за 1000 экзэмпляраў.

Такім чынам, гэткі наклад быў вельмі нізкім ня толькі ў супастаўленьні з колькась-

Табліца 3. Наклады кніжак у 1927—1939 гг., паводле тэматычных групаў[a]

Тэматычная група	да 500 асобнікаў	501—1000 асобнікаў	больш за 1000 асобнікаў	Разам
I	—	8	6	14
II	7	12	6	25
III	16	36	8	60
IV	8	12	9	29
V	7	12	21	40
VI	9	4	1	14
VII	3	11	4	18
Разам	50	95	55	200

[a] Улучна з трыма брашурамі, выдадзенымі ў 1926 г. Грамадой

цю беларускага насельніцтва ў II Рэчы Паспалітай[57], але і ў параўнаньні з накладамі кніжак, выдадзеных перад першай сусьветнай вайной. Паводле падлікаў С. Александровіча, сярэдні наклад кніжак, выдадзеных у 1913—1915 гг. віленскім Беларускім Выдавецкім Таварыствам, складаў 3180 асобнікаў, г.зн. быў у тры разы большым, чым у міжваенную пару[58].

Аднак гэтае параўнаньне не зусім карэктнае, бо кніжкі гэтага выдавецтва прызначаліся для чытачоў з усёй Беларусі, а ня толькі для яе заходняй часткі, якая па першай сусьветнай вайне апынулася ў межах польскай дзяржавы. Аднак гэта не мяняе агульнай ацэнкі рэгрэсу ў гэтай галіне, на што паказвае й той факт, што кніжкі, выдадзеныя ў 1913—1915 гг. віленскай каталіцкай газэтай "Беларус", г.зн. прызначаныя галоўным чынам для насельніцтва паўночна-заходняй Беларусі, у сярэднім выходзілі накладам 2440 асобнікаў, г.зн. у два разы большым накладам, чым у 1921—1939[59].

Пры такім стане рэчаў заслугоўваюць увагі кніжкі, якія мелі вышэйшыя за сярэдні наклады (больш за 1000 асобнікаў). У міжваенную пару іх выйшла 55, з чаго значную частку складала грамадзка-палітычная літаратура (23 назвы): галоўным чынам, творы клясыкаў марксізму, выдадзеныя Пасольскім Клюбам "Змаганьне" (па 2000 асобнікаў), выдадзеныя Грамадой брашуры С. Баха "Цар-голад" (20 000 асобнікаў) і Э. Бэлямі "Казка аб вадзе" (кірыліцай і лацінкай, 10 000 асобнікаў)[60], а таксама спансаваныя ўладамі антыкамуністычныя брашуры Ф. Акінчыца "Чаму гэта так сталася" (10 000 асобнікаў), А. Русаковіча (тры па 4000 асобнікаў), А. Баброўскага і іншых аўтараў у рамках "Беларускай Народнай Бібліятэкі" (ад 2000 да 6000 асобнікаў) і, мабыць, успаміны Ф. Аляхновіча з савецкіх лягероў (2000 асобнікаў).

Аднак рэкордны наклад (25 000 асобнікаў) належыць выдадзенаму Брытанскім і Замежным Біблійным Таварыствам перакладу "Новага Запавету"[61].

Адносна вялікімі накладамі выходзілі кніжкі, выдадзеныя Праваслаўнай Мітраполіяй у Варшаве. Так, напрыклад, падручнік Сяргея Паўловіча "Беларуска-славянскі лемантар (буквар) і першая навука Закону Божага" (1933), а таксама "Праваслаўны малітваслоў" (1935) былі выдадзеныя накладам 2000 асобнікаў, а наклад апошняй пазыцыі Паўловіча — "Сьвяшчэнная гісторыя Новага Завету" (1936) — сягнуў 3000 асобнікаў. Такім жа накладам у 1934 г. быў выдадзены каталіцкі малітаўнік Канстанціна Стаповіча "Hołas Dušy".

Мяркуючы па няпоўных дадзеных, наклады пратэстанцкай літаратуры (мэтадыстаў і баптыстаў) былі ніжэйшыя, што, напэўна, было зьвязана з тагачаснай невялікай колькасьцю чальцоў гэтых рэлігійных супольнасьцяў. У некалькіх выпадках яны не перасягалі 500 асобнікаў, да выняткаў належаў мэтадысцкі сьпеўнік "Божая Ліра" (1930), выдадзены накладам 1500 асобнікаў.

Наклады выданьняў мастацкай літаратуры рэдка перасягалі сярэдні ўзровень, г.зн. 1000 асобнікаў. Гэта датычыла нават твораў найбольш вядомых клясыкаў беларускай літаратуры. Для прыкладу, першая частка паэмы Якуба Коласа "Новая зямля" была выдадзеная ў 1928 г. накладам 2000 асобнікаў, аднак у выніку ніжэйшага, чым чакала-

[57] Перапісы насельніцтва 1921 і 1931 г., паводле якіх насельніцтва беларускай нацыянальнасьці ў II Рэчы Паспалітай складала каля 1 млн., выклікалі крытыку польскіх дэмографаў і гісторыкаў. К. Сракоўскі ацэньваў яго ў 1,6 млн., А. Крысінскі ў 1,5 млн., А. Жарноўскі ў 1,8 млн., а З. Ландаў і Е. Тамашэўскі ў амаль 2 млн. асобаў. Гл.: Gomółka K. Тамсама. С. 9.

[58] Александровіч С. Тамсама. С. 164.

[59] Тамсама.

[60] Паводле справаздачы былога генэральнага сакратара Грамады М. Бурсевіча. Гл.: Борьба трудящихся Западной Белоруссии за социальное и национальное освобождение и воссоединение с БССР. Т. I. Минск, 1962. С. 554.

[61] Picarda G. Тамсама.

ся, попыту чытачоў наклад выдадзенай у наступным годзе апошняй часткі гэтай паэмы быў зьменшаны да 1000 асобнікаў. Такім жа накладам у 1935 г. быў выдадзены найлепшы твор[62] Янкі Купалы "Шляхам жыцьця".

Таму можна сьцьвярджаць, што высокатыражныя кнігі служылі галоўным чынам прапагандзе пэўных ідэйных каштоўнасьцяў і пераважна выдаваліся зацікаўленымі ў іх распаўсюдзе небеларускімі арганізацыямі і ўстановамі — камуністычнай партыяй, польскімі адміністрацыйнымі ўладамі і часткова царкоўнымі асяродкамі.

Канфіскацыі

Канфіскацыі беларускіх кніжак адміністрацыйнымі ўладамі міжваеннай Польшчы, галоўным чынам, віленскім гарадзкім стараствам, былі адносна рэдкай зьявай. Паводле зьвестак беларускай прэсы, якая скрупулёзна фіксавала такія выпадкі, у міжваенную пару былі канфіскаваныя 11 выданьняў, г.зн. 2,4% агульнай колькасьці выдадзеных кніжак[63].

Гэта былі наступныя публікацыі:

— Суліма. Што такое "Wyzwolenie" зь беларускага пункту гледжаньня. 1923;
— Працэс 45–ці беларусаў у Беластоку. 1923;
— З усіх бакоў польскае дзяржаўнасьці. 1926;
— Браславіч. І нас разбудзілі (п'еса). 1927;
— Васілёк М. Шум баравы. 1929;
— Ініцкі У. Сон Гаўрылы. 1929;
— Быліна Я. Na pokuci. 1934;
— Машара М. З пад стрэх саламяных. 1937;
— Танк М. На этапах. 1936;
— Паўловіч С. Zasieŭki. 1937;
— Грынкевіч С. Асьвета. 1937.

Яўнае ўзмацненьне канфіскацыяў прыпадае на 1934—1937 гады, што было зьвязана зь пераходам дзяржавы да больш жорсткай палітыкі да нацыянальных меншыняў, у выніку чаго былі зачыненыя: Таварыства Беларускай Школы (канец 1936 г.), Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры (канец 1936 г.), Беларускі Нацыянальны Камітэт (студзень 1938 г.) і іншыя арганізацыі.

У гэтым кантэксьце апроч названых твораў Быліны, Машары і Танка, канфіскаваных неўзабаве пасьля іх выданьня, заслугоўвае ўвагі лёс зборнікаў вершаў Ініцкага "Сон Гаўрылы" і Васілька "Шум баравы". Абедзьве гэтыя кніжкі, выдадзеныя ў 1929 г., на працягу некалькіх гадоў свабодна распаўсюджваліся і толькі ў канцы 1936 г. рэшткі іх накладу былі канфіскаваныя[64].

Палітычныя настроі, якія панавалі ў той час у колах дзяржаўнай адміністрацыі ў Вільні, красамоўна характарызуе лёс лемантара Сяргея Паўловіча "Zasieŭki", то бок першага падручніка для навукі чытаньня і пісаньня. Лемантар быў канфіскаваны 29 траўня 1937 г., праз два тыдні пасьля яго выхаду з друку[65].

У кастрычніку таго году пасьля паданьня пазову віленскай пракуратурай у гэтай справе меўся адбыцца судовы разбор, на адкрыцьці якога абаронца аўтара, адвакат Б. Аляхновіч, патрабаваў, каб пракуратура выразна сфармулявала, які злачынны зьмест утрымлівае лемантар. Нягледзячы на супраціў пракурора, суд прызнаў патрабаваньне

---

[62] Мусіла б быць "зборнік твораў". — *А.С.*

[63] Падлік аўтара на падставе інфармацыі зь "Biełaruskaj Krynicy" (1927—1930), "Шляху Моладзі" (1933—1939) і Летапісу беларускага друку. Ч. III. Менск, 1927.

[64] Шлях Моладзі. 1937. № 2/101.

[65] Тамсама. 1937. № 6/105.

абаронцы слушным і адклаў справу да моманту, калі пракуратура перарэдагуе абвінавачаньне. Аднак гэтага так і не адбылося, таксама так і ня быў адноўлены судовы разбор, дарма што "небясьпечны" для польскай дзяржавы лемантар ня быў вызвалены з-пад арышту[66].

Чытачы

Найбольшую ролю ў распаўсюдзе беларускіх кніжак адыгралі кнігарні. У першыя паваенныя гады ў Вільні існавала заснаваная ў 1913 г. Вацлавам Ластоўскім кнігарня Беларускага Выдавецкага Таварыства на вул. Завальнай, 7. У той час гэта была адзіная беларуская кнігарня, якая прадавала кніжкі і часопісы ўсіх беларускіх выдаўцоў, незалежна ад іх ідэйнай арыентацыі.

Пасьля ўзмацненьня палітычных супярэчнасьцяў у кантэксьце дзейнасьці Грамады ў сакавіку 1926 кнігарня БВТ выключыла з продажу хадэцкую "Biełaruskuju Krynicu", што выклікала канфлікт паміж БВТ і БХД. Як высьветлілі супрацоўнікі II аддзелу Генэральнага Штабу Польскага Войска, кнігарня БВТ у выніку немагчымасьці выкананьня фінансавых абавязкаў неўзабаве была купленая зьвязаным з хадэцыяй Станіславам Станкевічам[67].

Таму дзеячы Грамады і БВТ адчынілі асобную кнігарню на вуліцы Вастрабрамскай, 1, а на процілеглым баку вуліцы, у доме № 2, Станіслаў Станкевіч разьмясьціў сваю кнігарню, перавезеную з вуліцы Завальнай, і кіраваў ёй ад уласнага імя.

У канцы дваццатых гадоў у Вільні паўстала трэцяя беларуская кнігарня "Пагоня", якая найдаўжэй мясьцілася на вуліцы Завальнай, 1. У гэтым доме мясьцілася таксама друкарня імя Францішка Скарыны, а таксама рэдакцыі часопісаў і арганізацыяў хадэцкай арыентацыі. Гэтая кнігарня прадавала прадукцыю ўсіх беларускіх выдавецтваў.

Віленскія кнігарні і некаторыя выдавецтвы ўкладалі дамовы з кнігарнямі ў правінцыі, на падставе якіх апошнія займаліся продажам кніжак. Такія пункты продажу былі арганізаваныя ў Маладэчне, Валожыне, Лідзе, Ашмянах, Наваградку, Слоніме, Горадні і, магчыма, у іншых месцах, аднак пра маштабы і вынікі іх дзейнасьці вядома няшмат.

Апроч таго, у распаўсюдзе кніжак удзельнічалі рэгіянальныя суполкі віленскіх грамадзка-культурніцкіх арганізацыяў, у прыватнасьці, Таварыства Беларускай Школы і Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры. Для гэтай мэты віленскія арганізацыі і кнігарні давалі рэгіянальным суполкам крэдыты і часам рабілі значныя зьніжкі. Праўда, дзейнасьць гэтых суполак падлягала разнастайным абмежаваньням адміністрацыйных уладаў, аднак прынамсі да канца 1936 г., г.зн. да часу іх роспуску, яны маглі нямала зрабіць у справе распаўсюду кніжак.

Падаецца, што, нягледзячы на цяжкасьці, наяўная сетка дыстрыбуцыі ў прынцыпе была дастатковай для рэалізацыі выдавецкай прадукцыі. Праўда, мы не валодаем зьвесткамі аб колькасьці прададзеных кніжак, аднак гэта не выключае магчымасьці іншай ацэнкі чытацкага попыту.

Такім чынам, у 1921—1939 гг. нацыянальныя выдаўцы выкінулі на кніжны рынак (за выняткам канфіскаваных) 455 пазыцыяў. Гэта азначае, калі прыняць сярэдні наклад за 1000 асобнікаў, што агульная прапанова была ня большай за 455 тысяч асобнікаў. Гэтую лічбу варта павялічыць на больш як дзясятак кніжак, выпушчаных бела-

[66] Тамсама. 1937. № 14/113.

[67] Krótki zarys zagadnienia białoruskiego. Opracowanie II Oddziału Sztabu Generalnego WP. Warszawa, 1928. S. 341—342.

рускімі выдавецтвамі ў Коўне і, магчыма, на некалькі назваў, выпушчаных у Польшчы і ня ўлічаных у дадатку[68].

У сытуацыі, калі выдадзеныя ў Савецкай Беларусі кніжкі ў прынцыпе траплялі толькі ў некаторыя польскія навуковыя бібліятэкі і зацікаўленыя дзяржаўныя ўстановы, колькасьць беларускіх кніжак, прызначаных для распаўсюду на тэрыторыі Польскай Рэспублікі, мабыць, не перасягала 500 тыс. асобнікаў. Такім чынам, на сярэднестатыстычнага беларуса выпадала (у залежнасьці ад ацэнак памераў гэтай нацыянальнай меншыні) усяго 0,25—0,5 асобнікаў за ўсю блізка што дваццацігадовую міжваенную пару. Нават пры аптымістычным дапушчэньні, што адной кніжкай карысталіся некалькі асобаў, гэты паказьнік павялічыўся б да каля 1 пазыцыі на чытача, і гэта пры ўмове поўнага продажу накладаў.

Аднак беларуская кніжка зь цяжкасьцю дабіралася ў сялянскія хаты. Пра гэта сьведчыць аналіз выдадзенага ў сярэдзіне 1937 г. каталёгу віленскай кнігарні "Пагоня". Вось жа, сярод 363 пазыцыяў, прапанаваных на продаж, было 156 кніжак, выдадзеных яшчэ да 1927 г., з чаго вынікае, што 43% прапановы складалі пазыцыі, наклады якіх не былі прададзеныя за дзесяць і больш гадоў. Варта заўважыць, што сярод іх было 17 пазыцыяў, выдадзеных яшчэ да 1917 г.[69].

З гэтага вынікае, што грамадзкі попыт на беларускую кніжку захоўваўся на вельмі нізкім узроўні і ў прынцыпе абмяжоўваўся вузкімі коламі інтэлігенцыі. Пры такім стане рэчаў выдавецкая дзейнасьць не магла мець істотнага ўплыву на рост нацыянальнай сьвядомасьці ў масавым маштабе, асабліва сярод беларускага сялянства. Гэтая праблема турбавала выдаўцоў і грамадзкіх дзеячаў, якія, правільна ацэньваючы матэрыяльнае і культурнае становішча вясковага насельніцтва, а таксама вынікі асыміляцыйнай палітыкі дзяржавы, так і не маглі знайсьці пазытыўнага вырашэньня[70].

Агонія віленскага выдавецкага асяродку

У міжваенную пару ў Вільні было засяроджана каля сотні работнікаў кнігі — аўтараў, перакладчыкаў, выдаўцоў, друкароў і кнігагандляроў. Нэгатыўная палітыка польскай дзяржавы і неспрыяльныя ўнутраныя ўмовы хоць і не замінялі выдавецкай дзейнасьці, але не спрыялі яе разьвіцьцю. Сілы гэтага асяродку пачалі слабець.

У міжваенную пару і падчас апошняй вайны натуральнай сьмерцю памерлі (у дужках псэўданімы): у 1921 г. кс. Аляксандар Астрамовіч (А. Зязюля), у 1922 г. Антон Лявіцкі (Ядвігін Ш.), у 1923 г. Ігнат Канчэўскі (І. Абдзіраловіч), у 1926 г. кс. Канстанцін Стаповіч (К. Сваяк), у 1934 г. Альбін Стаповіч, у 1938 г. Мікола Ільляшэвіч і Браніслаў Туронак, у 1939 г. Вячаслаў Адамовіч (Дзяргач), у 1940 г. кс. Баляслаў Пачопка і ў 1944 г. кс. Ільдэфонс Бобіч.

Адносна значная група работнікаў добраахвотна эмігравала ў СССР. Ужо ў пачатку дваццатых гадоў паехалі С. Чыжэўскі, Антон Грыневіч, Максім і Леаніла Гарэцкія, Аркадзь і Аляксандра Смолічы, Леапольд Родзевіч і Уладзімер Жылка. Пасьля разгрому Грамады і "Змаганьня" да іх далучыліся Браніслаў Тарашкевіч, Ігнат Дварчанін, Пётар Мятла і Сымон Рак–Міхайлоўскі. Амаль усе яны загінулі ў савецкіх турмах і лягерох, у ссылцы.

---

[68] У 1919—1926 гг. у Літве было выдадзена больш за 30 беларускіх кніжак. Найбольш кніжак (15) выйшла на сродкі Міністэрства Беларускіх Справаў у Коўне. Паводле дамоўленасьці зь віленскім Беларускім Навуковым Таварыствам, частка накладаў прызначалася для патрэбаў беларускіх школаў на тэрыторыі Польшчы.

[69] Каталёг (кнігасьпіс) беларускіх кніг кнігарні "Пагоня". Вільня, 1937.

[70] Сялянская Ніва. 1926. № 4; Калосьсе. 1935. № 1; і іншыя.

Сьпіс псэўданімаў і крыптанімаў

А.В.	Язэп Германовіч, кс.
Абдзіраловіч І.	Ігнат Канчэўскі
Адважны В.	Язэп Германовіч, кс.
Башкір Я.	Ян Пачопка
Быліна Я.	Ян Семашкевіч, кс.
Хмара С.	Сяргей Сіняк
Дзядзька Пранук	Францішак Умястоўскі
Дзяргач	Вячаслаў Адамовіч
І.Р.	Язэп Рэшаць, кс.
І.С.	Іосіф Сталін
Ініцкі У.	Уладзіслаў Паўлюкоўскі
Івэрс А.	Іван Місько
Я.Б.	Ян Семашкевіч, кс.
Ядвігін Ш.	Антон Лявіцкі
Каганец К.	Казімер Кастравіцкі
Казлоўшчык У.	Уладзіслаў Казлоўскі
М.А.	Фабіян Абрантовіч, кс.
М.Р.	Мар'ян Рапацкі
Малады Дзядок	Сяргей Новік
Н.К.	Казімер Найловіч, кс.
Навіна А.	Антон Луцкевіч
Нарцызаў Я.	Язэп Драздовіч
П.З.	Пётар Татарыновіч, кс.
Паляшук	Сяргей Паўловіч
Рушчанец Я.	Язэп Рэшаць
С.К.	Канстанцін Стаповіч
С.С.	Станіслаў Станкевіч
Скарыніч Б.	Ян Станкевіч
Сучасны	Леапольд Родзевіч
Суліма	Уладзімер Самойла
Сваяк К.	Канстанцін Стаповіч, кс.
Улад-Ініцкі	Уладзіслаў Паўлюкоўскі
Унук В.	Антон Падзява, кс.
Ваг	Вінцэнт Гадлеўскі, кс.
Васілёк М.	Міхал Касьцевіч
Верас Зоська	Людвіка Войцік
Задума П.	Пётар Татарыновіч, кс.
Зязюля А.	Аляксандар Астрамовіч, кс.

У сакавіку 1938 г. кс. Язэп Рэшаць эміграваў у Злучаныя Штаты, дзе ўжо быў кс. Ян Тарасэвіч. У гэтым жа годзе на загад адміністрацыйных уладаў былі выселеныя зь Вільні кс. Язэп Германовіч (В. Адважны), Адам Станкевіч і Ўладзіслаў Талочка, інжынэр Адольф Клімовіч і клерык кляштару айцоў марыянаў у Друі Антон Падзява.

У 1939 быў арыштаваны і адпраўлены ў лягер у Бярозе Картускай Уладзіслаў Паўлюкоўскі (У. Ініцкі), а таксама працаўнікі друкарні імя Францішка Скарыны Язэп Найдзюк і Альфонс Шутовіч. Больш за дзесяць месяцаў у гэтым лягеры правёў паэт Сяргей Сіняк (Хмара). Усе яны выжылі і пасьля канца II Польскай Рэспублікі вярнуліся дадому. Вярнуўся ў Вільню з ссылкі ў Слоніме таксама і кс. Адам Станкевіч і ў варунках Літоўскай Рэспублікі аднавіў выдавецкую дзейнасьць. Аднак на кароткі час.

Ужытыя скароты

БХД	Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя
Бел.	Беларуская, Беларускі
"Bieł. Krynica"	"Biełaruskaja Krynica"
БІГіК	Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры
БКВ	Беларускае Каталіцкае Выдавецтва
БСР Грамада	Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада
БВТ	Беларускае Выдавецкае Таварыства
БСРГ	Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада
"Chr. Dumka"	"Chryścjanskaja Dumka"
КПП	Камуністычная Партыя Польшчы
КРПП	Камуністычная Рабочая Партыя Польшчы
КПЗБ	Камуністычная Партыя Заходняй Беларусі
ТБШ	Таварыства Беларускай Школы
УСБ	Унівэрсытэт Сьцяпана Батуры ў Вільні
ВП	Польскае Войска
выд.	Выдавец, выданьне

Агонія віленскага выдавецкага асяродку ўзмацнілася за савецкай уладай, як увосень 1939 г., так і ў паваенныя гады. Былі арыштаваныя і загінулі ў савецкіх турмах, лягерох, некаторыя і ў Катыні, наступныя аўтары і выдаўцы: кс. Фабіян Абрантовіч, С. Бусел, Станіслаў Грынкевіч, Францішак Грышкевіч, Макар Краўцоў, Антон Луцкевіч (А. Навіна), Антон Неканда-Трэпка, Ян Пазьняк, Уладзімер Самойла (Суліма), кс. Адам Станкевіч, Мікола Шкялёнак, Францішак Умястоўскі (Дзядзька Пранук).

У савецкія лягеры былі высланыя Ян Багдановіч, Фабіян Ярэміч, Адольф Клімовіч, Мар'ян Пецюкевіч і арыштаваны ў Манджурыі кс. Язэп Германовіч. Ім удалося выжыць, і ў сярэдзіне пяцідзясятых яны выйшлі на волю.

У гады нямецкай акупацыі (1941—1944) загінулі ад рук наёмных забойцаў: Фабіян Акінчыц, кс. Станіслаў Глякоўскі, Уладзіслаў Казлоўскі (Казлоўшчык) і Францішак Аляхновіч, а арыштаваны менскім гестапа кс. Вінцэнт Гадлеўскі зьнік бязь вестак[71].

Напярэдадні вяртаньня Чырвонай Арміі летам 1944 г. эмігравалі на Захад: Натальля Арсеньнева, Тодар Ільляшэвіч, Язэп Малецкі, Радаслаў Астроўскі, Ян Станкевіч, Сяргей Сіняк (Хмара), Мікола Шыла, кс. Пётар Татарыновіч, Аляксей Васіленя. Тамсама пасьля дэмабілізацыі з арміі генэрала Андэрса засталіся Дамінік Аніська і кс. Язэп Германовіч — пасьля яго вызваленьня зь лягеру ў СССР.

Прытулак у Польшчы знайшлі Адам Більдзюкевіч, Ядвіга Грынкевіч, Язэп Найдзюк, Антон Падзява, Мар'ян Пецюкевіч, кс. Ян Семашкевіч (Я. Быліна), Антон Васілеўскі, Уладзіслаў Знамяроўскі і іншыя.

У Савецкай Беларусі пасьля другой сусьветнай вайны жылі і тварылі Язэп Драздовіч, Міхал Касьцевіч (М. Васілёк), Іван Місько (А. Івэрс), Міхась Машара, Яўген Скурко (М. Танк) і Рыгор Шырма.

Вільня апусьцела. У першыя паваенныя гады тут заставаліся толькі Людвіка Войцік (Зоська Верас) і Уладзіслаў Паўлюкоўскі (У. Ініцкі). У сярэдзіне пяцідзясятых гадоў у Вільню вярнуліся зь лягераў Ян Багдановіч, Фабіян Ярэміч і Адольф Клімовіч. Ува ўмовах Савецкай Літвы гэтая дробная жменька даваенных работнікаў беларускай кнігі не была здольная працягваць ранейшую дзейнасьць. Толькі Людвіка Войцік захавала

[71] У савецкай літаратуры і Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі сьцьвярджаецца, што Ф. Акінчыца і У. Казлоўскага забілі савецкія партызаны; невядомы забойца Ф. Аляхновіча; кс. Вінцэнт Гадлеўскі і кс. Станіслаў Глякоўскі зьнішчаныя нацыстамі. — *А.С.*

свой багаты архіў[72], а Адольф Клімовіч падрыхтаваў біяграфічны слоўнік беларускіх дзеячаў міжваеннай пары, рукапіс якога трапіў у Бібліятэку Беларускай Акадэміі Навук у Менску.

Дадатак

У дадатку пералічаныя кніжкі на беларускай мове, выдадзеныя ў 1921—1939 гг. у Польскай Рэспубліцы з падзелам на паасобныя гады выданьня. У бальшыні выпадкаў год выданьня вызначаўся на падставе інфармацыі, зьмешчанай на вокладцы кніжкі, а ў выпадку яе адсутнасьці выкарыстоўвалася інфармацыя з прэсы. Кніжкі кожнага году падаюцца ў альфабэтным парадку прозьвішчаў альбо псэўданімаў ці крыптанімаў аўтараў сучасным правапісам, а ў выпадку іх адсутнасьці — назваў кніжак. Прозьвішчы і псэўданімы аўтараў падаюцца ў арыгінальнай беларускай вэрсіі. У асобным сьпісе падаецца паказьнік псэўданімаў і крыптанімаў аўтараў і ў меры магчымасьці іх сапраўдных прозьвішчаў, за выняткам некалькіх агульнавядомых, як Купала, Колас і інш. Месца выданьня кніжкі ў Дадатку падаецца толькі тады, калі кніжка выйшла ня ў Вільні. Выданьні на кірыліцы падаюцца кірыліцай, на лацінцы — лацінкаю, а таксама, у меру магчымасьці, пазначаюцца выдавец, друкарня, аб'ём і наклад. Тэматычныя групы кніжак пазначаюцца наступнымі лічбамі:

I. школьныя падручнікі і пэдагагічная літаратура;
II. рэпэртуарная літаратура і сьпеўнікі;
III. мастацкая літаратура;
IV. рэлігійная літаратура;
V. грамадзка–палітычная літаратура;
VI. мовазнаўства, літаратуразнаўства, асьвета і культура;
VII. астатняя літаратура.

1921

Абдзіраловіч І. Адвечным шляхам. V, выд. БВТ, друкарня Клецкіна, 72 с.

Аляхновіч Ф. Нясконченая драма. II, выд. БВТ, друкарня "Друк", 72 с.

Аляхновіч Ф. Заручыны Паўлінкі. II, друкарня "Друк", 22 с.

Арытмэтычная тэрмінолёгія. I, выд. Беларускай Школьнай Рады, друкарня Клецкіна, 8 с.

Багушэвіч Ф. Дудка беларуская. III, выд. Знамяроўскага, друкарня "Друк", 64 с.

Bobič I. Niadzielašnija evanhielii i navuki. Č. 2, IV, vyd. "Krynicy", drukarnia "Druk", 74 s.

Bobič I. Niadzielašnija evanhielii i navuki. Č. 3, IV, vyd. "Krynicy", drukarnia "Druk", 68 s.

Гарэцкая Л. Родны край, першая пасьля лемантара кніжка да чытаньня. I, выд. БВТ, друкарня Клецкіна, 94 с.

Гарэцкая Л. Родны край, трэцяя і чацьвёртая пасьля лемантара кніжка да чытаньня. I, выд. Таварыства Беларускай Школы, друкарня Клецкіна, 208 с.

Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літаратуры. I, выд. і друкарня Клецкіна, 207 с.

Гарэцкі М. Мутэрка. II, друкарня Клецкіна, 20 с.

Гарэцкія М. і Г. Маскоўска–беларускі слоўнік. VI, выд. Знамяроўскага, 144 с.

Дэкляматар. Выд. М. Гарэцкі, 48 с.

[72] Значная частка архіву Л. Войцік згарэла. — *А.С.*

Зборнік "Беларускіх Ведамасьцей" № 1. VII, выд. М. Гарэцкі, друкарня "Друк", 80 с.
Зборнік "Беларускіх Ведамасьцей" № 2. VII, выд. М. Гарэцкі, друкарня "Друк", 14 с.
Зборнік "Беларускіх Ведамасьцей" № 3. VII, выд. М. Гарэцкі, друкарня "Друк", 16 с.
Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. I, выд. Знамяроўскага, друкарня "Друк", 112 с.
Канчар А. Клясавае, нацыянальнае і рэлігійнае змаганьне на Беларусі. V, выд. "Наша Думка", друкарня "Друк", 32 с.
Кісялёў А. Элемэнтарная альгэбра. I, выд. Беларускага Навуковага Таварыства, друкарня "Szwyturis", 82 с.
Kraskoŭski A. Biełaruskija ziołki. VII, vyd. "Krynicy", drukarnia "Druk". 24 s.
Навіна А. Пуцяводныя ідэі беларускае літаратуры. VI, выд. "Наша Думка", друкарня "Друк", 32 с.
Остэрлёф В. і Шустэр Ю. Сусьветная гісторыя. Ч. 2: Сярэднявечная гісторыя. I, выд. Беларускага Навуковага Таварыства, друкарня Клецкіна, 138 с.
Паўловіч А. Снапок. III, выд. Знамяроўскага, друкарня "Друк", 32 с.
Родзевіч Л. Сцэнічныя творы. II, выд. Знамяроўскага, друкарня "Друк", 34 с.
Смоліч Аляксандра. Зорка. I, выд. Беларускай Школьнай Рады, друкарня Клецкіна, 42 с.
Смоліч Аркадзь. Географія Беларусі. I, выд. і друкарня Клецкіна, 374 с.
Станкевіч Я. Беларуская правапісь з практыкаваньнямі. I, выд. БВТ, друкарня Клецкіна, 32 с.
Станкевіч Я. Паўкулі па–беларуску. VI, выд. ТБШ.
Чыжэўскі С. Коопэратары. VII, друкарня "Друк", 16 с.
Чыжэўскі С. Першыя крокі ўраду спажывецкага таварыства (коопэратыва). VII, выд. "Wileński Związek Współdzielczy", друкарня "Друк", 30 с.
Чыжэўскі С. У аб'яднаньні моц і іншыя апавяданьні з жыцьця беларускіх коопэратываў. Выд. аўтара, друкарня "Друк", 34 с.
Юрэвіч Г. Задачнік для пачатковае школы. I, выд. Беларускай Школьнай Рады, друкарня Клецкіна, 27 с.
Jadvihin Š. Uspaminy. V, vyd. Związku Krajowego [Krajovaj Suviazi. — ***Рэд.***], drukarnia "Druk", 63 s.

1922

Аляхновіч Ф. Птушка шчасьця. II, выд. Беларускага Музычна–Драматычнага Гуртка, друкарня "Друк", 38 с.
Аляхновіч Ф. Шчасьлівы муж. II, выд. Беларускага Музычна–Драматычнага Гуртка, друкарня Клецкіна, 68 с.
Bobič I. Niadzielašnija evanhielii i navuki. Č. 1, IV, vyd. "Krynicy", drukarnia "Druk", 70 s.
Дзядзька Пранук. Стася. III, выд. Знамяроўскага, друкарня "Друк", 31 с.
Домбаль Т. Прамова перад Акружным судом у Варшаве. V, 34 с.
Гутоўскі У. Сурдут і сярмяга. II, выд. БВТ, друкарня Клецкіна, 58 с.
Кісялёў А. Элемэнтарная альгэбра. Ч. 2, I, выд. БВТ, друкарня "Szwyturis", 164 с.
Неканда–Трэпка А. Фізыка (мэханіка, цяплыня). I, выд. БВТ, друкарня Клецкіна, 228 с.
Остэрлёф В. і Шустэр Ю. Сусьветная гісторыя. Ч. 3: Гісторыя новых часаў. I, выд. Беларускага Навуковага Таварыства, друкарня Клецкіна, 150 с.
П'есы. II, выд. Знамяроўскага, друкарня "Друк", 32 с.
Родзевіч Л. Беларусь (вершы). III, друкарня "Друк", 32 с.

Рэзалюцыі III партыйнай канфэрэнцыі Камуністычнай Рабочай Партыі Польшчы. V, выд. КРПП, 30 с.

Смоліч Аляксандра. Зорка. Першая навука чытаньня і пісаньня. I, выд. БВТ, друкарня Клецкіна, 62 с.

Тарашкевіч Б. Беларуская граматыка для школ. I, выд. БВТ, друкарня Клецкіна, 62 с.

1923

Вагнэр J (Мікалай? — ***Рэд.***). Апавяданьне аб жывёлах. I, выд. і друкарня Клецкіна, 27 с.

Гарэцкая Л. Родны край, другая кніжка пасьля лемантара. I, выд. і друкарня Клецкіна, 156 с.

Гарэцкі М. Хрэстаматыя беларускае літаратуры XI в. — 1905 г. I, выд. і друкарня Клецкіна, 264 с.

Грыневіч А. Навука сьпеву. I, выд. аўтара, друкарня Левіна, 40 с.

Дубоўка У. Строма (вершы). III, выд. "Наша Будучына", друкарня "Друк", 30 с.

Езавітаў К. Становішча беларускай школы ў Латвіі. VI, друкарня Бэкера, 28 с.

Жылка У. Уяўленьне (вершы). III, выд. "Новае Жыцьцё", друкарня Гарбэра, 24 с.

Ziaziula A. Alenčyna viasielle. II, vyd. "Krynicy", drukarnia Kleckina, 27 s.

Колас Я. У палескай глушы. III, выд. і друкарня Клецкіна, 186 с.

Купала Я. Шляхам жыцьця. III, выд. і друкарня Клецкіна, 272 с.

Купрын А. Алеся (апавяданьні). III, выд. і друкарня Клецкіна, 83 с.

Луцкевіч А. Як вучыць у новай школе? I, выд. Беларускай Гімназіі ў Вільні, друкарня Двожэца (Dworzeca), 14 с.

Макманус. Ірляндзкія народныя казкі. III, выд. і друкарня Клецкіна, 148 с.

Нарцызаў Я. Пабрацімы і вялікая шышка. III, выд. і друкарня Клецкіна, 64 с.

Пачопка Я. Малочная карова. VII, выд. "Воля Народу", друкарня Левіна, 84 с.

Пачопка Я. Пчолы і як вадзіць іх у рамовых вульлях. VII, выд. БВТ, друкарня Левіна, 190 с.

Працэс 45-ці беларусаў у Беластоку. V, выд. Беларускага Дэпутацкага Клюбу, друкарня Двожэца (Dworzeca), 394 с.

Рак-Міхайлоўскі С. Арытмэтычны задачнік для пачатковых школ. I, выд. і друкарня Клецкіна, 46 с.

Смоліч А. Географія Беларусі. I, выд. і друкарня Клецкіна, 367 с.

Суліма. Што такое "Вызваленьне" зь беларускага пункту гледжаньня. V, друкарня Левіна, 44 с.

Сучасны. П. С. Х. II, выд. Беларускага Грамадзянскага Згуртаваньня, друкарня Бэкера, 20 с.

Сцэнічныя творы для дзіцячага тэатру. II, выд. Знамяроўскага, друкарня "Друк", 44 с.

Тарас на Парнасе. III, выд. С. Станкевіча, друкарня "Друк", 16 с.

Тарашкевіч Б. Прамова на X соймавым паседжаньні. V, друкарня Гарбэра.

Ядвігін Ш. Бярозка (апавяданьне). III, выд. і друкарня Клецкіна, 48 с.

1924

Аляхновіч Ф. Беларускі тэатар. VI, выд. Беларускага Грамадзянскага Згуртаваньня, друкарня "Люкс", 114 с.

Аляхновіч Ф. Пан міністар. II, выд. "Голас Беларуса", друкарня Бэкера, 54 с.

Астроўскі Р. Космографія. I, выд. БВТ, літаграфія, 84 с.

Bylina J. Na pryźbie. II, vyd. BVT, drukarnia Bekera, 56 s.

Верас З. Беларуска–польска–расейска–лацінскі батанічны слоўнік. VI, выд. "Голас Беларуса", друкарня Бэкера, 76 с.

Гарэцкі М. Гісторыя беларускае літэратуры. I, выд. аўтара, друкарня Клецкіна, 207 с.

Дзяргач. Тыпы Палесься. III, друкарня "Люкс", 129 с.

Жылка У. На ростані (вершы). III, выд. БВТ, друкарня Левіна, 48 с.

Заходняя Беларусь. Зборнік грамадзкае мысьлі, навукі, літаратуры, мастацтва. VI, выд. БВТ, друкарня Вытворчага Каапэратыву, 155 с.

Каляда Б. Страшны вораг. Кніжка пра гарэлку. VII, выд. аўтара, друкарня Левіна, 38 с.

Констытуцыя Польскае Рэспублікі 17 III 1921 і Закон 10 I 1920 аб польскім грамадзянстве. VII, выд. "Голас Беларуса", друкарня Левіна, 119 с.

Лермантаў М. Мцыры. III, выд. "Змаганьне", друкарня Бэкера, 42 с.

Лёсік Я. Ня ўсе разам ягамосьці. II, выд. БВТ, 32 с.

Неканда–Трэпка А. Аналітычная геомэтрыя. I, выд. БВТ.

Неканда–Трэпка А. Фізыка (акустыка, оптыка). I, выд. БВТ, літаграфія, 76 с.

Неканда–Трэпка А. Фізыка (магнэтызм, электрыка). I, выд. БВТ.

Прамовы дэпутатаў Беларускага Пасольскага Клюбу ў польскім Сойме. V, выд. "Сын Беларуса", друкарня Левіна, 48 с.

Рубакін Н. Расказы аб вялікіх падзеях розных часаў і народаў. VII, выд. і друкарня Клецкіна, 183 с.

С.К. Янка Канцавы. II.

Сваяк К. Мая ліра. III, выд. БВТ, друкарня Мотус, 112 с.

Смоліч Аляксандра. Зорка. I, выд. БВТ, 80 с.

Суліма. Які "самаўрад" гатуе беларускаму народу Польская Рэспубліка? V, выд. "Голас Беларуса", друкарня Левіна, 32 с.

Суліма. Прафэсар Зьдзяхоўскі аб беларускай душы. VI, выд. "Змаганьне", друкарня Левіна, 20 с.

Суседзкая Л. Фізыка для малодшых клясаў. I, выд. БВТ.

Трактат паміж галоўнымі саюзнымі і ставарышанымі дзяржавамі ды Польшчаю падпісаны ў Вэрсалі 28.6.1919 г. VII, выд. "Голас Беларуса", друкарня Бэкера, 31 с.

1925

Аляхновіч Ф. Дрыгва. II, выд. Часовай Беларускай Рады, 64 с.

Астроўскі Р. Беларускі правапіс. I, выд. і друкарня Клецкіна, 102 с.

Беларускі сьпеўнік. II, выд. С. Станкевіч, 32 с.

Вульфіюс А.Х. Навейшая гісторыя. I, выд. БВТ, друкарня Левіна, 122 с.

Галоўныя асновы мэтадызму. IV, друкарня Левіна, 16 с.

Луцкевіч А. Вільня ў беларускай літаратуры. VI, 15 с.

Пачопка Я. Гароднічтва. VII, выд. БВТ, 55 с.

Песьні духоўныя з гары Сіонскай. (кірыліцай і лацінкай), IV, выд. Місіі Мэтадыстаў у Варшаве, 19 с.

Рыбкін Н. Геомэтрычны задачнік. I, выд. БВТ, друкарня Левіна, 115 с.

Служба Божая. IV, выд. Місіі Мэтадыстаў у Варшаве.

Станкевіч А. Доктар Францішак Скарына першы друкар беларускі 1525—1925. V, выд. Беларускага Навуковага Таварыства, 56 с.

Stankievič A. Doktar Francišak Skaryna pieršy drukar biełaruski 1525—1925. V, vyd. "Krynicy", drukarnia "Pogoń–Pax", 59 s.

1926

Бах С. Цар-голад. V, выд. Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады, друкарня "Скарына", 41 с., 20 000 ас.

Bellami. Kazka ab vadzie. I, vyd. BSR Hramady, 14 s., 10 000 as.

Більдзюкевіч А. Асновы грамадзкай гаспадаркі. VII, выд. аўтара, друкарня "Скарына", 180 с.

Блок А. Дванаццаць. III, 29 с.

Bylina J. Vybary staršyni. II, vyd. "Bieł. Krynicy". Drukarnia "Skaryna", 24 s.

Друцкі-Падбярэскі Б. Байкі. III, друкарня "Nowoczesna", 62 с.

Евангельле паводле Яана. IV, выд. і друкарня "Компас", Лодзь, 62 с.

Евангельле паводле Лукі. IV, выд. і друкарня "Компас", Лодзь, 86 с.

Гарэцкая Л. Родны край. I, выд. БВТ, друкарня "Żaibas", 96 с.

Гарэцкая Л. Родны край. Хрэстаматыя. I, выд. БВТ.

Hołub-Bučynskaja M. Alkahol i baraćba z jim. VII, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 24 s.

Гурскі А. Наглядны арытмэтычны задачнік. I, выд. і друкарня Клецкіна, 39 с.

Joergensen J. Prypovieści. IV, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 55 s.

З усіх бакоў польскае дзяржаўнасьці. V.

Інструкцыя для зьбіраньня слоўніка-тэрмінолёгічнага матэр'ялу ў беларускай мове. VI, друкарня Левіна, 8 с.

Kantyčka. Sabrańnie nabožnych piesień. IV, vyd. "Bieł. Krynicy".

Куды і як эміграваць? VII, выд. Знамяроўскага, 16 с.

Лермантаў М. Дэман. III, выд. БВТ, 44 с.

Małaziamielnik. Ci maje być u Polšču praviedziena ziamielnaja reforma? VII, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 12 s.

Паўловіч С. Сьвяшчэнная гісторыя Старога Завету. IV, выд. аўтара, друкарня Левіна, 164 с.

Прамовы дэпутатаў Беларускага Пасольскага Клюбу. V, друкарня Левіна, 16 с.

Прамовы дэпутатаў Соймавага Клюбу БРС Грамады. Друкарня Левіна, 82 с.

Родзевіч Л. Сцэнічныя творы. II.

Сваяк К. Чарку дай, браце. II, выд. "Сялянская Ніва", друкарня "Скарына", 13 с.

Станкевіч С. Сьмех ня грэх (гумарыстычныя вершы). Выд. А. Яцыны, друкарня "Скарына", 64 с.

Стаповіч А. Дзе чутны мовы нашай гукі. II.

Stapovič K. Hołas dušy. Malitveńnik dla biełarusau-katalikou. IV, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Pax", 176 s.

Сянкевіч Г. Бартэк пераможнік. III, выд. БВТ, друкарня Левіна, 83 с.

Цёшча ў дом — усё ўверх дном. II, 38 с.

1927

Арсеньнева Н. Пад сінім небам. III, выд. і друкарня Клецкіна, 144 с.

Багдановіч М. Вянок (вершы). III, выд. і друкарня Клецкіна, 118 с.

Bahuševič F. Dudka biełaruskaja. III, vyd. Biełaruskaj Sialanskaj Partyji, drukarnia "Skaryna", 48 s.

Башкір Я. Гурток. II, выд. Беларускай Сялянскай Партыі, друкарня "Скарына", 32 с.

Браславіч П. І нас разбудзілі. II.

Васілеўскі Я. Дахапаліся. II, выд. А. Яцына, друкарня "Скарына", 16 с.

Васілеўскі Я. Скарб. III, выд. "Беларуская Хатка", 16 с.
Вясёлы К. (Аўдзей В.). Ня розумам сьцяміў, а сэрцам. II, выд. П. Мятла, друкарня Клецкіна, 48 с.
Дварчанін І. Хрэстаматыя новай беларускай літаратуры. I, выд. БВТ, 498 с.
Додэ А. Сакрэт дзядзькі Карніла. III, выд. "Пагоня", друкарня "Скарына", 56 с.
Друцкі-Падбярэскі Б. Пернік. III, друк Баеўскага, 10 с., 1000 ас.
Евангельле паводле Мацьвея. IV, выд. і друкарня "Компас", Лодзь, 80 с.
Галубок У. Суд. II, выд. БВТ, 32 с.
Harotny S. Lekary i leki. II, vyd. BVT, drukarnia "Nowoczesna", 80 s.
Гарэцкі М. Атрута. II, выд. БВТ, друкарня Клецкіна, 16 с.
Hrynkievič S. Ab teatry. VI, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 53 s., 500 as.
Hrynkievič S. Arlanio. III, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 52 s.
Hrynkievič S. Žanimstwa pa radyjo. II, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 38 s.
Hrynkievič S. Narod. Vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 31 s., 1000 as.
Hryškievič F. Viesnavyja melodyji. III, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 77 s.
З роднай нівы (зборнік). VII, выд. БІГіК, друкарня "Скарына", 141 с.
І.Р. Асновы хрысьціянскай веры для беларускага народу. IV, 45 с.
Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. I, выд. Знамяроўскага, друк "Крэйнэс і Кавальскі", 116 с.
Kazłoŭščyk U. Fizyčnaje vychavańnie hramadzianstva. VII, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 88 s., 1000 as.
Колас Я. Выбраныя творы. III, выд. БВТ, 78 с.
Колас Я. Казкі жыцьця. III, выд. і друкарня Клецкіна, 99 с.
Kołas J. Prapaŭ čałaviek, Niomnaŭ dar, Toŭstaje palena. III, vyd. Biełaruskaj Sialanskaj Partyji, drukarnia "Skaryna", 48 s.
Купала Я. Адвечная песьня. II, выд. Беларускай Сялянскай Партыі, друкарня "Пакс", 32 с., 2000 ас.
Купала Я. Паўлінка. II, выд. І. Мятла, 63 с.
М.Р. Палажэньне спажыўца. VII, выд. Зьвязу Спажывецкіх Каапэратываў, 34 с.
Малады Дзядок. Ёлка Дзеда Мароза. II, выд. ТБШ, 16 с.
Міхаіл. Хрыстовы золак (вершы). IV, друкарня "Скарына", 62 с.
Неканда-Трэпка А. Аналітычная геомэтрыя. I, выд. аўтара, літаграфія, 44 с.
Нэйтральнага месца няма, IV, выд. і друк "Компас", Лодзь, 11 с.
Ожэшко Э. У зімовы вечар. II, выд. І. Мятла і І. Дварчанін, 31 с.
П.С. Ніва і краскі. III, выд. Беларускай Сялянскай Партыі, 102 с.
Пачопка Я. Дурнішча. Народная казка зь Дзісеншчыны. III, выд. і друк Клецкіна, 16 с.
Прыпавесьць пра блуднага сына (Лукі, 15). IV, выд. і друк "Компас", Лодзь, 36 с.
Rešeć J. Karotki katechizm dla biełarusaŭ-katalikoŭ. IV, vyd. koštam metrapalita vilenskaha, drukarnia "Skaryna". 46 s.
Sadok dla našych dzietak (apaviadańni). III, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 40 s.
Sałaŭjova P. (Allegro), Cudoŭnaja noč. II, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 38 s.
Сцэнічныя творы. II, выд. "Пагоня", друкарня "Скарына", 70 с.
Смоліч А. Зорка. I, выд. БВТ, друк Бэкера, 63 с., 10 000 ас.
Смоліч А. Зорка. I, выд. БВТ, друкарня "Пакс", 80 с., 2000 ас.
Сьвятыя віленскія мучанікі Антон, Іван і Астап — патроны Беларусі. IV, адбітка з праваслаўнага календара на 1927 г., 12 с.
Уліцын Аграном. Суд над трохпалёўкай. II, выд. БВТ, 30 с.
Ядвігін Ш. Дзед Завала. III, выд. Знамяроўскага, 14 с.

1928

А.К. Казкі. III, выд. Знамяроўскага, 32 с.

A.V. Jak Kaziuk sabraŭsia da spoviedzi. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 68 s., 1000 as.

Васіленя А. Спажывецкі каапэратыў і праца ў ім. VII, выд. аўтара, друкарня Левіна, 35 с., 2000 ас.

Васілеўскі А. Беларускі соньнік. VII, выд. аўтара, друкарня "Скарына", 67 с., 2000 ас.

Гнатышак М. З сучаснае мастацкае прозы Нямеччыны. VI, выд. БВТ, друк Крэйнэс і Кавальскі, 27 с., 2000 ас.

Грыневіч А. Дзяцячы сьпеўнік. II, выд. аўтара.

Hrynkievič A. Carkva, Pomsta, Viaźnica. III, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 126 s., 800 as.

Друцкі–Падбярэскі Б. Байкі, гумар, сатыра. III, выд. і друкарня Клецкіна, 64 с., 1000 ас.

Ініцкі У. Сон Гаўрылы і розныя вершы. III, выд. Знамяроўскага, друк "Notes i Szwajlich", 32 с., 1500 ас.

Kazłoŭščyk U. Ab fizyčnym vychavańni u biełarusaŭ. VII, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 127 s., 1000 as.

Караленка У. Судны дзень. III, выд. БВТ, друкарня Левіна, 87 с.

Караленка У. Сьляпы музыка. III, выд. і друк Клецкіна, 163 с., 1000 ас.

Колас Я. Нёмнаў дар і іншыя расказы. III, выд. і друк Клецкіна, 78 с., 1000 ас.

Колас Я. Новая зямля. Ч. 1, III, выд. Беларускай Сялянскай Партыі, друк Бэкера, 122 с., 2000 ас.

Колас Я. Новая зямля. Ч. 2, III, выд. Беларускай Сялянскай Партыі, друкарня "Пакс", 123—186 с.

Колас Я. Сымон Музыка. III, выд. "Пагоня", друкарня "Скарына", 211 с., 2000 ас.

Крапіўніцкі М. Па рэвізіі. Каганец К. Модны шляхцюк. II, выд. БВТ, друкарня Левіна, 32 с., 2000 ас.

Крапіўніцкі М. Пашыліся у дурні. II, выд. ТБШ, друкарня "Пакс", 32 с., 2000 ас.

Kupała J. Adviečnaja pieśnia. II, vyd. BVT.

Купала Я. На Куцьцю. II, выд. Таварыства "Прасьвета", друкарня "Скарына", 16 с., 1000 ас.

Лугам, лугам зеляненькім (раманс). II, выд. БВТ.

Луцкевіч А. За дваццаць пяць гадоў. V, выд. БВТ, друкарня "Скарына", 52 с., 1000 ас.

M.A. Boh. Filozofičny narys. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 24 s.

Машара М. Малюнкі (вершы). III, выд. Л. Войцік, друкарня "Скарына", 16 с.

Наваградчына ў 1926—1930 г.г. V, выд. "Беспарцейны блёк спаўпрацы з урадам", друк "Wydział powiatowy w Nowogródku", 14 с.

Niemirovič–Dančenko V. Stary zamak. III, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 39 s., 1000 as.

P.Z. Ziarniatki z rodnaje junackaje nivy. V, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 15 s., 1000 as.

Пазашкольная асьвета. Культурна–асьветная праца ў гуртках ТБШ. VI, выд. ТБШ, друкарня "Скарына", 15 с., 300 ас.

Паўловіч С. Аб арганізацыі беларускае працоўнае школы. VI, выд. БВТ, друкарня "Скарына", 16 с., 300 ас.

Пачопка Я. Як выбраць добрага каня. VII, выд. Беларускай Радыкальна–Сялянскай Партыі, 31 с., 2000 ас.

Рунь веснаходу. Зборнік твораў паэтаў і пісьменьнікаў Заходняй Беларусі. III, выд.

БВТ, друк Крэйнэс і Кавальскі, 48 с., 2000 ас.

Rešeć J. Z historyi apolohietyki chryścijanskaj. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 103 s., 1000 as.

Сцэнічныя творы. II, выд. БВТ, друкарня Левіна, 48 с., 3000 ас.

С.С. Беларускі дэкляматар. II, выд. Знамяроўскага, друкарня "Пакс", 64 с., 2000 ас.

Siemaškievič J. Ružaniec Najśviaciejšaj Dzievy Maryi. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 35 s.

Stankievič A. Biełaruskaja mova ŭ škołach Biełarusi XVI—XVIII st. V, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 19 s., 1000 as.

Stankievič S. Z majho vakonca. Zbornik vieršaŭ. III, vyd. J. Hapanoviča, drukarnia "Skaryna", 64 s., 1500 as.

Талстой Л. Для дзяцей. III, выд. і друк Клецкіна, 158 с.

Талстой Л. Ці шмат чалавеку трэба зямлі і другія апавяданьні. III, выд. Знамяроўскага, друк "Zorza", 31 с., 1500 ас.

Tarasievič J. Zło i lakarstwa na jaho. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 32 s., 1000 as.

Tatarynovič P. Śv Izydar chlebarob. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 31 s., 1000 as.

Твэн М. Прынц і жабрак. III, выд. і друк Клецкіна, 215 с.

Turonak B. Hygijena uzhadavańnia dziciaci. VII, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 40 s., 1000 as.

У коопэрацыі будучына. VII, выд. БВТ, 16 с.

1929

A.V. Kaziukovaje žanimstva. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 77 s., 1000 as.

Астроўскі Р. Арытмэтычны задачнік для пачатковых школ. Ч. 1, для вучняў, I, выд. і друкарня Клецкіна, 136 с., 1000 ас.

Астроўскі Р. Арытмэтычны задачнік для пачатковых школ. Ч. 2, для настаўнікаў, I, літаграфія, 112 с.

Беларускі сьпеўнік з нотамі. II, выд. БВТ, 16 с.

Васіленя А. Залажэньне спажывецкага каапэратыву на вёсцы. VII, выд. аўтара, друкарня Левіна, 16 с., 2000 ас.

Васілёк М. Шум баравы. III, выд. Р. Шырмы, друкарня Левіна, 127 с., 1000 ас.

Гарэцкая Л. Родны край. I, выд. і друк Клецкіна, 144 с., 1000 ас.

Дамарослы. Аматарскі зборнік лірычных твораў. III, выд. J. (? — ***Рэд.***) Харытановіч, друкарня "Скарыны", 32 с.

Друцкі-Палбярэскі Б. Падручны беларуска-польскі слоўнік. VI, выд. і друкарня Клецкіна, 324 с.

Дыфоў Д. Робінзон Крузо. III, выд. Беларускай Сялянскай Партыі, друкарня "Пакс", 96 с., 1000 ас.

Завадовіч Р. Князь Марцыпан. II, выд. "Заранка", друкарня "Скарына", 16 с., 1000 ас.

І.С. Марксызм і нацыянальнае пытаньне. V, выд. Беларускага Пасольскага Клюбу "Змаганьне", друк Левіна, 68 с., 2000 ас.

Ігараў J (? — ***Рэд.***). Сірата. II, друк "Zorza", 8 с., 1500 ас.

Ільляшэвіч Х. Веснапесьні. III, выд. Ніны Ільляшэвіч, друкарня Левіна, 71 с., 1000 ас.

Ініцкі У. Клім бабаю і іншыя жарты. III, выд. Знамяроўскага і Будзькі, друкарня "Пакс", 32 с.

J.B. Pieśni žalby. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 16 s.

Колас Я. Новая зямля. Ч. 3, III, выд. Беларускай Сялянскай Партыі, друкарня "Пакс".

167—295 с., 1000 ас.

Крывіцкі В.J. (? — ***Рэд.***) і Выкачка. Як палепшыць пяскавую глебу. VII, выд. "Саха", друкарня "Скарына", 24 с., 1000 ас.

Lubič-Majeŭski S. Pieršy pramień. I, Dziaržaŭnaje Vydaviectva Školnych Knižak, Lvoŭ, 118 s.

M.A., Całaviek. Filozofična-hramadzki narys. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryny", 16 s.

Маркс К. Барацьба клясаў у Францыі 1848—1850. V, выд. Беларускага Пасольскага Клюбу "Змаганьне", друк Левіна, 152 с., 2000 ас.

Навіна А. Адбітае жыцьцё. VI, выд. БВТ, друкарня Левіна, 145 с.

Ožeško E. Cham. II, vyd. Biełaruskaj Sialanskaj Partyji, drukarnia "Skaryna", 16 s.

Паляшук. Некалькі ўваг аб "беларускім" "Лемантары" Ст. Любіч-Маеўскага. VI, выд. Таварыства "Рунь" у Беластоку, друкарня "Скарыны", 16 с., 400 ас.

(Paźniak J.) Samaŭrad viaskovych hmin. V, "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 15 s.

Паўловіч А. Снапок. III, выд. Знамяроўскага, 39 с.

Паўловіч С. Пішы самадзейна. I, выд. аўтара, друкарня "Скарыны", 88 с., 4000 ас.

Паўловіч С. Мэтадычныя ўвагі да пасобніка "Пішы самадзейна". I, выд. аўтара, друкарня "Скарына", 15 с.

Песьні духоўныя (працяг). IV, выданьне мэтадыстаў, друкарня "Pogoń-Pax", 16 с., 500 ас.

Плеханаў Г.В. Аснаўныя пытаньні марксызму. V, выд. Беларускага Пасольскага Клюбу "Змаганьне", друк Левіна, 125 с., 2000 ас.

(Рэймонт В.С.) Абарона зямлі. III, выд. Беларускай Сялянскай Партыі, друкарня "Zorza", 8 с.

Stankievič A. Rodnaja mova ŭ śviatyniach. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 192 s., 900 as.

Stapovič A. Biełarusy i dziaržaŭnaja niezaležnaść. V, vyd. "Biel. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 16 s., 1000 as.

Тагабочны. Змагары за ідэю. V, выд. Беларускага Пасольскага Клюбу "Змаганьне", друк Левіна, 75 с., 2000 ас.

Талстой Л. Ад чаго зло на сьвеце. III, выд. Знамяроўскага, 23 с., 1500 ас.

Тарас на Парнасе. III, выд. С. Станкевіча, друкарня "Скарына", 15 с., 2000 ас.

Тарашкевіч Б. Беларуская граматыка для школ. I, выд. Веры Тарашкевіч, друкарня "Скарына", 143 с.

Шырма Г. Беларускія народныя песьні. II, выд. аўтара, друкарня "Скарына", 63 с.

Энгельс Ф. Разьвіцьцё соцыялізму ад утопіі да навукі. V, выд. Беларускага пасольскага клюбу "Змаганьне", друкарня Левіна, 136 с., 2000 ас.

1930

A.V. Jak Hanula źbirałasia ŭ Arhientynu. III, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 30 s., 1000 as.

Астроўскі Р. Беларускі правапіс. I, выд. і друкарня Клецкіна, 148 с., 1000 ас.

Bahuševič F. Dudka biełaruskaja. III, vyd. BIHiK, drukarnia "Skaryna", 56 s., 1000 as.

Bahuševič F. Dudka biełaruskaja i Smyk biełaruski z krytyčnym narysam A. Stankieviča. III, vyd. BIHiK, drukarnia "Skaryna", 140 s., 1000 as.

Bahuševič F. Smyk biełaruski. III, vyd. BIHiK, drukarnia "Skaryna", 32 s., 1000 as.

Беларускія (крывіцкія) казкі з трыкалёрнымі малюнкамі. III, выд. Беларускай сялянскай партыі.

Божая ліра. Хрысьціянскія песьні. IV, выд. "Southern Trade", 186 с., 1500 ас.

Bylina J. Daroha Kryža — nabaženstva na Vialiki Post. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia

"Skaryna", 32 s. 1000 as.

Hadleŭski V. Historyja śviataja abo biblijnaha Staroha Zakonu. IV, vyd. BKV, drukarnia "Skaryna", 151 s., 1500 as.

Zaduma P. Kupalle. III, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 70 s.

Kazłoŭščyk U. Płač biełaruskaj staronki matki pa dzietkach svaich renehatach. III, vyd. J. Bahdanovič, drukarnia "Skaryna", 24 s., 1000 as.

Kazłoŭščyk U. Biełaruskija narodnyja pieśni z Sakolskaha pavietu. II, vyd "Biel. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 40 s., 1000 as.

Курс нядзельнае школы. IV, выд. "Southern Trade", друкарня Знамяроўскага, 142 с.

Маркс К. 18–е брумэра Луі Бонапарта. V, выд. Беларускага Пасольскага Клюбу "Змаганьне", друк Левіна, 119 с., 2000 ас.

Наваградчына ў дзясятыя ўгодкі незалежнасьці Рэчыпаспалітай Польскай. V, выд. "Nowogrodzki Komitet Społeczny Obchodów 10 rocznicy niepodległości Polski", друк "Wydział powiatowy w Nowogródku", б.м.в., 29 с.

Svajak K. Kupalle. Fantazija–misteryum. III, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 15 s., 300 as.

Смоліч А. Зорка. I, выд. БВТ, друкарня "Пакс", 80 с., 1000 ас.

Станкевіч А. Вітаўт Вялікі і беларусы. V, выд. Беларускага Народнага Камітэту, друкарня "Скарына", 31 с., 1000 ас.

Stankievič A., Francišak Bahuševič, jaho žyćcio i tvorčaść. VI, vyd. BIHiK, drukarnia "Skaryna", 50 s., 1000 as.

Хрысьціянскія беларускія мэтодыстычныя абходы. IV, выд. "Southern Trade", друкарня Левіна, 39 с., 500 ас.

1931

A.V. Adam i Anielka. III, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 69 s., 1000 as.

Акінчыц Ф. Чаму гэта так сталася? (да справы выезду заграніцу б. правадыра Грамады). V, друкарня Знамяроўскага, 16 с., 10 000 ас.

Біанкі В. Лясныя хаткі. III, выд. Таварыства Беларускіх Жанчын, друкарня Левіна, 18 с., 500 ас.

Біанкі В. Мышанё Пік. III, выд. Таварыства Беларускіх Жанчын, друкарня Левіна, 42 с., 1000 ас.

Vah. Palityčnyja i hramadzkija kirunki ŭ minuŭščynie i sučasnaści. V, vyd, "Šlach Moładzi", drukarnia "Skaryna", 33 s., 1000 as.

Hareckaja L. Rodny kraj. I, vyd. BVT, drukarnia Levina, 96 s., 1000 as.

Драздовіч Я. Нябесныя бегі. VII, друкарня Двожэца, 24 с.

Ziaziula A. Z rodnaha zahonu. Zbornik vieršaŭ. III, vyd. ks. J. Siemaškieviča, drukarnia "Skaryna", 175 s., 1000 as.

Колас Я. Новая зямля. III, выд. БІГіК, друкарня "Скарына", 288 с., 1000 ас.

Колас Я. У глыбі Палесься. III, выд. і друкарня Клецкіна, 207 с., 800 ас.

N.K. Śviaty Rym. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 67 s.

Новы Запавет Госпада Нашага Ісуса Хрыста і Псальмы. IV, выд. Брытанскае і Замежнае Біблійнае Таварыства, Гельсынфорс, друк у Лодзі, 446 с., 25 000 ас.

Ruščaniec J. Pieršyja łastaŭki. II, vyd. BIHiK, drukarnia "Skaryna", 24 s., 1000 as.

Скарыніч Б. Нашто і як зьбіраці географічныя і асабовыя назовы беларускія. VI, выд. Беларускага Студэнцкага Саюзу, друкарня Левіна, 14 с., 1000 ас.

Stankievič A. Kazimier Svajak. Narys ab jahonaj ideolohii. V, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryny", 67 s., 1000 as.

Stankievič J. Novy lemantar dla biełaruskich dzietak. I, vyd. BVT, drukarnia Levina, 32

s., 800 as.

Тарашкевіч Б. Беларуская граматыка для школ. I, выд. БВТ, друкарня Левіна, 112 с., 800 ас.

Ярэміч Ф. Прамова на пасяджэньні Сойму 9.2.1931. V, выд. аўтара, друкарня "Скарына", 7 с., 2500 ас.

Ярэміч Ф. Прамова на пасяджэньні Сойму 2.10.1931. V, выд. аўтара, друкарня "Скарына", 7 с., 1500 ас.

1932

A.V. Betlejka. II, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 16 s., 600 as.

A.V. Kaniok-Harbuniok. III, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 88 s., 1000 as.

А.В. Унія на Палесьсі. IV, выд. Таварыства Ісуса, друкарня "Скарына", 16 с., 1000 ас.

Alchoŭski I. Jak žyviecca sialanstvu pad kamunistyčnaj uladaj? V, drukarnia Znamiaroŭskaha, 16 s., 2000 as.

Božaja Chvała. Malitaŭnik zakonu ajcoŭ Maryjanaŭ. IV, vyd., Źviaz ajcoŭ Maryjanaŭ u Drui, drukarnia "Skaryna", 83 s.

Бусел С. Матыльковыя расьліны. VII, выд. "Цэнтрасаюз", друкарня Левіна, 62 с., 1000 ас.

Голуб-Бучынская М. Што такое сухоты? VII, выд. аўтара, друкарня "Скарына", 14 с., 1000 ас.

Грыневіч А. Навука сьпеву. I, друкарня Левіна, 40 с.

Загінуў ці спасёны. IV, выд. і друк "Компас", Лодзь, 12 с.

Ільляшэвіч М. Кароткі нарыс псыхолёгіі. I, выд. аўтара, друкарня "Скарына", 47 с., 1000 ас.

Ільляшэвіч Х. Зорным шляхам. III, выд. БВТ, друкарня Левіна, 64 с., 500 ас.

Kazłoŭščyk U. Puty kachańnia. III, vyd. Znamiaroŭskaha, 92 s., 600 as.

Клімовіч А. Культура і палітыка. V, выд. "Bieł. Krynicy", друкарня "Скарына". 16 с., 500 ас.

Klimovič A. Leki na ździeki. VII, vyd. BIHiK, drukarnia "Skaryna", 32 s.

Klimovič A. Ziemlarobskaja čytanka. VII, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryny", 147 s., 1000 as.

Луцкевіч А. Янка Купала як прарок адраджэньня. VI, выд. аўтара, друкарня Левіна, 16 с., 1000 ас.

Pačorka B. Jak vučyć nas vieryć i žyć śviataja Chrystovaja Paŭsiudnaja Cerkva. IV, vyd. aŭtara, drukarnia "Skaryna", 16 s., 2000 as.

Русаковіч А. У краіне прымусу. V, выд. "Цэнтрасаюз", друкарня Левіна, 30 с., 4000 ас.

Русаковіч А. Што такое "калгасы"? V, выд. "Цэнтрасаюз", друкарня Левіна, 29 с., 4000 ас.

Русаковіч А. Ад волі — да прымусу. V, выд. "Цэнтрасаюз", друкарня Левіна, 26 с., 4000 ас.

Рэлігійнае жыцьцё на Беларусі. IV, выд. Беларускага Рэлігійна-грамадзкага Зьвязу, друкарня "Скарына", 64 с, 1000 ас.

Svajak K. Dzieja majej myśli, serca i voli. V, vyd, "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 250 s.

1933

A.V. Biełaruskija cymbały. (Zbornik vieršaŭ). III, vyd. BIHiK, drukarnia "Skaryna", 72

s., 1000 as.

Akінчыц Ф. Правакацыя беларускага народу (да справы б. старшыні Грамады Б. Тарашкевіча). V, друкарня Знамяроўскага, 36 с., 500 ас.

Aniśko D. Usio ŭ miłaści. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 52 s.

Babroŭski A. Čamu ciapier ciažka žyviecca ziemlarobam. V, drukarnia Znamiaroŭskaha, 16 s., 4000 as.

Barkoŭski S. "Kamsamoł" i jahonyja mety. V, drukarnia Znamiaroŭskaha, 15 s., 4000 as.

Беларуска–славянскі лемантар (буквар) і першая навука Закону Божага. Падарунначак добрым дзеткам. IV, выд. Праваслаўнай Мітраполіі ў Варшаве, Сынадальная друкарня, 122 с., 2000 ас.

Біанкі В. Мурзік. III, выд. Таварыства Беларускай Асьветы, друкарня Левіна, 133 с., 500 ас.

Брэжго Б. Замкі Віцебшчыны. V, друкарня Левіна, 35 с.

Віленчук А. Супраць расправы акупантаў над Б. Тарашкевічам. V, Беласток, выд. КПЗБ.

Hadleŭski V. Historyja śviataja abo biblijnaja Novaha Zakonu. IV, vyd, BKV, drukarnia "Skaryna", 186 s., 1500 as.

Ільляшэвіч М. Расейская палітыка на землях былога Беларуска–Літоўскага гаспадарства за панаваньня Кацярыны II і Паўлы I (1772—1801). V, друкарня Левіна, 24 с.

Ільляшэвіч Х. Ядвігін Ш. выд. Таварыства Беларускай Асьветы, друкарня Левіна, 37 с., 280 ас.

Жыткоў Б. Пра малпачку. III, выд. Таварыства Беларускай Асьветы, друкарня Левіна, 30 с., 500 ас.

Keturakis. Ameryka ŭ łaźni. II, vyd, "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 46 s., 1000 as.

Колас Я. У старых дубох. III, выд. Таварыства Беларускай Асьветы, друкарня Левіна, 62 с., 1000 ас.

Косаўскі J (? — ***Рэд.***). Для бліжніх. II, выд. "Самапомач", друкарня "Скарына", 55 с. 1000 ас.

Луцкевіч А. Беларускі музэй імя І. Луцкевіча. VII, друкарня Левіна, 16 с.

N.K. 31–šy Mižnarodny Eŭcharystyčny Kanhres. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 55 s.

Навіна А. Галоўныя кірункі ў беларускай паэзіі. VI, друкарня Левіна, 20 с.

Navicki K. Što robić urad u baraćbie z kryzysam. V, drukarnia Znamiaroŭskaha, 16 s., 5000 as.

Пецюкевіч М. Увагі дзеля запісаваньня беларускае народнае творчасьці і абрадаў. VI, выд. Таварыства Прыяцеляў Беларусаведы пры УСБ у Вільні.

Rodzievič L. Sceničnyja tvory. II, vyd. J. Najdziuk, drukarnia "Skaryna", 30 s., 1000 as.

Ruščaniec J. Zorka–ideja. II, vyd. BIHiK, drukarnia "Skaryna", 24 s., 1000 as.

Stankievič A. Kastuś Kalinoŭski, "Mužyckaja Praŭda" i ideja niezaležnaści Biełarusi. V, vyd. Biełaruski Narodny Kamitet, Drukarnia "Skaryna", 63 s., 1000 as.

Станкевіч Я. Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом. VI, друкарня Левіна, 33 с.

Шкялёнак М. У 300–я ўгодкі сьмерці Вялікага Канцлера Льва Сапегі. V, друкарня Левіна, 30 с., 500 ас.

1934

Aniśko D. Dla čyjho dabra! (Da spravy biełaruskaj movy ŭ kaściele). IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 15 s., 600 as.

Babroŭski A. Jak palepšyć zyćcio sialanstva. V, drukarnia Laŭkoviča, 16 s., 600 as.

Баўтручок — беларускі народны твор. III, выд. Знамяроўскага, друкарня "Zorza", 16 с., 400 ас.

Bylina J. Na pokuci. Bajki i roznyja vieršy. III, vyd. BIHiK, drukarnia "Skaryna", 72 s., 1000 as.

Гарадоцкі А. Як Беларуская Хадэцыя гандлюе крывёю рабочых і сялян. V, выд. КПЗБ, 31 с.

Kempijski Tomaš. Śledam za Chrystusam. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", Lvoŭ—Vilnia, 288 s., 1000 as.

Машара М. Вось тут і зразумей. II, выд. Таварыства Беларускай Асьветы, друкарня Левіна, 29 с., 300 ас.

Машара М. Вясельле. III, выд. Таварыства Беларускай Асьветы, друкарня "Скарына", 19 с., 300 ас.

Машара М. На сонечны бераг. III, выд. С. Глякоўскага і Я. Найдзюка, друкарня "Скарына", 78 с., 500 ас.

Машара М. Сьмерць Кастуся Каліноўскага. III, выд. С. Глякоўскага і Я. Найдзюка, друкарня "Скарына", 19 с., 800 ас.

Stapovič K. Hołas dušy. Knižka da nabaženstva. IV, vyd. BKW, drukarnia "Skaryna", 317 s., 3000 as.

Tatarynovič P. Šlacham dzivaŭ i ŭražańniaŭ. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 72 s., 500 as.

Улад-Ініцкі. Апавяданьні. III, выд. Знамяроўскага, друкарня "Zorza", 48 с., 1000 ас.

1935

Advažny V. Hanuliny kłopaty. III, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 64 s.

Advažny V. Kazka ab rybaku i rybcy. III, vyd. S. Hlakoŭski i J. Najdziuk, drukarnia "Skaryna", 29 s., 1000 as.

Advažny V. Chłapiec. III, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 242 s., 1000 as.

Aniśko D. Da biełaruskaha narodu. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 39 s., 400 as.

Бажанаў. Шустрая бабулька. II, выд. М. Шчасны, 32 с.

Hrynkievičy S. i J. Rady chvorym i zdarovym. Č. 1, VII, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 119 s., 1000 as.

Зборнік "Роднага Краю" за 1934 г. VII, выд. Таварыства Беларускай Асьветы, друкарня Левіна, 128 с.

Казлоўшчык У. Шляхам змаганьня. III, выд. "Новы Шлях", друкарня "Скарына", 62 с., 500 ас.

Karalenka M. Zachodniaja Biełaruś jak abšar faŭnistyčnych dośledaŭ. VII, vyd. Biełaruski Studencki Źviaz, druk Handlova-pramysłovaha Kaaperatyvu, 8 s., 200 as.

Karalenka M. Majovy chrušč i sposaby baraćby ź jim. VII, vyd. "Samapomač", drukarnia "Skaryna", 12 s., 500 as.

Купала Я. Шляхам жыцьця. III, выд. БІГіК, друкарня "Скарына", 269 с, 1000 ас.

Машара М. На прадвесьні. III, выд. С. Глякоўскі і Я. Найдзюк, друкарня "Скарына", 96 с., 600 ас.

Officium Najśviaciejšaj Dzievy Maryi. IV, vyd. BKV, drukarnia "Skaryna", 16 s.

Праваслаўны малітваслоў на царкоўна-славянскай і беларускай мове. IV, Сынадальная друкарня, Варшава, 48 с., 2000 ас.

Станкевіч А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня. V, выд. "Шлях Мо-

ладзі", друкарня "Скарына", 128 с., 600 ас.

Станкевіч А. Прафэсар Браніслаў Эпімах–Шыпіла. V, выд. БІГіК, друкарня "Скарына", 23 с., 500 ас.

Станкевіч Я. Апытальнік да зьбіраньня дыялектычных і некаторых агульных асаблівасьцяў беларускага (крывіцкага) языка. VI, выд. Таварыства Прыяцеляў Беларусаведы пры УСБ у Вільні, 48 с., 500 ас.

Stapovič A. Za Baćkaŭščynu. Śpieŭnik. II, vyd. BIHiK, drukarnia "Skaryna", 24 s., 1000 as.

Tarasevič J. Biełarusy u śviatle praŭdy. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 40 s., 300 as.

Uspamin z Kalvaryi. IV, vyd. BKV, drukarnia "Skaryna", 23 s., 1000 as.

Цёшча ў дом — усё ўверх дном. II, выд. Тэатральная Бібліятэчка, друкарня Клецкіна, 37 с, 500 ас.

1936

Акінчыц Ф. Аграрна–коопэратыўная палітыка будучыні. V, выд. "Новы Шлях", друкарня "Скарына", 36 с, 500 ас.

Божая ліра. Хрысьціянскія духоўныя песьні. IV, выд. "Southern Trade", 204 ас.

Hareckaja L. Rodny kraj. I, vyd. kniharni "Nadzieja", drukarnia Bajeŭskaha, 96 s., 1000 as.

Hrynkievič S. Aśvieta. VI, vyd. "Bieł. Krynicy", drukarnia "Skaryna", 55 s.

Ільляшэвіч Х. Захварбаваныя вершы. III, друк Гандлёва–прамысловага каапэратыву, 30 с., 500 ас.

Лёкай на гадзіну. II, выд. Тэатральнай Бібліятэчкі, друкарня Клецкіна, 23 с., 500 ас.

Машара М. Мамчына горка. III, выд. "Калосьсе", друкарня "Скарына", 56 с., 1000 ас.

Машара М. Чорт з падпечча. II, 24 с.

Мілючанка М. Грамадзкая і літаратурная дзейнасьць Цёткі. VI, выд. "Шлях Моладзі". друкарня "Скарыны", 16 с., 500 ас.

Паўловіч С. Першая навука Закону Божага зь беларуска–славянскім букваром. IV. Сынадальная друкарня, Варшава, 164 с.

Паўловіч С. Першыя зерняткі. I, выд. Я. Малецкі, друкарня "Скарына", 96 с., 4000 ас.

Паўловіч С. Сьвяшчэнная гісторыя Новага Завету. IV, Сынадальная друкарня, Варшава, 152 с., 3000 ас.

Rutkoŭski F. Zabojstva ŭ domie Nr 37. II, drukarnia "Skaryna", 16 s., 1100 as.

Станкевіч А. З жыцьця і дзейнасьці К. Сваяка. V, выд. "Калосьсе", друкарня "Скарына", 32 с., 500 ас.

Станкевіч Я. Зьмена граматыкі беларускага языка ў БССР. VI, друкарня Баеўскага. 16 с., 1000 ас.

Сучасныя маладажоны, водэвіль паводле Н.П. Краснова. II, 14 с.

Танк М. На этапах. III, выд. В. Труцько, друкарня Баеўскага, 127 с., 1000 ас.

Tarasevič J. Na Baćkaŭščynu. VII, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 120 s.

1937

Аляхновіч Ф. У капцюрох ГПУ. V, выд. аўтара, друкарня Баеўскага, 158 с., 2000 ас.

Baba Jeŭka, dzied Tamaš i inšyja biełaruskija narodnyja pieśni. II, drukarnia "Skaryna", 31 s.

Barovič J. Ab sadoch i hryboch. VII, vyd. "Biełpres", drukarnia "Skaryna", 32 s., 900 as.

Беларускія (крывіцкія) народныя песьні і казкі. III, выд. Я. Станкевіча, друкарня Гандлёва–прамысловага Каапэратыву, 32 с., 380 ас.

Vałakos. Try daktary na adnu plamku. II, vyd. Teatralnaj Bibliatečki, drukarnia

"Skaryna", 28 s.

Васілёк М. Зь сялянскіх ніў. III, выд. Р. Шырма, друкарня Баеўскага, 32 с., 1000 ас.

Васілеўскі А. Беларускі соньнік. VII, выд. кнігарні С. Станкевіча, друкарня "Dzielowa", 78 с., 100 ас.

Vasiłčenka S. Zyla karalevič. II, drukarnia "Marianum", 27 s., 500 as.

Гадоўля авец. VII, выд. "Белпрэс", друкарня "Скарына", 16 с.

Haspadarski zbornik. Č. 1, VII, vyd. "Biełpres", drukarnia "Skaryny", 16 s.

Грынкевіч С. У братоў украінцаў. VII, выд. "Пагоня", друкарня "Скарына", 88 с., 600 ас.

Kołas J. Sceničnyja tvory. II, vyd. Teatralnaj Biblijatečki, drukarnia "Marianum", 32 s., 500 as.

Lavonicha i inšyja pieśni. II, drukarnia "Skaryna", 16 s.

Машара М. З пад стрэх саламяных. III, выд. "Белпрэс", друкарня "Скарына", 112 с., 500 ас.

Машара М. Лёгкі хлеб. II, выд. "Bieł. Krynicy", друкарня "Скарына", 63 с., 1000 ас.

Paułovič S. Zasieŭki. Biełaruski lemantar dla chatniaha navučańnia. I, vyd. "Biełpres", 88 s., 2000 as.

Pieraškoda (operetka). II, vyd. Teatralnaj Biblijatečki, drukarnia "Skaryna", 66 s.

Пятроўскі Я. Нядзельная школа, яе сутнасьць і гісторыя. IV, выд. аўтара, друк Гандлёва-прамысловага Каапэратыву, 24 с., 500 ас.

Rešać J. Śviatyja. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", Vilnia—Lvoŭ, 122 s.

Saksahanskaja K. Abrazki žyćcia. II, vyd. Teatralnaj Biblijatečki, drukarnia "Marianum", 14 s., 500 as.

Stankievič A. Mahnušeŭski-Paŭluk Bahrym-Babroŭski (Da vytokaŭ biełaruskaha adradžeńnia). V, vyd, "Biełpres", drukarnia "Skaryna", 45 s., 600 as.

Станкевіч Я. Повесьці і апавяданьні беларускіх летапісцаў. VI.

Танк М. Журавінавы цьвет. III, выд. Р. Шырма і Ф. Стацкевіч, друкарня Левіна, 80 с., 1000 ас.

Танк М. Нарач (паэма). III, выд. "Калосьсе", друкарня "Скарына", 100 с., 200 ас.

Čamu-ž nam nia pieć. II, drukarnia "Skaryna", 16 s.

Як правільна гаварыць і пісаць пабеларуску. VI, выд. Я. Станкевіч, С. Глякоўскі, Я. Хвораст, А. Шукелойць, друкарня "Скарына", 18 с., 500 ас.

1938

Ajer A. Bosyja na lodzie. V, vyd. Znamiaroŭskaha, 24 s.

Bylina J. Vybary staršyni. II, drukarnia "Skaryna", 16 s., 1000 as.

Выбарная ардынацыя ў самаўрад. V, выд. "Chr. Dumki", друкарня "Скарына", 31 с.

Hrynkievičy S. i J. Alkahalizm. VII, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 14 s.

Hrynkievičy S. i J. Rady chvorym i zdarovym. Č. 2, VII, vyd. "Šlach Moładzi", drukarnia "Skaryna", 80 s.

Клімовіч А. Садоўніцкая чытанка. VII, выд. "Самапомач", друкарня "Скарына", 84 с.

Наша песьня. Зборнік 15 беларускіх народных песьняў. II, выд. Р. Шырмы, друкарня "Скарына".

Stankievič A. Božaje słova na niadzieli i śviaty. IV, vyd. BKV, drukarnia "Skaryna", Vilnia—Lvoŭ, 372 s.

Stankievič A. Lekcyi i evanhelii na niadzieli i śviaty. IV, vyd. BKV, drukarnia "Skaryna", Vilnia—Lvoŭ, 195 s., 500 as.

Станкевіч А. Лекцыі і эвангеліі на нядзелі і сьвяты. IV, выд. БКВ, друкарня "Скарына", Вільня—Львоў, 195 с., 500 ас.

Станкевіч А. Міхась Забэйда–Суміцкі і беларуская народная песьня. VI, выд. "Калосьсе", друкарня "Скарына", 16 с., 600 ас.

Stankievič A. U čeść 950–hodździa chryščeńnia Biełarusi. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 14 s., 1000 as.

Танк М. Пад мачтай. III, выд. Р. Шырмы, друк Багаткевіча і Труцькі, 110 с., 500 ас.

Uspamin z Kalvaryi pad Vilniaj. IV, vyd. druhoje BKV, drukarnia "Skaryna", 40 s.

1939

Гаспадарскі зборнік. Ч. 2, VII, выд. А. Маркоўскі, 16 с.

Гаспадарскі зборнік. Ч. 3, VII, выд. А. Маркоўскі, 16 с.

Hrynkievičy S. i J. Rady chvorym i zdarovym. Č. 3, VII, vyd. "Šlach Moładzi", drukarnia "Skaryny", 78 s., 700 as.

Івэрс А. Песьні на загонах. III, выд. "Калосьсе", друкарня "Скарына", 32 с.

Omańkoŭska F. Pradka pad Kryžam. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 24 s.

Сазанскі В. Чаго патрабуе зямля. II, выд. "Самапомач", друкарня "Скарына", 28 с.

Сахараў С. Полацкі князь Усяслаў — беларускі народны асілак. V, выд. "Калосьсе", друкарня "Скарына", 16 с.

Stankievič A. Biełaruski chryścijanski ruch. V, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 272 s., 1000 as.

Станкевіч Я. Гісторыя беларускага языка. VI, выд. аўтара, 16 с.

Unuk V. Dobramu i Boh pamahaje. IV, vyd. "Chr. Dumki", drukarnia "Skaryna", 72 s.

Хмара С. Жураўліным шляхам. III, выд. С. Сіняк, друкарня "Скарына", 31 с., 500 ас.

Čatyry evanhelii i Apostalskija dziei. Pierakład i vyjaśnieńni ks. V. Hadleŭskaha. IV, arcydyjacezijalnaja drukarnia ŭ Vilni, 416 s.

Друкуецца ў перакладзе з польскай, зробленым паводле кн.: Turonek J. Książka białoruska w II Rzeczy Pospolitej. 1921—1939. Warszawa: Slawistyczny Ośrodek Wydawniczy (Prace Slawistyczne; 109), 2000.

Кніга адрэцэнзавана. Гл.: Андранік Антанян. Беларуская кніга ў міжваеннай Польшчы // Arche. 2005. № 5. Рэцэнзэнт падаў сьпіс кніг, якія не паказаныя ў Дадатку да гэтае працы. Аднак і з улікам гэтага сьпісу індэкс беларускіх кніг, выпушчаных у 1921—1929 гг., усё адно застаецца няпоўны. Так, напрыклад, не названыя брашуры А. Луцкевіча "Жыдоўскае пытаньне ў беларускай літаратуры" (1921; адбітка з "Нашае Думкі") і "Вязьніца Адама Міцкевіча" (1923).

У асноўнай частцы гэтае працы загалоўкі кніг, выпушчаных лацінкаю, падаюцца ў кірылічнай графіцы, а прозьвішчы аўтараў — паводле сучаснага клясычнага правапісу.

Беларуская кніга пад нямецкім кантролем (1939—1944)

Уступ

Аднойчы ў 60–х гадах адзін вядомы дзяяч Беларускага грамадзка–культурнага таварыства на Беласточчыне і паважаны пэдагог у Бельску Падляскім пазычыў у свайго сябра Міколы Калядкі выдадзеную ў 1942 г. у Бэрліне кнігу "Гісторыя Беларусі ў картах", пасьля чаго занёс яе ў павятовы камітэт Польскай аб'яднанай рабочай партыі (ПАРП) з даносам на Калядку за захоўваньне і распаўсюджваньне фашысцкай літаратуры. І хаця ў камітэце не змаглі разабрацца са зьместам кнігі і ацаніць яе, але на ўсялякі выпадак Калядку выключылі з партыі. У той самы час згаданая кніга захоўвалася ў адкрытым фондзе ўнівэрсытэцкай бібліятэкі ў Варшаве й была даступная для ўсіх зацікаўленых.

Магчыма, гэты эпізод выклікае іранічную ўсьмешку ў грамадзян Беларусі, якія перажылі пасьляваенныя наступствы нямецкай акупацыі. "Толькі выключылі з партыі… — сказаў мой менскі калега, — дык гэта ж яшчэ ня так страшна, у параўнаньні з тым, што ў нас пагражала за такую літаратуру". Многія нават адукаваныя людзі зьнішчалі, палілі кнігі і часопісы, выдадзеныя ў гады нямецкае акупацыі, а ў архівах і бібліятэках БССР яны захоўваліся ў закрытых фондах і былі даступныя бадай толькі для сьледчых органаў і выкрывальнікаў "ворагаў народу".

На гэта ўплываў перш за ўсё час выпуску кнігі, а ня ейны зьмест. Таму "пад замок" траплялі кнігі савецкага ці заходнебеларускага выпуску як "Сымон Музыка" Якуба Коласа, "Беларускі правапіс" і "Беларуская граматыка" Браніслава Тарашкевіча і нават выдадзеная за царом–бацюшкам брашура Арцёма Музыкі "Прыгоды Панаса і Тараса", якія былі перавыдадзеныя падчас вайны. Кнігі, што выйшлі пад нямецкім кантролем, былі асуджаныя на небыцьцё. Пра гэта сьведчылі манаграфіі Аляксандры Бэргман і Арсеня Ліса пра Б. Тарашкевіча, у якіх замоўчвалася шостае выданьне яго "Беларускай граматыкі" (1943 г.).

У такіх умовах доўгі час не магло быць гутаркі пра вывучэньне непадкантрольнай савецкім уладам выдавецкай прадукцыі пэрыяду II сусьветнай вайны. Маўчалі ня толькі беларускія савецкія гісторыкі, але і эмігранты, якія ў ваенныя гады бралі ўдзел у выдавецкіх працэсах. Бадай усе яны ўжо адышлі на той сьвет, і толькі нямногія пакінулі для гісторыі годныя ўвагі ўспаміны пра сваю выдавецкую дзейнасьць.

Толькі ў 90–я гады ўзьніклі ўмовы для навуковага вывучэньня і публікацыі гісторыі выдавецкага руху ваеннага часу, чаму спрыялі крах камуністычнай ідэалёгіі, распад СССР і рассакрэчаньне беларускіх бібліятэк і архіваў. У 1996 г. была выдадзена невялікім накладам (300 асобнікаў) салідная манаграфія Сяргея Жумара "Оккупационная периодическая печать на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны". На шчасьце, зьмест кнігі С. Жумара не адпавядае яе загалоўку, бо аўтар разгледзеў становішча беларускай прэсы таксама ў Літве, Беластоцкай акрузе і ў Нямеччыне, у выніку чаго манаграфія атрымала комплексны характар.

Затое не шанцавала гісторыі кнігі. Праўда, у 90–я гады былі перавыдадзены ў Менску скарочаная кніга Язэпа Найдзюка "Беларусь учора і сяньня", як на зьдзек спалучаная з успамінамі яго асабістага ворага Івана Касяка, зборнік вершаў Тодара Лебяды "Песьні выгнаньня", Янкі Станкевіча "Маленькі маскоўска–беларускі (крывіцкі) слоў-

нічак фразэолёгічны"; "Як правільна гаварыць і пісаць пабеларуску" і, магчыма, іншыя выданьні ваеннага часу, аднак комплекснае вывучэньне гэтага пытаньня чакала дасьледчыка.

Прапанаваная праца ёсьць бадай першай спробай вывучэньня гісторыі беларускай кнігі пэрыяду другой сусьветнай вайны. У ёй улічаны кнігі, якія зь верасьня 1939 г. і да канца 1944 г. (у 1945 г. яны ўжо не выдаваліся) выпускаліся пад кантролем нямецкіх уладаў як на акупаваных тэрыторыях (Беларусь, Літва, Латвія, Беластоцкая акруга, Генэральнае губэрнатарства), так і ў самой Нямеччыне ўлучна з Пратэктаратам Багемія і Маравія, далучаным да яе на падставе вымушанага нямецка–чэхаславацкага пагадненьня.

На гэтых тэрыторыях у той час існавалі разнастайныя ўмовы для выдавецкай дзейнасьці: палітыка нямецкіх уладаў, грамадзкі попыт на кнігу, наяўнасьць аўтараў і выдаўцоў, іх фінансавыя магчымасьці, варункі паліграфіі і распаўсюду выданьняў. Да таго ж, гэтыя ўмовы зь бегам часу зьмяняліся ў залежнасьці ад стану ўзаемадачыненьняў Нямеччыны і СССР: адныя яны былі ў пэрыяд нямецка–савецкага супрацоўніцтва (са жніўня 1939 г. да 22 чэрвеня 1941 г.), а іншыя пасьля нашэсьця Нямеччыны на Савецкі Саюз. Пастаянным фактарам была толькі нямецкая цэнзура, хаця і ў гэтым выпадку былі пэўныя адрозьненьні. Найбольш жорсткая яна была ў Генэральнай акрузе Беларусь, а адносна лагоднай — у самой Нямеччыне.

Зыходным пунктам дасьледаваньня і асноўнай падставай аналізу выдавецкіх працэсаў ёсьць каталёг кніг і брашур. Яго апрацоўка патрабавала шматгадовай карпатлівай працы. Ніводная бібліятэка, як у Беларусі, так і за яе межамі, не імкнулася пасьля вайны стварыць па магчымасьці поўны фонд выданьняў, якія выпускаліся пад кантролем нямецкіх уладаў. Як вынік, у лепшым выпадку, сёньня можна адшукаць у паасобных бібліятэках ці архівах толькі невялікую колькасьць гэтых выданьняў. Некаторыя зь іх, магчыма, беззваротна страчаныя або захоўваюцца ў прыватных калекцыях.

Пачатак быў зроблены даволі даўно. Пасьля сьмерці варшаўскага кнігалюба Пятра Ластаўкі ў 1968 г. мне пашанцавала купіць усю яго калекцыю — блізу 20 беларускіх кніг, выдадзеных у ваенны час у Бэрліне, Варшаве і Менску. Пазьней, дзякуючы прыхільнасьці і даверу іншых аматараў кнігі ў Варшаве, Вільні і на эміграцыі, мая прыватная бібліятэка час ад часу папаўнялася новымі набыткамі. Аднак доўгі час яны трактаваліся ня больш як бібліяграфічная рэдкасьць.

Актыўныя пошукі кніг пачаліся толькі ў 90–я гг., гэтым разам ужо з акрэсьленай мэтай апрацоўкі іх каталёгу. Яны праводзіліся ў бібліятэках Менску, Варшавы, Вільні, Рыгі, Прагі і Лёндану, а таксама ў Беларускім дзяржаўным архіве (цяпер Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь) і Беларускім дзяржаўным архіве–музэі літаратуры і мастацтва ў Менску. Некаторыя выданьні адшуканыя ў прыватных калекцыянэраў.

Усяго выяўлена 117 кніг і брашураў, зь якіх каля 80% апісана ў каталёгу на падставе агледзін арыгіналу ці яго ксэракопіі. Астатнюю частку складаюць выданьні, якіх пакуль што не давялося бачыць. Яны апісаны на падставе зьвестак, апублікаваных у прэсе, — "Беларускай Газэце", "Голасе Вёскі", "Раніцы", "Новай Дарозе" і іншых пэрыёдыках.

Кнігі беларускіх аўтараў і выдаўцоў даволі часта апісваліся, рэклямаваліся ці рэцэнзаваліся ў тагачаснай прэсе. З гэтай прычыны пададзеная ў каталёгу іх колькасьць, спадзяемся, блізкая да поўнай дакладнасьці. Але засталося некалькі пытальнікаў. У прыватнасьці, ня высьветленыя бібліяграфічныя дэталі баранавіцкага буквара "Зорка" і кнігі прафэсара Калыньша "Смалакурэньне". Таксама невядома, ці "Арытмэтыка" Зоф'і Дабрынскай, якая зь лета 1943 г. друкавалася ў Рызе, выйшла да прыходу Чырвонай Арміі.

Затое выпуск нямецкіх беларускамоўных выданьняў адзначаўся ў газэтах надзвычай рэдка. Так, нічога не паведамлялася аб прапагандысцкіх брашурах, якія выпускала

"Вінэта", афіцыйны орган нямецкай прапаганды (гл. каталёг, № 105—117). Таму, на нашу думку, колькасьць гэтых выданьняў магла быць большая, чым паказана ў каталёгу.

У каталёг ня ўключаны пэрыядычныя выданьні: газэты, часопісы, календары, нават калі іх выпуск спыняўся на першым нумары. Таксама ня ўключаны геаграфічныя карты, непэрыядычныя ўлёткі, плякаты і непагінаваныя ілюстраваныя складанкі. Кніга, выдадзеная дзьвюма абэцэдамі (кірыліцай і лацінкай), лічыцца як дзьве кнігі. Такіх выданьняў было ўсяго два: "Беларускі правапіс" Антона Лёсіка і "Кароткі малітаўнік для беларусаў-каталікоў".

Пры апісаньні кнігі браліся пад увагу наступныя бібліяграфічныя дэталі: прозьвішча ці псэўданім аўтара, поўны загаловак, месца і год выпуску, выдавец, друкарня, аб'ём, фармат, наклад і цана. Таксама пададзеныя месца захаваньня кнігі, першая прэсавая інфармацыя аб яе выпуску і рэцэнзія. Аднак з увагі на недаступнасьць некаторых выданьняў і недастатковую інфармацыю, якая падавалася на вокладках кнігі і ў газэтах, часта было немагчыма падаць усе жаданыя бібліяграфічныя зьвесткі.

Сумнай спэцыфікай тагачасных беларускіх выданьняў была адвольнасьць і разнастайнасьць альфабэтных сыстэмаў, непасьлядоўнасьць правапісу і тэрміналёгіі. Нават у выданьнях, здавалася, найбольш кампэтэнтнага ў галіне мовазнаўства школьнага інспэктарату часам стасавалася "школ", а часам — "школаў". Гэтае пытаньне ўзьнікла пры апісаньні кніг у каталёгу, аднак уніфікацыя ўсяго запісу на базе тагачаснага ці сучаснага правапісу выглядала б недарэчна. З гэтай прычыны прозьвішчы аўтараў, загалоўкі кніг і назвы газэт падаюцца ў арыгінальнай форме, а іншыя бібліяграфічныя дэталі — згодна з сучасным правапісам. На жаль, і гэты спосаб не гарантуе поўнай пасьлядоўнасьці і ня робіць добрага ўражаньня.

Кніга разьдзелена на некалькі частак. У першым разьдзеле пададзеныя ў храналягічным парадку ініцыятывы і зьдзяйсьненьні аўтараў і выдаўцоў на ўсіх падкантрольных нямецкім уладам тэрыторыях.

Гэта нібы гістарычны агляд кнігадрукаваньня на фоне вонкавых і ўласна беларускіх умоваў. У гэтым разьдзеле, акрамя выданьняў, што выйшлі, улічаны творы, якія, паводле прэсавых зьвестак, пасьляваенных успамінаў і іншых крыніцаў, былі падрыхтаваныя да друку, але ў выніку ваенных апэрацыяў не пабачылі сьвету.

Увесь другі разьдзел займае каталёг кніг і брашур. Тэматычная структура выданьняў і іншыя аналітычныя высновы разглядаюцца ў наступным разьдзеле. Урэшце, у заключэньні прыведзены палітычныя аспэкты кнігадрукаваньня і лёсы яго ўдзельнікаў. Кнігу завяршаюць кароткія біяграмы аўтараў, складальнікаў, выдаўцоў і іншых дзеячоў выдавецкага руху, іх здымкі, а таксама ілюстрацыі вокладак найбольш цікавых кніг.

Аўтар лічыць сваім прыемным абавязкам выказаць падзяку Ганьне Запартыцы, дырэктару Беларускага дзяржаўнага архіву-музэю літаратуры і мастацтва, айцу Аляксандру Надсану, дырэктару Беларускай бібліятэкі імя Ф. Скарыны ў Лёндане, Людміле Рабок, загадчыцы беларускага аддзелу Нацыянальнай бібліятэкі ў Менску, Здэнцы Рахунковай, дырэктару Славянскай бібліятэкі ў Празе, В. Ціхаміравай, галоўнаму бібліёграфу Нацыянальнай бібліятэкі ў Рызе, а таксама Алегу Гардзіенку, Лене Глагоўскай, Алесю Жынкіну, Валянціне Панько, Генадзю Сагановічу, Антону Шукелойцю, Язэпу Янушкевічу за іх канкрэтную дапамогу ў стварэньні гэтай кнігі.

1. Аўтары і выдаўцы

1.1. Пэрыяд нямецка-савецкага супрацоўніцтва

Да жніўня 1939 г. у нямецкіх плянах ваенных апэрацыяў супраць Польшчы бралася пад увагу магчымасьць арганізаваць на беларускіх і ўкраінскіх тэрыторыях гэтай дзяр-

жавы дывэрсійныя дзеяньні, якія павінны былі палегчыць задачы Вэрмахту. З такой мэтай прадугледжвалася выдаваць для насельніцтва адпаведную прапагандысцкую літаратуру на беларускай і ўкраінскай мовах.

Аднак пасьля заключэньня 23 жніўня 1939 г. савецка–нямецкага пакту аб ненападзе і дамовы аб разьмежаваньні сфэры інтарэсаў СССР і Нямеччыны ў Польшчы ўжо не было патрэбы прапагандысцкай актывізацыі заходнебеларускага і заходнеўкраінскага насельніцтва, якое далучалася да СССР. Зьмянілася становішча і ў Нямеччыне. 25 жніўня, г.зн. літаральна праз два дні пасьля заключэньня пакту, усе пасты нямецкай паліцыі на тэрыторыі гэтай дзяржавы атрымалі дырэктыву начальніка гестапа, якая забараняла існуючым у Нямеччыне расейскім, украінскім, казацкім і каўкаскім эмігранцкім арганізацыям і іх сябрам выказваць вусна ці пісьмова варожае стаўленьне да Савецкага Саюзу, ладзіць публічныя мерапрыемствы, выкарыстоўваць нацыянальныя сьцягі і адзнакі[1]. У дырэктыве ня згадваліся беларускія арганізацыі, якія тады яшчэ не існавалі.

Загад паліцэйскіх уладаў адносіўся таксама да рэдакцый нямецкіх газэт, часопісаў і кніжных выдавецтваў. У выніку, з восені 1939 г. да чэрвеня 1941 г. у Нямеччыне выйшла толькі адна кніга — унівэрсытэцкая дысэртацыя Вэрнэра Концэ, прысьвечаная аграрным пытаньням у Вялікім Княстве Літоўскім, і толькі адзін невялікі артыкул Пэтэра Шайбэрта пра станаўленьне БССР, дарэчы, блізкі з тэзамі савецкай гістарыяграфіі[2]. Беларуская і ўкраінская праблематыка зьнікла са старонак навуковых выданьняў, такіх, як бэрлінскія “Jahrbücher für Geschichte Osteuropas” (выпускі 1940 і 1941 гг.).

Пасьля заканчэньня польскай кампаніі ў нямецкіх лягерох апынулася вялікая колькасьць ваеннапалонных жаўнераў польскай арміі, а ў іх ліку некалькі дзясяткаў тысяч беларусаў. Для ваеннапалонных ваеннае міністэрства Нямеччыны выдавала на розных мовах газэты, сярод іх са сьнежня 1939 г. і беларускамоўную “Раніцу”, якая да 22 чэрвеня 1941 г. старанна пазьбягала антысавецкіх выказваньняў.

У апошнім квартале 1939 г. выдавецтва ваеннага міністэрства *Die Wehrmacht* выпусьціла невялікую кнігу Ота Лемана “Нямецкія салдаты”, якая была першай беларускамоўнай кнігай, выдадзенай у разгляданы пэрыяд (1939—1944) пад кантролем нямецкіх уладаў. Кніга Лемана, багата ілюстраваная, прызначалася ў асноўным для ваеннапалонных і знаёміла іх са структурай нямецкай арміі, відамі войск, вайсковымі рангамі і г.д. Цяжка ў ёй дашукацца іншай прапагандысцкай ці ідэйнай накіраванасьці, тым больш антысавецкіх тэндэнцый. Як і газэты, кніга Лемана выдавалася на розных мовах ваеннапалонных, пра што сьведчыць яе польскамоўны варыянт “Żołnierz niemiecki”, які захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве.

Пасьля выданьня кнігі Лемана нямецкія ўстановы доўгі час не выпускалі кніг па-беларуску. Іх выданьне было справай саміх беларусаў, наколькі гэта дазваляла дзяржаўная палітыка, тэхнічна–фінансавыя магчымасьці і наяўныя інтэлектуальныя сілы.

Тым часам на пачатку другой сусьветнай вайны на падкантрольных Нямеччыне тэрыторыях беларускія інтэлектуальныя сілы былі малакольнасныя, раскіданыя па розных гарадах і толькі пачыналі арганізоўвацца. Іх росту ў пэўнай ступені спрыяў прыток некалькіх дзясяткаў новых эмігрантаў зь Вільні, якія напярэдадні акупацыі Літвы Чырвонай Арміяй перасяліліся ў зону нямецкай акупацыі. У іх ліку: Мікола Шкялёнак прыехаў у Бэрлін, а Янка Станкевіч і ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі — у Варшаву.

Акрамя ўрадавай установы, т.зв. Беларускага прадстаўніцтва, узьнікла ў Бэрліне дазволеная ўладамі грамадзкая арганізацыя Беларускі камітэт самапомачы ў Нямеч-

[1] Косик В. Україна і Німеччина ў Другій світовій війні. Паріж—Львів—Нью Ёрк, 1998. С. 486. (дакумэнт № 35).

[2] Conze W. Agrarverfassung und Bevölkerung in Litauen und Weissrussland. Leipzig, 1940; Scheibert P. Der Weg der Weissruthenen zur weissruthenischen Sowjetrepublik. Jomsburg, 1940. S. 191—196.

чыне (далей БКС), якой да канца студзеня 1943 г. кіраваў праўнік Мікола Шкялёнак. Бэрлінскаму цэнтру падпарадкоўваліся філіі БКС у розных гарадах Нямеччыны, Пратэктарату і далучаных да Райху польскіх заходніх тэрыторыях. Беларускі камітэт у Генэральным губэрнатарстве не падпарадкоўваўся БКС, а дзейнічаў самастойна і, акрамя цэнтру ў Варшаве, меў дзьве філіі (дэлегатуры) у Кракаве і Белай Падляскай. Зь ліку гэтых камітэцкіх структураў толькі тры — у Бэрліне, Празе і Варшаве — адыгралі пэўную ролю ў гісторыі беларускага кнігадрукаваньня гэтага пэрыяду (жнівень 1939 — чэрвень 1941 г.).

Аднак, акрамя зьнешніх умоваў, вырашальнае значэньне ў выдавецкай справе мелі не камітэцкія структуры, а канкрэтныя людзі, зацікаўленыя і здольныя ствараць, арганізоўваць выдавецкую дзейнасьць, распаўсюджваць кнігі і брашуры. Аўтары і выдаўцы, якія жылі ў Бэрліне, Празе і Варшаве і працавалі ў мясцовых камітэтах, ня раз супрацоўнічалі паміж сабой, а кнігі, якія апрацоўваліся ў адным горадзе, нярэдка друкаваліся ў іншым, што залежала ад мясцовых варункаў.

Спачатку на першым пляне апынулася Прага. Тут з даваенных гадоў жыло некалькі беларусаў, якія ў час вайны імкнуліся ўплываць на лёс бацькаўшчыны і, між іншым, арганізаваць выдавецкую дзейнасьць. Да гэтай групы належалі лекар Іван Ермачэнка, які заснаваў Беларускае выдавецтва ў Празе, лекар Іван Геніюш з жонкай Ларысай, інжынэры Васіль Русак і Аляксандар Калоша, філёляг Пётар Бакач і іншыя. Да праскай сябрыны прымыкалі Мікола Абрамчык, які жыў у Парыжы, і Янка Станкевіч, які з чэрвеня 1940 г. знаходзіўся ў Варшаве і даволі часта наведваў Прагу. Усе яны, акрамя паэткі Ларысы Геніюш, былі выпускнікамі чэхаславацкіх навучальных установаў і дзеячамі беларускага студэнцкага руху, што ўплывала на іх супрацоўніцтва.

Пачынальнікам кнігадрукаваньня быў Пётар Бакач. У канцы 1940 г. ён скончыў апрацоўку папулярнага "Падручніка нямецкага языка для Беларусаў" і як яго дапаўненьня — кароткага нямецка–беларускага слоўніка. Быў гэта пiянэрскі пачын, паколькі дасюль беларускія падручнікі нямецкай мовы нідзе не выдаваліся. У апрацоўцы падручніка супрацоўнічалі з аўтарам бэрлінскія дзеячы М. Шкялёнак, Э. і А. Шкуткі і С. Саўчук, а праскі прадпрымальнік В. Русак аказваў Бакачу матэрыяльную дапамогу падчас яго працы над рукапісам. Магчыма, усе яны складалі выдавецкую групу, ад імя якой была напісана прадмова да гэтай кнігі.

Падручнікам П. Бакача зацікавілася бэрлінская выдавецкая фірма *Bernard und Graefe*, якая яго надрукавала ва ўласнай друкарні ў красавіку або на пачатку траўня 1941 г. Нягледзячы на даволі значны аб'ём (357 старонак) і наклад у некалькі тысячаў асобнікаў, ні аўтар, ні выдавецтва не баяліся фінансавай рызыкі, паколькі запатрабаваньне на гэтую кнігу перавышала ўсе разьлікі і спадзяваньні. Як паведамлялася ў прадмове, ужо падчас друку падручніка была прададзена авансам амаль палова накладу.

Тысячы заказчыкаў у Нямеччыне і Генэральным губэрнатарстве зь нецярплівасьцю чакалі выпуску падручніка П. Бакача. Пра гэта бэрлінская "Раніца" зьмясьціла 30 траўня 1941 г. наступнае характэрнае паведамленьне:

> У справе „Падручніка нямецкага языка для Беларусаў" выясьняем: Падручнік выйшаў з друку і рассылаецца фірмай адзіночным заказчыкам. Ня ўсе, аднак, заказчыкі маглі дастаць кніжку ў першых днях пасьля яе выхаду, бо заказаў набралася *больш за пару тысячаў* (падкр. намі. — *Ю.Т.*), а высланьне вымагае шмат тэхнічнае працы (упакоўка, выпаўненьне фрахтаў і г.д.). Як паведаміла нас фірма, дзе кніжка друкавалася *(Bernard und Graefe Berlin SW 68, Alexandrinnenstr. 134)*, у бліжэйшым тыдні ўсе заказчыкі кніжку дастануць. Далейшыя заказы можна кіраваць у нашую Рэдакцыю, або ў Беларускае Прадстаўніцтва <...>. Хто мае намер кніжку выпісаць, хай сьпяшаецца з заказам, бо запасы яе ўжо невялікія, а калі выйдзе другое выданьне — няведама.

Аднак другога выданьня кніга П. Бакача не дачакалася, а яе аўтар пасьля вайны апынуўся ў савецкіх лягерох. Доўгі час ёю цікавіліся толькі спэцслужбы, на што паказвае кароткая пазнака, зьмешчаная на трэцяй старонцы вокладкі асобніка, які захоўваецца ў варшаўскай Нацыянальнай бібліятэцы: *16 VIII 1945 r. Dar Milicji Obywatelskiej m. st. Warszawy*[3].

Таксама з Прагай быў зьвязаны выдавецкі пачын, які ў 1941 г. ажыцьцяўляўся пад грыфам "Карэспандэнцыйных курсаў беларусаведы". Такія курсы арганізоўваліся падчас вайны ў некалькіх найбольш значных асяродках беларускай эміграцыі ў форме лекцый, галоўным чынам, па беларускай мове, літаратуры і гісторыі Беларусі, якія чыталіся для сяброў камітэтаў у Бэрліне, Варшаве, Лодзі і, магчыма, у іншых гарадах.

Асаблівасьцю курсаў беларусаведы ў Празе, дзе беларуская калёнія была нешматлікая, было тое, што, паводле задумы іх арганізатараў даклады на паасобныя тэмы павінны былі апрацоўвацца ў пісьмовай форме спэцыялістамі з розных гарадоў і выпускацца праскім выдавецтвам Івана Ермачэнкі ў выглядзе асобных брашур і рассылацца зацікаўленым беларусам у Нямеччыне, Пратэктараце і Генэральным губэрнатарстве. З гэтай прычыны курсы называліся "карэспандэнцыйныя".

З такой мэтай напрыканцы 1940 г. была створана рэдакцыя курсаў, якой кіраваў Я. Станкевіч з дапамогай тэхнічнага супрацоўніка выдавецтва П. Бакача. У склад рэдакцыі ўваходзілі М. Абрамчык (Парыж), А. Мамчыц (Варшава) і М. Шкялёнак (Бэрлін), задачай якіх было распаўсюджваньне брашур сярод беларускіх эмігрантаў у Францыі і Генэральным губэрнатарстве, а таксама ваеннапалонных у Нямеччыне. Апошнім сябрам рэдкалегіі быў старшыня Рады БНР В. Захарка, які ня браў удзелу ў рэдакцыйнай працы і лічыўся толькі ганаровым фігурантам.

З увагі на тагачасныя палітычныя ўмовы рэдакцыя праскіх курсаў беларусаведы абмяжоўвалася пытаньнямі, якія ня мелі антысавецкай накіраванасьці і не маглі быць прычынай падазрэньня нямецкіх уладаў у падтрымцы беларускага нацыяналізму. Таму невыпадкова публікацыі, выдаваныя пад грыфам курсаў, не закраналі актуальных пытаньняў беларускага нацыянальнага руху, але датычылі такіх "нэўтральных" пытаньняў, як мовазнаўства і раньняя гісторыя Беларусі.

Агулам рэдакцыя курсаў выдала чатыры брашуры, зь іх ліку дзьве выпускаліся частками ("лекцыямі"). Першай зь іх была ананімная брашура "Як правільна гаварыць і пісаць пабеларуску", надрукаваная на пачатку 1941 г. у праскай друкарні пад крыху іншым грыфам "Беларускія карэспандэнцыйныя курсы ў Празе". Брашура была перадрукам аднайменнай публікацыі, выдадзенай у 1937 г. у Вільні Янкам Станкевічам, ксяндзом Станіславам Глякоўскім, Янам Хворастам і Антонам Шукелойцем, зь якіх толькі Станкевіч меў мовазнаўчую адукацыю і несумненна быў яе аўтарам.

Пасьля выпуску гэтай брашуры выдаўцы рашылі выправіць назву курсаў на "Карэспандэнцыйныя курсы беларусаведы" і пад такім грыфам выпусьцілі рататарнай тэхнікай тры чарговыя брашуры: Я. Станкевіча "Курс беларускае мовы" (у дзьвюх частках) і "Курс гісторыі Крывіі–Беларусі" (у трох частках), а таксама І. Ермачэнкі "Пранцы (сыфіліс)".

Такім чынам, мовазнаўчыя і гістарычныя працы Я. Станкевіча складалі пераважную частку выдавецкай прадукцыі праскіх курсаў.

Заслугоўвае ўвагі "Курс гісторыі Крывіі–Беларусі", у якім Я. Станкевіч упершыню ў беларускай навуцы выказаў погляд аб балта–славянскім этнагенэзе беларусаў. Гэты яго погляд толькі празь некалькі дзесяцігодзьдзяў ухвалілі вучоныя Савецкай Беларусі[4].

[3] Дар грамадзянскай міліцыі сталічнага места Варшавы. — *А.С.*

[4] На падставе сваіх дасьледаваньняў да падобнае высновы прыйшоў расейскі археоляг Валянцін Сядоў (тэорыя балцкага субстрату). Улады БССР нэгатыўна паставіліся да гэтае тэорыі і ў 1973 г. не дазволілі правесьці ў Менску навуковую канфэрэнцыю пра этнагенэз беларусаў. — *А.С.*

Праца І. Ермачэнкі пра сыфыліс, вядома, магла быць карыснай для чытачоў, аднак ня мела нічога агульнага зь беларусаведай. Яе выпуск, напэўна, задавальняў лекарскія амбіцыі аўтара — шэфа Беларускага выдавецтва і праскага аддзелу БКС, але таксама сьведчыў пра тое, што ў рэдакцыйнай тэчцы не было больш адпаведных матэрыялаў.

Супастаўленьне гэтых выдавецкіх вынікаў, цікавых, мабыць, толькі для вузкага кола спэцыялістаў, з асабовым складам рэдкалегіі, у якую, акрамя Я. Станкевіча, уваходзілі такія дасьведчаныя дзеячы, як М. Абрамчык і М. Шкялёнак, наводзіць на думку, што "Праскія курсы" былі задуманыя як зручная фірма для наладжваньня неафіцыйных кантактаў эміграцкага актыву і выпрацоўкі канцэпцыі палітычнай дзейнасьці ва ўмовах блізкай нямецка–савецкай вайны. На гэтым грунтавалася і супрацоўніцтва Я. Станкевіча з І. Ермачэнкам, якое неўзабаве працягнулася ў акупаваным немцамі Менску.

Тым часам, у другой палове 1940 г. Станкевіч, заснаваўшы ў Варшаве нелегальную Партыю беларускіх нацыяналістаў, ствараў перадумовы для будучых кантактаў з кіраўніцтвам польскага падпольля[5]. Адначасова ён заняўся падрыхтоўкай падручнікаў для беларускіх пачатковых школаў на бацькаўшчыне, якія пад яго кіраўніцтвам апрацоўвала варшаўская настаўніца Зоф'я Дабрынская.

Янка Станкевіч пазнаёміўся з З. Дабрынскай у другой палове 1940 г. у Беларускім камітэце ў Варшаве. Яна паходзіла з Дрысеншчыны, ведала беларускую мову, мела пэдагагічную адукацыю і настаўніцкі досьвед. Дабрынская прыняла прапанову Станкевіча і на працягу двух гадоў (1941—1942) апрацавала сем падручнікаў: два лемантары (кірыліцай і лацінкай), чытанку для другое клясы й чатыры арытмэтычныя задачнікі для I—IV клясаў. Малюнкі выконваў варшаўскі графік беларускага паходжаньня Гайкоўскі. Гэтую іх працу пэрыядычна аплочваў Я. Станкевіч[6].

Інфармацыя З. Дабрынскай аб апрацоўцы ў такі кароткі і неспрыяльны ваенны час сямі падручнікаў спачатку ўяўлялася малаверагоднай. І толькі пазьнейшыя пошукі ў газэтах ваенных гадоў і нядаўняя публікацыя лістоў Я. Станкевіча да К. Езавітава разьвеялі сумненьні[7]. Першы яе арытмэтычны задачнік быў надрукаваны ў 1942 г. у Празе, а два наступныя — у 1943 г. у Менску. Яшчэ адзін задачнік друкаваўся ў Рызе.

На заканчэньне агляду выданьняў гэтага пэрыяду спынімся на дзьвюх брашурах: У. Верес "Шляхом барацьбы Беларусі з Москвою" і У. Верас "Як створым нашую сілу".

Яны былі выдадзеныя ратататарнай тэхнікай без пададзенага месца і году выпуску і якіх–кольвечы іншых выдавецкіх дэталяў. Гэта адпавядала патрабаваньням нелегальнай публіцыстыкі, у сувязі з чым і прозьвішча аўтара можна лічыць псэўданімам. Паспрабуем расшыфраваць гэтыя загадкавыя брашуры.

Дапушчаныя ў адной зь іх правапісныя памылкі ("Верес", "Шляхом", "Москвою") і іх выпраўленьне ў другой паказвае, што найперш была выдадзена брашура "Шляхом барацьбы Беларусі з Москвою". Гэтая чарговасьць мае для нас істотнае значэньне для ўстанаўленьня часу выпуску брашур.

Так, у брашуры "Як створым нашую сілу" аўтар згадвае пра перамогу Нямеччыны над Польшчай і Францыяй (с. 3—4) і спадзяецца на разгром Савецкага Саюзу (с. 6), а гэта значыць, што яна выйшла ў другой палове 1940 г. (Францыя капітулявала 22.06.1940), або ў першай палове 1941 г. Аналіз тэксту другой брашуры "Шляхом барацьбы Беларусі з Москвою" дазваляе больш дакладна вызначыць гэты тэрмін. Зьмешчаныя ў ёй фразы "рашучая барацьба набліжаецца" ці "будзьце гатовыя да рашучай барацьбы" (с. 20) паказваюць на тое, што яна выйшла незадоўга да нападу Нямеччыны на СССР. Гэта дазваляе вызначыць час выданьня брашур на вясну 1941 г.

Несумненна, абедзьве брашуры былі выдадзеныя ў Бэрліне. На гэта паказвае, па-

[5] Туронак Ю. Беларускае пытаньне ў палітыцы лёнданскага лягеру. С. 464—484 гэтага выданьня. — *Рэд.*
[6] Інфармацыя З. Дабрынскай для аўтара з 1984 г.
[7] Лісты Я. Станкевіча да К. Езавітава // Спадчына. 1999. № 5—6. С. 55—68.

першае, якасьць паперы, аналягічная ратататарным выданьням Бэрлінскага аддзелу БКС, такім як "Гісторыя Беларусі ў картах" Міколы і Ніны Абрамчыкаў і іншых, па–другое, машынапіс зроблены на машынцы з украінскім шрыфтам, якой праз адсутнасьць машынкі зь беларускім шрыфтам тады карысталіся ў бэрлінскім БКС.

"Як створым нашую сілу" — гэта тыповы для нямецкага нацыянал–сацыялізму пераказ асноваў грамадзкай дзейнасьці, арыенцірам якой былі ўласныя сілы, а не спадзяваньні на дапамогу звонку. Прапаганда гэтай ідэалёгіі, а таксама зьмешчаны ў брашуры "Шляхом барацьбы..." заклік да ўзброенай барацьбы "пад прапарам беларускага нацыяналізму" (с. 20) пераконваюць, што выдаўцом брашур была група Фабіяна Акінчыца — ідэоляга беларускіх нацыянал–сацыялістаў. Хто быў іх аўтарам — пытаньне менш істотнае. Мог ім быць сам Акінчыц ці нейкі яго супрацоўнік.

Верагодна, выпуск брашур У. Вераса быў інсьпіраваны нямецкімі службамі, але ў тагачаснай палітычнай сытуацыі нельга было выявіць іх выдаўцоў. Неўзабаве, калі пачалося наступленьне Нямеччыны на Савецкі Саюз, такая "кансьпірацыя" была лішняя.

1.2. Пасьля нашэсьця Нямеччыны на СССР

Генэральная акруга Беларусь

Непасрэдна пасьля таго, як нямецкія войскі занялі Беларусь, на ўсім яе абшары было ўведзена ваеннае кіраваньне, якое ўзначаліў камандуючы тыламі групы армій "Цэнтар" генэрал Макс фон Шэнкендорф. Яму падпарадкоўвалася сетка палявых камэндатур, а ім, у сваю чаргу, — мясцовыя камэндатуры, якія ствараліся практычна ва ўсіх гарадах і райцэнтрах.

Згодна з дырэктывамі Галоўнага камандаваньня Вэрмахту, ваеннае кіраваньне мела пераходны характар, зь цягам часу яго адміністрацыйныя функцыі мусілі пераняць цывільныя ўлады. Аднак у выніку неспрыяльнай сытуацыі на фронце армія перадала цывільным уладам толькі заходнюю частку Беларусі, а яе ўсходняя частка да канца акупацыі заставалася ў зоне ваеннага кіраваньня.

Форма акупацыйнага рэжыму была важным фактарам, які вызначаў магчымасьць выдавецкай працы. Армейскія службы прапаганды, якія функцыянавалі пры палявых камэндатурах, арганізоўвалі радыёвяшчаньне, выпуск газэт і плякатаў, але кнігавыдавецкая справа не была іх задачай — яна належала да кампэтэнцыі цывільнай улады. У такіх умовах не маглі мець посьпеху любыя ініцыятывы мясцовых дзеячоў, якім, у лепшым выпадку, удавалася наладзіць выпуск беларускамоўных дадаткаў да выдаваных вэрмахтам расейскамоўных газэт. Дарэчы, у гарадах зоны ваеннага кіраваньня не было і значнай традыцыі кнігадрукаваньня, якое за савецкім часам канцэнтравалася галоўным чынам у Менску.

Краёвае выдавецтва "Менск"

Цывільныя акупацыйныя ўлады мелі свае праблемы. Зь ліпеня 1941 г. дзейнічала ў Менску гарадзкая ўправа і падпарадкаваная ёй друкарня, таксама было заснавана Краёвае выдавецтва "Менск". Аднак галоўнай іх задачай было забесьпячэньне выпуску "Менскай Газэты", а ня кніг[8]. Генэральны камісар Вільгельм Кубэ, што прыбыў на пачатку верасьня 1941 г. у Менск, маляваў перад беларусамі сьветлыя пэрспэктывы; ён загадаў адчыніць школы і ў першым сваім рапарце ў Бэрлін заявіў: "Я намераны прысь-

[8] Жумарь С. Оккупационная печать на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны. Минск, 1996. С. 20.

вяціць маю асаблівую ўвагу клопатам пра беларускую культуру"[9].

Аднак за гэтымі словамі пакуль што ня йшлі ўчынкі. Нямецкія ўлады ў Бэрліне і Рызе, якія спадзяваліся на хуткую перамогу, не лічылі патрэбным сьпяшацца з вырашэньнем кнігавыдавецкай справы: яе арганізацыі, фінансаваньня, нагляду.

Але сьціплы пачатак быў зроблены. У той час, па сутнасьці, адзінай сфэрай выдавецкіх зацікаўленьняў нямецкай цывільнай адміністрацыі быў выпуск газэт, што, натуральна, патрабавала адзінага правапісу. Тым часам у гэтай галіне ўзьніклі праблемы, не сустраканыя на іншых тэрыторыях Остлянду. Рэдактары і супрацоўнікі рэдакцый не пагаджаліся з усходнебеларускім "бальшавіцкім" правапісам, і многія зь іх ставалі свае правапісныя і лексычныя нормы. Шкодны хаос не спрыяў прэстыжу беларускай мовы як дзяржаўнай, што, у сваю чаргу, патрабавала неадкладна вырашыць справу правапісу.

З такой мэтай Краёвае выдавецтва "Менск" атрымала дазвол на выданьне "Беларускага правапісу" Б. Тарашкевіча, што і было зьдзейсьнена пад канец верасьня 1941 г. Гэта была першая кніжка, выпушчаная на тэрыторыі акупаванай Беларусі. "Правапіс" выйшаў вялікім накладам (20 тысяч асобнікаў) і прызначаўся галоўным чынам для рэдакцый газэт і школаў. Гэта было моцна скарочанае перавыданьне выпушчанага ў 1925 г. у Вільні падручніка правапісу, скампіляванага Радаславам Астроўскім паводле Б. Тарашкевіча і Я. Лёсіка. Выданьне "Правапісу" выклікала новыя спрэчкі, якія доўгі час працягваліся на старонках "Беларускай Газэты".

"Беларускі правапіс" быў адзінай кнігай, выпушчанай Краёвым выдавецтвам "Менск". Дарэчы, неўзабаве скончылася нібы незалежнае яго існаваньне. 16 кастрычніка 1941 г. выдавецтва было падпарадкавана Менскаму гарадзкому камісарыяту, а па нейкім часе аддзелу прэсы Генэральнага камісарыяту Беларусі[10]. Справа заснаваньня кніжнага выдавецтва і далей адкладалася на пазьнейшы час, і толькі "Ўрадавыя Весьнікі" час ад часу нагадвалі пра неабходнасьць атрыманьня дазволу ўладаў на кожнае друкаванае выданьне.

Выданьні ксяндза С. Глякоўскага

У гэтых варунках была зьдзейсьнена прыватная ініцыятыва ксяндза Станіслава Глякоўскага, вядомага ў 30-х гадах выдаўца беларускай каталіцкай літаратуры ў Вільні. Зь ліпеня 1941 г. ён працаваў у Менску, рамантаваў касьцёлы, арганізоўваў беларускае каталіцкае душпастырства і разам са сваімі памочнікамі, маладымі сьвятарамі Дзянісам Мальцам і Казімерам Рыбалтоўскім, праводзіў катэхізацыю моладзі.

З увагі на вострую нястачу рэлігійнай літаратуры на пачатку сьнежня 1941 г. ён выдаў "Кароткі катэхізм для беларусаў-каталікоў" кс. Язэпа Рэшаця і невялікі "Кароткі малітаўнік для беларусаў-каталікоў". Абедзьве кнігі былі надрукаваны лацінкай. Катэхізмоўка Я. Рэшаця была поўным перадрукам яе аднайменнага віленскага выданьня 1927 г., а малітаўнічак зьмяшчаў выбраныя тэксты з выдадзенай у 1934 г. у Вільні кніжкі да набажэнства "Hołas Dušy".

Цікава заўважыць, што вынікам ініцыятывы кс. С. Глякоўскага былі, на добры лад, ня дзьве, а тры кніжкі, бо, маючы на ўвазе моўныя асаблівасьці Ўсходняй Беларусі, ён выдаў "Кароткі малітаўнік" ня толькі лацінкай, але і кірыліцай. Калі да гэтага часу беларускамоўная каталіцкая літаратура друкавалася выключна лацінкай, то выданьне ў 1941 г. каталіцкага малітаўніка кірылічным альфабэтам было абсалютнай навіной —

[9] Кубэ В. Ліст да А. Розэнбэрга ад 17.09.1941. Архіў актаў новых у Варшаве, Александрыйскія мікрафільмы. Т—454, ролік 21/668.

[10] Жумарь С. Тамсама. С. 21.

першай у найноўшай гісторыі спробай альфабэтнай уніфікацыі беларускамоўных канфэсійных выданьняў.

Усё ж гэты пачын кс. Глякоўскага, які сёньня ўхваляецца бадай усімі каталіцкімі выдаўцамі ў Беларусі, ня быў тады ім намераны. Вось што пра гэта пісаў аўтару 30 сакавіка 1996 г. Антон Шукелойць, у той час блізкі супрацоўнік кс. Глякоўскага:

> Кс. Ст. Глякоўскі быў вялікім энтуз'ястам лацінкі і ўсе аб'явы і лісты пісаў па беларуску лацінкай. Часта людзі менскія думалі, што пісана па нямецку і прыносілі да перакладу на беларускую мову. Але пры касьцеле на Кальварыі пасяліўся нелегальна ксёндз паляк, які выдаў прымітыўнай тэхнікай малітаўнік польскі кірыліцай. <...> Вось гэты факт выкарыстоўвання кірыліцы польскімі ксяндзамі і прымусіў кс. Глякоўскага выдаць малітаўнік беларускі кірыліцай.

Выпуск кірылічнага варыянту малітаўніка меў трагічныя наступствы. У той час дзейнічала ў Менску група праваслаўных экстрэмістаў (Іван Касяк, Юліян Саковіч і іншыя), паводле якіх беларускія ксяндзы даўно чакалі, каб на разваліпах рэлігійнага жыцьця ва Ўсходняй Беларусі распачаць місіянэрскую працу і пасьля прыбыцьця ў Менск адразу яе разгарнулі, як сярод каталікоў, так і праваслаўных[11]. Пачуцьцё небясьпекі паглыбляла нават беларуская мова, якой яны карысталіся, бо Праваслаўная Царква магла супрацьпаставіць адно традыцыйную расейшчыну. У такой атмасфэры кірылічны малітаўнік уяўляўся як доказ місіянэрскіх намераў кс. Глякоўскага сярод праваслаўных і прычыніўся да яго загубы[12].

З розных тэхнічных прычынаў няпроста было надрукаваць катэхізмоўку і лацінічны малітаўнік у Менску. Паколькі ў гарадзкой друкарні былі праблемы са шрыфтамі і паліграфістамі, набор лацінічных тэкстаў выконваўся ў Вільні, адкуль Язэп Найдзюк, які ўдзельнічаў у іх выпуску, прывозіў у Менск гатовыя да друку матрыцы. Толькі кірылічны варыянт малітаўніка мог быць поўнасьцю выкананы ў менскай друкарні.

Выданьні кс. С. Глякоўскага зьвяртаюць увагу адной цікавай асаблівасьцю. Вось жа, на вокладцы "Кароткага катэхізму" былі пададзены ўсе асноўныя біяграфічныя дэталі: прозьвішча аўтара, месца і год выпуску, выдавецтва і друкарня, што не выклікае сумненьняў у легальнасьці выданьня. Затое абодва малітаўнікі (лацінічны і кірылічны варыянты) нагадваюць нелегальныя публікацыі: на іх вокладках, акрамя загалоўка, не пададзены ніякія зьвесткі.

Паводле Найдзюка (ліст да аўтара ад 30.11.1980), яны былі надрукаваныя "не зусім легальна". Якая была прычына гэтай паўлегальнасьці, дакладна невядома. Магчыма, Генэральны камісарыят дазволіў выдаць усе прапанаваныя тэксты ў адной кнізе, а выдавец, не атрымаўшы цэнзурных засьцярог адносна зьместу і карыстаючыся дапамогай новага старшыні гораду Вацлава Іваноўскага, якому падпарадкоўвалася друкарня, надрукаваў катэхізм і малітаўнікі асобнымі кніжачкамі, зь якіх толькі адна магла быць выпушчана безь нежаданых наступстваў.

У выніку пасьля вайны ўзьніклі праблемы з ідэнтыфікацыяй малітаўнікаў. Наўрад ці хто лічыў іх падпольнымі выданьнямі, тым ня менш не было вядома хто, дзе і калі іх выдаў. Такія праблемы былі і ў аўтара, які ў 1984 г. атрымаў ад Міхаліны Татарыновіч лацінічны варыянт малітаўніка. І толькі інфармацыя Антона Шукелойця і дасланы ім ксэракс кірылічнага варыянту высьветлілі генэзу гэтых загадкавых кніг.

[11] А.М. (Апанас Мартос) Матэр'ялы да гісторыі Праваслаўнае Беларускае Царквы (Пэрыяд савецкай і нямецкай акупацыі Беларусі). Нямеччына, 1948. С. 135—136.

[12] Туронак Ю. Трагізм і загадкавасьць лёсаў. Да гісторыі беларускага каталіцкага душпастырства ў Менску // С. 421—429 гэтага выданьня. — *Рэд.*

Выданьні Школьнага інспэктарату

Першы нясьмелы крок у галіне кнігадрукаваньня быў зроблены акупацыйнымі ўладамі напрыканцы 1941 г. у сувязі з аднаўленьнем працы школаў. 12 сьнежня міністэрства акупаваных усходніх абшараў выслала райхскамісарам Остлянду і Ўкраіны інструкцыю, у якой таксама забаранялася карыстацца савецкімі навучальнымі плянамі, падручнікамі і іншымі "палітычна тэндэнцыйнымі" дапаможнікамі. Інструкцыя рэкамэндавала мясцовым уладам забясьпечыць школы навучальным матэрыялам, які павінны былі стварыць аддзелы культуры генэральных камісарыятаў[13].

Агульныя прынцыпы акупацыйнай школьнай палітыкі, відаць, былі раней вядомыя В. Кубэ, і ён не марнаваў часу на завяршэньне бюракратычнай працэдуры. Ужо 7 кастрычніка 1941 г. для нагляду над працай школаў, што аднаўляліся, быў створаны Школьны інспэктарат як інтэгральная частка Генэральнага камісарыяту. Кіраўніком інспэктарату Кубэ прызначыў Ёзафа Сівіцу, сылескага немца, які ведаў польскую мову, а з часам нядрэнна вывучыў і беларускую[14]. Яму падпарадкоўваўся ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, які пад канец кастрычніка прыбыў з Бэрліна і быў прызначаны галоўным школьным інспэктарам.

Пад іх кіраўніцтвам працаваў т.зв. Навуковы аддзел інспэктарату, першачарговай задачай якога была падрыхтоўка навучальных плянаў і праграм. Да гэтай працы запрасілі пэдагогаў, якія за два месяцы апрацавалі праграмы навучаньня ўсіх прадметаў для пачатковых школаў, што былі надрукаваныя на пачатку сьнежня 1941 г. у менскай друкарні ў форме паасобных брашураў і перададзеныя акруговым і раённым школьным інспэктарам на іх першай канфэрэнцыі, якая адбылася 15—17 сьнежня 1941 г. у Менску.

Агулам надрукавалі 13 праграм навучаньня: беларускай і нямецкай моваў, геаграфіі, гісторыі, грамадазнаўства, матэматыкі, музыкі і сьпеваў, прыродазнаўства, ручной працы, рысаваньня, фізыкі, фізычнага ўзгадаваньня моладзі, хіміі. Гэта, па сутнасьці, былі праекты праграм навучаньня і такімі заставаліся да канца акупацыі. Ва ўмовах нястачы школьных падручнікаў праграмы разам з часопісам "Беларуская Школа" сталі асноўнымі мэтадычнымі дапаможнікамі ў працэсе школьнага навучаньня. На пачатку 1942 г. стараньнем Інспэктарату была надрукаваная "Інструкцыя аб правядзеньні пераводаў з клясы ў клясу і аб выпускных экзамэнах у народных беларускіх школах".

Аднак ні праграмы, ні часопіс "Беларуская Школа", які са студзеня да сьнежня 1942 г. выдаваўся Інспэктаратам у дзьвюх частках — для настаўнікаў і вучняў, — не маглі замяніць школьных падручнікаў. Таму, пасьля таго, як навуковы аддзел Інспэктарату справіўся са сьпешнай падрыхтоўкай навучальных праграм, перад ім паўстала важнейшае заданьне — апрацоўка і выпуск падручнікаў.

Паводле Язэпа Найдзюка, да кастрычніка 1942 г., г.зн. за першы год працы Інспэктарату, беларускія пэдагогі і спэцыялісты падрыхтавалі каля 20 падручнікаў, у тым ліку: лемантар, чытанку, выпісы зь літаратуры, правапіс, граматыку, арытмэтычныя задачнікі для I—V клясаў, падручнікі па геамэтрыі, гісторыі, прыродаведзе і гігіене[15]. Апрацоўваліся яны ня толькі ў Менску, але і ў Варшаве (Зоф'яй Дабрынскай), а таксама ў Вільні, якую на пачатку лютага 1942 г. наведалі Ё. Сівіца з В. Гадлеўскім і абмяркоўвалі з аўтарамі гэтае пытаньне[16]. Выглядае на тое, што аўтарскіх прапаноў было

[13] Міністэрства акупаваных усходніх абшараў. Дырэктыва для райхскамісараў Остлянд і Ўкраіна ад 12.12.1941. Архіў актаў новых у Варшаве. Александрыйскія мікрафільмы. Т–454, ролік 20/871.

[14] Найдзюк Я. Ліст да аўтара ад 18.09.1979 (архіў аўтара).

[15] Беларуская Газэта. 1942. 15 кастрычніка.

[16] Раніца. 1943. 22 сакавіка.

дастаткова.

Аднак выпуск падручнікаў сутыкнуўся зь нечаканымі цяжкасьцямі, і ў 1941/42 годзе школы працавалі без падручнікаў. Затрымка нярэдка тлумачылася абставінамі ваеннага часу і патрабаваньнем міністэрства акупаваных усходніх абшараў дасылаць яму тэксты падручнікаў для праверкі і зацьвярджэньня[17]. Праўда, гэтае патрабаваньне ўскладняла працэдуру іх выпуску, але ня толькі яно было прычынай затрымкі. У прыватнасьці, дырэктыва міністэрства адносілася да ўсіх абшараў Остлянду, аднак выдаўцы літоўскіх, латыскіх і эстонскіх падручнікаў, хоць і непакоіліся, такіх цяжкасьцяў не адчувалі.

Затое Беларусь не магла абысьціся без спэцыфікі. Міністар акупаваных усходніх абшараў Альфрэд Розэнбэрг, які скептычна ацэньваў здольнасьць беларускага народу да самастойнага жыцьця, нечакана стаў прыхільнікам яго далучэньня да сям'і народаў Новай Эўропы, чаму, на яго думку, павінна была спрыяць замена кірылічнага альфабэту на лацінку. Гэтая ідэя міністра прапагандавалася і яго падначаленымі ў Менску, у тым ліку і Сівіцам, які ўжо ў сьнежні 1941 г. пазнаёміў зь ёй удзельнікаў канфэрэнцыі школьных інспэктараў[18].

Неўзабаве ідэя стала дырэктывай для чыноўнікаў міністэрства і Генэральнага камісарыяту ў Менску. 25 чэрвеня 1942 г. Розэнбэрг выдаў загад аб паступовым увядзеньні лацінкі ў народныя школы Беларусі: у 1942/43 г. яна ўводзілася ў першыя і часткова другія клясы, акрамя таго яе вывучэньне рэкамэндавалася і ў астатніх клясах пачатковых школ[19].

Загад Розэнбэрга значна ўскладніў працу Інспэктарату: ніхто, нават Сівіца, ня быў упэўнены, якія падручнікі і якім альфабэтам будуць дапушчаныя ў школы праз год ці два. Не было такой упэўненасьці ў бэрлінскім міністэрстве, якое магло загадаць пераклад дасланага тэксту з кірыліцы ў лацінку. Адначасова працягваліся бясконцыя спрэчкі паміж беларускімі прыхільнікамі першай і другой альфабэтных сыстэм.

Іншай прычынай, якая стрымлівала выпуск падручнікаў, была недасканаласьць правапісу і тэрміналёгіі. Гэтае пытаньне імкнулася вырашыць створаная ў студзені 1942 г. у рамках Інспэктарату тэрміналягічная камісія, якая толькі ў сакавіку 1943 г. зацьвердзіла новы правапіс[20]. Акрамя таго, камісія апрацавала некалькі тэрміналягічных слоўнікаў, аднак ніводзін зь іх ня ўбачыў сьвету.

Выдавецкія спробы БНС

У кастрычніку 1941 г. з Прагі ў Менск прыехаў Іван Ермачэнка, прызначаны А. Розэнбэргам кіраўніком Беларускай народнай самапомачы (БНС) — адзінай пакуль што дазволенай акупацыйнымі ўладамі грамадзкай арганізацыі ў Беларусі. 22 кастрычніка Кубэ і Ермачэнка выдалі адозву да насельніцтва, у якой абвяшчалі стварэньне БНС. Праз некалькі дзён "Менская Газэта" апублікавала яе статут, які, акрамя грамадзкай апекі і аховы здароўя, даваў БНС права арганізаваць культурную дзейнасьць, між іншым, выдаваць кнігі і часопісы.

Іван Ермачэнка быў перакананым прыхільнікам беларуска–нямецкага супрацоўніцтва і карыстаўся даверам і падтрымкай В. Кубэ. У ліпені 1942 г. Кубэ паклікаў яго ў свой штаб як мужа даверу, даручыў яму арганізацыю Беларускай самааховы і, як пісаў шэф паліцыі бясьпекі ў Беларусі Эдуард Штраўх, быў намераны прызначыць І. Ермачэнку

[17] Міністэрства акупаваных усходніх абшараў. Дырэктыва для райхскамісараў Остлянд і Ўкраіна ад 8.03.1942. Архіў актаў новых у Варшаве. Александрыйскія мікрафільмы. Т–454, ролік 20/907.
[18] Беларуская Школа. 1942. № 1. Студзень.
[19] Тамсама. 1942. № 5. Верасень—кастрычнік.
[20] Жумарь С. Тамсама. С. 223.

на пост прэм'ера будучай беларускай дзяржавы[21].

Пазыцыя І. Ермачэнкі абумовіла дзеяньні яго нядаўняга супрацоўніка па праскіх курсах беларусаведы Я. Станкевіча, які каля 20 сьнежня 1941 г. прыехаў з Варшавы ў Менск. У студзені 1942 г. І. Ермачэнка паклікаў Я. Станкевіча на пасаду свайго намесьніка і прызначыў яго кіраўніком Менскага акруговага аддзелу БНС. Адначасова ён далучыўся да супрацоўнікаў школьнага Інспэктарату, у якім працаваў над падрыхтоўкай падручнікаў і тэрміналёгіі. Аднак у выніку канфлікту з БНСаўскім дзеячом Іванам Касяком і Ё. Сівіцам, якога ён абвінаваціў у стрымліваньні выпуску падручнікаў, Станкевіч быў вымушаны пакінуць гэтыя пасады, і толькі заступніцтва Ермачэнкі выратавала яго ад арышту[22].

Аднак канфлікт зь Ё. Сівіцам не спыніў клопатаў Я. Станкевіча пра кнігадрукаваньне. Скончыўся першы год акупацыі, а нямецкія ўлады не сьпяшаліся стварыць выдавецтва. З гэтай прычыны ён вырашыў не чакаць нямецкай ласкі і арганізаваць выпуск кніг у рамках БНС, што дазваляў ейны статут. Як паведамляла прэса, гэтая яго дзейнасьць пачалася ў чэрвені 1942 г., вядома, не без ухвалы Ермачэнкі[23].

Першай кнігай, якую выпусьціла БНС, была манаграфія Янкі Станкевіча "Крыўя–Беларусь у мінуласьці", надрукаваная ў жніўні 1942 г. вялікім накладам у 50 тыс. асобнікаў[24]. Раней, ад 12 лістапада 1941 г. да 31 студзеня 1942 г., яна друкавалася ў "Менскай Газэце". "Крыўя–Беларусь у мінуласьці" не была цалкам новай кнігай, але перапрацаваным і пашыраным аўтарам варыянтам праскага выданьня "Курс гісторыі Крывіі–Беларусі", у выніку чаго яна магла быць хутка надрукаваная ў Менску.

Пра выпуск гэтай кнігі шмат пазьней Іван Касяк напісаў:

> На самым пачатку дзейнасьці нямецкай цывільнай адміністрацыі д-р Ян Станкевіч змог собскімі сродкамі і ашукваючы немцаў выдаць друкам у Менску сваю невялікую гістарычную кніжку "Беларусь–Крывія ў мінуласьці". Выказаныя ў ёй погляды аб балтыцкіх уплывах на народ Беларусі выклікалі надзвычайную варожасьць у Генэральным камісарыяце Беларусі. Д-р Станкевіч мусіў уцякаць зь Менску, каб ухаваць жыцьцё[25].

Варта разгледзець выказваньні І. Касяка. Па-першае, "Крыўя–Беларусь у мінуласьці" выйшла не на пачатку дзейнасьці цывільнай адміністрацыі, але амаль на год пазьней, па-другое, была выпушчана на сродкі БНС, а ня аўтара, урэшце, па-трэцяе, не магла выклікаць варожасьці Генэральнага камісарыяту, які ўжо раней дазволіў яе надрукаваць у "Менскай Газэце", у сувязі з чым ніякой патрэбы "ашукваць немцаў" у Станкевіча не было. На гэта паказваюць і выступленьні Кубэ, які ахвотна падкрэсьліваў этнічныя асаблівасьці беларусаў, іх часткова нардычнае паходжаньне і г.д.[26].

Пасьля выпуску сваёй кнігі "Крыўя–Беларусь у мінуласьці" Станкевіч надалей працаваў у выдавецкім аддзеле БНС. Пад канец жніўня 1942 г. ён выехаў у Вільню, аднак не для "ўхаваньня" жыцьця, як лічыў Касяк, а для нагляду над выпускам сваёй чарговай кнігі "Лемантар пераходны з лацініцы на кірыліцу"[27]. Яе набор рабіўся лацінскім

---

[21] Даклад Э. Штраўха ад 25.07.1943 // Vierteljahreshefte für Zeitgeschichte. 1956. Heft 1. S. 81—82.

[22] Справаздача "Эвы" (Зоф'і Дабрынскай) з падарожжа ў Менск у ліпені 1942 г. Архіў актаў новых у Варшаве. Фонд Дэлегатуры ўраду, 203/VII—45. С. 23.

[23] Раніца. 1943. 10 студзеня.

[24] Лісты Я. Станкевіча да К. Езавітава ад 19.07. і 31.08.1942 // Спадчына. 1999. № 5—6.

[25] Найдзюк Я. і Касяк І. Беларусь учора і сяньня. Менск, 1993. С. 284.

[26] Беларускі народны каляндар на 1944 г. Менск, 1944. С. 94.

[27] Бессэнсоўныя выказваньні Касяка пра кнігу Станкевіча адлюстроўвалі яго стаўленьне да тагачасных дзеячоў каталіцкага паходжаньня, якіх ён падазраваў у прыхаванай прапольскай дзейнасьці. Ня маючы іншых магчымасьцяў, Касяк складаў менскаму СД надуманыя даносы на Я. Станкевіча, В.

шрыфтам у віленскай друкарні, і там яна была надрукаваная. Невядома, што паўплывала на выданьне гэтай кнігі. У той час, калі ў беларускія школы ўводзілася лацінка, здаецца, больш патрэбны быў пераходны лемантар з кірыліцы на лацінку, а не наадварот.

Выданьне абедзьвюх кніг Я. Станкевіча сьведчыла ня толькі пра магчымасьці, якія Ермачэнка стварыў свайму сябру. У той час, у другой палове 1942 г., пад яго кіраўніцтвам БНС дасягнула апагею сваіх пачынаньняў: была створана ўстанова Мужоў даверу, арганізоўваўся корпус Беларускай самаахову, актывізавалася дзейнасьць у галіне школьніцтва, культуры і прапаганды, што побач з грамадзкай апекай і аховай здароўя стварала надзею на прызнаньне самаўрадавых кампэтэнцый Самапомачы.

Інтэгральнай часткай спадзяваньняў Ермачэнкі быў праект стварэньня на базе БНС кніжнага выдавецтва. З такой мэтай ён запрасіў у выдавецкі аддзел Самапомачы Язэпа Найдзюка, вопытнага друкара і выдаўца беларускіх кніг і часопісаў у даваеннай Вільні. Найдзюк неадкладна заняўся падрыхтоўкай чарговых кніг. Паводле справаздачы кіраўніцтва БНС на сакавіцкі (1943 г.) зьезд яе акруговых кіраўнікоў, да гэтага часу Самапомач надрукавала акрамя дзьвюх кніг Станкевіча яшчэ зборнік калядных песень ("Ой, прыйшла каляда". — *Ю.Т.*), "Страявы вайсковы статут" і падрыхтавала да друку пашыраную Найдзюком кніжку В. Ластоўскага "Што трэба ведаць кажнаму беларусу", "Новы беларускі песеньнік" і некалькі календароў[28].

Пададзеныя ў гэтай справаздачы зьвесткі ствараюць пэўную загадку для бібліёграфа. Справа ў тым, што на вокладках трох кніг: "Ой, прыйшла каляда", "Страявы вайсковы статут" і "Што трэба ведаць кажнаму беларусу" пазначаны як выдавец не БНС, а новастворанае Выдавецтва школьных падручнікаў і літаратуры для моладзі. Чаму апрацаваныя ў БНС і надрукаваныя коштам гэтай арганізацыі кнігі не былі выдадзеныя пад яе грыфам?

Так, летам 1942 г. начальства СС і паліцыі выступіла з рэзкай крытыкай палітыкі Кубэ ў Беларусі, які інсьпіраваў і падтрымоўваў незалежніцкія праекты Ермачэнкі, у прыватнасьці, стварэньне Самаахову. Паступова на пачатку 1943 г. сфэра дзейнасьці БНС была моцна звужана і абмежавана да грамадзкай апекі і аховы здароўя. Выдаваць кнігі ёй ужо не дазвалялася. У красавіку 1943 г. Ермачэнка быў адсунуты ад кіраўніцтва і вымушаны пакінуць Беларусь[29].

Такім чынам, пад фірмай БНС былі выдадзеныя ў Менску толькі дзьве кнігі Я. Станкевіча. Трэцюю — "Беларускі лемантар "Зорка" — выпусьцілі, верагодна, напрыканцы 1942 г. дзеячы БНС у Баранавічах[30].

Гэтага лемантара нам не давялося ні бачыць, ні знайсьці яго бібліяграфічнага апісаньня. Магчыма, ён быў поўным ці частковым перавыданьнем аднайменнага лемантара Аляксандры Смоліч, які ў міжваенныя гады некалькі разоў выпускаўся ў Вільні.

Іваноўскага, Я. Найдзюка і іншых. Гэтая справа разглядалася ў 1946 г. падчас выбараў у Беларускі нацыянальны камітэт у Нямеччыне, калі Я. Станкевіч адмовіўся супрацоўнічаць з Касяком за ягоныя даносы на Іваноўскага; у чым, пасьля сьведчаньня былога перакладчыка ў Менскім СД Віктара Чабатарэвіча, Касяк быў вымушаны прызнацца (гл.: Галяк Л. Успаміны. Частка другая. ЗША, 1983. С. 62). На сваё апраўданьне Касяк пазьней напісаў, што беларусы змагаліся з польскай акцыяй "тымі сродкамі, якія былі даступныя" (гл.: Касяк І. З гісторыі Праваслаўнай царквы беларускага народу. Нью-Ёрк, 1956. С. 121.).

[28] Беларуская Газэта. 1943. 18 сакавіка.

[29] Пра перадумовы канфлікту Кубэ і СС, які паўплываў на справу БНС і Ермачэнкі, гл. шырэй у працы Ю. Туронка "Беларусь пад нямецкай акупацыяй". С. 510—677 у гэтым. выд. — *Рэд.*

[30] Голас Вёскі. 1943. 11 лютага.

Выдавецтва школьных падручнікаў і літаратуры для моладзі

Пішучы ў "Беларускай Газэце" (1942. 15 кастрычніка) пра вынікі працы школьнага Інспэктарату за першы год яго дзейнасьці, Я. Найдзюк выказаў спадзяваньне на ажыўленьне выпуску кніг пасьля заснаваньня Выдавецтва школьных падручнікаў і літаратуры для моладзі (далей ВШПЛМ), якое да гэтага часу, г.зн. да паловы кастрычніка 1942 г., усё яшчэ было ў стане арганізацыі. Першую зьвестку пра яго заснаваньне падала "Беларуская Школа": выдаўцом першых чатырох нумароў гэтага двухмесячніка быў Інспэктарат, а пятага, за верасень—кастрычнік 1942 г., — ВШПЛМ. Аднак пяты нумар "Беларускай Школы" выйшаў са спазьненьнем на некалькі тыдняў, відаць, у палове лістапада, на што паказвае зьвестка пра ягоны выпуск, надрукаваная 22 лістапада 1942 г. у "Беларускай Газэце". Такім чынам, заснаваньне ВШПЛМ адбылося пад канец кастрычніка або на пачатку лістапада 1942 г.

Кіраўніком ВШПЛМ В. Кубэ назначыў Ё. Сівіцу, які надалей заставаўся шэфам школьнага Інспэктарату. Абедзьве гэтыя структуры аднолькава падпарадкоўваліся Генэральнаму камісарыяту Беларусі і працавалі пад кіраўніцтвам яго чыноўніка Сівіцы, які да канца акупацыі быў цэнзарам друкаваных кніг. Тэхнічным кіраўніком выдавецтва быў Язэп Найдзюк. У выдавецтве працавалі: прафэсар Мікола Байкоў, Антон Лёсік — брат мовазнаўцы й пэдагога Язэпа Лёсіка, Аўген Калубовіч, Язэп Гладкі, бухгальтар, сакратарка і машыністкі. З выдавецтвам супрацоўнічалі Янка Станкевіч, Яўхім Кіпель, Пётар Кісель, кампазытары Аляксей Туранкоў і Мікола Шчаглоў, мастак–графік Анатоль Тычына і іншыя[31].

Выдавецтва месьцілася ў доме № 13 на Камсамольскай вуліцы, перайменаванай падчас акупацыі на вуліцу Алеся Гаруна. Тамсама знаходзіўся Школьны інспэктарат і БНС. Людзі, якія займаліся апрацоўкай і выпускам кніг, звычайна рабілі адну і тую справу і ня раз, асабліва праз дзесяцігодзьдзі, не маглі дакладна акрэсьліць для якой "фірмы" яны працавалі — для Інспэктарату, БНС ці выдавецтва. Нават Найдзюк, які выдатна ведаў тагачаснае становішча, блытаў выдавецтва з Інспэктаратам. Яўхім Кіпель, які з другой паловы 1942 г. працаваў у навуковым аддзеле Інспэктарату, пасьля вайны пісаў: "...мне не было ясна, куды гэты аддзел належаў адміністрацыйна: уважалася, што аддзел знаходзіўся пры Генэральным Камісарыяце, хоць мясьціўся ён пры Самапомачы, ды ў розных справах адміністрацыйных усё заладжвалася якраз у той Самапомачы"[32].

Першай кнігай, якую напрыканцы 1942 г. выпусьціла ВШПЛМ, быў "Беларускі лемантар" Пятра Кісяля — дырэктара адной зь менскіх школаў. Яе выданьне адлюстроўвала незвычайныя цяжкасьці ў навучальным працэсе, калі забаранялася карыстацца савецкімі падручнікамі, а іншых не было. Кісель згадзіўся апрацаваць лемантар, аднак да восені 1942 г. здолеў падрыхтаваць толькі трэцюю яго частку. Усё ж, каб хоць часткова задаволіць патрэбы школаў, Інспэктарат вырашыў надрукаваць гэтую частку. Яе тэкст раптоўна абрываўся на 32 старонцы, на літары "Д". Выдавецтва не лічыла яго паўнацэнным лемантаром і не называла яго ў сьпісах сваіх выданьняў. Аднак кур'ёзнае выданьне 1942 г. адпавядае ўсім бібліяграфічным нормам і таму ўлучана ў наш каталёг. Агулам ВШПЛМ выдала 24 кнігі, улучна з лацінічным варыянтам "Беларускага правапісу" Лёсіка. З увагі на невялікую іх колькасьць выпуск кожнай кнігі быў свайго роду падзеяй і адзначаўся ў прэсе.

Найболып пільным іх "летапісцам", так як калісьці ў віленскім "Шляху Моладзі", быў Язэп Найдзюк, які пад сваімі псэўданімамі (З. Бойдацкі, Разглядальнік і іншымі) сыстэматычна зьмяшчаў у "Беларускай Газэце" і "Голасе Вёскі" інфармацыю аб вы-

[31] Найдзюк Я. Ліст да аўтара ад 18.09.1979 (архіў аўтара).
[32] Кіпель Я. Эпізоды. Нью–Ёрк, 1998. С. 212.

даньнях ВШПЛМ. "Кажная новая беларуская кніжачка, — пісаў ён 6 траўня 1943 г. у "Беларускай Газэце", — нашым часам цешыць ужо самым фактам свайго зьяўленьня". Гэтыя яго зьвесткі дазволілі вызначыць розныя бібліяграфічныя дэталі, якія часам не падаваліся на вокладках кніг, у прыватнасьці, удакладніць час іх выпуску. З увагі на кароткую дзейнасьць ВШПЛМ сам год выпуску кнігі яшчэ недастатковы для высьвятленьня выдавецкай працэдуры і яе вынікаў. Праўда, на некаторых кнігах часам падаваўся і месяц выпуску, але такіх кніг было няшмат, і толькі дзякуючы прэсавай інфармацыі можна было ўстанавіць больш дакладны тэрмін выданьня, прынамсі, па кварталах. Дарэчы, зборнік "Ой, прыйшла каляда" быў выдадзены не ў 1942 г., як пададзена на яго вокладцы, а ў студзені 1943 г. (гл. дакумэнтацыю ў каталёгу).

Вынікі працы ВШПЛМ, найбольш істотныя для аналізу яго дзейнасьці, паказаны ў табліцы 1. Кнігі, выдадзеныя лацінкай, трансьлітаруюцца кірыліцай, аднак з абазначэньнем альфабэту кожнай кнігі сымбалямі "К" — кірыліца і "Л" — лацінка. Фактычны выпуск кніг даецца па кварталах. У табліцы не падаецца месца выданьня, якім ва ўсіх выпадках быў Менск як сядзіба ВШПЛМ, затое падаецца месца іх надрукаваньня. Усе бібліяграфічныя дэталі ў поўным выглядзе пададзеныя ў каталёзе.

Табліца 1. Кнігі Выдавецтва школьных падручнікаў і літаратуры для моладзі

Аўтар/ загаловак	Альфабэт	Год, квартал выданьня	Колькасьць стар.	Наклад у тыс.	Месца друку
П. Кісель. Беларускі лемантар	Л	1942, IV	32	?	Менск
Ой, прыйшла каляда	К	1943, I	16	5	Менск
Страявы вайсковы статут	К	1943, I	31	10	Менск
В. Ластоўскі. Што трэба ведаць кажнаму беларусу	К	1943, II	31	?	Менск
Вясна–красна	К	1943, II	16	?	Менск
М. Лясун. На крыжы	К	1943, II	62	?	Менск
Эвангельскі хрысьціянскі сьпеўнік	К	1943, II	176	?	?
П. Кісель. Беларускі лемантар	Л	1943, II	96	?	Менск
Зборнік купальскіх і жніўных песьняў	К	1943, III	36	?	Менск
Зборнік сцэнічных твораў	К	1943, III	80	?	Менск
А. Лёсік. Беларускі правапіс	К	1943, III	61	100	Менск
Б. Тарашкевіч. Беларуская граматыка	К	1943, IV	104	100	Менск
З. Дабрынская, П. Шырынскі. Зборнік арытмэтычных задачаў	Л	1943, IV	88	50	Вільня
З. Дабрынская, М. Завусьцінскі. Зборнік арытмэтычных задачаў	Л	1943, IV	104	50	Вільня
Я. Станкевіч. Кніжка вучыцца чытаць і пісаць лацініцаю	К, Л	1943, IV	48	10	Вільня
А. Лёсік. Беларускі правапіс	Л	1944, I	72	50	Вільня
П. Кісель. Беларускі лемантар	Л	1944, I	96	30	Менск
Т. Лебяда. Песьні выгнаньня	К	1944, I	32	5	Вільня
Я. Найдзюк. Беларусь учора і сяньня	К	1944, I	304	25	Менск
Л. Случанін. Рагнеда	К	1944, II	63	5	Вільня
Н. Арсеньнева. Сягоньня	К	1944, II	127	5	Вільня
Я. Станкевіч. Маленькі слоўнічак фразэолёгічны	К	1944, II	151	?	Менск
Выбраныя беларускія народныя казкі	Л	1944, II	96	?	Вільня
Алесь Салавей. Мае песьні	К	1944, III	96	3	Рыга

Хаця асноўнай задачай ВШПЛМ быў выпуск літаратуры для патрэб школьніцтва, тэматычны дыяпазон яго выданьняў даволі шырокі. Акрамя школьных падручнікаў, яно выпусьціла песеньнікі, рэпэртуарны зборнік, казкі, мастацкую, рэлігійную, вайсковую, навуковую і навукова–папулярную літаратуру.

Пераважную частку выданьняў ВШПЛМ складалі арыгінальныя творы беларускіх аўтараў, апрацаваныя ва ўмовах нямецкай акупацыі. Да іх ліку належалі школьныя падручнікі П. Кісяля, А. Лёсіка, Я. Станкевіча і З. Дабрынскай, зборнікі паэзіі і апавяданьняў Н. Арсеньневай, Т. Лебяды, М. Лясуна, А. Салаўя і Л. Случаніна, а таксама апрацаваны Я. Станкевічам пры ўдзеле А. Адамовіча "Маленькі маскоўска–беларускі (крывіцкі) слоўнічак фразэолёгічны". "Граматыка" Б. Тарашкевіча лічылася перавыданьнем яе пятага віленскага выпуску, аднак яна была перапрацаваная і дапоўненая А. Лёсікам, К. Шкуцькам і А. Адамовічам згодна з патрабаваньнем новага правапісу.

Кніга Я. Найдзюка "Беларусь учора і сяньня" не была падручнікам для пачатковых школаў. Яна мела характар навукова–папулярнай працы, прызначанай для нацыянальнай адукацыі інтэлігенцыі і старэйшай моладзі, у прыватнасьці, для вучняў настаўніцкіх сэмінарыяў. Параўнальна аб'ёмістая кніга (звыш 300 старонак) не рыхтавалася насьпех — над ёй аўтар працаваў яшчэ ў Вільні, дзе ў 1940 г. выдаў аднайменную кніжку і ў 1941—1942 гг. закончыў апрацоўку яе новага варыянту, які ад пачатку 1942 г. друкаваўся ў "Голасе Вёскі". Аднак, нягледзячы на сугучнасьць загалоўкаў, няма падставы лічыць менскае выданьне пашыраным перавыданьнем віленскага: аб'ём выдадзенай у 1944 г. кнігі быў у пяць разоў большы, чым віленскага выданьня. Па сутнасьці, гэта быў цалкам новы твор.

Новымі былі і выданьні фальклёрных песень "Ой, прыйшла каляда", "Вясна–красна" і "Зборнік купальскіх і жніўных песьняў" з музычнай гарманізацыяй М. Шчаглова, А. Туранкова і іншых кампазытараў. Некаторыя кнігі, як "Зборнік сцэнічных твораў", "Выбраныя беларускія народныя казкі" і "Што трэба ведаць кажнаму беларусу" В. Ластоўскага былі перадрукам ранейшых выданьняў, прычым апошняя была пашырана Я. Найдзюком.

Больш складаная была кампазыцыя апрацаванага ў 1942 г. прапаведнікам царквы баптыстаў у Беларусі Антонам Кецкам "Эвангельскага хрысьціянскага сьпеўніка". Зьмешчаныя ў ім 142 рэлігійныя гімны былі часткова перадрукаваныя з папраўкамі з даваенных песеньнікаў "Песьні духоўныя з гарфы сіёнскай" (Варшава, 1925) і "Божая ліра" (Вільня, 1930) і часткова новаперакладзены Натальляй Арсеньневай зь нямецкай мовы. Да перакладной літаратуры таксама адносіўся "Страявы вайсковы статут", апрацаваны Віталём Мікулам на загад І. Ермачэнкі для патрэб Самааховы, паліцыі і школьнай моладзі.

Як паказана ў табліцы, з агульнай колькасьці 24 кніг, выпушчаных ВШПЛМ, 16 было надрукавана кірыліцай, 7 — лацінкай, а Я. Станкевіча "Кніжка вучыцца чытаць і пісаць лацініцаю" — двума альфабэтамі. Яна прызначалася як дапаможнік для ўсходнебеларускіх настаўнікаў, зь якіх многія ведалі толькі кірыліцу. Згодна з дырэктывай А. Розэнбэрга, лацінкай друкаваліся пераважна школьныя падручнікі. Астатнія кнігі, як правіла, выдаваліся кірыліцай, а адзіным выняткам былі "Выбраныя беларускія народныя казкі", на што, відаць, паўплывалі асабістыя сымпатыі да лацінкі яе складальніка і выдаўца Язэпа Найдзюка.

З розных прычынаў кнігі ВШПЛМ друкаваліся ў розных друкарнях. Паколькі ў Менску былі праблемы з адпаведнымі шрыфтамі і друкарамі, набор лацінічных выданьняў пераважна адбываўся ў Вільні і частка іх там друкавалася. Аднак у выніку перагружанасьці менскіх друкарняў у Вільню накіроўваліся і некаторыя кірылічныя выданьні ВШПЛМ, напрыклад, зборнікі вершаў Т. Лебяды, Н. Арсеньневай і Л. Случаніна. Агулам у Менску надрукавана 14 кніг, у Вільні — 8 і адна — у Рызе, дзе працаваў яе аўтар Алесь

Салавей. Ня высьветлена месца друку "Эвангельскага хрысьціянскага сьпеўніка".

Кнігі ВШПЛМ выпускаліся адносна вялікімі накладамі. Граматыка Тарашкевіча і кірылічны варыянт "Правапісу" А. Лёсіка выдадзеныя 100–тысячным накладам кожная кніга, а арытмэтычныя задачнікі і лацінічны варыянт "Правапісу" — па 50 тыс. асобнікаў. Напэўна, ня меншы быў агульны наклад "Лемантара" П. Кісяля — яго другое, стэрэатыпнае выданьне 1944 г. выйшла накладам 30 тыс. асобнікаў. Наклад папулярнай гісторыі Беларусі Я. Найдзюка склаў 25 тыс., зборнікаў паэзіі Н. Арсеньневай, Л. Случаніна і А. Салаўя — ад 3 да 5 тыс., "Страявога вайсковага статуту" — 10 тыс. і зборніку "Ой, прыйшла каляда" — 5 тыс. асобнікаў.

Паводле зьвестак, падаваных на вокладках кніг і ў газэтах, цэны выданьняў ВШПЛМ былі адносна нізкія. Школьныя падручнікі прадаваліся па 1,00—2,00 маркі, зборнік Т. Лебяды "Песьні выгнаньня" каштаваў 75 пфэнігаў, зборнік вершаў А. Салаўя — 3 маркі, "Выбраныя беларускія народныя казкі" — 3,50 маркі, "Фразэолёгічны слоўнічак" Я. Станкевіча — 2 маркі, а найбольш аб'ёмістая кніга Найдзюка "Беларусь учора і сяньня" — 5 марак. Паводле Я. Найдзюка, кнігі ВШПЛМ пачаткова субсыдыяваліся Генэральным камісарыятам, але з часам прыход зь іх продажу перавысіў кошты выданьня і выдавецтва стала прыбытковым[33].

Для ацэнкі дзейнасьці ВШПЛМ важнае значэньне мае фактар часу выпуску кніг, ад чаго ў вялікай ступені залежалі іх распаўсюджваньне і выкарыстаньне. Першы школьны падручнік — закончаны "Беларускі лемантар" Кісяля — быў надрукаваны вясной (хутчэй за ўсё ў траўні 1943 г.), і таму наўрад ці акруговыя і павятовыя школьныя інспэктары змаглі яго даставіць у школы перад летнімі вакацыямі. А гэта значыць, што ня толькі ў 1941/42, але і ў 1942/43 годзе школы працавалі без падручнікаў. Летам 1943 г. выйшаў з друку кірылічны варыянт "Беларускага правапісу" А. Лёсіка, а ў сьнежні і на пачатку 1944 г. — астатнія падручнікі, але настаўнікі і вучні маглі імі карыстацца ўсяго некалькі месяцаў, бадай, да траўня, калі закончыліся школьныя заняткі. Пазьней яны ўжо былі непатрэбныя.

Як паказана ў табліцы 1, 13 кніг, або больш за палову ўсіх выданьняў ВШПЛМ, былі надрукаваныя ў апошнія месяцы акупацыі — ад сьнежня 1943 да чэрвеня 1944 г. Кнігі Н. Арсеньневай, Л. Случаніна, казкі і фразэалягічны слоўнічак Я. Станкевіча выйшлі ў траўні–чэрвені 1944 г., і таму толькі нязначная частка іх накладаў магла быць распаўсюджаная да чэрвеньскага наступленьня Чырвонай Арміі. Як пісаў Я. Станкевіч у прадмове да другога выданьня "Слоўнічка", у выніку сьпешнай эвакуацыі ў Нямеччыну амаль увесь наклад яго кнігі застаўся ў Менску. Такі ж быў лёс і зборніка лірыкі Алеся Салаўя "Мае песьні", надрукаванага ў ліпені 1944 г. у Рызе, адкуль толькі частку накладу аўтар змог забраць з сабою ў Бэрлін[34].

З прычыны эвакуацыі не было закончана выданьне некалькіх кніг, падрыхтаваных ВШПЛМ да друку. На пачатку 1944 г. У. Сядура здаў выдавецтву дзьве свае працы "Беларускі тэатар" і "Беларускае мастацтва", якія, паводле "Беларускай Газэты" ад 15 сакавіка 1944 г., павінны былі "ў хуткім часе ўбачыць сьвет". Не была выдадзена п'еса Т. Лебяды "Загубленае жыцьцё", чытанка П. Кісяля і некалькі рэлігійных прац ксяндза Ільдэфонса Бобіча.

Іншыя выдаўцы

У адрозьненьне ад газэт і часопісаў, выданьне кніг на абшары Генэральнай акругі Беларусь, як і на іншых тэрыторыях Остлянду, не было строга цэнтралізавана і ВШПЛМ

[33] Паводле інфармацыі Я. Найдзюка з 1980 г.

[34] Пра гэтыя турботы А. Салаўя гл.: Адамовіч Антон. Жыцьцё й паэтычная спадчына Алеся Салаўя ў кнізе Нятуская краса // Салавей Алесь. Збор твораў. Нью–Ёрк—Мэльбурн, 1982. С. 307—311.

не было выключным выдаўцом. Выпускаць кнігі дазвалялася і іншым установам, згуртаваньням ці асобам пасьля атрыманьня на тое згоды генэральнага або акруговага камісарыяту. Паколькі акупацыйныя ўлады не стваралі прынцыповых перашкод, выданьне кнігі па–за ВШПЛМ у значнай меры залежала ад ініцыятывы і творчых магчымасьцяў аўтараў і выдаўцоў і, вядома, наяўнасьці сродкаў. Аднак такіх выданьняў было ўсяго некалькі.

У сьнежні 1943 г. у Слуцку быў выпушчаны зборнік вершаў мясцовых аўтараў "Песьняры Случчыны" пад рэдакцыяй Уладзімера Клішэвіча. У зборніку друкаваліся творы У. Клішэвіча, Л. Случаніна, Я. Золака, А. Крота, В. Блакітнага, Л. Гая і В. Явара. Гэты даволі аб'ёмісты зборнік убачыў сьвет дзякуючы датацыі Слуцкага акруговага камісарыяту. Вясной 1944 г. рэдакцыя часопіса "Новы Шлях" выпусьціла сцэнічны гратэск Францішка Аляхновіча "Круці, ня круці — трэба памярці".

Пасьля забойства 5 сакавіка 1943 г. лідэра беларускіх нацыянал–сацыялістаў Фабіяна Акінчыца яго ідэйныя паплечнікі Уладзіслаў Казлоўскі і Міхась Ганько выдалі ў Менску брашуру "Фабіян Акінчыц. Ягонае жыцьцё і думкі". Брашура, напэўна, выйшла на сродкі СБМ, як і апрацаваны пры ўдзеле кампазытара Міколы Шчаглова "Юнацкі сьпеўнік", выдадзены на пачатку 1944 г.

Немалую цікавасьць выклікае выданьне кнігі "Смалакурэньне" прафэсара Калыньша, якая 19.04.1944 рэклямавалася ў "Беларускай Газэце". У ёй разглядаліся спосабы карчаваньня пнёў, тэхналёгія вуглепаленьня, дзёгцекурэньня, кансэрвацыі драўніны і смалакурэньня.

Нам не давялося адшукаць гэтую кнігу ці яе бібліяграфічнае апісаньне, акрамя пададзеных у каталёгу аб'ёму і кошту. Таксама невядома, ці Калыньш — гэта сапраўднае прозьвішча ці псэўданім. Затое вядома, што падобнымі пытаньнямі, у прыватнасьці, карчаваньнем пнёў і кансэрвацыяй драўніны, займаўся ў 30–я гады прафэсар Варшаўскай палітэхнікі Вацлаў Іваноўскі, які ў 1941—1943 гг. працаваў у Менску[35]. Можа, гэты сьлед давядзе будучых дасьледчыкаў да разгадкі пытаньня аўтарства і выданьня.

Даволі позна занялася выпускам папулярнай сельскагаспадарчай літаратуры рэдакцыя газэты "Голас Вёскі". Як пісаў яе былы рэдактар Яўхім Кіпель, вясной 1944 г. было здадзена ў друк шэсьць кніжачак, якія мелі выйсьці 25–тысячным накладам кожная[36]. Далейшы іх лёс невядомы.

Безвыніковымі былі выдавецкія пляны Беларускай цэнтральнай рады. Паводле Р. Астроўскага, яе навуковы аддзел за некалькі месяцаў свайго існаваньня склаў 21 падручнік для сярэдніх і пачатковых школаў і апрацаваў беларуска–нямецкі тэхнічны слоўнік[37]. Некаторыя падручнікі мелі быць здадзены ў друк, але ніводзін ня ўбачыў сьвету.

* * *

Агулам за тры гады акупацыі ў Генэральнай акрузе Беларусь выйшла, ня лічачы нямецкіх выданьняў (пра якія ніжэй), 50 кніг на беларускай мове. Зь іх ліку Краёвае выдавецтва "Менск" выпусьціла 1 кнігу, ксёндз Глякоўскі — 3, школьны Інспэктарат — 14, БНС — 3, ВШПЛМ — 24 і іншыя выдаўцы — 5.

Генэральная акруга Літва

Вялікае значэньне Вільні як нацыянальнага цэнтру Заходняй Беларусі пачало слабець ужо ў 30–х гадах, калі польскія ўлады паступова спынялі дзейнасьць беларускіх

[35] Туронак Ю. Вацлаў Іваноўскі і адраджэньне Беларусі. С. 140—256 гэтага выданьня. — *Рэд.*
[36] Кіпель Я. Тамсама. С. 222.
[37] Другі Ўсебеларускі Кангрэс. Мюнхэн: выд. БЦР, 1954. С. 24—25.

грамадзкіх і культурных арганізацый і выганялі з роднага краю іх актыўных удзельнікаў. Значэньне Вільні яшчэ больш паслабела пасьля далучэньня восеньню 1939 г. заходнебеларускіх абшараў да Савецкай Беларусі і тэрытарыяльнага разьмежаваньня БССР і Літвы. Беларуская грамада ў Вільні раптоўна апынулася ў становішчы ледзь не замежнай эміграцкай групоўкі з абмежаванымі сувязямі з насельніцтвам заходніх абласьцей БССР. Да таго, гэтая групоўка пачала прыкметна зьмяншацца — адны перасяляліся ў Беларусь, іншых савецкія ўлады арыштоўвалі і вывозілі, урэшце некалькі дзясяткаў дзеячоў напярэдадні акупацыі Літвы Чырвонай Арміяй у другой палове чэрвеня 1940 г. выехала зь Вільні на абшар нямецкай акупацыі.

Падчас нямецкай акупацыі ў Вільні існаваў адноўлены Беларускі нацыянальны камітэт, працавала беларуская гімназія і настаўніцкая сэмінарыя, з сакавіка 1942 г. выдаваўся штотыднёвы "Беларускі Голас". Аднак наўрад ці гэтыя мерапрыемствы былі задуманыя як спроба актывізацыі беларускага руху на абшары Літвы. Паводле Язэпа Малецкага, старшыні БНК у 1941—1942 гг., галоўным заданьнем камітэту была падборка кадраў для працы ў Беларусі, куды накіравалі некалькі сот чалавек[38]. Зь ліку шматлікіх да вайны ўдзельнікаў кнігавыдавецкага руху ў Вільні засталіся нямногія — ксёндз Адам Станкевіч, Станіслаў Грынкевіч, Францішак Аляхновіч і некалькі іншых.

У такіх варунках за тры гады нямецкай акупацыі ў Вільні выйшлі толькі тры беларускія кніжкі, зь якіх дзьве — "Патрэбнейшыя выняткі з Рытуалу" і вучнёўскі малітаўнік "Вучыся і маліся" апрацаваў і выдаў у 1943 і 1944 г. ксёндз Адам Станкевіч. Паводле "Беларускай Газэты" (29.03.1944), да выпуску малітаўніка прычыніліся віленскія беларусы-каталікі, відаць, шляхам аказаньня грашовай падтрымкі.

Трэцяя кніга — "25-лецьце Беларускае Гімназіі ў Вільні 1919—1944" выйшла стараньнем кіраўніцтва гімназіі, юбілей якой сьвяткаваўся ў красавіку 1944 г. У кнізе зьмяшчаліся друкаваныя кірыліцай і лацінкай тэксты гадунцоў гімназіі ды іншых дзеячоў.

Генэральная акруга Латвія

Больш стабільным, чым у Літве, было становішча беларускай меншасьці ў Латвіі. Праўда, і там культурна-асьветная дзейнасьць беларускіх арганізацый ужо ў 30-я гады абмяжоўвалася латыскім урадам, а ў 1940/41 г. была цалкам спынена савецкімі ўладамі, аднак гэтыя падзеі не выклікалі такой значнай міграцыі беларускай інтэлігенцыі, як у Вільні. У выніку, ва ўмовах нямецкай акупацыі няцяжка было аднавіць ранейшыя арганізацыйныя структуры.

Важную ролю ў грамадзкім жыцьці латвійскіх беларусаў адыграў Канстанцін Езавітаў. У жніўні 1941 г. ён узначаліў Беларускі нацыянальны камітэт у Рызе, які кіраваў працай мясцовых камітэтаў ва Ўсходняй Латвіі, галоўным чынам па аднаўленьні школаў і гурткоў мастацкай самадзейнасьці.

Значную ролю адыграў К. Езавітаў і ў аднаўленьні кнігавыдавецкай дзейнасьці ў Латвіі. Посьпех у гэтай справе залежаў ня толькі ад дазволу акупацыйных уладаў, але таксама, і то ня ў меншай меры, ад наяўнасьці сродкаў, пра якія мусіў рупіцца сам выдавец.

З такой мэтай узьнікла ідэя стварэньня грамадзкага выдавецкага фонду, якая ажыцьцяўлялася арганізаваным парадкам сярод настаўнікаў. Як паведамляла "Раніца" (26.07.1942), першыя пачалі зьбіраць грошы на выданьне падручнікаў і іншых кніг настаўнікі Дзьвіншчыны, зь якіх кожны прызначыў на выдавецкі фонд адну месячную зарплату. Гэтая акцыя працягвалася і ў наступным годзе, а сабраныя грошы перадаваліся ў распараджэньне К. Езавітава.

[38] Малецкі Я. Пад знакам Пагоні. Таронта, 1976. С. 54.

Незалежна ад настаўніцкіх складчын, якія, вядома, не маглі забясьпечыць выдавецкіх патрэбаў, К. Езавітаў, напэўна, спадзяваўся і на іншыя грашовыя паступленьні і на базе сваіх аптымістычных разьлікаў разьвіваў амбітныя пляны. Акрамя школьных падручнікаў ён імкнуўся выдаваць кнігі для дзяцей, музычную і навуковую літаратуру, слоўнікі. Працаваў сам і заахвочваў да супрацоўніцтва іншых аўтараў, мастакоў, кампазытараў, наладзіў кантакты зь менскімі выдаўцамі Янкам Станкевічам і Язэпам Найдзюком, які ў лютым 1942 г. адведаў яго ў Рызе.

Летам 1942 г. К. Езавітаў сумесна з П. Бруноўскім і П. Масальскім закончылі апрацоўку беларуска-нямецкага слоўніка, які плянавалі выдаць у нямецкім выдавецтве ў Рызе[39].У канцы жніўня Я. Станкевіч даслаў яму рукапісы апрацаваных Зоф'яй Дабрынскай падручнікаў — лемантара, чытанкі "Наша кляса" і выдадзеную ў Празе яе "Арытмэтыку" з прапановай перавыданьня ў Рызе[40]. На заклік Езавітава адгукнуліся Аляксей Туранкоў і іншыя менскія кампазытары, а таксама дырэктар гімназіі ў Зілупэ на Люцыншчыне Сяргей Сахараў, які падрыхтаваў да друку зборнік народных твораў. У выдавецкую дзейнасьць уключылася і рыская мастачка родам з Чарнігаўшчыны Аляксандра Бяльцова, якая рыхтавала малюнкі да праектаваных кніжак для дзяцей.

Супрацоўнікаў і матэрыялаў прыбывала, але фінансавыя магчымасьці відавочна не адпавядалі аптымістычным спадзяваньням К. Езавітава. Таму, кіруючыся камэрцыйным разьлікам, ён пачаў з музычнай літаратуры, якая ўяўлялася больш прыбытковай, чым школьныя падручнікі.

Пры значным попыце на музычныя творы ў Латвіі і Беларусі плянаваныя паступленьні зь іх продажу павінны былі хутка палепшыць фінансавае становішча выдаўца і паспрыяць рэалізацыі яго праграмы.

На працягу сямі месяцаў — ад лістапада 1942 да траўня 1943 г. — К. Езавітаў выдаў у Рызе 10 паасобных беларускіх народных песень і рамансаў з нотамі ў гарманізацыі кампазытараў: М. Зінчука "Палыночак", Т. Самохінай "Непагодны вечар", А. Спаскага "Астры", А. Туранкова "Маладыя гады", "Лета", "Скрыпка", "Вечар", "Лявоніха", "Слуцкія ткачыхі" і "Ў садочку цьвітучым", а таксама два зборнікі: М. Мікалаевіча "3 беларускія народныя песьні" і А. Туранкова "7 беларускіх рамансаў". Усе творы былі выпушчаныя накладам ад 1000 да 2000 асобнікаў і атрымалі высокую ацэнку рэцэнзэнтаў А. Карповіча (Новы Шлях. 1943. № 18) і М. Шчаглова (Беларуская Газэта. 1943. 8 верасьня.).

Аднак музычная літаратура не дала спадзяванага прыбытку, у сувязі з чым К. Езавітаў быў вымушаны абмежаваць ранейшыя праекты. У палове 1943 г. быў надрукаваны невялікі "Статут Беларускага аб'яднаньня ў Латвіі" і, пасьля доўгага чаканьня, у лістападзе 1943 г. выйшла яго чытанка "Беларуская школа", перадрукаваная з даваеннага рыскага выданьня. Урэшце ў траўні 1944 г. выйшла ілюстраваная Аляксандрай Бяльцовай кніжка для дзяцей "Камарочак", якая, здаецца, была апошнім выдавецкім зьдзяйсьненьнем К. Езавітава.

Некалькі кніг засталося ў рукапісах. Не былі выкарыстаны дасланыя Я. Станкевічам лемантар і чытанка З. Дабрынскай, зборнік народных твораў С. Сахарава, а таксама беларуска-нямецкі слоўнік. Затое плянавалася выданьне "Арытмэтыкі" З. Дабрынскай. Летам 1943 г. быў атрыманы дазвол нямецкіх уладаў на выпуск гэтага падручніка, пасьля чаго К. Езавітаў здаў яго ў друкарню, але ці з-за нястачы грошай ці з-за іншых прычынаў да канца акупацыі прэса не паведамляла пра яго надрукаваньне.

Акрамя К. Езавітава, энтузіястам выдавецкай працы ў Латвіі быў Мікола Панькоў, які ўзначаліў у Дзьвінску ініцыятыўную групу па падрыхтоўцы Беларускай Народнай Энцыкляпэдыі. У ёй плянавалася 50—55 тыс. артыкулаў, тысячы здымкаў, ма-

[39] Раніца.1942. 26 студзеня.

[40] Станкевіч Я. Лісты да К. Езавітава ад 19.07.1942 і 31.08.1942 // Спадчына. 1999. № 5—6.

люнкаў, картаў, дыяграм і інш. У залежнасьці ад падтрымкі гэтай ініцыятывы творчай інтэлігенцыяй Панькоў спадзяваўся скончыць падрыхтоўку энцыкляпэдыі не пазьней 1944 г.[41]. Задума была нерэальная і не магла зьдзейсьніцца.

Беластоцкая акруга

Да нямецкай акупацыі беларускія кнігі ў Беластоку амаль не выдаваліся, сьціплыя патрэбы мясцовага насельніцтва пакрываліся паставамі віленскіх, а з восені 1939 г. — менскіх выданьняў. Адсутнасьць выдавецкай традыцыі і мясцовых творцаў была асноўнай прычынай стагнацыі кнігавыдавецкай справы і падчас акупацыі. Нямецкая адміністрацыя доўгі час яе не стымулявала і абмяжоўвалася выпускам для беларусаў Беластоцкай акругі штотыднёвіка "Новая Дарога" і пэрыядычных календароў "Гаспадар".

Рухавіком інтэлектуальнага жыцьця ў Беластоку быў у той час вядомы паэт і гісторык, вілянчук Хведар Ільляшэвіч — старшыня Беларускага аб'яднаньня і рэдактар "Новай Дарогі". У кастрычніку 1943 г. ён прыцягнуў да супрацоўніцтва прыбылага з Магілёўшчыны паэта Масея Сяднёва, які апрацаваў у Беластоку зборнік успамінаў і артыкулаў пад загалоўкам "Ахвяры бальшавізму", а таксама зборнік сваіх вершаў "Ад сына твайго, Беларусь". На пачатку 1944 г. Беларускае аб'яднаньне рашыла выдаць абедзьве кнігі М. Сяднёва і пасьля атрыманьня дазволу ўладаў выслала іх у кёнігсбэрскую друкарню.

Як пісаў аўтару М. Сяднёў, абодва зборнікі друкаваліся ў Кёнігсбэргу адначасова і ў ліпені 1944 г. ужо былі гатовыя. Аднак падчас бамбаваньня гораду зборнік вершаў згарэў, а "Ахвяры бальшавізму" цудам ацалелі. Усё ж друкарня не магла выслаць ацалелы наклад Беларускаму аб'яднаньню ў Беласток, які ў міжчасе быў заняты Чырвонай Арміяй. Кніга была адпраўлена Беларускаму камітэту самапомачы ў Бэрлін, дзе неўзабаве апынуўся і яе аўтар[42].

Таксама ня зьдзейсьніўся выпуск двух школьных падручнікаў — лемантара і чытанкі для II—III клясаў. Адзін зь іх апрацаваў інспэктар беларускіх школаў Беластоцкай акругі Аляксей Грыцук, а другі — іншы настаўнік, праўдападобна, П. Санчык. Абедзьве кніжкі на пачатку 1944 г. былі адпраўлены ў кёнігсбэргскую друкарню і там згарэлі ў выніку ваенных дзеяньняў[43]. Такім чынам, рэальны вынік кнігавыдавецкай дзейнасьці ў Беластоку абмежаваўся адной кнігай Сяднёва "Ахвяры бальшавізму", якая распаўсюджвалася ўжо толькі сярод эмігрантаў у Нямеччыне.

Чамусьці не шанцавала Беластоку. У 1943 г. Беларускае Аб'яднаньне плянавала выдаць зборнік народных казак Беласточчыны і зборнік беларускіх песень, які рыхтавалі мясцовыя кампазытары З. Арлоў і А. Евец[44]. Аднак ніводзін зь іх ня быў складальнікамі скончаны.

У апошнія месяцы акупацыі Х. Ільляшэвіч разгортваў новыя праекты кнігавыдавецкай дзейнасьці ў Беластоку — плянаваў выдаць лепшыя творы беларускай літаратуры ў сэрыі "Беларуская Народная Бібліятэчка", пераклады сусьветнай клясыкі ў сэрыі "Бібліятэка перакладаў" і іншыя кніжкі[45]. Гэтыя праекты перакрэсьліла наступленьне Чырвонай Арміі. Летам 1944 г. Ільляшэвіч выехаў у Бэрлін, дзе ажыцьцяўляў сваю задуму.

---

[41] Новая Дарога. 1943. 5 верасьня.

[42] Сяднёў М. Ліст да аўтара ад 02.10.1995 (архіў аўтара).

[43] Relacja Aleksandra Hrycuka... // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 1999. № 11. S. 228—234.

[44] Новая Дарога. 1943. 25 ліпеня.

[45] Жумарь С. Тамсама. С. 40.

Генэральнае губэрнатарства

Заснаваны на пачатку 1940 г. Беларускі камітэт у Варшаве на працягу ўсёй сваёй гісторыі фармальна не займаўся выдавецкай дзейнасьцю. Аднак з ініцыятывы камітэту 19 ліпеня 1942 г. было створана пры беларускай праваслаўнай парафіі ў Варшаве Царкоўнае брацтва імя сьвятога Юр'я, якое з апрабацыяй Варшаўскага мітрапаліта Дзяніса выпускала рэлігійную літаратуру на беларускай мове[46].

У 1942—1943 гг. старшынём брацтва быў протаярэй Хведар Барэцкі, настаяцель беларускай праваслаўнай парафіі ў Варшаве, яго намесьнікам — доктар Антон Краскоўскі, а сакратаром — Мікола Ждановіч, які адначасова ўваходзіў у склад кіраўніцтва камітэту. Праз Ждановіча камітэт ажыцьцяўляў фінансавую і іншую дапамогу брацтву ў яго выдавецкіх мерапрыемствах. Акрамя таго, Ждановіч быў неафіцыйным рэдактарам выдаванай літаратуры. Першай кніжкай, выдадзенай брацтвам, стаў надрукаваны ў жніўні 1942 г. "Нармальны статут праваслаўных царкоўных брацтваў". Вясной 1943 г. выйшаў вялікім накладам "Беларускі праваслаўны малітвеньнік", апрацаваны на падставе даваеннага падручніка С. Паўловіча "Першая навука Закону Божага", а таксама "Беларускі праваслаўны патэрык", прысьвечаны пытаньням гісторыі Праваслаўнай Царквы ў Беларусі. Акрамя таго, брацтва выпусьціла невялікі царкоўны каляндар на 1943 г. Як паведамляла "Раніца" (1944. 9 студзеня), брацтва пачало рыхтаваць выпуск другога сшытка "Патэрыка", які, аднак, ня ўбачыў сьвету.

З увагі на абмежаваны попыт у Генэральным губэрнатарстве кіраўніцтва брацтва ў паразуменьні зь Беларускім камітэтам рашыла значную частку накладу малітвеньніка распаўсюдзіць бясплатна сярод беларусаў у Нямеччыне, што і было зроблена на пачатку 1944 г.[47].

Нямеччына

Калі да 22 чэрвеня 1941 г. беларускім выдаўцам на тэрыторыі Нямеччыны забаранялася выказваць варожае стаўленьне да Савецкага Саюзу, то ва ўмовах нямецка-савецкай вайны такое патрабаваньне, вядома, ужо ня мела сэнсу. Зьмяніўся тон "Раніцы", але не беларускіх кніжных выданьняў, якія, дарэчы, выпускаліся рэдка і на фоне ажыўленай дзейнасьці расейскіх і ўкраінскіх выдаўцоў былі малапрыкметныя.

Беларускі камітэт самапомачы ў Бэрліне толькі ў другой палове 1942 г. пачаў спарадычна выпускаць кнігі і брашуры, што было заслугай Міколы Абрамчыка і яго жонкі Ніны. Стараньнем Абрамчыка летам 1942 г. БКС выдаў дзьве кнігі — Якуба Коласа "Сымон-Музыка" і зборнік вершаў Ларысы Геніюш "Ад родных ніў". Першая зь іх была перадрукам даваеннага віленскага выданьня, а другую падрыхтаваў да друку Вітаўт Тумаш, карыстаючыся тэкстамі, апублікаванымі ў "Раніцы" і атрыманымі ад аўтаркі з Прагі. Абедзьве кнігі былі адначасова надрукаваныя ў праскай друкарні "Палітыка" і ў верасьні 1942 г. рэклямаваліся на старонках "Раніцы".

Згодна з агульнапрынятым правілам бібліяграфіі, месцам выданьня кнігі лічыцца сядзіба выдавецтва, а не друкарні. Для прыкладу: ВШПЛМ частку сваіх кніг друкавала ў Вільні, але месцам іх выданьня заўсёды лічыўся Менск. Аднак на выдадзеных бэрлінскім камітэтам кнігах Коласа і Геніюш як месца іх выданьня пазначана Прага. Прычына гэтай недакладнасьці невядомая. У той час Чэхія была не самастойнай дзяржавай, а пратэктаратам у складзе Нямеччыны, у сувязі з чым абедзьве кнігі выйшлі з паметкай *Printed in Germany*.

[46] Раніца. 1942. 19 ліпеня і 4 кастрычніка.

[47] Раніца. 1943. 21 лістапада і 1994. 22 студзеня.

Пасьля вайны ня раз распаўсюджваліся выказваньні пра канфіскацыю нямецкімі ўладамі кнігі Я. Коласа “Сымон–Музыка”, прычынай чаго было знаходжаньне аўтара ў СССР. Невядома, у якой ступені гэтыя зьвесткі адпавядалі сапраўднасьці. Пад кантролем нямецкай цэнзуры выйшла ня толькі кніга Я. Коласа, але і “Беларуская граматыка” камуніста Б. Тарашкевіча, а сям–там ставіліся гурткамі мастацкай самадзейнасьці п’есы Купалы, які таксама быў эвакуаваны ў СССР. Пра канфіскацыю нічога не было вядома, напрыклад, у варшаўскім беларускім камітэце, які бесьперашкодна распаўсюджваў Коласаву кнігу. Урэшце, нельга ігнараваць і паведамленьня “Раніцы” ад 9/16.05.1943 пра поўны распродаж выдадзеных БКС кніг Я. Коласа і Л. Геніюш.

У кнігавыдавецкай дзейнасьці ў Нямеччыне брала ўдзел таксама жонка Міколы Абрамчыка Ніна Ляўковіч–Абрамчык. У 1942/43 г. яна апрацавала і выдала пад грыфам БКС, або яго бэрлінскай філіі, пяць розных велічыні кніг. Усе яны выдаваліся лацінкай, ратартарнай тэхнікай з пазнакай “на правох рукапісу”.

Першым выданьнем гэтай сэрыі быў невялікі зборнік папулярных песень і патрыятычных вершаў пад загалоўкам “Беларусь у песьнях”, які, мяркуючы па рэклямных аб’явах “Раніцы”, зьявіўся не пазьней верасьня 1942 г. Неўзабаве была надрукаваная кніга “Гісторыя Беларусі ў картах”, апрацаваная паводле лекцый, якія ў 1941/42 г. чытаў Мікола Абрамчык на курсах беларусаведы ў Бэрліне. Кніга ілюстравалася 12 гістарычнымі картамі і малюнкамі Баляслава Барткевіча. Выйшла яна накладам 3500 асобнікаў і распаўсюджвалася, між іншым, у беларускіх школах Беласточчыны і Варшавы.

Пад канец 1942 г. выйшлі брашура “25 сакавіка” і апрацаваны айцом Віктарам Шутовічам зборнік 20 беларускіх калядак пад загалоўкам “Калядныя песьні”. Выдавецкую сэрыю Ніны Абрамчык закончыў апрацаваны ёю і выдадзены вясной 1943 г. зборнік 30 беларускіх папулярных песень, рамансаў і прыпевак “Пад гоман вясёлы”.

Пад канец лістапада ці на пачатку сьнежня 1943 г. Абрамчыкі выехалі ў Парыж, аднак да таго часу не праяўлялі ў Бэрліне новых выдавецкіх ініцыятыў. Магчыма, на гэта паўплываў слабы попыт на ратартарныя выданьні лацінскім альфабэтам, якія залежваліся і цэлыя два гады не сыходзілі з рэклямных аб’яваў “Раніцы”.

Апошнім выданьнем БКС быў перадрукаваны зь “Беларускай Газэты” “Тэстамэнт” Уладзімера Жылкі. Ён выйшаў у палове 1944 г. у выніку стараньняў Антона Адамовіча, які высока цаніў гэты твор. З агульнай колькасьці 8 выданьняў БКС толькі зборнік вершаў Ларысы Геніюш быў новаапрацаванай кнігай, а ўсе астатнія — перадрукам раней апублікаваных твораў.

Акрамя Бэрліна, беларускія кніжкі выдаваліся ў Празе. У першай палове 1942 г. стараньнем Янкі Станкевіча праская філія БКС выпусьціла “Арытмэтыку” З. Дабрынскай, а ў 1943 г. Васіль Русак выдаў ці перавыдаў свой зборнік “Беларускія (крывіцкія) песьні”.

Выдавецкая дзейнасьць у Бэрліне ажывілася ў другой палове 1944 г. У канцы ліпеня сюды прыбыў зь Беластоку былы рэдактар “Новай Дарогі” Хведар Ільляшэвіч, які працаваў у рэдакцыі “Раніцы” і, нягледзячы на мізэрныя пэрспэктывы, спрабаваў рэалізаваць свае выдавецкія праекты. Фактычна, Чырвоная Армія, што спынілася ўлетку 1944 г. на Віслe, набіраючы сілы для канчатковага наступленьня, дала яму на тое некалькі месяцаў часу.

Гэты час Х. Ільляшэвіч скарыстаў для выпуску сямі кніжак у сэрыі “Народная бібліятэчка”: Ю. Віцьбіча “Нацыянальныя сьвятыні” і “Вялікія паўстанцы. Гэньдзікаўскія змагары”, У. Глыбіннага “Смаленшчына — адвечная беларуская зямля”, А. Музыкі “Прыгоды Панаса і Тараса”, Л. Радзіміча “Адам і Ева”, “Чабор”, М. Шчаглова “Беларуская музычная культура”, а таксама зборнік “Дудар”, у які ўвайшлі апавяданьні В. Ластоўскага, М. Гарэцкага, А. Савіцкай, Ядвігіна Ш., А. Падгорнага і С. Палескага.

Шэсьць першых кніг былі надрукаваны на газэтнай паперы, яны мелі аднолькавы фармат і аб’ём (31—32 старонкі). Гэта дазваляе меркаваць, што яны выйшлі як дадатак

да "Раніцы". Сёмая кніга "Дудар" выйшла ў той самай сэрыі "Народная бібліятэчка", але з пазнакай *Vineta*, відавочна, яна была апрацаваная ў беларускім аддзеле гэтага выдавецтва, які да сьнежня 1944 г. існаваў у рамках бэрлінскага міністэрства прапаганды. "Дудар" выйшаў прыкладна ў тым самым фармаце, што і папярэднія кнігі гэтай сэрыі, але ва ўдвая большым аб'ёме. Яго выпусьціла дзяржаўнае выдавецтва іншамоўнай літаратуры.

Таксама ў другой палове 1944 г. у Бэрліне была заснавана невядомым выдаўцом іншая сэрыя — "Бібліятэчка каліноўцаў", у рамках якой выйшла толькі адна кніга — трэцяе, пашыранае Я. Найдзюком выданьне В. Ластоўскага "Што трэба ведаць кажнаму беларусу". Хутчэй за ўсё і яна была выдадзена як дадатак да "Раніцы".

Летам 1944 г. пасьля адступленьня з акупаваных тэрыторыяў СССР нямецкія ўлады паступова абмяжоўвалі прапагандысцкую ролю "Вінэты". Урэшце 1 сьнежня яе беларускі аддзел быў падпарадкаваны Беларускай цэнтральнай радзе ў Бэрліне і працягваў дзейнічаць як Беларускае інфармацыйнае бюро (БІБ).

У сьнежні 1944 г. БІБ выпусьціла апрацаваную яшчэ ў жніўні брашуру К. Езавітава "Беларуская Цэнтральная Рада адзіны правамоцны прадстаўнік беларускага народу" і плянавала выданьне выступленьня М. Шкялёнка на Другім усебеларускім кангрэсе ў Менску ў якасьці брашуры пад загалоўкам "Беларускі народ уневажняе бясправўныя пастановы", а таксама іншую брашуру К. Езавітава "Ўсебеларускі кангрэс". Паводле інфармацыі айца А. Надсана, дырэктара Беларускай бібліятэкі імя Ф. Скарыны ў Лёндане, быў зроблены друкарскі набор брашур і былі змакетаваныя адбіткі для карэктуры, але наўрад ці пасьпелі іх надрукаваць. З-за гэтага абедзьве брашуры БІБ у наш каталёг ня ўлучаны.

Таксама, як у Менску, Рызе, Беластоку і Варшаве, некаторыя кнігі, падрыхтаваныя да друку ў Бэрліне, ня ўбачылі сьвету з прычыны ваенных дзеяньняў. Летам 1944 г. П. Бакач закончыў апрацоўку нарысаў па гісторыі беларускай літаратуры, якія ў хуткім часе меліся быць надрукаваныя на беларускай і нямецкай мовах[48]. Пакуль што невядома пра лёс гэтай кнігі — ці яна загінула ў вогненым Бэрліне, ці захаваўся недзе яе рукапіс. Пад канец 1944 г. згарэў у бэрлінскай друкарні зборнік беларускіх народных песень і ўласных музычных твораў М. Равенскага[49]. Такі ж лёс спаткаў і кнігу Я. Кіпеля "Беларусы ў савецкіх канцлягерох", якая была падрыхтавана да выданьня ў "Вінэце" і ў лютым 1945 г. загінула падчас бамбардаваньня Бэрліна[50].

Ня ўсё, аднак, зьнішчалі саюзьніцкія бомбы, прыкладам чаго быў лёс "Нямецка-беларускага слоўніка" (27 тыс. слоў), апрацаванага Аляксандрам Калошам, Васілём Камароўскім і Янам Пятроўскім. Пасьля падпісаньня з выдавецтвам *Bernard und Graefe* дамовы на яго выданьне 10 сьнежня 1942 г. складальнікі перадалі выдавецтву рукапіс, атрымалі прадбачаную дамовай частку ганарару і пачалі распаўсюджваць у прэсе паведамленьне пра яго хуткі выпуск. Пра гэта пісалі ня толькі "Беларуская Газэта" (1943. 16 студзеня) і "Новая Дарога" (1943. 7 студзеня), але нават пскоўская "За родину" (1943. 2 февраля). Паведамляўся нават тэрмін выпуску — пачатак сакавіка 1943 г.

Тым часам складальнікі чакалі карэктуры і рыхтавалі другую частку — "Беларуска-нямецкі слоўнік". Аднак у лютым 1943 г. выдавецтва адмовілася надрукаваць слоўнік. На запытаньне аўтара Я. Пятроўскі ня выявіў прычыны рашэньня выдавецтва[51]. Ня выявіў яе адкрыта ён і ў сваіх "Мэмуарах", аднак зьмешчаная ў іх крытыка паводзін суаўтараў А. Калошы і В. Камароўскага і іх мовазнаўчых кваліфікацый дазваляе мерка-

[48] Раніца. 1944. 6 жніўня.

[49] Равенскі М. Аўтабіяграфія // Спадчына. 2000. № 4. С. 208.

[50] Кіпель Я. Тамсама. С. 231.

[51] Пятроўскі Я. Ліст да аўтара ад 20.08.1986 (архіў аўтара).

ваць, што гэтай прычынай была марная якасьць аўтарскага матэрыялу[52].

Відаць, падобнай была якасьць апрацаванага ў 1942 г. вялікага зборніка публіцыстыкі У. Глыбіннага "Жыве Беларусь". Аўтар прапаноўваў яго бадай усім беларускім выдаўцам, але ні яго захады, ні шумны патрыятычны загаловак не выклікалі іх зацікаўленьня. Як выявіла Алена Глагоўская, зборнік У. Глыбіннага закончыў сваю вандроўку ў аддзеле рукапісаў Акадэмічнай бібліятэкі ў Вільні.

Нямецкія беларускамоўныя выданьні

Амаль пятую частку ўсіх выданьняў, выпушчаных у гадох II сусьветнай вайны на беларускай мове, складалі кнігі і брашуры, выдадзеныя нямецкімі выдаўцамі. Агулам выяўлена 19 тытулаў, зь якіх 17 захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы і Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. У каталёгу ня ўлічаны выдадзены ў лютым 1944 г. нямецкім выдавецтвам Франка ў Рызе "Нямецка–расейска–беларуска–польскі ілюстраваны слоўнік", прызначаны для нямецкіх вайскоўцаў. Агульная колькасьць беларускамоўных нямецкіх выданьняў, напэўна, была большая, і можна спадзявацца, што некаторыя зь іх будуць выяўлены ў будучыні.

Зь ліку нямецкіх выданьняў толькі нямногія мелі практычны ўжыткоўны характар. Да іх адносяцца выдадзены ў 1942 г. паштовым упраўленьнем "Сьпіс абанэнтаў Менскай аўтаматычнай тэлефоннай сеткі" і "Кароткая інструкцыя Цэнтральнага гандлёвага таварыства «Ўсход»". Да гэтай катэгорыі выданьняў можна яшчэ залічыць апрацаваны Гансам Лёе невялікі "Нямецка–беларускі слоўнік" (Бэрлін, 1944), які прызначаўся для нямецкіх службоўцаў, але маглі ім карыстацца і беларусы.

Аднак пераважную частку нямецкіх выданьняў складалі папулярныя брашуры, якія прызначаліся для палітычнай прапаганды і дыскрэдытацыі савецкага рэжыму, апатэозу нацыянал–сацыялістычнай Нямеччыны і яе правадыра Адольфа Гітлера, схіленьня насельніцтва акупаваных усходніх абшараў да супрацоўніцтва з акупацыйнымі уладамі.

На вокладках 13 прапагандысцкіх брашур (гл. каталёг, № 105—117) акрамя загалоўкаў і зрэдку аўтараў не падаваліся ніякія бібліяграфічныя дэталі, у прыватнасьці, месца і год выпуску, выдавецтва і месца надрукаваньня, неабходныя для ідэнтыфікацыі іх паходжаньня. Усё ж адна акалічнасьць дае такую магчымасьць: прапагандысцкія брашуры выдаваліся на некалькіх мовах народаў акупаваных тэрыторыяў СССР (аўтару вядомы беларускі, расейскі і літоўскі варыянты брашуры "Гітлер і дзеці"), прычым ня бралася пад увагу нацыянальная спэцыфіка адрасатаў выданьня. А гэта значыць, што іх выдаўцом былі не прапагандысцкія службы ў Менску, але цэнтральная арганізацыя ў Бэрліне. Такой арганізацыяй была "Вінэта" — спэцыялізаванае выдавецтва, створанае ў 1941 г. у рамках міністэрства прапаганды. У "Вінэце" дзейнічаў таксама беларускі аддзел, у якім пад кіраўніцтвам Яна Пятроўскага працавала група беларускіх перакладчыкаў.

Іншай установай, якая імкнулася разгарнуць выпуск прапагандысцкіх беларускамоўных брашур, было прэсавае выдавецтва Генэральнага камісарыяту ў Менску. Асноўнай сфэрай яго дзейнасьці сталі пэрыядычныя выданьні — газэты, часопісы, календары, а таксама радыёвяшчаньне і плякаты, аднак з восені 1942 г. выдавецтва пачало рыхтаваць сэрыю брашур пад грыфам "Новая пара". 15 красавіка 1943 г. "Беларуская Газэта" паведаміла пра выпуск першага сшытка сэрыі пад загалоўкам "Праваднік для жадаючых адбудовы Беларусі", які быў прысьвечаны прапагандзе ідэі Новай Эўропы і супрацоўніцтва яе народаў. Аднак пра выпуск наступных сшыткаў прэса больш не па-

[52] Пятроўскі Я. Мэмуары. Стагодзьдзе ў рэтраспэкце (1905—1945). Кніга першая. Слуцак—Гэйнсвіль, 1988. С. 320—321.

ведамляла. Магчыма, на першым сшытку і закончылася плянаваная сэрыя.

Прапагандысцкі характар мела і невялікая кніга П. Штыра "Слова да маладых людзей", выдадзеная ў палове 1944 г. міністэрствам акупаваных усходніх абшараў. Яна прызначалася беларускай моладзі, якая вясной 1944 г. апынулася ў Нямеччыне, і заклікала яе да працы і змаганьня за ідэалы Новай Эўропы.

2. Альфабэтны каталёг кніг і брашур

Тлустым шрыфтам пазначаныя ў каталёгу прозьвішчы ці псэўданімы (крыптанімы) аўтараў і поўныя загалоўкі кніг і брашур згодна з арыгінальным правапісам і альфабэтам выданьня.

У канцы каталёгу асобна пададзены сьпіс нямецкіх прапагандысцкіх брашур, на якіх адсутнічаюць асноўныя бібліяграфічныя дэталі.

1. АЛЯХНОВІЧ ФРАНЦІШАК. Круці, ня круці — трэба памярці. Сцэнічны гротэск у шасьцёх абразкох з пралёгам. Менск: выд. часопіса "Новы Шлях", 1944. — 79 с. Фармат 11х15 см. Месца захаваньня — БДАЛІМ.

Інф.: Беларуская Газэта. 1944. 31 траўня.

2. АРСЕНЬНЕВА НАТАЛЬЛЯ. Сягоньня. Вершы 1941—1943. Менск: выд. ВШПЛМ. Друкарня "Аўшра" ў Вільні, 1944. — 127 с. Фармат 14х20 см. Накл. 5000 асобнікаў, цана РМ 5,00. Месца захаваньня — НББ.

Інф.: Беларуская Газэта. 1944. 31 траўня. ("гэтымі днямі выйшла"). Рэцэнзіі: Альгердзіч Г. Беларускага слова жніво // Раніца. 1944. 30 ліпеня; Дальны М. На новай хвалі // Новая Дарога. 1944. 28 траўня; Лагода М. Сягоньня // Пагоня. 1944. 31 траўня; Палявы А. Сардэчны накіп // Газэта Случчыны. 1944. 4 чэрвеня.

3. БАКАЧ П. Падручнік нямецкага языка для Беларусаў. Бэрлін: выд. Бэрнард і Грэфэ, 1941. — 357 с. Фармат 11х17 см. Месца захаваньня — Нацыянальная бібліятэка ў Варшаве. Загаловак таксама па-нямецку: Bakatsch P. Lehrbuch der deutschen Sprache für Weissruthenen.

Інф.: Раніца. 1941. 30 траўня.

4. БЕЛАРУСКІ ЛЕМАНТАР "Зорка". Баранавічы: выд. БНС, 1942.

Інф.: Голас Вёскі. 1943. 11 лютага.

5. БЕЛАРУСКІ праваслаўны малітвеньнік. З багаслаўленьня Блажэньнейшага Дзянісія Мітрапаліта Варшаўскага. Варшава: выд. Беларускага Царкоўнага Брацтва ім. Сьвятога Юрага ў Варшаве, друк Праваслаўнай Мітрапалітальнай Друкарні ў Варшаве, 1943. — 15 с. Фармат 12х16 см. Месца захаваньня — калекцыя аўтара.

Інф.: Раніца. 1943. 14 сакавіка.

6. БЕЛАРУСКІ праваслаўны патэрык. Першы сшыток. З багаслаўленьня Блажэньнейшага Дзянісія Мітрапаліта Варшаўскага. Варшава: выд. коштам Беларускага Царкоўнага Брацтва ім. Сьвятога Юрага ў Варшаве, друк Праваслаўнай Мітрапалітальнай Друкарні ў Варшаве, 1943. — 24 с. Фармат 15×24 см. Месца захаваньня — калекцыя аўтара.

Інф.: Раніца. 1943. 14 сакавіка.

7. БЕЛАРУСКІЯ (крывіцкія) песьні для соля, дуэту, квартэту з акампанімэнтам фортэпяна і 4 народныя танцы. Прага: выд. В. Русака, 1943. — 65 с.

Інф.: Раніца. 1944. 16 студзеня.

8. BIEŁARUŚ u pieśniach. Zborničak patryjatyčnaj paeziji. Бэрлін: выд. Беларускага камітэту самапомачы ў Нямеччыне, рататар, 1942. — 40 с. Фармат 15х21 см. Цана РМ 0,50. Месца захаваньня — Бібліятэка Ф. Скарыны ў Лёндане.

Інф.: Раніца. 1942. 20 жніўня.

9. ВЕРАС ЎСЕВАЛАД. Як створым нашую сілу. Бэрлін: б.м., б.г., ратапар, 1941. — 12 с. Фармат 15x21 см. Месца захаваньня — калекцыя аўтара.

10. ВЕРЕС У. Шляхом барацьбы Беларусі з Москвою. Бэрлін: б.м., б.г., ратапар, 1941. — 20 с. Фармат 15x21 см. Месца захаваньня — НАРБ, калекцыя аўтара.

11. ВІЦЬБІЧ ЮРКА. Нацыянальныя сьвятыні. Мастацкія нарысы. Бэрлін: Народная Бібліятэчка № 1, 1944. — 31 с. Фармат 11x15,5 см. Цана РМ 0,50. Месца захаваньня — Бібліятэка Ф. Скарыны ў Лёндане.

Інф.: Раніца. 1944. 17 сьнежня.

12. ВІЦЬБІЧ ЮРКА. Вялікія паўстанцы. Гэньдзікаўскія змагары. Бэрлін: Народная Бібліятэчка № 4. 1944. — 32 с. Фармат 11x14 см. Цана РМ 0,50. Месца захаваньня — Бібліятэка Ф. Скарыны ў Лёндане.

Інф.: Раніца. 1944. 17 сьнежня.

13. VUČYSIA I MALISIA. Malitaŭničak vučnia-katalika Vilenskaj Biełaruskaj Himnazii i Vilenskaj Vučycielskaj Seminaryi. Улажыў кс. Адам Станкевіч. Вільня, друкарня "Patria", 1944. — 96 с. Фармат 8x12 см. Месца захаваньня — калекцыя аўтара.

Інф.: Беларуская Газэта. 1944. 29 сакавіка.

14. VYBRANYJA biełaruskija narodnyja kazki. Knižka dla dziaciej i moładzi. Vybraŭ Jazep Najdziuk. Менск: выд. ВШПЛМ, друкарня ў Вільні, 1944. — 96 с. Фармат 15x21 см. Цана РМ 3,50. Месца захаваньня — НББ.

Інф.: Беларуская Газэта. 1944. 10 чэрвеня. ("гэтымі днямі выйшла").

15. ВЯСНА-КРАСНА. Зборнічак веснавых беларускіх песьняў. Сабраў і падрыхтаваў да друку Я. Найдзюк, гарманізацыя М. Шчаглова і іншых кампазытараў. Менск: выд. ВШПЛМ, друк МВДТ, 1943. — 16 с. Фармат 14x20,5 см. Месца захаваньня — БДАЛІМ.

Інф.: Беларуская Газэта. 1943. 6 траўня.

16. ГЕНІЮШ ЛАРЫСА. Ад родных ніў. Вершы. Прага: выд. Беларускага камітэту самапомачы ў Нямеччыне, друкарня "Палітыка" ў Празе, 1942. — 152 с. Фармат 15x21 см. Цана РМ 2,30. Месца захаваньня — калекцыя Баляслава Манкевіча ў Варшаве.

Інф.: Раніца. 1942. 20 верасьня; Рэцэнзіі: Дальны М. Пад чужым небам // Новая Дарога. 1942. 27 верасьня.; С.Т. Пясьнярка на чужыне // Раніца. 1942. 4 кастрычніка.

17. HISTORYJA Biełarusi ŭ kartach. Pavodle lekcyj čytanych ing. M. Abramčykam na kursach biełarusaviedy ŭ Berlinie 1941—42 h. Апрацавала Ніна Абрамчык. Бэрлін: выд. Бэрлінскага аддзелу Беларускага камітэту Самапомачы ў Нямеччыне, на правах рукапісу, ратапар, 1942. — 62 с. Фармат 21x29 см. Наклад 3500 ас., цана РМ 2,70. Месца захаваньня — калекцыя аўтара.

Інф.: Раніца. 1942. 6 сьнежня.

18. ГЛЫБІННЫ Ў. Смаленшчына — адвечная беларуская зямля беларускага народу. Гістарычны нарыс. Бэрлін: Народная Бібліятэчка № 2, 1944. — 32 с. Фармат 11x14 см. Цана РМ 0,50. Месца захаваньня — НАРБ.

Інф.: Раніца. 1944. 17 сьнежня.

19. ДАБРЫНСКАЯ ЗОФІЯ. Арытмэтыка. Ад вучэньня ў школе й дома. Для 3 аддзела. Прага: выд. Беларускага камітэту самапомачы ў Празе, друкарня "Палітыка", 1942. — 84 с. Фармат 14,5x22 см. Наклад 2500 ас. Цана РМ 1,00. Месца захаваньня — НББ, Славянская бібліятэка ў Празе.

Інф.: Лісты Я. Станкевіча да К. Езавітава ад 19.07 і 31.08.1942 // Спадчына. 1999. № 5—6.

20. DABRYNSKAJA Z., ZAVUŠCINSKI M. Zbornik arytmetyčnych zadačaŭ i prykładaŭ na II klasu narodnaje škoły. Менск: выд. БШПЛМ, друкавалася ў Вільні, 1943. — 104 с. Фармат 15x21 см. Накл. 50 000 ас. Цана РМ 2,00. Месца захаваньня — НАРБ.

Інф.: Беларуская Газэта. 1944. 19 студзеня. ("выйшаў у сьнежні 1943 г.").

21. DABRYNSKAJA Z., ŠYRYNSKI P. Zbornik arytmetyčnych zadačaŭ i prykładaŭ na I klasu narodnaje školy. Менск: выд. ВШПЛМ, друк у Вільні, 1943. — 88 с. Фармат 15x21 см. Наклад 50 000 ас. Цана РМ 2,00. Месца захаваньня — НАРБ.

Інф.: Беларуская Газэта 1944. 19 студзеня. ("выйшаў у сьнежні 1943 г.").

22. 25–ЛЕЦЬЦЕ Беларускае Гімназіі ў Вільні 1919—1944. Вільня: выд. Беларускае Гімназіі ў Вільні, 1944. — 46 с. Фармат 14x19 см. Тэкст кірыліцай і лацінкай. Месца захаваньня — НАРБ.

23. 25 SAKAVIKA. Бэрлін: выд. Беларускага камітэту самапомачы ў Нямеччыне, рататтар, 1942. — 9 с. Фармат 21x29 см. Цана РМ 0,5. Месца захаваньня — Бібліятэка Ф. Скарыны ў Лёндане.

Інф.: Раніца. 1942. 6 сьнежня.

24. ДУДАР і іншыя апавяданьні. Бэрлін: выд. Фрэмдшпрахэн–Фэрляг. Беларуская Народная Бібліятэчка Vineta, Т. 7, 1944, — 63 с. Фармат 10,5x14,5 см. Месца захаваньня — Бібліятэка Ф. Скарыны ў Лёндане.

25. ЕЗАВІТАЎ К. Беларуская Цэнтральная Рада адзіны правамоцны прадстаўнік беларускага народу. Бэрлін: выд. Беларускага інфармацыйнага бюро, друк, 1944. — 12 с. Фармат 13x20 см. Месца захаваньня — Бібліятэка Ф. Скарыны ў Лёндане.

26. ЕЗАВІТАЎ К. Беларуская школа. Першая чытанка пасьля лемантара. Выд. трэцяе. Рыга: выд. К. Езавітава, Трэцяя рыская друкарня, 1943, лістапад. — 160 с. Фармат 15x20 см. Наклад 3000 ас. Цана РМ 3,00. Месца захаваньня — калекцыя аўтара.

Інф.: Раніца. 1944. 9 студзеня.

27. ЕРМАЧЭНКО Я. Пранцы (сыфіліс). Прага: Беларускае выдавецтва Яна Ермачэнкі, рататтар. Карэспандэнцыйныя курсы беларусаведы, 1941. — 10 с. Месца захаваньня — Славянская бібліятэка ў Празе.

28. ЖЫЛКА ЎЛАДЗІМЕР. Тэстамэнт. Бэрлін: выд. Бэрлінскага аддзелу Беларускага камітэту самапомачы, рататтар, 1944. — 21 с. Фармат 13x20 см. Цана РМ 0,50. Месца захаваньня — Бібліятэка Ф. Скарыны ў Лёндане.

Інф.: Раніца. 1944. 23 ліпеня.

29. ЗБОРНІК купальскіх і жніўных беларускіх песьняў. Апрацоўка М. Шчаглова і А. Туранкова. Менск: выд. ВШПЛМ, друкарня МВДТ, 1943. — 36 с. Фармат 14,5Ч20 см. Месца захаваньня — калекцыя аўтара.

Інф.: Беларуская Газэта. 1943. 17 ліпеня. ("днямі выйшаў").

30. ЗБОРНІК сцэнічных твораў (Пінская шляхта, Модны шляхцюк, Чорт і баба, Зьбянтэжаны Саўка, Мікітаў лапаць, Міхалка). Менск: выд. ВШПЛМ, друкарня МВДТ, 1943 — 80 с. Фармат 15x20 см. Месца захаваньня — БДАЛІМ.

Інф.: Голас Вёскі. 1943. 22 ліпеня. ("выдадзены ў ліпені 1943 г.").

31. ЗІНЧУК М. Палыночак. Беларуская народная песьня для высокага голасу. Рыга: выд. К. Езавітава, друкарня "Картаграфічны Інстытут П. Мантнекса", 1942, лістапад. — 4 с. Фармат 20x27 см. Наклад 2000 ас. Цана РМ 0,80. Месца захаваньня — БДАЛІМ.

Інф.: Раніца. 1943. 7 лютага.

32. ІНСТРУКЦЫЯ аб правядзеньні пераводаў з клясы ў клясу і аб выпускных зкзаменах у народных беларускіх школах. Менск: выд. Інспэктарату беларускіх школаў пры Генэральным камісары Беларусі, друкарня МВДТ, 1942. — 7 с. Фармат 14,5x21 см. Месца захаваньня — НББ.

33. КАЛЫНЬШ. Смалакурэньне. 1944. — 240 с. Цана РМ 11,60.

Інф.: Беларуская Газэта. 1944. 19 красавіка.

34. KALADNYJA pieśni. Апрацаваў а. В. Шутовіч. Бэрлін: выд. Бэрлінскага аддзелу Беларускага камітэту самапомачы ў Нямеччыне, рататтар, 1942. — 19 с. Фармат 15x21

см. Месца захаваньня — калекцыя аўтара.

35. КАМАРОЧАК. Беларуская народная песьня. Выданьне К. Езавітава, малюнкі А. Бяльцовай, Рыга, 1944.

Інф.: Беларуская Газэта. 1944. 20 траўня.

36. КАРОТКАЯ інструкцыя па выкананьню рахунковага пляну бухгальтарскага вучоту канторамі і прадпрыемствамі Цэнтральнага гандлёвага таварыства для ўсходу. Менск: выд. Цэнтральнага гандлёвага таварыства "Ўсход", 1942. — 48 с. Месца захаваньня — НАРБ.

37. KAROTKI malitaŭnik dla biełarusaŭ-katalikoŭ. Не пазначаныя месца і год выданьня, выдавец і друкарня [Менск, 1941. кс. др. Станіслаў Глякоўскі, друкарня Менскай гарадзкой управы]. — 14 с. Фармат 10x14 см. Месца захаваньня — калекцыя аўтара.

Інф.: Менская Газэта. 1941. 7 сьнежня.

38. КАРОТКІ малітаўнік для беларусаў-каталікоў. Не пазначаныя месца і год выданьня, выдавец і друкарня [Менск, 1941, кс. др. Станіслаў Глякоўскі, друкарня Менскай гарадзкой управы]. — 14 с. Месца захаваньня — калекцыя Антона Шукелойця, Нью-Ёрк.

Інф.: Менская Газэта. 1941. 7 сьнежня.

39. KISIEL P. Biełaruski lemantar. Менск: выд. ВШПЛМ, друкарня "Minsker Zeitung", 1942. — 32 с. Фармат 13,5x20,5 см. Месца захаваньня — Бібліятэка Акадэміі Навук Літвы ў Вільні.

40. KISIEL P. Biełaruski lemantar. Менск: выд. ВШПЛМ, 1943. — 96 с.

Інф.: Беларуская Газэта. 1943. 9 чэрвеня; рэцэнзія П. Санчыка: Новая Дарога. 1943. 3 кастрычніка.

41. KISIEL P. Biełaruski lemantar. Выданьне другое стэрэатыпнае. Менск: выд. ВШПЛМ, 1943. — 96 с. Наклад 30 000 ас. Цана РМ 1,50.

Інф.: Голас Вёскі. 1944. 25 лютага. ("гэтымі днямі выйшаў з друку").

42. КОЛАС ЯКУБ. Сымон Музыка. Поэма. Прага: выд. Беларускага камітэту самапомачы ў Нямеччыне, друкарня "Палітыка" ў Празе, 1942. — 212 с. Фармат 15x21 см.

Інф.: Раніца. 1942. 6 верасьня.; тамсама рэцэнзія Р. Максімовіча.

43. ЛАСТОЎСКІ В. Што трэба ведаць кажнаму беларусу. Выданьне другое, пашырыў Я. Найдзюк. Менск: выд. ВШПЛМ, друкарня МВДТ, 1943. — 31 с. Фармат 11x17 см. Месца захаваньня — НАРБ, НББ.

Інф.: Голас Вёскі. 1943. 16 траўня.

44. ЛАСТОЎСКІ В. Што трэба ведаць кажнаму беларусу. Выданьне трэцяе, пашырыў Я. Найдзюк. Бэрлін, друкарня "Бібліятэчка Каліноўцаў", 1944. — 32 с. Фармат 12x16 см. Цана РМ 0,50. Месца захаваньня — калекцыя аўтара.

Інф.: Раніца. 1944. 17 сьнежня.

45. ЛЕБЯДА ТОДАР. Песьні выгнаньня. Менск: выд. ВШПЛМ, друкарня "Аўшра" ў Вільні, 1944. — 32 с. Фармат 11x14 см. Наклад 5000 ас. Цана РМ 0,75. Месца захаваньня — калекцыя аўтара.

Інф.: Беларуская Газэта. 1944. 22 сакавіка.

46. ЛЕМАН ОТТО. Нямецкія салдаты. Што трэба ведаць аб нямецкіх варужных сілах. Бэрлін: выд. "Die Wehrmacht", 1939. — 44 с. Фармат 14x20 см. Месца захаваньня — НАРБ.

47. ЛЁЕ ГАНС. Нямецка-беларускі слоўнік. Бэрлін: выд. Buchdruckerei Gerb Radetzki, 1944. — 50 с.

Інф.: Раніца. 1944. 9 красавіка.

48. ЛЁСІК АНТОН. Беларускі правапіс. Менск: выд. ВШПЛМ, друкарня МВДТ, 1943. — 61 с. Фармат 14x21,5 см. Наклад 100 000 ас. Месца захаваньня — НББ, калекцыя аўтара.

Інф.: Голас Вёскі. 1943. 9 верасьня. ("гэтымі днямі выйшаў з друку").

49. LOSIK ANTON. Biełaruski pravapis. Менск: выд. ВШПЛМ, друк у Вільні. 1943. — 72 с. Фармат 15x21 см. Наклад 50 000 ас. Цана РМ 1,00. Месца захаваньня — калекцыя аўтара.

Інф.: Голас Вёскі. 1944. 25 лютага. ("гэтымі днямі выйшаў").

50. ЛЯСУН М. На крыжы. Апавяданьні. Менск: выд. ВШПЛМ, друкарня МВДТ, 1943. — 62 с. Фармат 10x14 см. Месца захаваньня — БДАЛІМ.

Інф.: Голас Вёскі. 1943. 28 траўня.

51. МІКАЛАЕВІЧ М. 3 беларускія народныя песьні для хору ("Ты, чырвоная каліна", "Ой, доля, мая доля", "Кумачка"). Рыга: выд. К. Езавітава, друкарня "Картаграфічны Інстытут П. Мантнекса", 1943, травень. Фармат 20x27 см. Цана РМ 1,00.

Інф.: Раніца. 1943. 6 чэрвеня.

52. МУЗЫКА АРЦЁМ. Прыгоды Панаса і Тараса. Бэрлін: "Народная Бібліятэчка № 3", 1944. — 32 с. Фармат 11x14 см. Цана РМ 0,50. Месца захаваньня — Бібліятэка Ф. Скарыны ў Лёндане.

Інф.: Раніца. 1944. 17 сьнежня.

53. НАЙДЗЮК ЯЗЭП. Беларусь учора і сяньня. Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі. Выданьне другое, пашыранае. Менск: выд. ВШПЛМ, друк МВДТ, 1944, сакавік. — 304 с. Фармат 13x21 см. Наклад 25 000 ас. Цана РМ 5,00. Месца захаваньня — НББ, калекцыя аўтара.

Інф.: Беларуская Газэта. 1944. 22 красавіка; рэцэнзія Р. Загорнага: Раніца. 1944. 23 ліпеня.

54. НАРМАЛЬНЫ статут праваслаўных царкоўных брацтваў. З багаслаўленьня Блажэньнейшага Дзянісія Мітрапаліта Варшаўскага. Варшава, выдадзена коштам Беларускага Камітэту і Беларускага Царкоўнага Брацтва ім. Сьвятога Юрага ў Варшаве, Сынадальная Друкарня, 1942. — 10 с. Фармат 12x16 см. Месца захаваньня — калекцыя аўтара.

Інф.: Раніца. 1942. 30 жніўня.

55. НОВАЯ пара. Праваднік для жадаючых адбудовы Беларусі. Сшытак I. Менск: выд. Прэсавага выдавецтва, 1943. — 16 с.

Інф.: Беларуская Газэта. 1943. 15 красавіка.

56. ОЙ, ПРЫЙШЛА каляда. Зборнічак беларускіх калядных песьняў. Апрацаваў М. Шчаглоў. Менск: выд. ВШПЛМ, друк МВДТ, 1942. — 16 с. Фармат 15x21 см. Наклад (паводле "Беларускай Газэты". 1943. 18 сакавіка) 5000 ас. Месца захаваньня — БДАЛІМ.

Інф.: Новая Дарога. 1943. 7 лютага; Голас Вёскі. 1943. 22 ліпеня ("выйшла на пачатку сёлетняга году").

57. PAD HOMAN viasioły. Zbornik papularnych pieśniaŭ, ramansaŭ i prypievak. Сабрала Ніна Абрамчык. Бэрлін: выд. Беларускага камітэту самапомачы ў Нямеччыне, на правах рукапісу, ратапар, 1943. — 37 с. Фармат 15x21 см. Месца захаваньня — калекцыя аўтара.

Інф.: Раніца. 1943. 9—16 траўня.

58. PATREBNIEJŠYJA vyniatki z Rytuału. Перакл. і выд. кс. А. Станкевіча, Вільня, 1943. — 31 с.

Інф.: Божым Шляхам (Лёндан). 1972. № 132. С. 7.

59. ПЕСЬНЯРЫ Случчыны. Збор вершаў. Выдадзены пры ўдзеле Лявона Случаніна, Арыстарха Крота, Палікарпа Манькова. Пад рэдакцыяй Уладзімера Клішэвіча. Слуцак, 1943. — 233 с. Фармат 13,5x20 см. Месца захаваньня — БДАЛІМ, НББ.

Інф.: Беларуская Газэта. 1944. 12 лютага.

60. ПРАГРАМА беларускай мовы для народнае школы. Праект. Менск: выд. Інспэктарату беларускіх школаў пры Генэральным камісары Беларусі, Краёвая друкарня ў Менску, 1941. — 15 с. Фармат 14x21 см. Месца захаваньня — НАРБ, НББ.

61. ПРАГРАМА геаграфіі для народнае школы. Праект. Менск: выд. Інспэктарату беларускіх школаў пры Генэральным камісары Беларусі, Краёвая друкарня ў Менску, 1941. — 16 с. Фармат 14x21 см. Месца захаваньня — НАРБ, НББ.

62. ПРАГРАМА гісторыі для народнае школы. Праект. Менск: выд. Інспэктарату беларускіх школаў пры Генэральным камісары Беларусі, Краёвая друкарня ў Менску, 1941. — 16 с. Фармат 14x21 см. Месца захаваньня — НББ.

63. ПРАГРАМА грамадазнаўства для народнае школы. Праект. Менск: выд. Інспэктарату беларускіх школаў пры Генэральным камісары Беларусі, Краёвая друкарня ў Менску, 1941. — 2 с. Фармат 15x22 см. Месца захаваньня — НББ.

64. ПРАГРАМА матэматыкі для народнае школы. Праект. Менск: выд. Інспэктарату беларускіх школаў пры Генэральным камісары Беларусі, Краёвая друкарня ў Менску, 1941. — 16 с. Фармат 14x21 см. Месца захаваньня — НАРБ.

65. ПРАГРАМА нямецкай мовы для народнае школы. Праект. Менск: выд. Інспэктарату беларускіх школаў пры Генэральным камісары Беларусі, Краёвая друкарня ў Менску, 1941. — 8 с. Фармат 14x21 см. Месца захаваньня — НАРБ.

66. ПРАГРАМА прыродазнаўства для народнае школы. Праект. Менск: выд. Інспэктарату беларускіх школаў пры Генэральным камісары Беларусі. Краёвая друкарня ў Менску, 1941. — 16 с. Фармат 15x22 см. Месца захаваньня — НББ.

67. ПРАГРАМА ручной працы для народнай школы. Праект. Менск: выд. Інспэктарату беларускіх школаў пры Генэральным камісары Беларусі, Краёвая друкарня ў Менску, 1941. — 8 с. Фармат 14x21 см. Месца захаваньня — НАРБ, НББ.

68. ПРАГРАМА рысаваньня для народнае школы. Праект. Менск: выд. Інспэктарату беларускіх школаў пры Генэральным камісары Беларусі, Краёвая друкарня ў Менску, 1941. — 4 с. Фармат 15x21 см. Месца захаваньня —НББ.

69. ПРАГРАМА сьпеваў і музыкі для народнае школы. Праект. Менск: выд. Інспэктарату беларускіх школаў пры Генэральным камісары Беларусі, Краёвая друкарня ў Менску, 1941. — 4 с. Фармат 14x19 см. Месца захаваньня — НББ.

70. ПРАГРАМА фізыкі для народнае школы. Праект. Менск: выд. Інспэктарату беларускіх школаў пры Генэральным камісары Беларусі, Краёвая друкарня ў Менску, 1941. — 8 с. Фармат 14x21 см. Месца захаваньня — НАРБ.

71. ПРАГРАМА фізычнага ўзгадаваньня для народнае школы. Праект. Менск: выд. Інспэктарату беларускіх школаў пры Генэральным камісары Беларусі, Краёвая друкарня ў Менску, 1941. — 32 с. Фармат 14x21 см. Месца захаваньня — НАРБ, НББ.

72. ПРАГРАМА хіміі для народнае школы. Праект. Менск: выд. Інспэктарату беларускіх школаў пры Генэральным камісары Беларусі, Краёвая друкарня ў Менску. 1941. — 2 с. Фармат 13x18,5 см. Месца захаваньня — НББ.

73. РАДЗІМІЧ ЛЯВОН. Адам і Ева. Чабор. Апавяданьні. Бэрлін: "Народная Бібліятэчка № 5", 1944. — 32 с. Фармат 11x14 см. Месца захаваньня — Бібліятэка Ф. Скарыны ў Лёндане.

74. REŠEĆ J. ks. dr. Karotki katechizm dla biełarusaŭ-katalikoŭ. Выданьне другое. Менск: выд. кс. др. Станіслава Глякоўскага, менская гарадзкая друкарня, 1941. — 47 с. Фармат 10x14 см. Месца захаваньня — калекцыя аўтара.

Інф.: Менская Газэта. 1941. 7 сьнежня.

75. САЛАВЕЙ АЛЕСЬ. Мае песьні. Зборнік лірыкі. Менск: выд. ВШПЛМ, друкарня "Рота" ў Рызе, 1944, ліпень. — 96 с. Фармат 15x21 см. Наклад 3000 ас. Цана РМ 3,00. Месца захаваньня — калекцыя аўтара (асобнік з дэдыкацыяй Н. Арсеньневай. Бэрлін. 18.09.1944).

Інф. і рэцэнзія: Раніца. 1944. 10 верасьня.

76. САМОХІНА Т. Непагодны вечар. Раманс на словы М. Багдановіча, музыка Р. Самохіна, для высокага голасу. Рыга: выд. К. Езавітава, друкарня "Картаграфічны Інстытут П. Мантнекса", 1942, лістапад. — 4 с. Фармат 20x27 см. Наклад 2000 ас. Цана РМ 0,80. Месца захаваньня — БДАЛІМ.

Інф.: Раніца. 1943. 7 лютага.

77. СЛОВА для маладых людзей. Першы сшыток з раду пісьмаў, выдадзеных для эўрапэйскае моладзі, працуючае для вайны. Апрацаваў фэльдфэбель др. П. Штыр. Бэрлін: выд. райхсьміністэрства для занятых усходніх абшараў, установа гаўптбанфюрэра Нікеля, 1944. — 24 с. Фармат 15x21 см. Месца захаваньня — НАРБ.

78. СЛУЧАНІН ЛЯВОН. Рагнеда. Паэма. Менск: выд. ВШПЛМ, друкарня "Аўшра" ў Вільні, 1944, травень. — 63 с. Фармат 11x14 см. Наклад 5000 ас. Месца захаваньня — БДАЛІМ, НББ.

Інф.: Беларуская Газэта. 1944. 31 траўня.; рэцэнзія Г. Альгердзіча: Раніца. 1944. 15 кастрычніка.

79. СПАСКІ А. Астры. Раманс на словы М. Багдановіча для высокага голасу. Рыга: выд. К. Езавітава, друкарня "Картаграфічны Інстытут П. Мантнекса", 1943, студзень. — 8 с. Фармат 20x27 см. Наклад 2000 ас. Цана РМ 1,00. Месца захаваньня — БДАЛІМ.

Інф.: Раніца. 1943. 6 чэрвеня.

80. СТАНКЕВІЧ Я. пры ўчасьці Ант. Адамовіча. Маленькі маскоўска-беларускі (крывіцкі) слоўнічак фразэолёгічны і прыказкаў ды прывітаньні, зычэньні і інш. Менск: выд. ВШПЛМ, друк МВДТ, 1944. — 151 с. Фармат 9x14 см. Цана РМ 2,00. Месца захаваньня — НББ.

Інф.: Беларуская Газэта. 1944. 10 ліпеня. ("гэтымі днямі выйшла").

81. СТАНКЕВІЧ ЯН. Курс беларускае мовы. Прага: Беларускае выдавецтва Яна Ермачэнкі, ратапар, "Карэспандэнцыйныя курсы беларусаведы", 1941. Лекцыя першая — 12 с. Лекцыя другая — 13—20 с. Месца захаваньня — Славянская бібліятэка ў Празе.

82. СТАНКЕВІЧ ЯН. Курс гісторыі Крывіі-Беларусі. Прага, Беларускае выдавецтва Яна Ермачэнкі, ратапар, "Карэспандэнцыйныя курсы беларусаведы", 1941. Лекцыя першая — 7 с. Лекцыя другая — 8—21 с. Лекцыя трэцяя — 22—31 с. Фармат 20x29 см. Месца захаваньня — Славянская бібліятэка ў Празе, Бібліятэка Ф. Скарыны ў Лёндане.

83. СТАНКЕВІЧ Я. др. Крыўя-Беларусь у мінуласьці (Адбітка з "Менскае Газэты" з 12.11.1941 — 31.01.1942). Менск: выд. Беларускай Народнай Самапомачы, друкарня МВДТ, 1942. — 70 с. Фармат 12x17,5 см. Наклад (паводле "Беларускай Газэты". 1943. 18 сакавіка) 50 000 ас. Месца захаваньня — калекцыя аўтара, НББ.

Інф.: Ліст Янкі Станкевіча ад 31.08.1942; Спадчына. 1999. № 5—6. С. 63.

84. STANKIEVIČ J. Lemantar pierachodny z łacinicy na kirylicu. Менск: выд. Беларускае народнае самапомачы, 1942. — 16 с. Фармат 15x21 см. Месца захаваньня — калекцыя аўтара, НББ.

Інф.: Беларуская Газета. 1942. 31 кастрычніка.

85. СТАНКЕВІЧ Я. Кніжка вучыцца чытаць і пісаць лацінкаю з укладаньнямі. Менск: выд. ВШПЛМ, друкарня ў Вільні, 1943. — 48 с. Фармат 14x22 см. Наклад 10 000 ас. Цана РМ 1,00. Месца захаваньня — НББ.

Інф.: Раніца. 1944. 9 студзеня.

86. СТАТУТ Беларускага аб'яднаньня. Рыга, 1943.

Інф.: Раніца. 1943. 25 ліпеня. ("гэтымі днямі выйшаў на беларускай і нямецкай мовах").

87. СТРАЯВЫ вайсковы статут. Перапрацаваў зь нямецкага вайсковага статуту (Ausbildungsvorschrift für die Infanterie, Heft 2—a) падпаручык арт. Мікула Віталі. Менск: выд. ВШПЛМ, друкарня МВДТ, 1943. — 31 с. Фармат 14x20